

Славутыя
імёны
Бацькаўшчыны

Славутыя імёны Бацькаўшчыны

выпуск першы

МІНСК
БЕЛАРУСКІ ФОНД КУЛЬТУРЫ
2000

УДК 929(476)(082)
ББК 63.3(4 Беи)-8
С47

Серыя заснавана ў 2000 годдзе

Зборнік складзены з лепшых прац, якія выкананы ў Беларускім фондзе культуры па заказу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і пры дапамозе Дзяржаўнага Камітэта па друку Рэспублікі Беларусь

Рэдакцыйная калегія:
У. А. Гілеп, А. П. Грыцкевіч (гал. рэд.),
В. Ф. Кушнер, В. А. Гапоненка, А. А. Тоўсцік,
М. П. Станкевіч, А. Р. Бутвілоўскі

Укладанне
УЛАДЗІМІРА ГІЛЕПА, АНАТОЛЯ ГРЫЦКЕВІЧА,
ВАСІЛЯ КУШНЕРА, АРКАДЗЯ ТОЎСЦІКА

Славутыя імёны Бацькаўшчыны: Зборнік. Вып. 1./ Уклад.
С47 У. Гілеп і інш; Рэдкал.: А. Грыцкевіч (гал. рэд.) і інш. — Мн.: БФК, 2000. — 384 с.

ISBN 985-6523-07-0 (Вып.1)
ISBN 985-6523-06-0

Зборнік складаецца з навуковых даследаванняў жыццёвага і творчага шляху тых дзяржаўных, палітычных, грамадскіх, ваенных дзеячаў, мецэнатаў, дзеячаў культуры, навукі, якія нарадзіліся і жылі на Беларусі, а таксама вылучыліся сваім талентам і здольнасцю ў іншых краінах, але да гэтага часу малавядомы, або зусім невядомы на радзіме.

Выданне разлічана на навукоўцаў, выкладчыкаў навучальных устаноў, школ, студэнтаў, а таксама аматараў беларускай даўніны.

УДК 929 (476) (082)
ББК 63.3 (4 Беи)-8

ISBN 985-6523-07-0 (Вып.1)
ISBN 985-6523-06-0
© Беларускі фонд культуры, 2000

Славутыя імёны Бацькаўшчыны

Гістарычна склалася так, што насельніцтва сучасных беларускіх зямель апынулася на геапалітычным перакрыжаванні паміж Усходняй і Цэнтральнай Еўропай. На працягу стагоддзяў яно было ўцягнута ў складаную міждзяржаўную палітычную і ўзброеную барацьбу, адчувала ўзаемаўплыў розных рэлігій і многіх нацыянальных культур. Полацкае, Тураўскае, Менскае, Берасцейскае, Гарадзенскае, Пінскае, Навагрsuccесдскае і іншыя княствы фарміраваліся як дзяржавы, асноўнай мэтай якіх быў не прыгнёт і рабаванне іншых народаў. Гэта былі тэрытарыяльныя, суверэнныя саюзы грамадзян, утвораныя з мэтай абароны іх жыцця, свабоды і маёмасці. Такі тып дзяржаў фарміраваў і пэўны менталітэт — свабодалюбства, стойкасць у барацьбе з ворагамі, павагу і цярпімасць да вераванняў і культуры народаў, якія жылі побач.

На такой палітычнай і ментальнай глебе нараджаліся неардынарныя постаці змагароў за стварэнне і абарону дзяржавы і яе інтарэсаў — палітыкі, дыпламаты, ваяры. Свабодалюбівыя крывічы, дрыгавічы, радзімічы і іх нашчадкі шанавалі сваіх багоў, памяць аб сваіх продках, цягнуліся да ведаў аб іншых народах.

Гістарычная памяць пакаленняў захавала для нас такія вядомыя імёны таго часу, як полацкія князі Брачыслаў Ізяславіч і Усяслаў Брачыславіч, тураўскі князь Ізяслаў Яраславіч, імёны асветнікаў, пісьменнікаў, рэлігійных дзеячаў, майстроў: Аўрамія Смаленскага, Лазара Богшы, Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Рагнеды Рагвалодаўны і некаторых іншых. Аднак і сёння мы вельмі мала ведаем пра іх, а іх вобразы створаны ў асноўным на міфах.

У выніку аб'ектыўных эканамічных працэсаў, а таксама пад націскам ворагаў — мангола-татар з паўднёвага ўсходу і крыжакоў з захаду — беларускія княствы ўсё больш згуртоўваюцца. У XIII–XV стагод-

дзях паступова ствараецца магутная шматнацыянальная і рознаканфесійная еўрапейская дзяржава — Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае і іншых зямель (ВКЛ). Палітычную, эканамічную, абарончую магутнасць ВКЛ умацоўваюць вялікія князі Вітаўт, Гедымін, Альгерд, Ягайла, Казімір Ягайлавіч, Аляксандр і іх нашчадкі. Не толькі на радзіме, але і за яе межамі сталі вядомымі імёны Алелькавічаў, Канстанціна Астрожскага, Ф.Скарыны, С.Буднага, М.Гусоўскага, Ф.Еўлашоўскага, прадстаўнікоў знакамітага беларускага рода Радзівілаў і многіх іншых нашых продкаў, якіх лёс закінуў у многія краіны, у палітычнае і культурнае жыццё якіх яны ўнеслі значны ўклад. У той жа час культура народаў Беларусі стала арганічнай часткай еўрапейскай сусветнай культуры: XVI стагоддзе стала «залатым векам» беларускай культуры. Але жыць на скрыжаванні дарог, а тым больш на скрыжаванні геапалітычных інтарэсаў заўсёды вельмі складана. З аднаго боку, эканамічная і палітычная арыентацыя на Еўропу, з другога — моцны націск Маскоўскай дзяржавы, якая імкнулася пашырыць свае ўладанні, і вымусілі ВКЛ аб'яднацца ў 1569 г. з Польскім Каралеўствам у федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую.

Ліцвіны прыйшлі ў аб'яднаную дзяржаву з сваімі палітычнымі і культурнымі традыцыямі, сваёй мовай, сваімі прававымі нормамі. Статут Вялікага княства Літоўскага, асабліва яго трэцяя рэдакцыя, зацверджаная ў 1588 г., з'яўляўся адным з лепшых у Еўропе зводам прававых актаў. Статут адлюстроўваў такія прагрэсіўныя ідэі, як суверэннасць дзяржавы, адзінства, усеагульнасць права. Пры падрыхтоўцы яго актыўны ўдзел прымаў канцлер ВКЛ Леў Сапега, а выдалі Статут беларускія кнігадрукары Мамонічы ў Вільні.

Перыяд знаходжання ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай — вельмі супярэчлівы час у яго гісторыі. ВКЛ захоўвала сваю пэўную палітычную і эканамічную самастойнасць, заканадаўства, мела свае войска і інш. У той жа час паступова, але настойліва вялася паланізацыя. Ідэалагічным сродкам яе стала уніяцкая царква. Пачала ўсё выразней праяўляцца слабасць каралеўскай улады, паланізацыя, а дакладней, акаталічванне вярхушкі ліцьвінскай шляхты, якая паступова адракалася ад роднай мовы, традыцый сваіх продкаў.

Таму вельмі цяжка адназначна ацаніць дзейнасць палітычных, рэлігійных, грамадскіх дзеячаў, дзеячаў навукі і культуры таго перыяду. Напрыклад, нават сярод прадстаўнікоў магнацкіх родаў Радзівілаў, Сапегаў, Хадкевічаў цесна перапляталіся каталіцызм, уніяцтва, праваслаўе, розныя пратэстанцкія плыні і філасофскія школы, палітычныя арыентацыі на Польшчу, Расію і іншыя дзяржавы.

Усё больш паглыбляюцца ўнутраныя супярэчнасці ў Рэчы Паспалітай, якія ў другой палове XVIII стагоддзя робяць яе здабыткам больш

моцных еўрапейскіх дзяржаў — Расійскай імперыі, Аўстрыі і Прусіі. У выніку трох падзелаў паміж імі, 1772, 1793 і 1795 гадоў, Рэч Паспалітая страчвае сваю незалежнасць. А пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі пачынаецца актыўная палітыка русіфікацыі, перш за ўсё, уцягвання гэтых тэрыторый у эканамічную сістэму імперыі. Адбываецца новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, увядзенне расійскага заканадаўства. З 30-х гадоў XIX ст. усё шырэй разгортваецца актыўная ідэалагічная барацьба паміж прыхільнікамі «заходне-русізма» (ён становіцца афіцыйнай імперскай ідэалогіяй на землях, якія атрымалі афіцыйную назву «Северо-Западный край») і прыхільнікамі «Ягелонскай ідэі», якія ставілі задачу адраджэння Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Вынікам гэтай барацьбы з'явілася тое, што праз палітычную і юрыдычную практыку, навуковую, грамадска-палітычную літаратуру русіфікатары імкнуліся пазбавіць беларусаў не толькі этнічных каранёў, культурнай самабытнасці, але нават імёнаў тых, хто стаў дзяржаўнымі, палітычнымі і культурнымі дзеячамі, і такім чынам пазбавіць народ гістарычнай памяці аб сваіх продках.

У выніку такой «дзялёжкі», якая праводзілася ў асноўным па канфесіянальнаму прызнаку, амаль усе полацкія, турава-пінскія, менскія князі сталі называцца русінамі, русічамі, а славутыя дзеячы ВКЛ і Рэчы Паспалітай — палякамі, літоўцамі і ўкраінцамі. Гэты падзел яшчэ ў другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя быў адпаведным чынам замацаваны ў польскіх і расійскіх энцыклапедычных выданнях, навуковых манаграфіях, падручніках і дапаможніках. Такі метадалагічны падыход задавальняў і бальшавіцкіх лідэраў. У пачатку 1920-х гадоў яны імкнуліся выкарыстаць нацыянальныя пачуцці і дазволілі «беларусізацыю». Але ўжо ў канцы 1920-х — пачатку 1930-х гадоў не толькі ўсе дзеячы Беларускай Народнай Рэспублікі, якія вярнуліся ў СССР, але і многія беларускія камуністы, што стварылі Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Беларусі (потым — БССР), былі аб'яўлены «нацдэмамі» і практычна ўсе знішчаны. Іх жыццёвы шлях і дзейнасць або замоўчваліся, або яны характарызаваліся ў навуковай і грамадска-палітычнай літаратуры як «ворагі народа».

У савецкія энцыклапедычныя выданні ўключаліся толькі партыйныя і дзяржаўныя кіраўнікі, навукоўцы і навуковыя дзеячы, дзейнасць якіх прызнавалася адпавядаючай мэтам пабудовы сацыялізму і камунізму. Беларускія грамадскія і культурныя дзеячы, што знаходзіліся ў эміграцыі, у гэтыя выданні, безумоўна, не траплялі. Менавіта па такому метадалагічнаму падыходу была зроблена «Беларуская савецкая энцыклапедыя».

У той жа час дзейнасць многіх, нават вядомых палітычных, дзяржаўных, грамадскіх, культурных дзеячаў часоў ВКЛ і Рэчы Паспалі-

тай — Радзівілаў, Сапегаў, Хадкевічаў і іншых — падавалася аднабакова і нават фальсіфікавалася па прычыне тых ці іншых палітычных абставін або ідэалагічных падыходаў.

Першыя спробы адыходу ад такіх прынцыпаў былі выкліканы крызісам бальшавіцкай ідэалогіі і імкненнем нацыянальнасвядомых беларусаў вярнуць у грамадскае, палітычнае і культурнае жыццё імёны славутых людзей нашай Бацькаўшчыны і адносяцца да сярэдзіны 1980-х гадоў. Адну з першых прац, прысвечаную мастаку, настаўніку, этнографу, краязнаўцу Язэпу Драздовічу, імя якога больш за 30 гадоў было ў забыцці, падрыхтаваў А.Ліс («Вечны вандроўнік». Мн., 1984). У 1988 г. супрацоўнікамі Акадэміі навук БССР пачала выдавацца навукова-папулярная серыя «Нашы славутыя землякі». У ёй знайшлі адлюстраванне жыццё і творчы шлях такіх славутых людзей беларускай зямлі, як Ефрасіння Полацкая, Усяслаў Полацкі, Леў Сапега, Канстанцін Астрожскі, Казімір Семяновіч, Яўстах Тышкевіч, Якуб Наркевіч-Ёдка, Караль Чаховіч, Саламея Русецкая, Ігнат Грынявіцкі і некаторыя іншыя. На жаль, з 1995 года гэта серыя не выдаецца, хоць некаторыя рукапісы былі ўжо падрыхтаваны.

Неабходна адзначыць, што пасля абвяшчэння Рэспублікі Беларусь работа ў гэтым накірунку значна актывізавалася. Ёсць пэўныя напрацоўкі, якія знайшлі адлюстраванне ў «Беларускай энцыклапедыі», «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», энцыклапедычным даведніку «Пісьменнікі Беларусі», гісторыка-дакументальных хроніках гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць», зборніках «Мысліцелі і асветнікі Беларусі», «Наш радавод», «Вяртанне», навуковых даведніках, на старонках «Беларускага гістарычнага часопіса», часопісаў «Беларуская мінуўшчына», «Спадчына», у іншых навуковых і грамадска-палітычных рэспубліканскіх і рэгіянальных часопісах, рэспубліканскіх і мясцовых газетах, у праграмах тэлебачання і радыё. Гэтай праблеме ўсё больш надаюць увагі настаўнікі агульнаадукацыйных школ пры распрацоўцы метадычных матэрыялаў да ўрокаў, афармленні школьных музеяў, краязнаўцы, работнікі архіваў і музеяў, супрацоўнікі Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф.Скарыны Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Аднак гэта работа вядзецца пакуль без належнай каардынацыі, адсутнічаюць метадычныя распрацоўкі падрыхтоўкі біяграм. Нават у энцыклапедычных выданнях шмат факталагічных памылак і недакладнасцей, супярэчнасцей. Жыццёвы шлях і дзейнасць многіх гістарычных асоб міфалагізуюцца, бо аўтары некаторых манаграфій і артыкулаў абапіраюцца не на першакрыніцы, а бяруць некрытычныя звесткі ў іншых даследчыкаў.

Таму ўзнікла ідэя стварэння першага ў нашай рэспубліцы навукова-

га праекта пад назвай «Славутыя імёны Бацькаўшчыны». Ініцыятыва стварэння праекта пад такой назвай, а таксама часовага навуковага калектыву (ЧНК) па яго распрацоўцы належыць Беларускаму фонду культуры. Яна падтрымана Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях і Міністэрствам культуры. Было вырашана на першым этапе пачаць распрацоўку біяграм беларускіх дзеячаў культуры, навукі, палітыкі IX—XIX стагоддзяў. Практычная работа пачалася з другога паўгоддзя 1998 г. Узначальвае часовы навуковы калектыў доктар гістарычных навук, прафесар А.Грыцкевіч.

Варта адзначыць, што ў гэтай працы мы значна адстаём нават ад нашых бліжэйшых суседзяў. Так, аналагічная праграма на Украіне ўжо даўно аб'яўлена дзяржаўнай. Да выканання яе прыцягнуты значныя навуковыя сілы, сістэматычна выдаюцца зборнікі дакументаў, матэрыялаў, манаграфічныя працы, праводзяцца міжнародныя навуковыя канферэнцыі, выставы і г.д. Такія праекты ўжо некалькі гадоў ажыццяўляюцца ў Расіі і іншых дзяржавах былога СССР, што сведчыць аб глыбокім разуменні важнасці гістарычных даследаванняў для ўмацавання дзяржаўнай незалежнасці і патрыятычнага выхавання.

Надзвычай актуальным і практычна значымым з'яўляецца навуковае даследаванне жыццёвага і творчага шляху тых дзяржаўных, палітычных, грамадскіх, ваенных дзеячаў, мецэнатаў, дзеячаў культуры, навукі, якія нарадзіліся і жылі на Беларусі, вылучыліся сваім талентам і здольнасцю ў іншых краінах, але да гэтага часу малавядомыя, або зусім невядомыя на радзіме. Сярод такіх можна назваць постаці Казіміра Семяновіча, які вынайшаў шматступеневую ракету, Ігната Дамейкі — нацыянальнага героя Чылі, Восіпа Кавалеўскага — аднаго з заснавальнікаў манголазнаўства ў Расійскай імперыі, Сігізмунда Мінэйку — удзельніка вайны за Крыт, ганаровага грамадзяніна Грэцыі і шмат іншых.

Распрацоўка праекта «Славутыя імёны Бацькаўшчыны» на навуковай аснове мае важнае значэнне ў адраджэнні і прапагандзе гістарычнай, культурнай і духоўнай спадчыны не толькі беларускага народа, а таксама іншых народаў, якія на працягу многіх стагоддзяў пражываюць на беларускіх землях: рускіх, палякаў, татар, яўрэяў і іншых.

Ужо падрыхтаваны і ў 1998 г. накіраваны ў навуковыя, вучэбныя, архіўныя ўстановы, рэспубліканскія і абласныя музеі і бібліятэкі для інфармацыі і абмеркавання сціслы даведнік біяграм каля 220 беларускіх дзеячаў культуры, навукі, палітыкі IX—XIX стагоддзяў па чатырох перыядах: ад IX да XIII ст., у перыяд Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага і іншых зямель, у перыяд Рэчы Паспалітай, падчас уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

Гэты матэрыял надрукаваны ў беларускай рэспубліканскай га-

зеце «Культура» за 23, 30 студзеня 1998 г., 6, 13, 27 лютага і 6 сакавіка 1999 г., падрыхтаваны неабходныя матэрыялы для ўнясення даведніка ў сістэму Інтэрнет. Вядзецца работа па прапагандзе матэрыялаў, змешчаных у даведніку, праз сродкі масавай інфармацыі.

Перад вамі, нашы шаноўныя чытачы, першы зборнік серыі нарысаў «Славутыя імёны Бацькаўшчыны». Рэдакцыйная калегія імкнулася скласці яго такім чынам, каб зборнік стаў не толькі навуковым даведнікам, які дапаможа ўдакладніць звесткі аб нашых славутых земляках, але і практычным дапаможнікам для выкладчыкаў і настаўнікаў у справе выхавання павагі да гісторыі свайго народа, яго спадчыны.

Таму ў зборніку ёсць біяграмы прадстаўнікоў розных эпох, дзяржаўных, палітычных, ваенных дзеячаў, прадстаўнікоў навукі, культуры, пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў. Некаторыя з гэтых гістарычных асоб, такія як Ефрасіння Полацкая, С.Будны, Ф.Скарына, В.Дунін-Марцінкевіч, Ф.Багушэвіч, М.К.Агінскі, Ст.Манюшка, Н.Орда, у пэўнай ступені ўжо вядомы.

Аднак большасць прадстаўленых у зборніку гістарычных асоб вядомы ў асноўным спецыялістам, а звесткі пра іх можна знайсці толькі ў энцыклапедычных даведніках. Гэта Я.Валовіч, Ф.Еўлашоўскі, М.Радзівіл, Г.Хадкевіч, Людвіка Радзівіл, Р.Сангушка, Я.Хадкевіч, І.Дамейка, М. і А.Ельскія, Е.Кавалеўскі, З.Мінейка, К.Падчашынскі, Ф.Стравінскі, Ж.Урублеўскі, І.Яркоўскі, М.Ястржэмбскі і іншыя.

Але галоўнае нават не ў тым, што іх жыццёвы шлях і вялікая стваральная праца мала вядомы сучаснікам.Галоўную ўвагу хацелася б звярнуць на тое, што гэтыя гістарычныя постаці раней разглядаліся як носьбіты польскай або рускай нацыянальнай гістарычнай спадчыны. Іх імёны небходна вярнуць беларускай гісторыі, зрабіць прыкладамі служэння сваёй Бацькаўшчыне, свайму народу.

Уладзімір Гілеп,
старшыня Беларускага фонду культуры

Ефрасіння (Прадслава) ПОЛАЦКАЯ *(1101—1167)*

Ефрасіння Полацкая (Еўфрасіння Полацкая, свецкае імя Прадслава), полацкая князёўна, беларуская святая (каля 1101 г., Полацк — 23 або 25.05.1167 г., Іерусалім).

Ефрасіння Полацкая нарадзілася ў Полацку каля 1101 года (не пазней 1104 года). Паходзіла з роду полацкіх князёў з дынастыі Рурыкавічаў па мужчынскай лініі і з дынастыі Рагвалода па жаночай лініі: была нашчадкам вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча, хрысціцеля Русі, і полацкай князёўны Рагнеды ад іх старэйшага сына Ізяслава, якому прыходзілася прапраўнучкай. Дзедам Прадславы быў славуты полацкі (а некалі і кіеўскі) князь Усяслаў Чарадзей, а бацькам — яго малодшы сын Святаслаў (хрысціянскае імя Георгій). Маці, Сафія, была дачкой кіеўскага князя Уладзіміра Манамаха. Блізкімі сваякамі Прадславы былі візантыйскія імператары, князі кіеўскія, тураўскія, пераяслаўскія, смаленскія, растова-суздальскія, уладзіміра-валынскія, каралі Венгрыі.

Звестак пра жыццё Ефрасінні Полацкай мала. Адзінай гістарычнай крыніцай, у якой распавядаецца пра жыццё полацкай князёўны, з'яўляецца «Жыціе святой і найпадобнейшай Еўфрасінні», створанае ў канцы XII ст. Да гэтай дакументальнай крыніцы далучаюцца звесткі з летапісаў гэтага перыяду.

У XII стагоддзі Полацкае княства, нягледзячы на амаль пастаянную палітычную барацьбу і нават войны з Кіеўскім княствам і яго саюзнікамі, заставалася самастойнай дзяржавай, хаця найбольшага ўздыму і росквіту яно дасянула ў XI ст. У XII ст. у складзе Полацкага княства ствара-

юцца ўдзельныя княствы, у тым ліку Віцебскае, Друцкае, Ізяслаўскае, Менскае, Лагожскае. Яны перадаюцца полацкім князем у валоданне сваім братам, сынам і пляменнікам, якія станавіліся васаламі вялікага князя полацкага. І хаця пэўнае адзінства княства яшчэ захоўвалася, але цэнтрабежныя сілы аслаблялі гэтае адзінства.

Ефрасіння Полацкая была сучасніцай палітычных падзей таго бурлівага веку. Ад самага маленства на княжацкім двары яна бачыла зборы ў вайсковыя паходы, была сведкай ваенных дзеянняў, якія суправаджаліся разбурэннем сёлаў і гарадоў, стратамі людзей не толькі ў баях, але і сярод мірнага насельніцтва.

На пачатку XII ст. полацкім князем быў яе дзядзька, Барыс Усяславіч (славянскае імя Рагвалод). Пасля няўдалага паходу гэтага князя на паўночны захад у зямлю зямгалаў у 1206 г. ён быў заменены полацкім вечам на брата Давыда. Давыд Усяславіч княжыў у Полацку ў 1106—1127 гадах. Яго змяніў Барыс Усяславіч, які вярнуўся на полацкі пасад, але ненадоўга. Ён памёр у 1128 годзе. Менавіта ў гэты час адбыўся напад кіеўскага князя Мсціслава Уладзіміравіча і яго саюзнікаў на Полацкую зямлю. Князі полацкай дынастыі ў 1129 г. былі высланыя ў Візантыю да імператара, сваяка кіеўскага і полацкіх князёў. Сярод высланых быў і бацька Ефрасінні князь Георгій. У Полацку князі мяняліся. У 1132 г. палачане выгналі з горада князя Святаполка Мсціславіча, сына Мсціслава, князя кіеўскага. На полацкі трон зноў былі пакліканы князі старажытнай полацкай дынастыі, якія вярнуліся з Візантыі. Полацкім князем у 1132 г. веча выбрала Васільку Святаславіча, роднага брата Ефрасінні Полацкай. Менавіта з гэтага часу полацкае веча набывае вялікую сілу і ўстойлівую традыцыю выбараў князя вечам — агульным сходам гараджан і сялян блізкіх ад Полацка вёсак. Каля 1144 г. полацкім князем становіцца Рагвалод (Васіль) Барысавіч, дваюрадны брат Ефрасінні. У 1151 г. полацкае веча выслала свайго князя ў Менск, а запрасіла на больш высокі трон менскага князя Расціслава Глебавіча, які таксама быў дваюрадным братам Ефрасінні. Пасля некалькіх гадоў княжання ў 1159 годзе зноў адбылася замена князя ў Полацку. Веча зноў выбрала полацкім князем Рагвалода Барысавіча, які вымушаны быў пакінуць трон у 1162 годзе, пасля паражэння, якое пацярпеў ад менскага князя Валадара Глебавіча. Полацкім князем стаў Усяслаў Васількавіч, родны пляменнік Ефрасінні Полацкай. У 1167 г. адбываецца новая змена на полацкім пасадзе. Менскі князь Валадар Глебавіч выступіў супраць Усяслава Васількавіча, нанёс паражэнне яго войску і заняў полацкі трон. Пры гэтым ён заключыў з полацкім вечам дагавор. Але гэты князь вымушаны быў адступіць назад у Менск, і ў тым жа годзе Усяслаў Васількавіч вярнуўся на полацкі трон.

Такім чынам, Ефрасіння Полацкая з самага маленства добра ведала

тагачасныя палітычныя ўмовы жыцця ў феадальным грамадстве, няўстойлівасць княжацкай улады, палітычныя камбінацыі і таксама сілу полацкага веча ў грамадскім жыцці свайго краю. У гэтай атмасферы яна гадавалася, і ўсе грамадскія падзеі ўплывалі на яе светапогляд. Разам з тым традыцыі полацкай княжацкай сям'і нашчадкаў Рагвалода, нейкая адасобленасць ад іншых членаў дынастыі Рурыкавічаў таксама ўплывалі на адчуванне свету, абуджалі ў князёўны не толькі цікавасць да мінуўшчыны Полацкай зямлі, але і патрыятычныя пачуцці, і княжацкую годнасць, і належнасць да сваёй зямлі крывічоў, да свайго вялікага па тэрыторыі княства.

Маленькая Прадслава была здольнай дзяўчынкай, мела ахвоту да вучэння, цікавілася рукапіснымі кнігамі, да якіх як князёўна мела доступ. Як гэта было ў той час, яе настаўнікамі былі духоўныя асобы, перш за ўсё манахі. Таму пераважна яна чытала Біблію, набажэнскія і іншыя духоўныя кнігі, жыціі святых, знаёмілася з манастырскімі статутамі. Пры княжацкім двары была і іншая літаратура: антычная гісторыя, схаластычнае апісанне прыроды, «Александрыя» і іншыя творы, якія былі распаўсюджаны ў Візантыі і ў княствах Русі. Для таго часу Прадслава атрымала вельмі добрую адукацыю. Як сведчыць «Жыціе Ефрасінні Полацкай»: «Так любіла вучэнне яна, што дзівіўся бацька яе з любові такой да навук. І па ўсіх гарадах разышлася слава пра яе мудрасць, і добрыя здольнасці да навук, і красу цялесную, бо была яна прыгожая надта абліччам».

Але ведала яна і пра жыццё гараджан-рамеснікаў і гандляроў, бачыла і народныя гулянні, ведала ад сваіх нянек народныя казкі, абрадавыя песні, замовы і заклёны.

Калі Прадславе споўнілася 12 гадоў (а гэта тады быў узрост, калі паводле кананічнага права, дзяўчына магла ўжо выходзіць замуж), да яе сталі засылаць сватоў князі. Бацькі вырашылі аддаць яе замуж за сына аднаго слаўнага і багатага князя, які прыслаў сватоў. Гэта адбылося дзесьці пасля 1113 года. Тады дзяўчына адмовілася ад дынастычнага шлюбу і вырашыла пайсці ў манастыр, дзе ігуменняй была яе цётка, удава князя Рамана Усяславіча.

Нягледзячы на ўгаворы бацькоў не пакідаць свецкае жыццё і выйсці замуж, Прадслава рашуча выказала сваё жаданне пайсці ў манастыр. І бацькі вымушаны былі ўрэшце даць сваю згоду на гэта.

Пастрыг Ефрасінні адбыўся таемна, і яна ўзяла гэтае хрысціянскае імя, ахвяруючы сябе Хрысту. Як лічыць даследчык «Жыція» А.Мельнікаў, прыняцце манашаскага сану найверагодней магло здарыцца 25 верасня, у дзень святой Ефрасінні Александрыйскай, пасля 1116 года (калі памёр князь Раман Усяславіч, а яго ўдава стала праз некаторы час ігуменняй). Праз некаторы час Ефрасіння папрасіла полацкага епіскапа

Іллю, каб ён дазволіў ёй жыць у саборнай царкве Святой Сафіі ў Полацку ў мураванай келлі. І ён дазволіў. Пасяліўшыся там, Ефрасіння пачала «пісаць кнігі сваімі рукамі, і прыбытак ад продажу іх аддавала тым, хто быў у нястачы».

Далей у «Жыціі найпадобнейшай Ефрасінні» гаворыцца пра сон, які тройчы бачыла Ефрасіння. Анёл узяў яе за руку і адвёў у Сяльцо, што знаходзілася непадалёку ад Полацка, дзе стаяў драўляны храм Святога Спаса. Тут ён сказаў Ефрасінні: «Тут належыць быць табе!» У тую ж ноч такі ж сон прысніўся і епіскапу Іллі, якому анёл паведаміў, што на Ефрасінні «спачывае Дух Святы».

Пасля гэтага прароцтва епіскап Ілля, запрасіўшы полацкага князя Барыса, яе бацьку Святаслава-Георгія, найпадобную Ефрасінню і знакамітых полацкіх баяраў, як сведкаў, перадаў Ефрасінні Сяльцо з царквой Святога Спаса. Тут найпадобная Ефрасіння і заснавала жаночы манастыр, яшчэ пры жыцці князя Барыса Усяславіча. Праз некаторы час пры царкве Багародзіцы Ефрасіння заснавала яшчэ адзін манастыр — мужчынскі. Статуты гэтых манастыроў напісала сама Ефрасіння. Пры полацкіх манастырах Ефрасіння заснавала скрыпторыі, майстэрні, у якіх перапісваліся кнігі.

Манаскі пастрыг Ефрасінні стаўся прыкладам для яе малодшай сястры Градславы (Гардзіславы), якая прыняла манаства да 1128 г. пад імем Еўдакіі, і для яе стрыечнай сястры Звеніславы Барысаўны (манаскае імя Еўпраксія) у 1128 г. Спачатку Ефрасіння папрасіла бацьку прыслаць да яе сястру для навучання граматы, а потым патаемна пастрыгла сястру ў манашкі, чым выклікала гнеў свайго бацькі, але потым з ім памірылася. Звеніслава ж прыйшла ў манастыр сама і зрабіла багаты ўклад, ахвяраваўшы манастыру свой пасаг. Сёстры былі з Ефрасінняй усё далейшае жыццё. З Еўпраксіяй Ефрасіння паехала пазней разам у Іерусалім, а Еўдакія засталася ў Полацку для кіравання жаночым манастыром Святога Спаса. Перад ад'ездам у Іерусалім Ефрасіння намовіла сваіх пляменніц, дачок брата Вячаслава — Вольгу і Кірыяну, таксама ўступіць у царкву і загадала пастрыгчы іх. Кірыяна была названа Агаф'яй, а Вольга — Яўфіміяй. Князь Вячаслаў спрабаваў угаварыць Ефрасінню не прымаць у манастыр дачок, але яго просьбы былі марныя. Ефрасіння ўладкавала, такім чынам, кіраванне манастыром, забяспечыўшы княскую апеку над ім.

Асветніцкая дзейнасць найпадобнейшай Ефрасінні была шматграннай. Адным з накірункаў яе дзейнасці было садзейніцтва пабудове храмаў. Па замове Ефрасінні вядомы полацкі дойлід Іаан, які быў манахам аднаго з полацкіх манастыроў, пабудаваў на месцы драўлянай царквы мураваны храм Святога Спаса. Пабудова храма адбылася за 30 тыдняў. Расійскі гісторык Леанід Аляксееў назваў будаўніцтва Спасаўскага сабора «найбуйнейшаю падзеяй у полацкай і ва ўсёй старажытнарускай

архітэктуры». У Спаскай царкве размяшчаліся келлі Ефрасінні і яе сястры Еўдакіі. Спаская царква была багата ўпрыгожана фрэскамі, якія маюць вялікую гістарычную і мастацкую каштоўнасць. Размешчаны на беразе Палаты, гэты храм пакідае і цяпер уражанне завершанасці і адпаведнасці ландшафту. Заканчэнне будаўніцтва і асвячэнне храма полацкім епіскапам было адзначана святкаваннем княжацкай сям'і, баяраў, гараджан і сялян навакольных сёлаў.

Ёсць меркаванне, што дойлід Іаан пры заснаваным Ефрасінняй мужчынскім манастыры пабудаваў таксама царкву святой Багародзіцы, для якой ігуменння выпрашыла набыць у Канстанцінопалі абраз Багародзіцы Эфескай. Ефрасіння паслала ў Канстанцінопаль да візантыйскага імператара Мануіла Комніна слугу свайго Міхаіла з каштоўнымі дарамі. Імператар выканаў просьбы сваячкі. З Іерусаліма быў дастаўлены абраз. Канстанцінопальскі патрыярх Лука ў прысутнасці епіскапаў блаславіў абраз святой Багародзіцы Эфескай у Сафійскім саборы Канстанцінопаля і перадаў яго Міхаілу, які даставіў абраз Адзігітрыі (Пуцяводнай) Полацкай, як яе сталі называць, у Полацк. Цяпер гэты абраз знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу ў фондах Рускага музея.

Па заказе Ефрасінні полацкім майстрам Лазарам Богшам у 1161 годзе быў зроблены настольны шасціканцовы крыж (даўжыня 51 сантыметр) для царквы Святога Спаса. Ён быў выраблены з кіпарысу. Да яго пярэдняй і адваротнай паверхняў прымацаваны залатыя, да бакавых сярэбраныя пласціны. Крыж быў аздоблены каштоўнымі каменнямі, упрыгожаны выявамі: на верхніх канцах крыжа размешчаны пагрудныя выявы Ісуса Хрыста, Іаана Прадцечы, маці Божай; у цэнтры ніжняга сяродкрыжжа — чатыры евангелісты; на канцах — архангелы Гаўрыіл і Міхаіл, унізе крыжа — выявы святых Ефрасінні, Софіі, Георгія (патронаў самой заказчыцы і яе бацькоў). У гістарычнай літаратуры ўсталявалася назва — крыж Ефрасінні Полацкай.

Заснаваныя Ефрасінняй Полацкай манастыры сталі асяродкам асветы ў Полацкім княстве. У іх знаходзіліся школы, дзе дзеці вучыліся чытанню, пісьму, «цыфры», царкоўным спевам і нотнай грамаце. У больш старэйшым узросце дзеці, акрамя царкоўнаславянскай мовы, вывучалі грэцкую мову, атрымлівалі звесткі з прыродазнаўства, медыцыны, рыторыкі і гісторыі, перш за ўсё гісторыі Полацкага княства. Да асветніцкай дзейнасці Ефрасінні Полацкай адносілася і адкрыццё бібліятэк са скрыпторыямі (дзе перапісваліся кнігі), іканапіснай і ювелірнай майстэрань. Ефрасіння Полацкая складала і запісвала малітвы і пропаведзі.

Сваёй культурна-асветніцкай дзейнасцю Ефрасіння Полацкая яшчэ ў пачатку нашай гісторыі, у яе полацкі перыяд, вызначыла важную ролю культуры ў жыцці народа і падала прыклад служэння ў галіне культу-

ры. Яе постаць паказала таксама плённую творчую працу ў служэнні інтарэсам грамадства. Ефрасіння Полацкая стала сімвалам духоўнага служэння сваёй Радзіме, невычарпальнай крыніцай маральнай сілы і духоўнага адраджэння народа.

Аўтарытэт Ефрасінні быў вельмі вялікі ў Полацкім княстве не толькі з-за яе асветніцкай дзейнасці, але і з-за яе высокага паходжання, згодна з тагачасным сярэдневечным статусам полацкага княжацкага роду нашчадкаў Рагвалода. З яе парадамі лічыліся полацкія князі і веча. Ефрасіння Полацкая лічылася справядлівай суддзёй у грамадскіх і маральных справах, была прыхільніцай міру ў сваім і суседніх княствах. Асабліва важкім было яе слова ў спрэчках паміж полацкімі князямі.

Менавіта ў адносна спакойныя для Полацкага княства гады ігуменння Ефрасіння Полацкая вырашыла здзейсніць духоўны чын — паломніцтва ў Святую Зямлю. Перадаўшы ігуменства малодшай сястры, на пачатку 1167 года, пасля дня Божага нараджэння, Ефрасіння Полацкая адправілася ў Іерусалім. Яе суправаджалі стрыечная сястра Еўпраксія і брат Давыд. Ефрасіння сустрэлася з візантыйскім імператарам Мануілам Комнінам. У Канстанцінопалі яна са сваімі спадарожнікамі наведала кафедральны сабор святой Сафіі і атрымала блаславенне ад патрыярха Лукі. У канцы красавіка 1167 года паломнікі былі ўжо ў Іерусаліме, які ў той час быў сталіцай Іерусалімскага каралеўства, заснаванага на пачатку XII ст. крыжакамі. Каралём Іерусаліма ў той час быў Амальрык I, з Анжуйскай дынастыі. Ефрасіння Полацкая была добра прынята ў Іерусаліме. Жыла ў манастыры Святой Багародзіцы. Яна часта малілася ля Труны Гасподняй. Знясіленая падарожжам, Ефрасіння захварэла. На дваццаць чацвёрты дзень хваробы Ефрасіння Полацкая прыняла прычасце і памерла (23 або 25 мая 1167 г.).

Ефрасіння Полацкая была пахавана ў манастыры святога Феадосія, непадалёку ад Іерусаліма. У 1187 г. Іерусалім быў захоплены войскамі егіпецкага султана Салах-эд-Дзіна, які за выкуп дазволіў хрысціянам пакінуць горад са сваімі рэліквіямі. Праваслаўныя манахі вывезлі з сабой раку з нятленнымі рэшткамі Ефрасінні. Мошчы Ефрасінні Полацкай у 1187 г. былі перапахаваны ў Феадосіевай пячоры Кіеўскага Пячорскага манастыра, у падземным храме Найсвяцейшае Багародзіцы.

Царкоўнае шанаванне Ефрасінні Полацкай пачалося яшчэ, верагодна, у канцы XII ст., пры епіскапе Дыянісіі. На Маскоўскай Русі Ефрасіння Полацкая стала шырока вядомая ў XVI ст., калі мітрапаліт маскоўскі Макарый уключыў яе «Жыціе» ў «Мінеі-чэцці». Ефрасіння Полацкая стала першай жанчынай, кананізаванай Рускай праваслаўнай царквой (1547 год). Ужо да таго часу быў шырока вядомы ў царкоўных колах гэты гістарычны помнік канца XII ст. У спісах XVII—XVIII стст. захаваліся царкоўныя спевы пра Ефрасінню Полацкую. У 1984 г. Ефрасіння Полац-

кая была прылічана да Сабора Беларускіх Святых. Яна прызнана святой апякункай Беларусі. Імя Ефрасінні Полацкай носяць цэрквы ў гарадах: Саўт-Рывер: (штат Нью-Джэрсі (ЗША) і Таронта (Канада). Беларускі праваслаўны прыход святой Ефрасінні Полацкай ёсць і ў Лондане. Ефрасіння Полацкая прызнана святой і каталіцкай царквой.

Жыхары Полацка хадайнічалі аб пераносе мошчаў нябеснай заступніцы Беларусі ў Полацк у пачатку панавання Аляксандра II. У 1864 г. пра гэта хадайнічаў і віленскі генерал-губернатар М.М.Мураўёў. Пасля трэцяга хадайніцтва полацкага епіскапа Савы ў 1871 г. з дазволу Свяцейшага Сінода на дзець памяці святой Ефрасінні Полацкай, 23 мая (старога стылю), у Спаскі манастыр была перанесена невялікая частка мошчаў — сярэдні палец правай рукі.

Просьбы аб пераносе мошчаў Ефрасінні Полацкай у яе родны горад паўтараліся і ў наступныя гады. Урэшце пасля рэвалюцыі 1905—1907 гадоў, калі ў Расійскай імперыі былі знятыя абмежаванні ў рэлігійным пытанні і калі ўлады ўжо не баяліся ўзрастання рэлігійнага «сепаратызму», Свяцейшы Сінод і імператар Мікалай II далі дазвол на перанос мошчаў найпадобнейшай Ефрасінні Полацкай у Полацк. На працягу красавіка—мая 1910 года рака з мошчамі Ефрасінні Полацкай была перавезена ў суправаджэнні флатыліі рачных судоў па Дняпры з Кіева да Оршы з прыпынкамі ў гарадах на шляху і з урачыстымі малебнамі. 23 мая 1910 г., у дзень яе памяці, мошчы святой Ефрасінні Полацкай былі перавезены ў Спаскі манастыр. У 1922 г. дамавіна з мошчамі святой Ефрасінні была ўскрытая, а мошчы былі адпраўленыя ў Маскву на атэістычную выставу, адтуль у Віцебск — у краязнаўчы музей для экспазіцыі. 23 кастрычніка 1943 г. мошчы Ефрасінні Полацкай былі ўрачыста перавезены ў Полацк, у храм Святога Спаса, дзе з таго часу і захоўваецца святыня.

У Беларусі з 1993 г. існуе Усебеларускі жаночы фонд святой Ефрасінні Полацкай, які ўзначальвае пісьменніца Валянціна Коўтун. Фонд святой Ефрасінні Полацкай з'яўляецца міжнароднай недзяржаўнай жаночай арганізацыяй, дзейнасць якой скіраваная на развіццё нацыянальнай культуры, навукі і асветы, умацаванне хрысціянскіх традыцый, а таксама на абарону правоў жанчын, асабліва творчых прафесій.

У беларускай савецкай гістарычнай навуцы да другой паловы 80-х гадоў імя Ефрасінні Полацкай альбо зусім не згадвалася (гл. Гісторыю Беларускай ССР, том 1, 1972), альбо да яе гісторыкі ставіліся адмоўна як прадстаўніцы княжацкай дынастыі, ігуменні ды яшчэ і святой. Асаблівай крытыцы падвяргалі партыйныя кіраўнікі і прапагандысты ў пачатку 30-х гадоў тых беларускіх гісторыкаў, хто згадваў Ефрасінню Полацкую, таксама як і Францішка Скарыну, якога чамусьці называлі «каталіцкім манахам». Толькі ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі

(том 4, 1971) з'явіўся невялікі артыкул Ул.Калесніка пра асветніцу перыяду Кіеўскай Русі ды былі выдадзены матэрыялы ў хрэстаматыі па старажытнай беларускай дакастрычніцкай літаратуры (том 1, Мінск, 1968).

За апошнія гады беларускія пісьменнікі прысвяцілі нямала твораў гістарычнай постаці Ефрасінні Полацкай. Пісьменніца Вольга Іпатава выдала гістарычную аповесць «Прадслава». Вобраз Ефрасінні Полацкай ёсць і ў рамане Таісы Бондар «Спакуса». Вершы, паэмы, апавяданні, прысвечаныя Ефрасінні Полацкай і яе сучаснікам, напісалі Ларыса Геніюш, Наталля Арсеннева, Рыгор Барадулін, Алесь Разанаў, Генадзь Бураўкін і іншыя. Рэжысёр кінастудыі «Летапіс» Вольга Моракава зняла ў 1989 годзе фільм «Еўфрасіння Полацкая». Беларускія мастакі таксама прысвяцілі нямала сваіх твораў вобразу Ефрасінні Полацкай.

Літаратура:

1. Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Ефрасінні, ігуменні манастыра святога Спаса. // Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994.

2. Тыртов А. Некоторые пояснения к описанию жития преподобной Ефросинии, княжны Полоцкой. Витебск, 1893.

3. Титов Ф. Преподобная Ефросиния, княжна Полоцкая. // Труды Киевской духовной академии 1910. Кн. 4.

4. Гарошка Л. Святая Ефрасіння-Прадслава Полацкая, патронка Беларусі. Парыж, 1950.

5. Арлоў У. Асветніца з роду Усяслава; Ефрасіння Полацкая. Мн., 1989.

6. Яго ж. Таямніцы полацкай гісторыі. Мн., 1994.

7. Яго ж. Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны. Гісторыя Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай. Мн., 1998.

8. Мельников А.А. Путь непечален: Исторические свидетельства о святости Белой Руси. Мн., 1992.

9. Мельнікаў А. «Жыціе» і жыццё Еўфрасінні, ігуменні Полацкай. // Адраджэнне: Гістарычны альманах. Вып. 1. Мн., 1995.

Анатоль Грыцкевіч

Мікалай РАДЗІВІЛ (Чорны)

(1515—1565)



Радзівіл Мікалай, мянушка Чорны (4 студзеня 1515 г., Нясвіж — 29 мая 1565 г., Лукішкі, тады ля горада Вільні), гербу Трубы. Адзін з найвыдатнейшых дзеячаў Беларуска-Літоўскай дзяржавы XVI стагоддзя. Мянушку Чорны Мікалай Радзівіл атрымаў пазней з-за колеру сваёй барады, чым адрозніваўся ад свайго стрыечнага брата, гетмана вялікага Мікалая Радзівіла Рудога (мянушка таксама з-за колеру барады).

Мікалай Радзівіл Чорны паходзіў са старажытнага роду ў Беларусі і Літве, які ўжо ў XVI ст. заняў, бадай, першае месца сярод магнацкіх радоў Вялікага княства Літоўскага па магутнасці, колькасці маёнткаў і палітычным уплыве. Сам Мікалай Радзівіл прычыніўся да ўзвышэння гэтага роду. Ён быў унукам Мікалая Старога (які памёр у 1509 годзе), ад якога пайшлі тры галоўныя галіны роду Радзівілаў: старэйшая (на Ганёндзу і Мэдэлях, у Падляшшы) — ад Мікалая (памёр у 1522 г.), сярэдняя (у Нясвіжы і Альцы) — ад Яна Мікалая і малодшая (на Біржах і Дубінках) — ад Юрыя (памёр у 1541 г.). Мікалай Радзівіл Чорны належаў да сярэдняй галіны роду.

Мікалай Радзівіл Чорны быў старэйшым сынам Яна Мікалая Радзівіла Барадатага (1474—1522), маршалка земскага, потым кашталяна троцкага, і яго трэцяй жонкі, Ганны Кішчанкі (дачкі Станіслава Кішкі, гетмана і маршалка земскага), якая памерла ў 1533 г. Пасля смерці мужа Ганна Кішчанка-Радзівілова выйшла замуж другі раз, за Станіслава Кежгайлу, старосту жамойцкага. Паколькі маці была ў другім шлюбе, апякуном Мікалая Радзівіла, яго брата Яна і іх сястры стаўся іх родны

дзядзька Юрый Радзівіл, гетман надворны і кашталян троцкі, вядомы палкаводзец, удзельнік бітвы пад Оршай 1514 года. Паводле рашэння караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога ў 1529 г. Мікалай Радзівіл разам з братам Янам і сястрой Ганнай быў узяты для выхавання на каралеўскі двор у Кракаў. Кіраванне бацькоўскімі маёнткамі вялікі князь Жыгімонт Стары прысудзіў Юрыю Радзівілу да паўналецця Мікалая і Яна Радзівілаў. Дагэтуль Мікалай Радзівіл атрымаў хатнюю адукацыю; цяпер ён выхоўваўся пры двары караля. Потым ён сам прызнаваўся, што недасканала ведаў міжнародную мову тагачаснай Еўропы — лацінскую, але добра ведаў і гаварыў на беларускай і польскай мовах.

Мікалай Радзівіл Чорны належаў да старадаўняга арыстакратычнага роду Радзівілаў, што давала яму магчымасць, абапіраючыся на багацце сям'і, буйныя маёнткі, сямейныя сувязі, даволі хутка прадэманстраваць свой талент дзяржаўнага дзеяча, які адстойваў незалежнасць Беларуска-Літоўскай дзяржавы ў складаных абставінах таго часу.

Радзівілы ўжо ў XVI ст. у сваіх уладаннях трымаліся як удзельныя князі. У радаводзе да аднолькавых імёнаў дадавалі парадкавыя нумары і мянушкі, як у пануючых еўрапейскіх дынастыях. Мікалай Радзівіл Чорны называўся ў родавых дакументах Мікалаем IV, а яго малодшы брат Ян (1516—1551), крайчы літоўскі, — Янам III. Бацька іх лічыўся Янам I.

Ад бацькі Мікалай Радзівіл атрымаў багатыя маёнткі: Жмуйткі, Дусяты, Свядосць і Бігушкі ў Вілкамірскім павеце, Мусьнікі і Воздгілішкі ў Віленскім павеце, Лукішкі ля самога горада Вільні (цяпер у цэнтры Вільні Лукішскі пляц), Здзітаў у Слонімскім павеце, Нягневічы ў Наваградскім павеце. Ад маці Мікалай Радзівіл атрымаў Геранёны ў Ашмянскім павеце, Нясвіж і Лахву ў Наваградскім павеце, Узду, Шацк і Дуброву ў Менскім павеце, а на Валыні — багатыя маёнткі з цэнтрам у горадзе Алыка. Разам з братам Янам Мікалай Радзівіл у 1534—1535 гг. выставіў са сваіх маёнткаў на вайну 160 коннікаў. Паводле ўставы аб земскай вайсковай службе, кожны феадал павінен быў выставіць у паход аднаго конніка з 8 службаў сялян (у кожнай службе па 3 сялянскіх «дымы», двары). Такім чынам, юныя браты Радзівілы мелі не менш за 3840 сялянскіх гаспадарак у сваіх маёнтках. Брат Мікалая Радзівіла Чорнага Ян памёр бяздзетным, і яго частка спадчыны засталася ў Мікалая Чорнага.

Мікалай Радзівіл Чорны набываў і атрымоўваў новыя маёнткі. У склад вялікіх латыфундый Мікалая Радзівіла Чорнага ўваходзілі гарады, мястэчкі і сотні вёсак. Сталіцай сваіх уладанняў ён зрабіў Нясвіж, які быў сталай сталіцай Радзівілаў на працягу некалькіх стагоддзяў. Неўзабаве пасля смерці Мікалая Чорнага ў попісу (перапісу) войска Вя-

лікага княства Літоўскага 1567 г. сярод атрадаў буйных паноў яго старэйшы сын Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка адзначаны першым. Ён выставіў у войска «з усіх іменей» ужо 539 коннікаў і 386 пехацінцаў, такім чынам, колькасць сялянскіх гаспадарак за гэты час у галоўнага прадстаўніка лініі нясвіжскіх Радзівілаў павялічылася больш чым у пяць разоў.

Мікалай Радзівіл Чорны на чале свайго атрада ў 160 коннікаў прыняў удзел у вайсковай кампаніі 1535 г. падчас вайны паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім княствам Літоўскім. Тады яго дзядзька, ужо гетман вялікі Юрый Мікалаевіч Радзівіл камандаваў войскам. Беларуска-літоўскае войска ўлетку 1535 г. заняло Гомель, жыхары якога самі адчынілі брамы Ю.Радзівілу. Потым Ю.Радзівіл штурмам узяў Старадуб. У гэтых баях удзельнічалі і коннікі М.Радзівіла. Аднак вайсковай кар'еры Мікалай Радзівіл не зрабіў, аддаючы перавагу палітычнай, дыпламатычнай і дзяржаўнай дзейнасці.

Мікалай Радзівіл Чорны зрабіў хуткую і бліскучую кар'еру не толькі з-за сваіх здольнасцей, але больш з-за сяброўства з маладым каралевічам і вялікім князем Жыгімонтам Аўгустам, які ў 1529 г. быў фармальна ўжо абраны і на польскі, і на беларуска-літоўскі трон пры жыцці бацькі Жыгімонта Старога. На Берасцейскім сойме паноў рады восенню 1544 г. Мікалай Радзівіл вёў моцную агітацыю за перадачу рэальнай улады маладому вялікаму князю ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве, куды стары вялікі князь ужо даўно не прыязджаў. Жыгімонт Аўгуст фактычна пачаў сваё панаванне ў Вільні. На гэтым жа сойме паноў рады вялікі князь аддзячыў Радзівілу, надаўшы яму пасаду маршалка земскага, і Мікалай Чорны, такім чынам, узначаліў раду паноў, вышэйшы кіруючы орган дзяржавы. Праз два гады Жыгімонт Аўгуст за заслугі перадаў М.Радзівілу «ў дзяржаву» Шавельскае староства ў Жэмайціі. Яшчэ большы ўплыў на дзяржаўныя справы атрымаў Мікалай Чорны, калі Жыгімонт Аўгуст, закахаўшыся ў стрыечную сястру М.Радзівіла, Барбару Радзівіл, уступіў з ёю ў патаемны шлюб. Радзівіл Чорны разам з родным братам Барбары, Мікалаем Радзівілам Рудым, спрыяў гэтаму шлюбу.

Як маршалак земскі Мікалай Радзівіл Чорны ўзначальваў раду паноў Вялікага княства Літоўскага і соймы дзяржавы. Мікалай Радзівіл Чорны ўвайшоў у склад сціслага атачэння Жыгімонта Аўгуста і цесна супрацоўнічаў з ім. Ён удзельнічаў у вызначэнні палітыкі дзяржавы, знешняй і ўнутранай. Гэта палітыка была скіраваная на ўмацаванне дзяржаўнай улады. Вышэйшыя пасады ў дзяржаве займаў і родны брат Барбары, Мікалай Радзівіл Руды. У 1549 г. ён атрымаў пасаду ваяводы троцкага, у 1553 г. гетмана вялікага літоўскага і ў 1566 г. дадаткова віленскага ваяводы і канцлера. Абодва Радзівілы ўмацавалі сваё дзяржаўнае становішча, калі Жыгімонт Стары памёр у 1548 г. і Жыгімонт Аўгуст стаўся

паўнапраўным каралём польскім і вялікім князем літоўскім.

Крыху пазней, у 1558 г., кароль і вялікі князь Жыгімонт Аўгуст адда Мікалаю Радзівілу Чорнаму маёнткі, якія засталіся пасля смерці каралевы Боны (маткі Жыгімонта Аўгуста), — Клецкае і Давыд-Гарадзецкае княствы, што яшчэ больш умацавала яго становішча ў дзяржаве. Акрамя таго, Мікалай Радзівіл Чорны быў пажыццёва старостам берасцейскім, ковенскім, барысаўскім і шавельскім.

У другой палове 1547 г. Мікалай Радзівіл Чорны быў накіраваны ў Вену на перамовы з Габсбургамі. Акрамя дзяржаўных, Радзівіл займаўся і прыватнымі справамі. У снежні 1547 г. імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Карл У надаў Мікалаю Радзівілу Чорнаму і яго брату Яну тытул князя на Альщы і Нясвіжы, а Мікалаю Радзівілу Рудому — князя на Біржах і Дубінках. Гэта яшчэ больш узмацніла аўтарытэт Радзівілаў у Беларуска-Літоўскай дзяржаве і за мяжой. У гэты ж час Мікалай Радзівіл устанавіў цесныя кантакты з герцагам прускім Альбрэхтам.

12 лютага 1548 г. Радзівіл ажаніўся з Эльжбетай Шыдлавецкай, прадстаўніцай польскага арыстакратычнага роду. Яе сястра была замужам за ўплывовым польскім магнатам Янам Тарноўскім, гетманам вялікім каронным (польскім) і кашталянам кракаўскім, для якога ён напярэдадні дабіўся ў германскага імператара тытула графа. Тым самым М.Радзівіл зблізіўся з апазіцыяй каралеве Боне ў Польшчы. Адначасова Мікалай Радзівіл Чорны атрымаў у пасаг жонкі і Шыдлавецкі маёнтак (у Сандамірскім ваяводстве).

Яшчэ больш узмацніліся пазіцыі Мікалая Радзівіла Чорнага пасля смерці Жыгімонта Старога (у красавіку 1548 г.). Цяпер яго бліжэйшы сябра Жыгімонт Аўгуст стаўся паўнаўладным каралём польскім і вялікім князем літоўскім і рускім. Але адразу Мікалаю Радзівілу прыйшлося пачаць барацьбу з апазіцыяй маладому каралю ў Польшчы, дзе ваявода кракаўскі Пётр Кміта і ваявода сандамірскі Ян Тэнчынскі сарвалі каранацыю каралеўскаю каронаю Барбары Радзівіл. Аднак Жыгімонт Аўгуст дамогся афіцыйнага прызнання яго шлюбу з Барбарай, пагражаючы адрачэннем ад трона ў Польшчы і заключыўшы саюз з Габсбургамі. Каранацыя Барбары адбылася пазней, 5 снежня 1550 г., калі Мікалай Радзівіл Чорны (дарэчы, ён быў не ў найлепшых адносінах са стрыечнай сястрой) вымусіў апазіцыю ў Польшчы пагадзіцца з пануючым становішчам Радзівілаў не толькі ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве, але і з іх моцнымі ўплывамі ў Польшчы, дзе Мікалай Радзівіл меў цяпер таксама маёнткі.

Адначасова Мікалай Чорны фактычна стаўся кіраўніком Беларуска-Літоўскай дзяржавы, якому перадаў уладу вялікі князь Жыгімонт Аўгуст, бо знаходзіўся амаль увесь час у Польшчы. 26 снежня 1550 г. Мікалай Радзівіл Чорны атрымаў пасаду канцлера вялікага літоўскага з захаваннем яму пасады маршалка земскага. Тады ж ён атрымаў і Бары-

саўскае староства. Неўзабаве, 8 мая 1551 г., памерла каралева і вялікая княгіня Барбара (была пахавана ў Віленскім кафедральным саборы). Пасля смерці каралевы 11 чэрвеня 1551 г. Мікалай Чорны атрымаў ад вялікага князя пасаду віленскага ваяводы (першы ваяводскі тытул у дзяржаве). Пры гэтым пасады вялікага канцлера і маршалка земскага засталіся ў яго. Такім чынам, у руках Мікалая Радзівіла Чорнага была цяпер сканцэнтравана вялікая ўлада. А калі дадаць, што яго стрыечны брат Мікалай Руды быў гетманам вялікім і ваяводам троцкім (другая ваяводская пасада ў дзяржаве), то можна зрабіць выснову, што пэўны час Радзівілы фактычна кіравалі Вялікім княствам Літоўскім. У знешняй палітыцы Мікалай Чорны шмат дамогся дзеля захавання незалежнасці Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

Восенню 1549 г. Жыгімонт Аўгуст накіраваў Мікалая Радзівіла на Валынь для адпору крымскім татарам, якія рабілі набегі на Украіну. Беларуска-Літоўскае войска ачысціла Валынь ад татараў. У снежні 1549 г. вялікі князь Жыгімонт Аўгуст надаў Мікалаю Чорнаму тытул гетмана, але М.Радзівіл прызначэння не прыняў, слушна лічачы, што гэта перашкодзіць яго дзейнасці ў вышэйшым кіраўніцтве дзяржавы.

Ужо на пачатку 50-х гадоў XVI ст. абодва Радзівілы — і Чорны, і Руды — распачалі барацьбу супраць тых магнатаў і шляхты, якія намагаліся заключыць больш цесны саюз з Польшчай, каб пашырыць свае палітычныя правы па ўзоры польскай шляхты. Мікалай Радзівіл Чорны праводзіў цвёрдую палітыку ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Ужо восенню 1551 г. на сойме ў Вільні Мікалай Радзівіл рашуча выступіў супраць перамоў з польскай дэлегацыяй аб дзяржаўнай уніі Вялікага княства Літоўскага і Рускага з Польшчай. На гэтым этапе польска-беларускіх дачыненняў яго падтрымліваў сам Жыгімонт Аўгуст. Вялікі князь у сваім прывілеі гарантаваў Беларуска-Літоўскай дзяржаве самастойнасць. У бліжэйшыя два гады Мікалай Чорны шмат займаўся пытаннямі знешняй палітыкі на соймах дзяржаў і падчас сустрэч з іншаземнымі манархамі.

Падарожжа Мікалая Радзівіла ў Вену ў першай палове 1553 г. і перамовы з габсбургскім дваром спрычыніліся да спынення падтрымкі Германскай імперыяй маскоўскага цара Івана IV. Мікалай Радзівіл Чорны пераканаў германа-аўстрыйскі двор, што заключэнне габсбургска-маскоўскага саюзу, скіраванага супраць Беларуска-Літоўскай дзяржавы і Польшчы, — справа марная. Так быў прадухілены саюз паміж Германскай імперыяй і Маскоўскім царствам, якое пагражала ўсходнім межам Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Наадварот, быў заключаны саюз з рымскім каралём Фердынандам (братам і спадчыннікам германскага імператара Карла V), які кіраваў аўстрыйскімі землямі Габсбургаў. Саюз быў умацаваны дамовай аб шлюбе ўдаўца Жыгімонта Аўгуста з дачкой

Фердынанда (потым ён стаў імператарам) — Кацярынай. Сам Мікалай Радзівіл Чорны атрымаў у дадатак тытул графа на Шыдлоўцу (у Польшчы), які захаваўся ў родзе Радзівілаў разам з княжацкім тытулам. Саюз з Германскай імперыяй захоўваўся на працягу наступных двух дзесяцігоддзяў, што потым аблегчыла Вялікаму княству Літоўскаму і Польшчы вядзенне Лівонскай вайны.

На сойме Беларуска-Літоўскай дзяржавы ў Вільні ў канцы 1554—пачатку 1555 г., дзякуючы ініцыятыве Радзівіла, была забяспечана дапамога польскага войска ў выпадку нападу Маскоўскай дзяржавы на Беларусь. У Швецыю з мэтай саюза на выпадак вайны на ўсходзе было накіравана пасольства. Разам з тым, як вопытны дзяржаўны дзеяч, Мікалай Радзівіл не парываў адносін з Масквою. У 1555 г. з царом Іванам IV было заключана 6-гадовае перамір'е, да 22 лютага 1562 года.

Шматгранная дзейнасць Мікалая Радзівіла праявілася ў правядзенні аграрнай рэформы ў гаспадарскіх (дзяржаўных) маёнтках. Радзівіл стаяў на чале камісіі па падрыхтоўцы рэформы. У склад гэтай камісіі ўваходзілі таксама маршалак дворны і пісар Вялікага княства Літоўскага Астафій Валовіч і Пётр Хвальчэўскі. Камісія падрыхтавала «Уставу на валокі», апублікаваную Жыгімонтам Аўгустам у 1557 г. Гэта быў заканадаўчы акт, паводле якога праводзілася валочная памера. У заходніх і цэнтральных раёнах Беларусі (ці, як тады назвалася гэтая тэрыторыя , у Літве) зямля была абмерана на стандартныя ўчасткі — валокі (валока — 21,37 гектара). Зямля ў карыстанні сялян пераразмяркоўвалася такім чынам, каб кожная сялянская сям'я атрымала па адной валоцы. Такім чынам, валока станавілася не толькі гаспадарчай адзінкай плошчы, але і фінансава-падаткавай для адной сялянскай сям'і. Валокі цяпер замянілі «службы» ці іншыя адзінкі, у якіх працавала па некалькі сялянскіх сем'яў, а зямля была часта ўвогуле неабмежаванай.

Адначасова ствараліся фальваркі — панскія гаспадаркі з палямі, якія мусілі апрацоўваць цяглыя сяляне: кожны селянін, гаспадар двара, абавязаны быў адпрацаваць два дні на тыдні на панскім полі. Яны выконвалі і іншыя павіннасці — натуральныя і грашовыя. Частка сялян (асадныя сяляне) выплачвала 30 грошаў з валокі ў год. Гэтая рэформа фактычна ўнармавала феадальныя павіннасці. Услед за вялікім князем і іншыя паны і шляхта праводзілі ў сваіх маёнтках такую ж рэформу, якая да таго ж замацавала і трохпольную сістэму земляробства. Зямельная рэформа змяніла і знешні выгляд беларускай вёскі на захадзе і ў цэнтры краіны. Вёскі станавіліся больш буйнымі, чым раней, з своеасаблівым выглядам: з адной вуліцай, на адным баку якой былі хаты, на другім — гаспадарчыя збудаванні. На валокі былі перамераны прыгарадныя землі гарадоў і мястэчак. Рэформа дала дзяржаўнаму скарбу дадатковыя фінансавыя сродкі. Сяляне былі вымушаны звязвацца з рын-

кам. Пашыралася грашовае абарачэнне. Сялянская абшчына ў большай частцы Беларусі была ліквідавана, бо сяляне атрымлівалі ў спадчыну ў сваё карыстанне валокі і выконвалі грашовыя і іншыя павіннасці паасобку, а не вёскай, абшчынай.

Пачынаючы з 1556 г. Мікалай Радзівіл Чорны некалькі гадоў займаўся прыбалтыйскай праблемай. Мэтай палітыкі Беларуска-Літоўскай дзяржавы ў гэты час было далучэнне Лівоніі да яе. У Лівоніі (на тэрыторыі цяперашніх Латвіі і Эстоніі) існаваў архаічны лад канфедэрацыі Лівонскага ордэна, трох біскупстваў і горада Рыгі, падпарадкаванага рыжскаму арцыбіскупу. Палітыка далучэння Лівоніі да Вялікага княства Літоўскага праводзілася асцярожна, каб не выклікаць вайну з Іванам IV. У верасні 1557 г. была падпісана дамова з лівонскім магістрам В.Фюрстэнбергам аб узаемнай абароне ад Расіі. За гэты поспех Жыгімонт Аўгуст у 1558 г. перадаў Радзівілу Ковенскае староства.

На пачатку 1558 г. Іван IV пачаў Лівонскую вайну, каб захапіць Лівонію і ўключыць яе ў склад Расіі. Аднак лёгка захапіць Прыбалтыку яму не ўдалося. Вайна доўжылася для Расіі 25 гадоў і нанесла яе эканоміцы вялікія страты. У пачатку Лівонскай вайны Мікалай Радзівіл Чорны адмовіўся ад прапановы цара заключыць саюз супраць Крымскага ханства, бо бачыў, што цар хоча адцягнуць увагу кіраўнікоў Вялікага княства Літоўскага ад Лівоніі, каб самому заваяваць яе. Па прапанове М.Радзівіла Чорнага паны рада ў Вільні вырашыла заключыць больш цесны дзяржаўны саюз з Лівоніяй. У жніўні 1559 г. на сойме ў Вільні быў заключаны дагавор, паводле якога Лівонскі ордэн з усімі яго тэрыторыямі станавіўся пратэктаратам Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Латгалія (паўднёва-ўсходняя частка Латвіі) была занята войскам Вялікага княства Літоўскага. Да дагавора далучыўся і рыжскі арцыбіскуп. Спадзеючыся дамовіцца з царом мірным шляхам, Радзівіл накіраваў пасольства ў Маскву, але цар Іван IV патрабаваў уступіць яму яшчэ не заваяваную Лівонію цалкам. Дарэчы, Іван IV заўсёды ў перамовах выстаўляў нерэальныя, максімалісцкія ўмовы аддаць яму ўсю Прыбалтыку, Беларусь і Украіну: «эти земли испокон наши».

У выніку новых удараў расійскіх войскаў у 1561 г. Лівонскі ордэн распаўся. 28 лістапада 1561 г. апошні магістр Г.Кетлер абвясціў секулярызацыю ордэна. У гэты ж дзень у Вільні быў падпісаны акт аб падпарадкаванні Лівоніі сумесна Вялікаму княству Літоўскаму і Польшчы. Г.Кетлер станавіўся герцагам Курляндыі, васалам Жыгімонта Аўгуста. Цяпер Беларуска-Літоўская дзяржава пачала вайну за гэтую аўтаномную тэрыторыю. Радзівіл быў прызначаны адміністратарам Лівоніі. У гэты час уплыў М.Радзівіла ўзмацніўся яшчэ больш. У 1561 г. па даручэнні вялікага князя Жыгімонта Аўгуста, падчас чарговага ад'езду яго з Вільні ў Польшчу, Радзівіл Чорны быў абвешчаны намеснікам вялікага

князя ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве з правам прызначаць чыноўнікаў і саноўнікаў на вышэйшыя пасады.

Ужо вясной 1562 г. расійскія войскі ўварваліся на тэрыторыю Беларусі, разрабаваўшы ваколіцы Віцебска, Оршы і Шклова і знішчыўшы там насельніцтва. Кульмінацыяй перамог Івана Грознага было ўзяцце яго войскам Полацка ў лютым 1563 г. (на 16 гадоў). Здзекі, гвалт і забойствы пры гэтым далі яму на Беларусі мянушку «Жахлівы».

Вайна з Маскоўскай дзяржавай значна змяніла становішча Беларуска-Літоўскага гаспадарства. У сувязі з пагрозай незалежнасці нашай дзяржавы беларуская шляхта на палявым сойме пад Віцебскам у верасні 1562 г. прапанавала праект новай дзяржаўнай уніі з Польшчай. Польская шляхта і магнаты таксама намагаліся заключыць унію са сваімі мэтамі пашырэння тэрыторыі на Украіне і інкарпарацыі беларусіх і літоўскіх зямель. Сам Жыгімонт Аўгуст, які не меў нашчадкаў і баяўся, што пасля яго смерці саюз паміж Польшчай і Беларуска-Літоўскай дзяржавай распадзецца, таксама схіляўся да дзяржаўнай уніі Польшчы і Літвы.

Мікалай Радзівіл Чорны ў першай палове 60-х гадоў XVI ст. у неспрыяльных умовах для Беларусі рабіў усё магчымае, каб захаваць самастойнасць, незалежнасць і суверэнітэт Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Дзякуючы яго настойлівасці на соймах дзяржаўную унію з Польшчай удалося адцягнуць на некалькі гадоў. Люблінская унія была заключана ў 1569 г., ужо пасля яго смерці.

Аднак Мікалай Радзівіл быў палітыкам-рэалістам. Абараняючы незалежнасць дзяржавы, ён разумеў, што трэба даць беларускай і літоўскай шляхце больш самастойнасці ў самакіраванні, правы, якія ўжо мела польская шляхта. Таму ён згадзіўся з Жыгімонтам Аўгустам, што неабходна правесці судова-адміністрацыйную рэформу для захавання грамадскага адзінства падчас вайны з Іванам Грозным. Менавіта яго намаганнямі была праведзена судова-адміністрацыйная рэформа. 1 ліпеня 1564 г. быў выдадзены Бельскі прывілей, у якім абвяшчалася аб утварэнні шляхецкіх саслоўных судоў і аб аддзяленні гэтых судовых органаў ад вялікакняжацкай адміністрацыі на месцах. Шляхта фактычна і фармальна выходзіла з падпарадкавання магнатам і вышэйшым саноўнікам, улада якіх абмяжоўвалася. Потым была праведзена павятовая рэформа і створаны органы мясцовага самакіравання — павятовыя соймікі. Мікалай Радзівіл Чорны ўдзельнічаў і ў падрыхтоўцы Статута Вялікага княства Літоўскага 1566 г. Пад яго наглядам з 1551 г. працавала Статутная камісія, якая распрацоўвала юрыдычныя нормы і лепш сістэматызавала матэрыял у параўнанні з тэкстам Статута 1529 г. Статут 1566 года быў зацверджаны прывілеем Жыгімонта Аўгуста 11 сакавіка 1566 года, ужо пасля смерці Мікалая Чорнага. У тэкст II Статута ўвайшлі ўсе тыя новаўвядзенні, якія былі зроблены ў выніку адміністрацыйна-судовых рэ-

формаў 60-х гадоў XVI стагоддзя. Грамадскае жыццё ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве будавалася па юрыдычных прынцыпах нацыянальнага права. Страта прывілеяў магнатаў і абмежаванне ўлады вялікага князя прывялі да кансалідацыі феадальнага саслоўя ў краіне. А гэта дало магчымасць дзяржаве выстаяць у цяжкія гады Лівонскай вайны. Прадбачлівасць Радзівіла праявілася і тут.

І яшчэ адна старонка дзейнасці Мікалая Радзівіла Чорнага: ён узначальваў рэфармацыйны рух у Беларуска-Літоўскай дзяржаве падчас крызісу каталіцкага касцёлу ў Заходняй Еўропе і праваслаўнай царквы на ўсходзе. На пачатку 50-х гадоў XVI ст. М.Радзівіл Чорны далучыўся да лютэранскай царквы, а ўжо праз два гады перайшоў у больш радыкальную плынь пратэстанцтва — кальвінізм (рэфармацтва). Пры ім Нясвіж становіцца сталіцай пратэстантызму ў Беларусі і Літве. Сам М.Радзівіл перапісваўся з галоўнымі дзеячамі кальвінісцкай царквы, уключна з Ж.Кальвінам.

У канцы свайго жыцця Мікалай Радзівіл спрыяў распаўсюджванню ў сваіх маёнтках поглядаў антытрынітарыяў, але ў апошні год жыцця, у 1564—1565 гг., пачаў выдаляць антытрынітарскіх прапаведнікаў са сваіх валоданняў.

Радзівіл выдаткоўваў шмат грошай для падтрымкі пратэстанцкіх суполак у Беларусі і Літве, у якія ўваходзілі шляхта і мяшчане, арганізоўваў зборы (дамы для малітвы) і школы. М.Радзівіл быў адным з першых магнатаў-мецэнатаў на Беларусі. Першым кальвінісцкім зборам стаўся збор у Берасці, дзе М.Радзівіл быў старостам. У сваіх маёнтках М.Радзівіл Чорны замяняў касцёлы і цэрквы на кальвінісцкія зборы. Такія зборы з'явіліся ў Нясвіжы (1554 г.), Клецку, Алыцы. У 1557 г. быў адчынены першы збор у Вільні, які спачатку быў у прыгарадным маёнтку М.Радзівіла Лукішках. Першы з'езд пратэстанцкіх суполак у Вялікім княстве Літоўскім пад кіраўніцтвам Мікалая Радзівіла Чорнага адбыўся ў Вільні ў 1557 г. Гэта быў устаноўчы з'езд (кангрэгацыя), на якім прысутнічалі прапаведнікі і прадстаўнікі ад шляхты і мяшчан. Потым, з 1560 г., такія з'езды (сіноды) становяцца выключна евангелісцка-рэфармацкімі (кальвінісцкімі), без прадстаўнікоў іншых плыняў Рэфармацыі. Пры садзейнічанні Мікалая Радзівіла Чорнага ў Берасці, у заснаванай ім друкарні ў 1563 г. была выдадзена адна з першых кніг на Беларусі — берасцейская Біблія (інакш радзівілаўская Біблія). Мікалай Радзівіл заснаваў друкарню і ў Нясвіжы, у якой працаваў друкар М.Кавячынскі. Тут у 1562—1571 гг. друкавалі кнігі вялікія беларускія асветнікі Сымон Будны і Васіль Цяпінскі.

У 1562 г. у нясвіжскай друкарні на беларускай мове кірыліцай былі выдадзены кнігі Сымона Буднага «Катэхізіс» і «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам». Даследчыкі лічаць, што ў Нясвіжы былі на-

друкаваны і некаторыя іншыя кнігі Сымона Буднага.

З 1563 г. у Нясвіжы працаваў друкаром Даніэль Лянчыцкі, які выдаў 11 кніг на польскай і лацінскай мовах, аўтарамі якіх былі прыхільнікі найбольш радыкальнай плыні пратэстантызму — антытрынітарыяў. У гэты час Радзівіл адчыніў пратэстанцкія школы ў гарадах Беларусі і Літвы, перш за ўсё ў сваіх прыватнаўладальніцкіх гарадах.

Свой зямны шлях князь Мікалай Радзівіл Чорны скончыў у маі 1565 г. у сваім маёнтку Лукішкі, каля Вільні.

Уся дзейнасць Мікалая Радзівіла Чорнага была накіравана на захаванне незалежнасці і суверэнітэту Беларуска-Літоўскага гаспадарства. Дзякуючы яго паслядоўнай незалежніцкай пазіцыі наша дзяржава дасягнула найвышэйшага росквіту, а грамадскае жыццё ў ёй было заснавана на юрыдычных прынцыпах нацыянальнага права. На працягу ўсёй сваёй дзейнасці ён меў вельмі вялікі ўплыў на вырашэнне галоўных дзяржаўных пытанняў як ва ўнутранай, так і ў знешняй палітыцы. Сучаснікі называлі яго «некаранаваным каралём» Вялікага княства Літоўскага.

М.Радзівіл Чорны заснаваў магутныя землеўладальніцкія комплексы з цэнтрам у Нясвіжы, адкуль ішло кіраванне ўсімі латыфундыямі і маёнткамі нясвіжскай галіны роду Радзівілаў. Самастойна, але з падпарадкаваннем кіраўніцтву ў Нясвіжы, існавалі Алыцкае, Клецкае княствы і іншыя, менш багатыя ладыфундыі ў Беларусі, Украіне і Польшчы. Магутнасць роду Радзівілаў абапіраецца на эканоміку гэтых латыфундый, прыбыткі з эксплуатацыі сялян, грашовыя прыбыткі з прыватнаўладальніцкіх радзівілаўскіх гарадоў і мястэчак і на вайсковую сілу з шляхты і ваеннаслужылых людзей, якія за сваю вайсковую службу Радзівілам атрымоўвалі зямельныя ўчасткі, нярэдка з сялянамі.

Мікалай Радзівіл Чорны ажаніўся ў 1548 г. з Эльжбетай Шыдлавецкай (1533—1562), дачкой кракаўскага кашталяна, ад якой меў дзевяць дзяцей. Засталіся пасля яго смерці сыны Мікалай Крыштоф Сіротка (1549—1616), Юрый (1556—1600), Альбрыхт (1558—1592) і Станіслаў (1559—1599), а таксама чатыры дачкі, з іх Крыстына (1560—1580) замужам за Янам Замойскім, канцлерам вялікім каронным. Сынам у сваім тэстаменце ён завяшчаў захаваць сваё кальвінісцкае веравызнанне, але спачатку Мікалай Крыштоф Сіротка перайшоў у каталіцтва, а потым і яго браты. Пасля смерці Мікалая Радзівіла Чорнага ў хуткім часе Нясвіж пазбавіўся свайго пратэстанцкага аблічча і стаўся адным з асяродкаў каталіцызму ў Беларусі. Роля лідэра пратэстанцкага руху на Беларусі (кальвінізму) пасля смерці М.Радзівіла Чорнага перайшла да яго стрыечнага брата Мікалая Радзівіла Рудога.

Літаратура:

1. Boniecki Adam. Poczet rodów w Wielkiem Księstwie Litewskiem w XV i XVI wieku. Warszawa, 1887.

2. Kosman M. Reformacja i kontrreformacja w Wielkiem Księstwie Litewskiem w swietle propagandy wyznaniowej. Wrocław-Warszawa, 1973.

3. Грыцкевіч А. Дзейнасць Віленскага Сінода рэфармацкіх абшчынаў у Вялікім княстве Літоўскім // Беларусіка. Кніга 4. Мн., 1995, С. 358—366.

4. Грыцкевіч А. Князь Мікалай Радзівіл Чорны і яго зорны час // Народная газета, № 58, 28 сакавіка 1995 г.

5. Грыцкевіч А. Палітык-рэаліст // Літаратура і мастацтва, 21 ліпеня 1995 г., № 29. С. 16.

6. Lulewicz H. Radziwiłł Mikołaj zwany Czarnym // Polski Słownik Biograficzny. Tom XXX/2, Zeszyt 2. Wrocław-Warszawa etc., ss. 335—345.

Анатоль Грыцкевіч

Астафій ВАЛОВІЧ

(1520—1587)



стафій Валовіч (каля 1520—1587), — дзяржаўны і культурны дзеяч. Валовічы, беларускі шляхецкі род, герб Багорыя. Згодна з гіпотэзай некаторых даследчыкаў, заснавальнікам роду былі баярын князя Дзмітрыя Карыбута Гірдзівід Белік (прысягаў на вернасць Ягайле 26 красавіка 1388 г. пасля Крэўскай уніі) і яго сын Сямён Валовіч, што аўтэнтычнымі крыніцамі не пацвярджаецца. Валовічы прадстаўлялі старажытны праваслаўны род і зваліся «русінамі», як у той час звычайна называлі сябе беларускія ці ўкраінскія ўраджэнцы. Дакументальныя звесткі аб Валовічах паходзяць з першай паловы XV ст. Згадваецца гарodзенскі баярын Ходзька (Ходко), яго сын Грынька Ходзькавіч. У сярэдзіне XV—пачатку XVI ст. Грынька Валовіч займаў пасаду вялікакняскага канюшага, з 1529 г. гародзенскага гараднічага, прэвальскага намесніка. Трымаў палову Трубчэўска. Двойчы ўступаў у шлюб, з першай жонкай (прозвішча невядома) прыжыў чатырох сыноў — Багдана, Яна, Лукаша, Марка, з другой — Надзеяй Васільеўнай Храптавічовай — трох: Грыгорыя, Міхаіла і Паўла. Меў таксама некалькі дочак. Бацька Астафія — Багдан Грынькавіч Валовіч, працягваючы традыцыю, з 1508 г. выконваў абавязкі вялікакняскага канюшага, з 1529 г. займаў пасады гародзенскага войскага, з 30-х гадоў намесніка крынскага, скідзальскага і азерскага (памёр 14 красавіка 1539 г.).

Пры падтрымцы каралевы Боны, Жыгімонта Аўгуста і Радзівіла Чорнага Валовічы ў сярэдзіне — другой палове XVI ст. хутка пашырылі свае ўплывы і зямельныя ўладанні, па службовай лесвіцы выразна прасунуліся патомкі Багдана Грынькавіча, асабліва Грыгорый і

Астафій. Грыгорый Багданавіч у 1548 г. атрымаў пасаду вялікакняскага дваараніна, з 1560 г. — каралеўскага маршалка, з 1569 г. — літоўскага лоўчага, з 1573 г. — смаленскага ваяводы. У 50—70-я гады — староста мсцібогаўскі, слонімскі, гараднічы гародзенскі, дзяржаўца эйшышскі, даўгоўскі, прэвальскі, каняўскі, варнянскі, дубіцкі, мерачскі, зэльвенскі, у 1563 г. узначальваў разам з Хадкевічам вялікае пасольства ў Маскву (памёр у 1577 г.). Сын Грыгорыя Багданавіча — Геранім, або Яраш, даслужыўся да значных пасад: земскага падскарбія (міністра фінансаў), у 1605 г., у 1618 г. — падканцлера, у 1619 г. — жэмайцкага старосты.

Выключнае месца ў дзяржаўна-палітычнай і культурнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. займаў другі сын Багдана Валовіча — Астафій (Астафей, Евстафій, Остафий) Багданавіч Валовіч (каля 1520 г.— памёр у 1587 г.). Па ацэнцы сучаснікаў (у прыватнасці Станіслава Сарніцкага), гэта быў выдатны дзяржаўны і палітычны дзеяч, які здзіўляў замежных гасцей сваім прыроджаным розумам, адміністрацыйнымі і гаспадарчымі талентамі.

Дзе атрымаў першапачатковую адукацыю Астафій Валовіч, даследчыкам невядома. Звычайна прадстаўнікі досыць заможных шляхецкіх сем'яў спачатку авалодвалі чытаннем і граматай у нейкіх прыватных і дваровых школах, а пазней частка з іх пашырала сваю адукацыю і веданне еўрапейскіх моў у замежных універсітэтах. Не ўсе з матрыкулаў заходнееўрапейскіх акадэмій дайшлі да нашых часоў, некаторыя з ацалелых не апублікаваны. Мяркуючы па яго літаратурных, гістарычных і прававых ведах і бліскучым валоданні вялікакняскім справаводствам, канцылярскімі і пісарскімі функцыямі, ён атрымаў вельмі добрую, хоць магчыма пераважна хатнюю адукацыю.

Службовая лесвіца.

Першы вядомы акт пра Астафія Валовіча павязаны з судовым працэсам 1541 г. супраць забойцы яго брата Васіля Валовіча нейкім дробным літоўскім шляхціцам Матысам Кунцэвічам. Незвычайныя здольнасці і працавітасць спрыялі службоваму ўзвышэнню Астафія. Дапамагалі і блізкасць да караля і вялікага князя літоўскага дзякуючы адказным працам у гаспадарскай канцылярыі ў Вільні, і разгалінаваныя кантакты з сябрамі паноў рады.

З 1546 г. Астафей працаваў пісарам Віленскага ваяводства пад апекай вядомага магната, найвышэйшага дзяржаўнага саноўніка — віленскага ваяводы Яна Глябовіча, з 1550 г. — падстароста берасцейскі, з 1551 г. — пісар гаспадарскі, дзяржаўца магілёўскі і медніцкі, з 1554 г. — маршалак гаспадарскі і пісар, староста медніцкі, з 1561 г. — маршалак дворны і падскарбі земскі літоўскі, з 11 сакавіка 1566 г. — падканцлер літоўскі, з 1569 г. — кашталян

троцкі, у 1567—1587 гг. — староста берасцейскі і кобрынскі, з 1576 г. — рэчыцкі, з кастрычніка 1579 г. — канцлер літоўскі і кашталян віленскі.

Дзяржаўна-палітычная, дыпламатычная, адміністрацыйная дзейнасць.

Дыпламатыя.

У сярэдзіне XVI ст. геапалітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага сур'ёзна ўскладнілася. Наспявала рашучае стратэгічнае сутыкненне з маскоўскім самадзержцам, які прэтэндаваў на ўсю былую палітычную спадчыну Русі. З поўдня Вялікае княства Літоўскае непакоілі крымскія татары («таўры»), якія пад апекай Турэцкай імперыі ажыццяўлялі свае драпежніцкія набегі на суседнія землі ў залежнасці ад сваіх магчымасцяў, уласных планаў сваіх пратэктараў і задаволенасці адкупнымі плацяжамі і падарункамі («упамінкамі»). Гаспадарскі скарб Вялікага княства Літоўскага штогод пасылаў крымскім ханам значныя сумы, каштоўны посуд, футра, цягавітых «літоўскіх» канёў. Грошы былі неабходны для ўтрымання гарнізонаў ва ўскраінных землях Вялікага княства Літоўскага, умацавання замкаў, аплату наёмнікаў, іншыя дзяржаўныя патрэбы. Неўрэгуляванымі заставаліся адносіны з Польшчай, а часткова і з Прускім герцагствам, якое знаходзілася ў леннай залежнасці ад Кароны. Пануючыя слаі Вялікага княства Літоўскага імкнуліся палітычным шляхам разамкнуць замкнёнае кола пераважна ў двух галоўных напрамках: нармалізаваць адносіны з Маскоўскай дзяржавай шляхам заключэння мірнага ці доўгатэрміновага перамірнага пагаднення і парубежнага размежавання і ўмацаваць саюзніцкія, асабліва ваенна-палітычныя сувязі з Польшчай. Астафій Валовіч актыўна і на першых радах удзельнічаў ва ўсіх гэтых планах.

У красавіку 1553 г. ён разам з полацкім ваяводам Станіславам Станіслававічам Давойнам узначаліў пасольства ў Маскву. Перамовы былі цяжкімі, бо Іван IV настойваў на афіцыйным прызнанні яго царскага тытула. Такі крок узмацняў міжнародныя пазіцыі рускага манарха і яго прэтэнзіі да ўсходнеславянскіх зямель Вялікага княства Літоўскага. Паслы Вялікага княства Літоўскага катэгарычна адмовіліся ад такой санкцыі. У рэшце-рэшт абодва бакі прыйшлі да часовага кампраміснага пагаднення: перамір'е працягвалася да 25 сакавіка 1556 г. Неўзабаве пасля вяртання Валовіч за свае дыпламатычныя здольнасці атрымаў гаспадарскі прывілей на Магілёўскае староства.

З пачатку Інфлянцкай вайны ўсё больш актуальнай і неадкладнай станавілася праблема заключэння новай уніі з Польшчай. Акрамя ваенных падзей да уніі прымушалі ўзрастаючы ціск польскай шляхты, якая зусім не імкнулася бясконца падтрымліваць Вялікае княства Літоўскае і несці даволі цяжкія фінансавыя затраты. Яе цікавілі перспектывы прыўлашчэння новых зямель, вакансіі на дзяржаўных пасадах, агуль-

нае пашырэнне і ўзмацненне Кароны, магчымасць падключэння Вялікага княства Літоўскага да еўрапейскай антытурэцкай лігі. Унію падтрымлівалі таксама значныя пласты сярэдняй шляхты Вялікага княства Літоўскага, якая разлічвала такім чынам пашырыць свае прывілегіі і абмежаваць самаўпраўства паноў і магнатаў. Астафій Валовіч быў, мабыць, самым яскравым прадстаўніком той часткі беларуска-украінскай і літоўскай знаці, якая з пазіцый дзяржаўнага патрыятызму выступала супраць кароннага плана уніі, адстойвала рэальны суверэнітэт Вялікага княства Літоўскага і дамагалася галоўным чынам узмацнення ваенна-палітычнага супрацоўніцтва. На перагаворах з польскімі сенатарамі на Люблінскім сойме 1569 г. падканцлер займаў жорсткую пазіцыю, настойваў, каб нават у прамовах не закраналіся «гонар і вольнасці нашага народу». У сфармуляваных ім 15-ці пунктах пагаднення асноўныя палажэнні прадугледжвалі сумеснае абранне новага манарха аднолькавай колькасцю дэпутатаў Польшчы і Вялікага княства Літоўскага на пагранічным сумежжы, адасобленую каранацыю і ўзвядзенне на вялікакняскі трон у Кракаве і Вільні, гарантыю раней дараваных манархамі правоў і вольнасцяў, агульную абарону і вальныя соймы Рэчы Паспалітай, якія павінны па чарзе адбывацца на землях Кароны і Вялікага княства Літоўскага. Прапанавалася таксама захаванне каронных і «літоўскіх» вальных соймаў для вырашэння адасобленых дзяржаўных спраў. Забаранялася экзекуцыя (праверка праў на ўладанні, што магло прывесці да разрухаў і перадзелаў маёмасці), захоўвалася структура асноўных цэнтральных і мясцовых органаў улады і адпаведныя пасады. У сутнасці праграма Валовіча пры некаторым узмацненні ваенна-палітычных і дзяржаўных сувязей гарантавала рэальную дзяржаўна-прававую роўнасць Вялікага княства Литоўскага і Кароны. Зразумела, што гэты праект выклікаў адмоўную рэакцыю з боку тых прадстаўнікоў польскай шляхты, якія выношвалі планы поўнай інкарпарацыі Вялікага княства Літоўскага ў склад Кароны. Разыходжанне пазіцый прывяло да нечаканага ад'езду большасці дэлегатаў ліцьвінаў з Любліна. У адказ на гэту дэманстрацыйную акцыю Жыгімонт Аўгуст 1 сакавіка 1569 г. выдаў універсал аб інкарпарацыі Валыні і Падляшша ў склад Кароны, некалькі пазней з'явіўся адпаведны ўніверсал аб далучэнні Кіеўшчыны да Польшчы. Спробы часткі пануючай і ўплывовай эліты Вялікага княства Літоўскага, у тым ліку Астафія Валовіча, арганізаваць паспалітае рушанне не былі падтрыманы большасцю сярэдняй і дробнай шляхты. 28 чэрвеня акт Люблінскай уніі быў урэшце падпісаны.

Шмат намаганняў прыклаў Валовіч у наступныя гады сваёй грамадскай і палітычнай дзейнасці на ўмацаванне дзяржаўнай самастойнасці Вялікага княства Літоўскага ў межах новаўтворанай федэрацыі — Рэчы Паспалітай, узмацненне абарончых высілкаў, распрацоўку новага Ста-

тута Вялікага княства Літоўскага. Ён захаваў павагу з боку манарха, свае ўладанні ў заходняй Берасцейшчыне (Ламазы, Кадынец і Воін), і 20 чэрвеня 1569 г. атрымаў новую значную намінацыю: Троцкае кашталянства.

Дыпламатычны вопыт Валовіча шырока выкарыстоўваўся вярхоўнай уладай і пануючымі слаямі Вялікага княства Літоўскага для вырашэння самых надзённых і важных праблем. Па ўмовах Люблінскай уніі Польшча і Вялікае княства Літоўскае павінны былі сумесна ажыццяўляць знешнюю палітыку Рэчы Паспалітай, але практычныя інтарэсы, геаграфічна-палітычныя фактары і традыцыйныя сувязі фактычна падзялялі яе на розныя сферы. Адносіны з Масквой сталі пераважна прэрагатывай Вялікага княства Літоўскага. Падканцлер быў ключавой фігурай у арганізацыі ўсіх важнейшых пасольстваў і перагавораў з Расіяй, відавочных і патаемных камбінацый. У 50—60-я гады ён лічыўся адным з найбольш уплывовых дзеячаў Вялікага княства Літоўскага ў перагаворах з Іванам IV, актыўна перапісваўся з выдатным расійскім дыпламатам дзякам Пасольскага прыказа Іванам Васільевічам Віскаватым. Гэта не перашкаджала яму прымаць непасрэдны ўдзел у ваенных дзеяннях пры аблозе Полацка ў 1579 г., тым больш што ў ходзе Інфлянцкай вайны ён страціў некаторыя са сваіх усходніх маёнткаў. Паводле попісу войска Вялікага княства Літоўскага 1567 г. ён выстаўляў са сваіх земскіх уладанняў 207 коннікаў і 65 пехацінцаў (драбаў).

Па сваіх службовых абавязках і надзвычай шырокіх інтарэсах ён заўсёды імкнуўся атрымоўваць самую разнастайную і надзейную інфармацыю пра маскоўскія справы, адносіны з Польшчай, Швецыяй, Інфлянтамі, Венгрыяй, Заходняй Еўропай, не гаворачы ўжо пра Крым і Турцыю. Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага пад яго кіраўніцтвам стала важным цэнтрам унутранай і міжнароднай палітыкі. Аператыўныя і сакрэтныя звесткі дастаўлялі Валовічу паслы і іншыя службоўцы Вялікага княства Літоўскага, прыдворнае кракаўскае і віленскае асяроддзе, купцы, замежныя дыпламаты і «госці», прыгранічныя ваяводы. Адным з асабліва блізкіх яго паплечнікаў быў аршанскі староста Філон Кміта, таленавіты военачальнік і арганізатар даволі эфектыўнай сістэмы «шпегоўства» ў Маскоўскай Русі. Сярод «навін» Кміты, «годных ведамасці панскай міласці», пераважалі ваенна-палітычныя звесткі: аб паходзе Івана IV пад Казань (што аслабляла напружанасць на усходняй мяжы Вялікага княства Літоўскага), аб выяздзе яго з Аляксандравай слабады, умацаванні Смаленска «і іншых усіх гарадоў Украіны» (пагранічча), перасоўваннях войска, будаўніцтве замкаў і астрогаў, уварванні шведаў у паўночна-заходнія землі Маскоўскай Русі і інш. У канфідэнцыяльнай перапісцы з Радзівіламі, Сапегамі, Хадкевічамі Астафій Валовіч абмяркоўваў унутранае становішча Вялікага княства Літоўскага, прававыя, маёмасныя і іншыя пытанні, у тым ліку магчымасці прасоў-

ванне па службовай лесвіцы, атрыманне высокіх «врадаў», пажыццёвых дзяржаў, староставаў і інш. Пазіцыя Валовіча тут шмат што значыла. Маскоўскія дыпламаты ў 1571 г. паведамлялі ў Пасольскі прыказ пра асаблівую блізкасць Валовіча да Жыгімонта Аўгуста і яго ўплывы ў Радзе. «А ближних панов при короле в Литве и в темной [сакрэтнай. — *Г.Г.*] раде живут завсе у короля староста жемотцкой Ян Еронимов да пан троцкий, что был писарь старший и моршалок, Остафей Волович»*.

Блізкасць да караля не вельмі перашкаджала дальнабачнаму канцлеру абдумваць з некаторымі панамі і ўраднікамі праблемы дынастычнага характару, ускладнёныя хваробай манарха і адсутнасцю нашчадкаў мужчынскага «рожаю». Са смерцю Жыгімонта Аўгуста (памёр у 1572 г.) заканчвалася двухсотгадовае панаванне Ягелонскай дынастыі ў абедзвюх дзяржавах. Федэратыўны характар Рэчы Паспалітай і ўнутраныя супярэчнасці ў шляхецкім і магнацкім асяроддзі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага дазвалялі прадугледжваць абвостранае саперніцтва ў перыяд інтэррэгнум (міжкаралеўя). Пануючая эліта Вялікага княства Літоўскага таксама была падзелена на розныя партыі і групы, сярод якіх былі папулярнымі або рэзервовымі розныя замежныя кандыдаты. Адзінае, што збліжала многіх паноў і магнатаў, — нежаданне мець на троне прадстаўніка польскай знаці ці нават замежнага прыхільніка польскага палітычнага панавання ў Рэчы Паспалітай, бо гэта магло прывесці да ўшчамлення «роўных» правоў Кароны і Вялікага княства Літоўскага. Яшчэ да смерці Жыгімонта Аўгуста апаненты гэтай палітычнай групоўкі ў Радзе Вялікага княства Літоўскага абвінавачвалі канцлера ў тайным намеры ўзвесці на трон Рэчы Паспалітай «угорскага каралевіча». У тагачасных сакрэтных адпісках рускіх пасланнікаў у Маскву адзначалася, што Астафій Валовіч баяўся забойства за свае дынастычныя праекты. Варта нагадаць, што праз пяць год каралём польскім і вялікім князем літоўскім быў абраны адзін з такіх, здаецца, зусім непраходных кандыдатаў — трансільванскі князь Стэфан Баторый. Гісторыя яго ваеннай і палітычнай дзейнасці шырока вядома.

У часы інтэррэгнум Валовіч актыўна ўдзельнічаў у патаемных дыпламатычных перамовах з Іванам IV, кандыдатура якога або яго сына Фёдара разглядалася вузкай групай магнатаў, у прыватнасці Крыштофам Радзівілам Сіроткай і Львом Сапегам. Магнаты спадзяваліся, што жорсткі ўсходні манарх будзе супрацьдзейнічаць польскім замыслам і захавае некранутымі ўсе іх прывілегіі. Па праўдзе, усе гэтыя зносіны з маскоўскім самаўладцам былі пераважна часткай іншых палітычных планаў, з мэтай стварыць спрыяльныя ўмовы для больш рэальных і пажаданых кандыдатаў.

* Сборник Русского исторического общества. СПб., 1892. Т. 71. С. 804

Практычна ўсе праблемы, што закранալі жыццёвыя інтарэсы Вялікага княства Літоўскага, дыскутаваліся на пасяджэннях паноў Рады і вальных соймах. Так, Валовіч выступіў у абарону прыватных асоб, якія шчодра карысталіся яго падтрымкай і апякунствам. Сярод іх былі старэйшы сын Мікалая Радзівіла Чорнага — Мікалай Крыштоф (Сіротка), аршанскі староста Філон Кміта і іншыя.

Маскоўскія дыпламаты пільна прыглядаліся да дзейнасці Астафія Валовіча і прызнавалі яго ўплывы ў пануючай эліце Вялікага княства Літоўскага.

Наколькі глыбока цікавіўся Валовіч маскоўскімі справамі, вядома па тых адпісках, якія дасылаліся яму Філонам Кмітам і іншымі парубежнымі ваяводамі і намеснікамі.

Вялікія арганізатарскія і адміністрацыйныя здольнасці Валовіча праяўляліся і ў іншых сферах яго дзейнасці. Ужо ў маладосці ён прыкметна адзначыўся ў ажыццяўленні аграрнай рэформы ў Вялікім княстве Літоўскім, саўдзельнічаў у напісанні вядомай «Уставы на валокі». У сярэдзіне 1550-х гг. Жыгімонт Аўгуст прапанаваў нават замяніць галоўнага арганізатара аграрных пераўтварэнняў Станіслава Хвальчэўскага Астафіем Валовічам (вядома па каралеўскіх лістах да Радзівіла Чорнага). У наступныя дзесяцігоддзі Астафій Валовіч неаднаразова ўдзельнічаў у памеры іншых гаспадарскіх уладанняў, у т. л. дзяржавы Трабскай. У сувязі з цяжкім становішчам гаспадарскага скарбу і ваеннымі патрэбамі шмат займаўся фінансавымі і падатковымі справамі. На Бельскім сойме 1564 г. падтрымаў судовую рэформу, выказаўся за змены ў кампетэнцыі старых урадаў Вялікага княства Літоўскага, дзяржаўным заканадаўстве.

Асабістыя таленты і кар'ернае ўзыходжанне Валовіча нямала спрыялі росту яго ўласнай «фартуны». Хутка ён стаў уладальнікам найбольш буйных маёнткаў сярод членаў роду. У попісы войска 1567 г. згадваюцца яго маёнткі ў паветах Упіцкім (Упіта), Ковенскім (Лапея і Карыян), Гародзенскім (Бераставіца, Чарніцы, Баля, Даўспуды, Кусцін, Сідра), Гарадзея, Станькаў у Мінскім павеце, Гальшаны, Камень Завілейскі, Чарнехаў. З усіх сваіх уладанняў, уключна з закладнымі, ён выстаўляў у 1567 г. да службы земскай 107 коннікаў, 65 пешых воінаў, а «на ласку караля і вялікага князя літоўскага» яшчэ 100 коннікаў. У тым жа 1567 г. замяніў Засулле на Стайкі, у 1585 г. набыў у татар маёнтак Калдычэвічы, у 1583 г. атрымаў прывілей Стэфана Баторыя на каралеўскія дзяржавы — Юрбарк і Новую Волю. Меў дамы і пляцы ў Вільні, набытыя ў Эразма Доўгірда, Мальхэра Шамета, аршанскага дзяржаўцы князя Андрэя Адзінцовіча, Войцэха Стаброўскага — на Зарэччы, «янушоўскі» дом у Гарасіма Дахновіча, у 1557 г. набыў двор на вул. Задорынскай у Філона Кміты. Свае дамы былі ў яго і ў Гародні і ў Бярэсці. Разам з Янам Хадке-

вічам у 1566 г. арэндаваў паборы з Вялікага княства Літоўскага, у 1568 г. купіў у княгіні Любецкай маёнтак Свержань і ўзяў у заставу Жыровічы. У 1582 г. Астафій Валовіч «паступіл» Жыгімонту Аўгусту маёнтак і воласць Мікулінскую ў ваяводстве Віцебскім, дзе апошні збіраўся пабудаваць абарончы замак. Астафій актыўна садзейнічаў абжыванню і каланізацыі Падляшша беларускімі і іншымі пасяленцамі, спрыяў развіццю магдэбургскага самакіравання ў Вялікім княстве Літоўскім, удасканаленню падатковай сістэмы.

Заканадаўчая, духоўная і культурная дзейнасць.

Развіццё грамадскіх адносін у Вялікім княстве Літоўскім, нябачанае пашырэнне бягучага справаводства сур'ёзна ўскладнялі працу гаспадарскай канцылярыі ў другой палове XVI ст. Практычныя патрэбы вярхоўнай улады і цэнтральных дзяржаўных органаў прывялі да пэўнага падзелу функцый і ўтварэння ў 1566 г. (побач са старой пасадай канцлера) новага ўраду — падканцлера. Мабыць, не выпадкова першым заняў гэту вакансію Астафій Валовіч, даўно вядомы як вопытны і адукаваны пісар віленскай гаспадарскай канцылярыі. Па характару сваёй дзейнасці ён быў стала звязаны з вырашэннем розных судовых спраў, афармленнем афіцыйных актаў, якія запісваліся ў кнігах гаспадарскай канцылярыі, так зв. Метрыцы Вялікага княства Літоўскага. Да нашых часоў дайшлі некаторыя кнігі Метрыкі, спраўленыя пад кантролем Астафія. Зразумела, што афармленне падобнай дакументацыі, якая мела натафікацыйнае значэнне (поўную юрыдычную моц), копій дэкрэтаў і пастаноў, іншых прыватных і публічна-прававых актаў патрабавала дасканалага ведання дзяржаўнага і мясцовага заканадаўства, звычаёвых традыцый, магдэбургскага, хелмскага, замежнага дапаможнага права, высвятляла ўсе наспелыя праблемы судова-працэсуальнай і прававой сістэмаў. У 50—60-х гадах XVI ст. востра адчувалася неабходнасць істотных змен у Статуце 1529 г. у сувязі з паглыбленнем сацыяльных працэсаў, кансалідацыяй шляхты, судовымі і адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі рэформамі. Статут 1566 г. рыхтавала камісія з 10 асоб на аснове роўнага прадстаўніцтва праваслаўных і католікаў. Астафій Валовіч актыўна ўдзельнічаў у соймавых сесіях і пасяджэннях паноў рады, дзе абмяркоўваліся праблемы Статута. У ім замацоўваліся прагрэсіўныя прававыя прынцыпы раздзялення судовай і выканаўчай улады, ліквідаваліся судовыя прывілеі магнатаў, гарантавалася права на дзяржаўныя пасады і набыццё зямельных уладанняў за абывацелямі Вялікага княства Літоўскага. Валовічу належыць асноўная арганізатарская і рэдактарская роля ў падрыхтоўцы Статута 1588 г. Новы звод законаў у прамой супярэчнасці з актам Люблінскай уніі сведчыў аб існаванні сувярэннай дзяржаўнасці, сваіх органаў улады і юрысдыкцыі.

Статут 1588 г. быў практычна завершаны, але выйшаў у свет праз

год пасля яго смерці з віленскай друкарні братоў Мамонічаў. Апеку над выдаўніцтвам ажыццяўляў новы падрыхтаваны Валовічам канцлер Вялікага княства Літоўскага — Леў Сапега.

Прыхільнік верацярпімасці, рацыяналістычна-гуманістычных канцэпцый, што былі адлюстраваныя ў яго працах над Статутамі, Астафій Валовіч клапаціўся аб захаванні традыцый дзяржаўнай і бытавой талерантнасці. Разам з другім дэлегатам на вальны канвакацыйны (папярэдні выбарчы) сойм у перыяд інтэррэгнум — віцебскім кашталянам Паўлам Мікалаевічам Пацам ён падпісаў абодва акты знакамітай Варшаўскай генеральнай канфедэрацыі 1573 г. — першы ў Еўропе публічна-прававы акт, які праклямаваў прынцыпы талерантнасці паміж людзьмі рознай веры і набажэнства. Знамянальна, што гэты акт быў «слова ад слова» упісаны ў тэкст Статута (раздзел 3, артыкул 3) і ўлічваў этна-канфесійную спецыфіку Польшчы і Вялікага княства Літоўскага: «А иж в Речи Посполитой ест розность немалая з стороны веры хрестияньское, забегаючы тому, абы се с тое причины межы людми зашстье якое шкодливое не вщело, которую по инших королевствах ясне видим, обецуем то собе сполне за нас и за потомки нашы на вечные часы ... покой межы собою заховати, а для розное веры и отмены в костелах крови не проливать, ани се карати отсуженьем маетности, почтивостью, везеньем и выволаньем, и зверхности жадное, ани уряду до таковоrо поступку жадным способом не помагать ...». Безумоўна, што талерантныя і гуманістычныя погляды Валовіча ў значнай ступені фармаваліся пад уплывам рэфармацыйных павеваў. Як выхадзец з праваслаўнага шляхецкага роду Астафій Валовіч да сярэдзіны 50-х гг. прытрымліваўся сямейных канфесіянальных традыцый. У тайнай перапісцы з памянутым дзякам Пасольскага прыказу Віскаватым у 1558 г. ён дыпламатычна скардзіўся на «зладзейскае лютарства» у Вялікім княстве Літоўскім, але ў той час ужо выразна схіляўся да кальвінізма. Заснаваў кальвінісцкія зборы ў сваіх маёнтках — Сідры і Упіце. Цікавіўся старажытнай і новай славянскай і еўрапейскай літаратурай, філасофіяй, складанымі тэалагічнымі пытаннямі (напрыклад аб нараджэнні Ісуса Хрыста), меў багатую ўласную бібліятэку, перапісваўся і сустракаўся з Сымонам Будным, старцам Арцеміем і іншымі культурнымі дзеячамі рознай царкоўна-рэлігійнай і грамадскай арыентацыі, у тым ліку антытрынітарыямі. Некаторы час у яго маёнтку ў Сідры адпраўляў пастырскія абавязкі прадстаўнік сацыяльна-радыкальнага антытрынітарызму — Якуб Каліноўскі.

Як мецэнат аказваў шчырую дапамогу многім пісьменнікам, духоўным асобам, перакладчыкам, кнігавыдаўцам. Пры яго непасрэдным удзеле была заснавана першая на тэрыторыі Беларусі кірылічная друкарня ў Нясвіжы, выдадзены першыя кнігі на беларускай мове (у т.л. твор Сымона Буднага «Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам», 1562),

яго служэбнікам быў Васіль Гарабурда, заснавальнік віленскай прыватнаўласніцкай друкарні. Напэўна, Астафій падтрымліваў і асветніцкую дзейнасць Васіля Цяпінскага, жонкай якога была пляменніца Валовіча князёўна Софія Жыжэмская. Астафій Валовіч разам з Грыгорыем Хадкевічам быў ініцыятарам выдання Свяшчэннага пісання ў Вялікім княстве Літоўскім. Пры іх падтрымцы яшчэ ў 1561 г. была арганізавана вядомая паездка чорнага дзякана Ісайі ў Маскву з мэтай набыцця спіскаў славянскай Біблії, Евангельскіх размоў Іаана Златавуста і Жыція Антонія Пячэрскага. Яму прысвячаліся шматлікія творы праваслаўных, каталіцкіх і рэфармацыйных аўтараў, у т. л. Генрыха Булінгера «O prawdziwym przyjmowaniu prawdziwego ciała y krwie Pana Chrystusa» (Бярэсце, 1559); Сымона Буднага «Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам» (Нясвіж, 1562), зборнік твораў Генадзія, патрыярха канстанцінопальскага, Іаана Дамаскіна, Іаана Златавуста (Вільня, друкарня Мамонічаў, 1585), кніга медыка Войцеха Очкі «Cieplice» (Кракаў, 1578), Марціна Чаховіча «Summariusz wszytkiego Nowego Testamentu» (Кракаў, 1570), ксяндза Паўла Гілоўскага «Wykład Katechizmu kościoła krześcijańskiego» (Вільня, 1579) і іншыя. Асобны раздзел у сваёй Хроніцы 1584 г. прысвяціў Валовічу Мацей Стрыйкоўскі, а паэтычны «вянок» — вядомы гуманістычны паэт, еўрапейскі культурны дзеяч Ян Мыліус — «Poemata», 1568 г. У 1563—1564 гг. паэт-лаўрэат пражываў у Вялікім княстве Літоўскім, карыстаўся апекай Валовіча і апяваў у вершах вайну з Іванам IV. Прадстаўнікі роду Валовічаў вучыліся ў розных еўрапейскіх універсітэтах: акрамя блізкіх Кракаўскага . Кёнігсбергскага яны наведвалі Альтдорф, Віттэнберг, Гейдэльберг, Іену, Інгальштадт, Падую, Лувен. У 1558 г. Астафій Валовіч на свае сродкі паслаў пляменніка Івана Валовіча ў лютэранскі Кёнігсберг, а праз год па рэкамендацыі рэфармацыйнага дзеяча Паўла Вяргерыя адправіў сваіх пляменнікаў з шляхціцамі Вялікага княства Літоўскага Весялоўскімі і Пятром Корсакам у Цюбінгенскі універсітэт.

Валовіч падтрымліваў ідэю стварэння першай вышэйшай вучэбнай установы ў Вялікім княстве Літоўскім — рэфармацыйнай Акадэміі — і па палітычных матывах доўга адмаўляўся зацвердзіць каралеўскі прывілей 1579 г. на заснаванне Віленскага езуіцкага універсітэта. Ён фундаваў школы і шпіталі пры Віленскім зборы, а таксама пры іншых новаўтвораных рэфармацыйных касцёлах (Сідра, Упіта), запрашаў казнадзеяў, бакалаўраў. Хатнім педагогам у Вільні быў лютэранін Ежы Заблоцкі, паплечнік вядомага літоўскага рэфарматара і асветніка Аўраама Кульвы. Сам Астафій Валовіч валодаў беларускай і рознымі замежнымі мовамі, і слухі аб яго неадукаванасці не маюць гістарычных падстаў.

На сваёй «смяротнай пасцелі» у Гародні ён завяшчаў пахаваць сябе ў мураваным склепе пад рэфармацыйным касцёлам у Сідры без усяля-

кай помпы і цырымоній, каней, зброі, «кгды там не на войну отхожу». Ён паклапаціўся таксама, каб «во всих имениях моих невольник, ани жадный дедечный правом зневоленый человек ..., хотя бы вязнем и должником зостал, маеть вольно служити и проч ити...». Гэтае пажаданне не толькі сведчыла аб адміранні архаічнага статуса чэлядзі ў новых сацыяльна-эканамічных умовах, што ўсталяваліся на Беларусі і ў Літве пасля зацвярджэння трэцяга Статута Вялікага княства Літоўскага, але і прыкметна парушала жыццёва-бытавыя традыцыі буйных зямельных уласнікаў. Валовіч не меў нашчадкаў мужчынскага полу, і амаль усе маёнткі яго перайшлі ў рукі адзінай дачкі.

Літаратура:

1. Саверчанка І. Астафей Валовіч: (Пст.-біягр. нарыс). Мн., 1992.
2. Падокшын С.А. Валовіч Астафій Багданавіч // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Энц. даведнік. Мн., 1995. С. 60—63.
3. Wasilewski T. Testament Ostafiego Wołłowicza // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. 1962. T. 7. C. 165—173.
4. Юзефович Л.А. Миссия Исайи (1561 г.) и Остафей Волович // Сов. славяноведение. 1975. №2. С. 73—81.
5. Дневник Люблинского сейма 1569 г. СПб., 1869. Вилинский С.Г. Послания старца Артемия (XVI века). Одесса, 1906.

Георгі Галенчанка

Сымон
БУДНЫ
(1530—1593)



ымон Будны (каля 1530 г. — 13 студзеня 1593 г.), выдатны культурны і рэфармацыйны дзеяч, гуманіст-асветнік, кнігавыдавец, пісьменнік, перакладчык. Месца нараджэння невядома. Верагодна, Мазовія, дзе існавала некалькі населеных пунктаў з назвай «Буда». Межавала з падляшскімі землямі Вялікага княства Літоўскага. Можна меркаваць, што пазней Будны быў нейкім чынам павязаны з Падляшшам, бо добра ведаў пра многія значныя падзеі гэтага рэгіёна, у т.л. пра паляміку супрасльскага архімандрыта Кімбра з манахам Арсеніем, дзейнасць берасцейскага старосты Аляксандра Хадкевіча і інш. У 1544 г. запісаўся ў спіс студэнтаў Кракаўскага універсітэта. З сярэдзіны 50-х гадоў па запрашэнню ўплывовага магната Мікалая Радзівіла (Чорнага) пасяліўся ў Вільні, дзе атрымаў спачатку пасаду катэхіста (памочніка пратэстанцкага святара — «міністра»), які абучаў дзетак асновам веры. Пазней школьныя і практычныя навыкі дапамаглі Буднаму падрыхтаваць свой арыгінальны Катэхізіс. У канцы 50-х гадоў атрымоўвае месца пратэстанцкага міністра ў Клецку. Тут пачынаецца яго надзвычай актыўная царкоўна-рэфармацыйная і літаратурная дзейнасць. Разам з нясвіжскім старостам Мацеем Кавячынскім і Лаўрэнціем Крышкоўскім Будны прыняў удзел у заснаванні нясвіжскай друкарні ў пачатку 60-х гадоў і выданні першых на сучаснай тэрыторыі Беларусі кірылічных друкаў. Хоць Будны непасрэдна не займаўся друкаваннем, як, мабыць, і памянутыя рэфарматары, яго вядучая духоўная роля ў першыя гады дзейнасці нясвіжскага выдавецтва праследжваецца бясспрэчна. Справа не толькі ў тым, што са сваіх бедных даходаў ён сабраў нейкія грошы для сумеснага «наклада»

на друкаванне. Ён у сутнасці быў адзіным аўтарам першых нясвіжскіх выданняў, бо толькі ён бліскуча валодаў беларускай мовай, кірылічнай пісьменнасцю і мог падрыхтаваць гэтыя тэксты. Вырашальны ўдзел і аўтарства Буднага ў падрыхтоўцы першых кірылічных выданняў прызнаваліся яго сучаснікамі, у тым ліку старцам Арцеміем, і нават праз паўстагоддзя уніяцкім царкоўным дзеячам Анастасіем Сялявай.

Што гэта былі за кнігі? Першае выданне мела наступны загаловак: «Катихисіс, то ест Наука стародавная хрістіаньская от Светого писма для простых людей языка руского в пытаніах и отказех събрана». Першая «прадмова до освенцоных княжат» падпісана ўсімі трыма выдаўцамі, другая, больш шырокая — «к всем благоверным христианом языка руского», безумоўна, належала Буднаму. Імя аўтара адсутнічае, але пазначана месца: «Пісан у Клецку под леты въплощение Господа и Спаса нашего Исус(а) Христа АФУВ (1562) июниа 1 (10) дня». У гэтай прадмове Будны апавядае пра асноўную мэту свайго друку: «...сию книжку от божественных писаний събрах и написах, абы вси слова божия учили и деток своих научали».

Нясвіжскі Катэхізіс, нягледзячы на знешне традыцыйную форму распаўсюджанага ў Еўропе царкоўнага выдання, быў арыгінальным творам, выкладзеным тагачаснай беларускай літаратурнай мовай. У некаторых фрагментах тэксту, асабліва ў цытатах, адчуваюцца ўплывы кніжнаславянскай мовы.

На думку даследчыкаў, на намер выдаць першыя беларускамоўныя выданні паўплывала актыўная рэлігійная і прапаведніцкая дзейнасць у Беларусі, Літве, на Украіне рускіх збегаў з Вялікага княства Маскоўскага, старца Арцемія, ератыкоў Феадосія Касога, Генадзія і іншых. Гэта гіпотэза нядаўна атрымала нечаканае, праўда частковае, пацверджанне. Згодна з адкрытым новым творам Буднага — «Сціплае выпісанне аб хрышчэнні дзетак» (1564) — у канцы 50-х ці, хутчэй, у самым пачатку 60-х гадоў ён вёў перамовы з князем Слуцкім (у якога пражываў Арцемій) аб арганізацыі «рускай» (г. зн. кірылічнай) друкарні. Ідэйныя разыходжанні паміж двума выдатнымі прадстаўнікамі беларускай і рускай культуры не дазволілі рэалізаваць гэтыя планы, але сам факт сведчыць пра незвычайную талерантнасць Буднага, яго цікавасць да людзей розных поглядаў і веравызнанняў. У 60-я гады Будны сустракаўся таксама з маскоўскімі першадрукарамі Іванам Фёдаравым і беларусам Пятром Цімафеевічам Мсціслаўцам, распытваў пра лёс іх маскоўскай друкарні, знаёміўся з маскоўскімі выданнямі і перакладамі.

У Катэхізісе даступна для дзіцячага ўзросту выкладзены асновы хрысціянскай веры ў пытаннях і адказах. Сам жанр катэхізісаў не быў распаўсюджаны ў Беларусі і сярод беларусіх рукапісных помнікаў XI—

XVI стст. падобных кніг практычна не захавалася. Я.Карскі назваў нясвіжскі Катэхізіс лютэранскім. Правільней было б называць яго кальвініецкім, бо ў асяроддзі Буднага ў Вільні і Нясвіжы ніколі не прытрымліваліся лютэранства. Іншая справа, што і асноўныя палажэнні кальвініецкай канфесіі слаба прагледжваюцца ў выданні, што, магчыма, звязана з недастатковай дапрацаванасцю тагачаснай тэалагічнай дактрыны сярод беларускіх, украінскіх і літоўскіх рэфарматараў. У прадмове С.Буднага і ў самой кнізе закрануты некаторыя пытанні, якія значна выходзяць за межы элементарнага вучэбна-тэалагічнага дапаможніка. Крытыкуючы распаўсюджаную ў Вялікім княстве Літоўскім практыку, Будны ў характэрнай вострай манеры ставіць праблемы ўзаемаадносін царквы і свецкага люду (паспольства), адзначае, што абрады і догмы служаць для абрамлення матэрыяльных інтарэсаў царкоўных пастыраў. «Научил их (веруючых) диавол, абы верили, иж без науки (царкоўнага настаўлення) без веры и без исповедания может человек спасен быти, только бы водою в детинстве скрещон был, и пришедши к розуму, только бы в певные дни мяса не ел, милостину, хотя ж от злого набытя давал, святым ся молил и таковые речи по-обычаю заховал».

Безумоўна, існавала яшчэ адно кірылічнае выданне нясвіжскай друкарні, якое ў навуковай літаратуры традыцыйна называецца «Аб апраўданні грэшнага чалавека перад Богам». Існуюць толькі ўскосныя звесткі аб гэтым выданні, якое ў пачатку XIX ст. трымаў у сваіх руках вядомы расійскі бібліёграф Васілій Сопікаў. Па яго словах, кніга выйшла пры фінансавай падтрымцы падканцлера Вялікага княства Літоўскага Астафія Валовіча 11 верасня 1562 г. Старац Арцемій у адным са сваіх пасланняў да Буднага крытыкаваў кнігу за антытрынітарскія погляды аўтара. На жаль, адказ Буднага невядомы.

Аб іншых нясвіжскіх кірылічных выданнях няма дакладных звестак. Евангелле 1560 г., якое часам згадваецца ў літаратуры, не магло выйсці з друкарні, бо выдаўцы называлі свой Катэхізіс 1562 г. «первородном в том языку плодом», а саму друкарню — «новой кузней». Праўда, пачатковыя планы выдаўцоў былі больш шырокімі. У прадмове да Катэхізіса Будны пісаў: «...а ведь же на потом, естли будет божия воля можется ширей у другое управити. Наболей четвертая часть, се есть о святом крещении, и о вечери Сына Божиего, помыслити можем опричную книжку выпустити».

Надзеі Буднага і яго паплечнікаў на разгортванне кірылічнага кнігадрукавання і выпуск «антычных кніжак» не спраўдзіліся галоўным чынам па грамадска-палітычных прычынах. Рэфармацыйныя рухі не знайшлі моцнай падтрымкі з боку большай часткі простага насельніцтва Беларусі і Украіны, якое трымалася традыцыйнай веры і звязвала пагаршэнне свайго матэрыяльнага становішча з узмацненнем польскіх

уплываў і шляхецкіх вольнасцей. Відавочная роля беларускіх і літоўскіх магнатаў і паноў у Рэфармацыі, а таксама даволі жвавыя сувязі рэфармацыйных абшчын з польскімі зборамі, здаецца, толькі падмацоўвалі гэтыя асцярогі. З 1563 г. нясвіжскія выдаўцы перайшлі на друкаванне выключна лацінскімі шрыфтамі з дапамогай запрошанага з Польшчы друкара Даніэля Лянчыцкага. У наступныя гады С.Будны менш займаецца друкарняй, галоўным уладальнікам якой быў Мацей Кавячынскі. Свае асноўныя высілкі ён накіроўвае на падрыхтоўку новага перакладу Бібліі, у той ці іншай ступені ўдзельнічае ў падрыхтоўцы некаторых іншых выданняў, у тым ліку «Размовы святога Юстына філосафа...» (Нясвіж, 1564), У пасляслоўі да кнігі Лаўрэнцій Крышкоўскі пісаў аб сумеснай працы: «Размову» на польскую мову пераклаў з дапамогай брата і таварыша свайго Буднага».

У сваёй аўтарскай і выдавецкай дзейнасці Будны працягваў улічваць патрэбы беларускіх, украінскіх, літоўскіх чытачоў, якія лепей ведалі «рускую» (тагачасную беларускую) мову чым малазразумелыя старажытныя тэрміны. У прадмове да нясвіжскага выдання Бібліі 1572 г. Будны прыхільна адзываўся аб ролі славянскіх моў у духоўнай і культурнавыдавецкай дзейнасці, асуджаў тых аўтараў, што схільны былі сваю ўласную мову ўзносіць пад нябёсы, а іншымі грэбаваць і не ведаць. Наследуючы вялікую справу Скарыны, які выдаваў кнігі «всему посполитому народу языка руского», ён прызначаў Біблію «не нейкай адной краіне ці павету», але ўсім будучым чытачам. Таму ўлічваў розныя моўныя і нават рэлігійныя асаблівасці, прыдатныя для такой складанай і далікатнай перакладчыцкай працы. «Знойдзеш тут словы вялікапольскія, знойдзеш кракаўскія, мазавецкія, падляшскія, сандамірскія, нямала — і рускія». На палях Новага запавету (Лоск, 1574) Будны змясціў сціплыя тлумачэнні некаторых малазразумелых для насельніцтва Вялікага княства Літоўскага («літвінаў») слоў. Напрыклад, ён пераклаў грашовыя біблейскія тэрміны ў сістэму «літоўскай» метралогіі: «драхма» — гэта чатыры грошы літоўскія», «грыўна» — тут разумей чатыры рублі літоўскія» і г.д. Той жа пераклад Новага запавету дапоўнены, услед за Скарынам, «зачаламі», дробнымі падзеламі тэкстаў «па жаданню брацii мілай, народу рускага».

З сярэдзіны 60-х гадоў Будны фактычна ўзначаліў беларуска-літоўскае адгалінаванне рэфарматараў. У адрозненні ад шмат якіх краін Еўропы, дзе рэфармацыя адпавядала імкненням розных сацыяльных слаёў, у тым ліку так званага трэцяга саслоўя (бюргерска-буржуазных пластоў), яе галоўнай асновай у Беларусі і Літве з'яўляліся магнаты і часта шляхта — пераважна сярэдняя і дробная кліентура, службоўцы буйных і ўплывовых паноў. Пазіцыя многіх магнатаў была абумоўлена галоўным чынам намерам паслабіць каталіцкую царкву, падарваць яе

цесныя сувязі з вярхоўнай уладай і Польшчай, дабіцца больш спрыяльных умоў дзяржаўнай уніі Вялікага княства Літоўскага з Каронай, у значнай ступені захаваць правы, самастойнасць і незалежнасць сваёй дзяржавы. Асноўнай царкоўна-рэлігійнай формай пануючага рэфармацыйнага руху (пасля некаторых ваганняў сярод прыхільнікаў рэлігійнага адраджэння) стаў кальвінізм, прывабны сваім рэспубліканскім ладам. С.Будны і яго паплечнікі, Кавячынскі, Крышкоўскі, Цяпінскі і іншыя, кіраваліся пераважна духоўнымі матывамі, а ў сваіх тэалагічных поглядах хутка эвалюцыянавалі ў бок антытрынітарызму.

Цяжка сказаць, чаму менавіта антытрынітарызм у другой палове XVI ст. знайшоў даволі прыдатную глебу ў Літве і Беларусі, часткова і ў Польшчы. З аднаго боку, гэта ў пэўным сэнсе быў працяг і радыкалізацыя еўрапейскіх рэфармацыйных тэндэнцый, якія абгрунтоўвалі неабходнасць вяртання да першасных запаветаў Бібліі і адмовы ад пазнейшых царкоўных наслаенняў (дагматаў і канонаў). Антытрынітарыі лічылі дагмат аб Св. Тройцы такім пазнейшым дадаткам (адсюль і найменне — антытрынітарыі, або арыяне ад імя сярэдневяковага ератыка Арыя, які абгрунтоўваў падобныя погляды). З другога боку, узнікненне гэтага сектанцкага адгалінавання ў рэфармацыі было выклікана незадаволенасцю некаторай часткі грамадства ўнутранай і знешняй палітыкай дзяржавы, прывілегіямі пануючых станаў (саслоўяў), абцяжарваннем простага люду, не выключаючы і сялянства, і адпаведна негатыўным стаўленнем да ўсіх хрысціянскіх цэркваў, якія, на яе погляд, падтрымлівалі і абаранялі існуючыя парадкі, уладу і пануючую эліту. Не разабраўшыся ў гэтых унутраных супярэчнасцях, немагчыма зразумець прыхільнасць да арыянства рэдкіх зрэшты прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў: з асяроддзя сярэдняй і дробная шляхты, мяшчанства, нават некаторых паноў і магнатаў (Мікалай Радзівіл Чорны, Ян Кішка). Немагчыма і зразумець сутнасць той палемікі, у якой актыўна ўдзельнічалі Будны і яго паплечнікі ў межах агульнага антытрынітарскага руху Рэчы Паспалітай.

Будучы прыхільнікам той групы антытрынітарыяў, якія прытрымліваліся сваёй рызыкоўнай дактрыны пераважна з тэалагічных і канфесійных меркаванняў, Будны ў сваім меркаванні знайсці боскую, біблейскую ісціну пайшоў значна далей, чым усе заснавальнікі еўрапейскай рэфармацыі — Лютар, Кальвін, Цвінглі і інш. Унутры ўсяго антытрынітарскага руху Вялікага княства Літоўскага і Кароны Будны і «буднеіты» праводзілі найбольш радыкальныя погляды па тэалагічных пытаннях, якія ахарактарызаваны пазнейшымі даследчыкамі еўрапейскага хрысціянства як унітарысцкія (прызнанне аднаго спрадвечнага і ўсемагутнага Бога, адмаўленне ад дагмата аб Св. Тройцы), нонадаранцкія (адмаўленне ад аддавання боскай пашаны Хрысту), анабапцісцкія (прыз-

нанне сапраўдным і разумным — толькі царкоўнае хрышчэнне дарослых, а не дзетак). З сярэдзіны 60-х гадоў мы бачым Буднага на чале значнай групы беларуска-літоўскіх антытрынітарыяў, якая кінула выклік двум рэгіянальным адгалінаванням антытрынітарскага руху Рэчы Паспалітай — люблінскім братам (Марцін Чаховіч, Ян Немаеўскі, Станіслаў Фарноўскі і інш.) і віленскай абшчыне (суперінтэндант Мікалай Вендрагоўскі). Венграўскі сінод 1565 г., які сабраўся ў маёнтку жамойцкага старосты Яна Кішкі, не зняў разыходжанняў па большасці ўзнятых там пытанняў. Суперінтэндант хелмскага збору Мікалай Жытна прапанаваў Вендрагоўскаму выкарыстаць свае сувязі з Радзівілам і спыніць далейшую выдавецкую дзейнасць у Нясвіжы: «Мой дарагі брат Вендрагоўскі! Паклапаціся між іншым аб тым, каб нясвіжскі намеснік забараніў друк іх ядавітых кніжак. Хоць мне вядома, шмат з іх ужо апублікавана на шкоду царквы».

Наступныя сіноды польскіх і «літоўскіх» братоў у Скрыне, 24—29 чэрвеня 1567 г., Іўе, 20—26 студзеня 1568 г., Белжыцах, сакавік 1569 г., выявілі апроч тэалагічных значныя разыходжанні ў сацыяльных і палітычных поглядах малапалян з Будным. Сярод саміх антытрынітарыяў Вялікага княства Літоўскага вызначыўся раскол на гэтай глебе. (Біблія яшчэ раз стала аб'ектам супярэчлівых і супрацьлеглых сацыяльных поглядаў і канцэпцый.)

На сінодзе ў беларускім мястэчку Іўе ў 1568 г. прадстаўнік невялікай групы «літоўскіх братоў» Якуб Каліноўскі сфармуляваў адно з галоўных патрабаванняў прыхільнікаў радыкальнага сацыяльнага накірунку ў антытрынітарскім руху Вялікага княства Літоўскага: ліквідацыю прыгонніцтва, нявольніцтва, усталяванне ўсеагульнай роўнасці. Спасылаючыся на Св. Пісанне, ён сцвярджаў у сваёй прамове: «Усе людзі роўныя! Усе адной крыві, і брат не павінен панаваць над братам!» Ён адкрыта заявіў на сінодзе: «Ці не абцяжараны падданыя паноў тут у нас, у Літве і ў Польшчы, цяжкай працай і вялікімі падаткамі? Самі, як свінні, ядуць пустазелле, а зерне вымушаны пакідаць на чынш і на іншыя падаткі». Якуб Каліноўскі і яго паплечнікі выступілі супраць дзяржаўнай улады і ўсіх яе органаў, удзелу хрысціян у войнах.

Прапаганда такіх поглядаў пагражала расхістаць усе асновы феадальнага і грамадска-палітычнага ладу Вялікага княства Літоўскага і Польшчы напярэдадні ўтварэння новай дзяржаўнай супольнасці — Рэчы Паспалітай, у адзін з самых крытычных перыядаў Інфлянцкай вайны. Яна не толькі ўносіла непажаданы раскольніцкі фермент у шэрагі арыян, але давала падставы для абвінавачванняў у дзяржаўнай здрадзе, абмяжоўвала ўплывы Рэфармацыі ў цэлым у асяроддзі пануючых і маёмасных станаў. Не выпадкова ў II Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г. быў упершыню ўнесены артыкул аб абмежаванні палітычных і

сацыяльных правоў арыянскай секты.

Сымон Будны быў прыхільнікам паступовага развіцця грамадства, ён выступаў супраць наіўных спроб утварэння чалавечага «царства нябеснага» на зямлі ў зусім іншых, чым у часы ранняга хрысціянства, умовах. Адзін з самых адукаваных дзеячаў еўрапейскай рэфармацыі, ён добра ведаў, чым заканчваліся гэтыя ці іншыя падобныя спробы ў Еўропе, асабліва калі яны грунтаваліся на насіллі, паўстаннях і бунтах. Нягледзячы на сацыяльна-палітычныя, а часткова і тэалагічныя разыходжанні малапольскія «браты», да якіх далучыліся толькі асобныя «літоўскія» арыяне, у 60-х гадах не пайшлі на разрыў з Будным, улічваючы яго ўплыў у значных колах беларуска-літоўскіх антытрынітарыяў. На Скрынскім сінодзе 1567 г. групе падрыхтаваных тэолагаў было даручана складанне новай ачышчанай ад прысад Бібліі. Большасць з іх ад такога непасільнага гонару хутка адмовілася. Мацей Кавячынскі і Будны прыйшлі да высновы, што выпраўленне і ачышчэнне кракаўскай 1561 г. і знакамітай берасцейскай Бібліі 1563 г. не менш складаная праца, чым падрыхтоўка новай. У ходзе работ над новым зводам выявіліся пэўныя разыходжанні паміж нясвіжскімі перакладчыкамі, рэдактарамі і выдаўцамі Бібліі. Некаторыя тэксты Буднага здымаліся або выпраўляліся без яго асабістага ўдзелу. Да таго ж у канцы друкавання нясвіжскай Бібліі значна ўскладніліся ўмовы выдавецкай дзейнасці. Старшы сын Мікалая Радзівіла Чорнага Мікалай Крыштоф (з мянушкай Сіротка) перайшоў у каталіцызм і стаў прыціскаць выдаўцоў. У 1571 г. ён пісаў свайму насвіжскаму намесніку Героніму Макавецкаму: «Не ведаю, чаму вы гэтых жоўтабрухіх церпіце ў Нясвіжы... Загадваю давесці не толькі новахрышчэнцу Крышкоўскаму, але і друкару, карэктару і іншым слугам, каб вярталіся да свайго пана, а ў маім маёнтку больш не жылі, акрамя тых, что аседласць там маюць». У тым жа годзе памёр асноўны ўладальнік друкарні Мацей Кавячынскі.

Даследчыкі дагэтуль спрачаюцца, дзе была дадрукавана нясвіжская Біблія. Па словах пратэстанцкага гісторыка Санда, яна была надрукавана ў мястэчку Заслаўі, дзе ў той час пад апекай Глябовічаў выконваў міністэрскія абавязкі Сымон Будны. Здаецца, што гэта малаверагодная гіпотэза. У прадмове да Бібліі асабліва падкрэслена, што яна закончана «стараннем і накладамі» сыноў нябожчыка — Альбрыхта і Гектара Кавячынскіх. Хутчэй за ўсё кніга была дадрукавана ва ўласным маёнтку Кавячынскіх — Уздзе. Яшчэ і зараз можна ўбачыць там каменны напаўразвалены каркас старажытнага рэфармацкага збора. Пазней Будны адзначаў прычыны свайго незадавальнення выданнем, якое, па яго словах, было скажона і выпраўлена, «бо друкарня не мне належала». Дарэчы, з гэтай нагоды Будны адмовіўся ад прадугледжаных каментарыяў — анатацый да Бібліі. У 1572 г. Кавячынскія прадалі друкарню крайчаму Вя-

лікага княства Літоўскага Яну Кішку, які ўладкаваў яе ў сваім замку ў Лоску. З гэтага часу амаль дзесяцігоддзе Будны выконвае абавязкі духоўнага кіраўніка выдавецтва. Большасць лоскіх выданняў — яго ўласныя творы або кнігі тых аўтараў, што карысталіся яго падтрымкай.

Незалежны ад староnніх уплываў Будны падрыхтаваў у Лоску свой пераклад самай знакамітай і кананічнай кнігі ўсяго хрысціянскага свету — Новага запавету. Гэта важнейшы твор Буднага, дзе выкладзены яго рацыяналістычныя погляды і выкарыстаны метады гістарычнай і філалагічнай крытыкі. Па яго словах, няма іншай кнігі, якая б была так сфальшавана, скажона і перакручана перакладчыкамі і выдаўцамі, як Біблія. «А нашы мілыя тэолагі, — пісаў ён у прадмове да «ўсіх верных» чытачоў гэтай кнігі, — не жадаюць таго бачыць, усё ў іх праўда, што ў іх Бібліях напісана, а хто іншай думкі, то па ім пеклам (д'яблам) пахне». Цэнтральнае месца ў яго перакладзе адведзена хрысталогіі. На яго думку, спрадвечная боскасць Хрыста не даказана і хрысціянскі дагмат аб Св. Тройцы ўзнік пад уплывам ерасяў Маркіёна і пазнейшых памылковых напластаванняў. Здзіўляе эрудыцыя Буднага. Ім даследаваны ўсе асноўныя выданні і пераклады Бібліі (яўрэйскія, грэчаскія, лацінскія і славянскія), вывучана агромная літаратура. Толькі ў яго прадмовах да Новага запавету згадваюцца каля сарака каментарыяў, перакладчыкаў, выдаўцоў, у тым ліку імёны вядомых прадстаўнікоў тэалагаічнай і філасофскай думкі рэнесансавай і рэфармацыйнай Еўропы — Эразма Ратэрдамскага, Лаўрэнція Валы, Марціна Лютэра, Тэадора Бэзы, Сэбасц'яна Кастальёна і інш. Не абыйдзены ўвагай таксама віленскія выданні Францыска Скарыны, маскоўскія друкі Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца.

Пэўны ўздым радыкальнага антытрынітарскага руху ў Вялікім княстве Літоўскім і Польшчы ў 70-х гадах заахвоціў Буднага зноў уключыцца ў палеміку. Ён адстойвае неабходнасць захавання ўнутранага міру ў грамадстве, усталяванага сацыяльнага ладу, весці абарончыя войны, падтрымліваць дзяржаву. Яго аддзяляе ад апанентаў (М.Чаховіча, Немаеўскага, П.Даманеўскага) і рознае разуменне шэрагу тэалагічных (дактрынальных) пытанняў, у тым ліку аб непарочным зачацці дзевы Марыі. Абагульняючыя погляды Буднага па найбольш спрэчных тэалагічных праблемах былі выкладзены ім у творы «Аб прадвечных артыкулах хрысціянскай веры» («O przednieyszych Wiary Christianskiey Artikulech». Лоск, 1576).

У тым жа годзе ў перакладзе С.Буднага выходзіць невялікі, але прынцыпова важны твор французскага пісьменніка, гугенота Эрнста Варамунда Фрызы (Франсуа Хотман), прысвечаны трагічным падзеям Варфаламееўскай ночы. Брашура нагадвала чытачам пра рэлігійную нецярпімасць былога караля Рэчы Паспалітай Генрыха Валуа, які патаемна збег у Францыю 19 чэрвеня 1574 г., як толькі аслабаніўся фран-

цузскі трон. Ва ўмовах дынастычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай гэта выданне было накіравана супраць новага замежнага кандыдата на трон Рэчы Паспалітай Эрнста Габсбурга, сына Максіміліяна II. Яго падтрымлівалі Рым і шмат якія магнаты. З прадмовай Буднага і «накладам» (фінансавай дапамогай) полацкага ваяводы Мікалая Аляхновіча Монвіда Дарагастайскага ў 1577 г. у Лоску ўбачыла свет самае знакамітае выданне польскага знаўцы права, юрыста і гуманіста Андрэя Фрыча Маджэўскага з праграмай глыбокіх рэформаў грамадска-палітычнага і сацыяльнага ладу: «Аб паправе Рэчы Паспалітай» («O poprawie Rzeczypospolitej»).

У канцы 70-х—пачатку 80-х гадоў зноў абвастрыліся адносіны з польскімі (пераважна малапольскімі) антытрынітарыямі, якія спрабавалі падначаліць сабе «літоўскіх братоў». Польскія рэфарматары не пажадалі перадаць ліцвінам рукапіс італьянскага палеміста Якуба Палеолага, грамадска-палітычныя погляды якога па праблемах дзяржаўнай улады былі сугучны Будному. Ён атрымаў рукапіс ад самога аўтара з Маравіі і адразу перадаў яе на друкарскі варштат. На сінодах 1579 г. у Любліне і Белжыцах малапаляне прынялі цэнзурны ўстаў. Беларуска-літоўскія антытрынітарыі аспрэчвалі яго. На чарговым сумесным сінодзе ў Левартаве восенню 1579 г. Будны прэзентаваў палякам выданне Палеолага. Частка малапалян выказвалася за выключэнне Буднага з польска-ліцвінскага антытрынітарскага збору. На сінодзе ў Лоску 6 студзеня 1582 г. усе «літоўскія браты», акрамя двух, далучыліся да Буднага. Не атрымалі падтрымкі польскія пасланнікі і на сінодзе ў Любчы 1 сакавіка 1582 г. Тым не менш, пасля вяртання іх у Польшчу на Луцлавіцкім сінодзе 1582 г. Будны быў адлучаны ад гэтай царквы за яго бязбожныя погляды. Пастанова пацверджана на Венграўскім сінодзе 1584 г. Апошняе лоскае выданне Буднага было надрукавана ў студзені 1583 г. — «Аб свецкай уладзе» («O urzędzie miecza uzywającem»). Гэта — праграмнае выданне, дзе падрабязна выкладзены погляды Буднага на важнейшыя сацыяльна-палітычныя і прававыя праблемы: аб адносінах хрысціян са свецкай уладай, гаротным становішчы паднявольнага сялянства, валоданні чэляддзю і рабамі, аб войнах, падатках і павіннасцях, арганізацыі рэфармацыйнай царквы і інш. Кніга апісвае гісторыю палемікі з малапалянамі, уключае амаль пратакольныя запісы спрэчак на Іўеўскім сінодзе 1568 г., розныя дакументальныя матэрыялы. Спасылаючыся на Св. Пісанне і вопыт антычных і сучасных яму еўрапейскіх дзяржаў, Будны крытыкаваў імкненне малапольскіх радыкалаў да падрыву свецкай улады, да ліквідацыі дзяржаўнага заканадаўства, якое рэгламентавала ўсе сацыяльныя адносіны. Па словах Буднага, яны сцвярджаюць, што сапраўдныя хрысціяне не могуць падтрымліваць дзяржаву, займаць пасады караля, князя, гетмана, на-

ват служыць суддзёй, войтам, бургамістрам ці воінам, што яны павінны адмовіцца ад карыстання «польскімі, літоўскімі, нямецкімі» і іншымі земскімі правамі «ва ўсіх землях, дзе караюць мячом і патрабуюць прысягі». На дзяржаўна-палітычных поглядах Буднага адбіліся пэўныя ваенна-палітычныя поспехі вярхоўнай улады Рэчы Паспалітай на завяршальнай фазе Інфлянцкай вайны, традыцыйна высокі статус вялікакняжацкай улады ў Вялікім княстве Літоўскім, асэнсаванне гістарычныга вопыту масавых радыкальных выступленняў у Еўропе. «Дрэнна, не па-хрысціянскі паступілі хлопы ў Германіі, — пісаў Будны ў памянутым творы, — калі ў 1525 г. супраць сваіх паноў паўсталі. А ўсё ж Бог не дапамог ім. Загінула гэтых хамаў у розных бітвах каля 100 тыс.». Рэзкія выступленні Буднага супраць утапічных і анархічных поглядаў малапалян і некаторых літоўскіх братоў спалучаліся з яго рашучай падтрымкай рэлігійнай талерантнасці, свабоды дыскусій, крытыкай царкоўнай цэнзуры. У той жа час Будны выступаў супраць крайнасцяў свецкай улады, тыраніі, самавольства паноў, шляхты, знаці. Ён лічыў магчымым значнае паляпшэнне сацыяльных адносін у выніку ўспрыняцця грамадствам сапраўдных хрысціянскіх запаведзяў, пашырэння гуманістычнага выхавання, асветніцтва. Ідэальныя вобразы вярхоўных правіцеляў, дзяржаўных саноўнікаў Будны шукаў у творах Платона, Арыстоцеля, Дэмасфена, Гамера, Цыцэрона, Эразма Ратэрдамскага, «нашага» Фрыча Маджэўскага. Яго стаўленне да антычных палітычных і гістарычных традыцый выразна нагадвае Скарыну з яго павагай да старажытнай духоўнай спадчыны. Каталіцкі абат С.Астроўскі, прыкмеціўшы гэтую рысу Буднага, саркастычна адзываўся аб старажытных гісторыках як людзях бязбожных і грэшных.

Разрыў Буднага з малапалянамі адбіўся на яго дзейнасці ў Вялікім княстве Літоўскім, абмежаваў яго выдавецкія магчымасці. У чарговым выданні Новага запавета, прадмова да якога падпісана Будным у Бярэсці ў 1588 г., ён адмовіўся ад многіх сваіх сцверджанняў. Некаторыя малыя творы Буднага публікуюцца ў выданнях іншых аўтараў, у тым ліку верш у кнізе яго старога прыяцеля, прызначанай для антытрынітарскай школы ў Іўі, Яна Ліцыніуса Намыслоўскага «Меркаванні аб агульным карыстанні» («Sentenciae ad communem vitae usum»). У тым жа годзе разам з Даманеўскім Будны ўдзельнічаў у дыспуце з езуітамі ў Полацку. Памёр Будны 13 студзеня 1593 г. у мястэчку Вішнева, у Ашмянскім павеце, у маёнтку пратэстанцкага шляхціца Лявона Маклока.

У творах езуіцкіх пісьменнікаў дзейнасці Буднага надавалі ледзве не апакаліптычныя рысы. Яго называюць бязбожнікам, атэістам жыдоўствуючым, што было звычайным абвінавачваннем усіх, хто адступаў ад кананічных тэкстаў і самастойна займаўся вывучэннем, перакладам ці выданнем кніг Старога запавета. У гравюры, змешчанай у кнізе С.Рэшкі

(De atheismis et phalarismis evangelicorum. Неапаль, 1596), шаржыраваны твор С.Буднага змешчаны на фоне пякельнай смалы. У езуіцкіх колах зарадзіліся і легенды ад жудаснай смерці грэшніка. Згодна з паведамленнем Лашча 1597 г., Будны перад сваёй канчынай «усім надакучыў, прыняў іудаізм і на пытанні аб Хрысце мог адказаць толькі: «Я аб Хрысце і за жыцця нямнога ведаў, а зараз і таго менш, альбо зусім нічога». Гэта ж легенда ў пазнейшым творы лютэранскага аўтара Міхаіла Фрыбелiўса Алесніцкага абрасла яшчэ новымі каларытнымі дробязямі. «Такі ератык быў проста абавязаны памерці ў страшэнных і доўгіх муках, глосна кленкая: «Ей богу, я не ведаю ніякага Бога, я таксама не ведаю нічога пра Бога. Ей богу, я не знаю Хрыста, я зусім не ведаю нічога аб Хрысце.» Такі быў яго канец, што можа пацвердзіць увесь Вішнеўскі прыход». (Ex unque Leonem, Вільня, 1603).

Погляды Буднага і яго кнігі надалі яму сапраўдную еўрапейскую вядомасць. Яны ж здабылі яму варожасць у самых розных царкоўных і свецкіх колах. Ніхто ў Беларусі, ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе XVI ст. не выступаў так радыкальна супраць хрысціянскай дагматыкі, асабліва ў хрысталогіі. Ніхто не выклікаў такой колькасці негатыўных водгукаў сярод прыхільнікаў усіх хрысціянскіх цэркваў: ад католікаў і рэфарматараў рознай масці да праваслаўных і уніяцкіх аўтараў.

Уніяцкі царкоўны дзеяч А.Сялява адным з першых адзначыў відавочную сувязь Буднага з традыцыямі Скарыны і пазнейшым брацкім выдавецкім і асветніцкім рухам. Рэальныя кантакты і ўплывы Буднага былі надзвычай шырокімі. Ён перапісваўся з вядомымі заходнееўрапейскімі дзеячамі ў Швейцарыі, Англіі, Італіі. З усяго шматлікага і ўплывовага рэфармацыйнага асяроддзя другой паловы XVI ст. толькі Будны і яго паплечнікі па нясвіжскай друкарні прыклалі значныя высілкі для распаўсюджвання сваіх поглядаў сярод беларускага насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, менавіта Будны меў непасрэдныя творчыя кантакты з рускімі эмігрантамі, вядомымі культурнымі дзеячамі — ад старца Арцемія да Івана Фёдарава, стала цікавіўся царкоўнарэлігійнымі і кніжнымі традыцыямі Беларусі і ўсёй Русі. Не выпадкова першыя нясвіжскія друкі былі выдадзены кірыліцай. І менавіта Буднаму належаць асноўныя заслугі ў справе выдання першых друкаваных твораў на беларускай мове на землях Беларусі і ва ўсім Вялікім княстве Літоўскім. Віленскія выданні Скарыны, як вядома, былі надрукаваны галоўным чынам на царкоўнаславянскай мове. Непасрэдныя і ўскосныя ўплывы Буднага выразна адбіліся і ў творчасці Васіля Цяпінскага, першага выдаўца Новага запавета для беларускага насельніцтва краіны. Не менш цікава і тое, што творы Буднага, яго кірылічныя выданні, знайшлі значны водгук сярод праваслаўнага асяроддзя. Аднак рэфармацыйныя ідэі ў цэлым і дзейнасць практычна ўсіх рэфармацыйных цэркваў на Бе-

ларусі ніколі не мелі тут празмернай падтрымкі сярод паспалітага «рускага» насельніцтва. З нямалай прыкрасцю вядомы царкоўны дзеяч перадшай паловы XVII ст., будучы ўніяцкі мітрапаліт Анастасій Сялява адзначаў гэты дзіўны феномен: «І перад тым даўно яшчэ, за вашых продкаў, — пісаў ён у палемічным выданні, абвяргаючы сцверджанні аўтара Эленхуса (Мялеція Сматрыцкага), — Русь была моцна атрута. Перад вуніяй быў Скарына, гусіт па сваіх ератычных поглядах, які па-руску друкаваў вам кнігі ў Празе. Прымалі з удзячнасцю, досыць таго, што зваўся русінам з Полацку, як і падпісваўся. Смакавалі яго друкі, мовілі, чалавек годны, русін, брат наш, друкаваў. Сымон Будны і Лаўрэнцій Крышкоўскі, па-руску надрукаваўшы, рассейвалі сваю арыянскую атруту сярод папоў. Прымалі яе за лекі, яшчэ і зараз ёсць значныя цяжкасці з папамі, каб адабраць ад іх друкі. Сцвярджаюць, што тыя кнігі — старыя і царкоўныя, сабраны з Св. Пісання, таму добрыя. Не аддаюць тых кніг, толькі пад прымусам ці з камутацыяй (заменай на іншыя). Дапамаглі да таго і тыя манахі з Масковіі, якіх сам чорт вывучыў ерасі... З той атручанай крыніцы пайшоў заразлівы паток Зізанія, што Хрыстус Пан не пасрэднік, што папа антыхрыст, што святых няма ў небе, а чэрцяў у пекле, усё узбунтавалася перад вуніяй. Non nos igitur turbavimus Israel, Elenche (не мы ўсхвалявалі Ізраель, Эланхус), не мы разагналі Русь па розных сектах, але вы самі!» (Antelenchus. Вільня, 1622).

Нямалы рэзананс атрымаў і падложны «Ліст полаўца Смеры да вялікага князя Уладзіміра», распаўсюджаны Будным і яго сябрамі ў шматлікіх рукапісных спісах у тым беларускім і ўкраінскім асяроддзі, якое шанавала старажытнарускія традыцыі. Ідэальная хрысціянская супольнасць, якая апісана ў Лісце полаўца Смеры, празрыста нагадвала рэфармацыйную абшчыну Вялікага княства Літоўскага.

Асоба Буднага сапраўды ўражвае сучасных даследчыкаў сваёй незвычайнасцю, энцыклапедычнымі ведамі, выключнай грамадскай і палемічнай актыўнасцю, гуманістычным і асветніцкім характарам дзейнасці, добразычлівым стаўленнем да культуры і мовы розных суседзяў, не выключаючы тых краін, з якімі Польшча і Вялікае княства Літоўскае мелі складаныя або непрыязныя адносіны.

Бібліяграфія:

1. Описание изданий Несвижской типографии и типографии Василия Тяпинского / Сост. Ю.А.Лабынцев при участии В.И.Лукьяненко и Е.Л.Немировского // Сводный каталог и описание старопечатных изданий кирилловского и глаголического шрифтов. М., 1985. Вып. 15.


2. Кніга Беларусі 1517—1917. Зводны каталог / Склад. Г.Я.Галенчанка і інш. Мн., 1986.

Літаратура:

1. Порецкий Я.И. Симон Будный — передовой белорусский мыслитель XVI века. Мн., 1961.
2. Плисс В. Исторический очерк проникновения и распространения Реформации в Литве и Западной Руси // Христианское чтение. 1914.
3. Голенченко Г.Я. Русские первопечатники и Симон Будный // Книга. Исследования и материалы. 1968. Сб. 10. С. 146-161.
4. Подокшин С.А. Скорина и Будный: Очерк философских взглядов. Мн., 1974.
5. Парэцкі Я.І. Сымон Будны. Мн., 1975.
6. Голенченко Г.Я. Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI—середине XVII в. Мн., 1989.
7. Саверчанка І.В. Aurea mediocritas: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Адраджэнне і ранняе барока. Мн., 1998.
8. Merczyng H. Szymon Budny jako krytyk tekstów biblijnych. Kraków, 1913.
9. Zalewski L. Tajemnica Szymona Budnego. Lublin, 1946.
10. Kot S. Szymon Budny. Der grösste Hareticer Litauens im 16. Jahrhundert // Wiener Archiv für Geschichte des Slaventums und Osteuropas. Graz-Köln, 1956. Bd. II.
11. Szczucki L. W kręgu myślicieli heretyckich. Wrocław et al. 1972.
12. Firpo M. Antitrinitari nell' Europa orientale de 500. Firenze, 1977.
13. Szczucki L. Szymona Budnego relacja o początkach i rozwoju anabaptyzmu w zborze mniejszym // Odrodzenie i Reformacja. 1986. T. 31.

Георгі Галенчанка

Раман САНГУШКА
(1537—1571)



Князь Раман Фёдаравіч Сангушка (нарадзіўся ў 1537 г., памёр 12 мая 1571 г.) — вайсковы і дзяржаўны дзеяч Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Меў родавы герб Літоўская Пагоня як нашчадак вялікага князя Альгерда. Яго продкам быў князь Фёдар (Федзька) Альгердавіч (каля 1335—1404), удзельны князь у Ратне, Ковелі, Любомлі (на Валыні, у Пінскіх балотах) і ў Кобрыне. Акрамя гэтых маёнткаў да родавых гнёздаў князёў Сангушкаў належалі Смаляны ў Аршанскім павеце, Абольцы (Аршанскі павет), Ракаў (Мінскі), Горваль (Рэчыцкі павет). Род Сангушкаў лічыўся ў Вялікім княстве Літоўскім сваяцкім ў дачыненні да каралеўскай і вялікакняжацкай дынастыі Ягелонаў (Ягайлавічаў). У XV і XVI стагоддзях правы ўдзельных князёў Сангушкі, як і іншыя нашчадкі Гедыміна і Альгерда, страцілі, але захавалі свае значныя маёнткі на правах уплывовых магнатаў. Захавалі Сангушкі і сваё праваслаўнае веравызнанне.

Ужо ў XV стагоддзі род Сангушкаў падзяліўся на асобныя лініі, якія адпаведна мелі маёнткі ў розных месцах дзяржавы. Раман Фёдаравіч Сангушка належаў да локачскай (або ковельскай) лініі роду.

Бацька Рамана Сангушкі, князь Фёдар Андрэевіч быў маршалкам Валынскай зямлі і старостам брацлаўскім і вінніцкім. Матка, Ганна, з роду Дэспатаў, гаспадароў Валахіі. Такім чынам, Раман Сангушка належаў да аднаго з арыстакратычных родаў дзяржавы.

Князь Раман Сангушка быў сярэднім сынам (з трох сыноў). Старэйшым братам яго быў Дзмітрый Сангушка, староста житомірскі, чаркаскі і канеўскі. Такім чынам, ужо ў маладым узросце Сангушкі

займалі важныя дзяржаўныя пасады.

Лёс быў нешчаслівым да мужчын з сям'і князёў Сангушкаў. Яны паміралі маладымі. У маладым узросце ў 1517 г. памёр дзядзька Рамана Фёдаравіча — Раман Андрэевіч Сангушка, староста брацлаўскі, вінніцкі і звянігародскі. Адносна маладым памёр і бацька Рамана Сангушкі ў 1547 г., а матка Рамана, Ганна, неўзабаве выйшла замуж за князя Мікалая Андрэевіча Збаражскага, таксама магната з Валыні.

Старэйшы брат Рамана Сангушкі, Дзмітрый, дамагаўся шлюбу з прыгожай 14-гадовай князёўнай Гальшкай Астрожскай (1539—1582), уладальніцай багатых маёнткаў, унучкай гетмана Канстанціна Іванавіча Астрожскага. У 1553 г. Дзмітрый Сангушка насуперак волі маткі Гальшкі Астрожскай — княгіні Бэаты Астрожскай — ажаніўся з Гальшкай, якая згадзілася на гэты шлюб. Бэата Астрожская, удава князя Іллі Астрожскага і пазашлюбная дачка караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога, не жадаючы страціць кантроль над маёнткамі дачкі, звярнулася са скаргай да караля і вялікага князя Жыгімонта Аўгуста (свайго брата). У пачатку 1554 г. вялікі князь выдаў прысуд да выгнання (баніцыі) Дзмітрыя Сангушкі за межы дзяржавы. Тады Дзмітрый Сангушка разам з 15-гадовай жонкай уцёк у Чэхію. За ім у пагоню накіраваўся з атрадам сын калішскага ваяводы Пётр Збароўскі, які таксама хацеў авалодаць Гальшкай і яе багатымі маёнткамі. Пётр Збароўскі забіў Дзмітрыя Сангушку ў Ярамержы і прывёз Гальшку да маткі. Потым Гальшка была гвалтоўна захоплена брэсцка-куяўскім ваяводам Лукашам Гуркам, які падманам і прымусам ажаніўся з ёю, згвалціўшы яе, хоць Гальшка і ненавідзела яго. Маці ўдалося забраць дачку ў Гуркі і знайсці сховішча ў Львове, ў дамініканскім кляштары. Кароль Жыгімонт Аўгуст загадаў львоўскаму старосце вярнуць Гальшку мужу. А ў гэты час, у 1559 г., у Львоў прыехаў слуцкі князь Сямён Юр'евіч Алелькавіч і абвянчаўся з Гальшкай.

Нягледзячы на гэта, загад караля быў выкананы і Гальшку Астрожскую адабралі ў князя Сямёна Алелькавіча і аддалі Гурку. Гальшка прапанавала Гурку за сябе выкуп у 100 тысяч злотых, але Лукаш Гурка пасадзіў яе ў замкавую турму ў адным са сваіх замкаў каля Познані і трымаў яе там 14 гадоў за адмову жыць з ім. Неўзабаве князь Сямён Алелькавіч памёр (у 1560 г.), і Лукаш Гурка зноў прапанаваў Гальшцы жыць з ім. Тая зноў адмовілася, і Гурка пратрымаў яе ў турме да самай сваёй смерці. Толькі тады яе аддалі яе дзядзьку, князю Канстанціну Васілю Канстанцінавічу Астрожскаму. Уся гэтая справа Гальшкі Астрожскай узрушыла тагачаснае грамадства і выклікала шырокі розгалас. А вырак вялікага князя Жыгімонта Аўгуста Дзмітрыю Сангушку застаўся ў моцы.

Трагічна скончылася жыццё і малодшага брата Рамана Сангушкі, Яраслава, які ў 1564 годзе быў застрэлены падчас застолля нейкім шлях-

ціцам Жэлехам. Ды і сам Раман Сангушка памёр, калі яму было толькі 34 гады, памёр маладым і яго адзіны сын Фёдар, не пакінуўшы патомства.

Раман Сангушка атрымаў выхаванне пры каралеўскім двары. Кароль Жыгімонт Аўгуст потым, у 1567 г., пісаў пра Сангушку ў адным са сваіх прывілеяў (грамат), што ён «амаль са свайго дзяцінства... узяты ў нашы пакоі». Шмат часу юнак прысвячаў вайсковай службе, у якой потым праславіўся. У 17 гадоў Раман Сангушка, пасля трагічнай смерці старэйшага брата, становіцца галавой сям'і. Адначасова на чале свайго прыватнага вайсковага атрада («почату»), набранага са шляхты з маёнткаў сям'і Сангушкаў, Раман Сангушка з 1555 года выходзіць на службу паводле універсалаў караля. У гэтым годзе Сангушка накіроўваецца ў Кіеў пад камандаваннем гетмана найвышэйшага Мікалая Радзівіла Рудога, каб абараняць горад ад магчымага нападу маскоўскіх войскаў, бо ў Вялікім княстве Літоўскім лічылі, што цар Іван IУ можа ў кожны момант распачаць вайну. У наступным годзе Раман Сангушка са сваім атрадам праходзіў службу пад камандаваннем князя Канстанціна Васіля Астрожскага, маршалка Валынскай зямлі, і ў кастрычніку 1556 г. быў адпушчаны са службы з добрай адзнакай з боку князя Канстанціна Астрожскага.

Ужо ў лютым 1557 г. вялікі князь Жыгімонт Аўгуст прызначыў Рамана Сангушку старостай житомірскім, і Р.Сангушка знаходзіўся ў житомірскім замку і рыхтаваў яго да магчымай абароны. На вайсковую экспедыцыю ў Інфлянты (Лівонію) Сангушка ў тым жа годзе адправіў набраную на службу роту, а сам застаўся ў житомірскім замку і фарміраваў гарнізон замка. У студзені 1558 г. Раман Сангушка прыняў удзел у адпоры моцнаму нападу крымскіх татараў на Падолію, знаходзячыся пад камандаваннем Грыгорыя Хадкевіча, у той час кіеўскага ваяводы. Атрад Рамана Сангушкі ўдзельнічаў у некалькіх баях з крымскімі татарамі, адбіваючы ў іх «ясыр» (захопленых у палон для продажу ў рабства ўкраінскіх сялян, юнакоў і дзяўчат).

Пакуль Р.Сангушка знаходзіўся ў Житоміры, яго малодшы брат Яраслаў Сангушка вясной 1558 г. паехаў у Вільню і перадаў вялікаму князю Жыгімонту Аўгусту скаргу абодвух братоў на забойцаў іх старэйшага брата Дзмітрыя. Вялікі князь разгледзеў скаргу і выдаў позву ў суд Бэаце Астрожскай, маці Гальшкі, бо яна загадала забіць Дзмітрыя Сангушку ў дзяржаве «іншай, вольнай ад нашага выраку». Выдадзеная вялікакняжацкай канцылярыяй позва ў суд пасмяротна рэабілітавала Дз.Сангушку.

У канцы 1558—пачатку 1559 года Раман Сангушка знаходзіўся ў гасцях у кіеўскага ваяводы Грыгорыя Аляксандравіча Хадкевіча ў яго маёнтку Харошчы на Падляшшы (недалёка ад Беластока). Тут Раман Фёдаравіч Сангушка ажаніўся з яго дачкой Аляксандрай. Наступныя гады ён заставаўся ў Житоміры. Восенню 1561 г. яму прыйшлося зай-

мацца адбудовай драўлянага замка ў Жытоміры, які згарэў у выніку падпалу. Улетку 1561 г. Сангушка прымаў удзел у ваеннай кампаніі ў Інфлянтах на чале свайго «почату», яго атрад дзейнічаў ля ракі Заходняя Дзвіна. Потым Р.Сангушка з атрадам быў перакінуты на Украіну, якой пагражала новае ўварванне крымскіх татараў. У маі—чэрвені 1563 г. Раман Сангушка ўдзельнічаў у працы сойма Вялікага княства Літоўскага, на якім адным з галоўных пытанняў было фінансаванне патрэб на вайну з Маскоўскай дзяржавай і набор войска. 19 чэрвеня 1563 г. разам з іншымі сябрамі вялікакняжацкай рады ён падпісаў пастанову аб скліканні войска на надзвычайны попіс (агляд з перапісам усіх) каля Крэва. Пасля попісу войска мусіла ісці на Полацк, каб вызваліць яго ад войска цара Івана Грознага. Восенню 1563 г. Сангушка са сваёй ротай застаўся ў Беларусі. Ён падпарадкоўваўся гетману вялікаму Мікалаю Радзівілу Рудому і гетману дворнаму (польнаму) Грыгорыю Хадкевічу. Разам з гетманамі Раман Фёдаравіч Сангушка на чале сваіх рыцараў удзельнічаў у пераможнай бітве каля Улы на Іваньскіх палях, пад Чашнікамі 26 студзеня 1564 года, у якой 10-тысячнае (па іншых звестках 4-тысячнае) беларуска-літоўскае войска разграміла ўшчэнт 30-тысячную армію князя Пятра Шуйскага (а сам П.Шуйскі быў забіты падчас бітвы простым мужыком, як сведчыць хроніка). У Полацк вярнулася толькі 5 тысяч уцекачоў. У бітве ля Улы Раман Сангушка камандаваў коннай ротай, якая налічвала 200 коннікаў, і быў адзначаны як адзін з камандзіраў сярэдняга рангу, якія вылучыліся падчас бітвы. Далей на працягу 1564 і 1565 гадоў Раман Сангушка зноў знаходзіўся ў Жытоміры, каб бараніць горад і замак ад нападаў крымскіх татараў, якія ішлі на Валынь на чале з ханам Дэўлет-Гірэем.

За вайсковыя заслугі князь Раман Фёдаравіч Сангушка быў узнагароджаны. 25 сакавіка 1566 года сойм Вялікага княства Літоўскага ў Вільні прыняў пастанову аб новым адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле дзяржавы з утварэннем новых ваяводстваў і паветаў. Вінніцкае і Брацлаўскае старосты ўтварылі новае ваяводства, якое спачатку называлася Брацлаўскім і Вінніцкім (аднак хутка назва змянілася на Брацлаўскае). 30 сакавіка 1566 года сваім прывілеем вялікі князь Жыгімонт Аўгуст прызначыў на пасаду першага брацлаўскага ваяводы Рамана Сангушку.

У сваім прывілеі Жыгімонт Аўгуст пісаў, што Раман Сангушка, «бываючы шмат разоў у вялікіх бітвах мужна супраць непрыяцеля нашага змагаўся, не шкадаваў здароўя з праліваннем крыві сваёй, рабіў тое, што сапраўднаму і праўдзіваму рыцару і роду княжацкаму належала рабіць». Адначасова князь Раман атрымаў у сваё валоданне двор у Вінніцы і некалькі вёсак на тэрыторыі ваяводства. Цяпер паўнамоцтвы Р.Сангушкі пашыраліся, і ён займаўся ўмацаваннем замкаў у ваяводстве для бяспекі

ад нападаў крымскіх татараў і таксама захаваннем парадку на тэрыторыі ўсяго Брацлаўскага ваяводства.

У гэты ж час таксама падвышаўся на пасадах і цесць Сангушкі, Грыгорый Аляксандравіч Хадкевіч, які з пасады гетмана дворнага быў прызначаны ў пачатку 1566 г. на пасаду гетмана найвышэйшага (вялікага). Гэта паспрыяла кар'еры і зяця. У канцы 1566—пачатку 1567 г. Раман Сангушка знаходзіўся ў Гродне, дзе адбываліся нарады сойма Вялікага княства Літоўскага. Р.Сангушка разам з іншымі панамі раднымі 26 снежня 1566 года ратыфікаваў дыплом вялікага князя Жыгімонта Аўгуста аб уключэнні Інфлянтаў (Лівоніі) у склад Вялікага княства Літоўскага, бо кожнае змяненне дзяржаўных граніц патрабавала абавязковага рашэння паноў рады — вышэйшага пастаяннага дзяржаўнага органа. 26 лютага 1567 г. вялікі князь Беларуска-Літоўскай дзяржавы Жыгімонт Аўгуст разаслаў да ўсіх вайсковых камандзіраў свой універсал, у якім паведамляў, што даручыў Раману Сангушку справы гетмана дворнага. Гэта не было прызначэнне на пасаду, але азначала выкананне абавязкаў (у афіцыйных дакументах Сангушка называўся «спраўцам гетманства дворнага»).

Гетман Грыгорый Хадкевіч выклікаў Сангушку ў армію для вядзення дзеянняў. Вясной 1567 г. Сангушка ўжо быў у Лукомлі, каб адтуль сачыць за дзеяннямі войскаў Івана Жахлівага і прадухіляць іх спробы будаваць замкі на акупаванай тэрыторыі на поўдзень ад захопленага імі ў 1563 годзе Полацка. У маі 1567 г. Раман Сангушка, паводле загаду Г.Хадкевіча, узначаліў усе беларуска-літоўскія атрады, якія знаходзіліся ў Віцебскім ваяводстве і перанёс сваю штаб-кватэру ў Чашнікі. У гэты час пад яго наглядам ішло будаўніцтва і ўзмацненне абарончых замкаў у Чашніках, Туроўлі і на рацэ Сорыцы. З гэтых крэпасцяў павінны былі наступаць беларуска-літоўскія войскі, каб вызваліць Полацк ад войскаў цара Івана Жахлівага. Адсюль накіроўваліся ў бок непрыяцеля атрады вайсковай разведкі. Ад гетмана найвышэйшага Грыгорыя Хадкевіча ён атрымоўваў падмацаванні і звесткі аб рухах ворага ў іншых мясцінах.

Вайсковая разведка была неабходная, бо па колькасці воінаў беларуска-літоўскае войска было значна меншае, чым рускае. На тэатры ваенных дзеянняў у паўночна-усходняй частцы Беларусі ўлетку 1567 г. знаходзіўся атрад у 1350 чалавек конніцы і 550 пяхоты пад началам князя Рамана Фёдаравіча Сангушкі, які прымяняў тактыку неспадзяваных папераджальных удараў пасля стараннай і ўкрытай разведкі, насуперак пашыранай тады тактыцы дзённых бітваў з усімі прызнакамі адкрытага выхаду войскаў на баявыя пазіцыі ў шырокім полі. Такая тактыка Рамана Сангушкі пры меншых, чым у непрыяцеля, сілах пачала прыносіць поспехі. Хутка аказія надарылася.

У ліпені 1657 г. маскоўскія ваяводы князь Пётр Сямёнавіч Абаленскі-

Сярэбраны, Г.Колычаў і князь Юрый Іванавіч Такмакоў разам са служылым татарскім царэвічам Амуратам выступілі з царскімі войскамі і татарскім войскам з Полацка і перайшлі Заходнюю Дзвіну, каб забяспечыць пабудову крэпасці Суша (на поўдзень ад Полацка) на востраве, на возеры з той жа назвай. Частка расійскіх войскаў на чале з Ю.І.Такмаковым заняла востраў і пачала будаваць на ім крэпасць. Іншыя рускія сілы спыніліся непадалёку ў палявым лагеры ва ўрочышчы Суша. Раман Фёдаравіч Сангушка правёў разведку і, сабраўшы крыху больш за 2 тысячы жаўнераў, вырушыў у паход на маскоўскае войска, у чатыры разы большае за яго войска. Храніст М.Бельскі адзначаў: «20 дня ліпеня, маючы пэўную ведамасць ад разведчыкаў аб войску маскоўскім, якога было з татарамі 8000, рушыў з Чашнікаў да іх».

На досвітку 21 ліпеня прыйшоў Р.Сангушка на Іваньскія палі, паблізу ад лагера маскоўскіх войскаў. Спачатку яго жаўнеры лёгкай конніцы (казакі) напалі на перадавую варту ў 100 коннікаў і разгрмілі іх. Потым знянацку напалі на лагер, пяхота хутка раскінула драўляную агароджу, а конніца, не даўшы магчымасці рускім воінам і татарам пастроіцца ў баявыя парадкі, уварвалася ў лагер. За кароткі час маскоўскае войска было амаль цалкам разгромлена. Шмат варожых воінаў было ўзята ў палон, быў захоплены непрыяцельскі абоз і вызвалены з палону жаўнеры свайго войска і мірныя жыхары, у асноўным сяляне, захопленыя падчас паходу маскоўскага войска і татараў з Полацка.

Гэтае паражэнне князя Пятра Абаленскага-Сярэбранага і царэвіча Амурата не змяніла намераў Ю.І.Такмакова пабудаваць крэпасць на возеры Суша. Сангушка спрабаваў заблакаваць Такмакова на востраве, але ў яго не было артылерыі. Таму Р.Сангушка перайшоў да доўгатэрміновай блакады непрыяцеля і намагаўся не дапусціць прыходу падмацаванняў да Такмакова з Полацка.

Паміж канцом першай дэкады і сярэдзінай верасня таго ж 1567 года князь Раман даведаўся ад сваёй разведкі аб новым войску, якое было накіравана з Полацка да Сушы. Гэтым маскоўскім войскам кіраваў ваявода князь Осіп Шчарбаты і яго намеснік князь Юрый Барацінскі; усяго маскоўскіх воінаў было 6 тысяч чалавек. Разам з імі ішоў 3-тысячны татарскі атрад Сеіт-Мурзы. Руска-татарскае войска ішло маршам з крэпасці Улы ў крэпасць Сушу з вялікім абозам, у якім былі і запасы харчавання для войска Такмакова. Р.Сангушка і на гэты раз пасля дакладнай разведкі са сваім цяпер ужо 3-тысячным войскам знянацку напаў на непрыяцеля, які быў разгромлены ў кароткім баі. Абодва ваяводы, О.Шчарбаты і Ю.Барацінскі, былі ўзяты ў палон, а ўвесь абоз з 1300 вазоў узяты як трафей.

Пасля гэтай перамогі ў верасні 1567 г. Раман Сангушка разам з атрадам кашталяна полацкага Юрыя Зяновіча зноў абложыў крэпасць Сушу,

але ўзяць яе не здолеў з-за адсутнасці гарматаў і абмежаваўся блакадай крэпасці. Адначасова Сангушка займаўся забеспячэннем свайго войска і дамагаўся ад вялікакняжацкай улады грошай для выплаты іх войску за службу. Даглядаў ён і пабудовы крэпасці ў Вароньчы. Паколькі ў дзяржаўным скарбе Вялікага княства Літоўскага грошай бракавала, Р.Сангушка пазычыў яшчэ 15 жніўня 120 копаў грошай літоўскіх пад заклад свайго маёнтка Дольска (ля Прыпяці) у Пінскім павеце.

У кастрычніку 1567 г. выехаў Раман Сангушка да галоўнага лагера беларуска-літоўскага войска пад Лебедзевам (недалёка ад Маладзечна), дзе вялікі князь збіраў армію для наступу супраць расійскіх войскаў у Беларусі. Тут быў зроблены попіс (перапіс) гэтага земскага войска (апалчэння), якое складалася з каля 35 тысяч чалавек, з іх 27 776 коннікаў, 5 694 жаўнераў-пехацінцаў і 1518 чалавек пешай шляхты. Акрамя таго, у вялікага князя Жыгімонта Аўгуста было яшчэ 12 тысяч надворнага войска. Сангушка выставіў у земскае войска са сваіх маёнткаў «почат» са 100 коннікаў і 50 драбаў-пехацінцаў з рушніцамі. Два месяцы войска стаяла ў Лебедзеве, а потым у Радашковічах. Жыгімонт Аўгуст не падтрымаў рашучых дзеянняў, бо вырашалася важная дзяржаўная справа: рыхтавалася інтэграцыя Польшчы і Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Дэлегаты польскага сойму прыбылі ў вайсковы лагер з прапановай аб дзяржаўнай уніі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, а шляхта, якая сабралася ў апалчэнне, у якасці палявога сойму вырашала гэтую справу. Потым войска Вялікага княства Літоўскага падзялілася: 12 тысяч з вялікім князем пайшлі ў Койданаў у якасці рэзерву, астатняя армія перайшла ў Барысаў і яго ваколіцы.

У 1567 г. за яго вайсковыя заслугі вялікі князь Жыгімонт Аўгуст надаў Раману Сангушку вёскі Чэрньча, Гарадок і Казлінічы ў Луцкім павеце.

У студзені 1568 г. войска Вялікага княства Літоўскага на чале з гетманам інфлянцкім і маршалкам земскім Янам Хадкевічам накіравалася да ўмацаванай рускай крэпаці Улы на р. Заходняя Дзвіна, але ўзяць яе не здолела. Да абкружанага гарнізона прыбыла дапамога з Полацка. Штурм 2 сакавіка 1568 г. вынікаў не даў. Прыйшлося зняць аблогу і адыйсці. У гэты час Раман Сангушка займаўся пабудовай і забеспячэннем узбраеннем і боепрыпасамі замкаў у Дрысе, Лепелі, Лукомлі, Чашніках, Вароньчы і Крывіне. Рэзідэнцыя яго была ў Чашніках, куды ён атрымоўваў для замкаў гарматы, якія прысылаў яму Грыгорый Хадкевіч з Барысава. Як узнагароду за сваю вайсковую службу Раман Сангушка 20 сакавіка 1568 г. атрымаў Рэчыцкае староства.

Вясной 1568 г. Сангушка зноў вырушыў на фронт і камандаваў усімі беларуска-літоўскімі войскамі на поўначы Беларусі. Асноўнай яго задачай было перашкаджаць маскоўскім войскам будаваць крэпасці на за

нятай імі тэрыторыі, каб не даць ім замацавацца тут. Ён працягваў набіраць жаўнераў у коннае войска, але ў дзяржаўным скарбе не хапала грошай і Сангушка меў пастаянныя клопаты з выплатай грошай войску. Адначасова князь Раман дастаўляў харчаванне ў Віцебск і Сураж дзякуючы дапамозе мяшчан і мясцовай шляхты. Такім чынам, непрыяцель не меў у Беларусі ў сваім валоданні гарадоў і вялікіх замкаў, акрамя Полацка. Р.Сангушка ўвесь час пільна сачыў за рухамі маскоўскага войска. Найбольшую ўвагу ён удзяляў рускаму гарнізону крэпасці Улы ля Заходняй Дзвіны. Улетку 1568 г. Раман Сангушка спрабаваў зноў блакіраваць Улу, але аблога вынікаў не дала і ён вымушаны быў праз шэсць тыдняў адыйсці ад крэпасці. Калі Р.Сангушка даведаўся, што туды прыбылі з Полацка дадатковыя маскоўскія атрады і ў гарнізоне Улы пачаўся прыём у ваяводаў і агульныя ўрачыстасці з частаваннем гарэлкай, ён у ноч з 20 на 21 верасня 1568 г. вярнууся да Улы і яго жаўнерам удалося падыйсці да замку, бо і варта на сценах была п'яная і не заўважыла падыходу атрада Р.Сангушкі. Маючы дакладны план замка, складзены падчас ранейшых аблог, Сангушка вызначыў месцы, якія лепш было атакаваць. Спачатку да замка па рацэ былі накіраваныя на чаўнах казакі, якія атакавалі Улу з боку ракі. Калі ўвага маскоўскіх воінаў была адцягнута першай атакай, ён кінуў пяхоту на штурм палісада. Адначасова жаўнеры пачалі выламываць брамы і падпалілі драўляныя сцены замка. Маскоўскія ваяводы і воіны разгубіліся і бязладна абараняліся. Атаку завяршыла конніца, якая ўплаў па рацэ дасягнула крэпасці і ўварвалася ў яе. Гарнізон Улы быў разгромлены, а замак спалены. Раман Сангушка захапіў у палон двух ваяводаў Вельямінавых, 300 знатных палонных і 800 стральцоў. Было ўзята і некалькі гармат. Пасля ўзяцця Улы князь Раман Сангушка пачаў адбудоўваць замак і пакінуў там гарнізон. Ён атрымаў ліст ад Жыгімонта Аўгуста з падзякай за ўзяцце Улы. Вялікі князь пазней загадаў Сангушку застацца ў Полацкім ваяводстве для абароны тэрыторыі. Аднак ваенныя дзеянні фактычна спыніліся, а ў 1570 г. паміж Маскоўскім царствам і Рэччу Паспалітай было падпісана перамір'е. Інфлянцкая вайна зацягнулася на доўгія гады, суправаджалася шматлікімі ахвярамі і разбурэннем гарадоў і вёсак, вялікімі грашовымі і матэрыяльнымі затратамі. Але ў вайне быў зроблены толькі перапынак.

Увесь наступны час Раман Сангушка заставаўся на паўночна-усходнім памежжы, умацоўваючы тут замкі. А ў гэты час разгортваліся падзеі вялікага палітычнага значэння. Ішло канчатковае аб'яднанне Беларуска-Літоўскай дзяржавы (Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага) і Польшчы ў федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую.

Непасрэднай прычынай заключэння Люблінскай уніі 1569 года былі агульныя няўдачы войска Вялікага княства Літоўскага ў час першага

перыяду Лівонскай (Інфлянцкай) вайны, страта ў 1563 г. Полацка. Польская шляхта і магнаты намагаліся ўключыць Вялікае княства Літоўскае ў склад сваёй дзяржавы. Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст, апошні з мужчынскай лініі Ягелонаў, хацеў замацаваць саюз Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, баючыся, што абедзве дзяржавы пасля яго смерці разарвуць персанальную унію, якая існавала раней, і выберуць кожная свайго ўласнага валадара. Беларуская шляхта, ў сваёй большасці яшчэ праваслаўная, была прыхільніцай аб'яднання з Польшчай, каб уратаваць сваю дзяржаву ад захопу яе Іванам Грозным. Яна таксама дамагалася пашырыць свае палітычныя правы і ўраўнаваць іх з правамі польскай шляхты. Магнаты Беларусі і Літвы былі супраць цеснага саюза з Польшчай ці аб'яднання ў адзіную дзяржаву, бо тады яны страчвалі сваё кіруючае становішча ў дзяржаве. Яны прапанавалі фактычна толькі абарончы саюз. Перагаворы працягваліся некалькі гадоў.

Урэшце 10 студзеня 1569 г. у Любліне адкрыўся агульны сойм Польшчы і Вялікага княства Літоўскага для абмеркавання і падпісання акту дзяржаўнай уніі. У гэты час Раман Сангушка не паехаў у Люблін на агульны сойм, матывуючы гэта дрэнным станам здароўя, ён у пачатку 1569 г. пераехаў у свой маёнтак і горад Уладаву ў Брэст-Літоўскім павеце. У канцы лютага большасць дэпутатаў ад Вялікага княства Літоўскага, у тым ліку амаль усе магнаты, не згаджаючыся з польскім праектам уніі, пакінулі Люблін. А ў гэты час польскія дэпутаты разам з дэпутатамі ад Падляшша прынялі пастанову, а кароль Жыгімонт Аўгуст 5 сакавіка падпісаў акт аб далучэнні Падляшша да Польшчы. Паны рада Вялікага княства Літоўскага заявіла пратэст, аднак большасць шляхты іх не падтрымала. Дэпутатам ад Вялікага княства Літоўскага быў устаноўлены тэрмін, каб яны вярнуліся. Некаторыя магнаты былі пазбаўлены каралём сваіх пасад і месц у Радзе Вялікага княства Літоўскага.

Менавіта ў гэты час віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Руды 13 сакавіка запрасіў Рамана Сангушку прыбыць у Вільню на нараду аб уніі з Польшчай. Сангушка адказаў у лісце, што гатовы прыехаць, але не паведаміў, якую пазіцыю ён займае. У сакавіку 1569 г. урадоўцы і зямяне Брацлаўскага ваяводства звярнуліся да Рамана Фёдаравіча Сангушкі як да свайго ваяводы ў сувязі з праектам на Люблінскім сойме аддзялення Брацлаўскага ваяводства ад Вялікага княства Літоўскага і інкарпарацыі ў склад Польшчы. Яны былі гатовыя выступіць са зброяй супраць такой інтэграцыі. А ў гэты час кароль Жыгімонт Аўгуст заклікаў яго прыбыць у Люблін. 4 красавіка 1569 г. Р.Сангушка адказаў каралю, што не можа прыехаць з-за дрэннага стану здароўя і з-за дрэннага стану дарог, якія вясной сталі непралазнымі.

Кароль і вялікі князь Жыгімонт Аўгуст 26 красавіка 1569 г. выдаў

акт аб далучэнні Валынскай зямлі да Польшчы, сойм гэта зацвердзіў 26 мая 1569 г., апошні тэрмін вяртання дэпутатаў на Люблінскі сойм быў прызначаны на 23 мая. Яны былі павінны прынесці прысягу на вернасць Кароне Польскай. Працягваліся адстаўкі. Урэшце ў маі 1569 г. дэпутаты і сенатары (сябры паноў рады) пачалі вяртацца ў Люблін. Урэшце 28 мая 1569 г. у Люблін прыехаў і Раман Сангушка, дзе ўрачыста перадаў каралю маскоўскіх палонных, сцягі і гарматы, узятыя ў бітве за Улу. 1 чэрвеня Сангушка выступіў на сойме і заявіў аб гатоўнасці прыняць прысягу на вернасць Кароне, але пры ўмове, што шляхта Валыні і Брацлаўскага ваяводства захавае ўсе тыя прывілеі, якія мела ў Вялікім княстве Літоўскім. Кароль пахваліў яго за такую прамову і сказаў, што Брацлаўскае ваяводства разам з Валынню ўжо далучана да Польшчы. Р.Сангушка стаў перад каралём на калені, папрасіў яго вызваліць ад прысягі Вялікаму княству Літоўскаму, а потым прынёс прысягу Кароне (Польшчы) як уладальнік маёнткаў на Валыні і як брацлаўскі ваявода. Пасля гэтага ён заняў месца ў сенаце. 2 ліпеня 1569 г. Сангушка прынёс прысягу Вялікаму княству Літоўскаму як польскі сенатар і прывесіў сваю пячатку да акту Люблінскай уніі. Такім чынам, у рашучы момант Р.Сангушка праявіў сябе як прыхільнік інкарпарацыі ўкраінскіх зямель у склад Польскага каралеўства. Такая яго пазіцыя выклікала абурэнне іншых сенатараў (паноў рады) Вялікага княства Літоўскага і пагоршыла яго адносіны з імі. Такі пераход на пазіцыі згоды з уніяй ён тлумачыў ваенным становішчам і пагрозай страты незалежнасці Беларуска-Літоўскай дзяржавы з-за магчымай заваёвы яе тэрыторыі Маскоўскай дзяржавай. Адначасова заключэнне уніі з Польшчай давала Вялікаму княству Літоўскаму шанц выкарыстаць польскія войскі ў вайне, спецыяльна не ўхваляючы адмысловых грашовых падаткаў на іх утрыманне. Яны павінны былі ваяваць як саюзнікі з адной федэратыўнай дзяржавы. А гэта давала магчымасць вярнуць захопленыя царскімі войскамі тэрыторыі ў Полацкім ваяводстве і Інфлянтах. Падчас абмеркавання пытання аб заключэнні міру з Маскоўскай дзяржавай Раман Сангушка выступіў супраць гэтага плана і за працяг вайны, асабліва калі крымскі хан пачаў паходы ў глыбіню тэрыторыі Расіі, а таксама з-за варожых да Івана Грознага адносін Швецыі і Даніі, таксама ўцягнутых у канфлікт з-за Інфлянтаў.

Пасля Люблінскага сойма Раман Сангушка некалькі месяцаў знаходзіўся ў сваіх маёнтках на Валыні, галоўным чынам у Несухаежах. Як раз у гэты час кароль Жыгімонт Аўгуст выдаў у Кнышыне прывілей аб афіцыйным наданні князю Раману Фёдаравічу Сангушку годнасці гетмана дворнага Вялікага княства Літоўскага, пасаду якога Сангушка фактычна займаў ужо некалькі гадоў. У снежні 1569 г. Р.Сангушка зноў наведаў замкі ў Полацкім ваяводстве. 25 снежня 1569 г. ён паведамляў Жыгімонту Аўгусту, што ўзяў штурмам замак на Цётчы, на шляху, які

злучаў замак Туроўлю, заняты рускімі, з Полацкам. У лютым 1570 г. вярнуўся з фронту на Валынь, атрымаўшы вестку аб смерці жонкі. Увесь 1570 год ён правёў у сваіх маёнтках на Валыні. Вясной 1571 г. Сангушка ездзіў у Варшаву і, калі вяртаўся назад, захварэў «на гарачку» і спыніўся ў Ружане (на р. Нарве), 10 мая 1571 г. ён прадыктаваў тастамент, а 12 мая памёр. Быў пахаваны паводле сямейнай традыцыі ў царкве святога Мікалая ў Мельцах на Валыні.

Ад шлюбу з Аляксандрай Грыгор'еўнай Хадкевіч ён меў сына Рамана, які памёр у 1591 г. нежанатым (з ім скончылася локачская лінія роду) і трох дачок: Марыянну, якая памерла да 1587 г. дзяўчынай, Аляксандру (памерла ў 1602 г.), якая выйшла замуж за князя Януша Заслаўскага (потым валынскага ваяводу), Фядору, якая была замужам тройчы: за ваяводам падляшскім Станіславам Радзіміньскім, за князем Аляксандрам Пронскім і за ваяводам берасцейска-куяўскім Андрэем Ляшчынскім.

Побач з дзяржаўнай дзейнасцю Раман Фёдаравіч Сангушка займаўся і гаспадарчай. Пасля смерці брата Дзмітрыя ў 1554 г. Раман Сангушка атрымаў у спадчыну разам з братам Яраславам яго маёнткі. У тым жа годзе матка, якая выйшла замуж за Мікалая Збаражскага, адмовілася на карысць Рамана і яго брата Яраслава ад маёнткаў, што ёй запісаў пажыццёва яе першы муж, бацька Рамана і Яраслава, а яны складалі трэць усіх маёнткаў. Браты родавыя маёнткі не дзялілі, і пасля смерці Яраслава ў 1564 г., у якога не было сям'і, усе маёнткі на Валыні і ў Беларусі заставаліся ў Рамана Сангушкі. Адным з асяродкаў яго латыфундый стаў яго прыватнаўладальніцкі горад Уладава на рацэ Заходні Буг у Берасцейскім павеце, другім цэнтрам — мястэчка Галятын у Луцкім павеце. У 1564 г. яго намаганнямі ва Уладаве была пабудавана царква.

Раман Фёдаравіч Сангушка карыстаўся павагай у сучаснікаў як «муж цвярозы і вайсковай справе добра дасведчаны». Яго ваенныя поспехі былі вынікам прымянення ім тактыкі нерэгулярнай вайны, удараў па праціўніку знянацку, малымі сіламі і пасля добра арганізаванай разведкі.

Літаратура:

1. Bielski M. Kronika. Tom II. Sanok, 1856; Stryjkowski M. Kronika polska, litewska, zmodzka i wszystkiej Rusi. Tom II. Warszawa, 1846.

2. Prochaska A. Roman Sanguszko, hetman polny litewski // Przewodnik Naukowy i Literacki. Tom XVII (Rok 1889).

3. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy końca czternastego wieku. Warszawa, 1885.

4. Piotrowski K. Rodowód książąt Sanguszków Olgierdowiczów, Gumniska, 1931.

5. Machynia M. Sanguszko, Roman // Polski Słownik Biograficzny. Tom XXXIV/4, zeszyt 143, Wrocław–Warsawa–Kraków, 1993, s. 500–505.

6. Lulewicz H. Roman Sanguszko // Hetmani Rzeczypospolitej obojga narodów. Warszawa, 1995.

Анатоль Грыцкевіч

Васіль ЦЯПІНСКІ

(памёр каля 1600)



ыдатны беларускі мысліцель, гуманіст-асветнік, публіцыст, перакладчык, пачынальнік біблейскай (новазапаветнай) выдавецкай традыцыі на роднай мове.

Жыццёвы шлях Цяпінскага амаль не асветлены пісьмовымі крыніцамі. Год нараджэння невядомы. Традыцыйна (без якіх-небудзь грунтоўных падстаў) лічыцца, што ён нарадзіўся недзе ў 40-х гадах XVI ст. Пацвердзіць ці абвергнуць гэту гіпотэзу даволі цяжка. Датаваны 1578 годам партрэт Цяпінскага выклікае сумненні адносна паходжання гэтага мастацкага твора. Няма звестак аб вучобе Васіля Цяпінскага ў замежных універсітэтах, што таксама дало б нейкія падставы для больш дакладнага вызначэння даты яго нараджэння. Як сведчаць знойдзеныя намі дакументы, у канцы 50-х гадоў бацькі Васіля Цяпінскага былі ўжо вельмі сталага ўзросту (тэстамент маці напісаны ў 1563 г., а бацька памёр раней). Адсюль можна лічыць, што Васіль Цяпінскі нарадзіўся ў 30-я — найпазней у пачатку 40-х гадоў XVI ст. У 50-х гадах ён самастойна удзельнічаў у судовых працэсах і не быў малодшым сынам у час складання тэстаменту. У ім згадваюцца таксама яшчэ два сыны Матроны Мікалаеўны — Ждан і Іван Война, які ў пачатку 60-х гадоў яшчэ патрабаваў апякунства, а таксама даволі дарослая ўнучка Марына.

Новыя архіўныя дакументы і даследаванні дазваляць пашырыць надзвычай скупыя гістарычныя звесткі аб жыццёвым шляху Цяпінскага, яго сваяцкіх і сямейных сувязях.

Род Цяпінскіх становіцца вядомым у актах Вялікага княства Літоўскага толькі з XVI ст. як «кроўнародасны» (блізка параднёны) з родам

Слушак. Слушкі былі знакамітай фаміліяй у другой палове XVI—XVII стст., займалі многія важныя дзяржаўныя пасады, удзельнічалі ў соймах і ўсіх буйных войнах. Згодна са звесткамі некаторых пазнейшых гербоўнікаў, якія пры апісанні генеалагічных каранёў знатных асоб нярэдка прытрымліваліся легендарных версій, Слушкі атрымалі шляхецтва яшчэ пры Вітаўце разам з зямельнай маёмасцю. Арыгінальнымі актамі гэта не пацвярджаецца, але пэўныя падставы маюцца. У 1547 г. спадчынныя дакументы кіеўскага гараднічага Івана Грыгор'евіча Слушкі загінулі ў час страшэннага пажару ў Мінску. Па хадайніцтву Слушкі гаспадарская канцылярыя выдала яму пацверджанне на яго спадчынныя маёнткі. У гэтым акце ўпершыню ў вядомых зараз гістарычных крыніцах згадваецца і Цяпіна. Кіеўскі гараднічы паведаў пра сваё права да Цяпіна: «Напервей што ему от брата его рожоного Павла Григоревича Служчича досталос(ь) на ровном делу именье их отчизное и дедизное на имя Тяпино» і на тое маюцца лісты і «твердасці» Вітаўта і іншых вялікіх князёў літоўскіх. Невядома, праўда, хто былі яго першымі ўладальнікамі, сам Слушка згадвае пра маёмасныя правы на Цяпіна толькі свайго бацькі — Грыгорыя і дзеда — «именье отчизное и дедизное». Але па гэтых звестках мы можам даведацца нарэшце пра першых рэальных заснавальнікаў рода Слушак і Цяпінскіх. Грыгорый Слушка — бацька кіеўскага гараднічага. Імя дзеда выяўляецца па іншых крыніцах. У судовым акце ад 14 чэрвеня 1514 г. згадваецца ліст, засведчаны слугамі навагародскага ваяводы, у т.л. Грыгорыем Амельянавічам Слушкай. Па свайму сацыяльнаму становішчу Амельян, верагодна, належаў да баярскага службовага стана, бо валодаў зямельнай маёмасцю. З нашчадкаў двух яго сыноў адзіны род Слушак стаў размяжоўвацца на два роднасных: Слушак (патомкаў Грыгорыя) і Цяпінскіх (ад Івана). Імя агульнага пачынальніка роду надоўга засталося ў памяці і ў поўных родавых прозвішчах Слушак і Цяпінскіх. Нават судовы акт ад 28 ліпеня 1604 г. згадвае аднаго з сыноў Васіля Цяпінскага, земяніна ваяводства Полацкага, Цяпінскім Амельянавічам.

Сыны Івана Амельянавіча, «рожоныя» (родныя) браты Мікалай (бацька Васіля) і Мацей Цяпінскія, упершыню названы ў попісу войска Вялікага княства Літоўскага 1528 г. У беларускай гістарыяграфіі гэты акт не зарэгістраваны. Магчыма, недагляд тлумачыцца тым, што яны апісаны тут без «мясцовага» прозвішча — Цяпінскія. Попісы войска (шляхецкага паспалітага рушання) праводзіліся нерэгулярна, звычайна ў выніку нейкіх міжнародных ускладненняў ці пагрозы вайны. Яны змяшчалі агульныя звесткі аб сацыяльным і маёмасным становішчы шляхты і колькасці выстаўляемых узброеных коннікаў. Пастановы вальных соймаў вызначылі адпаведныя нормы: 1 коннік з 8 служб сялянскіх у канцы 20-х гадоў, з 10 служб — у сярэдзіне XVI ст.

Па гэтых звестках Цяпінскія ў пописы 1528 г. выглядаюць дробнымі землеўладальнікамі, але ўваходзяць у асобную групу службовай шляхты, апісанай адразу пасля рэестраў цэнтральных паветаў і «каней» удоў князёў, ваявод, паноў. У палявым попісе войска ВКЛ 1565 г. нябожчык Мікалай Амельянавіч ужо, зразумела, адсутнічае, а апасрэдавана ўпамінаецца яго сын Васіль Цяпінскі: «В середу месяца аукгуста 8 дня Васілей Тяпін'скі выслал пахолка на коні в пан(цыры), с тар(чай. — шчытом), з древом (кап'ём), а сам служыт пану маршалку дворному». Маршалкі дворныя — гэта набліжаная да двара вялікага князя літоўскага службовая шляхта, якая ў той час займалася самымі разнастайнымі справамі. Вызначыць, каму прыслугоўваў Васіль Цяпінскі, пакуль немагчыма. Само залічэнне яго ў гэтую групу прыдворных маршалкаў сведчыць аб яго рыцарскіх і службовых здольнасцях. Матэрыяльнае становішча Васіля Цяпінскага пазней некалькі палепшылася, бо на попіс войска 1567 г. ён выстаўляў двух коннікаў: з сваёй часткі маёнтка Латыголы і ў агульным спісе шляхты Мінскага павета. Сваяк Цяпінскіх — сын кіеўскага гараднічага Івана Грыгор'ева — Мікалай Слушка выстаўляў на попіс 1567 г. сем коннікаў з маёнткаў Новы Двор, Гатаў, Прысёлкі, Відагошч і з уладанняў сваёй жонкі шэсць.

Сярод даследчыкаў выказваліся розныя меркаванні наконт месцазнаходжання і ўладальнікаў маёнтка Цяпіна. Згодна з адной з новых версій, існавала некалькі адасобленых населеных пунктаў з такой назвай, якія належалі Слушкам і Цяпінскім. Гэта памылковая думка. У Вялікім княстве Літоўскім XVI ст. звычайнай справай быў падзел аднаго больш менш буйнога ўладання паміж некалькімі баярамі, панамі, шляхцiцамі, нярэдка павязанымі кроўнароднаснымі адносінамі. Скарга кіеўскага гараднічага пана Івана Грыгор'евіча Слушкі, запісаная ў студзені 1550 г. гаспадарскімі суддзямі, усё растаўляе на свае месца. Разам са сваімі кроўнымі братамі Слушка абвінавачваў троцкую ваяводзіну ў бяспраўным валоданні палавінай «власного отчизного местечка их в Чашъникох, а тое дей местечко на власнои земли их именя Тяпиньского...».

Матэрыялы полацкай рэвізіі 1552 г. дазваляюць удакладніць гэтыя звесткі. Сярод зямель полацкай шляхты згадваецца «именье отчызное, дворец Тяпино с пашнею», уладальнікамі розных частак якога былі Мацей і Мікалай Іванавічы Цяпінскія. Бацьку Васіля Цяпінскага належалі: «К тому дворцу слуг путных два, которые ему конём служать, а людей отчызных дымов дванадцать, которые по два дни в недели служать. А людей вольных куничных чотыры чоловеки, с которых ему куницы приходить сорок осмь гр(о)шей. Огородники два, которые ему по дню в недели служать. С того именья ку службе земской коня ставить». Згодна з той жа рэвізіяй «панове» Цяпінскія былі абавязаны ўмацоўваць Полацкі

замак, пастаўляць дрэва для гародні каля дзевятай сафійскай вежы.

Дробныя спадчынныя і набытыя ўладанні Цяпінскага ў 60—70-х гадах знаходзіліся ў розных паветах Вялікага княства Літоўскага. У актах яго называюць земянінам паветаў Віленскага, Мінскага, Лідскага. Сам ён звычайна залічаў сябе да зямян ваяводства Полацкага, дзе знаходзіўся і яго родавы маёнтак Цяпіна, у 18 вярстах ад Лепеля. Валодаў Цяпінскі землямі і па лініі сваёй жонкі, княжны Сафіі Данілаўны Жыжэмскай, якой належаў маёнтак Свіраны ў Віленскім павеце, і на залогавым праве распараджаўся маёнткам Вярсоцкім ў Лідскім павеце. У 1579 г. Цяпінскі памяняў Вярсоцкае на маёнтак Полкаўскае, уласнасць земяніна Лідскага павета Мікалая Янавіча Брацішэўскага. У 1591 г. маёнтак Цяпіна «за росказаньем» старосціча крычаўскага Мікалая Слушкі быў застаўлены на тры гады шляхціцу Юрыю Наркевічу.

Ваенныя калатнечы Інфлянцкай вайны не абмінулі Васіля Цяпінскага. У вопісу коннай роты, зробленым у Чашніках 1 чэрвеня 1567 г. аршанскім старостам Ф.С.Кмітай, упамінаецца «таварыш (малодшы афіцэр) Василей Тяпин на шесть кони. На нем панцер, шышак, шабля, гаркабуз, кончер, секирка, под ним дрыкгант (жарабец) сив». Некаторы час Цяпінскі служыў у вядомага дзяржаўнага дзеяча, падканцлера Вялікага княства Літоўскага Астафія Валовіча. Апошні падтрымліваў і часткова фінансаваў выдавецкую дзейнасць Сымона Буднага, Мацея Кавячынскага, Лаўрэнція Крышкоўскага ў Нясвіжы і, пры іх пасрэдніцтве, напэўна, пазнаёміўся з Цяпінскім. У 60-х гадах Цяпінскі зблізіўся з Сымонам Будным і іншымі дзеячамі рэфармацыйнага руху на Беларусі. Падзяляў яго сацыяльныя і канфесійныя (царкоўна-рэлігійныя) погляды, разам з ім удзельнічаў у галосных дыспутах на сінодах з польскімі і ліцвінскімі антытрынітарыямі. Антытрынітарызм у цэлым быў радыкальным сектанцкім адгалінаваннем еўрапейскага хрысціянства, бо ў сваёй тэалагічнай аснове падважваў адзін з яго галоўных дагматаў аб Св. Тройцы. У 60—80-х гадах XVI ст. у нетрах арыянскага руху ў Вялікім княстве Літоўскім і Польшчы (пераважна ў Малой Польшчы) абвастраліся ідэалагічныя супярэчнасці па важнейшых праблемах грамадскага і палітычнага жыцця. Некаторыя антытрынітарыі сталі падтрымліваць анархічныя і наіўна-камуністычныя праекты, выступаць за карэнную перабудову грамадства, ліквідацыю прыгонніцтва, адмаўляліся ад прыватнай уласнасці, удзелу ў дзяржаўных органах і палітыцы, ва ўсіх, нават абарончых, войнах. Пытанне аб дзяржаве, грамадзянскай адказнасці за лёс Айчыны і хрысціянства, захаванне ўнутранага спакою і талерантнасці абумовілі выступленні большасці «літоўскіх братоў» супраць падобных ідэй і спроб іх рэалізацыі. Падкрэсліваючы нежаданне некаторых польскіх палемістаў працягваць дыскусіі па праблемах

дзяржаўнасці, С.Будны даволі з'ездліва пісаў у сваёй кнізе «Аб свецкай уладзе» (Лоск, 1583): «Ты, знаць, аб тым не ведаеш, браце, што ў нас у Літве даўно не спяць (у шапку). Але Марцін Чаховіц і Вітрэлін маглі б расказаць аб гэтым, калі б адкрыць праўду пажадалі. Бо ў нас у 1578 годзе самі дазналіся, што ім некаторыя шляхцічы ў Лоску адпавядалі... Супярэчылі ім, што не ёсць супраць слова божага трымаць свецкую уладу, удзельнічаць у войнах і інш. Аб чым адразу ж пачалася дыспутацыя паміж Васілём Цяпінскім і Марцінам з Вітрэлінам. Не ведаю, праўда, чаму вашы, не напіраючы, да Жмудзі падаліся». Згодна іншых фрагментарных звестак (большасць актавых дакументаў літоўскіх братоў загінула) Цяпінскі разам з С.Будным і М.Чаховіцам удзельнічаў на сінодзе у Белжыцах у сакавіку 1569 г. Адзін з наступных сінодаў адбыўся, па словах С.Буднага, у 1574 г. «у Літве, у доме мілага брата Цяпінскага». Па ўдзячных спасылках Буднага адчуваецца сугучнасць іх тэалагічных поглядаў, у т. л. на неабходнасць прыняцця хрысціянскага хрышчэння свядома, у сталым узросце. Магчыма, сярод «новахрышчэнцаў» разам з Будным быў «мілы брат» Цяпінскі.

Дакладна невядома, калі Цяпінскі пачаў свае літаратурна-перакладчыцкія працы. Верагодна, ужо ў канцы 60-х гадоў з пачатку свайго больш-менш актыўнага ўдзелу ў рэфармацыйным руху. Для таго нават, каб дзейсна спрачацца з адукаванымі польскімі і некаторымі літоўскімі «братамі», трэба было ведаць царкоўную і свецкую гісторыю, багаслоўе, збіраць і вывучаць рукапісы, друкі, знаёміцца са шматлікімі творамі сваіх паплечнікаў і апанентаў. Узрошчаны ў праваслаўнай традыцыі (бо ў другой чвэрці XVI ст. практычна ўся паспалітая беларуская шляхта Полаччыны прытрымлівалася праваслаўя) Цяпінскі пасля сваёй рэлігійнай канверсіі (пераходу ў Рэфармацыю) працягваў цікавіцца і высока ацэньваць царкоўна-славянскія пераклады Св. Пісання. Тут ён крыху разышоўся з Будным, які, аддаючы належнае грэцкім і славянскім перакладам, лічыў больш дакладнымі лацінскія і старажытнаяўрэйскія аўтэнтыкі. Загадкавая постаць абаронцы славянскіх перакладаў Бібліі, якая далікатна згадваецца ў прадмове Буднага да Новага запавету (Лоск, 1574), магчыма, датычыцца Цяпінскага. «Тут для таго прыпомніў, — пісаў Будны ў сваёй прабежнай характарыстыцы славянскіх, грэцкіх і лацінскіх перакладаў, — бо нядаўна адзін (з дзеячаў-асветнікаў) пісаў да аднаго вялікага пана (верагодна, Валовіча ці князя Андрэя Курбскага), выхваляючы славянскія кнігі над усімі, што ёсць на свеце, сцвярджаючы, што праўдзівейшых ад іх ніколі не існавала». Сапраўды, славянскія тэксты сталі асновай для беларускага перакладу самога Цяпінскага.

Невядома, дзе была заснавана невялікая прыватная друкарня Цяпінскага. У навуковых працах звычайна згадваецца родавы маёнтак —

Цяпіна, але ёсць сур'ёзныя падставы для іншых версій. З 1563 г. амаль да канца 70-х гадоў большая частка Полаччыны знаходзілася пад царскай уладай. Многія полацкія шляхціцы атрымалі часовую адмену ў заходніх паветах Вялікага княства Літоўскага. Мясцовыя антытрынітарскія сіноды таксама збіраліся звычайна ў заходняй частцы ВКЛ, і адзін з іх адбыўся, як адзначаў С.Будны, «у Літве», у доме Васіля Цяпінскага. Пра Цяпіна як месца заснавання новай друкарні рэч не магла ісці. Рускі самадзержац пачаў Інфлянцкую вайну пад сцягам барацьбы з лютэранствам і каталікамі. Да лютэран маскоўскія ідэолагі без разбору залічвалі ўсіх рэфарматараў. Займацца выдавецкай і перакладчыцкай дзейнасцю ў гэтых умовах было небяспечна. Акрамя таго, Цяпіна знаходзілася «на Русі», у тым гістарычным рэгіёне Вялікага княства Літоўскага, які ахопліваў галоўным чынам землі на ўсход ад Мінска — Полаччыну, Віцебшчыну і іншыя. С.Будны добра адрозніваў паняцці «Літва» і «Русь» у тэрытарыяльна-геаграфічным сэнсе. Абіраць месцазнаходжанне друкарні прыходзіцца з трох маёнткаў, якія ў часы Інфлянцкай вайны размяшчаліся ў заходніх і цэнтральных паветах Вялікага княства Літоўскага: 1. Лытаголы, паблізу ад Маладзечна, Мінскі павет, з яго Цяпінскія пастаўлялі коннікаў на попіс войска 1567 г.; 2. «именье Версоцкое», Лідскі павет, набыты Васілём Цяпінскім ад яго жонкі Соф'і Жыжэмскай; 3. Свіраны, Віленскі павет, уладанне на залогавым праве. Звяртае на сябе ўвагу, што Свіраны сталі часовай уласнасцю Цяпінскага менавіта з пачаткам полацкай кампаніі Івана IV, бо былі ўзяты ў заклад ад Осцікаў у 1563 г. на тры гады з наступным працягам дагавора. Тут, у адным з гэтых маёнткаў (верагодна, у больш аддаленых ад Полаччыны Вярсоцкім ці Свіранскім), Васіль Цяпінскі заснаваў друкарню, падрыхтаваў і ўпершыню ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе выдаў на беларускай і царкоўнаславянскай мовах самую знакамітую кнігу Новага запавета, у якой прагалошвалася для веруючых магчымасць духоўнага выратавання — Евангелле (чецці тып). Захаваліся амаль два ідэнтычныя, на жаль, няпоўныя экземпляры выдання: у Архангельскім краязнаўчым музеі (№ 3531, арк. 2 — 36, 40, 44, 42—57, 60—62, усяго 56) і ў фондах Расійскай нацыянальнай бібліятэкі (збор Пагодзіна, 1.1.29, арк. 2—63 з блытанай фаліяцыяй). Пецярбургскі экземпляр абрываецца на 14-й главе Евангелля ад Марка. Друкаваны тэкст разам з рукапіснай прадмовай Цяпінскага — «Василей Тяпинский зацною монархии словенской, а злаца богобойным ласка и покой от бога отца и пана нашего Исуса Христа» прыплецены да рукапіснага зборніка, які некалі належаў вядомай бібліятэцы Супральскага манастыра.

Прадмова да кнігі — адзін з найлепшых узораў беларускай грамадска-палітычнай публіцыстыкі.

Час, калі пісаў Цяпінскі сваю прадмову да Евангелля, быў склада-

ным. Не скончылася яшчэ Інфлянцкая вайна, няпростымі былі адносіны паміж Польшчай і Вялікім княствам Літоўскім у новым дзяржаўным фарміраванні — Рэчы Паспалітай. Люблінская унія 1569 г. закранула дзяржаўныя інтарэсы Вялікага княства Літоўскага, у склад Кароны былі інкарпараваны (уключаны) былыя яго землі — Валынь, Кіеўскае ваяводства, Падляшша. Умацаваліся пазіцыі каталіцкай царквы, відавочнымі сталі першыя поспехі езуіцкага ордэна. У асяроддзі прывілеяваных пластоў грамадства, князёў, паноў і магнатаў, высокіх дзяржаўных ураднікаў Беларусі і Літвы сталі развівацца не столькі паланафільскія, колькі паланізацыйныя тэндэнцыі. Усё часцей у бытавым і грамадскім жыцці мясцовай знаці беларуская мова саступала сваё месца польскай, а часткова і лацінскай мовам, пашыралася рэлігійная канверсія (пераход шляхты ў каталіцызм), у крызісным становішчы апынулася праваслаўная царква. Пад уплывам новых дзяржаўна-палітычных умоў і ўнутраных супярэчнасцяў пачаўся імклівы адыход ад Рэфармацыі найбольш знатных і ўплывовых родаў. Гэтыя працэсы па-рознаму адбіваліся на духоўным жыцці беларускага народа, але ў цэлым яны вялі да выразнага духоўнага і культурнага размежавання пануючых пластоў Вялікага княства Літоўскага з простым, «паспалітым», людам, значнай часткай гарадскога насельніцтва, дробнай шляхты, сялянамі. На былое сацыяльнае адасабленне наслайвалася ў дадатак чужая мова, звычаі і традыцыі, чужая канфесія. Агульнае пагаршэнне становішча, паборы і іншыя бядоты ваенных часоў у свядомасці паспалітага люду нярэдка звязваліся з пасіленнем польскіх уплываў, а польскамоўная каталіцкая мясцовая шляхта і магнаты нярэдка атаясамліваліся з «ляхамі». Некаторыя асветнікі-рэфарматары ў Беларусі, у тым ліку прыроджаныя палякі, з гуманістычных пазіцый выказваліся за пашырэнне і рэфармаванне занядбанай школьнай справы, высока ацэньвалі прыгажосць і духоўныя магчымасці беларускай і кніжнаславянскай моў, выказваліся за мірнае сужыццё розных, тым больш суседніх народаў. Прыкметы неадназначных палітычных, духоўных і культурна-моўных працэсаў усведамляліся яшчэ С.Будным і яго паплечнікамі ў Нясвіжы. У прадмове да Катэхізіса 1562 г. нясвіжскія кнігавыдаўцы прасілі сваіх апекуноў, асабліва сыноў Мікалая Радзівіла Чорнага, не адступацца ад старажытнай мовы продкаў, падтрымліваць яе дзяржаўны і бытавы статус. Але толькі ў творчасці паспалітага беларускага шляхціца, глыбока і паўсядзённа павязанага і патрэбамі, і настроямі мясцовага насельніцтва, гэтыя асветніцкія і духоўныя тэндэнцыі знайшлі найбольш моцнае і ўзвышанае ўвасабленне, сталі асноўнай духоўнай справай яго жыцця і дзейнасці. Напэўна, не выпадкова пасля Ефрасінні Полацкай і Францішка Скарыны Полаччына зноў стала абетаванай зямлёй для зараджэння новых духоўных і патрыятычных павеваў.

«Обычиване речей жалосных гвалтом слова до уст гонит».

Уражвае шчырасць прадмовы, яе эмацыянальнасць, мастацтва, з якім Цяпінскі ў невялікім адносна творы сціплымі словамі акрэслівае духоўны заняпад грамадства, асабліва яго пастыраў, занядбанне боскіх запаведзяў, пагоню за матэрыяльнымі здабыткамі, пашырэнне невуцтва, недастатковую развітасць школьнай і кніжнай справы, «трапенасць» і «заведзенасць» народу простага, беднага, паспалітага. Нават калі спісаць некаторыя з гэтых абвінавачванняў на палемічную завостранасць твора, рэфармацыйныя погляды аўтара, карціна атрымоўваецца надзвычай драматычная.

«З убогое своее маетности».

Для асветніцкіх і талерантных поглядаў Цяпінскага вельмі характэрным быў яго заклік да духоўных іерархаў і свецкіх вучоных асоб, выпускнікоў еўрапейскіх універсітэтаў, магістраў і дактароў навук, якія павінны б былі актыўна займацца школьнымі, кніжнымі і іншымі патрэбнымі рэчамі. На жаль, гэтыя яго чаканні не спраўдзіліся. Адчуваючы вострыя патрэбы Айчызны і свайго народа, ён вымушаны быў сам узяцца за гэту высакародную справу. Лепей сказаць яго ўласнымі словамі: «И о тое маючи пана (бога) на помочи, не смысленым або красомовным выводом, не залецаными ани часу угажаючими словы, але яко сприязливый, простый и щирий правдиве, верне а отвористе з зычливости ку моей отчизне, — поневаж, которым бы то властней учинити пристоило митрополитове, владыки и нихто з учоных через так многий час не хотели...».

Па сціслых словах прадмовы бачна, як цяжка прыйшлося небагатаму шляхціцу ў ажыццяўленні складанай справы па перакладу евангельскіх кніг, наладжванні ўласнай друкарні, якія фінансавыя і іншыя перашкоды прыйшлося пераадольваць. «З убогое своее маетности (маёмасці), — пісаў ён, — народу моему услугую, на которой, и теж при ней и на именечку, хотя ж то было невеликое вжо для накладу (неабходных выдаткаў), а злаща (асабліва) книг старих, давних на розных и неблизких месца(х) доставаючи, надто еще в минулые лета тяжкие дороги, дле друку и потреб, тому належачих, подымаючи, а праве все до того зачинаючи знову, ач вельмим стол(ь) предсе и должачисе».

Цяпінскі, мабыць, не вучыўся ў замежных універсітэтах, бо ўсё папярэдняе жыццё яго было павязана з рыцарскімі, грамадскімі і складанымі хатнімі абавязкамі, ды і каштавалі замежныя падарожжы нямала. Але ж пераклады Св. Пісання былі пад сілу толькі людзям вельмі адукаваным, таленавітым, маючым значныя гістарычныя, лінгвістычныя, тэалагічныя, літаратурныя веды. Безумоўна, пашырэнню яго інтарэсаў, кругагляду, грамадскай і духоўнай актыўнасці, зацікаўленасці біблейскімі перакладамі спрыяла яго сяброўства з С.Будным і яго пап-

лечнікамі, удзел ў рэфармацыйным руху, занаёмства з дзейнасцю Скарыны і нясвіжскай друкарні. Нейкі практычны вопыт быў назапашаны таксама ў часы прыдворнай і ваеннай службы. Лёс зводзіў яго з рознымі знакамітымі асобамі — падканцлерам Астафіям Валовічам, адным з удзельнікаў папраўак і рэдакцый Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г., аршанскім старостай Філонам Кмітай, вядомым сваімі ваеннымі, адміністрацыйнымі, прыроджанымі літаратурнымі здольнасцямі, і інш. Будучы блізкім паплечнікам Сымона Буднага, ён, безумоўна, добра ведаў пра дзейнасць маскоўскіх першадрукароў Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца пасля іх эміграцыі ў Вялікае княства Літоўскае. Магчыма, што разам з Будным ён сустракаўся з імі і вёў сяброўскія размовы. Пазней у сваім Евангеллі ён неаднаразова спасылаўся на маскоўскія друкі як на адну з важных крыніц яго перакладаў тэкстаў Новага запавету.

Нават па невялікай прадмове Цяпінскага адчуваецца, што ён добра ведаў царкоўна-славянскую і антычную традыцыю, шмат якіх царкоўных і свецкіх аўтараў, тэолагаў, кнігавыдаўцоў. Сам склад прадмовы, напісанай асаблівым, можна сказаць, унікальным літаратурным стылем, мовай вытанчанай і ў той жа час прыўзнятай, рытарычнай, амаль што біблейскай, — сведчанне яго высокага густу, неблагой адукацыі, павагі да задуманай ім высокай місіі.

«Не одно для лепшое их вери, але теж и для лепшого из розсудку, надто и для их самих цвичения...»

Выдавецкія і асветніцкія планы Цяпінскага былі разлічаны на ўсе пласты беларускага насельніцтва, уздым сапраўднай хрысціянскай духоўнасці (стараюся об іх «збавенное!» — пісаў ён), захаванне грамадскіх уплываў беларускай і «узвышанай», царкоўнаславянскай, моў, якія спрабавалі дыскрэдытаваць прыхільнікі ваяўнічага каталіцызму, пашырэнне школ, кірылічнай пісьменнасці, кніжнасці, абуджэнне гістарычнай і ўласнай свядомасці беларусаў, асэнсаванне маральнасці і хрысціянскай адказнасці прывілеяваных станаў: «гдыж простота человека бедного, посполитого на вас очи завжды удавала и удает и за вами идет».

Глыбокі непакой Цяпінскага выклікалі паланізатарскія тэндэнцыі, адыход ад культурных і моўных традыцый значнай часткі свецкай знаці, арыстакратыі, духавенства, іх бяздумнае жыццё ў роскашы і «марнатрацтве», пагонях за новымі прывілеямі і прыбытковымі пасадамі. «Бо а хто богобойный не задержить (задрыжыць), на такую казнь божию гледечи, хто бы не мусил плакати, видечи так великих княжат, таких панов значных, так много деток невинных, мужов з жонами в таком зацном руском, а злаща перед тым довстипном, учоном народу езыка своего славного занедбане, а просто взгарду, с которое за покаранем панским оная ясная их в слове божьем мудрость, а которая им была, праве, яко врожоная, гды от них отишла, на её местьце натыхмест такая оплаканая не-

умеетность пришла, же вжо некоторие и писмом ее своим, а злаща в слове божием встыдают».

Асабліва турбуюць Цяпінскага адступленні ад сваіх пастырскіх абавязкаў духоўнай епархіі, якой па яе боскаму прызначэнню было наказвана вучыць і весці народ, яе захапленне чужаземнымі мовамі, занядбанне сваёй уласнай: «А наостаток, што может быть жалоснейшая, што шкараджа, иж и тые, што се межи ними зовут духовными и учители, смеле мовлю, намней его не вмеют (слова боскага, сваёй уласнай мовы), намней его разуменя не знают, ани се в нем цвичат, але и ани школы ку науце его нигде не мают, зачим и полские або и иные писма за такою неволею немало и у себе и дети не без встыду своего... не малого заправуют».

Ён заклікае радавітых паноў і вялікіх княжат займацца міласэрнымі брацкімі чалавечымі справамі («помочи люцкое для греху нет»): « в ту потребу отчизны вашое, в простоту грубую, про недостаток науки братии вашое прикладом своим милосерным... тому народу вашому допомогаючи». Для гэтага, на яго думку, трэба, каб радавітыя паны і княжаты больш апекавалі духоўных асоб, мітрапалітаў, уладык, больш цікавіліся, як яны адпраўляюць свае богаўгодныя абавязкі: «жебы не подкупов, не посулов дле поседаня столиць один перед другим (епіскапскіх кафедр), не до живетей и привильев, один над другого обварованейших (багацейшых), але слова божего сами се учили и других (вучылі), а маетностей и именей, от ваших предков им не на марнотрацства, не на строй (роскош, побыт) и што такого, але дле наук наданых».

Відавочна, што Цяпінскі меў на ўвазе праваслаўнае духавенства, якое адыгрывала галоўную ролю ў школьных і асветніцкіх справах у Беларусі, не гаворачы ўжо пра царкоўныя.

Навука, у яго разуменні, як і ў прадмовах Скарыны да яго пражскай Бібліі, — гэта перш за ўсё ўспрыняцце і захаванне боскіх запаведзяў, шчырых хрысціянскіх паводзін, але Цяпінскі марыў таксама пра больш шырокае вывучэнне, спалучэнне духоўнай асветы народа з яго непасрэднымі патрэбамі і імкненнямі, выступаў за развіццё і ўдасканаленне школьнай справы: «Ова бы ку науце, — леч не такой, яко тепер на вечный свой встыд только прочести и то ледво в своем езыку не больш учатсе — школы заложити и науку слова божего, от так много лет занедбаную выдвигнути...». Адносіны Цяпінскага да асветніцтва і навук добра прасочваюцца таксама ў яго панегірыку славянскім апосталам, славянам, а таксама «наученшим» старажытным народам Лівіі, Анціохіі, Пентаполіі, Сіцыліі, Месапатаміі, Фініцыі і «нам недалеким» влохам (італьянцам), немцам, палякам, французам, «гангликам, гишпанам». Сцісла мовячы, усім хрысціянскім народам, якія «слово божее з латинских и иных письм своих теж езыком прироженым перекладати и читати почали».

Ён заклікаў паноў і княжат у іх дабрачыннай, асветніцкай, міласэрнай дзейнасці памятаць пра вялікія таленты і здольнасці беларускага («рускага», гаворачы тагачаснай мовай) народа, улічваць багатыя культурныя, моўныя і пісьменніцкія традыцыі славян.

«Оттуль досыць знак немалый маем, як пред тым словене...»

Упершыню ў беларускай літаратуры так выразна прадстаўлена гістарычнае, прыроджанае і духоўнае сваяцтва славянскай супольнасці і звязаныя з ім перспектывы духоўнага адраджэння Беларусі. «Што может быть прироженшого» для славян, калі не Русь, — пісаў Цяпінскі пра сваіх суайчыннікаў. Ён высока ацэньваў значнасць духоўнай пераемнасці. «Гды бы в часы давние посмотрели, — пісаў ён ў сваёй прадмове, маючы на ўвазе паўднёвых і іншых славян, — яки то был зацный, острий довстипный народ их в умеетности, яко многократ посторонние учоные народы их мудрость мусели похвалять и овшем се от них учить...»

Для пацвярджэння сваіх думак аб вялікай духоўнай спадчыне Цяпінскі нагадваў чытачам пра саборныя дыскусіі славян з рымскімі папамі, бездакорнае жыццё славянскіх першанастаўнікаў і апосталаў, «светобливое малженство», заслугі ў правядзенні да веры шматлікіх ератыкоў і фальшывых братоў: «яко мнозства людей з блудов выдвигали и яко в розмаитых езыках учоными были...». Ён успамінае знакамітых славянскіх і хрысціянскіх асветнікаў — Іаана і Грыгорыя Златавустаў, празваных так дзеля іх глыбокай вучонасці і «вдячное их вымовы». Калі б яны і цяпер былі — заключае асветнік, наўмысна, дзеля палемічных мэтаў згушчае фарбы, — сапраўды б знямелі, «видечи яко окраса и оздоба народу их в потомстве их отнята и просто загинула...».

Услед за Будным, праўда, без яго пэўнага крытыцызму, Цяпінскі высока ацэньвае славянскі пераклад Новага запавета: «... перед тисечею лет от некоторого з словян выложоно, а которое не одно в их, але и по всех церквах сербских, московских, волоских, булгарских, харвацких и иных чтут» і шануюць.

Верагодна пад «некаторым з словян» Цяпінскі разумеў аднаго з салунскіх братоў, балгарынаў, славянскіх асветнікаў і апосталаў — Кірыла і Мяфодзія. Пры жыцці Кірыла былі перакладзены і зборнае Евангелле, і Апостал. «Тот муж, наш милый словенин, — пісаў Цяпінскі, — латынских и иных толмачов яко властне слова з греческого выкладал, иж трудно зразуметь, чи больш греческий або словенский язык умел. И бы не было больш, тогды и оттуль досыть знак немалый маем, як пред тым словяне...»

«Рад пакажу маю веру, которую маю, а злаща народу своему рускому».

Патрыятычныя матывы Цяпінскага дазваляюць яму спадзявацца на пераадольванне няўдзячнасці лёсу і адсутнасць значнай грамадскай да-

памогі. «...ижем то не влох, не немець, або не доктор и ниякий постановеный межи попы, але з чого бы мели пана (бога) з выкриканем фалити и радоватсе, же з их с посредку русин их им своей руси услугуючий...» Пасля Францішка Скарыны толькі Васіль Цяпінскі так выразна і прыўзнята падкрэсліваў сваё беларускае («рускае») прыроджанае паходжанне.

Давяраючы «богобойной пилности, ростропности и верности» радавітых паноў у задавальненні неадкладных патрэб Айчыны, Цяпінскі пранікліва сведчыць аб сваёй духоўнай гатоўнасці падзяліць любы яе лёс: «если она до конца згинет, з нею згинуть, або, если через вашь ретунок будет выдвигнена, з вами и з нею выбринуть».

У сваіх гуманістычна-асветніцкіх і патрыятычных поглядах Цяпінскі быў найбольш паслядоўным пераемнікам духоўных запаветаў свайго знакамітага земляка, беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара Францішка Скарыны. Нават у друкарскім і мастацкім выглядзе яго Евангелле прыкметна відавочная стылізацыя арнаментальнага ўпрыгожвання, шрыфтаў, ініцыялаў. Гэта дало магчымасць некаторым даследчыкам выказаць думку аб набыцці сапраўдных друкарскіх матэрыялаў Скарыны, што не адпавядае рэчаіснасці. Памылковымі з'яўляюцца таксама сцверджанні аб выкарыстоўванні Цяпінскім шрыфтоў і ксілаграфій нясвіжскай друкарні. Уплывы С.Буднага і, магчыма, іншых дзеячаў нясвіжскага культурна-выдавецкага асяроддзя на дзейнасць і планы Цяпінскага аспрэчваць цяжка, але ўся тыпаграфіка яго выданняў, а тым больш змест і пераклады тэкстаў Евангелля носяць вельмі арыгінальны і непаўторны характар. Кніга набіралася ў дзве калонкі — на царкоўнаславянскай і паралельна на беларускай мовах (у аўтарскім перакладзе Цяпінскага). Па прыкладу Францішка Скарыны, Сымона Буднага выданне мае шматлікія маргінальныя глосы: тлумачэнні рэдкіх слоў, выразаў, спасылкі на літаратурныя крыніцы. Сярод апошніх згадваюцца паўднёваславянскія і іншыя кнігі і рукапісы, у тым ліку «нядаўна друкаваныя» ў Маскве Евангеллі. Для беларускіх гуманістаў-асветнікаў — Скарыны, Буднага, Цяпінскага — характэрна гэтая канфесійная талерантнасць, паважлівае стаўленне да духоўных спраў і выдання розных краін і народаў. Патрыятызм В.Цяпінскага не быў абмежаваны ідэямі нацыянальнай ці дзяржаўнай выключнасці, культурнай замкнёнасці. Выступаючы супраць духоўнай паланізацыі беларускай шляхты, магнатаў Вялікага княства Літоўскага, Цяпінскі, як і Будны, падтрымліваў сяброўскія адносіны з многімі дзеячамі літоўскага, польскага Адраджэння і Рэфармацыі. Дзейнасць Цяпінскага садзейнічала зараджэнню, уздыму і кансалідацыі нацыянальна-культурных і патрыятычных пластоў у Беларусі ў канцы XVI—пачатку XVII ст., развіццю беларускага кнігавыдавецтва, кнігадрукавання, школьнай справы.

Абмежаваныя матэрыяльныя магчымасці, складаныя ўмовы ваенных часоў і супрацьдзеянне кансерватыўных колаў не спрыялі працягванню літаратурна-перакладчыцкай, гуманістычна-асветніцкай, выдавецкай дзейнасці Цяпінскага. Невядома нават, ці сапраўды скончыў ён свае друкі. З ягонай прадмовы да Евангелля можна зразумець таксама, што адначасова быў падрыхтаваны да выдання нейкі Катэхізіс для навучання радавітых паноў і іх дзетак асновам веры. Па словах Цяпінскага, Катэхізіс «яко довнимаю (разумею) за реч исте потребную, естли не зараз, вжды з своим часом узнают, им вперед подаю». Цікава, што Катэхізіс на беларускай мове — для дзетак «языка руского» — быў выдадзены ў Нясвіжы ў 1562 г. Магчыма, намер Цяпінскага выдаць свой Катэхізіс сведчыць аб пэўных разыходжаннях яго з нясвіжскімі рэфарматарамі.

Даследчыкам нічога не вядома пра апошнія гады жыцця Васіля Цяпінскага. Ужо ў сталым узросце пры невысветленых дакладней абставінах выдатны беларускі дзеяч быў забіты сваімі пляменнікамі Іванам і Васілём Мацвеевічамі, мінскімі шляхціцамі, каля 1600 г. Убогая яго маёмасць дасталася яго сынам — Авраму, Тобіяшу і Канстанціну. Пазней многія з Цяпінскіх згадваюцца ў копіях судовых актаў Метрыкі Вялікага княства Літоўскага, студэнцкіх альбомах Віленскай акадэміі, іх родавае паходжанне пацвярджаецца рэвізіямі спраў пасля падзелу Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст.

Літаратура:

1. Довнар-Запольский М.В. В.Н.Тяпинский, переводчик Евангелия на белорусское наречие // Известия отдел. русск. яз. и словесности имп. АН. 1899. Т. ІУ. Кн. 3. С. 1031—1064. Перадрук: Яго ж. Исследования и статьи. Киев, 1909.

2. Левицький О. Про Василя Тяпиньского, що пераклав в XVI ст. Евангеліе на просту мову. (Крітічна розвідка) // Записки Украінського наукового товариства в Києві. 1913. Кн. XII. С. 5—21.

3. Карский Е.Ф. Белорусы. Птг., 1921. Т. 3. С. 35—36.

4. Алексютович Н.А. Тяпинский и его предисловие к Евангелию // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мн., 1962.

5. Жураўскі А.І. Тыпы і асаблівасці глос у «Евангеллі» В. Цяпінскага // Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР. 1960. Вып. 7. С. 213—226.

6. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Мн., 1968.

7. Галенчанка Г.Я. Васіль Цяпінскі — паслядоўнік скарынінскай справы // 450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968.

8. История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 126—132.

9. Немировский Е.Л. Иван Федоров в Белоруссии. М., 1979.

10. Бабкова В.У. Новыя дадзеныя аб В.Цяпінскім на падставе актавага матэрыялу ЦДГА БССР у Мінску // Наш радавод. Материалы международной научной конференции по региональной истории Восточной Европы «Культура народов Великого княжества Литовского — XIII—начала XX вв.» Гродно, 1991. Кн. 3. Ч. 1. С. 194—195.

11. Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд. Мн., 1998 (выд. 4). С. 200—204.

12. Саверчанка І. Aurea mediocritas: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Мн., 1998.

Публікацыі і бібліяграфічныя апісанні:

1. Галенчанка Г.Я. Старадрукаваныя кірылічныя выданні XVI—XVIII ст. // Кніга Беларусі. Зв. кат. 1517—1917. Мн., 1986., № 12. С. 61.

2. Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X—XIX стагоддзі. Энц. даведнік. Мн., 1995. С. 154—156.

3. Тяпинський Василь // Українські письменники. Біо-бібліографічний словник. Т. 1. Уклав Л.С.Махновець. Київ. 1960. С. 582—584.

Прадмова В.Цяпінскага неаднаразова перадрукоўвалася, у т.л.:

1. Владимиров П. Предисловие Василия Тяпинского к печатному Евангелию, изданному в Западной России около 1579 года // Киевская старина. 1888. Т. 24, январь, прилож. С. 1—11, 1—10.

2. Предисловие к Евангелию // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мн., 1962. С. 87—91.

3. Полный текст рукописной «Предмовы Василия Тяпинского к Евангелию» // Лабынцев Ю.А., Немировский Е.Л. Описание изданий Несвижской типографии и типографии Василия Тяпинского. М., 1985. С. 61—67.

Георгі Галенчанка

Фёдар ЕЎЛАШОЎСКІ
(1546—1619)



еларускі грамадскі дзеяч і пісьменнік эпохі Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай нарадзіўся 7 лютага 1546 года ў мястэчку Ляхавічы Наваградскага ваяводства (цяпер — раённы цэнтр Брэсцкай вобласці). Паходзіў з дробнапамеснай шляхты. Еўлашоўскія гербу Старжа (Сякера) належалі да праваслаўнай шляхты Наваградскага павета. Па яго словах, сваё імя ён атрымаў у гонар Тэадора Страцілата, праваслаўнае свята ўшанавання якога прыпала на дзень хрышчэння Фёдара (8 лютага). Страцілат быў палкаводцам рымскага цэсара Валерыя Ліцыніянуса Ліцынія. Несправядліва абвінавачаны паганцамі ў падрыхтоўцы змовы (на самой справе за хрысціянства), Тэадор Страцілат быў забіты ў горадзе Понт Іраклій. Прозвішча (ужытае ўпершыню Фёдарам) паходзіць ад назвы двара Улашкавічы, Яўлашкавічы, якім валодаў яго бацька Міхаіл Лявонавіч, святар Ляхавіцкай царквы св. Юрыя. У сям'і захоўваўся ўспамін: калі Фёдару споўніўся год, ён нечакана прамовіў да свайго бацькі слова «абба» (па-яўрэйску «айцец»), у чым бацькі схільныя былі бачыць незвычайныя разумовыя здольнасці і прыроджаную набожнасць сына. Гаварыць Фёдар, аднак, пачаў, калі яму споўнілася тры з паловай гады.

Фёдар піша далей у сваіх успамінах, што «в пятом року почато ме бавить наукою рускою», г. зн. вучыць беларускай мове. Паколькі «в тых часех в тэй нашей строне не было еще иншых наук», Еўлашоўскі атрымаў толькі беларускую і польскую грамату. Хаця тут жа прызнаецца, што яшчэ і «по-жидовски написать умелом». З далейшага яго апавядання бачна дасведчанасць яго адносна таго, што яўрэйскім пісьмом пісалі на дзвюх «яўрэйскіх» мовах — старажытнаяўрэйскай і ідыш («тое пис-

мо их потребуе умеетности езыка эбрайского або хоть немецкого» — ідыш, як вядома, — дыялект нямецкай мовы). Хаця Фёдар не ўказвае, якую школу ён закончыў, на думку літоўскай даследчыцы І.Лукшайтэ, гэта была школа кальвінісцкая, дзе выкладаўся т. зв. трылінгвіюм — лацінская, грэчаская і старажытнаяўрэйская мовы. На гэтай школе і закончылася, хутчэй за ўсё, сістэматычная адукацыя Еўлашоўскага, паколькі пра якое-небудзь далейшае навучанне ён нічога не піша. Затое ён набывае значныя веды па арыфметыцы шляхам самаадукацыі, што неўзабаве было заўважана знатнымі панамі, якія пачалі даручаць яму збор падаткаў і інвентарызацыю, «порозумявши на то з натуры способного».

У той час ішла Лівонская вайна. Яшчэ не дачакаўшыся васемнаццаці гадоў, Еўлашоўскі едзе на вайну. Баявое хрышчэнне ён атрымлівае ў вядомай Ульскай бітве 26 студзеня 1564 г., якая, як ён піша, «была нашым щаслива», г. зн. 10-тысячнае войска гетмана ВКЛ М.Радзівіла разбіла на чашніцкіх палях 30-тысячнае маскоўскае войска. Аднак далейшыя частыя паездкі на вайну з іх нягодамі хутка надакучылі Фёдару, які не ў ваеннай сферы бачыў сваё прызванне. З палёў бітваў ён вынес перакананне, што яго краю «пожитку не веле тэ войны приносили». У далейшым ён або ўхіляўся ад удзелу ў ваенных дзеяннях, або пасылаў замест сябе туды каго-небудзь са сваіх падданых.

У выніку ўжо праз два з нечым гады, у 1566 г. мы бачым Еўлашоўскага ў Вільні за выкананнем цывільнага абавязку — зборам падушнага падатку. Той год быў своеасаблівай вехай у жыцці Ф.Еўлашоўскага, у гэты час у Вялікім княстве Літоўскім набываў моц рэфармацыйны рух. Прыблізна з сярэдзіны стагоддзя пашыраецца адна з асноўных канкрэтных форм увасаблення гэтага руху — кальвінізм. У бытнасць сваю ў Вільні ён выпадкова трапляе ў кальвінісцкі збор на казанне «министров учоных» — кальвінісцкіх прапаведнікаў М.Вендрагоўскага і Касцініюса і, атрымаўшы ад гэтага казання «великую утеху», парывае з верай бацькоў — праваслаўем — і прымае кальвінізм, якому захоўвае вернасць да канца жыцця. З гэтага часу свае поспехі, як і няўдачы, ён пачынае тлумачыць у адпаведнасці з вучэннем Кальвіна пра абсалютнае прадвызначэнне: ні вера, ні справы чалавека не могуць паўплываць на яго лёс пасля смерці, бо ён ужо, безумоўна, вызначаны боскай воляй і з'яўляецца вышэйшай таямніцай. Ускосным сведчаннем абранасці могуць служыць прафесійныя поспехі чалавека. Гэты тэзіс стымуляваў развіццё рынкавых адносін перыяду першапачатковага накаплення, якія адпавядалі інтарэсам правага, бюргерскага, крыла Рэфармацыі, санкцыянаваў новыя грамадскія адносіны і прынцыпы сацыяльных і маральных адносін паміж людзьмі, заахвочванне накапляльніцтва. Кіруючыся гэтым веравызнаўчым пастулатам, Еўлашоўскі ўсё сваё жыццё падпарадкаваў дасягненню дабрабыту сваёй не малой сям'і. Займаючы невысокае

становішча ў грамадстве, ён, дзякуючы сваёй працавітасці і стараннасці, здолеў назапасіць немалое багацце. Аб гэтым сведчаць вялікія сумы грошай (тысячы коп), якія ён пазычаў, як бачна з дакументаў, свайму патрону Яну Гераніму Хадкевічу.

Спачатку прынятае новае веравызнанне не стварала цяжкасцей ў дачыненнях з прадстаўнікамі процілеглага, каталіцкага, лагера. Ён з удзячнасцю ўспамінае варшаўскага архідыякана, хавальніка каралеўскага скарбу, каталіцкага святара Яна Макавецкага, які дапамог яму значна павысіць прафесійную кваліфікацыю, «который ме барзей и тэто личбы вправил», а таксама пазнаёміў яго з многімі знатнымі панамі і адрэкамендаваў яго ім як стараннага і здольнага службоўца. Такая спагада пратэстанту з боку католіка стала магчымай дзякуючы панаваўшай у той час у Вялікім княстве Літоўскім атмасферы талерантнасці («на он час розность вяры не чинила намнейшей разности и милости приятельской»), з-за чаго ... «тамтот век злотым ми се види», — заключае Еўлашоўскі. У пацвярджэнне гэтых сваіх слоў ён прыводзіць яшчэ адно каштоўнае сведчанне: калі ён прысутнічаў у якасці госця на балі ў віленскага каталіцкага святара Балтрамея Нядзвіцкага, гэтаму вельмі зайздросцілі прысутныя там «слуги-влохи» (італьянцы), асуджаючы разам з тым меўшы месца царкоўны разлад у сябе на радзіме.

У тым жа 1566 г. княства было ахоплена маравой пошасцю, аднак Еўлашоўскі не спяшаўся пакінуць апанаваную эпідэміяй Вільню, не асцерагаючыся заражэння, хоць яго і папярэдзіў аб гэтым доктар Сэрпец, які там знаходзіўся. Між тым ён, ужо вяртаючыся неўзабаве дадому, адчуў у сабе сімптомы заразы (верагодна, англійскай потавай гарачкі) у выглядзе страт прытомнасці і галюцынацый, якія потым праследавалі яго ўсё астатняе жыццё, а ўрэшце рэшт сталі прычынай нездольнасці яго выконваць свае службовыя абавязкі.

Еўлашоўскі — цікавы сведка сваёй багатай на падзеі эпохі. У якасці павятовага дэпутата ён прымае ўдзел у працы Люблінскага сойма, на якім у 1569 г. адбылася лёсавызначальная для нашага краю падзея — Вялікае княства Літоўскае разам з Польшчай сталі часткамі новай канфедэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай (г. зн. была заключана так званая Люблінская дзяржаўная унія). Як сведка гэтага палітычнага акта, ён паслядоўна выкладае ўсе яго этапы, датуючы кожны з іх. Відавочна, менавіта ў час працы Люблінскага сойма Еўлашоўскі збліжаецца з каралём Жыгімонтам II Аўгустам. У адпаведнасці са сваёй рэлігійнай і жыццёвай мараллю ён служыў узорна сваім патронам нават тады, калі яму гэта было непрыемна. Як вядома, Жыгімонт Аўгуст праславіўся свімі амурнымі справамі, асабліва пасля смерці сваёй другой жонкі Барбары Радзівіл. Дзеля гэтага яму штодзень у замак пастаўляліся наложніцы. Гэтым даводзілася займацца і Еўлашоўскаму, хоць, як ён прызнаецца, «ми та послуга мерзила».

У гэты час у Еўлашоўскага пачашчаюцца прыступы хранічнай хваробы, пагаршаецца таксама стан здароўя засмучанай гэтым фактам маці. З 1572 г. ён пачынае служыць Мікалаю Крыштофу Радзівілу Сіротцы, ведучы яго справы ў судзе. У сувязі з гэтым ён выкладае сваё жыццёвае крэда, якое сведчыць і аб мэце прадпрынятага ім напісання ўспамінаў. У пажылым узросце, азіраючыся на свой жыццёвы шлях, ён зазначае: «Дятком свым раду мою зоставую, абы се при мне его княжеской милости (Радзівілу Сіротцы), и дятком, и домови его княжеской милости прикладэм моим служить не вымовили».

У сакавіку 1572 г. памірае маці Еўлашоўскага Фядора, якая была пахавана ў праваслаўнай царкве ў Ляхавічах. Смерць маці разладзіла планы сына «яхать до Угор и до Турцэи, зведать инше краины далеке, научитьсе ремесл розных». Традыцыя здзяйснення падарожжаў была навеяна Адраджэннем з яго культам ведаў, бо падарожжа было багацейшай крыніцай ведаў, а таксама давала магчымасць пісаць дзённікі ці ўспаміны. Мары Еўлашоўскага не было суджана збыцца, паколькі пасля смерці маці на яго лёг цяжар клопатаў аб сваіх малодшых братах і сёстрах, застаўшыхся без мацярынскай апекі.

Каб адцягнуць сумныя думкі бацькі аб памерлай жонцы, Еўлашоўскі праз князя Канстанціна Астрожскага дабіваецца для яго пасады епіскапа пінскага. Гэтая справа была звязана са значнымі матэрыяльнымі выдаткамі. Аднак дапамагчы яму грашыма адмовіліся нават тыя, каму ён некалі аказваў неабходныя паслугі. Зусім нечакана яго «пенезми был поратовал» шляхціц Андрэй Жданавіч Дароўскі. Заплаціўшы неабходную суму, Еўлашоўскі, нарэшце, дабіваецца пасвячэння свайго бацькі ў епіскапы. Аднак праз два гады бацька, захварэўшы, памірае ў Пінску, пакінуўшы сыну свае шматлікія даўгі.

У 1576 г., знаходзячыся па сваіх службовых справах у Торуні, Еўлашоўскі знаёміцца з новым каралём Стэфанам Баторыем і венграмі, якія служылі пры каралеўскім двары. Фёдар за кароткі час здолеў заслужыць прыхільнасць і гэтага караля. Улетку 1577 г. Баторый, знаходзячыся пад Гданьскам, прысылае Еўлашоўскаму прывілей на пасаду мастаўнічага Пінскага і Сервецкага паветаў. У тым жа 1577 г., «уклопотаный вжо будучи», г.зн. стомлены ад жыццёвых нягод, Еўлашоўскі ажаніўся з праваслаўнай Ганнай Балатоўнай, сястрой Данілы Балотавіча, продак якіх, Антоній Балота, прыбыў у Літву з Масквы яшчэ пры вялікім князі Казіміру, а яго нашчадкі, «под паны некоторыми оселости боярские побравши», пасяліліся ў Шклове і ў іншых месцах. Еўлашоўскі з захапленнем апісвае сваё шчаслівае жыццё з Ганнай Балатоўнай, перашкодай для якога не была розніца паміж імі ў веравызнаннях. Ад гэтага шлюбу ў Еўлашоўскага нарадзілася дзевяць сыноў і пяць дачок.

Будучы ў 1578 г. на Варшаўскім сойме, Еўлашоўскі з задавальнен-

нем зазначае, што «маршалковал межи послами наш литвин Лукаш Болько Свирский» (князь, удзельнік выпраўлення другой рэдакцыі Статута Вялікага княства Літоўскага). Гэтая заўвага разам з фактам, што свае ўспаміны ён напісаў па-беларуску, сведчыць аб такой выдатнай рысе асобы Еўлашоўскага, як яго мясцовы патрыятызм прадстаўніка ніжэйшых пластоў шляхецкага грамадства ў адрозненні ад буйнай шляхты і магнатаў, якія ў гэты час актыўна паланізаваліся.

У 1579 г. памірае адзін з апекуноў Еўлашоўскага, Ян Геранім Хадкевіч. Нягледзячы на гэта Фёдар працягвае служыць яго сям'і фактычна да канцы сваіх дзён. У гэтым жа годзе адбываецца падзея, якая сведчыць аб надзвычай высокім аўтарытэце Еўлашоўскага сярод сучаснікаў як вопытнага юрыста. На Варшаўскім сойме 1579 г. ён разам з суддзёй А.Трызнай працуе ў складзе камісіі па распрацоўцы статута галоўнага апеляцыйнага суда ВКЛ — Трыбунала — каштоўнейшага помніка даўняга айчыннага права («и працовалисмы, пишучи «Трибунал»).

Еўлашоўскі — знакаміты практык-юрыст свайго часу. Ён абараняе маёмасныя інтарэсы жонкі нябожчыка Я.Г.Хадкевіча і яго дзяцей. Вясной 1583 г. як адвакат сям'і Хадкевічаў удзельнічае ў вырашэнні аж 17 спраў у чатырох павятовых судах Вялікага княства Літоўскага. Магчыма, удалая адвакатура прадвызначыла тое, што ў 1592 г., калі з'явілася вакантнае месца ў Навагрудскім земскім судзе, ён па пратэкцыі Аляксандра Хадкевіча атрымлівае месца падсудка (памочніка суддзі), якое займае да самай смерці. Еўлашоўскі трапіў у ваяводскую шляхецкую эліту дзякуючы выключна прафесійным здольнасцям.

20 студзеня 1581 г. у Еўлашоўскага нарадзіўся сын Яўхім, якім ён асабліва ганарыўся, бо той удастоіўся гонару трапіць на службу пажам пры двары герцага Мантуанскага Філіпа Ганзага. 22 сакавіка 1581 г. памірае родны брат Ф.Еўлашоўскага Іван. На працягу 1588 г. Еўлашоўскаму даводзіцца па судовых справах бываць у розных гарадах Беларусі. У 1584 г. кароль у Вільні прызначае яго інстыгатарам, г.зн. дзяржаўным пракурорам. У 1586 г. ён набывае маёнтак Скубятоўшчыну і працягвае ўзнімацца па службовай лесвіцы. У запісе за 1591 г. ён ужо называе сябе навагрудскім мастаўнічым. 1 верасня 1592 г. на сойміку ў Цырыне яго ў чарговы раз абіраюць на пасаду падсудка. У гэты час яму становіцца вядома, што шляхціцы Крачатоўскі з Тлухоўскім, уводзячы яго і іншых паноў у зман, прысвойвалі сабе іх маёнткі. Аднак быццам у пацвярджэнне кальвінісцкага перакanання Еўлашоўскага Тлухоўскага ў хуткім часе напаткала боская кара: ён захварэў на пранцы і памёр.

У 1595 г. Еўлашоўскі становіцца сведкам яшчэ адной важнай падзеі адыходзячага XVI стагоддзя — казацка-сялянскага паўстання пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі. Фармальным повадам для паўстання стала павешанне панам Каліноўскім бацькі Налівайкі. Еўлашоўскі выкла-

дае ход падзеі ад пачатку да канца. Такая пільная ўвага з яго боку да паўстання можа быць вытлумачана небяспекай, якую яно ўяўляла для шляхты.

У атмасферы рэлігійнай варожасці, якую прынесла з сабой контррэфармацыя, Еўлашоўскі, які працягвае захоўваць вернасць пратэстантызму, усё часцей натыкаўся на непрыязныя адносіны да яго з боку прыхільнікаў польскай культуры і каталіцызму. На лютаўскай сесіі земскага суда 1602 г. ён не падтрымаў суддзю Васіля Зянкевіча, памочнікам (падсудкам) якога ў той час быў, і пана Падароўскага, якія хацелі, каб у княстве судовыя сесіі праводзіліся па польскаму звычаю, у адзін час. Еўлашоўскі, як і ўся астатняя шляхта Навагрудскага павета, хоць і быў папярэджаны суддзёй, не дазволіў ламаць старыя традыцыі і працягваў праводзіць суды па-старому. За гэта, на яго ўласную думку, яго спасцігла боская кара, бо ў час бліжэйшай сесіі Альбрыхт Бруханскі разам са сваім шваграм Корсакам забілі ў Навагрудку сына Еўлашоўскага Яна. Гэты Корсак, як піша Еўлашоўскі, быў новахрышчэнцам, г.зн. анабаптыстам — паслядоўнікам рэфармацыйнай секты, вераванне якой насіла фанатычны характар. Відаць, ахвярай гэтага фанатызму і стаў сын Еўлашоўскага.

За забойцамі спачатку была паслана па трацыдыі пагоня, каб іх затрымаць і судзіць. Аднак, калі суддзя Зянкевіч даведаўся, што Корсак даводзіцца яму пляменнікам («сестранец екго»), ён загадаў Еўлашоўскаму паслаць услед за пагоняй, каб тая не прычыніла яго пляменніку «што злого». А назаўтра, не зважаючы на няшчасце, якое спасцігла падсудка, загадаў яму, «абы з ним на судех заседал». «Видямо ми се, жем там был ... не межи людьми, але Каинами», — у роспачы піша Еўлашоўскі. Ён жадае, што калі людзі не хочуць яму паспачуваць, то няхай гэта напаткае іх саміх. Няшчасны бацька спадзяваўся, што яго суцешыць сваім казаннем над магілай сына брат па веры, славуты арыянскі прапаведнік і філосаф Ян Ліцыній Намыслоўскі, які тады служыў у Навагрудку пастарам. Але той, сеўшы побач з суддзёй, заняў у гэтай справе яго бок: у аснову свайго казання ён паклаў біблейскую прытчу пра блуднага сына, абвінаваціўшы такім чынам у тым, што адбылося, самога забітага. Убачыўшы гэты агідны малюнак, калі яго сябры скінулі нарэшце свае маскі і паказалі свае сапраўдныя аблічча, Еўлашоўскі вырашыў пакінуць гэту кампанію.

Ад перажытага няшчасця абвастрылася хвароба Еўлашоўскага: пачасціліся выпадкі страты ім прытомнасці, з-а чаго ён ужо не быў у стане засядаць у судах. Таму на пасаду падсудка быў абраны спачатку Рыгор Няміра, затым Марка Палонскі. Завяршае свае ўспаміны Еўлашоўскі мартыралогам, у якім пералічвае факты смерці знаёмых яму людзей — падкаморага полацкага Яна Францкевіча, слугі Яна Гераніма Хадкеві-

ча, Яна Адахоўскага, Паўла Віроўскага і Яна Высоцкага («швагрове два»), нясвіжскага старосты Войцаха Першкі, віленскага ваяводы Крыштофа Радзівіла Перуна, жамойцкага кашталяна Яна Нарушэвіча, валынскага ваяводы Аляксандра Астрожскага.

Гэты пахавальны матыў, якім завяршаюцца запіскі, а таксама адсутнасць у распараджэнні даследчыкаў дадатковых крыніц аб жыцці іх аўтара былі прычынай таго, што дата апошняга запісу (1604 г.) лічылася і датай яго смерці, якая быццам і абарвала яго працу над мемуарамі. Аднак з апублікаваных у пачатку 80-х гг. XIX ст. архіўных матэрыялаў, у прыватнасці з ліста Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі да Еўлашоўскага ад 11 лістапала 1611 г., вынікае, што ў другім дзесяцігоддзі XVII ст. апошні быў яшчэ жывы. У кнізе расійскага гісторыка мінулага стагоддзя К.Харламповіча «Западнорусские православные школы...» змяшчаецца цікавы факт, што Еўлашоўскі 30 мая 1616 г. меў спрэчку з уніяцкімі манахамі, якія скардзіліся на праследаванне кальвіністамі іх школы ў Навагрудку. Значыць, Еўлашоўскі быў сведкам не толькі эпідэміі, галодных гадоў пачатку XVII ст., але і мецяжу шляхты пад кіраўніцтвам Мікалая Зэбжыдоўскага і Януша Радзівіла, а таксама польска-літоўскай інтэрвенцыі ў Маскву (т.зв. «Дзімітрыяды»), якая была арганізавана Рэччу Паспалітай і скончылася няўдачай у 1612 г., аднак па невядомай прычыне Еўлашоўскі не адрэагаваў на гэтыя важныя падзеі свайго часу.

У дакументах з архіва графаў Патоцкіх з Радзыня, якія датычаць жыццёвага шляху Еўлашоўскага, змяшчаюцца звесткі аб яго ўладаннях. Адзін з дакументаў — прывілей на пажыццёвае валоданне маёнткам Еўлашова. Як арандатар маёнтка, размешчанага ў вялікакняскім уладанні, Еўлашоўскі адносіўся да так званай гаспадарскай спадчыннай шляхты. Адначасова яму належалі валокі ў маёнтках Нянькава, Мыслібаж і Каменка Навагрудскага павета. У 1572 г. вялікі князь Жыгімонт Аўгуст памяняў з Хадкевічам Ляхавічы на Свіслач. Так Еўлашоўскі апынуўся пад уладай Хадкевіча, які зацвердзіў за Еўлашоўскім Еўлашова і дадаткова валоку зямлі ў Каменцы. За гэта Еўлашоўскі павінен быў выстаўляць да харугвы Хадкевіча двух коней.

У 1576 г. Ян Геранім Хадкевіч пазычыў у Еўлашоўскага пад заклад двара Еўлашова 200 коп грошаў. У тым жа годзе Еўлашоўскі меў цяжбу са сваім суседам шляхціцам М.Зверавым за валокі ў маёнтку Мыслібаж, якія ён змог выкупіць толькі пасля смерці апошняга. У 1578 г. маршалак вялікі літоўскі Аляксандр Хадкевіч, сын Яна Гераніма Хадкевіча, перадаў Еўлашоўскаму, пінскаму мастаўнічаму, дзве валокі пад заклад 200 коп грошаў, адлучыўшы іх ад Каменкі і далучыўшы да Еўлашова. У 1579 г. абодва заклады Хадкевічаў зацвердзіла Крыстына Хадкевіч са Зборава, удава Яна Гераніма. У 1589 г. кароль зацвердзіў у Гродне дакумент, у якім Аляксандр Хадкевіч прызнаваў усе прывілеі, дадзеныя Еў-

лашоўскаму яго бацькам і маці. Уладальнік гэтага дакумента, г.зн. Еўлашоўскі, быў тытулаваны ў ім навагрудскім і пінскім мастаўнічым. Праз некалькі месяцаў пасля гэтага прывілею Аляксандр Хадкевіч са сваім братам Янам Каралем аддалі мастаўнічаму навагрудскаму Еўлашоўскаму двор Еўлашова, маёнткі Мыслібаж і Каменку пад заклад 1800 грошаў. Прывілей Еўлашоўскі атрымаў за верную службу Яну Гераніму Хадкевічу, а пасля яго смерці — яго жонцы Крыстыне са Зборава. У гэтым прывілеі Аляксандр і Ян Караль Хадкевічы пішуць, што Еўлашоўскі, «вжо маючы лета подстаралые и здорове неспособное, служыты однак дому нашому не переставает». У адрозненні ад ранейшых прывілеяў Еўлашоўскі атрымаў адначасова вызваленне ад служэння конна з тых маёнткаў. Яшчэ раней ён атрымаў ад Крыстыны Хадкевіч прывілей, які вызваляў яго ад усялякіх павіннасцей, а таксама падсуднасці ў любым іншым судзе акрамя ляхавіцкага замкавага.

Польскі гісторык В.Сянкевіч, які апісвае гэтыя дакументы, спрабуе на іх падставе ўдакладніць дату смерці Еўлашоўскага. Паводле другога польскага гісторыка М.Сякерскага, Еўлашоўскі памёр пасля 1616 г. На выпісе з кніг земскіх навагрудскіх побач з суддзёй і пісарам земскім названы і падсудак Фёдар Еўлашоўскі. На элекцыі ў Навагрудку 18 ліпеня 1619 г. падсудкам быў ужо абраны Ян Красноўскі. Прымаючы пад увагу гэты факт, а таксама тое, што Ян Караль Хадкевіч (памёр 24 верасня 1621 г.) пасля смерці Еўлашоўскага адабраў у яго сыноў маёнтак Еўлашова, Сянкевіч лічыць, што Фёдар Міхайлавіч Еўлашоўскі памёр у першай палавіне 1619 г.

З дзевяці сыноў Еўлашоўскага дагэтуль былі вядомыя імёны толькі васьмі, з пяці дачок — тольк дзвюх: Лізавета («Гальшка», 1588—?), Лаўрын (1584—?), Марцін (1585—?), Пётр (?—?), Раіна (1587—?), Самуэль (?—?), Фёдар (?—?), Ян (1579—1602), Яраш (?—?) і Яўхім (1581—?). У 1628 г. уладальнікамі маёнтка Еўлашова былі толькі Пётр і Фёдар Фёдаравічы Еўлашоўскія, якія пастановай Навагрудскага земскага суда былі абавязаны вярнуць яго новаму ўласніку маёнтка Ляхавічы маршалку ВКЛ пану Яну Станіславу Сапегу.

Вядомы расійскі гісторык Вялікага княства Літоўскага І.Лапа назваў Фёдара Еўлашоўскага тыповым узорам шляхціца XVI ст. Безумоўна, у псіхалогіі, звычаях яго ёсць шмат чаго тыповага для яго асяроддзя. Аднак у сілу драматычных калізій свайго часу, што адбіліся на яго лёсе і ўчынках у выглядзе шэрагу паражаючых супярэчнасцей (сын праваслаўных бацькоў, кальвініст, падапечны князя-католіка, меўшы праваслаўную жонку і аддаўшы свае дзіця ў арыянскую школу), ён — не тыповы ўзор шляхціца свайго часу. Узняўшыся ў сілу сваіх высокіх інтэлектуальных здольнасцей на ўзровень лепшых людзей эпохі, Еўлашоўскі пакінуў значны след у гісторыі нацыянальнай культуры. Ён — адзін з аўтараў

каштоўнага ўзору даўняга беларускага права — статута Галоўнага Літоўскага трыбунала. Яго «Успаміны» — каштоўная крыніца па гісторыі Беларусі эпохі Сярэднявечча, а таксама выдатны твор даўняй беларускай літаратуры. Спрактыкаванай рукой чалавека, дасведчанага ў законах нова для айчыннай літаратуры яго часу мемуарнага жанру, Еўлашоўскі выразна і пераканаўча паказаў тагачасныя падзеі, сведкам і ўдзельнікам якіх ён быў, менталітэт свайго сацыяльнага асяроддзя, звычаі і культуру грамадства Беларусі і Рэчы Паспалітай XVI—пачатку XVII стагоддзя.

Літаратура:

1. Еўлашоўскі Фёдар. Успаміны // Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн., 1983, С. 31—122.

2. Свяжынскі У.М. «Гістарычныя запіскі Ф.Еўлашоўскага, Мн., 1990, 122 с.

3. Коршунаў А.Ф. Новыя даныя аб Фёдары Еўлашоўскім // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Серыя грамадскіх навук. 1983, № 1. С. 110—118.

4. Коршунаў А.Ф. Лепшыя здабыткі старажытнай беларускай мемуарыстыкі // Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн., 1983. С. 9—22.

5. Свяжынскі У. Еўлашоўскі Фёдар Міхайлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. Мн., 1996. С. 357.

6. Свяжынскі У. Першы беларускі мемуарыст // Памяць. Ляхавіцкі раён. Мн., 1989. С. 82—84.

7. Спірыдонаў М.Ф. З сівой даўніны // Памяць. Ляхавіцкі раён. Мн., 1989. С. 36—38.

8. Ewa Lechniak. Litewski paź na dworze Gonzagów w Mantui. Z nieznanych archiwaliów polsko-włoskich // Lituano-Slavica Poznaniensia. Studia Historica, t. VI, Poznań, 1994, ss. 109—120.

9. Siekierski Maciej. Theodore Jeulaseuski and his Memoirs // The Journal of Byelorussian Studies, rocz. XIII, vol. IV, nr. 1, London, 1977, ss. 5—8.

10. Siekierski Naciej. Pamiętnikarz Fedor Jewłaszewski (1540—1614) w swietle nowych z ródeł // Studia zródłoznawcze – 24 (1979), ss. 177—180.

11. Sienkiewicz Witold. O podsędku nowogródzkim Fedorze Jewłaszewskim raz jeszcze // Studia Zródłoznawcze – 28 (1983), ss. 207—211.

12. Jevlašauskis Teodoras. Atsiminimai. Vilnius, 1998.

Уладзімір Свяжынскі

Мікалай Крыштоф РАДЗІВІЛ (Сіротка)

(1549—1616)



жо ў сярэдзіне XVI стагоддзя род Радзівілаў становіцца самым уплывовым і найбагацейшым магнацкім родам у Беларуска-Літоўскай дзяржаве. Яго старэйшая галіна яшчэ ў 1515 годзе атрымала княжацкі тытул Свяшчэннай Рымскай імперыі, а 10 снежня 1547 г. тытул імперскага князя быў пашыраны на ўвесь род Радзівілаў.

Асабліва прычынілася да ўзвышэння роду Радзівілаў сярэдняя галіна роду, якая паходзіла ад Яна Мікалая, альбо Яна II Барадатага (1474—1522), маршалка земскага, а ў канцы жыцця кашталяна троцкага. Важнае значэнне для роду Радзівілаў меў яго шлюб з Ганнай Кішчанкай, дачкой гетмана Станіслава Кішкі, якая ўнесла ў пасаг у род Радзівілаў вялікія маёнткі і горад Нясвіж, а таксама Алыку (на Валыні) і Лахву (на Палессі). Ян Мікалай і стаўся пачынальнікам сярэдняй, нясвіжска-алыцкай галіны роду Радзівілаў.

Сын Яна Мікалая, Мікалай Радзівіл Чорны (1515—1565), меў чатырох сыноў; тры з іх заснавалі асобныя лініі гэтай галіны роду Радзівілаў.

Старэйшы сын Мікалая Радзівіла Чорнага і Эльжбеты Шыдлавецкай (1533—1562) — Мікалай Крыштоф Радзівіл з мянушкай Сіротка (2 жніўня 1549 г. — 28 лютага 1616 г.) — і стаўся заснавальнікам нясвіжскай лініі гэтай галіны роду, якая ў сваёй старэйшай лініі згасла ў 1813 годзе ў мужчынскім пакаленні са смерцю нясвіжскага ардыната Дамініка Радзівіла, а ў малодшых адгалінаваннях працягваецца і цяпер.

Калі Мікалай Крыштоф Сіротка нарадзіўся ў замку ў Чмелюве (Сандамірскае ваяводства) 2 жніўня 1549 года, прадстаўнікі роду Радзівілаў ужо стала займалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў Беларуска-Літоў-

скай дзяржаве. Здольным прадстаўнікам роду дзяржаўная кар'ера была забяспечана. Гэтаму прычынялася магутнасць роду, заснаваная на багатых і населеных маёнтках з прыватнаўладальніцкімі гарадамі і мястэчкамі, замкамі і гарадскімі крэпасцямі, узброенымі атрадамі васальнай шляхты і ваенна-служылых людзей. Кар'еры садзейнічалі і сваяцкія сувязі паміж арыстакратычнымі сем'ямі, а таксама палітыка вялікага князя (ён жа і польскі кароль), які абапіраўся на самыя ўплывовыя магнацкія сем'і ў дзяржаве ў правядзенні сваёй палітыкі. Удалай кар'еры садзейнічала і еўрапейская адукацыя маладых арыстакратаў і іх еўрапейскія сувязі, у тым ліку з Германскай (Свяшчэннай Рымскай) імперыяй.

Як сведчыць сямейная легенда, што дайшла да нашага часу, мянушку Сіротка Мікалай Крыштоф Радзівіл атрымаў у дзяцінстве, калі ў каралеўскім палацы ў Кракаве ў адной з заляў згубіў сваіх бацькоў і пачаў плакаць. Праз гэтую залю праходзіў кароль Жыгімонт Аўгуст, узяў малога, пасадзіў на калені і пачаў лашчыць, прыгаворваючы, супакойваючы: «Ты, мая сіротка!» У гэты момант прыйшлі і бацькі.

Як і іншыя юнакі з магнацкіх сем'яў, Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка спачатку атрымаў адукацыю дома — у маёнтку Лукішкі (ля самой Вільні) і ў Нясвіжы. Потым ён вучыўся ва універсітэтах Германіі, пашыраў свае веды і назіранні ў Італіі. Ён сустракаўся з папам Піем V, германскім імператарам Максіміліянам II, з герцагам вюртэмбергскім Хрыстофам. Як і бацька, сын быў пратэстантам, прытрымліваючыся кальвінісцкага (рэфармацкага) веравызнання. Аднак, ужо пасля смерці бацькі, у снежні 1566 г. у Рыме перайшоў у каталіцтва.

Пасля вяртання з-за мяжы, куды ён ездзіў двойчы, Мікалай Крыштоф Сіротка ў пачатку 1567 г. быў прызнаны сваім апякуном, Мікалаем Радзівілам Рудым, стрыечным братам бацькі, паўналетнім і ўступіў ва ўладанне сваімі багатымі маёнткамі. Адначасова стаўся апякуном сваіх малодшых братоў і сясцёр.

Мікалай Крыштоф Сіротка быў магнатам не толькі ў Беларусі і Літве, але меў багатыя маёнткі і ў Польшчы. Ад сваёй маткі, графіні Эльжбеты Шыдлавецкай, ён атрымаў горад Шыдлавец і Шыдлавецкую латыфундыю (Сандамірскае ваяводства) з графскім тытулам. Ад бацькі, Мікалая Радзівіла Чорнага, ён атрымаў тытул князя Свяшчэннай Рымскай імперыі і ў 1567 г., калі стаўся паўналетнім, самыя багатыя латыфундыі ў Беларусі і Літве. 4 снежня 1577 г. адбыўся падзел маёнткаў паміж братамі (сёстры мелі толькі грашовыя пасагі, праўда, у вялікіх сумах). Мікалай Крыштоф атрымаў Нясвіж, Ліпск, Лахву (у Наваградскім павеце), Шацк, Дуброву, Узду, Свержань з Аталезскай воласцю (у Менскім павеце), маёнткі Гарадок і Высокае (у Падляшскім ваяводстве), маёнтак Лукішкі, ля самай Вільні (цяпер у цэнтры горада Вільні). Пасля смерці дваюраднага брата Юрыя Ілініча (1569 г.), з якім скончыўся гэты

графскі род, паводле тэстаменту і акту адопцыі (усынаўлення) Іллінічам Мікалая Крыштофа Радзівіла ад 25 жніўня 1568 г., да Сіроткі пераходзілі маёнткі Іллініча. Кароль і вялікі князь Жыгімонт Аўгуст 1 снежня 1569 г. пацвердзіў тэстамент Юрыя Іллініча. Такім чынам, Мікалай Крыштоф Радзівіл атрымаў Мірскае графства ў Наваградскім павеце, Дворышча — у Лідскім, Чарнаўчыцы і Белую (цяпер Бяла Падляска) — у Берасцейскім павеце, юрысдыку (квартал у горадзе) у Бярэсці. За ўдзел у ваеннай кампаніі супраць маскоўскіх войскаў Жыгімонт Аўгуст у 1568 г. надаў яму мястэчка Крожы з маёнткам у Жэмайціі. Кароль і вялікі князь Жыгімонт Ваза ў 1593 г. надаў яму маёнтак Грэск (на поўнач ад Слуцка). У тым жа 1593 г., пасля падзелаў маёнткаў жонкі з яе сваякамі, ад жонкі атрымаў Дзераўну, Хатава і Налібокі ў Менскім павеце, Пацейкі — у Наваградскім, Жодзішкі — у Ашмянскім.

Акрамя гэтых «сямейных» уладанняў, Радзівіл Сіротка купляў маёнткі паблізу сваіх латыфундый у канцы XVI—пачатку XVII ст.: Салтанаўшчыну, Затур'е, Куносу, Мікалаеўшчыну, мястэчка Магільну з валасцю, Лань, Гарадзею і Гавезну. Так ён павялічыў нясвіжскую латыфундыю, якая межавала з Клецкім княствам, што належала яго брату Альбрыхту. Мікалай Крыштоф купляў і маёнткі, што былі і далей ад Нясвіжа. У 1569 г. ён набыў Стваловічы, да 1601 г. — Карэлічы, Крошын і Калдычэвічы (Наваградскі павет), Салтанішкі (Віленскі павет), Дакудава (Лідскі павет). Потым гэтыя маёнткі былі падзеленыя паміж сынамі Радзівіла Сіроткі. Праўда, некаторыя, менш значныя для М.К.Радзівіла маёнткі ён пазней прадаў.

Дзяржаўная служба Мікалая Крыштофа Радзівіла пачалася з вайсковых чынаў. У лістападзе 1567 г. беларуска-літоўскае войска сабралася каля Радашковічаў на «земскую службу» для ваенных дзеянняў супраць маскоўскіх войскаў падчас Лівонскай вайны. У вайсковым лагеры пад Красным Сялом у маі 1567 г. быў зроблены попіс войска. Сярод атрадаў магнатаў атрады Мікалая Крыштофа Радзівіла былі самыя шматлікія: 539 коннікаў і 386 драбаў (пехацінцаў). На пачатку 1568 г. Радзівіл Сіротка са сваім войскам удзельнічаў у аблозе крэпасці Улы.

У тым жа 1568 годзе Мікалай Крыштоф Сіротка ўдзельнічаў упершыню ў пасяджэнні сойма Вялікага княства Літоўскага ў Гародні, на якім вырашалася пытанне аб дзяржаўнай уніі з Польшчай. Ад гэтага часу Радзівіл удзельнічаў у наступных соймах.

На аб'яднаўчы сойм у Любліне ў 1569 годзе, калі стваралася федэратыўная дзяржава, Радзівіл Сіротка спачатку не паехаў. Але пасля ад'езду дэпутатаў сойма з Вялікага княства Літоўскага (у знак пратэсту супраць жорсткіх умоў уніі) і пасля інкарпарацыі Падляшскага ваяводства і Валыні ў склад Кароны Польскай (12 сакавіка 1569 г.) кароль Жыгімонт Аўгуст выклікаў Мікалая Крыштофа на сойм у Люблін, каб Радзівіл

прынёс прысягу вернасці каралю і Кароне Польскай са сваіх падляшскіх маёнткаў. Пры адмове прыехаць Радзівілу Сіротку пагражала канфіскацыя гэтых маёнткаў. Адначасова з кнутом быў і пернік: Жыгімонт Аўгуст абяцаў надаць Радзівілу тытул падчашага літоўскага (першая прыступка ў службовай кар'еры). Як і большасць паноў з Літвы і Беларусі, Мікалай Крыштоф Сіротка аказваў пасіўны супраціў. Ён, не спяшаючыся, прыехаў у Люблін і 1 чэрвеня 1569 г. прынёс прысягу каралю і Польшчы. У гэты час і іншыя дэпутаты і паны рады вярталіся ў Люблін. 20 чэрвеня 1569 г. Сіротка атрымаў прызначэнне на тытул і функцыі маршалка дворнага літоўскага. Такім чынам, ён увайшоў у склад сената. 1 ліпеня 1569 г. новаспечаны маршалак падпісаў акт Люблінскай уніі.

Аднак Люблінскую унію Радзівіл ацэньваў адмоўна. У гэтым яго погляды падзяляў і Мікалай Радзівіл Руды, віленскі ваявода і канцлер вялікі Беларуска-Літоўскай дзяржавы, з якім стрыечны пляменнік быў па-ранейшаму блізкі. З-за сваёй пасады Радзівіл доўгі час знаходзіўся пры двары, з ім дзяліўся сваімі планамі Жыгімонт Аўгуст.

На сойме 1572 г. разам са сваім стрыем, Мікалаем Радзівілам Рудым, Сіротка заключыў пагадненне з галавой другога ўплывовага роду — Янам Хадкевічам, старостам жамойцкім і маршалкам вялікім літоўскім — праводзіць агульную палітыку захавання самастойнасці Беларуска-Літоўскай дзяржавы ў складзе федэрацыі. Яшчэ кароль быў жывы, а гэтыя самыя ўплывовыя магнаты ў Вялікім княстве Літоўскім вырашылі з дапамогай Рыму выбраць на асобным выбарчым сойме ў Вільні (як было да Люблінскай уніі) вялікім князем эрцгерцага Эрнеста Габсбурга (1553—1595), аднаго з сыноў імператара Максіміліяна II, і такім чынам прымусіць польскую шляхту выбраць яго каралём (каб не разарваць Люблінскую унію). Беларуска-літоўскія магнаты збіраліся паставіць умовай для абрання вялікім князем і каралём эрцгерцага Эрнеста вяртанне Вялікаму княству Літоўскаму Падляшша, Валыні, Кіеўскага і Брацлаўскага ваяводстваў, далучаных падчас пасяджэнняў Люблінскага сойму 1569 г. да Польшчы. Другой умовай будучаму кандыдату была раздача дзяржаўных пасадаў і старостваў у Літве і Беларусі толькі ўраджэнцам Вялікага княства Літоўскага. Вяліся перамовы з прадстаўніком імператара. А ў гэты час у Кнышыне памёр бяздзетны кароль і вялікі князь Жыгімонт Аўгуст, апошні з Ягелонаў (7 ліпеня 1572 г.). 24 жніўня на з'ездзе сенатараў у Кнышыне Мікалай Крыштоф Радзівіл абвясціў, што прадстаўнікі Вялікага княства Літоўскага на элекцыйным (выбарчым) сойме будуць патрабаваць вяртання Падляшша, Валыні, Кіеўскага і Брацлаўскага ваяводстваў.

Падчас выбараў новага караля Радзівіл на сойме не быў, бо паны рада разам з віленскім біскупам Валер'янам Пратасевічам вырашыла пакінуць яго ў Вільні для нагляду за парадкам у сталіцы і дзяржаве. Элекцыйны

сойм уключыў Радзівіла Сіротку ў склад пасольства ў Францыю для запрашэння на трон абранага на сойме прынца Генрыха Валуа (брата французскага караля Карла IX). Мікалай Крыштоф Радзівіл паехаў раней усяго пасольства ў Парыж, каб мець прыватную аўдыенцыю ў прынца і атрымаць ад яго абяцанне захоўваць ранейшыя правы Вялікага княства Літоўскага. Вярнуўся Радзівіл разам з каралём Генрыхам Французам і ўсе пяць месяцаў панавання караля знаходзіўся ў Кракаве. Калі кароль Генрых Валуа (Валезы) даведаўся, што яго старэйшы брат памёр у Парыжы, ён у чэрвені 1574 г. патаемна ўцёк у Францыю і стаўся там каралём Генрыхам III. Радзівіл Сіротка ўдзельнічаў у пагоні за каралём, каб вярнуць яго назад, але дарэмна.

Пасля ўцёкаў караля Генрыха, у час бескаралеўя, Радзівіл быў прыхільнікам абрання эрцгерцага аўстрыйскага Эрнеста, якога прапаноўвалі на трон раней. У пачатку лістапада 1574 г. на з'ездзе паноў рады Вялікага княства Літоўскага падпісаў іх рашэнне аб абранні на трон Эрнеста. Аднак уплывовы польскі магнат Ян Замойскі і сярэдне- і дробнамаёнткавая шляхта насуперак жаданню большасці магнатаў Польшчы і Вялікага княства Літоўскага дамагліся абрання на элекцыйным сойме каралём Стэфана Баторыя, трансільванскага князя, бо ён быў добрым палкаводцам, а ў гэты час вялася цяжкая барацьба з Маскоўскай дзяржавай і трэба было ратаваць Беларусь. Мікалай Крыштоф Радзівіл пагадзіўся з абраннем новага караля.

У сярэдзіне 70-х гадоў XVI ст. палітычная дзейнасць Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі сталася больш пасіўнай. З-за сур'ёзнай венерычнай хваробы, набытай падчас падарожжа ў Еўропу, ён вымушаны быў больш часу сядзець у Нясвіжскім замку і рэдка выязджаў у Вільню і іншыя гарады для ўдзелу ў нарадах сенатараў і ў соймах. Ён амаль цалкам страціў слых, паступова пагаршаўся зрок, агульны стан здароўя. Да таго дадалася падагра. Радзівіл, якому было тады 27 гадоў, у 1576 г. лячыўся ў Явораве, каля Львова, прымаючы там цёплыя саляныя ванны. У 1578 г. ён паехаў на лячэнне ў Германію.

Хвароба паглыбіла рэлігійны настрой Сіроткі. Ён стаў больш набожным. У верасні 1575 г. ён даў зарок, што паедзе пілігрымам у Святую Зямлю, каб там, у Іерусаліме, замаліць свае грахі. Паездку ён вызначыў на той час, калі стан здароўя яго палепшыцца. Лячыўся ён і надалей. У лютым 1580 г. Сіротка выехаў на лячэнне ў Італію, дзе прымаў цёплыя ванны каля Падуі і каля Луккі. Восень і зіму 1580 г. і пачатак 1581 г. ён правёў у Венецыі. Потым вярнуўся дадому.

У 1582 г. Радзівіл Сіротка пачаў сваё падарожжа на Блізкі Усход. 16 верасня 1582 г. ён выехаў з Нясвіжа. У пачатку снежня быў у Венецыі. У красавіку 1583 г. у адзенні пілігрыма на венецыянскім гандлёвым караблі пачаў сваё падарожжа. Па дарозе завітаў на востраў Крыт, затры-

маўшыся ў Кандзіі. Потым наведаў Кіпр. У Ларнацы ён наняў невялічкі карабель, які даставіў яго да Трыпалі (Ліван) 8 чэрвеня 1583 г. Адгэтуль накіраваўся ў Іерусалім, па дарозе наведаўшы Баальбек і Дамаск. 25 чэрвеня 1583 г. Радзівіл быў ужо ў Іерусаліме, дзе наведваў хрысціянскія святыні, перш за ўсё касцёл Гробу Гасподня. Раздаваў у касцёлы каштоўныя кнігі і грошы. Пасля двух тыдняў прабывання ў Іерусаліме Сіротка морам паехаў да Трыпалі, а адгэтуль на караблі ў канцы ліпеня 1583 г. паплыў у Егіпет, дзе правёў каля двух месяцаў. Там наведаў Каір, піраміды ў Гізе, некропаль у Мемфісе і Александрыю. 9 кастрычніка з Александрыі паплыў на Крыт і чакаў там карабля ў Італію. Толькі 10 лютага 1584 г. ён на венецыянскай галеры вырушыў у Італію. Дабраўся да порта Атранта на поўдні Італіі і адтуль паехаў па дарогах да Венецыі. Паблізу горада Пескары (вобласць Абруўцы) Радзівіла на дарозе абрабавалі бандыты. Урэшце 3 красавіка 1584 г. Сіротка дабраўся да Венецыі і пасля адпачынку праз Трыдэнт, Інсбрук і Вену паехаў дадому. 2 ліпеня 1584 г. Радзівіл вярнуўся ў Нясвіж.

Падчас свайго падарожжа на Блізкім Усходзе Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка вёў дзённік. Да 1595 г. ён перапісваў свой дзённік. У 1601 г. дзённік падарожжа М.К.Радзівіла ў Святую Зямлю быў надрукаваны на лацінскай мове, у 1607 г. — на польскай мове, а пазней дзённік выдаваўся на нямецкай мове, рускай і французскай мовах. У XX ст. неаднаразова выдаваўся па-польску. На беларускай мове дзённік выдадзены ў 1994 г. пад арыгінальнай назвай «Пэрэгрынацыя, або Паломніцтва Ясна Асветленага Князя Ягамосьці Мікалая Крыштофа Радзівіла ў Святую Зямлю» у «Кнізе жыцій і хаджэнняў». У свой час гэты літаратурны твор карыстаўся папулярнасцю ў адукаваных чытачоў XVII стагоддзя.

У 1577 г. Радзівіл Сіротка ўдзельнічаў на чале свайго палка ў ваенных дзеяннях каля Заходняй Дзвіны, каб не дапусціць у Беларусь маскоўскія войскі з Інфлянтаў. На пачатку жніўня 1579 г. разам з братам Альбрыхтам прывёў свой прыватны полк (з васальнай шляхты і ваеннаслужылых людзей) з 700 коннікаў у вайсковы лагер пад Свірам. Потым удзельнічаў у аблозе і штурме Полацка. Радзівіл Сіротка быў паранены ў твар падчас аблогі Полацка. За ўдзел у полацкай кампаніі Стэфан Баторый надаў Радзівілу 25 кастрычніка 1579 г. тытул маршалка найвышэйшага (вялікага) літоўскага. У 1581 годзе зноў ён удзельнічаў у вайсковай кампаніі, прывёўшы ў лагер каля Дзісны харугву са 120 гусараў, і потым удзельнічаў у аблозе Пскова (1581 г.).

Мікалай Крыштоф Радзівіл для арганізацыі кіравання сваіх латыфундыяў, замацавання іх за родам Радзівілаў і непадзельнасці маёнткаў выкарыстаў свае назіранні за арганізацыяй феадальных уладанняў у Заходняй Еўропе. Яшчэ ў 1579 г. Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка і яго браты Альбрыхт і Станіслаў заключылі пагадненне аб перадачы сваіх

маёнткаў у спадчыну адзін аднаму, калі ў іх не застанецца мужчынскіх нашчадкаў. Гэтае пагадненне было афармлена асобным актам, падпісаным трыма братамі 16 жніўня 1586 г. у Гародні. Акт быў зацверджаны каралём і вялікім князем Стэфанам Баторыям 10 снежня 1586 г., а потым і соймавай канстытуцыяй (законам) у 1589 г. У 1768 г. сойм яшчэ раз пацвердзіў гэты акт. Утварыліся тры ардынацыі: Нясвіжская, Клецкая і Алыцкая, што належалі тром братам. У склад ардынацый як уласнасць уваходзілі землі і лясы, азёры і рэчкі, вёскі, мястэчкі і гарады. Права на спадчыну вызначалася спецыяльным статутам (ардынацыяй). Ардынацыя не павінна была падлягаць адчужэнню, г.зн. нельга было прадаваць яе цалкам ці па частках. Ардынацыя пераходзіла да старэйшага нашчадка старэйшай мужчынскай лініі. Малодшыя браты атрымлівалі права на спадчыну пасля спынення ўсёй старэйшай мужчынскай лініі. Паводле гэтага пагаднення пасля смерці нашчадкаў кожнага з малодшых братоў ардынацыі пераходзілі да старэйшай (нясвіжскай) лініі Радзівілаў. Уладальнік ардынацыі называўся ардынатам. Жанчыны за нашчадкаў не лічыліся і да спадчыны не дапускаліся: «Або до тых іменей нашых менавіте опісаных Потомкі Нашы Женскага Рожаю ... опроч выправы своей і іншых рэчэй рукомых Ім назначоных не прыходзілі». Вызначаўся і памер грашовага пасагу князёўны Радзівіл: «з тых іменей Девкам, такая ж выправа мает быті зо ста волок по Тысечу злотых Польскіх». У акце ардынацыі 1586 г. князі Радзівілы з пашанай называлі сваіх дачок з вялікай літары «Патомкі Нашы», «Девкі». Ардынацыі замацавалі эканамічную аснову магутнасці роду Радзівілаў і захавалі сваё юрыдычнае дзеянне ажно да XX стагоддзя.

Перапынак у дзяржаўнай і вайсковай дзейнасці Радзівіла Сіроткі быў звязаны з яго хваробай і падарожжам у Італію ў 1582 г. і далей на Блізкі Усход ў 1583—1584 гг. Пасля вяртання на радзіму ў 1584 г. Мікалай Крыштоф Сіротка на пэўны час адышоў ад дзяржаўнай дзейнасці, сканцэнтраваўшы свае высілкі на разбудове рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы, самога горада і фундацыях каталіцкіх касцёлаў і кляштараў.

Мікалай Крыштоф Радзівіл у канцы 70-х і асабліва ў 80-х гадах XVI ст. шмат часу займаўся ўпарадкаваннем сваіх прыватнаўладальніцкіх гарадоў. У сваіх маёнтках Радзівіл правёў валочную памеру па ўзору аграрнай рэформы Жыгімонта Аўгуста. Гэта з цягам часу павялічыла прыбытак у яго скарб. Так, калі ў 1571 г. латыфундыі М.К.Радзівіла Сіроткі давалі прыбытак у 42 тысячы злотых, то ў 1604 г. ужо давалі 58500 злотых, што для тых часоў было вялікім прыбыткам. Каб павялічыць прыбыткі са сваіх гарадоў, трэба было даць мяшчанам эканамічныя ільготы і права на самакіраванне (каб выключыць з працэсу кіравання чыноўнікаў княжацкай адміністрацыі). Так, 27 снежня 1579 г. Радзівіл даў прывілей гораду Міру на гарадское самакіраванне з правам выбару войта

мяшчанамі. 23 красавіка 1586 г. Стэфан Баторый, па просьбе магната, даў прывілей Нясвіжу на магдэбургскае права, з выбарным магістратам і войтам. Гораду было дадзена 100 валок зямлі для пашы. У Нясвіжы, Міры, Белай і Чарнаўчыцах былі адчынены шпіталі. У канцы XVI ст. быў перабудаваны Нясвіжскі замак-крэпасць з бастыёнамі. Сам горад таксама быў абкружаны каменнай сцяной і валам з брамамі, якія таксама былі ўмацаванымі (захавалася да нашых дзён Слуцкая брама). Былі пабудаваныя новыя будынкі — ратуша, касцёлы, упарадкавана рыначная плошча Старога горада. У Нясвіжы была адчынена школа з еўрапейскім узроўнем навучання — езуіцкая калегія. Езуіцкі касцёл у Нясвіжы быў пабудаваны па ўзору рымскага касцёла Іль Джэзу вядомым архітэктарам Янам Марыяй Бернардоні. Былі пабудаваныя ў Нясвіжы кляштар бенедыктынак, а таксама кляштар і касцёл бернардзінцаў. Сіротка таксама пабудаваў касцёлы ў Дуброве, Чарнаўчыцах, Міры, Сверджані, Белай. Ён быў фундатарам уніяцкіх цэркваў у Нясвіжы, Лахве і Старым Сверджані.

У Нясвіжскім замку Радзівіл Сіротка заснаваў бібліятэку, карцінную галерэю, а таксама арсенал markdownрознай зброі і вайсковага рыштунку. За свой кошт падрыхтаваў выданне карты Вялікага княства Літоўскага («радзівілаўская» карта 1603 г., другое выданне 1613 г.). Перадаў у Вільню пратэстанцкую друкарню з Бярэсця, аддаўшы яе каталіцкаму касцёлу, а з 1586 г. — Віленскай езуіцкай акадэміі.

У 1584 г. Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка не прыняў прапановы каталіцкай іерархіі прэтэндаваць на пасаду віленскага ваяводы, якая стала вакантнай пасля смерці яго стрыечнага дзядзькі Мікалая Радзівіла Рудога. Нават калі кароль Стэфан Баторый прапанаваў яму гэты тытул, Радзівіл адмовіўся ад яго; у выніку гэтай адмовы тытул віленскага ваяводы перайшоў да сына Мікалая Рудога — Крыштофа Мікалая Радзівіла Перуна.

24 лістапада 1584 г. Радзівіл Сіротка, якому было ўжо 35 гадоў, у касцёле свайго мястэчка Дзераўна ўступіў у шлюб з 15-гадовай княжной Гальшкай (Эльжбетай) Еўфеміяй Вішнявецкай (1569—1596), дачкой ваяводы валынскага князя Андрэя Вішнявецкага, па веравызнанню кальвіністкай. Пад уздзеяннем мужа яна ў наступным годзе перайшла ў каталіцтва. Больш таго, Мікалай Крыштоф Радзівіл пераканаў і сваю цешчу Еўфемію Вішнявецкую (1539—1589) таксама прыняць каталіцтва. Як вядома, сваіх братоў ён схіліў перайсці з кальвінізму ў каталіцтва ў пачатку 70-х гадоў.

Ад шлюбу з Гальшкай Вішнявецкай меў за 12 гадоў ажно 9 дзяцей, некаторыя з іх паміралі ў дзяцінстве (з-за вынікаў хваробы бацькі). З яго дзяцей вядомыя: Ян Ежы (1588—1625), кашталян троцкі з 1613 г. і ардынат нясвіжскі, Альбрыхт Уладзіслаў (1589—1636), ардынат

нясвіжскі і кашталян віленскі. Яны былі жанатыя, але дзяцей не мелі. Зыгмунт Караль (1591—1642), рыцар і камандор стваловіцкі Мальтыйскага ордэну, ваявода наваградскі, нежанаты. Толькі малодшы сын, Аляксандр Людвік (1594—1654), ардынат нясвіжскі і ваявода полацкі, меў нашчадкаў. Дачка Радзівіла Сіроткі Эльжбета (1585—1618) была двойчы замужам, першы раз за Габрыэлем Тэнчынскім, люблінскім ваяводам, другі раз за Крыштофам Кішкам, віцебскім ваяводам. Сын Крыштоф Мікалай (1590—1607) памёр падчас вучобы ва універсітэце Балоньі.

Вясной 1586 г. Сіротка адмовіўся на карысць свайго брата Альбрыхта ад пасады вялікага маршалка, але кароль і вялікі князь Стэфан Баторый 1 чэрвеня 1586 г. надаў яму пасаду кашталяна троцкага (другі кашталянскі тытул у Вялікім княстве Літоўскім). У гэты час Мікалай Крыштоф Радзівіл не ўдзельнічаў у палітычным жыцці дзяржавы. Аднак ён выказваўся супраць новых планаў караля Стэфана Баторыя — вайны з Расіяй (пасля заключанага ў 1582 г. перамір'я).

Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка пачаў больш актыўнае палітычнае жыццё ўжо пасля смерці караля Стэфана Баторыя (снежань 1586 г.). Падчас бескаралеўя ў 1587 г. разам з віленскім ваяводам Крыштофам Радзівілам Перуном ён схіляўся да кандыдатуры на каралеўскі трон расійскага цара Фёдара, а таксама да варыянту карыснай, з яго пункту гледжання, для Вялікага княства Літоўскага дзяржаўнай уніі з Маскоўскай дзяржавай. Але пад уплывам папскага нунцыя Анібала падтрымаў кандыдатуру на каралеўскі трон аўстрыйскага эрцгерцага Максіміліяна Габсбурга, малодшага брата імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Рудольфа II. Разам са сваімі братамі агітаваў сярод дэпутатаў на элекцыйны (выбарчы) сойм за кандыдатуру эрцгерцага. Падчас выбарчага сойма пратэставаў супраць абвяшчэння каралём шведскага прынца Жыгімонта Вазы, што зрабіў канцлер каронны і гетман вялікі каронны Ян Замойскі. А на сойме галасы падзяліліся. Тады Радзівіл Сіротка прапанаваў эрцгерцагу Максіміліяну хутчэй з войскам увайсці на тэрыторыю Польшчы і каранавацца. У лістападзе 1587 г. М.К.Радзівіл удзельнічаў у Вільні ў з'ездзе сенатараў і дэпутатаў ад Вялікага княства Літоўскага і быў абраны ў склад дэлегацыі ад Вялікага княства Літоўскага для перамоваў з абодвума прэтэндэнтамі на трон, каб выбраць таго, хто з іх прапануе лепшыя ўмовы для Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

Сам Радзівіл Сіротка ў каранацыйным сойме, падчас каранацыі Жыгімонта Вазы ў Кракаве, удзелу не прымаў. Ён прызнаў выбары новага караля толькі тады, калі Жыгімонт у канцы 1588 г. зацвердзіў правілеі шляхце Вялікага княства Літоўскага, а галоўнае, калі кароль зацвердзіў Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г., у якім пацвярджалася, што Беларуска-Літоўская дзяржава застаецца самастойнай (у межах федэрацыі з Польшчай). Радзівіл прымаў удзел у «пацы-

фікацыйным» сойме 1589 г., на якім ён падпісаў ратыфікацыю пагаднення паміж прыхільнікамі абодвух прэтэндэнтаў на трон. Але і надалей заставаўся Радзівіл Сіротка прыхільнікам аўстрыйскага эрцгерцага і, калі ў 1589 г. існаваў праект выезду караля Жыгімонта ў Швецыю, Сіротка зноў знаходзіўся сярод прыхільнікаў Максіміліяна. Жыгімонт быў ужо наследным прынцам у Швецыі і некалькі гадоў вагаўся, ці кінуць Польшчу і Беларуска-Літоўскую дзяржаву.

У 1590 г. стасункі Мікалая Крыштофа Радзівіла з каралём Жыгімонтам III палепшыліся. Каб схіліць да сябе уплывовага беларуска-літоўскага магната, кароль і вялікі князь 10 жніўня 1590 г. надаў Радзівілу Сіротку тытул ваяводы троцкага (другая ваяводская пасада пасля пасады ваяводы віленскага). Як шмат хто з тагачасных магнатаў, М.К.Радзівіл абараняў самастойнасць Вялікага княства Літоўскага. У маі 1591 г. ён удзельнічаў у галоўным з'ездзе Вялікага княства ў Вільні, на якім з іншымі сенатарамі выступаў супраць надання свайму брату, віленскаму біскупу Юрыю Радзівілу, тытула біскупа кракаўскага, бо беларуска-літоўскія магнаты бачылі ў гэтым прызначэнні небяспеку прызначэння каралём біскупам у Вільню польскага святара. У 1592 г. Радзівіл Сіротка напісаў да караля ліст, у якім дакараў караля Жыгімонта, што кароль збіраецца ажаніцца з аўстрыйскай эрцгерцагіняй Анай без згоды на гэты шлюб сойма, паколькі паводле законаў як у Польшчы, так і ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве кароль не меў права ажаніцца без згоды сенатараў і дэпутатаў. Аднак у іншых выпадках М.К.Радзівіл Сіротка бараніў караля ад нападак апазіцыі. Адначасова абвяргаў абвінавачванні, што ён і яго браты з'яўляюцца прыхільнікамі аўстрыйскіх Габсбургаў, бо носяць тытул імперскіх князёў Свяшчэннай Рымскай імперыі, які атрымаў іх бацька, як і іншыя Радзівілы. У гэты ж час Радзівіл Сіротка ўдзельнічаў у соймах. У канцы 1595 — пачатку 1596 гг. М.К.Радзівіл удзельнічаў у ваенных дзеяннях супраць казацкага войска Семярына Налівайкі, якое прыйшло з Валыні на тэрыторыю Беларусі. Супраць казакоў, да якіх далучыліся мясцовыя сяляне, ён выставіў сваё прыватнае войска з некалькіх соцень жаўнераў. У канцы лютага 1596 г. у Капылі, дзе ён знаходзіўся, збіралася і шляхецкае апалчэнне навагрудскай шляхты. Падчас ваенных дзеянняў супраць войска С.Налівайкі М.К.Радзівіл падпарадкаваў свае атрады гетману найвышэйшаму Крыштофу Радзівілу Пяруну, свайму траюраднаму брату.

У кастрычніку 1596 г. Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка быў у Бярэсці, як адзін з трох каралеўскіх паслоў, на саборы праваслаўнай царквы, калі большасць праваслаўных епіскапаў і сам мітрапаліт Міхаіл Рагоза прынялі царкоўную унію. У наступныя некальні гадоў Радзівіл зноў не ўмешваецца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай, але соймы і перадсоймавыя з'езды Вялікага княства наведвае. У гэты час

М.К.Радзівіл адыходзіць ад свайго родзіча з біржанскай галіны роду Радзівілаў — гетмана Крыштофа Перуна, галавы кальвіністаў у Вялікім княстве Літоўскім. Так, вясной 1601 г. Радзівіл Сіротка выправіў на вайну супраць Швецыі ў Інфлянты са свайго прыватнага войска гусарскую харугву з 200 коннікаў, але падпарадкаваў яе не гетману К.Радзівілу Перуну, а яго недругу, старосце жамойцкаму Яну Каралю Хадкевічу, гетману польнаму літоўскаму.

26 сакавіка 1604 г. Мікалай Крыштоф Радзівіл атрымаў прывілей на Віленскае ваяводства. Такім чынам, ён заняў першае месца сярод правінцыяльнай адміністрацыі Вялікага княства Літоўскага. Як і большасць беларуска-літоўскіх магнатаў новы віленскі ваявода выступіў супраць падтрымкі Ілжэдзмітрыя І і ўмяшання ва ўнутраныя справы Расіі. Ён заявіў, што «спачатку трэба справіцца з Інфлянтамі, а потым думаць пра Маскву». Улетку 1605 г. Радзівіл удзельнічаў у нарадах беларускалітоўскіх сенатараў, на якіх вырашалася пытанне аб дапамозе гетману Яну Каралю Хадкевічу, які ў гэты час змагаўся ў Інфлянтах супраць наступу шведскіх войскаў. Ён выслаў са свайго Шавельскага староства роту пяхоты ў 100 жаўнераў і паслаў яе, каб узмацніць гарнізон Рыгі.

Падчас рокашу* М.Зэбжыдоўскага ў 1606—1607 гг., калі ваявода кракаўскі М.Зэбжыдоўскі ў Польшчы і Януш Радзівіл, галава пратэстанцкай апазіцыі ў Літве і Беларусі, выступілі супраць абсалютысцкіх планаў караля, Радзівіл Сіротка ўзначальваў прыхільнікаў караля і вялікага князя Жыгімонта ў Беларусі і Літве. Праўда, больш актыўна Жыгімонта падтрымлівалі гетман вялікі Я.К.Хадкевіч і канцлер Леў Сапега. Падчас з'езда прыхільнікаў караля ў ліпені 1606 г. у Вільні было прынята рашэнне аб незаконнасці з'езду ракашан у Польшчы. На з'ездзе сенатараў і дэпутатаў Вялікага княства Літоўскага ў Навагрудку ў верасні 1606 г. М.К.Радзівіл падтрымаў рашэнне аб перадачы грошай з падаткаў на аплату войска ў Інфлянтах, каб затрымаць жаўнераў там і каб незадаволеныя жаўнеры не прыйшлі ў Літву і Беларусь і не пачалі рабаваць панскія маёнткі і сялян. На Варшаўскім сойме 1607 г. Радзівіл Сіротка, асуджаючы ўдзельнікаў рокашу супраць караля, быў супраць ўзброенай барацьбы з удзельнікамі гэтага рокашу. У пачатку чэрвеня 1607 г. быў пасланы як адзін з сенатараў соймам у Варшаве ў лагер ракашанаў непадалёку ад Варшавы. Аднак мірная місія не ўдалася. У канцы чэрвеня зноў наведаў лагер ракашанаў з прапановай мірных умоў, што склаў сойм. Аднак і цяпер ракашане адмовіліся прыняць гэтыя ўмовы. Тады Мікалай Крыштоф Радзівіл на чале сваёй коннай харугвы разам з войскам караля паспяшыў за адступаючымі ракашанамі. Пасля паражэння ракашанаў у бітве ля Гузава (Сандамір-

* Рокаш — законны ўзброенны саюз шляхты супраць караля.

скае ваяводства) 6 ліпеня 1607 г. М.К.Радзівіл Сіротка стаўся мірным пасрэднікам паміж каралём і адным з кіраўнікоў апазіцыі, сваім родзічам Янушам Радзівілам. Справа прымірэння закончылася толькі ўлетку 1611 г., калі Януш Радзівіл у Вільні папрасіў прабачэння ў караля Жыгімонта, які вяртаўся ў Польшчу пасля ўзяцця Смаленска падчас вайны паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй 1609—1618 гг. Вясной 1608 г. Радзівіл Сіротка памірыў двух магнатаў, якія да таго часу варагавалі, Януша Радзівіла і гетмана вялікага Яна Караля Хадкевіча.

М.К.Радзівіл працягваў накіроўваць войскі ў Інфлянты супраць шведскай арміі. Так, у жніўні 1609 г. ён накіраваў гетману Я.К. Хадкевічу сваю ўласную гусарскую харугву з 200 коннікаў і сына Альбрыхта Уладзіслава на чале іншых харугваў. Ён выступаў супраць вайны з Расіяй і не паслаў пад Смаленск свае атрады. Кароль быў гэтым вельмі незадаволены.

У 1610 г. Радзівіл быў у Вільні, пры двары каралевы. Потым у ліпені 1611 г. зноў прыехаў у Вільню, дзе прымаў удзел ва ўрачыстасцях пасля перамогі караля пры ўзяцці Смаленска. У 1613 г. Мікалай Крыштоф Радзівіл апошні раз наведаў сойм. З-за хваробы ўжо больш удзелу ў палітычным жыцці не прымаў. На пачатку 1613 г. нават адмовіўся ад пасады віленскага ваяводы, але кароль адстаўкі не прыняў.

У апошнія гады жыцця Радзівіл Сіротка быў вельмі хворым. Ён скардзіўся не толькі на глухату, але пачаў траціць памяць, гаварыў з цяжкасцю і называў сябе «паўчалавекам». Памёр Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка ў Нясвіжы 28 лютага 1616 года. Загадаў пахаваць сябе ў езуіцкім касцёле са сціплым абрадам.

Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка ўвайшоў у гісторыю Беларусі і Літвы як дзяржаўны дзеяч, які адстойваў самастойнасць Вялікага княства Літоўскага ў межах федэратыўнай Рэчы Паспалітай. Ён быў прыхільнікам палітыкі караля польскага і вялікага князя літоўскага, але часам не згаджаўся з гэтай палітыкай, напрыклад у справе польска-беларускай інтэрвенцыі ў Маскоўскае царства. Гэта быў таксама падарожнік, мецэнат, які пераўтварыў Нясвіж у прыгожую архітэктурную рэзідэнцыю вялікіх латыфундый нясвіжскай галіны роду Радзівілаў. Ён таксама праявіў сябе як дзеяч Контррэфармацыі ў Беларусі.

Літаратура:

1. Грицкевич В.П. Путешествия наших земляков. Мн. 1968.
2. Грицкевич А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. Мн. 1975.
3. Kotłubaj E. Galerja nieświeżska portretów Radziwiłłowskich. Wilno, 1857.
4. Bartoszewicz K. Radziwiłłowie. Warszawa–Kraków, 1928.

5. Taurogiński B. Z dziejów Nieświeża. Warszawa, 1937.

6. Z dokumentów Xięcia Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła zwanego Sierotką. Wyd. 2-ie. Warszawa, 1936.

7. Lulewicz H. Radziwiłł Mikołaj Krzysztof // Polski Słownik Biograficzny. Tom XXX/2, zeszyt 125. Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk–Lódź, 1987, s. 349–361.

Анатоль Грыцкевіч

Леў САПЕГА
(1557—1633)

Леў Сапега (4 красавіка 1557 г., Астроўна, Віцебскі павет —7 ліпеня 1633 г., Вільня), гербу Ліс. Прадстаўнік старажытнага беларускага шляхецкага роду, які паходзіў з полацкіх баяраў. Выдатны дзяржаўны і вайсковы дзеяч Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Займаў пасады пісара літоўскага, падканцлера, доўгі час — канцлера, а потым віленскага ваяводы і гетмана вялікага. Адзін з самых уплывовых дзяржаўных дзячаў канца XVI—першай трэці XVII ст. у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай.

Леў Іванавіч Сапега паходзіў са старэйшай чарэйскай (альбо чарэйска-ружанскай) лініі роду Сапегаў. Быў старэйшым сынам Івана Іванавіча Сапегі (памёр у 1580 г.), старосты драгіцкага і падстаросты аршанскага, і князёўны Багданы Друцкай-Саколінскай-Канаплі (Канаплянкі), якая памерла каля 1584 г. Дзед Льва Сапегі, Іван Багданавіч Сапега (памёр у 1516 г.) быў ваяводам віцебскім, а потым — падляскім. Такім чынам, Леў Сапега нарадзіўся ў магнацкай сям'і, якая мела ўплывовыя сваяцкія сувязі, валодала багатымі маёнткамі, што дало магчымасць здольнаму юнаку распачаць бліскучую кар'еру.

Калі Леў Сапега быў яшчэ хлопцам, бацька аддаў яго на вучобу і выхаванне на двор віленскага ваяводы і канцлера вялікага Мікалая Радзівіла Чорнага, з малодшымі сынамі якога Леў Сапега вучыўся. У 1570 г. ён разам з трыма малодшымі сынамі Мікалая Радзівіла выехаў на вучобу ў Германію, дзе запісаўся ў 1570 г. студэнтам у Лейпцыгскі універсітэт. У Германіі з-за ўплываў Рэфармацыі ён змяніў сваё праваслаўнае веравызнанне і стаў пратэстантам (кальвіністам). Ён добра ведаў права, замеж-

ныя мовы і бегла размаўляў па-латыні. У 1573 г. ён вярнуўся на радзіму. Неўзабаве Леў Сапега дзякуючы сваім ведам і пратэкцыі Радзівілаў быў прыняты пры двары караля і вялікага князя Стэфана Баторыя. У 1579 г. Сапега ўдзельнічаў на чале гусарскай харугвы (палка) у полацкай кампаніі Стэфана Баторыя і ў вызваленні Полацка ад войск Івана Жахлівага. Кароль прыняў яго ў лік сваіх дваранаў (прыдворных) 30 студзеня 1580 г. Сапега быў прызначаны на пасаду вялікакняскага (каралеўскага) сакратара. Разам з каралём Стэфанам Баторыям ён у 1580—1581 гг. прымаў удзел у ваенных паходах на Вялікія Лукі і Пскоў. Зноў ён узначальваў гусарскую харугву. У 1581 г. Сапега атрымаў ад вялікага князя і караля пасаду пісара вялікага Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Ад гэтага часу ён уваходзіць у склад сціслага кола кіраўнікоў дзяржавы.

Разам з канцлерам Астафіям Валовічам і падканцлерам Крыштофам Мікалаем Радзівілам Леў Сапега прымаў удзел у стварэнні вышэйшага апеляцыйнага суда ў дзяржаве — Галоўнага трыбунала Вялікага княства Літоўскага. Такім чынам, завяршылася судовая рэформа ў дзяржаве, і судовая сістэма мела цяпер такі ж характар, як і ў Польшчы, з выбарнымі (а не прызначанымі кіраўніком дзяржавы) суддзямі з шляхецкага саслоўя.

У лютым 1584 г. Леў Сапега ў рангу пасла быў накіраваны ў Маскву да цара Івана IУ для вырашэння памежных пытанняў і для абмену ваеннапалоннымі. Аднак пасольства было затрымана ў Мажайску, бо ў сакавіку 1584 г. памёр Іван Грозны. Урэшце Леў Сапега быў прыняты царом Фёдарам Іванавічам. Было падпісана новае перамір'е, і Сапегу ўдалося вызваліць з палону 900 чалавек. За ўдалую дыпламатычную місію Леў Сапега атрымаў ад вялікага князя і караля 2 лютага 1585 г. пасаду падканцлера Вялікага княства Літоўскага, а 20 ліпеня 1586 г. — пажыццёва Слонімскае староства, прыбыткі з якога ішлі яму. Пасля гэтага Леў Сапега зрабіў Слонім сваёй галоўнай рэзідэнцыяй.

Леў Сапега, маючы ўжо 29 гадоў, 1 верасня 1586 г. ажаніўся з Даротай, дачкой кашталяна люблінскага Андрэя Фірлея (яна памерла 14 сакавіка 1591 г.), якая была ўжо ўдавой троцкага ваяводы князя Стэфана Збаражскага (памёр у 1585 г.). За свайго першага мужа яна выйшла замуж у 1581 годзе і мела ў гэтым шлюбе дачку Барбару Збаражскую. Льву Сапегу Дарота Збаражская-Сапежына нарадзіла сына Яна Станіслава (1589—1635), які потым стаўся маршалкам вялікім літоўскім, а таксама яшчэ траіх дзяцей, якія памерлі немаўлятамі (у тыя часы дзіцячая смяротнасць была вельмі высокай). Леў Сапега пахаваў жонку ў віленскім касцёле святога Міхаіла.

У 1585—1586 гг., калі Стэфан Баторый знаходзіўся ў Гродне, Леў Сапега быў пры двары. Ён распрацоўваў праект уніі Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай. У жніўні і верасні 1586 г. у Гродне Леў Са-

пега ўдзельнічаў у мірных перамовах з маскоўскім пасольствам князя Фёдара Траякурава.

Падчас бескаралеўя 1587 г., пасля смерці Стэфана Баторыя, Леў Сапега быў адным з актыўнейшых сенатараў Вялікага княства Літоўскага. На канвакацыйным сойме ў лютым 1587 г., які выпрацоўваў умовы абрання новага караля і кампетэнцыю каралеўскай улады на перыяд яго панавання, Леў Сапега выступіў разам з троцкім ваяводам Янам Глябовічам супраць спробаў польскіх магнатаў падпарадкаваць сабе Вялікае княства Літоўскае. Прапанаваў у сенаце весці з маскоўскім бокам перамовы аб уніі дзвюх дзяржаў. Для гэтай мэты ён сустрэўся ў сакавіку 1587 г. у Навагрудку з пасольствам ад цара Фёдара Іванавіча і неафіцыйна прапанаваў маскоўскім дыпламатам падтрымаць кандыдатуру цара Фёдара на трон Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. На элекцыйным (выбарчым) сойме 1587 г. Леў Сапега пад уплывам Крыштофа Мікалая Радзівіла Перуна выказаўся за абранне каралём і вялікім князем цара Фёдара, але, калі гэтая кандыдатура не атрымала падтрымкі, разам з часткай дэпутатаў ад Вялікага княства Літоўскага падтрымаў кандыдатуру шведскага каралевіча Жыгімонта Вазы, унука па матчынай лініі караля і вялікага князя Жыгімонта Старога, аднак пры ўмове, што з Расіяй будзе заключаны мірны дагавор. Пад уплывам Сапегі Беларуска-Літоўская дзяржава, асобна ад Польшчы, заключыла з Расіяй перамір'е на 15 гадоў. Але пасля абрання караля гэты дагавор не быў зацверджаны.

Жыгімонт Ваза быў абраны каралём пасля таго, як войска прыхільнікаў другога кандыдата на трон, аўстрыйскага эрцгерцага Максіміліяна, было разбіта. Аднак беларуска-літоўскія магнаты доўгі час, пакуль не скончылася барацьба паміж абодвума кандыдатамі на карону, займалі нейтральную пазіцыю. І толькі ў снежні 1587 г. на з'ездзе сенатараў і дэпутатаў сойму ад Вялікага княства Літоўскага ў Бярэсці новаабраны кароль быў прызнаны і вялікім князем літоўскім. Леў Сапега з Янам Глябовічам паехалі ў пачатку студзеня 1588 г. у Кракаў. Жыгімонт Ваза пачуваўся ўсё ж на троне няпэўна. Каб атрымаць падтрымку беларуска-літоўскіх магнатаў і шляхты, ён 28 студзеня 1588 г. выдаў прывілей, якім зацвярджаў III Статут Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Статут 1588 года падкрэсліваў самастойнасць гэтай дзяржавы («панства»), як і да Люблінскай уніі 1569 г. А польская шляхта, паводле Статута, прызнавалася «суседзямі», «чужаземцамі» і не мела права набываць і атрымоўваць у Вялікім княстве маёнткі і дзяржаўныя пасады. 12-ы артыкул 3-га раздзелу Статута 1588 г. забараняў надаваць якія-небудзь дзяржаўныя пасады, надаваць або здаваць у арэнду польскай шляхце мясцовасці, гарады і мястэчкі, маёнткі. Ёй забаранялася купляць маёнткі або атрымліваць іх у спадчыну. Толькі ўраджэнцы Вялікага княства Літоўскага мелі права займаць любыя (і высокія, і малыя)

дзяржаўныя пасады. Гэтым артыкулам не толькі перакрэсліваўся адпаведны артыкул Люблінскай уніі 1569 года, але замацоўваліся даўнія юрыдычныя нормы забароны набыцця маёнткаў польскай шляхтай, якія яшчэ былі зафіксаваны ў Статутах 1529 і 1566 гадоў. Цяпер польскі шляхціц мог прыехаць у Беларусь і Літву, ажаніцца з якой-небудзь мясцовай шляхцянкай і, калі толькі яна была спадчынніцай маёнтка (а такое было рэдка, бо маёнтак пераходзіў у спадчыну сынам), то толькі ўжо дзеці ад гэтага шлюбу (ураджэнцы Вялікага княства Літоўскага) мелі правы на маёнтак, а не іх бацька — паляк. Таму ў Беларусь і Літву наплыву польскай шляхты не было, у адрозненні ад Украіны, якая з 1569 г. уваходзіла ў склад Польшчы. За беларуска-літоўскай шляхтой замацоўваліся шматлікія прывілеі. Тым самым Жыгімонту была гарантаваная падтрымка Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

Леў Сапега заняўся выданнем Статута, які адрэдагаваў, стварыўшы, па сутнасці, новую канцэпцыю незалежнай Беларуска-Літоўскай дзяржавы. У тым жа 1588 годзе Статут быў выдадзены на беларускай, дзяржаўнай мове ў Вільні ў друкарні Мамонічаў. Потым, у 1614 і 1619 гг., Статут зноў выдаваўся ў Вільні пад наглядам Сапегі. У прадмове да Статута 1588 г. Леў Сапега, маючы на ўвазе беларускую мову, пісаў: «А если которому народу встыд прав своих не умети, поготовю нам, которые не обчым яким языком, але своим власным права списаные маем и кождого часу чого нам потреба ку отпору всякое кривды ведати можем». Статут 1588 г. дзейнічаў на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны да 1840 г., пакуль не быў скасаваны Мікалаем I.

Нягледзячы на пэўныя разыходжанні ў палітыцы паміж каралём Жыгімонтам і Львом Сапегам, кароль падтрымліваў Льва Сапегу, аўтарытэт якога ў Беларусі і Літве быў вялікі. Яшчэ ў 1586 г. Леў Сапега перайшоў з кальвінізму ў каталіцтва, што садзейнічала яго далейшай кар'еры, аднак звычайна ён займаў талерантную пазіцыю ў рэлігійным пытанні.

Пераход Льва Сапегі ў каталіцтва адбыўся дзякуючы дзейнасці ў Вільні езуітаў і асабліва выдатнага прамоўцы і прапаведніка Пятра Скаргі, які быў першым рэктарам Віленскай езуіцкай акадэміі. П.Скарга стварыў у Вільні касцёльнае брацтва Божага Цела, да якога належаў Леў Сапега. Сапега стаўся багатым фундатарам для Каталіцкага касцёла ў Вялікім княстве Літоўскім. Ён пабудаваў і забяспечыў 24 касцёлы, у тым ліку і ў Оршы, Слоніме, Ружанах, жаночы кляштар у Вільні (1594 г.), кляштар кармелітаў ў Бялынічах (1623 г.), езуіцкі касцёл і калегію (навучальную ўстанову) у Бярэсці (1623 г.), уніяцкую царкву Святой Тройцы разам з базыліянскім манастыром у Чарэі (1599 г.). Сапега пашырыў фундацыю караля для езуіцкай калегіі ў Оршы (1610 г.). Рабіў фундацыі і для іншых святыняў.

У красавіку 1589 г. кароль надаў яму тытул канцлера вялікага Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Такім чынам, Леў Сапега становіцца кіраўніком знешняй і ўнутранай палітыкі Вялікага княства Літоўскага ў адказны гістарычны перыяд для нашай тагачаснай дзяржавы, падчас ваенных канфліктаў у Прыбалтыцы, на ўсходніх і паўднёвых рубяжах Рэчы Паспалітай. У гэты ж час Леў Сапега набывае новыя маёнткі, сярод іх Лепель (Полацкае ваяводства) і Іказнь (Браслаўскі павет). Не заўсёды канцлер Леў Сапега знаходзіўся ў сталіцы або на соймах у Польшчы. Так, восень 1589 г. ён правёў у сваім маёнтку у Маладзечне. Звычайна ж ён знаходзіўся ў Вільні і кіраваў дзяржаўнымі справамі або ездзіў да караля ў Кракаў, які яшчэ быў сталіцай Польшчы. Праўда, праз некалькі гадоў, у 1596 г., кароль Жыгімонт III Ваза перанёс сваю рэзідэнцыю ў Варшаву, і гэты горад з таго часу стаўся сталіцай Польшчы.

У 1591 г. у Вялікім княстве Літоўскім адбыўся канфлікт паміж пратэстантамі (пераважна кальвіністамі) і дзяржаўнымі ўладамі. Пратэстанты патрабавалі ад уладаў выканання акту Варшаўскай генеральнай шляхецкай канфедэрацыі 1573 г., якая (на правах сойму Рэчы Паспалітай) пацвярджала вольнае выкананне сваёй рэлігійнай дзейнасці вернікамі ўсіх хрысціянскіх канфесій. Канцлер абяцаў пратэстантам бараніць іх правы і вольнасці, якія дагэтуль парушаліся. Дзеля гэтага Л.Сапега сустракаўся з адным з кіраўнікоў пратэстантаў Вялікага княства Літоўскага Андрэем Валянам. У гэты час Леў Сапега ўвайшоў у канфлікт з каралём і польскімі ўладамі. У 1596 г. Сапега адмовіўся паставіць вялікую дзяржаўную пячатку на акт аб прызначэнні на пасаду віленскага біскупа ўраджэнца Польшчы луцкага біскупа Бернарда Мацяёўскага. А без гэтай пячаткі прызначэнне не было сапраўдным і не мела законнай сілы нават з подпісам караля (вялікага князя). Сапегу падтрымалі ў гэтым і іншыя вышэйшыя саноўнікі Вялікага княства Літоўскага, бо парушаліся нормы Статута 1588 г. Канфлікт скончыўся толькі ў 1600 годзе, калі на віленскую кафедру быў прызначаны мясцовы ўраджэнец Бенедыкт Война, а не паляк.

У кастрычніку 1596 г. у Бярэсці была заключана царкоўная унія, акт пра арганізацыйнае аб'яднанне каталіцкага касцёлу і праваслаўнай царквы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Мэтамі уніі былі неабходнасць аб'яднання абедзвюх цэркваў супраць пратэстанцтва, ідэйнае аб'яднанне духавенства і феадалаў Рэчы Паспалітай пры правядзенні ўнутранай і знешняй палітыкі, захаванне рэлігійна-культурнай незалежнасці дзяржавы, процідзеянне імкненню рускага цара захапіць землі Беларусі і Украіны. Леў Сапега падтрымаў ідэю стварэння уніяцкай царквы. Сапега асабіста прысутнічаў на Берасцейскім царкоўным саборы як каралеўскі камісар і выступіў на саборы з палымянай прамовай у абарону царкоўнай уніі.

Леў Сапега займаўся і ўпарадкаваннем дзяржаўных дакументаў. Пры

ім спраўна працавала дзяржаўная канцылярыя. Паводле яго загаду з 1594 года пачалося перапісванне кніг Літоўскай метрыкі, дзяржаўнага архіва, што было скончана ў 1607 г. Гэта было зроблена для таго, каб рабіць выпіскі для дзяржаўнай дакументацыі з архіва. Дарэчы, гэтая ініцыятыва Льва Сапегі дапамагла захаваць старажытныя акты XVI і нават XV стагоддзяў.

У гэты ж час Леў Сапега ўзмацніў свае становішча ў вышэйшых колах дзяржавы. У 1599 г. Сапега ажаніўся другі раз, на гэты раз з 16-гадовай князёўнай Гальшкай (Лізаветай) Радзівіл (1583—1611), дачкой Крыштофа Мікалая Радзівіла Перуна, ваяводы віленскага і вялікага гетмана літоўскага, галавы кальвіністаў у Вялікім княстве Літоўскім. Гальшка Радзівіл унесла мужу, як тады называлі, новыя маёнткі. Пасля шлюбу Леў Сапега купляе багатыя маёнткі. Да іх ліку адносяцца мястэчкі Друя (Браслаўскі павет) і Асвея (Полацкае ваяводства) з навакольнымі вёскамі. Пазней Сапега набывае Круглае, Шапялевічы, мястэчка Барань, Коханава і частку маёнтка Копысь (Аршанскі павет).

Ад Гальшкі Радзівіл Леў Сапега меў трох сыноў — пісара Вялікага княства Літоўскага Крыштофа Мікалая (1607—1631), падканцлера Льва (1609—1656) і Мікалая, які памёр хлопчыкам, а таксама дачку Ганну (1603—1627), што была замужам за Альбрыхтам Уладзіславам Радзівілам, кашталянам троцкім і нясвіжскім ардынатам. Гэты шлюб з 16-гадовай князёўнай меў і палітычныя наступствы. Умацаваліся сувязі Льва Сапегі з апазіцыяй. Цяпер ён часта выступаў у палітычных спрэчках як пасрэднік паміж каралём і пратэстантамі ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве.

Як раз у гэты час адбыўся канфлікт паміж дзвюма варагуючымі магнацкімі сем'ямі — Радзівіламі і Хадкевічамі. Гэты канфлікт у пачатку 1600 г. амаль не прывёў да грамадзянскай вайны ў дзяржаве. Швагер Льва Сапегі, князь Януш Радзівіл, вёў перамовы з апякунамі слуцкай князёўны Соф'і Алелькавіч (1585—1612) Хадкевічамі аб шлюбе з ёю. Хадкевічы завінаваціліся Радзівілам вялікую суму грошай. За згоду на шлюб Януша Радзівіла з уладальніцай былога Слуцкага княства апякун князёўны Геранім Хадкевіч атрымоўваў 360 тысяч злотых і 500 валок (больш за 10 тысяч гектараў) зямлі, а яго доўг скасоўваўся. Аднак з-за спрэчак паміж Хадкевічамі і Радзівіламі, якія захапілі ў Хадкевічаў мястэчка Копысь з маёнткам, вясной 1600 г. у Вільні амаль не адбыўся ўзброены канфлікт. І Хадкевічы, і Радзівілы сабралі па некалькі тысяч узброеных жаўнераў. У гэтым канфліксце Леў Сапега стаяў на баку швагра, якому Хадкевіч не хацеў аддаць нявесту. Урэшце Радзівілы выслалі Сапегу як парламенцёра да Хадкевічаў. Леў Сапега ўгаварыў цесця дамовіцца з праціўнікамі. У справу ўмяшаўся кароль і сенатары. Урэшце пагадненне было дасягнута. 15-гадовая князёўна Соф'я, праваслаўная,

была выдана замуж за кальвініста Януша Радзівіла, але засталася праваслаўнай. Яна завяшчала Слуцкае княства мужу. Хадкевічы атрымалі 360.080 злотых і 500 валок зямлі, а іх доўг быў скасаваны. Соф'я Алелькавіч-Радзівіл у канцы XX ст. прылічана Беларускай Праваслаўнай царквой да ліку святых. Міратворчая місія Льва Сапегі ў гэтай справе была прызнана каралём і вялікім князем Жыгімонтам Вазам.

Леў Сапега працягваў актыўна праводзіць усходнюю палітыку дзяржавы. Пасля смерці ў 1598 г. цара Фёдара Іванавіча Леў Сапега спрабаваў выставіць кандыдатуру Жыгімонта III на маскоўскі трон, але Барыс Гадуноў хутка заняў трон. Тады Сапега прапанаваў праект жаніцьбы караля Жыгімонта з царэўнай Ксеніяй Барысаўнай. Канчатковая мэта гэтага праекту прадугледжвала дзяржаўную унію Рэчы Паспалітай з Масквой. І гэты праект не здзейсніўся.

Сойм 1600 г. прызначыў Льва Сапегу кіраўніком вялікага пасольства ў Маскву. У канцы верасня 1600 г. Сапега выехаў з Оршы ў Маскву на чале пасольства, якое налічвала з ахoвай і са слугамі каля тысячы чалавек. Перамовы ў Маскве вяліся доўга і цяжка. У сакавіку 1601 г. была дасягнута дамова аб працягу перамір'я паміж Маскоўскім царствам і Рэччу Паспалітай на 20 гадоў, пачынаючы з 15 жніўня 1602 г., аднак план дзяржаўнай уніі не ўдаўся. Сапега разлічваў у гэтым пытанні на маскоўскіх баяраў, але цар Барыс Гадуноў якраз у гэты час разграміў баярскую апазіцыю на чале з баярамі Раманавымі.

Пасля вяртання з Масквы Леў Сапега больш займаўся ўнутранымі справамі Рэчы Паспалітай і з 1601 г. разам з каралём паехаў з Вільні ў Інфлянты, дзе ішла вайна паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай. Праз сваю канцылярыю Леў Сапега забяспечваў арганізацыю ваенных дзянняў. Ён пры кожнай магчымасці выступаў супраць праходу польскага войска праз тэрыторыю Літвы і Беларусі на поўнач, у Інфлянты, бо па дарозе і ў час пастою гэтае войска рабавала насельніцтва. Сапега абвінавачваў у гэтым польскіх дарадцаў караля, якія, як ён лічыў, намагаліся такім чынам аслабіць Вялікае княства. На перадсоймавым з'ездзе дэпутатаў ад Беларуска-Літоўскай дзяржавы ў студзені 1603 г. у Слоніме ён патрабаваў ад польскага боку хутчэйшага вываду свайго войска з тэрыторыі Літвы і Беларусі.

Леў Сапега выступаў супраць падтрымкі Ілжэдзмітрыя I, хаця ёсць версія, што менавіта Сапега і падрыхтаваў яго для ролі царэвіча Дзмітрыя (так лічыць расійскі гісторык С.М.Салаўёў). На сойме 1605 г. Леў Сапега асудзіў падтрымку паходу Ілжэдзмітрыя I на Маскву, бо лічыў, што лепш трэба было заключыць дзяржаўную унію з Маскоўскім царствам. Прымаючы пасольства Барыса Гадунова, Сапега заявіў, што кароль не адказвае за паход самазванца і што Рэч Паспалітая захоўвае перамір'е.

У 1606—1607 гг. Леў Сапега вымушаны быў удзельнічаць у сур'ёз-

ным канфлікце магнацка-шляхецкіх груповак Рэчы Паспалітай. Супраць абсалютысцкіх планаў караля Жыгімонта Вазы выступіла групоўка на чале з кракаўскім ваяводам Мікалаем Зэбжыдоўскім. У Беларусі і Літве яго падтрымаў папулярны сярод шляхты Януш Радзівіл, швагер Льва Сапегі. У выступленні на сойме 1606 г. Сапега абвінаваціў апазіцыю ў зрыве папярэдняга сойма 1605 г., што стварыла пагрозу Рэчы Паспалітай (не была прынята пастанова аб падатках на войска), бо пачаў наступ у Інфлянтах шведскі кароль, а з поўдня на Украіну напалі крымскія татары. Л.Сапега патрабаваў прыняць пастановы аб падатках і падрыхтавацца да абароны краю. У сваёй прамове ён таксама бараніў уніяцкую царкву ад нападак на яе праваслаўных і пратэстантаў.

У 1606 г. Л.Сапега ўдзельнічаў у нарадах беларуска-літоўскіх сенатараў у Вільні і Навагрудку і асудзіў дзейнасць удзельнікаў рокашу М.Зэбжыдоўскага супраць караля. На сойме ў красавіку 1607 г. Сапега прапанаваў заключыць пагадненне з ракашанамі і сустракаўся з Янушам Радзівілам, які быў маршалкам кола рокашу (кіраўніцтва апазіцыі). У бітве супраць ракашан пад Гузавам Леў Сапега не ўдзельнічаў, а пасля гэтай бітвы, якая скончылася паражэннем ракашан, ён разам з віленскім ваяводам Мікалаем Крыштофам Радзівілам Сіроткам намагаўся паміраць Януша Радзівіла з каралём.

Леў Сапега звяртаў вялікую ўвагу на падзеі ў суседняй Маскоўскай дзяржаве, асабліва пасля забойства ў маі 1606 г. у Маскве Ілжэдзмітрыя І. У 1607 г. Леў Сапега прыйшоў да высновы, што вайны з Расіяй не пазбегнуць. У жніўні 1607 г. з яго згоды стрыечны брат Л.Сапегі Ян Пётр Сапега паступіў на службу да Ілжэдзмітрыя ІІ. Ужо на сойме 1609 г. Леў Сапега рашуча выступіў за ўступленне ў вайну з Расіяй, бо «ніколі Рэч Паспалітая лепшай аказіі для пашырэння граніц не мела». Ён нагадаў тэрытарыяльныя страты, панесеныя Беларуска-Літоўскай дзяржавай у папярэдні перыяд.

Разам з каралём Жыгімонтам Леў Сапега ў верасні 1609 г. адправіўся на вайну з Расіяй, пад Смаленск. Ён узначальваў полк, які выставіў у войска за свой кошт. У складзе палка было 550 коннікаў — гусараў, казакоў (лёгкая кавалерыя) і пэтыгорцаў (сярэднеўзброеныя коннікі), а таксама 200 пехацінцаў. Сапега са сваім палком першы падышоў да смаленскіх муроў 29 верасня 1609 г., калі пачалася паўтарагадовая аблога Смаленска войскам караля. Аднак аблога Смаленска зацягвалася, і Сапега зноў вяртаецца да думкі аб неабходнасці мірных перамоў з Масквой. Ён лічыў, што партнёраў для гэтых перагавораў трэба шукаць у тушынскім лагеры Ілжэдзмітрыя ІІ і адначасова сярод баяраў цара Васіля Шуйскага. У пачатку 1610 г. Леў Сапега ўдзельнічаў у перамовах з пасольствам баярына Міхаіла Салтыкова, якое прыехала з Тушына. 14 лютага 1610 г. гэтае пасольства падпісала дагавор з каралём, што яго ста-

рэйшы сын Уладзіслаў Зыгмунтавіч, як яго па беларускаму ўзору называлі ў Польшчы, будзе рускім царом, які гарантуе прывілеі баяраў і дваранаў. Ад гэтага моманту Леў Сапега, знаходзячыся ў лагеры пад Смаленскам, адначасова ўзначальваў не толькі дзяржаўную канцылярыю Вялікага княства Літоўскага, але і маскоўскую канцылярыю караля Жыгімонта III, адкуль зыходзілі граматы на маёнткі расійскім баярам і дваранам і іншая дзяржаўная дакументацыя (кароль дзейнічаў ад імя свайго сына, запрошанага пасольствам на маскоўскі трон).

Пасля перамогі 4 ліпеня 1610 г. войска гетмана Станіслава Жулкеўскага, якое складалася з польскіх і беларускіх коннікаў і ўкраінскіх казакоў і налічвала 6 525 чалавек, над 35-тысячнай рускай арміяй князя Дзмітрыя Шуйскага (брат цара) пад Клушынам (ля Гжацка) Жулкеўскі пайшоў на Маскву. Калі там даведаліся аб паразе, цар Васіль Шуйскі быў скінуты з трона і створаны баярскі ўрад («сямібаяршчына»). Гэты ўрад падпісаў у жніўні 1610 г. дагавор з С.Жулкеўскім аб перадачы маскоўскага трона 15-гадоваму каралевічу Уладзіславу, які быў афіцыйна абвешчаны царом Расіі. Яму прынеслі крыжацалавальную прысягу (і далі грамату) жыхары Масквы і іншых гарадоў Расіі. У Маскву быў упушчаны польска-беларускі гарнізон. С.Жулкеўскі адправіў да караля пад Смаленск вялікае баярскае пасольства прасіць адпусціць у Маскву сына. У пасольства гетман уключыў усіх магчымых прэтэндэнтаў на царскі трон. Пад Смаленскам усіх іх затрымалі. Вось тут і вёў з імі перамовы Леў Сапега. У той жа час ён пераконваў Жыгімонта III хутчэй адпусціць Уладзіслава ў Маскву. У гэтым ён бачыў здзяйсненне даўняга плана аб дзяржаўнай уніі Варшавы, Вільні і Масквы. Па загаду караля ўмовы дагавору з маскоўскімі прадстаўнікамі былі перагледжаны, аднак маскоўскія паслы на ўступкі не ішлі і адмовіліся пераканаць ваяводу М.Шэіна, які абараняў Смаленск, капітуляваць. Тады, зноў-такі па загаду караля, 12 сакавіка 1611 г. Леў Сапега абвясціў маскоўскім паслам, што яны арыштаваныя і што іх адсылаюць у Польшчу да канца вайны.

Пасля ўзяцця Смаленска каралеўскімі войскамі ў чэрвені 1611 г. Леў Сапега разам з каралём Жыгімонтам вярнуўся ў Вільню і пачаў рыхтаваць скліканне сойма. На павятовых сойміках, на якіх выбіраліся паслы (дэпутаты) на сойм, і на перадсоймавым з'ездзе дэпутатаў ад Вялікага княства Літоўскага ў Слоніме (верасень 1611 г.) ён прапанаваў далучыць да Рэчы Паспалітай занятыя польскімі і беларуска-літоўскімі войскамі тэрыторыі смаленшчыны, якую прапанаваў вярнуць назад у склад Беларуска-Літоўскай дзяржавы, і севершчыну, якую прапанаваў далучыць да Польшчы (да яе ўкраінскіх зямель). Трэба нагадаць, што менавіта ў Смаленскім ваяводстве былі першапачаткова асноўныя маёнткі роду Сапегаў. З такой жа прапановай ён выступіў і на сойме. Пры гэтым ён настойваў на далучэнні Смаленскай зямлі да Вялікага княства Літоўскага

і пратэставаў супраць надання маёнткаў там польскай шляхце (згодна са Статутатам Вялікага княства Літоўскага 1588 г.).

У канцы 1611 г. Леў Сапега ў Варшаве ўдзельнічаў у перамовах з маскоўскім пасольствам князя Юрыя Трубяцкога і баярына Міхаіла Марозава, якія прыехалі з просьбай маскоўскага ўрада хутчэй адпусціць цара Уладзіслава Сігізмундавіча ў Маскву. Сапега быў супраць таго, каб адпусціць юнака на царства ў няпэўнай сітуацыі ў Расіі, і кароль пагадзіўся з гэтым. Аднак восенню 1612 г. Сапега ўдзельнічаў у новым паходзе на Маскву, адначасова з гетманам Янам Каралем Хадкевічам і разам з каралём і каралевічам Уладзіславам, якога цяпер хацелі пасадзіць на маскоўскі трон. Аднак час быў страчаны. Войскі другога рускага апалчэння, якім камандаваў князь Дзмітрый Пажарскі, не дапусцілі невялікае войска Хадкевіча да Крамля, дзе засеў польска-беларускі гарнізон, і пасля баёў у самім горадзе Хадкевіч вымушаны быў адступіць. Сапега не выканаў сваю місію пасадзіць на маскоўскім троне цара Уладзіслава.

У наступныя гады Леў Сапега цалкам узначаліў усходні кірунак палітыкі Рэчы Паспалітай, дбаючы перш за ўсё пра інтарэсы Беларуска-Літоўскай дзяржавы, а таксама актыўна ўдзельнічаў у пасяджэннях соймаў, якія збіраліся ў гэты перыяд. На сойме 1616 г. Леў Сапега выступаў з новай прапановай аб падрыхтоўцы новай вайсковай экспедыцыі на Маскву і прапанаваў шляхце засяліць далучаныя падчас вайны ўсходнія тэрыторыі і эканамічна іх паднімаць пасля ваеннай руіны. Дзеля гэтага ў красавіку 1617 г. на канвакацыйным з'ездзе прадстаўнікоў шляхты Вялікага княства Літоўскага Сапега разам з іншымі сенатарамі пераканаў шляхецкіх дэпутатаў ухваліць новыя падаткі на два гады. Матывамі неабходнасці вайсковай экспедыцыі ў Расію былі ўзыход на царскі трон каралевіча Уладзіслава і замацаванне Смаленскага ваяводства. Пасля гэтага Сапега прыспяшаў Уладзіслава хутчэй пайсці на Маскву, пакуль яшчэ малады цар Міхаіл Раманаў не замацаваўся ва ўладзе.

Урэшце ў ліпені 1617 г. каралевіч вырушыў у паход. Шлях войска на чале з гетманам Я.К.Хадкевічам праходзіў праз Беларусь. Леў Сапега наладзіў прыём каралевічу ў сваіх рэзідэнцыях у Ружанах і Слоніме. Канцлер выставіў са сваіх уладанняў у войска Уладзіслава Вазы дзве роты: гусарскую (200 коннікаў) і пяхотную (100 чалавек). Леў Сапега суправаджаў каралевіча. Былі заняты Дарагабуж і Вязьма. Аднак войска было невялікім, а жаўнеры не атрымоўвалі грошай. Частка галодных жаўнераў пакінулі войска. Каб узмацніць войска Уладзіслава і Хадкевіча, Л.Сапега вярнуўся ў Вільню і сабраў грошы для войска. Адначасова ён дамовіўся з казацкім гетманам Пятром Канашэвічам-Сагайдачным аб паходзе ўкраінскіх казакоў на Маскву. Сойм 1618 г. грошай на працяг кампаніі не даў і выказаўся за мірныя перамовы з Масквой. Сапега вымушаны быў з гэтым пагадзіцца. Ад-

нак выслаў на дапамогу Уладзіславу вайсковыя падмацаванні, у тым ліку эскадроны беларускіх татараў.

У кастрычніку 1618 г. каралевіч Уладзіслаў, гетманы вялікі літоўскі Ян Караль Хадкевіч і ўкраінскі Пётр Сагайдачны падышлі да Масквы. Каралевіч знаходзіўся ў сяле Тушына, а Сагайдачны з казакамі — каля Данскога манастыра. Аднак штурм Масквы вынікаў не даў, не былі ўзяты таксама Мажайск і Троіцка-Сергіеў манастыр. У гэты час Леў Сапега вярнуўся да каралевіча пад Маскву. Вычарпаныя баявыя рэсурсы і значныя страты ў людзях прымусілі абодва бакі пайсці на перамовы. У гэтых перамовах Сапега быў адным з чатырох паслоў. У выніку перагавораў 11 снежня 1618 г. паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай было заключана ў сяле Дэуліна перамір'е (Дэулінскае перамір'е) на 14 з паловай гадоў. Да Вялікага княства Літоўскага афіцыйна адыходзіла Смаленскае ваяводства, за выключэннем Вязьмы, а да Польшчы — ноўгарад-северскія і чарнігаўскія землі з гарадамі. Каралевіч Уладзіслаў захаваў тытул «цара маскоўскага і ўсяе Расіі», але на троне застаўся Міхаіл Раманаў. Пытанне аб канчатковым міры было адкладзена. Пасля падпісання акту аб перамір'і Леў Сапега адразу ж вярнуўся ў Вільню. У 1619 г. ён даў сенату справаздачу аб перагаворах і аб заключэнні перамір'я.

На сойме 1620 г. Леў Сапега змог пераадолець прапанову дэпутатаў ад Вялікага княства Літоўскага супраць перадачы пад адміністрацыю каралевіча Уладзіслава Смаленскага і Чарнігаўскага ваяводстваў, г. зн. вернутых ад Маскоўскага царства зямель. Адначасова Сапега падрыхтаваў да абароны Смаленскую крэпасць, забяспечыўшы яе ўзбраеннем і боепрыпасамі. У 1621 г. канцлер Сапега таксама размяркоўвае шляхецкае апалчэнне Вялікага княства Літоўскага. Ён накіроўваў розныя харугвы (палкі) на вайну супраць Турцыі ў Малдавію, у Інфлянты — супраць шведаў і на Смаленшчыну і ўсходнія раёны Падняпроўя — на выпадак абароны гэтай тэрыторыі ад магчымага нашэсця маскоўскіх войскаў. Потым Сапега знаходзіўся ў Варшаве і займаўся справамі Інфлянтаў і адпору там шведскім войскам, якія захапілі Рыгу і Мітаву (Елгаву), сталіцу Курляндскага герцагства, васала Рэчы Паспалітай.

У пачатку 1623 г. Леў Сапега ўдзельнічаў у Варшаве ў працы сойма. 6 лютага 1623 г. ён атрымаў ад Жыгімонта Вазы прызначэнне на самую ганаровую ваяводскую пасаду ў Вялікім княстве Літоўскім — ваяводы віленскага і адначасова адмовіўся ад пасады канцлера вялікага (пра што размовы былі яшчэ ў 1621 г.) на карысць падканцлера Альбрыхта Станіслава Радзівіла. Адмовіўся Леў Сапега і ад пасады старосты берасцэйскага.

У гэты ж час прыйшлося Л.Сапегу займацца і спрэчкамі паміж іерархіяй уніяцкай царквы і праваслаўнымі вернікамі ў Беларусі. На Украіне ўжо ў 1620 г. была ўзноўлена праваслаўная іерархія на чале з мітрапалітам (пасля аб'яднання праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёлу

ў Рэчы Паспалітай у 1596 годзе). Аднак Украіна была ў складзе Польскага каралеўства, і там дзейнічалі польскія законы. У Беларусі і Літве заканадаўства і яго выкананне былі свае ўласныя. У гэтым рэлігійным канфлікце Леў Сапега выконваў волю караля-католіка, сам быў католікам і таму выступаў на баку уніяцкай іерархіі.

Аднак Л.Сапега намагаўся неяк улагодзіць канфлікт. Калі ў 1618 г. уніяцкім архіепіскапам Полацкім стаўся Іасафат Кунцэвіч, у новага архіепіскапа пачаўся канфлікт з праваслаўнымі магілёўскімі мяшчанамі, якія яму не падпарадкоўваліся і ў кастрычніку 1618 г. зачынілі перад ім гарадскую браму. 22 сакавіка 1619 г. Сапега апублікаваў дэкрэт. Кароль патрабаваў пакарання смерцю бунтаўшчыкоў-магілёўцаў. Аднак Леў Сапега, дзяржаўца Магілёўскай эканоміі, пакараў магілёўцаў буйным грашовым штрафам і загадаў гарадскім уладам перадаць цэрквы пад юрысдыкцыю І.Кунцэвіча. У лютым 1621 г. Леў Сапега як канцлер адмовіўся прыкласці пячатку да універсала Жыгімонта Вазы, якім вялікі князь і кароль забараняў полацкаму магістрату дапусціць у горад праваслаўнага полацкага архіепіскапа Мялеція Сматрыцкага. Такім чынам, універсал караля не меў законнай сілы. 12 сакавіка 1622 г. Леў Сапега накіраваў ліст да Іасафата Кунцэвіча, у якім абвінавачваў уніяцкага архіепіскапа ў рэпрэсіўных дзеяннях супраць праваслаўных і папярэджваў яго аб трагічных наступствах такой палітыкі.

На сойме 1623 г. Л.Сапега быў уключаны ў склад соймавай камісіі, якая павінна была прымірыць абодва бакі — уніятаў і праваслаўных — шляхам узаемных уступак. Пасля забойства Іасафата Кунцэвіча віцебскімі праваслаўнымі мяшчанамі 12 лістапада 1623 г. Леў Сапега 11 снежня 1623 г. атрымаў асобыя паўнамоцтвы ад караля і вялікага князя Жыгімонта для правядзення судовага працэсу ў Віцебску. Узначальваемая Л.Сапегам судовая камісія, разгледзеўшы справу аб забойстве архіепіскапа, 22 студзеня 1624 г. прыгаварыла 19 мяшчан да смяротнага пакарання, 78 мяшчанам, якія ўцяклі з горада, прыгавор быў вынесены завочна. У Віцебска было адабрана магдэбургскае права і ўсе вялікакняжацкія і каралеўскія прывілеі. Была разбурана гарадская ратуша. Званы з праваслаўных цэркваў былі знятыя.

25 ліпеня 1625 г. вялікі князь літоўскі і рускі (ён жа кароль польскі) Жыгімонт Ваза прызначыў Льва Сапегу гетманам вялікім літоўскім. Галоўнакамандуючым беларуска-літоўскім войскам Л.Сапега стаўся ўжо ў 68-гадовым узросце. Жыгімонт быў настроены варожа да польнага гетмана Крыштофа Радзівіла, швагра Л.Сапегі, і таму аддаў вялікую булаву гетмана Сапегу, пакінуўшы К.Радзівіла з малой булавой. Кароль таксама разлічваў на здольнасць Сапегі забяспечыць фінансамі войска, без чаго працягваць вайну са Швецыяй было немагчыма. Польны гетман пакрыўдзіўся і на караля, і на Л.Сапегу. Барацьба паміж дзвюма гру-

поўкамі магнатаў у Літве і Беларусі абвастрылася.

На тэатр ваенных дзеянняў стары гетман не паехаў. Знаходзячыся ў сваім маёнтку Талачыне і выязджаючы ў Магілёў, Л.Сапега фарміраваў ваенныя атрады. А камандавацъ войскам у Інфлянтах замест яго быў прызначаны ваявода смаленскі Аляксандр Гасеўскі. Толькі ў верасні 1625 г. Сапега выехаў на фронт на Заходнюю Дзвіну. Дывізія Л.Сапегі дзейнічала асобна ад дывізіі польнага гетмана Крыштофа Радзівіла, і толькі ў лістападзе 1625 г. абодва гетманы сустрэліся і прынялі агульны план ваенных дзеянняў. Пакінуўшы ў войску свайго сына Яна Станіслава, Леў Сапега ад'ехаў на сойм у Варшаву. Хутка пасля яго ад'езду, 17 студзеня 1626 г., малады шведскі кароль Густаў II Адольф нанёс сур'ёзнае паражэнне войску Яна Станіслава Сапегі, маршалка вялікага Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Войскамі ў Інфлянтах камандаваў Аляксандр Гасеўскі. І гэты камандзір цярпеў паражэнні ад шведаў. У пачатку 1627 г. Леў Сапега прапанаваў сенатарам, не звяртаючы ўвагі на намеры караля, пачаць перамовы са шведамі. У выніку дэлегацыя на перамовах у студзені 1627 г. падпісала 5-месячнае перамір'е і шведы вярнулі занятыя імі Біржы.

Улетку 1627 г. 70-гадовы гетман вырушыў на вайну. За ім, па яго ж загадзе, везлі вялікую чорную труну. Але на фронце гетман быў нядоўга і выехаў зноў у Варшаву на чарговы сойм. На сойме дэпутаты моцна яго крытыкавалі і за ход ваенных дзеянняў, і за грашовыя выдаткі. Дэпутаты ад Польшчы папікалі яму, што ён плаціць беларуска-літоўскім жаўнерам больш грошай, чым атрымоўвалі польскія жаўнеры, якія ваявалі супраць шведаў у Прусіі. Сапега зноў выязджаў на фронт у Інфлянты, шведы між тым занялі Прусію. Аднак ішлі ўжо мірныя перамовы. Урэшце 26 верасня 1629 г. у горадзе Альтмарк (Стары Тарг) быў падпісаны дагавор аб перамір'і, паводле якога ўсе гарады, акрамя Караляўца (Кёнігсберга), Гданьска і Пуцка, і ўсе Інфлянты на поўнач ад Заходняй Дзвіны пераходзілі да Швецыі.

30 красавіка 1632 г., пасля 45 гадоў панавання, памёр кароль і вялікі князь Жыгімонт Ваза. Наступіла міжкаралеўе. Леў Сапега адразу паехаў з Бярэсця, дзе знаходзіўся, у Варшаву. На нарадзе сенатараў яму было даручана забяспечыць усходнія межы Вялікага княства Літоўскага, узмацніўшы гарнізоны пагранічных замкаў на маскоўскім рубяжы. У летнія месяцы 1632 г. гэтым і займаўся Сапега. Потым ён зноў вярнуўся ў Варшаву на канвакацыйны сойм. На наступным, элекцыйным (выбарчым), сойме ў жніўні 1632 г. Леў Сапега падтрымаў кандыдатуру Уладзіслава Вазы, старэйшага сына папярэдняга караля. На гэтым сойме ў лістападзе 1632 г. Уладзіслаў быў абраны каралём польскім (і аўтаматычна вялікім князем літоўскім).

Але яшчэ перад выбарамі караля, карыстаючыся бескаралеўем у

Рэчы Паспалітай, рускі цар Міхаіл Фёдаравіч Раманаў і яго бацька патрыярх Філарэт накіравалі ў верасні 1632 г. пад Смаленск 40-тысячнае войска, каб захапіць горад і ўсё Смаленскае ваяводства. Рускія войскі занялі і іншыя памежныя гарады, пранiклі на беларускую тэрыторыю. У гэты час Леў Сапега фарміраваў новыя роты і накіроўваў іх не толькі ў войска, але і ў свае маёнткі на ўсходзе Беларусі, каб захоўваць іх ад нападаў рускага войска. У першай палове 1633 г. Л.Сапега быў у Вільні і нават вітаў караля Уладзіслава IV, які ехаў на фронт пад Смаленск.

Памёр Леў Сапега 7 ліпеня 1633 г. у Вільні падчас прыёму італьянцаў, якія былі ў каралеўскай свіце. Быў пахаваны ў касцёле святога Міхаіла Архангела ў Вільні.

Леў Сапега быў адным з самых багатых магнатаў Беларусі і Літвы. У яго былі згаданыя вышэй маёнткі ў Браслаўскім павеце з цэнтрам у Іказні, Аршанскім павеце — з цэнтрамі ў Чарэі, Талачыне, Копысі, Барані, Круглым, Коханаве, Бялынічах, у Полацкім ваяводстве — Лепель, Друя, Асвея, Бешанковічы і іншыя маёнткі, у Слонімскім — з цэнтрам у Ружане, а таксама і ў іншых паветах. Леў Сапега меў таксама вышэйзгаданыя староствы — Слонімскае, Магілёўскае і Бярасцейскае, а таксама іншыя дробныя. Фактычна Леў Сапега стварыў багацце для сваёй чарэйска-ружанскай галіны роду. З таго часу галоўныя ўладанні гэтай лініі Сапегаў канцэнтраваліся ва ўсходняй частцы Беларусі — у Віцебскім ваяводстве (Аршанскім і Віцебскім паветах), у Полацкім ваяводстве і на захадзе — у Навагрудскім ваяводстве, хаця былі маёнткі і ў іншых мясцінах. У латыфундыях Льва Сапегі былі гарады з крэпасцямі і мястэчкі, некаторыя з іх мелі самакіраванне па магдэбургскаму праву. Так, у 1619 г. ён надаў права самакіравання сваім гарадам у Аршанскім павеце Горам Вялікім і Горкам Малым (цяпер горад, дзе знаходзіцца сельскагаспадарчая акадэмія), у 1618 г. магдэбургскае права было ім нададзена гораду Друі. У вялікіх маёнтках Льва Сапегі раздаваліся ўчасткі зямлі (нярэдка з сялянамі) дробнай шляхце пры ўмове нясення ёю вайсковай службы, і па першаму закліку магната яна выступала ў паход у войска або на абарону маёнткаў самога Сапегі. Зямля раздавалася за вайсковую службу магнату і выбранцам, вольным ваенным людзям, якія таксама ўваходзілі ў склад ваенных атрадаў Сапегаў. Леў Сапега прычыніўся не толькі да ўзрастання багацця свайго роду, а і да заняцця родам Сапегаў найвышэйшых пасад у дзяржаве. Сапегі пачалі сапернічаць з Радзівіламі па сваёй значнасці ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве. Леў Сапега быў і мецэнатам. У сваёй рэзідэнцыі ў Ружанах ён стварыў багатую па кнігазбору бібліятэку, якую потым павялічыў яго сын Казімір Леў. Увайшоў у гісторыю Беларусі Леў Сапега як выдатны дзяржаўны дзеяч, які адстойваў суверэнітэт Вялікага княства Літоўскага і Рускага (Беларуска-Літоўскай дзяржавы), як дыпламат і палкаводзец, прыхільнік прававой дзяржавы і дакладнага выканання законаў.

Літаратура:

1. Саверчанка І.В. Канцлер Вялікага княства: Леў Сапега. Мн. 1992.
2. Грицкевич А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. Мн. 1975.
3. Boniecki A. Poczet rodów w Wielkiem Księstwie Litewskiem w XV i XVI więku. Warszawa, 1887.
4. Gorczak B., Ożarowski K. Sapiehowie. Materjały historyczno-genealogiczne i majątkowe. Tom 1. Petersburg. 1890.
5. Prochaska A.Archiwum domu Sapiehów. Tom 1. Lwów, 1892.
6. Sapieha E.Dom Sapieżyński. Warszawa, 1995.
7. Kognowicki K. Życia Sapiehów. Tom 1. Wilno, 1790.

Анатоль Грыцкевіч

Ян Караль ХАДКЕВІЧ
(1560—1621)



н Караль Хадкевіч (1560 — 24 верасня 1621, ля замку Хоцін, Малдавія), гербу Грыф з мечам. Адзін з самых таленавітых палкаводцаў Беларуска-Літоўскай дзяржавы XVII стагоддзя. Прадстаўнік старажытнага магнацкага роду Беларусі і Літвы, што паходзіў ад кіеўскіх баяраў XV ст. Ян Караль Хадкевіч належаў да старэйшай, быхаўскай, галіны роду і ад бацькі атрымаў у спадчыну тытул графа на Шклове, Мышы і Быхаве. Ян Караль Хадкевіч займаў дзяржаўныя пасады ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве, быў з 1605 г. гетманам вялікім, а з 1616 г. і ваяводам віленскім. У сваёй палітычнай дзейнасці адстойваў суверэнітэт Вялікага княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай.

У сям'і Хадкевічаў была традыцыя актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці Вялікага княства Літоўскага. Яго бацька, Ян Хадкевіч (1537—1579), быў кашталянам віленскім (сенатарам) і адміністратарам Інфлянтаў (Лівоніі). Дарэчы, бацька ў 1568 г. атрымаў ад імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Фердынанда тытул графа з назвамі галоўных гарадоў і маёнткаў, якія належалі Яну Хадкевічу. Дзед вядомага беларускага палкаводца, Геранім Хадкевіч (1500—1561), быў кашталянам віленскім і ўваходзіў у склад паноў рады Вялікага княства Літоўскага. А брат дзеда, Грыгорый Аляксандравіч Хадкевіч, які памёр у 1572 г., быў кашталянам віленскім і гетманам вялікім літоўскім. Гэтыя традыцыі роду, багатыя латыфундыі, галоўным чынам на Беларусі, і сваяцкія сувязі з магнацкімі сем'ямі Беларусі і Польшчы давалі магчымасць здольнаму і амбітнаму чалавеку рабіць сваю кар'еру.

Ян Караль Хадкевіч быў сынам Яна Хадкевіча, у той час яшчэ

стольніка літоўскага, і Крыстыны Збароўскай, дачкі польскага магната Марціна Збароўскага, ваяводы пазнаньскага, а потым кашталяна кракаўскага. Адзін з братоў маткі, Ян Збароўскі, быў гетманам надворным у Польшчы; іншыя яе браты займалі пасады ваяводаў і кашталянаў.

Дзяцінства Яна Караля праходзіла ў гады Лівонскай вайны. Ён быў сведкам ваенных дзеянняў у Беларусі і Прыбалтыцы і вельмі цікавіўся вайсковай справай. Калі хлопчыку было некалькі гадоў, бацька ўзяў яго ў паход супраць маскоўскіх войскаў Івана Грознага, што ўварваліся ў Беларусь. Беларуска-літоўскім войскам камандавалі гетманы вялікі Мікалай Радзівіл і польны Грыгорый Хадкевіч, дзядзька яго бацькі. Асобным атрадам камандаваў і сам Ян Хадкевіч, які раней удзельнічаў у бітве над Улай у 1564 г. Такім чынам, 8-гадовы хлопчык пабачыў, як жаўнеры ездзяць падчас паходу, як становяцца на месцы лагерам і, галоўнае, як удзельнічаюць у баях.

Пасля папярэдняй хатняй адукацыі ў 1573 г. Ян Караль разам са сваім старэйшым братам Аляксандрам (каля 1560—1626), які потым стаўся ваяводам троцкім, пачаў вучобу ў Віленскай езуіцкай калегіі, а потым і ў Віленскай акадэміі. Калі кароль Стэфан Баторый у сакавіку 1579 г. праязджаў праз Вільню з войскам, каб здабыць Полацк, ад імя студэнтаў акадэміі яго вітаў малады Ян Караль Хадкевіч урачыстай прамовай. Ён вылучаўся сваёй здольнасцю да навукі і ўжо тады вылучаўся моцным характарам, хаця і без перашкоды ўстанаўліваў кантакты з людзьмі. Пасля смерці бацькі атрымаў у спадчыну не толькі маёнткі, але і тытул графа на Шклове, Мышы і Быхаве.

У 1586—1589 гг. малады Ян Караль Хадкевіч разам з братам вучыўся ў езуіцкай акадэміі ў Інгольштадце (Баварыя), дзе вывучаў філасофію і права. У верасні 1589 г. яны атрымалі пасведчанні аб паспяховым заканчэнні курса вучобы. Потым браты паехалі ў Італію, у Падую. Аляксандр Хадкевіч застаўся ў Італіі, а Ян Караль наведаў Мальту, дзе ў мальтыйскіх рыцараў азнаёміўся з дзеяннямі артылерыі, з агнястрэльнай зброяй, фартыфікацыяй і правіламі аблогі крэпасцей. За мяжой Ян Караль Хадкевіч, апрача акадэмічнага курса, шмат увагі прысвячаў вайсковым ведам і тэорыі вайсковай справы.

Пасля вяртання на радзіму ў 1590 г. Хадкевіч стаўся вайскоўцам. Ужо ў 1595 г. Хадкевіч камандаваў уласнай ротай з 50 коннікаў, а потым камандаваў ротай у 100 коннікаў на Украіне. У 1596 г. Ян Караль Хадкевіч удзельнічаў у баях з паўстанцкім войскам Семярына Налівайкі. Камандаваў гэтым войскам гетман польны каронны (польскі) Станіслаў Жулкеўскі. У першай бітве пад Каневам, які быў узяты 14 красавіка 1596 г., Я.К.Хадкевіч выявіў свой вайсковы талент. Адрозніўся ён і падчас аблогі казацкага табару пад Лубнамі (25 мая—7 чэрвеня 1596 г.). За свае вайсковыя заслугі Ян Караль Хадкевіч атрымаў пасаду падчашага

літоўскага, а праз тры гады, у 1599 г., яму было нададзена Жамойцкае староства, што раўнялася ваяводскай пасадзе, і ён увайшоў, такім чынам, у склад сенату Рэчы Паспалітай.

У 1600 годзе Ян Караль Хадкевіч разам з братам Аляксандрам на чале ўласнай коннай роты ўдзельнічаў у паходзе гетмана вялікага кароннага Яна Замойскага ў Малдавію, якую заняў гаспадар Валахіі Міхай Мужны (Вітязул), каб аб'яднаць Дунайскія княствы. Польшча намагалася захаваць палітычную залежнасць ад яе Малдавіі і ўстанавіць там уладу залежнага ад яе гаспадара. Бітва войска Яна Замойскага з арміяй Міхая Мужнага адбылася ў ваколіцах Плаешці 20 кастрычніка 1600 г. і закончылася перамогай Замойскага. Хадкевічы былі ў перадавым атрадзе дабраахвотнікаў, якія ўдарылі на сілы гаспадара Міхая і прычыніліся да перамогі. Гетман Ян Замойскі сярод лепшых воінаў вылучаў Яна Караля Хадкевіча. У выніку перамогі ў Валахіі ў кастрычніку 1600 г. быў пасаджаны на трон стаўленнік Польшчы Сымон Магіла з малдаўскага баярскага роду. У тым жа годзе Яну Каралю Хадкевічу быў нададзены тытул гетмана польнага літоўскага.

У 1600 годзе пачалася доўгая па часе вайна Рэчы Паспалітай са Швецыяй за панаванне на Балтыйскім моры. Яна цягнулася да 1629 года. Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Ваза, каталік, які адначасова лічыўся каралём Швецыі, але прабываў у Варшаве, у 1599 годзе быў дэтранізаваны лютэранскай апазіцыяй. У 1600 годзе Жыгімонт III уключыў Эстляндыю ў склад Рэчы Паспалітай, што стала зачэпкай для вайны. Гетман польны літоўскі Ян Караль Хадкевіч пад камандаваннем гетмана вялікага літоўскага Крыштофа Радзівіла Перуна ўдзельнічаў у ваенных дзеяннях з самага пачатку вайны. Абодвух гетманаў накіравалі ў Лівонію, нягледзячы на суперніцтва паміж двума гэтымі магнацкімі родамі Радзівілаў і Хадкевічаў, якія ў 1600 г. амаль не распачалі ў Вільні і краіне грамадзянскую вайну з-за таго, што не маглі дамовіцца пра гарады і маёнткі слуцкай князёўны Соф'і Алелькавіч (апякунамі якой былі Хадкевічы), калі яна выходзіла замуж за князя Януша Радзівіла, сына гетмана вялікага. Адносіны паміж Радзівіламі і Хадкевічамі ў некаторай ступені ўплывалі і на ход ваенных дзеянняў.

Гетман вялікі Крыштоф Радзівіл у маі 1601 г. распачаў ваенныя дзеянні ў Інфлянтах. Яго атрады акружылі горад і крэпасць Кокенгаўзэн (Кокнесе), на правым беразе Заходняй Дзвіны. 8 чэрвеня 1601 г. да Кокенгаўзэна падыйшоў са сваімі атрадамі і польны гетман Ян Караль Хадкевіч. Каб зняць аблогу горада, шведскі камандуючы Карл Карлсан Гіленг'ельм на ўсход ад горада на беразе Заходняй Дзвіны даў бітву беларуска-літоўскаму войску. У бітве ўдзельнічала 5000 шведскіх жаўнераў супраць 3000 беларуска-літоўскіх. Ян Караль Хадкевіч камандаваў гусарскім палком на правым флангу беларуска-літоўскага войска, знахо-

дзячыся ў першых шэрагах свайго войска. Разам з конным палком Крыштофа Дарагастайскага Хадкевіч правёў моцную атаку на левае крыло шведскага войска. Шведскія рэйтары былі разбітыя і пачалося праследванне шведскіх жаўнераў. Шведы страцілі 2 тысячы чалавек, беларуска-літоўскае войска — 200 чалавек. Шведскі гарнізон Кокенгаўзэна капітуляваў. У палон трапіла 1800 шведскіх жаўнераў і ўзята шведская артылерыя. У выніку перамогі пад Кокенгаўзэнам беларуска-літоўскае войска заняло ў ліпені 1601 г. Вэндэн (Кесь, Цэсіс), на паўночны ўсход ад Рыгі. Але потым пад націскам пераважных па колькасці шведскіх сіл беларуска-літоўскае войска адступіла да Рыгі, якую разам з вэндэнскім ваяводам Георгам Фарэнсбахам і польскімі атрадамі абаранялі атрады Я.К.Хадкевіча. Некалькі штурмаў шведскіх войскаў былі адбітыя. У кастрычніку 1601 г. да Рыгі наблізілася польская армія на чале з гетманам вялікім каронным Янам Замойскім, і шведская армія пачала адступаць. Атрады Яна Караля Хадкевіча ўдзельнічалі ў праследаванні шведаў і блакадзе шведскіх гарнізонаў у крэпасцях Вольмар (Валміера) і Вэзэнберг (Ракверэ), Фэлін (Вільяндзі) і Белы Камень (Пайдэ). Узяцце Белага Камня ўзмацніла пазіцыі войска Рэчы Паспалітай. Ваенныя дзеянні працягваліся ад восені 1601 г. да канца лета 1602 г.

У пачатку кастрычніка 1602 г., пасля ад'езду з тэатра ваенных дзеянняў гетмана вялікага кароннага Яна Замойскага, кароль Жыгімонт III даручыў камандаванне польскімі і беларуска-літоўскімі сіламі ў Інфлянтах Яну Каралю Хадкевічу. Хадкевічу ўдалося сабраць пад сваім камандаваннем да 4000 жаўнераў. З імі ў лістападзе 1602 г. ён пачаў самастойна новую кампанію. 16 лістапада яго войска пачало аблогу аднаго з буйнейшых гарадоў Прыбалтыкі Дорпата (Тарту). Паступова ў баях сілы Хадкевіча змяншаліся, і ў канцы студзеня 1603 г. у яго заставалася толькі 700 коннікаў і 100 пехацінцаў. Даведаўшыся, што шведскае войска збіраецца прыйсці да Дорпата і зняць аблогу, Я.К.Хадкевіч пакінуў каля горада сотні дзве жаўнераў, а з астатнімі сіламі, узяўшы з гарнізона Вэзэнберга (Ракверэ) дапамогу і давёўшы колькасць жаўнераў у сваім войску да 1000 чалавек, прымусіў у сакавіку 1603 г. шведскае войска, якое не дайшло да Дорпата, адступіць. Пасля другой аблогі 13 красавіка 1603 г. шведскі гарнізон (1050 чалавек) Дорпата капітуляваў на ганаровых умовах, адыйшоўшы на Рэвель (Талін), але аддаўшы пераможцам усю артылерыю (звыш 80 гарматаў). У 1603 г. Хадкевіч быў прызначаны адміністратарам Інфлянтаў (Лівоніі).

Наступную кампанію ў Прыбалтыцы гетман польны літоўскі Ян Караль Хадкевіч вёў у 1604 г. У пачатку 1604 г. шведскі сойм абраў каралём герцага Судэрманландскага Карла (дзядзьку польскага караля Жыгімонта III), дагэтуль рэгента каралеўства. Пазіцыі новага караля Карла IX узмацніліся, і ён намагаўся вярнуць крэпасці і гарады ў Эс-

тоніі, перш за ўсё Дорпат і Белы Камень, а потым пайсці на Рыгу. Была сфарміравана новая шведская армія ў 9 тысяч жаўнераў на чале з губернатарам Фінляндыі, генералам Арвідам Эрыксанам Стэлармам. У верасні 1604 г. войскі Стэларма і Хадкевіча сустрэліся. 23 верасня 1604 г. адбылася бітва на дарозе з Дорпата да Рэвеля каля Белага Камня. У Хадкевіча было 2300 жаўнераў, шведскае войска налічвала 7 тысяч чалавек. Хадкевіч вырашыў ударыць на больш моцнае левае крыло праціўніка. Яго гусары, што знаходзіліся на правым крыле арміі Хадкевіча, смелым націскам разграмілі шведскіх рэйтараў, а потым ударылі на пяхоту. Калі ў бой пайшлі атрады цэнтру і левага крыла, шведскае войска было а, кінута ў балоты і пачаўся поўны разгром праціўніка. На полі бою засталося 300 забітых шведскіх жаўнераў. Пераможцы ўзялі 21 сцяг, 6 гармат і ўвесь абоз. У войску Хадкевіча страты былі малыя: 50 забітых і 100 параненых. Перамога не была выкарыстана, бо ў дзяржаўным скарбе не было грошай і жаўнерам не выплацілі жалавання. Войска стварыла канфедэрацыю, якая адмовілася працягваць ваенныя дзеянні.

За заслугі ў вайне са Швецыяй у сакавіку 1605 г. староста Жамойцкі Ян Караль Хадкевіч атрымаў вялікую булаву, г. зн. атрымаў пасаду гетмана вялікага літоўскага. Кароль Жыгімонт Ваза надаў таксама Хадкевічу Дорпацкае староства (у Эстоніі). А ў гэты час Швецыя рыхтавалася да новай кампаніі, каб усё ж такі захапіць Інфлянты. У сярэдзіне верасня 1605 г. шведскія сілы сканцэнтраваліся каля Рыгі, каб узяць яе. Сюды ж накіравалася і шведская армія на чале з каралём Карлам IX. Ян Караль Хадкевіч, які меў 3500 жаўнераў (пераважна конніцы), вырашыў даць бітву каля Рыгі, супраць яго выступіла шведскае войска ў 11 тысяч чалавек, у тым ліку 8500 пяхоты. Кароль Карл IX, маючы войска ўтрая большае, быў перакананы ў сваёй перамозе.

27 верасня 1605 г. пад Кірхгольмам (цяпер Саласпілс), у 15 кіламетрах ад Рыгі, на паўночным беразе Заходняй Дзвіны, адбылася бітва. Хадкевічу ўдалося выманіць шведаў з іх выгадных пазіцый на ўзгорках, зрабіўшы выгляд, што яго войска раптам пачало адступаць. А калі пяхота і конніца праціўніка пачалі наступ услед за адступаючымі атрадамі Хадкевіча, беларуска-літоўскія конныя харугвы хутка змянілі фронт і абрынуліся на шведскую пяхоту, якая ўжо пачала ўзбірацца на ўзгоркі, услед за атрадам Хадкевіча. Адначасова шведскую пяхоту ва ўпор расстрэльвала артылерыя беларуска-літоўскага войска. Гусары Яна Пятра Сапегі, Вінцэнта Войны і Тодара Ляцкага разграмілі шведскіх рэйтараў і ўварваліся ў шэрагі галоўных шведскіх сіл на правым крыле, якім камандаваў граф Фрыдрых Іахім Мансфельд. Пасля трох гадзін бою армія шведскага караля была цалкам разгромлена. Карл IX выратаваўся, уцёкшы на кані з бітвы ў Парнаву (Пярну). Шведы страцілі 6 тысяч забітымі. Былі захоплены 60 шведскіх штандартаў, 12 гармат і ўвесь абоз. Некалькі соцень

шведскіх жаўнераў трапілі ў палон. Страты арміі Хадкевіча былі невялікімі: у баі з пяхотай страцілі 100 чалавек забітымі і 200 параненымі.

Перамога Яна Караля Хадкевіча пад Кірхгольмам над у тры разы большым праціўнікам была атрымана дзякуючы майстэрскаму кіраванню конніцай і канцэнтрацыяй сіл на розных этапах бітвы ў патрэбным на гэты час накірунку. Таму конніца Хадкевіча і здолела перамагчы некалькі калонаў праціўніка, што стаялі адна з адной. Бітва пад Кірхгольмам была найбольш слаўнай сярод перамог гетмана Я.К.Хадкевіча. Кірхгольмская бітва 1605 г. з'яўляецца адной са слаўных старонак беларускай вайсковай гісторыі XVII стагоддзя. Хутка весткі пра яе разляцеліся па ўсяму краю і за мяжой. Хадкевіча віншаваў не толькі кароль Жыгімонт III, але таксама і германскі імператар Рудольф II, англійскі кароль Якаў I і нават персідскі шах Абас Вялікі і турэцкі султан Ахмед I. Папа рымскі Павел V прыслаў Хадкевічу ліст з віншаваннямі. Прапаведнік Пётр Скарга выступіў у Вавельскім кафедральным касцёле з казаннем у прысутнасці караля. Гэтая прамова пра інфлянцкую перамогу была надрукаваная ў Вільні ў тым жа 1605 годзе. За сваю перамогу Ян Караль Хадкевіч атрымаў маёнткі Сэруце ля Віцебска, Дуды над Нёманам і Лотву (Ашмянскі павет), а таксама прыбыткі з Упіцкай эканоміі. Яму таксама была перададзена Любашанскае староства ў Аршанскім павеце.

Аднак вынікі перамогі пад Кірхгольмам не былі выкарыстаныя. У дзяржаўным скарбе зноў не было грошай, жаўнерам за службу не плацілі, і войска пачало разыходзіцца.

А ў гэты час у Польшчы ўзмацнілася апазіцыя цэнтралізатарскай палітыцы караля Жыгімонта III групоўкі магнатаў і шляхты. На чале яе стаяў кракаўскі ваявода Мікалай Зэбжыдоўскі. У Вялікім княстве Літоўскім яго падтрымліваў адзін з лідэраў кальвіністаў Януш Радзівіл, муж княгіні слуцкай Соф'і Алелькавіч і ўладальнік багатых маёнткаў у Літве і Жэмайціі. У 1606 г. апазіцыя перайшла да рашучых дзеянняў з мэтай дэтранізацыі Жыгімонта Вазы. Апазіцыя стварыла канфедэрацыю і абвясціла рокаш (законны ўзброены саюз шляхты супраць караля). Кароль у сваю чаргу пачаў збіраць войска супраць канфедэратаў. Ян Караль Хадкевіч спрабаваў спачатку захаваць нейтралітэт, але, калі Януш Радзівіл далучыўся да М.Зэбжыдоўскага, Хадкевіч на з'ездзе беларуска-літоўскай шляхты ў Навагрудку 25 верасня 1606 г. асудзіў апазіцыю каралю. Потым Хадкевіч з 1600 жаўнерамі далучыўся да караля каля Варшавы (чэрвень 1607 г.). 6 ліпеня 1607 г. каля Гузава (недалёка ад Радама) адбылася бітва паміж каралеўскімі войскамі і ракашанамі. Ян Караль Хадкевіч камандаваў беларуска-літоўскімі сіламі на правым крыле каралеўскіх войскаў. Супраць яго стаялі беларуска-літоўскія роты, якімі камандаваў Януш Радзівіл, і, калі яны пачалі адступаць, Хадкевіч, не жадаючы разгрому сіл Радзівіла, вырашыў не праследаваць іх. І хоць

перамогу атрымалі каралеўскія войскі, магнаты, прыхільнікі караля, якія таксама не хацелі ўзмацнення каралеўскай улады, прымусілі караля пайсці з ракашанамі на кампраміс. Кароль адмовіўся ад плану рэформы дзяржаўнай сістэмы. Тым не менш бітва пад Гузавам 1607 года выразна падзяліла магнацка-шляхецкае грамадства Беларусі і Літвы на дзве групоўкі: на прыхільнікаў караля і вялікага князя Жыгімонта на чале з Хадкевічам і на апазіцыю на чале з Янушам Радзівілам. Узброеныя сутычкі партызанскага характару адбываліся ў Літве і Беларусі. Але і гэтыя партызанскія выступы апазіцыі былі падаўленыя. У гэтай барацьбе прыхільнікаў караля (рэгалістаў), якіх узначальваў каталіцкі магнат Ян Караль Хадкевіч, з апазіцыяй, якую ўзначальваў Януш Радзівіл, праявіліся не толькі палітычныя і рэлігійныя супярэчнасці ў беларуска-літоўскім грамадстве, але і асабістае суперніцтва двух вядомых прадстаўнікоў магнацкіх родаў Хадкевічаў і Радзівілаў, якія аспрэчвалі сваё першынства ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве. Каб памірыць Хадкевічаў з Радзівіламі, у справу ўмяшаўся самы уплывовы чалавек у краіне, канцлер вялікі Леў Сапега. Урэшце суперніцтва магнатаў было прыцішана.

Грамадзянская вайна ў Рэчы Паспалітай аблегчыла становішча шведаў у Прыбалтыцы. Вясной 1607 г. яны здабылі Белы Камень, а ў 1608 г. — Дынамюндэ (пры ўпадзенні Заходняй Дзвіны ў Рыжскі заліў) і Фэлін (Вільяндзі). У кастрычніку 1608 г. Ян Караль Хадкевіч вярнуўся ў Інфлянты і перайшоў у контрнаступ. Сабраўшы 2-тысячнае войска, Хадкевіч рушыў на поўнач. Яго войска ў лютым 1609 г. за 6 дзён прайшло 200 кіламетраў, што для таго часу было незвычайна. Дайшоўшы да Парнавы (Пярну), ён начным штурмам 1 сакавіка 1609 г. здабыў Парнаву і вярнуўся пад Рыгу, якую заблакавалі шведскія войскі і флот. Смелым ударам яго коннікаў былі разбіты перадавыя атрады корпусу графа Мансфельда, што прымусіла шведскага генерала адыйсці ад Рыгі. Была ўзята крэпасць Дынамюндэ. Адначасова невялічкая эскадра Хадкевіча нанесла страты шведскаму флоту ля Рыгі, ля порта Саліс, і прымусіла яго адыйсці таксама. Пры гэтым шведскі флот страціў два караблі. Далей Ян Караль Хадкевіч намагаўся пайсці ў Эстонію, але не атрымаў абяцаных падмацаванняў ад караля, бо Жыгімонт III рыхтаваўся да вайны з Расіяй. Смерць караля Карла IX дазволіла пачаць мірныя перамовы. У 1611 г. паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай было падпісана перамір'е і на некаторы час (да 1617 г.) ваенныя дзеянні ў Прыбалтыцы былі спыненыя.

Падчас барацьбы ў Маскоўскай дзяржаве паміж Ілжэдзмітрыем І і Барысам Гадуновым і потым, пасля забойства Ілжэдзмітрыя І, сярод кіруючых колаў Рэчы Паспалітай папулярным быў план стварэння славянскай федэрацыі — Рэчы Паспалітай з далучэннем да яе Расіі ў якасці трэцяга члена федэрацыі, разам з Польшчай і Беларуска-Літоўскай дзяржавай.

Зачэпкай для пачатку вайны з Маскоўскім царствам было ўвядзенне на тэрыторыю Расіі па просьбе цара Васілія Шуйскага ў 1609 г. шведскага корпуса на чале з Я.Дэлагардзі для барацьбы з прыхільнікамі Ілжэдзмітрыя II, які знаходзіўся ў Тушыне пад Масквой. Паколькі Жыгімонт Ваза быў у стане вайны са Швецыяй, то ўвядзенне каралеўскіх войск у Расію і яе саюз са Швецыяй разглядаліся як варожы акт. Сам кароль Жыгімонт узначаліў войска, якое складалася з польскіх і беларуска-літоўскіх войск і палкоў украінскіх казакоў. Да гэтага войска, якое ўступіла на тэрыторыю Расіі, па закліку караля далучыліся польскія, беларуска-літоўскія і ўкраінскія атрады з-пад Тушына, якія пакінулі лагер Ілжэдзмітрыя II. У верасні 1609 г. пад камандаваннем караля Жыгімонта пачалася аблога Смаленска, якая цягнулася да чэрвеня 1611 г., калі Смаленск быў узяты.

Пасля ганебнага паражэння маскоўскага войска (на чале з братам цара князем Дз.І.Шуйскім), калі 6.500 жаўнераў (польскія і беларуска-літоўскія сілы) на чале з гетманам польным каронным С.Жулкеўскім 4 ліпеня 1610 г. разграмілі 35-тысячную расійскую армію ля сяла Клушына (у раёне Гжацка), у Маскве цар Васілій Шуйскі быў скінуты з трона і пастрыжаны ў манахі. Новы маскоўскі ўрад — «сямібаяршчына» — праз месяц заключыў дагавор з каралём Жыгімонтам і абвясціў 15-гадовага каралевіча Уладзіслава Зыгмунтавіча (як яго па беларускаму ўзору называлі ў Польшчы) царом маскоўскім і ўсяе Русі. Жыхары Масквы і іншых гарадоў Расіі прызналі Уладзіслава царом і прынеслі яму крыжацалавальную прысягу на вернасць, падпісаўшы грамату. Але бацька тады каралевіча ў Маскву не адпусціў. У Маскву ўвайшоў польска-беларускі гарнізон на чале са Станіславам Жулкеўскім.

Гетман вялікі літоўскі Ян Караль Хадкевіч выступаў супраць дапамогі Ілжэдзмітрыю II і супраць вайны з Расійскай дзяржавай і нават выказваў сваё незадавальненне каралю, як і раней, гаварыў яму адкрыта, што з-за таго, што кароль не выдаткаваў грошай і не прысылаў у час вайсковай дапамогі ў Інфлянты, не ўдалося атрымаць канчатковай перамогі над шведамі. Цяпер каралю прыйшлося прыкласці шмат намаганняў, каб пераканаць Хадкевіча ўдзельнічаць з войскам, што было ў Інфлянтах, у вайне супраць Маскоўскай дзяржавы. У красавіку 1611 г. Ян Караль Хадкевіч пайшоў у напрамку на Пскоў і шэсць тыдняў стаяў пад сценамі Пячорскага манастыра, але ўзяць яго не здолеў і адступіў.

Урэшце гетман Я.К.Хадкевіч згадзіўся на прапанову караля ўзначаліць войска для дапамогі польска-беларускаму гарнізону ў Маскве. На пачатку восені 1611 г. Хадкевіч сабраў у Шклове 2500 жаўнераў, запасы харчавання і амуніцыі і накіраваўся ў Маскву, куды дайшоў 6 кастрычніка. Яго войска мела некалькі сутычак з удзельнікамі першага расійскага апалчэння Дз.Трубяцкога і І.Заруцкага, але мусіла адступіць.

Польскія жаўнеры не вельмі хацелі падпарадкоўвацца гетману літоўскаму. У пачатку лістапада 1611 г. ужо 2-тысячны атрад Я.К.Хадкевіча адступіў у Гомель. Тут ён зноў сабраў запасы харчавання і 18 снежня 1611 г. прывёз іх у Маскву для польска-беларускага гарнізона Крамля. У 1612 г. яшчэ двойчы ён прыходзіў у Маскву, каб забяспечыць гарнізон харчаваннем. Апошні паход гетмана Хадкевіча на Маскву, зноў з запасамі для крамлёўскага гарнізона, адбыўся ў канцы лета—пачатку верасня 1612 г. У адзін час з гетманам Я.К.Хадкевічам у Маскву накіраваўся кароль Жыгімонт III і каралевіч Уладзіслаў, каб заняць маскоўскі трон. Каралевіча суправаджаў канцлер Леў Сапега. Хадкевіча ля Масквы сустрэлі атрады першага і другога расійскага апалчэння, у якіх воінаў было значна больш, чым у Я.К.Хадкевіча. На гэты раз прабіцца да Крамля яму не ўдалося. Другое расійскае апалчэнне пад камандаваннем К.Мініна і князя Дз.Пажарскага ўжо заняло большую частку Масквы. 31 жніўня 1612 г. войска гетмана Хадкевіча знаходзілася ў 5 кіламетрах ад сцен Масквы, на Паклоннай гары. 1 верасня Хадкевіч заняў падмаскоўны тады Новадзевічы манастыр і спрабаваў увайсці ў Маскву з захаду праз Чартольскую браму, але быў адбіты апалчэнцамі. На наступны дзень ён спрабаваў увайсці ў горад з поўдня, прайшоўшы праз Данскі манастыр, праз Калужскую браму. Яго войску ўдалося прабіцца ў Замаскварэчча і дайсці да вуліц Бальшая Ардынка і Пятніцкая. Спробы прарвацца да Крамля і Кітай-горада не ўдаліся і ў гэты дзень. 2 верасня 1612 г. Хадкевіч узнавіў атакі. Яго жаўнерам удалося дайсці амаль да самай Масквы-ракі, але і цяпер да берага ракі рускія апалчэнцы іх не дапусцілі. А К.Мінін з часткай сіл пераправіўся праз Маскву-раку і нанёс удар войску Хадкевіча ля Крымскага двара (цяпер раён Крымскага маста). Атакі войска Я.К.Хадкевіча былі канчаткова адбітыя, яго войска страціла 500 чалавек і абоз з правіянтам, і ён вымушаны быў адступаць. Гэта вырашыла і лёс крамлёўскага гарнізона. 1 лістапада воіны другога апалчэння занялі Кітай-горад, а 6 снежня 1612 г. капітуляраваў і гарнізон Крамля, бо харчавання ў іх ужо не было.

Адступаючы Я.К.Хадкевіч сустрэў у Вязьме новую каралеўскую армію, з якою ў Маскву ўрэшце ехаў разам з бацькам 17-гадовы каралевіч Уладзіслаў Жыгімонтавіч, каб заняць маскоўскі трон. Але гэтая армія затрымалася ў дарозе, спрабуючы ўзяць Валакаламск, і да моманту капітуляцыі польска-беларускага гарнізона не паспела. А потым ужо было позна. У лютым 1613 г. земскі сабор абраў новага цара, 16-гадовага Міхаіла Фёдаравіча Раманава, родапачынальніка новай дынастыі ў Расіі.

Гетман вялікі Ян Караль Хадкевіч у 1613—1615 гг. камандаваў польскімі і беларуска-літоўскімі сіламі ў Смаленскім ваяводстве, не дапускаючы сюды расійскія войскі. На пачатку 1615 г. Хадкевіч накіраваў у глыбіню расійскай тэрыторыі два атрады: Януша

Кішкі на Старадуб і Аляксандра Лісоўскага на Бранск.

А ў гэты час каралеўскі двор у Варшаве зноў вярнуўся да плана пасадзіць на маскоўскі трон каралевіча Уладзіслава. Было вырашана, што камандаваць войскам, якое будзе суправаджаць цара Уладзіслава ў Маскву, будзе гетман вялікі літоўскі Ян Караль Хадкевіч, бо гетман вялікі каронны Станіслаў Жулкеўскі адмовіўся ісці ў паход.

Каб пераканаць Я.К.Хадкевіча ў неабходнасці новага паход ў Маскву, 20 чэрвеня 1616 г. Жыгімонт Ваза надаў яму вышэйшую пасаду ў Вялікім княстве Літоўскім — віленскага ваяводы. Тады ж Ян Караль Хадкевіч адмовіўся ад пасады старосты жамойцкага на карысць Януша Кішкі.

Хадкевіч з войскам пачаў паход раней і 11 кастрычніка 1617 г. узяў Дарагабуж, а неўзабаве аблажыў Вязьму. Сюды да яго выехаў праз Магілёў і Смаленск каралевіч Уладзіслаў, які і пачаў рассылаць у Расіі свае царскія граматы з ільготамі да розных груп насельніцтва. Была занята і Вязьма. Да Уладзіслава далучылася частка дваран, данскіх казакоў і рэшткі казацка-сялянскіх атрадаў часоў паўстання Івана Балотнікава. Але большасць баяраў, дваранаў і казакоў Уладзіслава не падтрымала. Пасля заняцця Вязьмы ўдарылі моцныя марозы, і асноўныя ваенныя дзеянні былі прыпыненыя. Каралевіч і гетман засталіся ў Вязьме. Атрады лёгкай конніцы (лісоўчыкі) дзейнічалі ў бліжэйшых паветах, спусташаючы і так спустошаныя раёны Расіі. Пачалася падрыхтоўка да далейшага паход. Вясной 1618 г. сілы для наступу на Маскву былі сабраныя. Цяпер у войску Я.К.Хадкевіча налічвалася 14 тысяч чалавек, у тым ліку каля 5500 пяхоты. Аднак дысцыпліна ў лагеры была недастаткова высокай. Пачаліся спрэчкі, каму камандаваць асобнымі палкамі. У рашэнні камандавання ўмешваўся сам каралевіч і яго фаварыты. Рашучы і смелы, Хадкевіч часта ўступаў у спрэчкі з Уладзіславам. А ў гэты час прыйшлі весткі з Варшавы, што сойм выдаткаваў грошы на вядзенне вайны ў Расіі толькі на 1618 год.

У чэрвені 1618 г. войска Хадкевіча прадоўжыла паход на Маскву. Ён хацеў прайсці ў Маскву праз Калугу, але вайсковая рада і каралевіч вырашылі накіраваць атрады прама на Маскву. Час быў страчаны на заняцце Мажайска. У пачатку кастрычніка 1618 г. войска каралевіча заняло сяло Тушына на поўнач ад Масквы і пачало рыхтавацца да штурму сталіцы. Да Масквы праз паўднёвыя паветы Расіі прыйшло з Украіны 20-тысячнае казацкае войска на чале з гетманам Пятром Канашэвічам-Сагайдачным, па дарозе разрабаваўшы Пуціўль, Ліўны, Ялец і Лебядзянь і іх акругі. Сагайдачны з'явіўся да Данскога манастыра, а адтуль прайшоў у Тушына. У ноч на 11 кастрычніка пачаўся штурм Масквы праз Цвярскую і Арбацкую брамы, але штурм быў адбіты. Набліжалася зіма, жаўнерам грошы не плацілі, бо іх не было, і каралевіч пачаў перамовы з маскоўскімі баярамі. У выніку перамоваў 11 снежня 1618 г. у сяле Дэ-

уліне (каля Тройца-Сергіева манастыра) было падпісана пераміp'е. Расія адмовілася ад прэтэнзій на смаленскую зямлю, якая цяпер вярталася ў склад Беларуска-Літоўскай дзяржавы, і на чарнігаўскую і северскую землі, якія ўвайшлі ў склад Кароны. Уладзіслаў захаваў тытул цара маскоўскага і ўсяе Русі. Пераміp'е было заключана на 14,5 гадоў. Гэта быў кампраміс і часовае вырашэнне дзяржаўных і тэрытарыяльных праблем.

Гетман вялікі Ян Караль Хадкевіч вярнуўся з гэтага пахода расчараваным. Гады, праведзеныя на войнах, паўплывалі на яго здароўе. Хадкевіч ўсё часцей хварэў. Ён адыйшоў ад дзяржаўных спраў, усё больш займаўся гаспадаркай у сваіх маёнтках. Былі і сямейныя клопаты.

Ян Караль Хадкевіч ажаніўся ў 1593 г. з удавой слуцкага князя Яна Сымеона Алелькавіча, Зоф'яй Мялецкай (1567—1619), дачкой ваяводы падольскага і гетмана вялікага кароннага Мікалая Мялецкага. Жонку, як сведчылі сучаснікі, ён кахаў. Ад гэтага шлюбу ў яго быў сын Геранім (1598—1613) і дачка Ганна Схаластыка (1604—1625), якая была замужам за Янам Станіславам Сапегам (1589—1635), маршалкам дворным літоўскім, старэйшым сынам Льва Сапегі, канцлера вялікага літоўскага. Адзінокага гетмана ўгаварыў ажаніцца другі раз яго старэйшы брат, Аляксандр Хадкевіч, ваявода троцкі, які не хацеў, каб багатая спадчына брата перайшла да Сапегаў. Аляксандр сватаў Яна Караля за адну з дачок княгіні Ганны Астрожскай. 60-гадовы гетман выбраў князёўну Ганну Алойзію Астрожскую (1600—1654), 20-гадовую дачку валынскага ваяводы, ужо сірату. Шлюб адбыўся 28 лістапада 1620 г. у Яраславе. Хутка пасля вяселля гетман адправіўся на сойм у Варшаву, а потым у свой апошні паход, не ўступіўшы ў правы мужа. Яго жонка збіралася раней пайсці ў манастыр і, згодна з яе воляй, прасіла мужа пакінуць яе нявінніцай.

На сойме ў Варшаве ў снежні 1620 г. гетман Ян Караль Хадкевіч атрымаў галоўнае камандаванне над узброенымі сіламі Рэчы Паспалітай у вайне супраць Турцыі, бо каронное войска ў кастрычніку 1620 г. страціла абодвух гетманаў у бітве з туркамі і крымскімі татарамі пад Цэцорай (у Малдавіі, недалёка ад Яс). Гетман вялікі каронны Станіслаў Жулкеўскі быў забіты, а гетман польны каронны Станіслаў Канецпольскі трапіў у няволю.

Як Караль Хадкевіч узначаліў кароннае (польскае) і беларуска-літоўскае войска ў паходзе супраць туркаў і крымскіх татараў у Малдавію. На поўначы тагачаснага Малдаўскага княства (васала Турэцкай імперыі) знаходзілася крэпасць Хоцін, на малдаўскім беразе Днястра. Тут, у раёне Хоціна, і збіраўся даць рашаючую бітву ворагу стары гетман. Да польска-беларускага войска далучыліся ўкраінскія казакі гетмана Пятра Канашэвіча-Сагайдачнага, даўняга знаёмага і баявога паплечніка Хадкевіча. Польска-беларускае войска налічвала каля 30 тысяч жаўне-

раў, з іх 14 тысяч пяхоты і больш за 17 тысяч коннікаў, была і артылерыя. Украінскіх казакоў было таксама 35 тысяч. Супраць гэтага войска турэцкі султан Асман II прывёў армію, якая складалася з туркаў, крымскіх татараў, малдаванаў і валахаў, разам каля 100 тысяч чалавек (некаторыя крыніцы называюць 160 тысяч туркаў і 60 тысяч татараў). Пяхота складала толькі адну шостую частку арміі султана, хаця ў баявых дзеяннях вакол моцнай крэпасці Хоцін, якую заняў Хадкевіч, перш за ўсё патрэбная была пяхота. Аднак у туркаў было больш гарматаў, чым у Хадкевіча. У параўнанні з Хадкевічам малады султан Асман II прайграваў, бо баявога вопыту не меў. Тым не менш становішча польска-беларускіх сіл і ўкраінскіх казакоў было складаным, бо іх было менш, чым у праціўніка.

Ужо 21 ліпеня 1621 г. Ян Караль Хадкевіч з 20 тысячамі жаўнераў знаходзіўся пад Хоцінам і чакаў асноўную частку войска, якую вёў сюды каралевіч Уладзіслаў. 1 жніўня, не чакаючы падыходу галоўных сіл, Хадкевіч пачаў пераправу праз Днестр, заняўшы крэпасць Хоцін і яго наваколле. Галоўны корпус каралевіча Уладзіслава падыйшоў у мястэчка Жванец (насупраць Хоціна, на левым беразе Днястра) толькі 30 жніўня, а пераправіўся праз Днестр ужо падчас баёў з туркамі.

Лагер Хадкевіча, тылам якога быў Днестр, быў абкружаны земляным валам у 8 кіламетраў даўжыні. Казакі абкружылі свой лагер радамі закапаных у зямлю вазоў. Хадкевіч падзяліў лінію абароны на тры ўчасткі. Правы ўчастак, побач з казакамі, занялі беларуска-літоўскія палкі пад непасрэдным камандаваннем Хадкевіча, у цэнтры камандаваў каралевіч Уладзіслаў (але ён увесь час быў хворы і фактычна не камандаваў), левым крылом камандаваў Станіслаў Любамірскі, падчашы каронны, потым ваявода кракаўскі. Галоўнакамандуючым быў сам Ян Караль Хадкевіч.

Бітва пад Хоцінам пачалася ў самым пачатку верасня 1621 г. і з кароткімі перапынкамі цягнулася шэсць тыдняў. Польска-беларускае войска і казакі ўмацавалі свае пазіцыі, вырылі акопы і насыпалі земляныя ўмацаванні вакол свайго лагера. У цяжкіх умовах Хадкевічу ўдалося ўтрымаць дысцыпліну жаўнераў і казакоў, нягледзячы на тое, што ў яго лагеры не хапала харчавання і жаўнеры былі пасаджаны на галодны паёк, бо татары на паўночным беразе Днястра перашкаджалі падвозу харчавання. Да таго Я.К.Хадкевіч ужо моцна хварэў і з 11 верасня кіраваў ваеннымі дзеяннямі, лежучы ў сваім паходным шатры. Спачатку 2—4 верасня 1621 г. туркі і іх саюзнікі атакавалі казацкі лагер і ўрэшце і польска-беларускі, але атакі туркаў былі адбітыя. Пры гэтым яны панеслі цяжкія страты.

Потым наступілі два дні перапынку. 7 верасня туркі, выкарыстоўваючы артылерыю, пайшлі на штурм і нават уварваліся на галоўны вал у

стыку цэнтру і левага крыла войска Хадкевіча. Хадкевіч кінуў на туркаў сваіх гусараў, якія сагналі туркаў з вала. Новую атаку туркаў Хадкевіч перапыніў, выпусціўшы праз бакавую браму конніцу, якая флангавым ударам разбіла калоны туркаў. Туркі неслі вялікія страты. Тады туркі спынілі штурм і ў наступныя дні заблакіравалі лагер Хадкевіча. 15 верасня яны кінулі на штурм адборныя сілы з 5000 янычараў і 8000 конніцы. І гэты штурм быў адбіты з вялікімі стратамі для туркаў. Але і ў войску Хадкевіча былі страты, пашыраліся хваробы, наступіў голад. 23 верасня абаронцы скарацілі перыметр абароны, разрыўшы галоўныя земляныя валы і насыпаўшы новыя, але далей у тыле. У гэты дзень Ян Караль Хадкевіч сабраў вайсковую раду і перадаў булаву кароннаму падчашаму Станіславу Любамірскаму, сказаўшы, што памірае. Памёр Ян Караль Хадкевіч 24 верасня 1621 года. Хоць камандзіры спрабавалі захаваць гэтую вестку ў таямніцы, каб не аслабіць баявы дух жаўнераў, войска хутка даведалася і, калі перавозілі ў замак Хоцін яго цела, жаўнеры сталі ў строй і аддалі вайсковае ўшанаванне свайму палкаводцу.

Туркі таксама даведаліся пра смерць Хадкевіча і 25 і 28 верасня зноў штурмавалі лагер Хадкевіча, аднак зноў панеслі страты. 29 верасня ваенныя дзеянні спыніліся, пачаліся мірныя перамовы, і 9 кастрычніка 1621 г. быў падпісаны мірны дагавор паміж Рэччу Паспалітай і Турцыяй. Султан забараніў крымскім татарам нападаць на Украіну. На наступны дзень турэцкая армія адступіла. Вайна закончылася перамогай. Гэта была і апошняя перамога Хадкевіча.

Пасля Яна Караля Хадкевіча засталася багатая спадчына. Найбольш вялікімі маёнткамі з гарадамі і мястэчкамі былі Быхаў і Горы ў Аршанскім павеце, Ляхавічы — у Навагрудскім, Свіслач — у Ваўкавыскім, Шкуды і Крэтынга — у Жэмайціі. Разам з братам Аляксандрам ён быў уладальнікам Шклова і Шклоўскага графства. Праўда, Ян Караль Хадкевіч выдаваў свае грошы на войска, і таму яго даўгі перад смерцю дасягалі 100 тысяч злотых (больш чым гадавы прыбытак ад усіх яго маёнткаў). Тым не менш за спадчыну Хадкевіча пачаліся спрэчкі паміж рознымі магнацкімі родамі, якія былі ў сваяцтве з ім. Прэтэнзіі на спадчыну выказалі дачка Анна Схаластыка і яе муж Станіслаў Сапега, брат Яна Караля Аляксандр Хадкевіч і маладая ўдава Ганна Алойзія Хадкевічова (народжаная Астрожская) разам са сваімі апекунамі. Барацьба за спадчыну скончылася толькі праз два гады, у маі 1623 г., калі ўсе сваякі падзялілі спадчыну гетмана. Удава гетмана дамаглася, каб яго труну пахавалі ў магіле не ў хадкевічаўскім горадзе Крэтынзе (дзе была пахавана яго першая жонка), як ён сам хацеў, а ў рэзідэнцыі князёў Астрожскіх — горадзе Астрогу на Валыні.

Літаратура:

1. Dobrowolska W. Chodkiewicz Jan Karol // Polski Słownik Biograficzny. Tom III, Kraków, 1937, ss. 363—367.
2. Kukiel M. Zarys historii wojskowości w Polsce. Londyn, 1949.
3. Zarys dziejów wojskowości polskiej do roku 1864. Tom I. Warszawa, 1965.
4. Nagielski M. Jan Karol Chodkiewicz // Hetmani Rzeczypospolitej Obojga Narodów. Warszawa, 1995, ss. 447—457.

Анатоль Грыцкевіч

Казімір СЕМЯНОВІЧ
(1600—1651)



азімір Семяновіч (каля 1600 г.—пасля 1651 г.), — выдатны вучоны, тэарэтык артылерыі і піратэхнікі, генерал-лейтэнант кароннай артылерыі.

Аб жыцці К. Семяновіча, нягледзячы на сапраўды еўрапейскую вядомасць яго твораў, амаль не захавалася звестак. Дакладна вядома, што ён быў прадстаўніком дробнага набілітаванага роду Вялікага княства Літоўскага. Існуе некалькі версій адносна яго этнічнага паходжання. Фамілія Семяновіч была вельмі распаўсюджана ў Беларусі. На думку беларускіх даследчыкаў (А.М.Бельскага, М.А.Ткачова), К.Семяновіч паходзіць з роду дробных князёў Семяновічаў, якія ў XIV— XVI стст. валодалі рознымі маёнткамі на землях беларускага Падняпроўя. У 1323 г. князю Дзімітрыю Сямёнавічу належаў «двор Быхава» і «земля пустая Дубровенская» (Описание документов и бумаг, хранящихся в Московском архиве Министерства юстиции. Кн. 21. С. 406). Хоць згаданыя даследчыкі спасылаюцца на «дакументальнае пацверджанне», фактычна гэта гіпотэза. Па-першае, генеалагічная пераемнасць Казіміра Семяновіча з памянутым княжацкім родам ніяк тут не прагледжвацца; па-другое, на тытульным аркушы сваёй кнігі Казімір Семяновіч называе сябе «шляхціцам літвінам» («eques Lithuanus») і змяшчае гравюрную выяву з гербам Астоя і лацінскімі літарамі C S — Casimirus Siemienowicz. Княжацкі род Сямёнавічаў з такім гербам гісторыкам невядомы. Літоўскія гісторыкі выдзвінулі гіпотэзу, згодна з якой род К.Семяновіча павязаны сваім паходжаннем з Жэмайціяй. У актавых кнігах Віленскай акадэміі імі знойдзены дакумент аб педагагічнай дзейнасці нейкага доктара філа-

софіі Казіміра Семяновіча ў 1650 г. Лічыць, што такую пасаду мог займаць былы практык і тэарэтык артылерыі, які большую частку свайго жыцця правёў пры дварах польскіх каралёў і вялікіх князёў літоўскіх, а таксама на замежных службах, мягка кажучы, рызыкоўна. Адна з вышэйшых навуковых ступеняў сярэдневяковай сістэмы універсітэцкай адукацыі патрабавала доўгіх гадоў вучобы на факультэтах вызваленых навук, шматгадовай педагагічнай практыкі, сваіх вучняў і г.д. Калі б Семяновіч сапраўды быў павязаны з дзейнасцю Віленскай акадэміі, захавалася б значна больш актаў. Таму і гэта гіпотэза не вытрымлівае адпаведнай крытыкі. Можна працягваць і далей падобныя не вельмі пераканаўчыя прыклады. У попісу войска Вялікага княства Літоўскага 1567 г. згадваецца дробны шляхціц Віленскага павета «Федор Семенович з Сор выслал детину на имя Опонаса Павловича на мерине, (зброя) согай, рогатина».

Такім чынам, пры выразнай адсутнасці дакументальных дадзеных сёння магчыма толькі ўпэўнена сцвярджаць, што Казімір Семяновіч быў выдатным прадстаўніком навуковай і інтэлектуальнай эліты Вялікага княства Літоўскага, а яго спадчына мае гістарычнае значэнне як для беларускага, так і для іншых народаў Вялікага княства Літоўскага і ў пэўнай ступені Польшчы. Тэрмін «шляхціц-літвін», якім карыстаўся Семяновіч, у XVII ст. звычайна падкрэсліваў прыналежнасць да палітычнага народа-шляхты Вялікага княства Літоўскага, кансалідаванай на аснове саслоўнага і прававога статуса. У гэтым сэнсе ён не меў ні этнічнага, ні рэлігійнага вызначэння. Судзячы па імені Казімір Семяновіч быў каталікам.

Невядома, дзе Семяновіч атрымаў дасканалую адукацыю. Па яго ўласных словах, у пазнейшай прадмове «да чытачоў» ён сцісла паведамляў пра набытыя ім дадатковыя веды. Пасля пачатковай ваеннай службы ён поўнасцю прысвяціў сябе вывучэнню артылерыйскай справы і карпатліва штудзіраваў усе неабходныя навукі — матэматыку, фізіку, хімію, архітэктуру (фартыфікацыю), а таксама адпаведныя рамёствы – ліцейнае майстэрства, гравіравальныя і іншыя працы.

Фрагментныя канкрэтныя звесткі аб Казіміру Семяновічу пачынаюць з'яўляцца ў вядомых даследчыкам крыніцах з другой чвэрці XVII ст. У 1634 г. ён прымаў удзел у аблозе г. Белага, у пачатку 1644 г. — у бітве з татарамі пад Ахматавам, у 1645 г. — у аблозе г. Гульста Фрыдэрыкам Генрыкам Аранскім. Удзел у шматлікіх нідэрландскіх ваенных кампаніях у гэты перыяд Трыццацігадовай вайны ў Еўропе дазволіў яму добра азнаёміцца з вопытам ваенных дзеянняў, асноўнымі відамі і практыкай выкарыстання палявой і штурмавой артылерыі. З 1646 г. К.Семяновіч знаходзіцца на сталай прыдворнай службе — вайсковым інжынерам, а з 1648 г. намеснікам начальніка кароннай (польскай) артылерыі

генерала Крыштофа Арцішэўскага. У чэрвені 1648 г. Семяновіч разам з 17 гарматнікамі адправіўся на вайну з казакамі. Непрыязныя адносіны з Арцішэўскім, які абвінаваціў Семяновіча ў фінансавых парушэннях, негатыўна адазваліся на яго далейшай ваеннай кар'еры. Новы кароль Рэчы Паспалітай Ян Казімір дазволіў яму выйсці ў адстаўку і эміграваць ў Нідэрланды.

Тут, у Амстэрдаме, Семяновіч змог нарэшце завяршыць галоўныя свае працы па артылерыі, заснаваныя на ўласным ваенным вопыце і шматлікіх літаратурных і навуковых крыніцах. Невядома, калі і з якой нагоды памёр Семяновіч. Канкрэтныя звесткі з упамінаннем яго дзейнасці знікаюць у дакументах каля 1651 г. Не выключана, што яго смерць магла быць павязана з яго піратэхнічнымі працамі і інжынернымі пошукамі, або з удзелам у чарговай ваеннай кампаніі. Не выяўлены і партрэты Казіміра Семяновіча. Гісторык польскай літаратуры Ф. Бенткоўскі паведамляў, што ў 1814 г. у бібліятэцы варшаўскага Ліцэя стаяў бюст, упрыгожаны каляровай стужкай і ордэнскай зоркай. Пры жыцці Казіміра Семяновіча атрымаць ордэн можна было толькі за межамі Рэчы Паспалітай, бо шляхта Вялікага княства Літоўскага і Кароны працівілася ўвядзенню якіх-небудзь афіцыйных размежаванняў шляхецкага стана.

Будучыя даследаванні, безумоўна, значна дапоўняць і ўдакладняць слаба даследаваны жыццёвы шлях гэтага выдатнага вучонага, тэарэтыка і прафесіянала артылерыйскай навукі, якая канцэнтравала ў сябе шматвекавы вопыт і дасягненні еўрапейскіх мысліцеляў і практыкаў і дзякуючы яму ўзнялась на новы непараўнальна больш высокі ўзровень. Ад першай паловы XVII ст. захавалася значна больш пісьмовых крыніц, чым ад папярэдняга перыяду. Няма яшчэ ніводнай манаграфічнай грунтоўнай працы, прысвечанай Казіміру Семяновічу. Аднак, як бы не разviваліся далейшыя навуковыя даследаванні яго біяграфіі, асноўным і найбольш важным помнікам яго дзейнасці і яго заслуг застаюцца і будуць заставацца яго выдатныя працы, перш за ўсё адзіны поўнасцю захаваны трактат «Вялікае мастацтва артылерыі».

Арыгінальны тытул кнігі, напісанай на лацінскай мове і надрукаванай у 1650 г. фарматам in folio у знакамітай амстэрдамскай друкарні Яна Янсана: «Artis Magna Artilleriae. Pars Prima. Amsterdami anno MDCL». Трактат уключае 304 старонкі тэксту, 22 табліцы з 206 прафесійнымі і цікавымі малюнкамі, зробленымі самім Семяновічам. Франтыспіс і гравюры малюнкаў падрыхтаваны вопытным амстэрдамскім гравёрам Якубам ван Мэйрсам.

У прадмове да свайго твора аўтар паведамляе, што яго натхнялі вялікая цікавасць і павага яго суайчыннікаў да майстэрства артылерыі, а таксама адсутнасць неабходных апісанняў і дапаможнікаў да гэтай найбольш значнай сферы ваеннай навукі.

Праца падзяляецца на пяць частак. У 13 раздзелах першай часткі выкладаюцца метады класіфікацыі гармат і ядраў у залежнасці ад калібру, выкарыстаных матэрыялаў, агульных памераў, вагі. У двух апошніх раздзелах апісваюцца меры вадкасцяў, сыпучых рэчаў, даўжыні. Уражвае гістарычны і тэрытарыяльны ахоп прыведзеных звестак: ад антычнасці (старажытныя рымскія, грэцкія, яўрэйскія) да сучасных аўтараў італьянскіх, нямецкіх, нідэрландскіх, польскіх сістэм. Большасць прыведзеных звестак перанята з кнігі французскага фізіка, францысканца Мярсена Марэна «Гідраўліка» (1644 г.).

Другая частка прысвечана сродкам і матэрыялам, якія выкарыстоўваліся ў піратэхніцы. У 32 раздзелах апісваюцца спосабы атрымання і апрацоўкі салетры, вугалю, вырабу пораху, захавання выбуховых матэрыялаў.«На падставе ўласнага вопыту і літаратурных крыніц», выкладаюцца меры перасцярогі і лекавыя сродкі, неабходныя для лячэння траўм, атрыманых ад узгарання пораху, серы, расплаўленага волава, раскалёнага жалеза. Адчуваецца, што аўтар быў добра знаёмы з рознымі непазбежнымі пры абранай прафесіі выпадкамі.

Найбольш цікавай з'яўляецца трэцяя частка, прысвечаная характарыстыцы розных тыпаў ракет, спосабаў іх вырабу, драўляным і металічным формам, іншым прыстасаванням, неабходным для такой працы. Асобна апісваюцца ракеты паветраныя (незалежныя і з драўлянымі жэрдкамі), водныя, на лінях. Чацвёртая частка падзелена на дзве часткі: першая прысвечана піратэхніцы ў яе святочна-забаўляльным сэнсе — піратэхнічныя зоркі, іскры, кулі, якія свецяцца, выдаюць розныя пахі, агні водныя, кульбістыя і іншыя. Другая — апісвае ваенныя металічныя, драўляныя ядры, у тым ліку ядры з ядавітай труцізнай, дымавыя, прызначаныя для падпальвання і іншыя. Звяртаюць на сябе ўвагу ручныя гранаты, а таксама патаемныя зарады, якія выбухоўваюць у пэўным, прызначаным раней часе. У апошняй, пятай, частцы разгледжаны розныя механізмы, прыстасаванні, вынаходніцтвы, прызначаныя для складаных піратэхнічных куншцюкаў і ваенных мэтаў.

Няпростым аказаўся лёс наступнай — другой — кнігі трактату Казіміра Семяновіча. Дакладны яе змест выкладзены ў першай кнізе — у прадмове да чытачоў. Паведамляецца, што яна ужо напісана і падрыхтавана да друку. На думку польскага даследчыка Т. Новака, верагодна заўчасная смерць аўтара перашкодзіла яе выданню. Згодна з інфармацыяй вядомага бібліёграфа і бібліятэкара кніжных збораў Залускага ў Варшаве Яна Даніэля Яніцкага (1720—1786) рукапіс у XVIII ст. захоўваўся ў Левартаўскай бібліятэцы кн. Сангушак. Праўда, сам Яніцкі яго не бачыў. Па другіх звестках, нейкі рукапіс Семяновіча ў пачатку XX ст. Браніслаў Гембажэўскі бачыў ў бібліячтэцы Артылерыйскага музея ў Санкт-Пецярбургу. У сувязі з недакладнасцю апісанняў Т.Новак не выключае,

што так званая другая кніга з'яўляецца рукапіснай копіяй апублікаванага трактата.

Спробу рэканструяваць другую кнігу Казіміра Семяновіча на падставе ўласных заўваг аўтара і тагачаснай еўрапейскай літаратуры прадпрынялі памянутыя беларускія гісторыкі А.М.Бельскі, М. А.Ткачоў. Праблема заключаецца ў тым, што значная частка раздзелаў, апісаных на гэтай аснове, вельмі падобна да тэматыкі першай кнігі. Некаторыя разыходжанні (асобныя раздзелы, прысвечаныя марцірам, ложам або лафетам, спосабам закладання падземных мінаў, арсеналам) канчаткова не вырашаюць пытанні і могуць быць спісаны на метад рэканструкцыі тэкста. Аўтары выкарысталі дадатак да нямецкага перавыдання кнігі Семяновіча 1676 г., напісаны нямецкімі даследчыкамі Даніэлем Эльрыхам і Георгам Шрайберам, а таксама працы сучаснікаў Казіміра – Адама Фрэйдтага і Андрэа дэль Аквы. Мабыць, дадатковыя пошукі рукапісных работ Казіміра Семяновіча ў арыгіналах і копіях, а таксама яго дакументальнай і эпісталярнай спадчыны пральюць святло і на гэту праблему.

Захаваная кніга сведчыць аб багатым артылерыйскім і ваенным вопыце Семяновіча, яго тэарэтычнай падрыхтоўцы, інжынерных і майстэрскіх талентах, шырокай еўрапейскай эрудыцыі. У кнізе выкарыстаны працы больш за 200 антычных, сярэдневяковых, рэнесансавых і навейшых па тым часе аўтараў. Шмат якія канкрэтныя распрацоўкі і рэкамендацыі з'яўляюцца яго ўласным здабыткам, або выверменааны і апрабаваны практычна ў ваенных сутычках і святочнай піратэхніцы.

У кнізе Семяновіча падрабязна раскрываюцца многія таямнічыя сакрэты, складаная тэхналогія вырабу галоўных сродкаў прыкладной і баявой піратэхнікі, артылерыі, неабходнага канструктарскага, рамесніцкага і майстэрскага рыштунку. У сваіх працах ён шмат у чым апярэдзіў свой час, першым у новай гісторыі ракетабудавання дакладна распрацаваў ідэю шматступенчатай ракеты, якая на сучасным узроўні стала рэалізавацца ў ХХ ст. і зараз з'яўляецца асноўным носьбітам усіх касмічных апаратаў. Трохступенчатая ракета Семяновіча мела аўтаномныя ракетныя рухавікі, якія маглі працаваць адначасова ці паасобку. Ён сканструяваў таксама батарэйную ракету з ракетнымі рухавікамі, якія размешчаны вакол галоўнага стрыжня, і камбінаваную ракету, у якой спалучаюцца разам шматступенчатая і батарэйная ракеты.

Казімір Семяновіч шчыра падзяліўся ў сваёй кнізе і іншымі ўласнымі адкрыццямі: стабілізатар тыпу «дэльта», нязвыклыя спосабы свідравання корпусаў ракет, непасрэдныя метрычныя і вагавыя вымярэнні розных матэрыялаў і інш. Нядзіўна, што апублікаваная кніга Семяновіча адразу прыцягнула ўвагу розных еўрапейскіх палітычных і ваенных колаў і ўжо ў наступным годзе была перакладзена на французскую мову: «Grand art d'artillerie par le sieur Casimir Siemienowicz

chevalier Lithuanien, jadis lieutenant général de l'artillerie dans le Royaume de Pologne» (Amsterodami apud Joannem Janssonium. 1651). У 1676 і 1729 гг. былі ажыццёўлены пераклады на нямецкую і ангельскую мовы. Згадкі, спасылкі і перайманні з працы Семяновіча прагледжваюцца ў многіх еўрапейскіх навуковых працах аналагічнай або блізкай тэматыкі.

Кніга Казіміра Семяновіча больш за 150 гадоў актыўна выкарыстоўвалася вучонымі, тэарэтыкамі і практыкамі артылерыйскіх і піратэхнічных навук і майстэрстваў. Значна пазней яна стала пераважна выдатным помнікам айчыннай гістарыяграфіі, сведчаннем высокага развіцця вопытных і прыродазнаўчых навук, якія былі вольнымі ад схаластыкі, грунтаваліся на рацыяналістычным мысленні і эмпірычных метадах даследавання і закладвалі падмурак пазнейшай еўрапейскай артылерыйскай навуцы і касмічнаму ракетабудаванню. Менавіта ў такім успрыняцці яна была зноў выдадзена ў перакладзе на польскую мову ў 1963 г. у Варшаве: Kazimierz Siemienowicz. Wielkiej sztuki artyleryi część pierwsza.

Літаратура:

1. Ивашкявичюс А. Казимир Семенович и его книга «Великое искусство артиллерии. Часть первая.» Вильнюс, 1971.

2. Цярохін С.Ф. Трактат аб артылерыі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1973. № 3. С. 30—32.

3. Бельскі А.М., Ткачоў М.А. Вялікае мастацтва артылерыі. Казімір Семяновіч. Мн., 1992.

4. Ткачоў М.А. Казімір Семяновіч (каля 1600—пасля 1651) // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995. С. 293—296.

Літаратура дадатковая:

1. Górski K. Historia artylerii polskiej. Warszawa, 1902. S. 118, 148–152.

2. Subotowicz M. Kazimierz Siemienowicz i jego wkład do nauki o rakietach // Kwartalnik Historii Nauki i Techniki. R. II (1957). N 3. S. 485–513.

3. Nowak T. Polskie wojskowe piśmiennictwo do roku 1764 // Wypisy źródłowe do historii polskiej sztuki wojennej. Warszawa, 1961. Zeszyt VIII B. S. 105–156.


4. Nowak T. Rozwój techniki rakietowej w świetle europejskich traktatów XIII–XVII wieku. Warszawa, 1995.

Навейшая публікацыя:

1. Kazimierz Siemienowicz. Wielkiej sztuki artylerii część pierwsza / Tekst łaciński do druku przygotował i tłumaczenia na jęz. polski dokonał Rudolf Niemiec. Redakcję naukową tekstu łacińskiego i tłumaczenia przeprowadził oraz wstęp i komentarz opracował Tadeusz Nowak. Warszawa, 1963.

Георгі Галенчанка

Казімір Леў САПЕГА
(1609—1656)



азімір Леон, або Казімір Леў Сапега, (15 ліпеня 1609 г., Вільня — 19 студзеня 1656 г., Бярэсце), гербу Ліс. Прадстаўнік старадаўняга беларускага шляхецкага роду. З полацкіх баяраў. Дзяржаўны і вайсковы дзеяч Вяліка га княства Літоўскага. Займаў пасады пісара вялікага, пасля маршалка надворнага, потым падканцлера Вялікага княства Літоўскага. Малодшы сын канцлера, а потым гетмана вялікага Беларуска-Літоўскай дзяржавы Льва Сапегі і яго другой жонкі Гальшкі (Эльжбеты) Радзівіл. Хроснымі бацькамі Казіміра Льва Сапегі былі жонка караля і вялікага князя Жыгімонта Вазы, каралева Канстанцыя, і яго сын, каралевіч Уладзіслаў. Калі Казіміру Льву было два гады, памерла яго маці, і бацька гадаваў малодшых дзяцей адзін. Выхаваннем хлопчыка займаўся яго родны дзядзька, вядомы вайсковец (а потым і гетман вялікі) Крыштоф Радзівіл. Тут сябрам яго быў дваюрадны брат Януш Радзівіл, які потым стаўся гетманам вялікім. Але хутка іх лёс развёў: Казімір Леў быў каталікам, а Януш Радзівіл, як і яго бацька, стаўся лідэрам кальвіністаў. Прымала ўдзел у яго выхаванні і каралева Канстанцыя, якая пэўны час жыла і ў Вільні. Пасля хатняга выхавання Казімір Леў Сапега вучыўся ў Віленскай езуіцкай акадэміі.

Пасля вучобы ў акадэміі Казімір Леў разам з братам Крыштофам Мікалаем (1606—1631) выехаў на вучобу за мяжу. Канцлер Леў Сапега намагаўся даць дзецям еўрапейскую адукацыю. Восенню 1621 г. браты Сапегі праехалі праз Лейпцыг, Кобург, Нюрнберг, Аўгсбург у Мюнхен. Казімір Леў вучыўся тут у езуіцкай калегіі і на прыватных уроках галоўным чынам латыні і нямецкай мове. Маладога беларускага арыстак-

рата часта запрашалі ў госці курфюрст Баварыі і яго сям'я. У студзені 1624 г. Казімір Леў пачаў вучыцца ў Інгальштадцкім універсітэце, але неўзабаве з-за хваробы брата спыніў вучобу і выехаў у Аўгсбург, дзе брат лячыўся. Восенню 1624 г. браты вярнуліся дадому. У тым жа годзе бацька перадаў Казіміру Льву Воўпенскае староства (Ваўкавыскі павет), і юнак меў цяпер самастойныя прыбыткі, а ў лютым 1625 г. старэйшы брат (ад першага шлюбу Льва Сапегі з Даротай Фірлей) Ян Станіслаў Сапега (1589—1635), маршалак вялікі Вялікага княства Літоўскага, перадаў яму і Любашанскае староства (Аршанскі павет).

Пасля таго, як брат Крыштоф Мікалай падлячыўся, Казімір Леў разам з братам у сакавіку 1625 г. зноў паехалі за мяжу. На гэты раз падарожжа было ў іншым напрамку: праз Уроцлаў, Франкфурт-на-Майне, Кёльн і Ахэн браты на пачатку мая 1625 г. прыбылі ў Лёвен (Лувен), у знакаміты каталіцкі універсітэт у тагачасных іспанскіх Нідэрландах, дзе браты пачалі праходзіць курс навук. Казімір Леў вывучаў палітыку, гісторыю, філасофію, рыторыку, эканоміку. Падчас канікулаў малады К.Л.Сапега знаёміўся з тагачаснай іспанскай і галандскай вайсковай справай, удзельнічаў у грамадскім жыцці. Яго і брата пры двары ў Брусэлі прымала намесніца Нідэрландаў інфанта Ізабела. Казімір Леў знаходзіўся ў лагеры іспанскага палкаводца А.Спінолы падчас аблогі ім галандскай крэпасці Брэда ў 1625 г. У ліпені 1627 г. К.Л.Сапега скончыў вучобу, пераехаў у Брусель, дзе навучаўся коннай яздзе, фехтаванню, інжынернай справе і замежным мовам. Сучаснікі адзначалі, што Казімір Леў Сапега ведаў 7 моў. Наведаў ён і іншыя гарады і мясцовасці іспанскіх Нідэрландаў.

У 1628 годзе К.Л.Сапега праз Францыю накіраваўся ў Іспанію, дзе працягваў сваю вучобу. У жніўні 1628 г. ён запісаўся на вучобу ва універсітэт у Балоньі, а ў 1629 г. вучыўся ў Падуанскім універсітэце. Падчас знаходжання ў Італіі ён наведаў Фларэнцыю, Рым і Неапаль, дзе знаёміўся з архітэктурнымі помнікамі, творамі мастацтва, жыццём гэтых гарадоў, пабываў у храмах і манастырах. У 1630 г. ён вярнуўся на радзіму.

У 1630 г. для Казіміра Льва Сапегі пачынаецца перыяд, калі ён актыўна ўваходзіць у грамадскае і палітычнае жыццё свайго краю. На слонімскім павятовым сойміку ён быў абраны дэпутатам (дэпутаты выбіраліся на адзін год па два ад павета) Галоўнага трыбуналу Вялікага княства Літоўскага, вышэйшага судовага органа дзяржавы. У 1631 г. ён упершыню быў абраны паслом (дэпутатам) сойму Рэчы Паспалітай аршанскім павятовым соймікам.

У ліпені 1631 г. ён атрымаў тытул каралеўскага сакратара, а ў верасні 1631 г. быў прызначаны на пасаду пісара вялікага Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Гэта была важкая пасада ў дзяржаўным апараце. Пісар вялікі ўдзельнічаў у падрыхтоўцы праектаў дзяржаўных актаў, якія

прымаліся вялікім князем, соймам або сенатам. Пісар вялікі фактычна ўзначальваў дзяржаўную канцылярыю Вялікага княства Літоўскага. Паводле Статута 1588 г. ён павінен быў, як і кожны дзяржаўны чыноўнік, ведаць афіцыйную беларускую мову, на якой складаліся дзяржаўныя дакументы. Прызначэнне Казіміра Льва Сапегі на гэтую пасаду было звязана з тым, што яго бацька — Леў Сапега — займаў вышэйшыя пасады ў дзяржаве і быў адным з уплывовых палітыкаў. Былі ўлічаны таксама еўрапейская адукацыя маладога Сапегі і веданне ім некалькіх моў. Як узнагароду за сваю пасаду малады палітык у тым жа 1631 годзе атрымаў Гродзенскае гродавае староства з правам суда ў гродавым (замкавым) судзе; прыбыткі са староства ішлі старосце. Гэта феадальная сістэма ўзнагароджвання вышэйшых саноўнікаў дзяржавы існавала доўгі час, бо яны не атрымоўвалі грашовай узнагароды (ці жалавання) за выкананне сваіх службовых функцый. Сапега сваю працу пачаў з упарадкавання дзяржаўнага архіву.

У сакавіку 1632 г. Леў Сапега перадаў сыну яшчэ адно староства — Здзітаўскае (Слонімскі павет). У гэты час Казімір Леў Сапега зноў выбіраецца дэпутатам сойма ад Слонімскага павета, становіцца прадстаўніком Уладзіслава Вазы пры абранні яго каралём польскім (і вялікім князем літоўскім і рускім), выбіраецца дэпутатам на чарговыя соймы. Разам з новаабраным каралём Уладзіславам Зыгімунтавічам (як яго называлі). К.Л.Сапега ўлетку 1633 г. праехаў па Беларусі, калі кароль з войскам адправіўся да Смаленска падчас Смаленскай вайны 1632—1634 гадоў з Расіяй, аднак у вайне Сапега ўдзелу не прымаў. Ад гэтага часу Казімір Сапега становіцца даверанай асобай караля і мае пэўны ўплыў на рашэнні Уладзіслава Вазы па дзяржаўных пытаннях.

7 ліпеня 1633 года памёр найбуйнейшы палітычны дзеяч Беларуска-Літоўскай дзяржавы XVII стагоддзя Леў Сапега. Цяпер Казімір Леў Сапега рабіў палітычную кар'еру самастойна, без падтрымкі бацькі. Перад смерцю бацька запісаў яму ў тэстаменце значную частку сваіх маёнткаў. Казімір Леў Сапега становіцца ўладальнікам Дзятлава, Вязоўца, Явара (Слонімскі павет), Дзярэўны і Шыдловічаў (Менскі павет), Цяцерына, Бялынічаў, Стараселля, Коханава, Круглага, Талачына, Друцка, Чарэі, Лукомля, Пачаевічаў (Аршанскі павет), Сянна (Віцебскі павет), Бешанковічаў (Полацкае ваяводства), Сямятычаў (Падляшскае ваяводства). Да таго пасля смерці нежанатага брата Крыштофа Мікалая Сапегі, пісара вялікага літоўскага, у 1631 годзе Казімір Леў атрымаў Бярозу (Бярасцейскі павет). У 1635 годзе памёр без патомства і старэйшы яго брат, Ян Станіслаў, і Казімір Леў Сапега атрымаў новыя маёнткі, якія ў свой час бацька запісаў старэйшаму з сыноў, — гэта Іказнь, Сапежын (Друя) з Прыдруйскам, або Задзвіннем (цяпер у Латвіі — Піедруя) і Дубровіца (Браслаўскі павет), Асвея (Полацкае ваяводства), Шкуды і Крэтынга (Жэ-

майція), Зэльва (Ваўкавыскі павет), Ружана (Слонімскі павет), Горы Вялікія і Горы Малыя (цяпер горад Горкі), Шышава ў Аршанскім павеце. Такім чынам, за некалькі гадоў Казімір Леў Сапега становіцца адным з наймагутнейшых і ўплывовых магнатаў Беларусі і Літвы. Гэта дазволіла яму рабіць палітычную кар'еру. У далейшым К.Л.Сапега набываў новыя ўладанні (не лічачы старостваў, якія звычайна атрымоўваў пажыццёва). Да яго набыткаў належалі Косава (Слонімскі павет), Ляхавічы з крэпасцю (Наваградскі павет), Цімкавічы (Слуцкае княства), Стары Быхаў з крэпасцю (Аршанскі павет), Чарнобыль (Кіеўскае ваяводства). Усё гэта яшчэ больш павялічыла ўплыў на ўнутраную палітыку дзяржавы. Пазней Сапега атрымаў яшчэ Слонімскае, Рагачоўскае і Аршанскае староствы, а таксама Берасцейскую эканомію.

Пасля заключэння Палянаўскага міру 1634 г., якім закончылася вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай 1632—1634 гадоў, Казімір Леў Сапега ўзначаліў пасольства Рэчы Паспалітай у Маскву, побач з паслом ад Польшчы Аляксандрам Пясэчыньскім, кашталянам камянецкім. Пасольства прыехала ў Маскву, каб ратыфікаваць Палянаўскі мірны дагавор. У той час ратыфікацыя прадстаўляла сабой цырымонію цалавання крыжа царом Міхаілам Фёдаравічам у прысутнасці паслоў. Пэўныя ўступкі з боку Масквы, якія былі адкладзены да ратыфікацыі, былі цалкам адвергнутыя маскоўскім бокам. Не ўдалося таксама заключыць саюз паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй супраць Швецыі. Жорсткасць маскоўскіх прадстаўнікоў і абмежаванні ў дзейнасці пасольства ў Маскве выклікалі абурэнне Сапегі. Адначасова ў Сапегі адбыўся канфлікт і з А.Пясэчыньскім, якога Сапега абвінаваціў у недастатковай кампетэнцыі і ў дыскрымінацыі ліцьвінаў падчас пасольства. Пасля вяртання з Масквы ў красавіку 1635 г. К.Л.Сапега атрымаў яшчэ і Губскае староства.

У маі 1637 г. Казімір Леў Сапега атрымаў тытул маршалка надворнага літоўскага, які кіраваў вялікакняскім дваром у Вільні, загадваў цырымоніямі, размяшчэннем двара. Хаця гэты тытул быў ніжэйшы за маршалка вялікага літоўскага, аднак ён даваў права засядаць у сенаце, вышэйшай палаце сойма Рэчы Паспалітай. Так К.Л.Сапега ўвайшоў у склад сенату. У гэты час пачынаецца саперніцтва Сапегі з Радзівіламі.

К.Л.Сапега займаецца і ўпарадкаваннем сваіх маёнткаў. Каб узмацніць магутнасць сваіх латыфундый, ён спрыяе развіццю гандлю і рамёстваў у сваіх прыватнаўладальніцкіх гарадах і мястэчках. Так, ён дамогся ў караля і вялікага князя Уладзіслава прывілею ад 4 кастрычніка 1634 г. на магдэбургскае права і ярмаркі Бешанковічам, у тым жа 1634 г. магдэбургскае права і права на ярмаркі атрымалі ад караля Бялынічы і Талачын, у 1637 г. — Ружана (Ружаны), дзе была пабудавана ратуша, створаны магістрат і магістрацкі суд. Па-ранейшаму Сапега знаходзіўся ў вельмі добрых адносінах з каралём Уладзіславам.

У лютым 1639 г. Казімір Леў Сапега ў Кракаве ажаніўся з Тэадорай Крыстынай Тарноўскай (1625—1652), ад якой дзяцей не меў. Яго жонка была прадстаўніцай вяльможнага польскага роду; яе бацька быў ваяводам вэндэнскім і таксама засядаў у сенаце. У канцы 30-х і ў 40-я гады XVII ст. К.Л.Сапега абіраецца дэпутатам сойму. На адным з іх, у 1639 г., Сапегу выбралі старшынёй камісіі па расследванню рэлігійнага канфлікта ў Вільні паміж католікамі і кальвіністамі. Па ініцыятыве Сапегі было прынята рашэнне аб выдаленні з Вільні кальвінісцкага збору (храму) у 1640 годзе. К.Л.Сапега адмовіў таксама свайму дзядзьку, Крыштофу Радзівілу, які ў гэты час паміраў, у просьбе пасярэднічаць у магчымым пагадненні паміж віленскім біскупам Абрагамам Войнай і кальвіністамі. На наступных соймах К.Л.Сапега выступаў з ультракаталіцкіх пазіцый. Так, у лютым 1642 г. ён разам з такім жа заўзятым католікам, канцлерам вялікім літоўскім Альбрыхтам Станіславам Радзівілам і чатырма каталіцкімі біскупамі выступіў з пратэстам супраць пастановы сойма Рэчы Паспалітай, паводле якой былі прызнаныя правы перамышльскага праваслаўнага епіскапа Сільвестра Гулевіча-Ваютынскага, а праваслаўным вернутыя манастыры і маёнткі, якія аспрэчвала уніяцкая царква.

На чарговым сойме ў 1643 годзе Сапега быў уключаны ў склад камісіі па рэвізіі смаленскага замка, каб ён быў падрыхтаваны для абароны ў выпадку вайны з Расіяй. У гэты ж час сустракаўся з князем Філіпам Вільгельмам Нейбургскім, які ажаніўся з сястрой караля Уладзіслава, і ўстанавіў з гэтым баварскім прынцам сяброўскія адносіны. У снежні 1643 г. прымаў у сваім віленскім палацы дацкага прынца Вальдэмара, а ў студзені 1644 г. ажно 9 дзён прымаў у сваім палацы ў Ружане (Ружанах) караля Уладзіслава і каралеву Цэцылію Рэнату. Даў каралеўскай пары багатыя і каштоўныя падарункі.

6 сакавіка 1645 г. падчас пасяджэння сойму Казімір Леў Сапега атрымаў ад караля пасаду падканцлера Вялікага княства Літоўскага і Рускага. Выказваў свае погляды з пункту гледжання сваёй аўстрыйскай арыентацыі. Пасля смерці каралевы (сакавік 1644 г.) і ў сувязі з намерамі караля Уладзіслава IV Вазы зноў ажаніцца з прынцэсай Людвікай Марыяй Гансага, дачкой герцага мантуанскага (з французскай лініі роду Ганзага) Сапега выступіў на пасяджэнні сенату супраць праекта гэтага шлюбу, бо тады пры двары ўзмацнялася прафранцузская групоўка. Аднак, калі кароль настаяў на сваім, Сапега як адзін з двух прадстаўнікоў Рэчы Паспалітай паехаў сустракаць нявесту караля на мяжу і ўзяў з сабой світу і ўзброеныя атрады ў 800 чалавек, чым вельмі дагадзіў каралю. Потым суправаджаў прынцэсу да Варшавы.

У гэты ж час выступіў супраць плана караля пачаць вялікую вайну з Турцыяй і нават адмовіўся ставіць малую дзяржаўную пячатку на адпа-

ведныя лісты, карыстаючыся правам падканцлера ў такіх выпадках нязгоды з каралём (адпаведна і канцлер меў права адмовіць каралю ставіць вялікую дзяржаўную пячатку на дакументы, з якімі быў нязгодны).

Займаўся К.Л.Сапега і ўнутранымі справамі. Паколькі ў 1646 г. з Расіяй было падпісана пагадненне аб памежных тэрытарыяльных зменах і Трубчэўск (Старадубскі павет) быў перададзены Расіі, то Сапега прапанаваў перадаць з Кіеўскага ваяводства, якое ўваходзіла ў склад Польскага каралеўства, у склад Вялікага княства Літоўскага свой прыватнаўладальніцкі горад Чарнобыль з акругай. Але шляхецкія дэпутаты ад Кіеўскага ваяводства на сойме 1646 г. рашуча выступілі супраць такой перадачы, і Чарнобыль застаўся на Украіне. Да Беларуска-Літоўскай дзяржавы быў далучаны Любеч, на ўсходнім беразе Дняпра (на поўдзень ад Лоева).

Неспакойны Сапега выкарыстоўваў у палітыцы і свае родавыя адносіны. Так, у 1647 г. ён спрыяў шлюбу свайго далёкага сваяка Тамаша Сапегі з Соф'яй Дарагастайскай, апошняй прадстаўніцай гэтага кальвінісцкага шляхецкага роду. З-за яе спадчыны ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве амаль не пачалася вайна паміж узброенымі атрадамі католікаў Сапегаў і кальвіністаў Радзівілаў, якіх узначальваў дваюрадны брат К.Л.Сапегі Януш Радзівіл, гетман польны літоўскі, які не хацеў аддаваць Т.Сапегу маёнткі яго жонкі. Урэшце ў снежні 1646 г. пры пасрэдніцтве канцлера вялікага літоўскага Альбрыхта Станіслава Радзівіла дваюрадныя браты прыйшлі да пагаднення. Потым у справу ўмяшаўся і сам кароль Уладзіслаў IV, які разам са смаленскім ваяводам Юрыем Каралем Глябовічам памірыў К.Л.Сапегу і Я.Радзівіла. У маі 1648 г. была дасягнута канчатковая дамова па спадчыне Дарагастайскіх.

Кароль Уладзіслаў Ваза паміраў у літоўскім гарадку Мерачы. У апошнія дні свайго жыцця ён выклікаў з Вільні Казіміра Льва Сапегу і прызначыў яго адным з чатырох выканаўцаў свайго тэстамента. Кароль памёр 20 мая 1648 года. К.Л.Сапега даглядаў выкананне тэстамента нябожчыка і суправаджаў труну з целам караля з Мерачы да Варшавы.

На канвакацыйным сойме ўлетку 1648 г., калі выпрацоўваліся ўмовы абрання караля і пагаднення з ім аб яго правах і паўнамоцтвах, Сапега зноў выступіў супраць пратэстантаў і нават падпісаў пратэст супраць прызнання рэлігійных правоў арыянскай канфесіі. Зноў выступаў як заўзяты католік.

У гэты час на Украіне пачалася нацыянальна-вызваленчая вайна пад кіраўніцтвам гетмана Багдана Хмяльніцкага. Асноўныя сілы польскага (кароннага) войска былі разбіты казацка-татарскім войскам. Абодва каронных гетмана, вялікі і польны, трапілі ў палон. Збіралася новая каронная армія. Сапега прапанаваў, каб яе ўзначалілі гетманы літоўскія — гетман вялікі Януш Кішка і гетман польны Януш Радзівіл, дваюрадны брат,

палітычны і рэлігійны праціўнік Казіміра Льва Сапегі. Аднак польскія дэпутаты сойма не згадзіліся з гэтай прапановай. Яны баранілі сваю незалежнасць у федэратыўнай дзяржаве Рэчы Паспалітай. Польскім войскам, як яны лічылі, маглі камандаваць толькі польскія, а не беларуска-літоўскія шляхціцы. Не аддалі камандавання і рашучаму праціўніку казакоў князю Іерэмію Вішнявецкаму. У выніку польскае войска ўзначалілі ажно тры камандуючыя (рэгіментары): князь Дамінік Заслаўскі, Мікалай Астрарог і Аляксандр Канецпольскі. Казакі называлі іх: старога Заслаўскага з-за яго гадоў — Пярына, вучонага Астрарога— Лаціна і маладога Канецпольскага — Дытына. У выніку калектыўнага кіраўніцтва польскае войска было разбіта ў чарговай бітве 23 верасня 1648 г. пад Піляўцамі.

Сойм Рэчы Паспалітай утварыў камісію для мірных перамоваў з казакамі, куды быў уключаны і К.Л.Сапега. Сапега лічыў, што для абароны Беларусі ад казакоў хопіць 3 тысяч жаўнераў, а гетман польны Я.Радзівіл прасіў грошай на ўтрыманне 6 тысяч жаўнераў. Але, каб абараніць тэрыторыю Беларусі, Сапега выставіў трохтысячнае войска за свой кошт і ўмацаваў свае крэпасці ў Старым Быхаве і Ляхавічах.

Падчас выбараў новага караля спачатку Сапега падтрымліваў кандыдатуру Караля Фердынанда Вазы, самага малодшага брата Уладзіслава IV, з якім у яго былі даўнія сяброўскія адносіны. Аднак хутка пераканаўся, што больш шанцаў быць абраным мае яго старэйшы брат Ян Казімір Ваза, і Сапега паспрабаваў пераканаць малодшага з братоў караля зняць сваю кандыдатуру. На элекцыйным (выбарчым) сойме перамагла «партыя міру» з казакамі, якая падтрымлівала кандыдатуру Яна Казіміра. Яго кандыдатуру падтрымалі імператарскія і папскія дыпламаты, а таксама Багдан Хмяльніцкі. Караль Фердынанд адмовіўся ад высокай пасады, і 20 лістапада 1648 г. на сойме шляхта абрала новым каралём Яна Казіміра. На каранацыйным сойме ў студзені 1649 г. Сапега ўжо знаходзіўся ў свіце новага караля.

У казацкай справе Казімір Леў Сапега быў блізкі да «партыі вайны». Ён выступаў за хутчэйшае наступленне на Украіну і за перадачу галоўнага камандавання польскім войскам князю Іярэміі Вішнявецкаму. Разам з тым Сапега выступаў і за перамовы з Багданам Хмяльніцкім і казацкай старшынай. Каб забяспечыць граніцы Рэчы Паспалітай, ён прапанаваў выслаць пасольствы ў Маскву і Швецыю і заключыць з гэтымі дзяржавамі дагаворы.

У Казіміра Льва Сапегі ўсталяваліся добрыя стасункі з каралём Янам Казімірам, што ўзмацніла пазіцыі магната ў яго на радзіме. К.Л.Сапега ўзначаліў «прыдворную партыю» ў Вялікім княстве Літоўскім, на якую абапіраўся кароль і вялікі князь Ян Казімір. У 1649 г. Сапега атрымаў Рагачоўскае староства і Берасцейскую эканомію (з абавязкам выплаты з

яе ў скарб дзяржавы штогод 55 тысяч злотых).

Казімір Леў Сапега ўдзельнічаў у паходзе войска польскага караля Яна Казіміра на Украіну ўлетку 1649 г. Са сваіх маёнткаў ён выставіў у гэты паход 1 тысячу жаўнераў і камандаваў 7-м палком каралеўскага войска. Гэтае войска ішло на дапамогу польскаму войску, якое было ў аблозе ў Збаражы. 15 жніўня 1649 г. падчас пераправы польскага войска на чале з каралём праз раку Стрыпу (на Валыні) на яго напала казацка-татарскае войска. Два дні ішлі баі пад Зборавам (на Стрыпе). Полк Сапегі дапамог 8-му палку Самуэля Караля Карэцкага вытрымаць атаку крымскіх татараў, але атрады Сапегі панеслі вялікія страты, і сам Сапега быў у небяспецы падчас бітвы. Аднак і казакі, і крымскія татары панеслі страты. Па прапанове караля канцлер вялікі каронны Ежы Асалінскі і Казімір Леў Сапега вялі перамовы з візірам крымскага хана Сеферам Газі. Хан за грашовую ўзнагароду спыніў ваенныя дзеянні і прымусіў Б.Хмяльніцкага таксама ўступіць у перамовы. У выніку іх 18 жніўня 1649 г. быў падпісаны Збораўскі мір з казакамі і Крымам. Тры ўкраінскія ваяводствы з цэнтрам у Кіеве станавіліся аўтаномнай адзінкай (на чале з гетманам Б.Хмяльніцкім) у складзе Польскага каралеўства. Напады казацкіх атрадаў на Беларусь спыняліся. На сойме Рэчы Паспалітай у канцы 1649 г. К.Л.Сапега атрымаў падзяку ад сойма за дапамогу ў збораўскай кампаніі.

На сойме ў снежні 1650 г. Сапега, разам з іншымі дэпутатамі і сенатарамі, падпісаў пратэст ад Вялікага княства Літоўскага супраць прыпісання шляхты Літвы і Беларусі да паспалітага рушэння (апалчэння) польскай шляхты, бо былі парушаны ўмовы Люблінскай уніі: усе законы і пастановы сойм павінен быў прымаць асобна для Польшчы, асобна для Вялікага княства Літоўскага (а тэксты іх былі рознымі). Пазней, у студзені 1651 г., Сапега прымаў у сваім палацы ў Ружане (Ружаны) караля Яна Казіміра, які прыехаў наведаць Жыровіцкі уніяцкі манастыр. Вясной 1651 г. К.Л.Сапега зноў суправаджаў караля Яна Казіміра ў яго паходзе на Украіну. Падчас бітвы пад Берасцечкам (на Валыні) 28—30 чэрвеня 1651 г. Сапега камандаваў сваім палком на правым крыле каралеўскай арміі. Бітва пад Берасцечкам закончылася паражэннем казацка-татарскага войска, і быў падпісаны Белацаркоўскі мір, у выніку якога тэрыторыя гетманскай Украіны скарачалася да аднаго Кіеўскага ваяводства. Менавіта ў гэты час Сапега атрымаў і Аршанскае староства. На сойме звычайным 1652 г. К.Л.Сапега яшчэ раз атрымаў падзяку за ўдзел у вайсковай кампаніі 1651 года. На сойме надзвычайным у тым жа годзе Сапега падтрымліваў палітыку караля Яна Казіміра, выступаючы супраць апанентаў караля. Вясной 1653 г. на сойме ў Брэсці К.Л.Сапега выказаўся за затрыманне на службе войска літоўска-беларускага (у мірны час яно ў большасці распускалася), каб

забяспечыць край і перад усім Смаленск на выпадак нападу Расіі на Рэч Паспалітую. Улетку 1653 г. Сапега зноў у паходзе караля на Украіну на чале сваёй казацкай харугвы (яна складалася не з казакоў, а з коннай шляхты з лёгкім узбраеннем, таму і называлася казацкай).

У гэты час палітычныя пазіцыі К.Л.Сапегі і Радзівілаў разыходзяцца яшчэ далей і кароль у сваёй унутрыдзяржаўнай барацьбе ў Вялікім княстве Літоўскім з Янушам Радзівілам абапіраецца на магнацкую групоўку Сапегаў. Таму на сойме звычайным у 1654 г. кароль Ян Казімір хацеў даць К.Л.Сапегу вялікую булаву літоўскую, г.зн. прызначыць Сапегу на пасаду вялікага гетмана. Аднак апазіцыя ў Беларусі і Літве (Радзівілы) і ў Польшчы (Ляшчынскія, Апалінскія, Любамірскія) выступілі супраць гэтага намеру, а Януш Радзівіл дамогся зрыву сойма 28 сакавіка 1654 года. Вясной 1654 г. расійскі цар Аляксей Міхайлавіч распачаў вялікую вайну супраць Рэчы Паспалітай, намагаючыся захапіць Украіну і Беларусь. У выніку дзеянняў апазіцыі кароль вымушаны быў на надзвычайным сойме ў чэрвені 1654 г.надаць тытул гетмана вялікага літоўскага віленскаму ваяводзе Янушу Радзівілу, а кароннага (польскага) гетмана вялікага Станіславу Рэверы Патоцкаму.

На надзвычайным сойме 1654 г. Казімір Леў Сапега прасіў дэпутатаў і сенатараў ад Кароны (Польшчы) даць вайсковую дапамогу Беларуска-Літоўскай дзяржаве. Сам Сапега выставіў за свой кошт полк жаўнераў, але падчас ваенных дзеянняў супраць маскоўскіх войскаў гэты полк дзейнічаў самастойна, не падпарадкоўваючыся ўладзе гетмана. Толькі ўзімку 1654—1655 гг. падчас наступу Януша Радзівіла на Магілёў гэты сапежынскі полк дзейнічаў пад началам вялікага гетмана. У 1655 г. падчас далейшага наступу расійскіх войск у глыбіню тэрыторыі Беларусі і Літвы Казімір Леў Сапега спрабаваў устанавіць кантакты са шведскім каралём Карлам X Густавам, разлічваючы на яго дапамогу супраць маскоўскага цара. Аднак сам шведскі кароль у гэты час напаў на Польшчу, якая амаль цалкам была акупавана шведскімі войскамі, і спробы Сапегі аказаліся марнымі. Рашуча выступіў Сапега супраць дамовы са Швецыяй аб саюзе, заключанай у Кейданах 17 жніўня 1655 г. ад імя Вялікага княства Літоўскага Янушам Радзівілам. Пад актам гэтай дамовы паставілі свае подпісы 436 чалавек, у тым ліку гетман вялікі Януш Радзівіл, гетман польны Вінцэнт Корвін Гасеўскі, віленскі біскуп Юрый Тышкевіч, жамойцкі біскуп Пётр Парчэўскі і іншыя магнаты і шляхта. Вялікае княства Літоўскае ўстанаўлівала саюз са Швецыяй супраць агульнага непрыяцеля.

К.Л.Сапега застаўся верным каралю Яну Казіміру і Рэчы Паспалітай і восенню 1655 г., знаходзячыся ў Бярэсці: каардынаваў дзеянні войска Вялікага княства Літоўскага і шляхты на тэрыторыі Берасцейскага павета і Падляшскага ваяводства, не занятай ні расійскімі, ні шведскімі войскамі.

Улетку 1655 г. расійскія войскі дамагліся вялікіх поспехаў. Яны занялі Менск, Вільню, Трокі, Коўна, Гродна, а ўкраінскія казакі захапілі Ліду, Мір, Карэлічы і Мерач. Фактычна ён узначаліў у гэтым рэгіёне прыхільнікаў караля Яна Казіміра і ахвяраваў на справу супраціўлення ворагам свае фінансавыя сродкі, а камандаваў войскамі тут яго далёкі сваяк, віцебскі ваявода Павел Ян Сапега. Шведскі кароль Карл X Густаў некалькі разоў звяртаўся да Казіміра Льва Сапегі, каб ён перайшоў пад уладу шведскага караля, асабліва пасля заключэння Кейданскага дагавора 20 кастрычніка 1655 г. Паводле гэтага дагавору Вялікае княства Літоўскае заключыла дзяржаўную унію са Швецыяй, а шведскі кароль (і яго наступнікі) станавіўся вялікім князем літоўскім. Свабода каталіцкага, уніяцкага і праваслаўнага веравызнанняў гарантавалася. Гэты дагавор падпісала 1142 чалавекі.

Хворы Казімір Леў Сапега доўга адмаўляўся прызнаць уладу шведскага караля і толькі ў канцы лістапада 1655 г. пасля чарговага паражэння літоўскага войска даў згоду на фармальнае прызнанне ўлады шведскага караля. Зрабіў гэта ён пасля таго, як войска, узначальваемае Паўлам Янам Сапегам, згадзілася прызнаць пратэкцыю шведскага караля, аднак пры гэтым захоўвала сваю адданасць каралю Яну Казіміру і дзейнічала супраць саюзнікаў шведаў — гетмана вялікага Януша Радзівіла і яго прыхільнікаў.

Казімір Леў Сапега яшчэ паспеў даведацца пра аблогу войскам Паўла Яна Сапегі Тыкаціна на Падляшшы, дзе з невялікімі сіламі знаходзіўся дваюрадны брат і вораг К.Л.Сапегі Януш Радзівіл, абвешчаны ворагам Айчыны. Даведаўся К.Л.Сапега і пра смерць Януша Радзівіла ў Тыкаціне 31 снежня 1655 г. Аднак і сам Сапега паміраў. Казімір Леў Сапега памёр у Бярэсці 19 студзеня 1656 г. і быў перазахаваны праз 10 гадоў, у чэрвені 1666 г., у Бярозе ў касцёле святога Крыжа. Жонка яго, Тэадора Крыстына Тарноўская, памерла ў 27-гадовым узросце ў 1652 г. Дзяцей у іх не было, патомства канцлера Льва Сапегі скончылася. Паводле тэстаменту Казіміра Льва Сапегі яго вялікія маёнткі былі перададзены яго далёкаму сваяку і хросніку Казіміру Яну Сапегу (1637—1720), бацьку хросніка, віцебскаму ваяводзе і палкаводцу Паўлу Яну Сапегу (1609—1665) і аднаму з вайсковых камандзіраў, Аляксандру Гіларыю Палубінскаму.

Маючы вялікія багацці, Казімір Леў Сапега выдаткоўваў грошы не толькі на войска, але быў фундатарам касцёлаў і мецэнатам. Так, ён быў фундатарам кляштару картузаў у Бярозе (1648 г.), узвёў мураваны касцёл Святой Тройцы і кляштар бернардынаў у Друі (1640—1646 гг.) і ў Гародні (1648 г.), фундаваў кармелітаў у Бялынічах і езуітаў у Бярэсці (1653 г.), бернардынаў і рэгулярных латэранскіх канонікаў у Слоніме, боніфратраў і езуітаў у Навагрудку, дамініканаў у Чарнобылі, пабудаваў касцёлы ў Бярэзіно, Бешанковічах, Сямятычах, Дзяцелу і Чарэі,

уніяцкую царкву ў Шчаўрах, шпіталі ў Ружане і Талачыне. За 63 тысячы талераў фундаваў сярэбраную труну для мошчаў архіепіскапа полацкага Іясафата Кунцэвіча.

Пры сваім двары ў Ружане (Ружанах) ён арганізаваў капэлу. Тут жа была бібліятэка (каля 3 тысяч тамоў), з якой кніжкі ён даваў часова каралю Уладзіславу Вазу. Пасля гэтая бібліятэка была перададзена ў Віленскую акадэмію. Для гэтай акадэміі ён фундаваў адкрыццё кафедраў кананічнага і цывільнага права, а потым запісаў прыбыткі з маёнтка Пачаевічы (Аршанскі павет) на ўтрыманне чатырох прафесараў кананічнага і цывільнага права. Казімір Леў Сапега тытулаваўся графам на Быхаве і Сапежыне. Лічыўся сучаснікамі добрым прамоўцам і руплівым гаспадаром. Увайшоў у гісторыю як палітычны дзеяч сваёй неспакойнай для краю эпохі.

Літаратура:

1. Грицкевич А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. Мн., 1975.
2. Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654—1667. Мн., 1995.
3. Sapiehowie. Materjały historyczno-genealogiczne i majątkowe. Tom II. Petersburg, 1891.
4. Rachuba A. Sapieha Kazimierz Leon (Lew) // Polski Słownik Biograficzny. Tom XXXV/1, zeszyt 144, Warszawa-Kraków, 1994, s. 31—37.

Анатоль Грыцкевіч

Урсула Францішка РАДЗІВІЛ
(1705—1753)



Калі задумацца пра шляхі развіцця тэатральнай культуры Беларусі, паглядзець у яе вытокі, то нельга не ўбачыць неадназначнасці яе праяўлення ў XVIII ст. і парадаксальнасці працэсу яе фарміравання: яе нацыянальныя рэаліі спалучаліся з каштоўнасцямі іншаэтнічнымі.

У гэтай культурнай плыні нараджаўся свецкі тэатр, ва ўзнікненні якога вялікую ролю адыграла творчасць Урсулы Францішкі Радзівіл — «адной вучонай літоўскай дамы» (так называлі яе сучаснікі), першай жонкі нясвіжскага ардыната, вялікага гетмана літоўскага князя Міхала Казіміра Радзівіла (Рыбанькі).

Княгіня Урсула паходзіла з старажытнага роду Карыбутаў-Вішнявецкіх. Нарадзілася яна 13 лютага 1705 г. у Чартарыйску, у сям'і Януша Антонія Вішнявецкага, кашталяна кракаўскага. Атрымала бліскучую хатнюю адукацыю, ведала тры мовы, арыентавалася ў літаратурных навінках, рана пачала пісаць вершы.

У шлюбе Урсула была шчаслівая, вельмі кахала свайго мужа: пісала яму палкія паэтычныя пасланні і падаравала 36(!) дзяцей, якія, па волі лёсу, памерлі ў маленстве (з яе сыноў дажыў да старасці толькі адзін — любімец шляхты, праслаўуты Пане Каханку, князь Караль). Але была і асабістая драма, і пачалася яна задоўга да смерці дзяцей: маці князя «Рыбанькі» — Ганна з Сангушак — вельмі пратэставала супраць будучага шлюбу і дала згоду на яго толькі пад моцным ціскам радні.

Неабходна адзначыць, што княгіня Урсула была не беднай. Ужо па шлюбнаму кантракту яна прынесла ў дом Радзівілаў 40 тысяч залатых

дукатаў, а пасля смерці дзядзькі — канцлера вялікага літоўскага, пісьменніка і паэта Сервацыя Вішнявецкага — вялікія зямельныя надзелы: гарады і маёнткі на Валыні, у Кракаўскім, Кіеўскім і Браслаўскім ваяводствах, тысячы прыгонных.

Вяселле Урсулы з князем Рыбанькай згулялі 22 красавіка 1725 г. Затым — на працягу года — традыцыйнае наведванне родавых вотчын, а Новы год яны адзначылі ў Варшаве, на карнавале. Толькі потым — у 1726 г. — маладых сустракалі ў Нясвіжы: княгіня Урсула становіцца паўнапраўнай гаспадыняй у зноў адбудаваным замку, які моцна пацярпеў ад шведаў у 1706 г.

Па складу характару княгіня была сентыментальнай, цікаўнай і актыўнай. Яна занялася ўпарадкаваннем інтэр'ераў замка, упэўніла мужа аднавіць дзейнасць друкарні, прывесці ў добры стан бібліятэку і знакаміты архіў, зацікавілася вырабамі ўрэцкай гуты. Урсулу не задавальняў побыт нясвіжскай шляхты, напоўнены бясконцымі паляваннямі, балявannямі і абжорствам. Яна марыла пра тэатральныя прадстаўленні, падобныя на тыя, якія яна бачыла ў Вішняўцы, у прыдворным тэатры свайго дзядзькі. Спектакль «Прыклад справядлівасці», які паказалі ў 1740 г. іншаземцы, што жылі пры нясвіжскім двары, яе не задаволіў. Яна вырашае адкрыць свой — «замкавы» — тэатр, для якога будзе пісаць п'есы. Іх будзе 16 — трагедый, камедый і оперных лібрэта. Яна ўпершыню перавыдае на польскай мове Мальера, выдае свае «Камедыі і трагедыі», якія даследчыкі XX стагоддзя аднясуць да ўнікальных «тэатральных прымітываў» эпохі сармацкага барока.

Нясвіжскі аматарскі тэатр У.Ф.Радзівіл, як з'ява, не мае аналагаў у тэатральнай культуры славянскіх народаў. Ён з'явіўся на мяжы шляхецка-сармацкай культуры XVII ст. — першай паловы XVIII ст. і заходнееўрапейскай культуры ў той перыяд, калі ў межах Вялікага княства Літоўскага адсутнічаў прафесійны тэатр, але яшчэ вельмі распаўсюджаной была школьная сцэна. Драматургія У.Ф.Радзівіл, са слоў Ю.Кжыжаноўскага, «стала своеасаблівым дакументам прымітыўнай, але багатай літаратурнай культуры, якая аднолькава цікавілася лёсам чалавека, аб'ядноўвала ў сабе княжацкі замак і бедную сялянскую хату».

І культуру гэту вызначала ў першую чаргу творчасць Урсулы Радзівіл. Створаныя ёю «Камедыі і трагедыі» былі спачатку надрукаваны ў Нясвіжы, а затым — восенню 1754 г. — у друкарні Гершона Галеві з Жолквы і ўжо ў той час былі вельмі рэдкімі. Кніга была ўпрыгожана гравюрамі на медзі львоўскага мастака М.Жукоўскага, у якіх адлюстраваліся непасрэдныя ўражанні мастака ад убачаных пастановак. Сярод іншых матэрыялаў, якія расказвалі пра ранні этап нясвіжскай сцэны, могуць быць названы запісы ў дзённіку «Дыярыуш» князя Рыбанькі, а таксама лісты Якуба Побуга Фрычынскага, арга-

нізатара амаль усіх пастановак княгіні Урсулы і абвязковага іх удзельніка ў якасці акцёра-аматара.

Творы У.Ф.Радзівіл, напісаныя цяжкой рыфмаванай прозай, адлюстроўвалі перш за ўсё не патрэбы нясвіжскага гледача, які далучаўся да тэатра як да віду мастацтва, а асабісты настрой і густ самога аўтара. Праблематыка камедый і трагедый У.Ф.Радзівіл, жанравыя межы якіх былі даволі неакрэсленымі, не выходзілі за кола пытанняў маралі, сямейнай і васальнай вернасці, пастаральнага кахання, якое пераадолела ўсе перашкоды, трываласці рэлігійных поглядаў, пакарання за зло і вераломнасць. Але ў той жа час нельга не заўважыць, што на іх пачынаюць уплываць ідэі Асветы, якія з сярэдзіны XVIII ст. актыўна ўздзейнічаюць на настрой думак адукаванай часткі шляхты і гараджан. Аднак у канкрэтнай драматургіі княгіні Урсулы новае светабачанне атрымала дастаткова спрошчанае адлюстраванне. І на структуры, і на форме яе твораў яскрава відаць адбітак дастаткова прымітыўных уяўленняў аўтара пра законы драматургіі (напрыклад, дзеянне магло адбывацца па-за часам і месцам).

Сюжэты для сваіх «пастаральна-рамансавых» п'ес і «свецкіх містэрый» У.Ф.Радзівіл брала з сярэдневяковых драм і народных казак, антычнай міфалогіі, арабскіх і персідскіх гумарэсак, спалучаючы неспалучальнае ў самых незвычайных варыяцыях. У яе камедыях і трагедыях маглі існаваць самыя розныя персанажы: арлекіны, якія прыйшлі ў Нясвіж з італьянскай камедыі дэль артэ і балетаў Францыі XVIII ст., а таксама героі са школьных драм, рэнесансных навел Бакачыо і Героніма Морштына, фарсаў і народных легенд. Такі быў «творчы метад У.Ф. Радзівіл», які яскрава адлюстраваў спецыфіку мясцовай культуры барока ў яе своеасаблівай пераходнай форме ад сярэдневяковых відовішчаў да тэатра новага часу.

Асноўным выканаўцам ролей у аматарскім «замкавым» тэатры княгіні Урсулы спачатку былі члены сям'і князя, госці, прыдворныя, а таксама настаўнікі танцаў і спеваў. У масавых сцэнах прымалі ўдзел прыгонныя музыканты і пеўчыя капэлы, слугі замка, а ў далейшым і жыхары горада.

Першая камедыя У.Ф.Радзівіл — «Дасціпнае каханне» — убачыла свет 13 чэрвеня 1746 г. З-за адсутнасці памяшкання, прыстасаванага для пастановак, спектакль вырашана было паказаць у Альбе — загараднай рэзідэнцыі, за Нясвіжам. Пад адкрытым небам была пабудавана арачная дэкарацыя, для знатных гледачоў і духавенства былі пастаўлены канапы (дробная шляхта і афіцэры нясвіжскага гарнізона глядзелі прадстаўленне стоячы). Па жанру «Дасціпнае каханне» — камедыя-пастараль, падобная да італьянскай камедыі дэль артэ з песнямі і танцамі.

У.Ф.Радзівіл, напісаўшы сваё «Дасціпнае каханне», унесла ў кано-

ны італьянскай камедыі масак свае карэктывы: яна дае новае імя Панталоне — Люцыдор, пасяляе яго ў Егіпце (?), пераўтварае з купца ў багатага пастуха і ўзнагароджвае яго тузінам дачок. А далей усё па традыцыі: Люцыдор стары і набожны, недаверлівы і сварлівы, любіць знаходзіць у сябе хваробы і траціць прытомнасць, носіць акуляры і не ведае, як усачыць за нявіннасцю сваіх дачок.

Што ж датычыцца апошніх, то ноччу яны арганізоўваюць «у палацы» патаемныя сустрэчы з пастухамі. Двойчы заспетыя сваім падслепаватым бацькам, якога будзяць песні і танцы, яны паспяваюць паставіць сваіх каханкаў на пустыя пастаменты ў арках і выдаць іх за купленыя імі мармуровыя скульптуры. У цэнтры інтрыгі — Арлекін: менавіта яму належыць ідэя «жывых статуй», ён просіць іх «не круціць нічым і не марочыць галаву». Але ўсё марна. Разбуджаны ў трэці раз, Люцыдор застае ўсіх на месцы злачынства — у час імправізаванага канцэрта. Ён выганяе пастухоў з хаты, а дачок адпраўляе пасвіць авечак і «часаць воўну». Калі гнеў праходзіць, Люцыдор засмучаецца: ён успамінае свой стары ўзрост і свае «хваробы», лічыць, што прыйшла яго смерць. Загадвае паклікаць урача і траціць прытомнасць. З'яўляецца ўрач — персанаж, які нясе ў сабе рысы героя італьянскай камедыі масак і ў той жа час чымсьці нагадвае герояў школьных і батлеечных інтэрмедый. Ён гаворыць адначасова па-лацінску, па-нямецку і па-французску, блытаючы ўсё з благім польскім, мітусіцца, ахкае, шукае пульс і «дух» у Люцыдора і пакутліва ўспамінае, колькі і чаго яму даў, асабліва «спірытусу», і гучна выказвае сваё задавальненне, калі Люцыдор ажывае. Затым яны ўдваіх ідуць за парадай да багіні Ізіды, якая прапаноўвае Люцыдору аб'яднаць каханкаў і скончыць справу мірам. Усё скончылася вяселлем пастухоў і пастушак і «канцэртам італьянскім» — як і належыць у камедыі дэль артэ.

На працягу дзеяння ў тэксце камедыі былі вясёлыя куплеты, жарты і віншаванні акцёраў-аматараў у адрас імяніннік — князя Рыбанькі, а багіня палявання чытала ў яго гонар панегірычныя вершы пад акампанемент музыкі сатыраў.

Мова галоўнага героя камедыі, Люцыдора, як і Арлекіна, была простанароднай, пастухоў і пастушак — больш прыгожай і пабудаванай па ўсіх правілах ласкавых размоў («далікатнасці»), у асобных месцах куртуазнай, напышлівай і вычварнай, што лічылася прыкладам добрага тону ў шляхецкіх колах. У камедыі з'яўляюцца жаночыя вобразы, якія ў наступных творах У.Ф.Радзівіл пачынаюць несці галоўную ідэйную аснову, атрымліваюць далейшае развіццё і становяцца тыповымі для сентыменталізму, які нараджаецца: гераіні У.Ф.Радзівіл разумныя, знаходлівыя, самаадданыя, верныя ў каханні і шлюбе. Яны патрабуюць у адказ глыбокага пачуцця і належнага саюза.

Што ж датычыцца Арлекіна, то ён узнікае на нясвіжскіх падмурках яшчэ тройчы. Згодна з гравюрай М.Жукоўскага ў 1749 г. Арлекін прымаў удзел у інтэрмедыі да камедыі У.Ф.Радзівіл «Убачанае не праходзіць» (перапрацоўка «Бліскучых палюбоўнікаў» Мальера), год таму яшчэ ў адной камедыі княгіні Урсулы — «Суддзя без розуму», дзе ён дапамагае цудоўнай Зумруд ажаніць дурнога суддзю з брыдкай Джыдотай. А трэці раз Арлекін з'яўляецца ў якасці аднаго з галоўных персанажаў камедыі У.Ф.Радзівіл «Загана ў цянётах» (была пастаўлена ў нясвіжскім тэатры ў 1751 г. і вытрымала шэсць прадстаўленняў).

«Загана ў цянётах» не была дакладнай копіяй італьянскай камедыі масак. Яна па сваіх жанравых прызнаках можа быць аднесена да «усходніх фарсаў», тыпічных для XVIII ст. і для «сарматцкага» барока. Асновай камедыі стаў распаўсюджаны ў літаратуры і фальклоры многіх народаў сюжэт аб юрлівых багатых нягодніках, якіх заманіла ў пастку спрытная і разумная жанчына. У творы княгіні Урсулы ёю стала маладая і кемлівая Аруя, жонка старога і бязвольнага купца Бануты, які пазычыў усе свае грошы Урачу, Суддзі і Губернатару. Купцу пагражае банкрутства. Але калі Банута звяртаецца да даўжнікоў з просьбай вярнуць даўгі, то замест грошай атрымлівае кпіны і кухталі. Банута ў адчаі. Як ён лічыць, усім у хаце «пагражае галодная смерць». Напалоханы і яго слуга Арлекін: калі ўсе памруць з голаду, то памрэ і ён, а як тады ажаніцца з Лаурай. Ён прапаноўвае сваёй гаспадыні дзейнічаць. Аруя па чарзе наведвае даўжнікоў разам з Арлекінам, які перад наведваннем павучаў яе, як «прыстойна» апрануцца для гэтага выпадку і паводзіць сябе («глядзі сціпла, усміхайся, вытры нос і апусці вочы»). Урач, Суддзя і Губернатар, перад якімі Аруя як бы ненарокам зняла чадру, так былі ўражаны яе харастаом, што паабяцалі не толькі вярнуць доўг мужу, але і заплаціць ёй у некалькі разоў больш, але пры ўмове, што яна патаемна прыме іх у сябе. Губернатар прапаноўвае Аруе наогул кінуць Бануту і стаць яго жонкай, а Бануце, у якасці кампенсацыі, абяцае аддаць сваю старую жонку, якая яму абрыдла. Аруя вырашае правучыць нягоднікаў і прыцягвае да інтрыгі сваіх слуг — Арлекіна і Лауру. Спачатку яна даручае Арлекіну купіць тры вялікія куфры, а Лауры — прыгатаваць багатую вячэру. Затым пасылае іх да даўжнікоў з прапановай прыйсці на спатканне і прызначае ім усім розны час. Спектакль адбываецца па адзінаму сцэнарыю: ад кожнага «каханка» Аруя атрымлівае грошы, просіць зняць «шапку, жупан, кунтуш, пояс і боты» і сесці за стол, а затым з'яўляліся слугі і палохалі навіной пра нечаканае вяртанне Бануты. Аруя хавала кожнага ў адзін з куфраў. Затым — візіт са скаргай у палац. Султану паказваюць, што ў куфрах.

У выніку юрліўцы адпраўлены ў турму, Банута прызначаецца губернатарам, Арлекін — суддзёй, а Аруя выратоўвае свой гонар і маёмасць сям'і.

Вобразы Арлекіна і Лауры (Фантанескі), якія прышлі з камедыі дэль артэ, атрымалі мясцовую інтэрпрэтацыю. Яго маска відазмянілася, хоць адметныя рысы італьянскага Арлекіна XVII ст. гэты персанаж захаваў. Сярод спецыфічных якасцей Арлекіна выдзяляюцца «весялосць» і «цудоўная наіўнасць», «уменне выкручвацца з непрыемнага становішча, а таксама лоўкасць у дасягненні мэтаў». Польскі варыянт камедыі дэль артэ на свет не з'явіўся; не спалучыўся Арлекін са спрадвечнымі фальклорнымі вобразамі, як гэта адбылося, напрыклад, у Германіі і Аўстрыі ў XVIII ст. Але сваю, спецыфічна «сармацкую» характарыстыку ён усё ж атрымаў на нясвіжскай сцэне. Ён характарызаваўся ва ўсіх творах У.Ф. Радзівіл як «верны васал», давераны слуга сваіх гаспадароў, які стаяў на варце іх інтарэсаў. Ні ў адной камедыі княгіня Урсула не падкрэслівала, што Арлекін плебей: калі гэта было неабходна па працягу дзеяння, ён прызначаўся на шляхецкія пасады. Такім чынам з'явіўся нясвіжскі Арлекін — дробны шляхціц, які гаварыў па-польску. Але, як і належыць шляхціцу «шарачковаму», яго мова была вельмі далёкай ад патрыцыянскай куртуазнасці. Напрыклад, раззлаваўшыся на Лауру, Арлекін мог назваць яе «паганкай», а ў добрым настроі адпусціць камплімент яе прыгажосці: сказаць, што яна «гладкая і белая, як спіна ў свінні». У камедыі «Загана ў цянётах» ён бліжэй за ўсё да народнай першаасновы. А якая ў Арлекіна багатая фантазія, як ён праводзіць інтрыгу, з якім размахам і «густам» (гэта ён заганяе ўпартага суддзю ў куфар, спалохаўшы яго да смерці паведамленнем , што варочаецца Банута і вядзе дахаты разам з братам усю сваю радню)! Арлекін, створаны У.Ф.Радзівіл, не толькі прастадушны, але і практычны, а ў пытаннях маралі — без асаблівых забабонаў. Напрыклад, ён ніяк не можа зразумець, чаму яго гаспадыня не згадзілася стаць палюбоўніцай на адзін вечар Урача, Суддзі і Губернатара, калі тыя, як ён падлічыў, паабяцалі ёй цэлых дваццаць тысяч дукатаў: «З-за такой дробязі губляць грошы! Падумаеш — зневажэнне! Нічога бы ад цябе не страцілася! Гэта крыўда не вялікая, быццам б табе прыснілася».

У 1746 г. княгіня Урсула стварае камедыю «Справа божага лёсу» («Вынік божага лёсу»), для якой выкарыстоўвае матыў папулярнай у Заходняй Еўропе цудоўнай казкі «Прынцэса ў хрустальнай труне». Гэта казка ў свой час была апрацавана Шарлем Перо і ў 1697 г. увайшла ў зборнік «Казкі маёй маці Гусыні» пад назвай «Спячая прыгажуня». У 1747 г. у княгіні з'явіўся новы твор, камедыя «Каханне — зацікаўлены суддзя», у аснову якога быў пакладзены антычны міф пра траянскага царэвіча Парыса і цудоўную Алену.

Неабходна адзначыць, што, звяртаючыся да антычных крыніц або іх тагачасных пераказаў, У.Ф.Радзівіл дастаткова вольна перапрацоўвала міфы: уводзіла новых персанажаў, змяняла імёны, ставіла акцэнты

на тым, што лічыла важным, і пакідала без увагі тыя падзеі, якія не змяшчаліся ў светаўспрыманні або ішлі ўразрэз з этыкай традыцыйнага шляхецкага сарматызму.

Камедыя «Каханне — зацікаўлены суддзя» была напісана, як і былыя творы, цяжкой рыфмаванай прозай. У п'есе была празмернасць дыдактычных сентэнцый і сентыментальных выказванняў і вельмі мала дзеянняў.

У.Ф. Радзівіл паказвае не ўсю гісторыю Парыса (трагічныя падзеі Траянскай вайны і яго смерць не ўвайшлі ў п'есу). Яна выбірае з «біяграфіі» героя найбольш рамантычныя і гераічныя падзеі, якія дазваляюць разгарнуць малюнак яго палюбоўных прыгод (з 1000 строф камедыі амаль трэць аддадзена любоўнай рыторыцы німфы Эноны і патэтычным разважанням пра каханне Алены і Парыса), паказаць гераізм і моц апошняга (сцэны перамогі над бандытамі на гары Ідзе, над знакамітымі сапернікамі на спаборніцтвах у Троі), а самае галоўнае — правесці думку пра тое, што суддзёй багінь, каханым німфы Эноны і мужам самай цудоўнай жанчыны Грэцыі — Алены, смелым пераможцам мог стаць толькі той, у каго ў жылах «блакітная кроў», г.зн. спадчынны патрыцый. Аўтар невыпадкова вуснамі пастуха Фаусціна, які выхоўваў Парыса, гаворыць даволі характэрную сентэнцыю: «пастух застанецца пастухом, а кароль каралём заўсёды будзе».

Відаць, Эноне свядома не адведзена належнага месца ў п'есе, хоць яна прысутнічае ў многіх сцэнах. У трактоўцы У.Ф.Радзівіл Парыс не павінен быў стаць мужам німфы (хоць у міфе ўсё наадварот: Энона была першай жонкай Парыса і нарадзіла яму сына), а толькі Алены. Тое, што Парыс украў жонку цара Менелая, не засмучала княгіню — «кесарава кесару». Такая інтэрпрэтацыя антычнага міфа адпавядала настроям нясвіжскага патрыцыята.

Трэба адзначыць, што княгіня зрабіла дзеючымі асобамі свайго твора не толькі ўсіх асноўных герояў міфа і жыхароў Алімпа, але і дадала да іх некалькі «канфідэнтак» і «канфідэнтаў», паслоў, бабу-варажбітку і алегарычную фігуру Разладу.

Пераказваючы паслядоўна падзеі міфа аж да аб'яўлення грэкамі вайны Троі, У.Ф.Радзівіл захавала тыя часткі падання, якія былі своеасаблівымі (напрыклад, сон Гекубы: ёй праснілася, што яна нарадзіла факел, ад якога ў полымі загінула Троя). У гэтым даволі яскрава адлюстравалася «барочнае» успрыняцце міфалогіі аўтарам. У той жа час яна змягчыла ўсе сітуацыі, у якіх назіралася жорсткасць царскіх асобаў. Касандра была прадстаўлена толькі як прадвесніца (у супярэчнасць міфу яна ніколі не рабіла замаху на жыццё свайго царствуючага брата). Іншымі словамі, трагічны пафас міфа аўтар пераявяла ў дастаткова бяскрыўдны бытавы план «ідэальных адносін», якія павінны былі панаваць, на яе думку, у сям'і патрыцыяў.

Калі разглядаць гэту «камедыю» ў асяроддзі іншых тэатральных з'яў XVIII ст., то няцяжка заўважыць у ёй дастаткова яскравы прыклад тэатральнага прымітыву. У творчым метадзе драматурга можна заўважыць і своеасаблівае «рэнесанснае» адлюстраванне гісторыі: захоўваючы канву антычнай легенды, У.Ф.Радзівіл фактычна ўсіх герояў апранае згодна са сваім часам, праектуючы на грэчаскі міф сваю эпоху з яе ідэаламі, этычнымі праблемамі, норавамі і звычаямі. Перанос увагі на асабістыя адносіны па-свойму адлюстроўвалі павевы XVIII ст., і антычныя сюжэты былі жаданай крыніцай для сентыменталізму, які нараджаўся. Княгіня Урсула надавала вялікую ўвагу жаночым персанажам, а ў канкрэтным выпадку — вобразу німфы Эноны. Ён становіцца сімвалам самаахвярнага, бязмежнага кахання да Парыса (нездарма ў міфе німфа кідаецца ў яго пахавальнае вогнішча), але кахання трагічнага і зняважанага.

Камедыя «Каханне — зацікаўлены суддзя» — тыповы прыклад мясцовага тэатральнага барока, для якога характэрна спалучэнне патэтыкі і прыземленага бытавізму. У гэтым плане таксама цікавы вобраз Эноны. Калі ахарактарызаваць стылістыку яе мовы, то відаць, што разам з высакамоўнымі і палкімі прызнаннямі, напісанымі ў лепшых традыцыях куртуазнасці, па-суседству знаходзіцца празаічны, «нізкі» пласт мовы. Збіраючы травы і кветкі на гары Ідзе — на полі, дзе змагаўся Парыс з ляснымі бандытамі, — Энона гаворыць сваёй «канфідэнтцы»: «Шукай, мая Сільвія, забароненыя травы. Лекавае маё зелле, якое нарадзілася на крывавым ратным полі. Лясны мак вельмі добры. Палын горкі з маяранам неабходны ад болю ў сэрцы. Гваздзік з цюльпанам — гарачку лечыць. Рута, божадрэўка, мята вылечыць, у каго па маладосці боль пячэ страўнік. Іеленія з язычкамі, ветоніка з мальвай кроў ачышчаюць таму, хто хутка вып'е ўсё з адварам гарбаты». Энона збірае лекавае зелле так, як гэта рабілі знахаркі-траўніцы ў часы У.Ф.Радзівіл; лясная німфа дае рэцэпты, якія, відавочна, узяты аўтарам з хатняга «лячэбніка».

Тэатр барока быў у першай палове XVIII ст. эмблематычным. Як школьная, так і аматарская сцэна гэтага часу ахвотна звярталася да розных знакаў і сімвалічных атрыбутаў, якія «тлумачылі» публіцы значэнне персанажа. Не мінула гэта і творы У.Ф.Радзівіл, пра што сведчыць гравюра М.Жукоўскага са сцэнай «Суд Парыса» з камедыі «Каханне — зацікаўлены суддзя». На гравюры перад Парысам стаяць антычныя багіні, як знатныя дамы часоў Людовіка XIV, а адзіным указаннем, што гэта жыхаркі Аліпма, былі сімвалы. На гравюры былі і наіўныя лубяныя дэталі — завітыя баранчыкі і «яблыка раздору», якое ў п'есе ўпамінаецца як залатое, яно на гравюры мела нават надпіс — «Самай найпрыгажэйшай».

У 1748 г. У.Ф.Радзівіл стварае сваю першую трагедыю пад назвай

«Суддзя, пазбаўлены розуму». Дзеянне адбываецца ў часы імператара Дыяклетыяна. У аснове сюжэта — гісторыя хрысціянскіх пакут сясцёр Агапіі, Хіоніі і Ірыны, якія загінулі за веру ад рук рымскіх салдат. Неабходна адзначыць, што змест трагедыі княгіні Урсулы супадае з сюжэтам п'есы для тэатра містэрыі — «Дульцыліус», якую ў Х стагоддзі стварыла лаціна-нямецкая паэтэса, манахіня-бенедыкцінка Хратсвіта Гандэрсгеймская. У «тлумачэнні» да яе п'есы гаворыцца: «Пакутніцтва св. дзяўчат: Агапы, Хіоніі і Ірыны, да якіх ціхай ноччу прабраўся патаемна суддзя Дульцыліус, які хацеў насыціцца іх хараством; аднак як толькі зайшоў да іх, страціў розум і замест дзяўчат ціскаў і цалаваў катлы і каструлі да такой ступені, што вельмі запэцкаў у чорны колер твар і адзенне. Потым загадаў свайму наследніку Сісініусу пакараць дзяўчат. Той жа быў незвычайным чынам ашуканы, але ў выніку загадаў Агапу і Хіону спаліць, а Ірыну застрэліць».

Усе апісваемыя падзеі цалкам увайшлі ў сцэнічны варыянт княгіні Урсулы, а асноўная ўвага надавалася велічы і стойкасці духу, які не змаглі пахіснуць ні ўгаворы змяніць рэлігію, ні катаванні і зневажанні, на знаках боскага заступніцтва. Так, салдаты, якім Дульцыліус загадвае зняславіць нявінніц, а затым «іх скуру папсаваць цярністымі розгамі», не змаглі сарваць з ахвяр адзенне, таму што сукенкі апошніх цудоўным чынам прыраслі да скуры». Акрамя таго, калі Агапія і Хіонія гінуць у вогнішчы, іх целы застаюцца неапаленымі; Ірыну, якую Сісініус на забаву адпраўляе ў «лупанар», выратоўваюць два анёлы ў абліччы салдат. Яны падымаюць яе на «недаступную» скалу, дзе яна ўсё ж гіне ад стралы, паспяваючы сказаць доўгі маналог пра шчаслівае аб'яднанне з богам. Цэнтральнай сцэнай у спектаклі стала вар'яцтва сладастраснага Дульцыліуса, у якога боскасць забрала розум.

Калі не лічыць вар'яцкіх маналогаў Дульцыліуса, дастаткова дасціпна распрацаваных У.Ф.Радзівіл, і ўстаўнога эпізода з Цэзарам, які загадаў выгнаць з палаца звар'яцелага суддзю, усё астатняе цалкам супадае з кананічным сюжэтам. Трагедыя «Суддзя, пазбаўлены розуму» — першы і апошні зварот У.Ф.Радзівіл да сярэдневяковай агіяграфіі. Але, з пункту гледжання засваення вопыту школьнай сцэны, гэты прыклад дастаткова характэрны, бо са школьнай тэатральнай практыкі быў запазычаны не толькі сюжэт, але і сімультацыйны прынцып дэкарацый — на сцэне сумяшчаліся адначасова кухня, турма і часоўня.

У 1750 г. княгіня Урсула паказвае нясвіжскаму гледачу адразу чатыры творы: «Золата ў полымі», «У вачах нараджаецца каханне», «Суцяшэнне пасля клопату» («Кансаляцыя ў клопатах») і «Гульні Фартуны».

Трагедыя «Золата ў полымі» была пастаўлена 13 студзеня 1750 г. у зноў адкрытым «камедыяхаузе», які хоць і быў узведзены за два гады да

гэтай падзеі, дакладней, перабудаваны з княжацкага манежа ў Нясвіжы, але затым (часова) быў закрыты, каб пабудаваць складаныя тэатральныя машыны і кулісныя станкі. У аснову свайго новага твора У.Ф. Радзівіл паклала драматычную навелу «Гісторыя пра Пшэмыслава, князя Асвенцімскага, і пра Цэцылію, незвычайна цярплівую жонку яго», якая ўваходзіла ў добра вядомыя ў той час «Сваркі сямейныя» Геroніма Морштына і, у сваю чаргу, была ні чым іншым, як пераносам на польскую глебу навелы Бакачыо пра цярплівую сялянку Грызэльду. Яе муж — маркіз Салуццо — падвяргаў яе жорсткім выпрабаванням, з якіх яна выходзіла з гонарам. У перапрацоўцы У.Ф.Радзівіл навела набыла новыя акцэнты, з-за таго што яна пераклала дзеянне на мову вершаванага драматычнага твора, і твор набыў новую, дастаткова незвычайную форму. Аўтар адмовілася ад «класічнай» пабудовы трагедыі і драматычныя сцэны «перамяшала» ў поўным сэнсе гэтага слова з жартаўлівымі пастухоўскімі сцэнамі — «пастарэламі» і балетнымі ўстаўкамі.

І зноў Урсула як бы праектуе сваю эпоху на норавы і звычаі часоў Бакачыо, а ад Г.Морштына захоўвае толькі імёны і канву апавядання. Усё астатняе ў трагедыі робіць сваім, звычайным — сармацкім. Італьянская сялянка Грызэльда атрымлівае ў нясвіжскім варыянце не толькі новае імя — Цэцылія, але і новае сацыяльнае становішча — шляхецтва. Аднак і гэтага аказвалася вельмі мала: Урсула Радзівіл прыдумвае сваёй гераіні новую «біяграфію»: Цэцылія не проста шляхцянка, але і прадстаўніца знакамітага роду. Гераіня гаворыць, што яе бацька, калі служыў у князя, быў « адважным рыцарам у баі» і хадзіў у «сенатарскім званні», але ўсё згубіў «праз фальшывыя паклёпы і майстэрскую хлусню» ворагаў-прыдворных. «Шляхецкі гонар» не дазваляў яму апусціцца нізка, ён быў вышэй за апраўданні і зневажэнні, цяпер, са слоў Цэцыліі, маці вымушана «воўну часаць і ткаць палатно на адзенне», а бацька «хлеб на раллі збірае ледзь жывы ад голаду».

Цікава заўважыць, што пачынаючы менавіта з гэтага твора У.Ф. Радзівіл імкнецца да псіхалагічнай матывацыі паводзін герояў. Яшчэ далёка да шматграннага паказу характараў, але яскрава бачна жаданне падкрэсліць у кожным персанажы тое, што з'яўляецца галоўным і натуральным, што акрэслівае ўчынкі. Так, бацька Цэцыліі — Тэафіл — паўстае як выразнік і носьбіт «пазітыўных» каштоўнасцей шляхецтва (як і разумела, і сцвярджала ў сваіх творах княгіня Урсула). У трагедыі Тэафіл горды, высакародны і далікатны, для яго характэрна пачуццё ўласнай годнасці. Ён гатовы «хоць у подлай хаце, але сумленна жыць і сумленна зарабляць свой хлеб». Ён гнеўна адмаўляецца ад прапановы Пшэмыслава забраць яго дачку (памылкова зразумеўшы жаданне князя бачыць Цэцылію не жонкай яго, а палюбоўніцай).

Характарыстыка «годнасцей» Цэцыліі (яна верная, дабрачынная,

сарамлівая, паслухмяная, будзе ціхая ў шлюбе і, самае галоўнае, «не вераломная»), не разыходзіцца з першакрыніцай. Адзінае, што дадае новага ў яе характар У.Ф.Радзівіл, дык гэта тое, што ёй цяжка ад яе становішча і яна, як належыць гордай шляхцянцы, «жадае памерці адразу, чым жыць у нястачы і чакаць смерці». Ва ўсім астатнім Цэцылія не адрозніваецца ад Грызельды Бакачыо: яна безадказная, стойка пераносіць удары лёсу, успрымае выпрабаванні без нараканняў — іншымі словамі, Урсула Радзівіл стварае чарговы варыянт жанчыны, якая кахае, што вельмі характэрна для яе творчасці.

Галоўны герой зусім іншы ў параўнанні з персанажам Бакачыо. У навеле «Дэкамерона» маркіз Гвальтэры Салуцца браў жонкай Грызэльду і змог «угадаць яе вялікую годнасць, схаваную за рыззём і сялянскім адзеннем». Князь Пшэмыслаў у тлумачэнні У.Ф.Радзівіл больш за ўсё занепакоены тым, што на яго «вялікакняжацкім ложку» будзе «убогая шляхцянка» і што такі саюз зняважыць яго гонар. Гэтымі меркаваннямі і кіруецца ён у сваіх паводзінах, шукае ім апраўданне: ужо калі ён ідзе на такую ахвяру, то павінен сам упэўніцца, што Цэцылія будзе без пярэчання выконваць яго волю, любое жаданне, капрыз, жорсткае недарэчнае жаданне. На працягу трагедыі Пшэмыслаў не толькі гаворыць, але і дзейнічае ў адпаведнасці з гэтым. Страшэнныя і зняважлівыя іспыты і ў Бакачыо, але яго маркіз больш стрыманы, там няма нават намёку на тыя агідныя словы, з якімі Пшэмыслаў звяртаецца да Цэцыліі пасля нараджэння дачкі:

«Покажи, Цецилия, плод мой! Ребенка,
Осквернившего Честь мою, отравившего Славу!
Ты только шляхтяночка и раба моя!
Взвесь это, подлая, и следуй за своим господином!
Разве можно, чтобы жило твоей крови потомство,
Которое Честь и Государство целое обгадило!»

З'яўленне наследніка ён «вітае» падобнымі словамі:

«Покажи мне сына, оскорбившего мое ложе!
Разве можно на трон посадить нищего?»

Затым наступае момант, калі князь выганяе Цэцылію «з сорамам, карай і секвестрам». Фінал трагедыі нічым не адрозніваецца ад падзей, расказаных у навеле Бакачыо і ў яе польскім пераказе Г.Морштына: гераіню варочаюць дахаты, знаёмяць яе з ужо пасталеўшымі дзяцьмі, і ўсё заканчваецца святкаваннем. Пшэмыслаў прапаноўвае гасцям патанцаваць, і пачынаецца апошняя «пастарэла».

Чаму У.Ф.Радзівіл абірае менавіта гэту навелу, але захоўвае польскія імёны, дадзеныя Г.Морштынам? Верагодна, у гэтым можна ўбачыць жаданне аўтара, які імкнецца, каб шмат хто з саноўных гледачоў убачылі сябе ў жорсткім Пшэмыславе. Яго прататыпы былі і ў сям'і Радзівілаў. Вярхі шляхты паводзілі сябе ў асабістым жыцці разбэшчана і не адрозніваліся маральнай чысцінёй, жорстка паводзілі сябе з блізкімі. Але была, верагодна, і іншая прычына: у кожнай гераіні княгіня Урсула бачыла сябе і незнарок надзялялі яе сваімі рысамі.

Іншыя творы У.Ф.Радзівіл, згодна з класіфікацыяй Ю.Кшыжаноўскага, неабходна аднесці да таго кола твораў, які можна акрэсліць як «антычна-усходне-пастаральны». На Кіпр пераносіць падзеі У.Ф. Радзівіл, калі ў камедыі «У вачах нараджаецца каханне» гаворыць пра перапетыі двух закадычных сяброў — караля Паліксена і князя Філаксіпа. На Кіпры адбываюцца падзеі і іншай камедыі У.Ф.Радзівіл — «Суцяшэнне пасля клопату», а 15 жніўня ў нясвіжскім «камедыяхаузе» гледачам была паказана апошняя камедыя княгіні Урсулы — «Каханне — цудоўная майстрыца». Сюжэт свайго твора княгіня Урсула таксама запазычыла ў Г.Морштына з яго «Сварак сямейных». У гэтым празаічным зборніку была навела «Пра Галезюша, сына Дэмакрыта, і Філіду, дачку Арыстыдзеса, шляхціца Кіпрскага каралеўства». У яе аснову пакладзена фабула навелы «Дэкамерона», якую Г.Морштын напоўніў польскімі матывамі.

Урсула Радзівіл пайшла далей. У яе вершаванай інтэпрэтацыі ад рэнесанснай авантурнай навелы мала што засталося. Яна захавала толькі галоўнае — ідэю пра тое, што сапраўднае каханне можа змяніць чалавека: дурнога прымусіць узяцца за розум, баязліўца пераўтварыць у адважнага воіна, а прастафілю і невука — у адукаванага чалавека.

Што ж датычыцца твораў, створаных княгіняй Урсулай у 1752 г., то яны маюць непасрэднае дачыненне да оперы. Менавіта ў гэтым годзе яна піша «камедыі» цалкам са «спевамі», якія ставяць у Нясвіжы. Першая з іх — аднаактная опера. Яна называлася «Шчаслівае няшчасце», расказвала пра гісторыю выкрадання Еўропы Зеўсам, па жанры была вельмі блізкай да папулярнай у XVIII ст. оперы-лібрэта. Другі твор — гісторыка-легендарная опера ў 5 актах «Сляпое каханне не думае пра вынікі». У аснову яе сюжэта пакладзены грэчаскі міф пра цара Мегары Ніса і яго дачку Скіллу і крыцкага цара Міноса. Што гэта былі за оперы, цяжка сказаць. Магчыма, што ў іх, як ў зінгшпіле або французскай камічнай оперы, музычныя нумары перапляталіся з размоўнымі дыялогамі. Музыку да іх пісаў скрыпач Ян Цэнтыловіч, прыгонны Радзівілаў, якога яны паслалі вучыцца ў Рым і які, калі вярнуўся ў Нясвіж у 1751 г., узначаліў прыдворную капэлу.

У 1753 г. княгіні Урсулы не стала: 23 мая яна памерла ў маёнтку

Пунцэвічы каля Наваградка. Пасля яе смерці тэатральнае жыццё заціхае ненадоўга. Князь Рыбанька захапіўся маладой удавой, пляменніцай Урсулы — Ганнай Мыцельскай і для яе забавы загадваў зноў адкрыць тэатральныя памяшканні ў Жолкве і Алыцы (на Украіне), пашырыць склад капэлы, запрасіць прафесійных акцёраў, арганізаваць балет і стварыць спецыяльную школу.

Што ж датычыцца пастановак твораў У.Ф.Радзівіл, то яны былі апошнімі ў гісторыі мясцовай сцэны і пасля смерці князя Рыбанькі ў 1762 г. больш не ставіліся. Драматургія княгіні Урсулы, архаічная па форме і мове, якая развівалася абасоблена і імкнулася да містэрый і казак, да арыенталізму, вобразам-маскам камедыі дэль артэ, выканала сваю гістарычную місію і стала тэатральнай рэліквіяй. Яе п'есы выклікалі цікавасць сваёй праблематыкай толькі ў вузкім коле радзівілаўскага акружэння, а пасля стварэння прыдворнага тэатра былі забытыя нават у нясвіжскім асяроддзі: яны назаўсёды перайшлі ў бібліятэку замка і выклікалі цікавасць даследчыкаў толькі ў XX стагоддзі.

Літаратура:

1. Барышев Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII века. Мн., 1992.


2. Krzyżanowski J. Talia i Melpomena w Nieświeżu: Twórczość U.F.Radziwiłłowej // Pamiętnik Teatralny. 1961, ą 3.

3. Sajkowski A. Od Sierotki do Rybeńki. Poznań, 1965.

4. Teatr Urszuli Radziwiłłowej. Warszawa, 1961.

Гурый Барышаў

Міхал КАРЫЦКІ
(1714—1781)



На літаратурным даляглядзе Беларусі XVIII ст. постаць новалацінскага паэта Міхала Карыцкага вымалёўваецца рэльефна і важка. Яго творчасць мае своеасаблівую каштоўнасць для нашых часоў. У эпоху Асветніцтва, калі Еўропа разам з высокім памкненнем да спасціжэння праўды і гармоніі, да ўсталявання справядлівасці і разумнасці ў грамадскім жыцці ўспрыняла спакусу пазітывізму, спакусу «вызвалення» ад Бога, Карыцкі не паддаўся гэтай аблуднай плыні, скіраванай на дэсакралізацыю чалавека, прыроды і сусвету, і застаўся паэтам хрысціянскім. Сваім жыццём і творамі ён паказаў, што святасць неадрыўная ад самой сутнасці мікра- і макракосмаса ў іх адзінстве, што розум без веры не можа прывесці да ісціны.

Карыцкі — паэт-філосаф і разумеў філасофію не як абстрактнае мудраванне, а ў яе першасным значэнні — як жыццё паводле спазнанай праўды. Паэт-працаўнік, ён ахвяраваў усё сваё жыццё школе, хрысціянскаму выхаванню і ўдасканаленню адукацыі. Да апошняй хвіліны не выпусціўшы з рук пяро, ён нястомна адточваў і шліфаваў свае літаратурныя творы, даводзячы іх да філіграннага ўзроўню.

Нарадзіўся Міхал Карыцкі 7 верасня 1714 г. у спадчынным маёнтку Дзітрыкі Лідскага павета Віленскага ваяводства ў не вельмі багай шляхецкай сям'і.

Пра бацькоў паэта вядома толькі тое, што бацьку звалі Аляксандрам, а маці Тарэзай. У элегіі «Да брата Караля» Карыцкі згадвае таксама сваіх братоў Анупрэя, Луку, Сымона, Андрэя і Караля. Найбольш знакаміты з іх быў апошні, які задоўга да з'яўлення праграмнай кнігі

С. Канарскага «Аб выпраўленні заганаў красамоўства» (1741), прадвесніцы класіцызму ў Рэчы Паспалітай, зрабіў вялікі ўклад у распрацоўку тэорыі аратарскага мастацтва гэтага накірунку, а пазней — у абнаўленне сістэмы адукацыі.

Дзіцячыя гады Міхал правёў у маёнтку бацькоў, а затым быў выпраўлены на навучанне ў Бабруйскую езуіцкую рэзідэнцыю, пры якой тады існавала школа. Езуіцкія навучальныя ўстановы мелі агульную назву «калегіум» і, фактрычна, аб'ядноўвалі дзве ступені адукацыі: сярэдняй школы — «гімназію» і вышэйшай, дзе вывучаліся філасофія і тэалогія. Гімназічнае навучанне доўжылася 7—8 год і складалася з паслядоўных курсаў граматыкі, паэтыкі і рыторыкі. Адукацыя езуітаў, як і наогул уся тагачасная еўрапейская, у т. л. і беларуская, мела класічны характар. Гэта значыць, што асноўным яе зместам было вывучэнне лацінскай і грэцкай моваў, антычнай літаратуры, міфалогіі, паэтыкі і рыторыкі. Езуіцкая школа грунтавалася на прынцыпах рэнесанснай педагогікі і мэту навучання бачыла ў «вучонай і красамоўнай пабожнасці» (docta et eloquens pietas). Гімназія вучыла сваіх выхаванцаў дасканальнаму валоданню лацінскай мовай, якая тады лічылася мовай навукі і літаратуры.

Бабруйская рэзідэнцыя была заснавана яшчэ ў 1627 г., але пазней з-за ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі падчас вайны 1654—1667 гг. і Паўночнай вайны на пачатку XVIII ст. перапыняла сваю дзейнасць. Школа пры ёй, зачыненая ў 1715 г., аднавілася толькі ў 1725 г. з класамі граматыкі, паэтыкі і рыторыкі. Верагодна, што ў гэтым годзе і з'явіўся тут Міхал Карыцкі. Яшчэ да гэтага прыватна альбо іншым шляхам ён павінен быў атрымаць пачатковую адукацыю, бо езуіты пачатковым навучаннем не займаліся.

У Бабруйску будучы паэт здабыў някепскія веды ў лацінскай мове, паэтыцы і рыторыцы. Магчыма, ужо тут у яго абудзіўся паэтычны дар, бо ў класах паэтыкі і рыторыкі ўсе выхаванцы вучыліся складаць прамовы і вершы на лацінскай мове. Выхаванне ягонага паэтычнага майстэрства адбывалася, відаць, ужо пазней — у Віленскай акадэміі.

7 чэрвеня 1730 г. у Вільні Міхал уступае ў езуіцкі ордэн. Гэты крок адкрыў яму шлях да вышэйшай адукацыі і духоўнага ўдасканалення. Паспяхова прайшоўшы выпрабаванні ў навіцыяце (1730—1731), Карыцкі быў накіраваны ў Слуцк для атрымання педагагічнай адукацыі (1732—1733). Тут ён пазнаёміўся з Антоніем Скарульскім, пазней вядомым аўтарам падручніка па філасофіі і выдатным матэматыкам, разам з якім ён потым займаўся мадэрнізацыяй школьнай сістэмы.

У 1733 г. паэт прыехаў у Вільню для вывучэння ў акадэміі курса філасофіі, які доўжыўся тры гады і ахопліваў логіку, фізіку і метафізіку.

Апрача таго, студэнты штудыявалі этыку, вышэйшую матэматыку ды іншыя прадметы. Вывучаліся і ўсе асноўныя еўрапейскія мовы. Віленская езуіцкая акадэмія ў той час адрознівалася вельмі высокім узроўнем адукацыі і пераўзыходзіла другі універсітэцкі цэнтр Рэчы Паспалітай — вядомую Кракаўскую акадэмію.

Група, у якой вучыўся Міхал, была невялікаю: апрача яго вядомыя імёны яшчэ пяці чалавек, сярод іх варта адзначыць Людвіка Сестравітоўскага. Хутчэй за ўсё, гэта ён з'яўляецца адрасатам оды Карыцкага «Да Людвіка, які гасцюе ў паэта». Мяркуючы па назве і цёпламу тону сутвора, Людвік быў сябрам Карыцкага. Іх магло збліжаць не толькі сумеснае навучанне, але і агульныя літаратурныя інтарэсы: абодва мелі паэтычны дар і пісалі лацінскія вершы.

У 1736 г. паэт скончыў філасофскі факультэт, бліскуча здаўшы ўсе іспыты ды атрымаўшы ад экзаменатараў наступную цікавую характарыстыку: «здольныя ўсе, а асабліва апошні, які пераўзыйшоў усіх» (Карыцкі здаваў экзамен апошнім).

Пасля заканчэння філасофскага факультэта ўсе выпускнікі звычайна накіроўваліся выкладчыкамі ніжэйшых класаў у калегіумы Беларусі. Карыцкі, як самы здольны, быў пакінуты ў Віленскай акадэміі, дзе ў 1736— 1738 гг. выкладаў граматыку ў першых класах.

У 1738 г. яго перавялі ў Варшаўскі калегіум, які адміністратыўна належыў да Літоўскай езуіцкай правінцыі, на пасаду выкладчыка паэтыкі. У гэтым жа калегіуме з 1739 г. ён становіцца студэнтам тэалагічнага факультэта. Тэалогія ў калегіумах і акадэміі вывучалася 4 гады, прычым курс дысцыплінаў уключаў не толькі багаслоўе, але і розныя іншыя гуманітарныя навукі. У 1742 г. Карыцкі вяртаецца ў Віленскую акадэмію, каб прадоўжыць тут вывучэнне тэалогіі. Сярод выкладчыкаў, якія маглі весці ў паэта некаторыя прадметы, вылучаліся Марцін Быстрыцкі, чалавек перадавых поглядаў і вядомы ў Еўропе матэматык, а таксама Фелікс Вяржбіцкі, цудоўны педагог, выкладчык старагабрэйскай мовы. За год да заканчэння акадэміі Міхал прыняў святарскі сан, а ў 1743 г. здаў іспыт за ўвесь курс тэалогіі.

Скончыўшы курс тэалогіі і атрымаўшы вышэйшую свецкую і духоўную адукацыю, ён мусіў яшчэ адзін год быць у так званым «доме трэцяй пробы» ў Вільні, каб падрыхтавацца да будучай пастырскай і педагагічнай дзейнасці. Тут ён зноў апынуўся разам з Антоніем Скарульскім, і магчыма тады ў іх канчаткова акрэсліліся планы ўдасканалення езуіцкай педагогікі.

Наведваючы лекцыі знакамітых прафесароў, пад час навучання ў Вільні і Варшаве, Карыцкі меў магчымасць пазнаёміцца з дасягненнямі сусветнай навукі, з новымі ідэямі, вывучыць новыя і старажытныя мовы, матэматычныя і гуманітарныя дысцыпліны. Усё гэта знайшло потым сваё

ўвасабленне ў ягонай асветніцкай дзейнасці і паэтычнай творчасці. У 1744 г. паэта накіроўваюць выкладчыкам паэтыкі і рыторыкі ў Мінскі калегіум. А ў 1745/46 навучальным годзе ён зноў апынуўся ў Віленскай акадэміі, дзе выкладаў рыторыку і атрымаў ступень магістра філасофіі і вызваленых навук.

Якраз тады ў выкладчыцкіх колах разгарэлася спрэчка пра стыль у рыторыцы, што азначала фармаванне новых класіцыстычных поглядаў у літаратурнай тэорыі. Пасля працяглых дэбатаў генерал ордэна езуітаў Францішак Рэтц сваім рашэннем перапыніў дыскусію, прадпісаўшы браць за ўзор Цыцэрона і карыстацца новым падручнікам Ювэнцыя. Гэта быў прагрэсіўны крок, які адпавядаў новым павевам. Выхаванне кадраў маладых настаўнікаў на аснове прадпісанняў генерала даручылі Карыцкаму. Дзеля гэтага яго накіравалі прафесарам у Слуцкую семінарыю, дзе ён працаваў два гады (1746—1748).

2 лютага 1748 г. Карыцкі склаў чацвёрты шлюб (абет) і тым самым атрымаў магчымасць займаць самыя высокія пасады ў ордэне. У 1748—1750 гг. ён знаходзіўся ў Пінскім калегіуме, а з 1750 г., пасля атрымання навуковай ступені доктара філасофіі, працаваў у Віленскай акадэміі прафесарам і сеньёрам філасофскага факультэта (1750—1755). Сярод яго слухачоў быў знакаміты пазней пісьменнік-асветнік Адам Нарушэвіч.

У 1756—1763 гг. Карыцкі выкладаў у розных калегіумах Беларусі і Польшчы: Варшаве, Драгічыне, Мінску, Нясвіжы. У 1763 г. яго прызначылі рэктарам Варшаўскага калегіума. Пад ягоным кіраваннем працавалі выдатныя дзеячы Асветніцтва Ян Альбэртрандзі, Францішак Багамолец, Стэфан Лускіна. У той час пры калегіуме існаваў таксама свецкі калегіум для шляхты, дзе выкладалі Караль Вырвіч і Адам Нарушэвіч. Кантакты з гэтымі прагрэсіўнымі людзьмі, агульны дух, што панаваў у школах, як найлепш адпавядалі поглядам Карыцкага. Менавіта пры ягоным рэктарстве дасягнуў росквіту Варшаўскі свецкі калегіум для шляхты, у ім атрымалі развіццё розныя навукі. З гэтага ж часу пачынаецца перыяд актыўнай паэтычнай творчасці Карыцкага: выходзяць асобнымі выданнямі эпіграмы на Младзяёўскага і на каранацыю Станіслава Аўгуста, элегія да Антонія Пшэздзецкага. А крыху пазней, у 1766 г., з'явіўся лацінскі зборнік Яна Яноцкага «Выбранае з польскай літаратуры», дзе былі надрукаваныя дзве згаданыя эпіграмы і яшчэ шэсць новых твораў. Перадрукоўка ў зборніку двух раней апублікаваных вершаў сведчыць пра прызнанне таленту паэта, пра рост ягонай папулярнасці.

6 верасня 1766 г. Карыцкі заняў пасаду кіраўніка Мазавецкай правінцыі. Як вядома, тэрытарыяльна езуіцкі ордэн падзяляўся на асістэнцыі, а асістэнцыі — на правінцыі. Тэрыторыя Беларусі ахоплівалася

дзвюма правінцыямі — Літоўскай і Мазавецкай, якія ўваходзілі ў польскую асістэнцыю. Прапрацаваўшы шмат гадоў у калегіумах Беларусі і Польшчы, Міхал Карыцкі добра бачыў усе іх недахопы і таму адразу ж пасля прызначэння, пры падтрымцы брата Караля, у той час польскага асістэнта, пачаў актыўна працаваць над удасканаленнем адукацыі. Карыцкі ўвёў іспыты па прадмету і методыцы навучання для кандыдатаў у выкладчыкі, адмяніў састарэлы метад дыктавання лекцый і прадпісаў шырока выкарыстоўваць падручнікі. Апроч таго, ён разаслаў рэктарам калегіумаў анкету з 17 пытанняў па ўсіх аспектах дзейнасці выкладчыкаў. Ён клапаціўся таксама пра забеспячэнне студэнцкіх бібліятэк найноўшай літаратурай у розных галінах навукі, выпісваючы некаторыя кніжкі з-за мяжы. Вялікая ўвага звярталася і на маральнае выхаванне моладзі, асабліва вучняў, якія жылі ў канвіктах (інтэрнатах).

У 1770 г. паэт пакінуў пасаду правінцыяла і ў 1770—1771 гг. выконваў абавязкі кансультанта ў Полацкім калегіуме, а затым быў пераведзены ў Бабруйск, дзе працаваў прапаведнікам і прэфэктам школьнай бібліятэкі. Прычына перамяшчэння Карыцкага з кіраўніка правінцыі на даволі сціплую пасаду ў Бабруйску нам невядомая, але можна меркаваць, што ягоная актыўная асветніцкая дзейнасць не зусім падабалася некаторым кансерватыўным колам ордэна. Магчыма, часткова будзе слушным выказванне беларускага паэта XIX ст. Уладзіслава Сыракомлі: «Міхал Карыцкі, чалавек з вялікімі заслугамі перад навукаю, якога разам з ягоным братам Каралем, таксама езуітам, Альбертрандзі лічыў першымі аднаўляльнікамі навук і добрага густу ў езуітаў і менавіта ў Літве (Беларусі — *А.Ж.*) да таго ж значна раней, чым Канарскі выступіў са сваім знакамітым творам. Але езуіты не спяшаліся з рэформаю. Ведаючы пра талент Карыцкага, яны тым не менш далі яму марнець на прапаведванні ў Бабруйску...»*.

У 1773 г., пасля скасавання езуіцкага ордэна, Адукацыйная камісія, утвораная на ягонай матэрыяльнай аснове, забрала школьныя ўстановы з-пад апекі духавенства і, улічваючы прагрэсіўныя погляды Карыцкага, ягоную былую дзейнасць па абнаўленні адукацыйнай сістэмы, а таксама вялікі педагагічны досвед, запрасіла яго на пасаду прэфекта Мінскага калегіума, які неўзабаве быў пераўтвораны ў ваяводскую школу.

Відавочна, што і на пасадзе правінцыяла, і пад час побыту ў Полацку і Бабруйску Карыцкі не пакідаў займацца паэзіяй. У 1771 г. выйшаў другі зборнік Яна Яноцкага «Новыя творы сармацкіх музаў», куды ўвайшлі пяць новых твораў паэта: панегірык, дзве элегіі і дзве эпіграмы.

У Мінску асветнік працаваў да самай пенсіі, займаючыся амаль выключна школьнымі справамі. Яго новыя вершы, датаваныя 1780—1781 гг.,

* Syrokomla W. Mińsk // Teka Wileńska. 1858. Nr. 1-2. S. 128.

былі надрукаваны, відаць, ужо пасля таго, як ён па стану здароўя пакінуў працу ў школе. У апошні год працы ў Мінскай ваяводскай школе паводле ўказу караля Станіслава Аўгуста, вялікага знаўцы і аматара літаратуры, Карыцкі быў узнагароджаны пачэсным медалём Merentibus (заслужаным). У сваім звароце да паэта кароль прапанаваў яму выдаць за каралеўскі кошт збор твораў. Аднак у тым жа 1780 г. здароўе Карыцкага значна пагоршылася. 13 чэрвеня ён па хваробе быў вызвалены ад пасады.

На пачатку наступнага года Карыцкаму была прызначаная пажыццёвая пенсія, якая павінна была выплочвацца з 1 красавіка. Аднак скарыстацца ёю яму ўжо не давялося, бо 10 сакавіка 1781 г. жыццё паэта абарвалася. Нават у хвіліну смерці паэт застаўся верны асветніцкім ідэалам, бо ўсю сваю небагатую маёмасць ахвяраваў на патрэбы Мінскай школы, дзе выкладаў у апошнія гады свайго жыцця.

Літаратурная спадчына М. Карыцкага складаецца з вялікай колькасці вершаў, лістоў і аднаго казання, якое аднак прыпісваецца таксама і ягонаму брату Каралю. Карэспандэнцыя паэта, што захоўваецца ў архівах Вільні, Кракава і Масквы, змяшчае мала інфармацыі пра яго жыццёвы і творчы шлях.

На сённяшні дзень вядома 25 вершаваных твораў Карыцкага, выдадзеных прыжыццёва: 11 з іх выйшлі асобнымі выданнямі, 12 апублікаваныя ў зборніках Яна Яноцкага, а два — асобна і ў зборніках Яноцкага.

Мяркуючы па ўсім, прыжыццёвыя вершы асветніка карысталіся папулярнасцю і таму выдаваліся вялікімі накладамі. Творы арганічна ўліваліся ў літаратурны працэс у Беларусі і ва ўсёй Рэчы Паспалітай, чыталіся тут, пэўным чынам уплываючы на розум і пачуцці сучаснікаў паэта.

Першыя з яго датаваных вершаў, відаць, — «Аўстрыйскі Марс» (1756—1757) і «Дыфірамб» (1757). Апошні вядомы паэтычны твор, надрукаваны пры ягоным жыцці ў 1781 г., — «Песня», адрасаваная Кацярыне II.

Амаль праз чатыры дзесяцігоддзі пасля смерці Карыцкага ягоная творчая спадчына была ўпарадкавана і выдадзена Полацкай акадэміяй, куды аўтар пераслаў яго незадоўга да смерці. Полацкі зборнік пад назваю «Carmina» (Песні) выйшаў у 1817 г. і налічваў 155 старонак. Ён адкрываецца кароткаю прадмоваю пад назваю «Звесткі пра жыццё і творы аўтара», дзе змяшчаецца таксама вершаванае прысвячэнне Карыцкага свайму мецэнату і апекуну каралю Станіславу Аўгусту. Далей ідуць вершы, згрупаваныя паводле жанрава-метрычных асаблівасцяў. У першую частку ўключаны эпіка-панегірычныя творы. За выключэннем «Дыфірамба», усе яны напісаныя дактылічным гекзаметрам. Другая частка складаецца з элегіяў,метрычна ўвасобленых у памеры элегічнага дыстыху. У трэцяй — сабраныя оды, пераважна гарацыянскія паводле памераў (толькі другая палова шостай оды напісаная леанінамі). І, нарэшце, апошнюю, чацвёртую, частку зборніка склалі эпіграмы, напісаныя

элегічным дыстыхам. Завяршае гэты раздзел і ўвесь зборнік эпітафія Кацярыне ІІ.

У кнігу ўвайшло 86 паэтычных твораў: 18 эпічных, 15 элегій, 13 од і 40 эпіграм. Творы першай часткі, куды ўключаны эпічная паэма «Птушыны сойм» і 17 панегірычна-сільвічных вершаў, паводле сваёй тэматыкі і адрасатаў можна падзяліць на такія групы: прысвечаныя Кацярыне ІІ і яе саноўнікам (7 твораў), каралю Станіславу Аўгусту (3), паэтычныя водгукі на пажар у Вішневе (1) і на абранне беларускага астранома Марціна Пачобута-Адляніцкага рэктарам Віленскай акадэміі (1), прысвечаныя лёсу езуіцкага ордэна (2), нарэшце, сатырычнае пасланне, адрасаванае невядомаму паэту (1), а таксама вершы, прысвечаныя Радзівілам: «Аўстрыйскі Марс» і «Дыфірамб». Усе творы гэтай часткі звернуты да асобаў, якія займалі высокае становішча, напісаны з нагоды значных падзеяў у жыцці краіны. У жанравых адносінах склад першай часткі даволі разнастайны: апроч эпічнай паэмы сюды ўвайшлі творы ўласна панегірычныя, а таксама «фабула» (байка), «дырэ» (дакор, праклён), эклога і сатыра, якія часцей адносіліся тагачаснымі паэтыкамі да сільвічных жанраў, але часам вылучаліся асобна. Аднак усе гэтыя жанры згодна з паэтычнымі канонамі класіцызму ўваходзілі як падвіды ў агульнае паняцце эпічнай паэзіі.

З літаратурнага боку найбольш цікавая ў першай частцы паэма «Птушыны сойм». Яна напісана з нагоды абрання Станіслава Панятоўскага каралём Рэчы Паспалітай у 1764 г., відаць, адразу ж пасля элекцыі. Паэма ўяўляе сабой разгорнутую алегорыю, дзе кароль паказаны ў выглядзе арла, а выбарчы сойм — у вобразе птушынага злёту.

Фабула паэмы даволі суладная. Птушкі, якіх паўсюль чакаюць няшчасці, разумеючы, што прычынаю іхніх нягодаў ёсць анархія, адсутнасць адзінага, мудрага і справядлівага важака, вырашаюць абраць яго са свайго асяроддзя. Зляцеўшыся на агульны сход, яны прыходзяць да высновы, што адзіна вартымі тытулу важака могуць быць толькі арлы — яны паўстаюць перад чытачамі як адважныя ваяводы, справядлівыя суддзі і мудрыя кіраўнікі. Абранне аднаго з арлоў, г. зн. Станіслава Панятоўскага, каралём і агульны трыумф з гэтай нагоды завяршаюць паэму.

Апавяданне ў «Птушыным сойме» складаецца з шэрагу эпізодаў, якія пераходзяць адзін у адзін, перапыняюцца маналогамі і дыялогамі персанажаў, апісаннямі. Пасля зачыну ідзе пераказ нягодаў птушак, якія ў сваіх маналогах наракаюць на розныя жыццёвыя небяспекі. Яны ўсведамляюць, што прычына гэтага — у бязуладдзі і празмернай вольнасці, адсутнасці адзінага моцнага кіраўніка. Адна з птушак праслаўляе асобу ўладара. Іншыя, паслухаўшы яе, вырашаюць абвясціць пра агульны сход, каб абраць сабе гэткага правадыра.

Наступнае падрабязнае апісанне месца сходу і прыбыцця яго ўдзель-

нікаў істотна запавольвае ход дзеяння, але ў выніку ствараецца выразны фон, на якім будуць разгортвацца далейшыя падзеі, чытач знаёміцца з асноўнымі дзеючымі асобамі. Пералік персанажаў завяршаецца на паўліне. Ягоная рэпліка, дзе выказаная прэтэнзія на пасад, і адказ сходу, які адхіліў дамаганні ганарлівай птушкі, выклікае актыўную рэакцыю вароны, якая ў сваёй прамове прадказвае будучае панаванне арлоў. Недавер сходу да прарочых слоў прадказальніцы і высоўванне іншых кандыдатураў — гэта ключавы момант развіцця дзеяння, які вызначае далейшы ход падзеяў у паэме. Цяпер арлам застаецца толькі даказаць свае права на пасад.

І тут сход перапыняецца надыходам ночы. Скарыстаўшыся цемраю, на чараду галубоў, што спыніліся на начлег, нападае пугач. Птушкі ловяць драпежніка і судзяць яго. Пры гэтым арлы дэманструюць сваю судовую мудрасць, справядлівасць і непахіснасць. Яны выносяць пугачу смяротны прысуд.

Пасля пакарання сход узнаўляецца, але зноў перарываецца нападам куніц. Арлы зараз жа ўступаюць у бітву з небяспечным ворагам і дзякуючы адвазе і вайсковай хітрасці адольваюць яго.

Зноў збіраецца сход і зноў спыняецца — цяпер ужо з прычыны навальніцы. Сярод агульнай разгубленасці і жаху толькі арлы застаюцца спакойнымі і непарушнымі, затуляюць сваімі крыламі ад дажджу палахлівых птушак.

Пасля заканчэння навальніцы на сойме выступіў папугай, які ўславіў цноты, толькі што выяўленыя арламі. Ён прапанаваў абраць каралём кагосці з іх. Сход аднадушна прымае гэтую прапанову. Завяршаецца паэма апісаннем агульнага святкавання і радасці.

Галоўны герой паэмы — зборны. Гэта арлы, якія сімвалізуюць сабою род Панятоўскіх. Толькі ў фінале з іх вылучаецца адзіны абраннік, пад якім разумеецца Станіслаў Панятоўскі.

Характарыстыка арлам даецца праз іх дзеянні. Тыпізацыя цалкам адпавядае класіцыстычнаму ідэалу кіраўніка дзяржавы: мудрасць і справядлівасць, вайсковая доблесць і адвага, клопат пра падданых. Гэтыя якасці і выяўляюцца ў галоўных падзеях «Птушынага сойма» — судзе над пугачом, змаганні з куніцамі, эпізодзе навальніцы.

Заклік да адзінства дзяржавы і грамадзянаў пад уладаю мудрага і адукаванага манарха ў перыяд унутранага бязладдзя і цяжкага знешняга становішча Рэчы Паспалітай — вось галоўны ідэйны стрыжань паэмы.

Паказ сітуацыі ў краіне перад элекцыяй, чаканні, звязаныя з абраннем новага караля, ход саміх выбараў — усё гэта суладна і паслядоўна ўвасоблена ў кароткай, з 509 вершаваных радкоў, эпічнай паэме.

Разнастайнасць зместу, змена формаў выкладу, рэтардацыі і адступленні, разгорнутыя параўнанні, нечаканыя павароты ў развіцці дзеян-

ня надаюць паэме займальнасць, трымаюць чытача ў пастаянным напружанні.

Займальнасці зместу адпавядае вытанчаная форма. Назіраецца цесная ўзаемасувязь між аб'ектамі, паказанымі ў творы, і ўжытымі выяўленчымі сродкамі. У апісаннях прыроды, батальных сцэнах і прамовах герояў гэтыя сродкі розныя. Аднак можна адзначыць і агульнае: наяўнасць вялікай колькасці рытарычных фігураў, складанасць, але разам з тым кампактнасць і сіметрычнасць сінтаксічных канструкцый, багацце і чысціня паэтычнай мовы, развітая сінаніміка і ўдалае ўжыванне тропаў, цудоўная гукавая аранжыроўка. Прыкладам паэтычнага стылю Міхала Карыцкага можа быць наступны ўрывак з «Птушынага сойма» у падрадковым перакладзе, дзе апісваецца месца будучага элекцыйнага сходу:

«На шырокай раўніне было поле , раскінутае на сто югераў. Частку яго, звернутую на ўсход, ужо апранула жоўтым калоссем спелая Цэцэра, якая магла б карміць гэтымі пладамі (сваіх) дзяцей – птушак. Другую частку, што схілялася на поўдзень, амываў маўклівай плынню водаў найчысцейшы ручай; тут – даўняя радзіма хітрых ныркоў, гусей і ўтульнае паселішча пяшчотных лебедзяў.

Частка ж, звернутая да заходзячага Фэба, і другая, падданая поўначы, якая пазбягае святла, зелянелі цяністымі параснікамі і былі цяжкадаступныя з-за цярністага кустоўя, хавалі і густой лістотай з уплеценымі кветкамі крынічку, што блукала ў зацені, амываючы шумлівым выгінам купіны ды абрывістыя скалы і, затрымліваючы шчодра рассыпаныя агні Гіпэрыёна, захоўвала ад спёкі запаветную прахалоду водаў. Гэтае месца, захапіўшыся слодыччу ручая, выбралі сабе салаўі – род, найслаўнейшы ў спеве.

Далей ідзе гай, што адкідае цені кучаравых платанаў і забяспечвае спакойны начлег чародам крылатых; паблізу ўздымаюцца вяршыні хмараносных гораў з расколінамі скалаў і разарваныя шматлікімі трэшчынамі стромы – бяспечнае прыстанішча галубоў. Такія межы замыкалі прасторнае поле, дзе было выбранае месца для будучых нарадаў».

Уражвае прасадычная дасканаласць паэмы. Напрыклад, у 200 першых паэтычных радках заўважаны толькі 2 рытмічныя недакладнасці.

Як класіцыстычны твор «Птушыны сойм» арыентаваны на антычныя ўзоры, і перш за ўсё на творы Вергілія і Авідыя — найвялікшых рымскіх эпікаў. Гэтая арыентацыя можа быць выяўленая на ўсіх узроўнях: ад тэматыкі і ідэйнай скіраванасці да лексікі і метрыкі. Варта, аднак, зазначыць, што фармальныя элементы, якія маюць аналагі ў антычным эпасе, тут трансфармуюцца ў адпаведнасці з новым зместам.

Структура паэмы таксама выяўляе падабенства да старажытнага эпа-

су: тут ёсць зачын, рэтардацыі і адступленні, разгорнутыя параўнанні, прамовы герояў ды інш. Твор напісаны традыцыйным эпічным памерам — гекзаметрам дыктылічным.

У панегірыку Марціну Пачобуту-Адляніцкаму, беларускаму астраному і свайму блізкаму сябру, з нагоды абрання яго рэктарам Віленскай акадэміі ў 1780 г. Карыцкі праслаўляе магутнасць чалавечага розуму і навуку, якая, на яго думку, мае боскае паходжанне:

Хто першым доктарам быў? Ім стаўся Пан Бог усявышні!
Ён калі геніяў небных са змрочных нябыту прадонняў
Вывеў, то семя ўсіх рэчаў, якія спазнаць неабходна,
Ў душах іх вышніх засеяў і ўсё чалавечае племя
(Ім запоўніў ён сьвет) навучыў усялякім навукам.

У панегірыках Кацярыне II з нагоды прыезду яе ў Беларусь і наведвання Полацка ў 1780 г. паэт выказвае свае пачуцці замілавання родным краем, ганарыцца ягонай прыгажосцю і багатай гісторыяй, праслаўляе славянскую раку Дзвіну і старажытны Полацк, куды раіць ён Кацярыне перанесьці сваю сталіцу.

У вершы «Праклён Вулкану», апісваючы пажар на жалезаплавільнай фабрыцы Яхіма Храптовіча ў Вішневе, ён захапляецца прадпрымальніцкай дзейнасцю беларускага арыстакрата і прамыслоўцы.

У другой частцы зборніка, куды ўвайшло 16 элегічных твораў, найбольшай мастацкай дасканаласцю вылучаецца элегія на ад'езд у Рым брата Міхала Карыцкага — Караля.

Пачуццё смутку і тугі, якое ахапіла паэта пры расставанні з братам, — вядучы матыў элегіі. Гарачая любоў да Караля, адчай ад прадчування будучых няшчасцяў і думкі пра тое, што ён памрэ, не ўбачыўшы брата, складаюць пабочныя тэматычныя лініі, якія садзейнічаюць развіццю галоўнай. Асноўная думка элегіі — хуткаплыннасць і крохкасць чалавечага жыцця, зменлівасць лёсу і падуладнасць смерці.

У творы можна вылучыць тры часткі: заклік, прадстаўленне тэмы і яе выклад. Звяртаючыся да адрасата, аўтар выкарыстоўвае такі спосаб выкладу, як маналог лірычнага суб'екта. У склад гэтага ўсхваляванага, эмацыйна насычанага маналогу ўваходзяць звароты і рытарычныя пытанні, разгорнутыя параўнанні, кароткія апавяданні — успаміны, апісанні духоўных узрушэнняў. Сувязь кампанентаў здзяйсняецца паводле прынцыпу свабоднай асацыяцыі, а ўнутры гэтых кампанентаў дробныя сэнсавыя адзінкі злучаны лагічнай і прычыннавыніковай сувяззю.

З глыбокім жалем паэт распавядае пра тое, як смерць забрала ўсіх яго родных: памерлі старыя бацькі, утапіўся ў Бузе Сымон, загінуў Лука,

пасля доўгіх нягодаў развітаўся з жыццём Андрэй, а Анупрэй памёр яшчэ ў калысцы. Жыць засталіся толькі ён, Міхал, ды старэйшы Караль, на якім засяродзілася цяпер уся ягоная любоў. Развярэджанае ўяўленне малюе жахлівыя карціны. Яму здаецца, што Караль, вярнуўшыся, ужо не застае яго жывым. Ён нават чуе над сваёю магілаю прамову брата, блізкую па сваёй будове да беларускіх народных галашэнняў.

У творы Карыцкі выкарыстоўвае разнастайныя і багатыя паэтычныя сродкі: лексічны арсенал лацінскай мовы, сінонімы і антонімы, удалыя тропы. Вось, напрыклад, адно з параўнанняў, ужытае паэтам: «Калі галубіца, выляцеўшы з гнязда ў скалах, доўга марудзіць ды не вяртаецца да сваіх дзетак, тады кволыя птушаняты выглядаюць з гнязда, жаласна пішчаць ды наракаюць, што няма мілае маці. Гэтак і мы, засмучаныя тваім ад'ездам, глядзім са стогнам на праміналочыя чорныя дні».

Выразныя стылістычныя сродкі дапаўняюцца прасадычнай і рытмічнай дасканаласцю элегіі (толькі два прасадычныя збоі на 140 вершаваных радкоў твора). Як і ў іншых сваіх вершах Карыцкі свядома арыентуецца тут на антычных паэтаў. Па тэматыцы элегія блізкая да асобных элегічных твораў Авідыя, а ў некаторых месцах да «Энеіды» Вергілія.

Астатнія элегіі прысвечаны вядомым у Рэчы Паспалітай грамадскім дзеячам: Ю. А. Залускаму — стваральніку першай у дзяржаве публічнай бібліятэкі, вядомаму сатырыку Ігнацыю Красіцкаму, варшаўскаму біскупу Анджэю Младзяёўскаму, каралеўскаму сакратару Антонію Касакоўскаму, падканцлеру Вялікага княства Літоўскага Антонію Пшэздзецкаму ды іншым.

Трэцяя частка зборніка Карыцкага ўключае 13 одаў, напісаных рознымі вершаванымі памерамі, на розныя тэмы і ў рознай танальнасці. Характэрным для гэтага жанру можна лічыць, напрыклад, оду «Да Людвіка пры надыходзе траўня». Твор адрасаваны, відаць, Людвіку Сестравітоўскаму, аднакурсніку паэта на факультэце філасофіі, аўтару некалькіх лацінскіх вершаў. Верагодна, што абодвух паэтаў лучылі між сабою сяброўскія сувязі, а Людвік часам наведваў свайго сябра ў вёсцы. Як вынікае са зместу, адно з такіх наведванняў і стала нагодаю для стварэння оды.

Твор можна аднесці да прыродаапісальнай лірыкі з моцнымі элементамі сентыменталізму. Тэма оды названая ў яе загалоўку: надыход вясны ў вёсцы, куды да Карыцкага прыехаў у госці яго сябра. Уся прырода вітае дарагога госця, радуецца, сустракаючы яго. Па форме выкладу ода падзяляецца на дзве часткі: апісальную і апастрафічную. У першай з іх паказваюцца ўцёкі зімы і надыход вясны, абнаўленне прыроды. У другой паэт заклікае Людвіка зірнуць на радасную прыроду, што вітае яго, просіць сонца захаваць добрае надвор'е, кліча Зэфіраў, каб яны заслалі шлях госцю кветкамі.

Тэма выдатна раскрыта з дапамогаю адпаведных сінтаксічных срод-

каў, багатай лексікі і своеасаблівай метафорыкі. Вось, напрыклад, як вітае прырода і людзі прыезд Людвіка:

Кветкамі зямля засцілае сцежку
І павевам ветлым вясна вітае,
Галасістых птушак суладным хорам
Лес сустракае...

Годзе ў травах бавіцца вам, Зэфіры!
Кіньце гулі, хутка сюды імчыце,
Прынясіце ў кошыках нам лілеяў,
Кветкі нарцысаў.

Мы аздобім сьцежку, якою будзе
Госць вялікі йсці, чабаром духмяным,
Ружаў цветам, браткамі, ліўнем снежным
Белага бэзу.

Ода напісана першай сапфічнай страфой, беззаганная ў прасадычных і рытмічных адносінах.

Дзве оды прысвечаны Ю. А. Залускаму, у адной з іх услаўляецца храм ведаў — бібліятэка. Пытанні маралі закранаюцца ў одзе да біскупа Антонія Валовіча, яшчэ чатыры оды напісаны з нагоды ад'езду Рымнейскага Францішка і маюць гімнічны характар, дзве закранаюць філасофскія пытанні чалавечага быцця. Вось невялікі прыклад філасофскай лірыкі Карыцкага – пачатак оды «Часам малое стварае небяспеку для вялікага»:

Богам наканавана так,
Каб малое нясло часам вялікаму
Небяспеку жахлівую.
Карабель, які змог нотаў шалёных моц,
Вынес Япіга люты шквал,
Пасмяяўся з пагроз злоснага Афрыка,
Штылем спынены, ў моры стаў.
Велізарным сланам мыш найдрабнейшая
Хуткую часам прыносіць смерць.
Дуб, які дасставаў стромай вяршыняй зор,
Не згінаўся прад бурамі,
Цяжка ўпаўшы, сваёй кронай заслаў зямлю,
Сцяты лёгкай сякеркаю.

Апошняя частка кнігі змяшчае ў сабе 40 эпіграмаў: памер іх ад 2 да 76 вершаваных радкоў. За выключэннем адной, усе яны напісаны элегічным дыстыхам. Часта эпіграмы складаюцца з некалькіх частак, якія па сутнасці могуць лічыцца асобнымі вершамі, аб'яднанымі адной агульнай тэмай.

Падобным чынам пабудавана, напрыклад, эпіграма «Да аднаго паэта». Яна падзелена на чатыры часткі. Першая частка — гэта ўступ, дзве наступныя — выклад тэмы, а чацвёртая — заключэнне з абагульняючым кансэптам. Тэмай твора сталі асноўныя прынцыпы паэтычнай творчасці, якія аўтар выкладае нейкаму паэту. Палажэнні, што абараняюцца ў эпіграме, характарызуюць Карыцкага як тыповага прадстаўніка асветніцкага класіцызму: паэт патрабуе ісці за жыццёваю праўдаю, карыстацца розумам — галоўным інструментам творчасці, нястомна і рупліва праціваць над творам. Згаданыя патрабаванні ўвасоблены ў алегорыі, дзе творчая індывідуальнасць паэта паказваецца ў выглядзе мудрай і працавітай пчалы. Спачатку даецца назіранне аўтара за працаю пчолаў, якое вырастае ў невялікую прыродаапісальную карціну. Далей, параўноўваючы музаў з пчоламі, Карыцкі пачаргова выкладае асноўныя прынцыпы творчасці. Заканчваецца твор эфектным кансэптам:

Гэткаю згодай калі з'яднаныя з пчоламі Музы,
Хай твая Муза тады стане руплівай пчалой.
З яўнага ў гэтым радках схаванае зведаць імкніся;
Толькі тады Апалон зробіцца твой мудрацом.

У іншых эпіграмах знайшлі адлюстраванне самыя розныя тэмы: каралеўскай улады і ўплыву яе на жыццё дзяржавы, дзяржаўнай дзейнасці Кацярыны II, патрыятызму і захаплення веліччу беларускіх магнатаў Радзівілаў, сяброўства і сяброўскіх пачуццяў, вайны і міру, будзённых падзеяў. У адной з эпіграмаў паэт, магчыма, першым выяўляе рэгіянальны патрыятызм, пагрунтаваны на назве «Белая Русь», якая актыўна пачала ўжывацца царскай адміністрацыяй да захопленых земляў усходняй Беларусі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. Ён спрабуе даць тлумачэнне гэтай назве і следам за адным са звычайных тлумачэнняў з пафасам падае іншае, больш узнёслае: «Яна атрымала назву Белай Русі ад бялізны сваіх снягоў ... ад чысціні душы ... яна заўсёды будзе Белай». Можна казаць пра пэўную трансфармацыю патрыятызму Міхала Карыцкага ад краёвага ліцвінскага, які больш выразна гучыць у першым, «дападзелавым», перыядзе яго творчасці, часам у спалучэнні з патрыятызмам агульнадзяржаўным, канфедэратыўным. Пры гэтым асветнік ясна ўсведамляе, што Рэч Паспалітая — гэта дзяржава двух народаў, кожны з якіх мае свае асаблівыя культурныя традыцыі і лёс.

Біяграфічныя дадзеныя і аналіз твораў Карыцкага сведчаць, што большая частка яго жыццёвага шляху, амаль уся грамадская і літаратурная дзейнасць праходзілі ў рэчышчы Асветніцтва.

Асновай для фармавання передавога светапогляду асветніка стала выдатная класічная адукацыя, атрыманая ў сценах школы ў Бабруйскай рэзідэнцыі, Віленскай акадэміі і Варшаўскім калегіуме. Глыбокае засваенне антычнай літаратуры і класічных моў, паэтычных і рытарычных тэорый дазволіла паэту ўзняцца да еўрапейскага ўзроўню літаратурнай адукаванасці. Фармаванню светапогляду і развіццю літаратурнага таленту Карыцкага садзейнічалі знаёмства і сумесная праца з прагрэсіўнымі пісьменнікамі, паэтамі і навукоўцамі эпохі Асветніцтва, далучанасць да філасофскіх тэорый і літаратуры Заходняй Еўропы.

Сталасць асветніцкіх поглядаў паэта выявілася ў плённай і самааданай працы па ўдасканаленню сістэмы адукацыі і выхавання, у ягонай літаратурнай дзейнасці. Ідэі Асветніцтва з'яўляюцца дамінантай у творчасці Карыцкага.

У літаратуры і мастацтве Рэчы Паспалітай з Асветніцтвам звязаны такія метады, як класіцызм, сентыменталізм і ракако, якія жывіліся метадалагічнымі і ідэалагічнымі канцэпцыямі эпохі. У творчасці Карыцкага можна знайсці прыкметы ўсіх гэтых метадаў, але вядучым, безумоўна, быў класіцызм.

Прынцыпы класіцызму знайшлі выразны адбітак у поглядах паэта. Ён абвяшчаў інтэлектуальны падыход да спасціжэння сутнасці рэчаў і з'яваў, якая атаясамліваецца з іх нязменнаю «субстанцыяй» («прыродаю»); «свет — разумны», і таму Карыцкі прыпісваў яму тэндэнцыю да пастаяннага ўзнаўлення гармоніі і хараства. Але гэткая ж здольнасць да рэалізацыі вечных і універсальных прынцыпаў прыроды закладзена і ў чалавеку — неад'емнай часціне сусвету. Дзеля таго, каб увасобіць у жыццё гэтыя прынцыпы, неабходна толькі іх спазнаць. Галоўным «інструментам» спазнання і пераўтварэння рэчаіснасці ў адпаведнасці з яе першаснай «прыродай» Карыцкі лічыў розум.

Рацыяналізм прысутнічае і ў эстэтычнай канцэпцыі паэта. На ягоную думку, мастацтва толькі тады можа быць дзейсным, калі яно падпарадкоўваецца нормам, вызначаным розумам, які стварае іх на падставе спазнання «прыроды» свету. Праўдзівасць творчасці асэнсоўвалася Карыцкім як адпаведнасць твораў мастацтва іманентнай сутнасці рэчаў. Падобным чынам трактаваў паэт і катэгорыю «прыгожага» — як адпаведнасць паказанага ў творы першаснаму хараству, суладдзю свету. Вось чаму асветнік лічыў, што сапраўдны паэт павінен добра ведаць і законы прыроды, і маральна-этычныя нормы грамадства, і правілы паэзіі. Задачу творцы Карыцкі бачыў у скіраванні чытача на шлях цноты, разумеючы яе як вяртанне да першаснай сутнасці чалавека.

Мяркуючы па творах полацкага зборніка, крыніцы творчасці Карыцкі бачыў не толькі ў звароце да «прыроды», але і ў наследаванні ўзорных твораў — перш за ўсё антычнай літаратуры, бо менавіта ў ёй найбольш увасобіліся універсальныя прынцыпы і законы прыроды. Аднак, трымаючыся канонаў класіцызму, Карыцкі ніколі слепа не пераймаў антычных паэтаў.

Уплыў класіцызму выявіўся таксама ў паэтыцы і стылістыцы вершаў Карыцкага. Як вядома, галоўнай праблемай, якую распрацоўвалі літаратура і мастацтва класіцызму, была праблема «сусветнага парадку» і яго рэалізацыі ў грамадскім жыцці. Класіцысты імкнуліся да асэнсавання таго, якімі павінны быць грамадскія правы і абавязкі людзей, якімі правіламі павінен кіравацца чалавек у жыцці, каб найбольш поўна выявіць сваю адвечную сутнасць. Не застаўся ў баку ад гэтай праблематыкі і Карыцкі. Яго цікавілі пытанні маральнага ўдасканалення чалавека, адказнасці інтэлігенцыі перад народам і дзяржавай, становішча вытворчай сілы грамадства — сялянаў ды інш.

Лёгка заўважыць, што ў вершах полацкага зборніка вызначаецца шлях да фармавання мадэлі адукаванага чалавека. Выяўляюцца наступныя рысы гэтай мадэлі: адукаванасць, адданасць народу і дзяржаве, прадпрымальнасць, клопат пра народ, цнота, сціпласць, асвечаная рэлігійнасць. Гэты ідэал павінен быў заахвочваць сучаснікаў да вызвалення ад заганаў, самаўдасканалення.

У адпаведнасці з задачамі, якія стаялі перад літаратурай эпохі Асветніцтва, шмат якія творы Карыцкага маюць дыдактычна-маралізатарскі характар. Часам, імкнучыся паўплываць на сучасніка, паэт спрабуе актуалізаваць гістарычныя ўзоры (напр., Аўгуста III). Некаторыя ягоныя творы прысвечаны аналізу і крытыцы чалавечых заганаў. Для Карыцкага важнымі былі таксама пытанні ролі розуму і жарсці ў чалавечай прыродзе. Пры распрацоўцы тэм маралі паэт звяртаўся да антычных сюжэтаў, што цалкам адпавядала канонам класіцызму. У творчасці Карыцкага варта адзначыць багацце міфалагічных матываў і атрыбутыкі.

У паэзіі полацкага зборніка прэвалююць матывы сацыяльна-грамадзянскія (радзей — патрыятычныя і рэлігійныя). Матывы ж асабістыя, інтымна-лірычныя ў адпаведнасці з духам класіцызму адсоўваюцца на задні план.

Для значнай часткі лірычных і панегірычных вершаў Карыцкага характэрны актуальнасць, сувязь з канкрэтнымі падзеямі ці асобамі: канцэпцыя аўтарскага «я» як абстрактнага суб'екта, які павучае ці пераконвае, выкладае агульны, «адвечны» погляд ці меркаванне, якое правяраецца розумам; арбітральны аўтарытэт гэтага «я»; дыстанцыя між аўтарам і адрасатам і аб'ектываваныя адносіны да паказанага ў творы; падача матэрыялу ў форме рытарызаванага маналога, адрасаванага часцей за ўсё кан-

крэтнай асобе ці персаніфікаванай з'яве: адрасацыя (прысвячэнне) як сітуацыйнае матываванне гэтага маналогу; падпарадкаванасць кампазіцыі плыні рытарычнага пераконвання ці рацыянальнай аргументацыі. Усе гэтыя рысы характэрны якраз для класіцыстычных твораў.

Разглядаючы стылістыку Карыцкага, можна заўважыць яго імкненне да яснасці думкі, адназначнасці і семантычнай выразнасці лексічных адзінак. Паэзіі полацкага зборніка ўласцівы багацце і разнастайнасць лексікі твораў, чысціня і класічная суладнасць мовы. Звяртае на сябе ўвагу шматлікасць рытарычных фігур і тропаў, завершанасць і сіметрычнасць сказаў, імкненне да сэнтэнцыйнасці. Яго вершы дэманструюць амаль беззаганную прасадычную правільнасць, рытмічную дакладнасць і гукавую меладычнасць.

Такім чынам, можна канстатаваць, што дамінуючым мастацкім метадам у творчасці Карыцкага ёсць асветніцкі класіцызм.

Менш паўплывалі на паэта канцэпцыі сентыменталізму. Часам поруч з розумам у яго як сродак спазнання выступае і пачуццё, «сэрца». Пачуццю і сімпатыі паэтам адводзіцца немалаважная роля ў фармаванні міжчалавечых адносін. Як вынікае з твораў пейзажнага, прыродаапісальнага характару, пачуццё вызначае і стаўленне чалавека да прыроды. Уплыў ідэяў сентыменталізму відавочны ў Карыцкага і ў тэндэнцыі да «дэмакратызацыі» некаторых твораў, што выявілася ва ўвядзенні персанажаў з сялянскага і мяшчанскага асяроддзя, у звароце да жыцця простага люду, імкненні меркаваць пра людзей не на падставе іх грамадскага становішча, а па асабістых якасцях.

У паэзіі Карыцкага адчуваецца таксама ўплыў барока. Поруч з праслаўленнем розуму, ён узвышаў веру, адкрыццё. Пераўтваральная актыўнасць чалавека ў яго абмяжоўваецца наканаванасцю чалавечага жыцця воляю вышэйшых сіл. Часам персанажы твораў Карыцкага паказаны істотамі слабымі і абмежаванымі ў параўнанні з усемагутным Богам. Барочнае бачанне свету часам накладвае адбітак і на тэматыку твораў (гімны святым, праслаўленне рэлігійных свят, абарона ордэна езуітаў). Рысы барока выяўляюцца таксама ў манеры паказу (кантрастнасць, супярэчлівасць, стракатасць, шматлікасць рытарычных прыёмаў, арыентацыя на знешні эфект, параднасць і пампезнасць).

У частцы твораў полацкага зборніка, і перш за ўсё ў эпіграмах, а часам і ў одах, адлюстраваліся таксама тэндэнцыі ракако. Нарэшце, у творчасці Карыцкага заўважны з'явы, якія можна трактаваць як адзнакі передрамантызму і нават зародкавага рамантызму.

Усе гэтыя творчыя метады арганічна яднаюцца асветніцкай скіраванасцю таленту Карыцкага, што заўважна і ў ягоным светапоглядзе, і ў творчасці. Як асветніка яго адрознівае ўпэўненасць у першапачатковай разумнасці, упарадкаванасці свету і грамадства, у магчымасці, кірую-

чыся святлом розуму, вярнуць гэты спрадвечны парадак. У творах паэта праслаўляецца навука, якая ўважаецца за дзейсны інструмент пераўтварэння свету. Асаблівая роля адводзіцца ім адукацыі і выхаванню, якія павінны садзейнічаць спасціжэнню «парадка рэчаў» і ягонаму ўвасабленню ў дзейнасці чалавека. Выхаваўчую фунцыю павінны таксама, на думку асветніка, выконваць літаратура і мастацтва. Галоўным сродкам маральнага ўдасканальвання чалавека ён лічыў рэлігію і стаяў на пазіцыях асвечанага хрысціянства.

Карыцкі быў паслядоўным прыхільнікам першаснай роўнасці людзей, заклікаў ацэньваць чалавека не паводле знатнасці роду, а паводле асабістых якасцяў.

У духу Асветніцтва разглядаліся паэтам праблемы вайны і міру. Вайна ўспрымаецца ім як парушэнне гармоніі, натуральных і маральных законаў, як з'ява, абсалютна несумяшчальная з прагрэсам грамадства, развіццём навук і мастацтваў.

Як асветніка і гуманіста Карыцкага вабілі адвечныя тэмы барацьбы дабра і зла, цнотаў і заганаў, становішча і ролі чалавека ў свеце, лёсу чалавецтва. Яго хвалявалі праблемы ўзаемаадносінаў мастака і грамадства, ролі мастацтва ва ўдасканаленні чалавека, вытокі гуманізму і варварства. Усё гэта ў сукупнасці з высокімі вартасцямі яго творчасці дазваляе гаварыць пра важнае месца паэта ў гісторыі літаратуры XVIII ст.

Творы Карыцкага знаходзілі шлях да сэрцаў ягоных сучаснікаў, распаўсюджваючыся па ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Яны заўсёды выклікалі захапленне і вялікую цікавасць. Адным з самых яскравых талентаў лічыў паэта яго мецэнат, знаўца літаратуры кароль Станіслаў Аўгуст. Знакаміты Ян Яноцкі называў аўтара «Птушынага сойма» аздобаю прыгожага пісьменства, «самым таленавітым і вучоным паэтам», «найвялікшым і найдасціпнейшым з паэтаў», «мазавецкім прарокам».

Пра папулярнасць і высокія вартасці творчасці Карыцкага сведчыць таксама сталая прысутнасць яго імені ў шматлікіх пазнейшых энцыклапедыях і слоўніках, абагульняючых працах па літаратуры XVIII ст., а таксама нязменная цікавасць да яго з боку сучасных беларускіх і польскіх літаратуразнаўцаў.

Літаратура:

1. Дорошкевич В.И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы. Первая половина XVI ст. Мн., 1979.
2. Конон В.М. От Ренессанса к классицизму. Становление эстетической мысли Белоруссии в XV—XVIII вв. Мн., 1978.
3. Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980.

4. Парэцкі Я.І. Міхал Карыцкі. Мн., 1991.

5. Garbaczowa M. Michał Korycki – elegantissimus poetarum // Ruch literacki. 1980. Zesz. 3. S. 175–188.

6. Garbaczowa M. Poezja łacińska w Polsce doby Oświecenia. Wrocław ii., 1986.

7. Korycki M. Carmina. Polociae, 1817.

8. Kostkiewiczowa T. Klasycyzm, sentymentalizm, rokoko. Warszawa, 1975.

9. Zabłocki St./ Od prerenesansu do Oświecenia. Z dziejów inspiracji klasycznej w literaturze polskiej. Warszawa, 1976.

Аляксандр Жлутка

Вікенцій РАВІНСКІ

(1786—1833)



гісторыі Беларусі, у станаўленні яе духоўнай культуры, выключна важную ролю адыгралі пісьменнікі — пачынальнікі літаратуры новага часу. Яе вытокі адносяцца да другой паловы XVIII— пачатку XIX стагоддзя. А хто быў першым беларускім пісьменнікам? Хто першы ўзяў у рукі беларускую ліру? Адназначнага адказу на гэта пытанне сёння няма. Яшчэ Максім Танк гаварыў у паэме «Люцыян Таполя»:

Бо ў народзе,
Бы ў прадвечным лесе,
Дзе ты знойдзеш дрэва, ад якога
Шум вясны пачаўся?
Дзе ты знойдзеш!

І ўсё-такі гісторыкі ведаюць ужо нямала. І ясна, што калі не першым, то прынамсі адным з першых быў Вікенцій Равінскі, з якім звязваецца стварэнне знакамітай беларускай паэмы «Энеіда навыварат».

Гэта парадыйна-сатырычная паэма, напісаная на сюжэт старажытнарымскага класіка Вергілія. Толькі ў нашай «Энеідзе» пад выглядам рымскіх багоў і герояў, а часам і пад сваімі імёнамі, дзейнічаюць самыя звычайныя «тутэйшыя людзі» — паны і сяляне. Такія пародыі на антычную «Энеіду» ствараліся ў многіх еўрапейскіх літаратурах. Непасрэднымі папярэднікамі аўтара беларускай «Энеіды» былі рускі паэт Мікалай Восіпаў і ўкраінец Іван Катлярэўскі.

Некаторымі канкрэтнымі здагадкамі наша паэма звязана з заходняй

Смаленшчынай, якая ў тыя далёкія часы не адрознівалася мовай і звычаямі, усім укладам народнага жыцця ад суседняй Беларусі. З гэтага адметнага беларуска-рускага памежжа і паходзіць наш паэт.

Якім жа быў яго жыццёвы і творчы шлях?

Вікенцій Паўлавіч Равінскі нарадзіўся ў 1786 годзе ў Духаў-шчынскім павеце Смаленскай губерні. Бацькі яго належалі да служылай смаленскай шляхты, якая доўга трымалася старадаўніх традыцый і патрыярхальных звычаяў, не вядомых у іншых мясцінах Расіі. У смаленскіх шляхецкіх сем'ях помнілі, што край гэты ўваходзіў некалі ў «Літву» і Рэч Паспалітую. З пакалення ў пакаленне перадавалі Равінскія граматы польскіх каралёў і вялікіх князёў літоўскіх пра наданне іх продкам маёнткаў на Смаленшчыне (юрыдычная моц такіх дакументаў прызнавалася і царскімі ўладамі). Да нараджэння Вікенція ад маёнткаў гэтых мала што засталося. Равінскія лічыліся дробнамаянтковымі дваранамі. Тым не менш у павеце і нават шырэй прозвішча гэта ведалі добра: бацька паэта, адстаўны секунд-маёр, а потым калежскі саветнік, быў у розныя часы духаўшчынскім земскім спраўнікам, павятовым суддзёй, гараднічым. Выхоўваўся будучы паэт дома і па прыкладзе старэйшых братоў у 1800 годзе, яшчэ падлеткам, паступіў на вайсковую службу. Суровы армейскі быт — «фрунт», як тады казалі, — стаў для яго ці не галоўнай жыццёвай школай. Спачатку служыў унтэр-афіцэрам у мушкецёрскім палку, потым у чыне прапаршчыка пераводзіцца ў егерскі полк. Служба Равінскага ў арміі супала з важнымі падзеямі еўрапейскай гісторыі, з шматлікімі напалеонаўскімі войнамі, у якія была ўцягнута і Расія. Малады афіцэр прымаў удзел у вайне з французамі 1805—1807 гадоў, у складзе войск пад камандаваннем М.Кутузава, П.Багpаціёна і іншых военачальнікаў пабываў у Галіцыі, Сілезіі, Маравіі, Аўстрыі, Усходняй Прусіі, удзельнічаў у бітвах пад Аўстэрліцам і Прэйсіш-Эйлаў. Пад Аўстэрліцам ледзь не напаткала бяда — за ім гналіся два французскія кірасіры, выратаваў толькі быстраногі конь-данчак. Асабліва адзначыўся Равінскі ў вядомай бітве пры Шэнграбэне, дзе ён, паводле запісу ў атэстаце, «храбра адкрываў сам сабе шлях праз варожыя калоны». Яго мундзір упрыгожыўся першай баявой узнагародай — ордэнам святой Ганны. У 1808—1809 гадах знаходзіўся ў Пецярбургу, куды быў накіраваны «для ўведання парадку службы». Тут, трэба думаць, ён добра пазнаёміўся з навінамі рускай культуры. І не толькі рускай. За гэты час ў Пецярбургу двойчы выдавалася «Энеіда» Катлярэў-скага, і зусім магчыма, што Равінскі са сваімі сябрамі-афіцэрамі захапляўся ёю. 36-ы егерскі полк, дзе пасля Пецярбурга працягваў службу Равінскі, некалькі гадоў стаяў на Украіне, што дало магчымасць дапытліваму афіцэру грунтоўна пазнаёміцца з украінскай мовай і народнымі звычаямі.

Напярэдадні вайны 1812 года полк перакінулі на захад Беларусі, пад Ліду. Разам з усёй рускай арміяй капітан Равінскі зведаў горкі шлях ад-

ступлення, на пачатку вайны камандзір корпуса, вядомы военачальнік генерал Дз.Дохтураў узяў яго да сябе старшым ад'ютантам. Апрача выканання небяспечных ратных даручэнняў малады афіцэр, які бойка валодаў пяром, загадваў яшчэ паперамі карпусной паходнай канцылярыі.

Равінскаму давялося ўдзельнічаць у вырашальных бітвах той вялікай вайны: пад Смаленскам, дзе, выконваючы распараджэнне Дохтурава, атрымаў моцныя апёкі, Барадзіном, Малаяраслаўцам. Яго мужнасць засведчана атрыманымі новымі баявымі ордэнамі, а таксама надзвычай ганаровай тагачаснай узнагародай — залатой шпагай з надпісам «За храбрасць» (за Барадзіно). Зноў прайшоўшы, пры праследаванні ворага, з канца ў канец усю Беларусь, у 1813—1814 гадах наш паэт удзельнічаў у паходзе рускай арміі ў Заходнюю Еўропу, ваяваў у Германіі, быў сведкам-удзельнікам гістарычнай «бітвы народаў» пад Лейпцыгам. У 1815 годзе, калі ваенныя дзеянні ўзнавіліся ў сувязі з вяртаннем Напалеона з вострава Эльбы, Равінскі знаходзіўся ў шэрагах рускай арміі, што вяла наступ на Парыж. Нарэшце, як змоўклі апошнія грымоты вайны, у сакавіку 1816 года пайшоў у адстаўку ў чыне палкоўніка і вярнуўся на зруйнаваную ворагам радзіму.

Паводле сведчання ўнука, «жыццё за мяжой як падчас акупацыі Францыі, так і ў час паходаў, у Аўстрыі і Германіі, не прайшло бясследна для Вікенція Паўлавіча: ён не толькі вывучаў французскую і нямецкую мовы, якімі валодаў дасканала, але пры кожным зручным выпадку стараўся папоўніць недахопы сваёй адукацыі і прычым, апрача набыцця навуковых звестак, стараўся вывучыць умовы грамадскага і дзяржаўнага жыцця Заходняй Еўропы, — чаму спрыялі яго жывы, дапытлівы розум і назіральнасць. Вярнуўшыся на радзіму, Вікенцій Паўлавіч смела мог назваць сябе перадавым чалавекам, так рэзка адрозніваўся ад большасці памешчыкаў таго часу».

Як героя нядаўняй вайны, бывалага і дасціпнага чалавека Равінскага, нягледзячы на яго вельмі сціплы маёнтак, з энтузіязмам прымалі на радзіме ва ўсіх самых ганарлівых панскіх дамах. Неўзабаве ён ажаніўся з дачкой багатага мясцовага памешчыка Рымскага-Корсакавага. Але хутка расла сям'я, і, удосталь пакаштаваўшы несалодкай долі прымака, ён у 1826 годзе вымушаны быў паступіць на службу па цывільнаму ведамству, стаў інспектарам піцейных збораў ледзь не на краі свету — у Арэнбургскай губерні. Жыў ён тады ва Уфе, дзе знаходзіліся губернскія ўстановы. Хутка ў сувязі з рэформай піцейнай сістэмы і гэтая незайздросная служба была згублена, і Равінскі адправіўся ў Пецярбург шукаць новай пасады. Гэты прыезд у сталіцу адзначаны ва ўспамінах земляка — кампазітара М.Глінкі, які жыў на адной кватэры са шваграм Равінскага, маладым паэтам А.Рымскім-Корсакавым. Паводле характарыстыкі Глінкі, Равінскі «у маладосці быў чалавек вясёлы, дасціпны і любіў смяшыць рознымі мудрагелістымі выхадкамі. Прычым захоўваў заўжды сур'ёзны выгляд». Як бачым, у яго быў прырод-

ны талент гумарыста-сатырыка. Гэтая рыса («людзей смяшы, а сам не смейся», як заўважаў яшчэ Я.Брыль) — характэрная «адзнака сатырычнага прызвання». У 1828 годзе Равінскі атрымаў службу ў дэпартаменце ўдзелаў і пасля нядоўгай стажыроўкі ў Смаленску кіраваў удзельнымі канторамі ў Пензе і Кастраме. Ён разумеў сялянскія патрэбы, па магчымасці стараўся палепшыць ва ўдзельных маёнтках становішча сялян. У 1833 годзе, так і не прыдбаўшы новых вялікіх чыноў, канчаткова пайшоў у адстаўку і пасяліўся на радзіме, спалучаючы клопаты сельскага гаспадара з навуковымі і літаратурнымі заняткамі. Памёр у 1855 годзе, пахаваны ў сямейным склепе ў царкве ў вёсцы Спас-Вуглы (цяпер Духаўшчынскі раён Смаленскай вобласці).

Вікенцій Равінскі належаў да пакалення дзекабрыстаў. Хоць змоўшчыкам, па ўсім відаць, не быў і да дзекабрысцкіх арганізацый непасрэдна не належаў, жыццёвым вопытам, поглядамі, як яны адлюстраваліся і ў «Энеідзе навыварат», ён шмат у чым блізкі да бліскучай плеяды дзеячаў 1825 года. Прынамсі на сучасную яму прыгонніцкую рэчаіснасць ён глядзеў досыць крытычна. Паводле сведчанняў сваякоў, ён уважліва сачыў за росквітам рускай літаратуры, які якраз тады распачаўся. Быў знаўцам і аматарам гісторыі (гэтая рыса зноў збліжае яго з дзекабрыстамі), сам пісаў гістарычныя нататкі, якія да нас не дайшлі. Сяброўскія і сваяцкія сувязі (ужо згаданы паэт Рымскі-Корсакаў; сям'я брата — маскоўскага паліцмайстра — таксама была зязана з салонамі інтэлектуалаў, гурткамі інтэлігенцыі) садзейнічалі таму, што,жывучы ў правінцыі, Вікенцій Паўлавіч не адчуваў адарванасці ад навінаў сталічнага культурнага жыцця. Несумненна, даходзілі да яго і першыя ластаўкі новай беларускай літаратуры (гумарыстычнае «Уваскрэсенне Хрыстова або Рабункі мужыкоў» Я.Баршчэўскага), якія, трэба думаць, у рукапісах і вуснай перадачы шырока бытавалі ў той час і на Смаленшчыне. У сваёй творчасці Равінскі карыстаўся як беларускай, так і рускай мовамі, аднолькава яму блізкімі. Найбольш ярка рысы яго таленту раскрыліся ў творчасці на беларускай мове, якраз гэтая творчасць захавала яго імя для гісторыі.

Паэма «Энеіда навыварат» напісана ім у 1816—1825 гадах, пасля вяртання з арміі, ці ў 1827—1828 гадах, калі ён чакаў новага прызначэння і стажыраваўся ў Смаленскай удзельнай канторы. Апрача «Энеіды» Равінскі напісаў вершаваную камедыю «Шлюб з прымусу», сатыру на аракчэеўскія парадкі «Вялікі муж субардынацыі», вершы, у якіх высмейвалася самадурства паноў і апісваліся камічныя эпізоды з памешчыцкага жыцця. Тэксты іх распаўсюджваліся ў рукапісах і цяпер невядомыя (змест некаторых твораў вядомы ў пераказе ўнука).

Тэкст «Энеіды навыварат» у тым выглядзе, у якім дайшоў да нас, ахоплівае наступныя эпізоды прыгодаў Энея. З захопленай грэкамі Троі Эней са сваімі хаўруснікамі ўцякае на пабудаваным судне («чаўнаку») у мора. Ва-

рожая Энею багіня Юнона, убачыўшы гэта, наважылася яго пагубіць і з падарункамі з'явілася да бога вятроў Эола. Той абяцае ўзняць на моры буру і патапіць траянцаў. Эней і яго спадарожнікі напалоханы ўзнятай бурай і ўжо гатовы развітацца з жыццём. Але ў апошні момант Эней звярнуўся з просьбай аб заступніцтве да марскога бога Нептуна, таксама абяцаючы яму падарункі. Нептун сцішыў буру. Узрадаваныя, супакоеныя траянцы святкуюць выратаванне. Дзеянне зноў пераносіцца ў нябесныя сферы. Аб зламысных інтрыгах сваёй суперніцы Юноны даведваецца маці Энея багіня Венера і, старанна прыбраўшыся, ідзе са сваімі скаргамі-просьбамі да галоўнага гаспадара Алімпа Зеўса, які паабяцаў, што з Энеем ўсё ўладзіцца добра, і нават канкрэтна абмаляваў усю яго будучыню («прароцтва Зеўса»). Супакоеная Венера дзякуе Зеўсу. Так снуецца-разгортваецца сюжэт — вяршацца людскія лёсы ў алімпійскай завоблачнай высі. А ўнізе — на судне з беглымі траянцамі — прачынаецца бадзёры Эней і загадвае плыць далей. Доўгае плаванне па моры ўжо да рэшты абрыдла, «горш ад талакна прыелась» траянцам, але тут яны ўбачылі жаданы бераг з паселішчам (з прароцтва Зеўса мы ведаем, што гэта Карфаген). Падсілкаваўшыся, падарожнікі сышлі на бераг. Царыца Карфагена Дыдона пагардліва насміхаецца з бедных абарваных, стомленых нягодамі траянцаў. Тыя тлумачаць ёй сваю журботную гісторыю і просяць літасціва іх прыняць. Дыдона ўжо чула пра Энея і яго высокія мужчынскія якасці. Як і прад-бачыў Зеўс, у яе сэрцы, так бы мовіць, з першага погляду загараецца неадольнае каханне да героя. Вядома ж, траянцы ў сувязі з гэтым прымаюцца на самым высокім узроўні. Малюецца карціна балю. Эней па-маладзецку пускаецца ў скокі...

Паводле высноў даследчыкаў, якія раскрылі складаную мастацкую прыроду твора, кніжныя традыцыі непарыўна аб'яднаны ў «Энеідзе навыварат» з традыцыямі народнымі, у прыватнасці фальклорнымі.

Высокі сюжэт Вергілія выкладзены мовай беларускага селяніна (хаця трэба ўдакладніць, што ў тыя далёкія, яшчэ ў многім патрыярхальныя часы мова гэта была пашырана і ў асяроддзі вясковага дваранства). У паэме надзвычай ярка паказаны побыт беларускай вёскі часоў прыгонніцтва. Траянцы — спадарожнікі Энея — ператварыліся пад пяром аўтара ў прыгонных сялян. Аўтар шчыра любуецца невычэрпнай энергіяй, таленавітым усёўмельствам, прафесійным спрытам, кемлівасцю народа (гэтая тэма будзе потым падхоплена і развіта іншымі беларускімі пісьменнікамі, стане скразной у беларускай літаратуры):

Мы ўсяку паншчыну смякаем:
У бровары глядзець як знаем,
Загнеткі, сундукі рабіць,
На бочкі абручы набіць.
Піліп наш лепіць гарлачы,

Пракоп жа ступы, таўкачы...

І многія тайны прыроды — няхай на інтуітыўным узроўні знахарства — таксама даступны, адкрыты дапытліваму мужыцкаму розуму:

А Саўка зелле ўсяка знаець,
Дзяцём ён вогнік адклікаець,
Хупаў бабамі варажыць
І скурапею адхадзіць.

Аўтару ўласцівы народны погляд на рэчы, прынамсі ён стараецца ўстаць на такі пункт погляду. Калі народныя рысы з'яўляюцца для нашага паэта станоўчымі якасцямі, то «панскае» для яго як бы сінонім адмоўнага, нялюдскага. Аўтар паказвае сябе тонкім знаўцам псіхалогіі, народнага побыту, звычаяў у розных пластах беларускай тагачаснай вёскі. Дасканальна ведае ён і жаночыя сакрэты. Грунтоўна і жыва выпісана сцэна збораў Венеры, прыгожай засцянковай шляхцянкі, а то, здаецца, і зусім сялянкі (побыт гэтых сацыяльных пластоў па сутнасці мала адрозніваўся), да важнага візіту. Усё ў яе абдумана, па-жаночы разлічана і разам з тым асвячона векавымі народнымі традыцыямі:

Андрак з насоўкай апранула,
З падплётам ўздзела кавярзні,
Анучкі рабыя абула,
Як быццам войта селязні;
Твар сывараткаю абмыла,
Кужэльны ўздзела балахон,
Папарнік у хустачку ўлажыла,
Пайшла да Зеўса на паклон.

Тут зусім няма сатыры, аўтар надоўга спыняецца на гэтай сцэне, нібы сцішана назірае, як рыхтуецца да нейкага адказнага кроку жанчына яго народа, якая толькі па нейкай недарэчнай выпадковасці носіць імя антычнай багіні.

Сваёй паэмай Вікенцій Равінскі зрабіў велізарны ўклад у станаўленне сатырычна-гумарыстычных жанраў у беларускай паэзіі. Жанравыя традыцыі «Энеіды навыварат» выразна прасочваюцца потым у паэме «Тарас на Парнасе», у творчасці Ф.Тапчэўскага і іншых паэтаў. Але гэтым яе значэнне далёка не вычэрпваецца, у ёй моцна адчуваецца лірычная плынь. Станоўчы ідэал сцвярджаўся нашым паэтам не толькі шляхам сатырычнага адмаўлення, але і непасрэдна праз узрушана-чуллівы (часам нейтральна-аб'ектывізаваны) паказ народных звычаяў, народнага менталітэту:

Дзявухны галасу гукалі,
Вясну малоданькі склікалі
І жарты розныя рабілі:
Казу святочную вадзілі,
З загнеткі лося забівалі
Дугу у браму прадзявалі...

Перад намі своеасаблівы паэтычны звод народных светаўяўленняў, маленькая энцыклапедыя народнага жыцця, адлюстраванне неўміручасці народнага духу, багацця і каштоўнасці культуры народа. Равін-скаму радасна ўказваць на невычэрпнае багацце гэтага народнага духоўнага космасу і — больш таго — на сваю (хаця б праз глыбокае веданне, суперажыванне) прыналежнасць, далучанасць да яго. Паэту радасна адчуваць сябе часцінкай народа. Нельга не пагадзіцца з земляком паэта А.Кіркорам, які пісаў пра беларускую «Энеіду» і яе стваральніка: «Аўтар выдатна ведаў народ, яго паданні, норавы і звычаі і валодаў мовай, як няшмат хто. Яго гумар, уменне перадаваць народныя сцэны знамянуюць геніяльныя здольнасці».

Сваёй паэмай Равінскі закладваў трывалыя асновы ўсёй новай беларускай літаратуры з яе дэмакратызмам, чалавекалюбствам, непрыняццем сацыяльнай несправядлівасці, апорай на народныя духоўныя каштоўнасці з жыццясцвярджальным пафасам. Незалежна ад суб'ектыўных намераў паэта (мы яшчэ мала пра гэта ведаем) яго паэма з'явілася зародкам нацыянальнага эпасу.

Такой праз добрыя паўтара-два стагоддзі бачыцца нам постаць Вікенція Равінскага, так у рэтраспектыве часу прачытваецца яго выдатны твор — паэма «Энеіда навыварат». Што астаецца дадаць?

Да рэвалюцыі ў маёнтку Равінскіх Спаса-Руцкае захоўваўся архіў Вікенція Паўлавіча, у тым ліку і аўтограф «Энеіды навыварат».Вісеў там і вялікі алейны партрэт нашага пісьменніка. Усё гэта прапала-загінула ў віхуры 1917 года. Балазе, з архівам у свой час паспеў пазнаёміцца яго ўнук К.І.Равінскі, які данёс да нас шмат цікавых дэталяў. Ва ўспа-мінах ён пісаў пра свайго дзеда-паэта: «З ацалелых пасля яго смерці сшыткаў і рукапісаў відаць, што дзядуля вельмі шмат чытаў, асабліва старанна займаючыся гісторыяй. Прагледаючы зробленыя ім выпіскі з навуковых кніг, я пераканаўся, што пры вывучэнні гісторыі ён карыстаўся даволі рэдкімі кнігамі на замежных мовах, адзначаючы ўсё, што было ў навуковых адносінах асабліва каштоўным або пралівала новае святло на тыя ці іншыя гістарычныя падзеі або эпоху і наогул спыняла яго ўвагу». Адзначае ўнук таксама знаёмства нашага паэта з філасофіяй французскіх асветнікаў Вальтэра, Русо, Дзідро, Д'Аламбера, Гольбаха. Так што далягляды пачынальніка новай беларускай літаратуры былі вельмі і вельмі шырокія.

Даносіць да нас унук і чыста чалавечыя рысы Вікенція Паўлавіча. Па-

водле яго слоў, паэт «меў нямала сяброў у межах Смаленскай губерні і заўсёды быў жаданым госцем у дваранскіх сядзібах, тым больш што быў вельмі вясёлым і жыццярадасным чалавекам, любіў пагаварыць (французы называюць такіх людзей causeurs), кінуць вострае слова і пасмяяцца здаровым смехам...».

І што асабліва каштоўна, апісваючы жаніцьбу Вікенція Паўлавіча, К.І.Равінскі малюе яго знешні выгляд, дае славесны партрэт. Вось пасля войска наш герой з'яўляецца на радзіме і адразу пакарае непрыступнае сэрца мясцовай багачкі Праскоўі Якаўлеўны. Ды ці ж можна было ўстаяць: «Статны, высокага росту, з трохі кучаравымі валасамі, з густымі чорнымі бровамі і вялікім ілбом, гадоў трыццаці двух палкоўнік, разумны, надзвычай дасціпны, вясёлага нораву, ён быў выдатна прыняты мясцовымі памешчыкамі, у тым ліку і гордым Я.С.Рымскім-Корсакавым. Але калі Праскоўя Якаўлеўна палюбіла Вікенція Паўлавіча, то яе бацька вельмі неахвотна даў згоду на гэты шлюб, лічачы яго няроўным: хоць дзядуня сваёй радавітасцю не саступаў Рымскім-Корсакавым, але ён быў вельмі небагатым чалавекам». Як мы ведаем, з небагатай, блізкай да народа шляхты выйшла большасць беларускіх пісьменнікаў XIX стагоддзя.

А што да партрэта Вікенція Равінскага, то сёння мы такі партрэт маем: яго стварыў у 1992 годзе — па даступных тады матэрыялах — наш таленавіты мастак-графік Пятро Драчоў.

Літаратура:

1. Ахрыменка П. Летапіс братэрства: Аб беларуска-ўкраінскіх фальклорных, літаратурных і тэатральных сувязях. Мн., 1973.
2. Бас І. Літаратурныя пошукі, знаходкі, даследаванні. Мн., 1969.
3. Киселев Г. Разыскивается классик... Мн., 1989.
4. Киселев Г. Портрет классика // Неман, 1992, № 5.
5. Кісялёў Г. Загадка беларускай «Энеіды». Мн., 1971.
6. Кісялёў Г. Слядамі «Энеіды»: Да 210-годдзя з дня нараджэння Вікенція Равінскага // Полымя, 1996, № 10.
7. Лебядзевіч Д.М. «Энеіда» Вергілія і «Энеіда навыварат» В.Равін-скага / Да пытання аб праблемна-тэматычных і сюжэтна-кампазіцыйных сувязях // Беларуская мова і літаратура. Мн., 1997. Вып. 9.
8. Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей. Мн., 1993. Кн. 1.
9. Ровинский К.И. Забытое произведение // Пачынальнікі. Мн., 1977.

Генадзь Кісялёў

Юзэф
ХОДЗЬКА
(1800—1881)



арта неабходна ўсім: геолагам, дарожнікам, будаўнікам, ваенным, падарожнікам. Але, каб яе скласці, патрэбна правесці вялікую работу, праставіць так званыя трыангуляцыйныя пункты, праверыць адлегласць паміж імі.

Праводзіць трыангуляцыйную работу цяжка нават на добра вывучанай раўніннай мясцовасці. Цяжэй за ўсё праводзіць яе на зноў далучаных землях. Яшчэ цяжэй — у гарах. Вельмі складана займацца трыангуляцыйнымі работамі ў нядаўна заваяваных гарах, у месцах ваенных дзеянняў, пад кулямі горцаў і турэцкіх аскераў.

Вось такую складаную працу па трыангуляцыі Закаўказзя і Каўказа, у так званых «заміраных» гарах узначаліў і правёў у сярэдзіне XIX ст. ураджэнец Крывічэй (непадалёку ад Вілейкі) Юзэф Ходзька.

Паходзіў Ю.Ходзька з вядомага сваімі культурнымі традыцыямі і апазіцыяй да царызму ў Беларусі роду Ходзькаў. Традыцыі свабодалюбства ў гэтай сям'і ішлі ад маёра Людвіка Ходзькі (1769—1843), які прымаў удзел у паўстанні супраць рускага царызму пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Сын Людвіка Леанард (1800—1871) эмігрыраваў з краю і прымаў актыўны ўдзел у Ліпеньскай рэвалюцыі ў Францыі ў 1830 г. Стрыечны дзядзька Юзэфа Ходзькі па бацькоўскай лініі Ігнацы (1794—1891) быў пісьменнікам. У аповесці «Прыгонны» ён асуджаў жорсткасць памешчыкаў у адносінах да сялян.

Бацька Юзэфа Ходзькі Ян Ходзька (1777—1851)[1] быў дастаткова вядомым на Беларусі. Аўтар успамінаў «Некалькі гадоў маёй маладосці ў Вільні (1818—1825)» урач С.Мараўскі, які з непрыхільнасцю ставіўся

да многіх сваіх сучаснікаў, узносіў Яна Ходзьку да нябёсаў, характарызаваў яго як «чалавека ва ўсіх адносінах незвычайнага /.../, аднаго з апошніх прыкладаў нашых выдатных і не сапсаваных чужаземшчынай людзей. Гэта быў шляхціц!»[2].

Пасля навучання ў віленскай Галоўнай Школе Вялікага княства Літоўскага Ян Ходзька прайшоў усе прыступкі шляхецкай кар'еры, займаючы пасады ў судах. У 1808 г. ён быў падкаморым Віленскага павета (чыноўнікам, які вырашаў памежныя спрэчкі паміж гаспадарамі зямель), з 1811 г. быў прэзідэнтам земскага трыбунала ў Мінскай губерні (трыбунал — суд спецыяльнай кампетэнцыі). Улетку 1812 г., як і значная частка беларускай шляхты, Ян Ходзька падтрымліваў Напалеона, разлічваючы на аднаўленне дзяржаўнасці Беларусі ў складзе адноўленай Рэчы Паспалітай (федэрацыя Польшчы і Беларуска-Літоўскай дзяржавы). Ён напісаў камедыю «Прыход над Нёман, або Вызваленне Літвы», што прымусіла яго хавацца ад царскіх улад да абвяшчэння амністыі прыхільнікам Напалеона. Зноў ён удзельнічае ў грамадскім жыцці. Яму даручаюць быць упаўнаважаным так званай «Радзівілаўскай масы» — вялікай зямельнай і грашовай спадчыны Дамініка Радзівіла, аднаго з найбуйнейшых памешчыкаў Беларусі. Ён атрымліваў вялікі аклад, жыў то ў Мінску, то ў Вільні, ездзіў у карэце, запрэжанай шасцёркай коней, са шматлікімі лакеямі, разам з мясцовай арыстакратыяй арганізоўваў літаратурныя вячэры і тэатральныя прадстаўленні. Як вядомы масон (масонамі былі Моцарт, Кутузаў, Пушкін і іншыя прадстаўнікі адукаваных колаў) ён заснаваў ложу Сакрата, быў вялікім магістрам ложы «Факел Поўначы» у Мінску.

З 1812 г. Ян Ходзька быў ганаровым наглядчыкам Дзісненскага павета і сакратаром дабрачыннага грамадства ў Мінску. Пазней замацоўвае свае даўнія сувязі з прагрэсіўным Віленскім універсітэтам, уступае ў таварыствы шубраўцаў і друкарскае, якія займаліся асветніцтвам і выступалі супраць феадальных перажыткаў. З 1819 г. Ян Ходзька займаецца пытаннямі пачатковай адукацыі. У 1820 г. у віленскім часопісе «Гісторыя дабрачыннасці» публікуе праграмны даклад аб задачах чатырохгадовай школы для сялянскіх дзяцей. Акцэнтуе сваю ўвагу на маральнай навуцы і рэлігіі, знаёмстве вучняў з новымі тэхнічнымі метадамі апрацоўкі зямлі, жывёлагадоўлі, будаўнічай справы. У 1821 г. ён становіцца школьным інспектарам Віленскай навучальнай акругі, якая ахоплівала Літву і Беларусь.

У гэты перыяд Ян Ходзька піша аповесць «Пан Ян са Свіслачы», у якой выказвае свае асноўныя педагагічныя думкі[3]. У 1822 г. Школьны камітэт Віленскай навучальнай акругі прапаноўвае яму выказаць свае погляды наконт вясковай школы, але не згаджаецца нават на тое, каб вясковых школьнікаў вучыць два гады, мяркуючы, што для іх дастатко-

ва нядзельных заняткаў садаводства і хатняй гаспадаркі, каб яны «не страцілі навыкаў свайго саслоўя». Ян Ходзька не змог упэўніць сваіх кансерватыўных праціўнікаў у адваротным, засталася толькі яго кніжка «Пан Ян са Свіслачы», хоць яна і дастаткова кансерватыўная па сваёй ідэі. У далейшым Ян Ходзька прыняў удзел у дзейнасці польскага Патрыятычнага Таварыства, якое дзейнічала падпольна, у выніку чаго 1826—1827 гады праводзіць у турме, у 1829 г. яго высылаюць з Беларусі спачатку ў Пецярбург, затым у Варонеж, Вятку і Перм пад паліцэйскім наглядам. Пасля вызваленчага паўстання 1830—1831 гг. яго маёнткі былі разрабаваныя, сам ён вымушаны быў шукаць прытулку ў зяця, у якога пражыў да самай смерці.

Яго кніжку «Пан Ян са Свіслачы» звычайна разглядалі як краязнаўчае апісанне Беларусі, адно з першых у гэтым жанры, ці як прыклад вясковай ідыліі, але кніжка гэта мае больш глыбокі падтэкст. Яна была напісана па прыкладзе французскай папулярнай кнігі М.Л. дэ Жусье «Сімон дэ Нантуа, або Ярмарачны гандляр». У 1821 г. Школьны камітэт Віленскай навучальнай акругі адобрыў яе і рэкамендаваў для чытання. Яна была выдадзена ў 1821 г. і разаслана ва ўсе школы Беларусі і Літвы з рэкамендацыяй яе распаўсюджання, у 1824 і 1825 гг. яе перавыдаюць на польскай мове, у 1823 г. выдаюць у перакладзе на літоўскую і перавыдаюць па-літоўску яшчэ ў 1860 г.

Аўтар кнігі звяртаецца да сялян, расказвае ім самім пра іх жыццё, якое Я.Ходзька вельмі добра ведаў. Яе галоўны герой — гандляр, які падарожнічае, з'яўляецца своеасаблівым люстэркам, расказвае і тлумачыць усё тое, што бачыць на сваім шляху. У кнізе вельмі многа розных інструкцый па паляпшэнню быту, гаспадаркі. Кожны продаж якога-небудзь тавару суправаджаецца інструкцыямі па яго выкарыстанню. Герой кнігі вучыць сялян, як вырошчваць хмель, каб варыць добрае піва, фарбаваць воўну, угнойваць і апрацоўваць зямлю, рэкамендуе асушаць балоцістыя глебы і дае канкрэтныя парады наконт гэтага, вучыць, як плесці кашы з лазы, шляпы з саломы, як прасці воўну, бяліць палатно, рацыянальна асвятляць хаты, мяняць участкі зямлі пры іх апрацоўцы і г.д.

Адна з яго задач — барацьба з забабонамі і п'янствам. Ён апісвае ідэальную вясковую школу. Кніга прасякнута і ліберальнымі, і кансерватыўнымі ідэямі. Ян Ходзька настойваў на тым, каб прадстаўнікі розных саслоўяў заставаліся ў іх межах: сяляне заставаліся сялянамі і верна служылі памешчыкам, а шляхта заставалася шляхтай. Нягледзячы на гэтыя кансерватыўныя погляды, кніга Яна Ходзькі была значным этапам у педагагічнай думцы Беларусі і заслугоўвае ўвагі.

У Яна Ходзькі было шэсць сыноў і дачка Зоф'я (яе замужняе прозвішча Набароўская). Старэйшы сын Уладзіслаў быў павятовым суддзёй у Вілейцы. Яшчэ адзін сын, Фелікс, стаў інжынерам; вядома, што ён у 1881 г. служыў у Францыі на чыгунцы. Міхал Ходзька, матэматык, паэт, удзельнічаў у барацьбе супраць царызму ў 1830—1831 гг., а пасля паражэння паўстан-

ня прымаў удзел у партызанскай экспедыцыі 1833 г. пад камандаваннем Заліў-скага у Польшчы і на Украіне. Аляксандр Ходзька стаў вядомым усхода-знаўцам (пра яго аповяд у іншым артыкуле). Невыпадкова мемуарыст М.Мараўскі пісаў пра сям'ю Ходзькі: «Грэх сказаць: што калі дзе-небудзь быў Ходзька, то таленавіты. Неразумнага з гэтым імем я не ведаў»[4].

Сын Яна Ходзькі Юзэф нарадзіўся 6 снежня 1800 г. у Крывічах. Атрымаў добрую хатнюю адукацыю, пастаянна карыстаўся вялікай бацькоўскай бібліятэкай, чытаў творы лепшых еўрапейскіх пісьменнікаў. Каб папоўніць адукацыю, Юзэф разам з двума братамі накіраваўся ў Вільню, дзе вучыўся ва універсітэцкай гімназіі, а затым ва універсітэце, на фізіка-матэматычным факультэце. Універсітэт меў вялікае значэнне для развіцця духоўнага жыцця Беларусі і Літвы. Маладзёжныя гурткі філаматаў, прамяністых і іншыя, якія стваралі выпускнікі і студэнты гэтага універсітэта, выступалі за асвету народа з далейшай думкай аб палітычных зменах у краіне і самастойным развіцці Беларусі і Літвы. Кіраваў адукацыяй братоў Ходзькаў у Вільні Тамаш Зан, адзін са стваральнікаў гурткоў філаматаў і прамяністых[5]. Т.Зан увёў братоў Ходзькаў у кола віленскай моладзі. На пасяджэнні таварыстваў студэнты выступалі з навуковымі дакладамі. Юзэф Ходзька, які меў псеўданімы Пітый або Пілад, чытаў там даклады «Аб сапраўднай мужнасці», «Аб асновах сапраўднага патрыятызму».

Юзэф Ходзька дапамагаў адстаючым студэнтам паўтараць універсітэцкія курсы алгебры і фізікі. Ён узначальваў так званы «Блакітны саюз» пры аддзяленні літаратурных навук філаматаў.

Скончыў Юзэф Ходзька універсітэт у 1821 г. Да гэтага часу ў Расійскай імперыі пачалася вялікая праца па стварэнню ваенна-тапаграфічных карт. Адсталасць царскай Расіі ў гэтай справе была прадэманстравана на працягу войнаў першых дзесяцігоддзяў XIX ст., паколькі карты, якія былі ў войсках, не задавальнялі іх ні па дакладнасці, ні па зместу. Гэта прымусіла расійскі ўрад да рэарганізацыі картаграфіравання краіны шляхам вызначэння астранамічнай асновы, каб скласці дакладныя тапаграфічныя карты. Напрыканцы 1816 г. ваеннае ведамства намеціла пачаць трыганаметрычныя і тапаграфічныя здымкі Літоўска-Віленскай губерні.

У 1822 г. Юзэф Ходзька атрымаў даручэнне праводзіць трыангуляцыйныя работы на захадзе Латвіі, затым у Літве, Гродзенскай і Мінскай губернях.

Царскія ўлады даведаліся пра існаванне патаемных таварстваў у Вільні. Вясной 1823 г. адзін гімназіст там напісаў на класнай дошцы лозунг «Няхай жыве Канстытуцыя Трэцяга мая!». Трэцяга мая 1791 г. у Рэчы Паспалітай была прынята дэмакратычная Канстытуцыя, другая па ліку пасля амерыканскай тых жа часоў. Была прызначана камісія для расследвання падзей пад кіраўніцтвам сенатара М.Навасільцава. 13 мая 1823 г. Навасільцаў накіраваў грунтоўны рапарт пераемніку імператара Аляксандра I цэсарэвічу Канстанціну Паўлавічу.

Сенатар абвінаваціў членаў выяўленага таварыства філаматаў, прамяністых і філарэтаў у наступным: «Першая віна заключаецца ў самым стварэнні тайных таварыстваў /.../. Другая віна заключаецца ў супрацьзаконным прысваенні сабе /.../ самаадвольнага ўплыву над утварэннем юнацтва. Трэцяя віна — у чытанні на сходах філарэтаў дзёрскіх /.../ вершаў і ў выказванні прывітанняў і прамоў, што супярэчаць вернасці расійскаму прэстолу»[6].

Многіх удзельнікаў віленскіх гурткоў, у тым ліку Адама Міцкевіча, выслалі за межы Беларусі і Літвы. Тамаша Зана, Адама Сузіна і Яна Чачота пасадзілі ў турму. І хоць Юзэф Ходзька ў спісе філаматаў быў сто першым, галоўны вайскавы геадэзіст у Літве і Беларусі К.І.Тэнер заступіўся за яго і ён працягваў сваю працу па трыангуляцыі Літвы і Беларусі.

У ходзе падрыхтоўкі паўстання 1830—1831 гг. супраць царызму падпольная арганізацыя ў Вільні намеціла Юзэфа Ходзьку на пасаду будучага каменданта Вільні[7]. У сувязі з тым, што Юзэф Ходзька праходзіў па справе філаматаў, штаб дзеючай у Польшчы і Літве арміі загадаў сачыць за ім, і ў 1831 г. яго накіравалі для правядзення геадэзічных работ у атрад палкоўніка Дзітмарса, які праводзіў геадэзічныя работы на Дунаі, дзе руская армія вяла ваенныя дзеянні супраць турэцкіх войск. Тут, у цяперашняй Румыніі, Ю.Ходзька праводзіў астранамічна-геадэзічныя і тапаграфічныя работы.

Праз два гады з той жа мэтай ён быў у складзе экспедыцыйнага корпуса рускіх войск, накіраванага для падтрымкі турэцкаму султану (да таго часу паміж рускімі і туркамі быў заключаны саюз) супраць магчымага егіпецкага дэсанта на Басфоры[8]. Пазней Ю.Ходзька складаў ваенны агляд румынскіх княстваў Малдавіі і Валахіі. Гэты агляд быў завершаны да лістапада 1835 г.

Праз чатыры гады, у кастрычніку 1839 г., Юзэф Ходзька атрымаў новае прызначэнне. Яго накіравалі служыць на Каўказ. У пачатку красавіка 1840 г. ён прыбыў у Тыфліс (цяпер Тбілісі). Юзэф Ходзька пачаў складаць карты Каўказа, узначаліў камітэт па размежаванню зямель гэтага намесніцтва Расіі, змог стварыць у Тыфлісе школу землямераў. У лістападзе 1845 г. ён прыступіў да галоўнай справы свайго жыцця — закаўказскай трыангуляцыі.

На раўніне Расійскай імперыі пад кіраўніцтвам геадэзістаў К.І.Тэнера і Ф.Ф.Шуберта было ахоплена трыангуляцыяй семнаццаць губерняў — 905400 км^2. Каўказ з яго лясамі і гарамі, у якіх ішлі бесперапынныя баі з вальналюбівымі горцамі, не ўваходзіў у лік губерняў, абмераных Шубертам і Тэнерам. За чатырнаццаць гадоў цяжкай працы Юзэф Ходзька зрабіў трыангуляцыю Закаўказзя на плошчы ў 440472 км^2, гэта значыць, на палове той плошчы, якую даследавалі яго калегі на мірнай раўніне.

Найбольшую вядомасць Юзэфу Ходзьку прынеслі даследванні на заваяванай ім у 1850 г. вышыні, заходняй вяршыні гары Вялікі Арарат[9]. За гэта французскі альпінісцкі клуб абраў нашага земляка сваім ганаровым сябрам. На Арараце Юзэфу Ходзьку хацелася вызначыць шырыню мясцовасці з най-

большай дакладнасцю. Гэтаму перашкаджалі вымярэнні ў тых гарах, паблізу якіх хрыбты перашкаджалі атрымаць з астранамічных назіранняў дакладныя дадзеныя. На Арараце пагрэшнасцяў ад суседніх гор не магло быць, таму што гэта была самая вялікая вяршыня Каўказа.

Да Юзэфа Ходзькі на гэту вяршыню падымаліся толькі чацвёра расійскіх вучоных, якім мясцовыя жыхары не хацелі верыць. 30 ліпеня (11 жніўня) 1850 г. Юзэф Ходзька накіраваўся ўверх, да мяжы вечных снягоў. Падымацца на заходнюю вяршыню Арарата пачалі 1(13) жніўня, ішлі пяць дзён. Людзі слізгалі на бясснежных месцах, мерзлі, абдзіраліся аб выступы скал, коні спатыкаліся і валіліся. Было вырашана пусціць коней уніз, а паклажу перамясціць на санкі, якія цягнулі на сабе салдаты атрада Юзэфа Ходзькі.

Падарожнікі ішлі, правальваючыся ў снег па пояс, утоптвалі яго, каб падцягнуць на вяроўках санкі. Дасягнулі адгор'яў скал і наладзілі пад імі навес. Пад ім і правялі ноч Юзэф Ходзька і пяць яго спадарожнікаў, таму што астатнія спусціліся ўніз.

Усю ночь бушаваў ураган. Патокі святла пераліваліся перад вачыма Ю.Ходзькі і яго спадарожнікаў. Грамавыя ўдары ішлі адзін за адным. Але геадэзістаў ад маланак абараняла адгор'е скалы, што навісла над імі. Гэта адгор'е ўспрымала патокі электрычнасці, якія неслі ў сабе пагібель. Каля гадзіны ночы над галовамі людзей, якія схаваліся ад непагоды пад навесам, маланка адарвала кавалак скалы, які праляцеў каля іх з вялікім грукатам. На шчасце, камень не зачапіў іх і скаціўся ў бездань. Ураган перашкаджаў людзям замацаваць палаткі, пагражаючы разарваць палатно на шматкі. Усё, што знаходзілася ўнізе, закрываў шчыльны белы туман, які напамінаў паверхню замерзлага мора. Туман паступова падымаўся і ахутваў назіральнікаў. Вецер шпурляў у іх твары мерзлыя камякі снегу.

6 (18) жніўня з месца стаянкі Юзэф Ходзька падняўся да заходняй вяршыні, якую акружалі з трох бакоў крутыя абрывы. Адсюль ледзь быў відаць Эльбрус, які знаходзіўся ад іх у чатырохстах кіламетрах на поўнач. Лепш быў відаць Казбек, да якога было толькі 220 кіламетраў.

Геадэзіст заўважыў на двух больш блізкіх вяршынях Ахдаг і Алагез сонечныя блікі ўсталяваных там раней апаратаў геліятропаў. Ён стаў перадаваць пры дапамозе люстэрка свайго геліятропа ўмоўныя сігналы на гэтыя вяршыні. Адтуль яму адказалі яго таварышы па рабоце.

Працаваць прыходзілася толькі раніцай. Таму Юзэфу Ходзьку прыйшлося правесці пяць сутак ля вяршыні Арарата, якая дасягала 5165 метраў, разам з яшчэ адным салдатам. Астатнія яго спадарожнікі то спукаліся ўніз, то падымаліся на вяршыню па меры неабходнасці. Яны раскапалі снег для таго, каб размясціць палатку на вышыні 5121 метраў для Юзэфа Ходзькі. Капалі яго на глыбіню дванаццаці метраў, але зямлі так і не знайшлі. Унутры разаслалі дываны. Ежу рыхтавалі ў медных тазіках на драўняных вуг-

лях. Вогнішча распальвалі з вялікай цяжкасцю з-за разрэджанасці паветра. «Мерзлае віно, — пісаў пазней Ю.Ходзька, — было некранутае, гарбата, гарэлка, портэр, разбаўлены кіпенем, і снег, які раставаў у роце, складалі нашы напіткі»[10]. Мясцовыя жыхары, армяне, якія падымаліся на вяршыню з грузамі, спыняліся і вельмі здзіўляліся, не верачы сабе: па іх павер'і, Вялікі Арарат пакарыць чалавеку было немагчыма.

8(22) жніўня быў умерзлены ў лёд крыж, які салдаты і казакі прынеслі з даліны на вяршыню. 10(24) жніўня Юзэф Ходзька завяршыў назіранні на абедзвюх вяршынях гары — заходняй і ўсходняй, сеў у санкі і пачаў спускацца ўніз. З-за крутізны спуску прыйшлося перасесці на бурку. Праз тры гадзіны ён ужо знаходзіўся ў ніжнім лагеры і адпачываў на зялёным лузе.

Цяпер альпіністы, падымаючыся ўверх, захоўваюць акрэсленыя правілы і прытрымліваюцца асаблівага рэжыму працы і адпачынку. Юзэф Ходзька гэтага не ведаў і дзяліўся пазней сваімі адчуваннямі: «На самай вяршыні 19-га і 20-га (жніўня) я адчуваў расслабленне ўсяго арганізму, грудзі былі ахоплены сталлю, галава як жалезным абручом крэпка звязаная. /.../ Пры кожным некалькі паскораным руху пастаянна спынялася дыханне; асабліва ноччу, усялякі рух, неабходны для таго, каб захутацца ў шубу, якая развярнулася ў час сну, спыняла адпачынак»[11].

Унізе, у лагеры, Юзэф Ходзька заўважыў, што не можа зняць з ног боты і вымушаны быў іх разрэзаць, а ацёкшыя ногі каля трох гадзін трымаў у халодным ручаі, а потым яшчэ паўмесяца лячыў іх.

Услед за пакарэннем Вялікага Арарата Юзэфу Ходзьку ўдалося правесці адно з першых у гісторыі астраноміі высакагорнае назіранне за поўным сонечным зацьменнем. Гэта было 16 (28) ліпеня 1851 г. на гары Галаўдур на вышыні 3146 метраў[12]. Назіранні даследчыка паказалі, што сонечная карона і пратуберанцы на самой справе ўзнікаюць на сонцы.

Не толькі на Арараце Юзэф Ходзька і яго таварышы сустрэлі цяжкасці. У 1847 г. ім перашкаджала эпідэмія халеры. У 1849 г. буры зрывалі пастаўленыя тапаграфічныя піраміды, снегам заносіла іх. У 1850 г. паміж Эльбрусам і Казбекам снег пачаў растайваць і разрэзаў цясніны сваімі патокамі на ледзяныя рвы. Нагружаныя прыборамі людзі з цяжкасцю праходзілі праз іх, перакідваючы праз трэшчыны масткі. Увечары і раніцой, калі снег абмярзаў на паверхні леднікоў, прыходзілася прасякаць лесвіцу ў лёдзе. Гэта працягвалася больш за два месяцы.

У 1851—1852 гг. у Асеціі Юзэфу Ходзьку і яго спадарожнікам прыйшлося пераадолець прарэзаныя небяспечнымі глыбокімі трэшчынамі леднікі. На крутым спуску з аднаго ледніка людзі, якія пераносілі цяжкія рэчы, прабіраліся паўзком па камяністаму касагору да вертыкальнага абвалу, разрэзанага глыбокай трэшчынай. Спуск ускладняў туман. Два асеціны, якія ішлі наперадзе, знайшлі самае вузкае месца трэшчыны. Шырыня яе была шэсць з паловай метраў. З шастоў для

палатак зрабілі мост і перацягнулі груз на канатах.

Толькі на працягу пяці гадоў, з 1847 г. па 1852 г., Юзэф Ходзька падымаўся на вяршыні Аглаган (2998 м), Гадарэбі (3190 м), Гадзіс (2542 м), Галаўдур (3146 м), Зіма-Кох (3857 м). Адным з першых еўрапейцаў ён узыйшоў на высакагорную частку Грузіі Сванецію[13].

У 1852 г. на лезгінскай лініі геадэзічныя работы можна было праводзіць толькі пад прыкрыццем мясцовых стралкоў, таму што горцы абстрэльвалі атрад Юзэфа Ходзькі.

Ні хваробы, ні недаступнасць гор і цяснін, ні небяспека і нястачы, ні цяжкасці клімату не змаглі перашкодзіць волі чалавека. Невялікі атрад Юзэфа Ходзькі выканаў сваю задачу. Вялікі Каўказскі край быў абмераны. Нялёгкай была гэта перамога. Дваццаць дзевяць чалавек з атрада памерлі ад хвароб.

У 1853 г. закаўказская трыангуляцыя была завершана. Было дадзена дакладнае азначэнне 1386 пунктам па іх геаграфічнаму становішчу і вышыні над узроўнем мора, што дало магчымасць у далейшым пачаць дакладныя здымкі Закаўказзя.

У 1853 г. пачалася Крымская вайна. Атрад Юзэфа Ходзькі пад агнём турэцкіх аскераў праводзіў на турэцкім фронце тапаграфічныя здымкі. У 1856 г. ён правёў здымкі тагачаснай пагранічнай лініі ад Малога Арарата да Чорнага мора[14].

Толькі пасля канчатковага падаўлення нацыянальна-вызваленчай вайны горцаў супраць царызму Юзэф Ходзька змог вярнуцца да думкі прадоўжыць трыангуляцыйныя здымкі на поўначы ад Галоўнага Каўказскага хрыбта. Нягледзячы на шасцідзесяцігадовы ўзрост, Юзэф Ходзька зноў пачаў сваю нялёгкую працу і сам прыняў удзел у палявых працах. Пазней ён пісаў пра гэта: «Калі /.../ мы не сустрэлі даўно знаёмыя нам снягі, завеі, густыя туманы і холад, то вялікая гарачыня і стэпы, недахоп прыдатнай для піцця вады і мірыяды мух і камароў — жыхароў чароту і балот, рабілі становішча трыганаметрыстаў вельмі цяжкім».

Прырода адпомсціла смельчаку, які паквапіўся на разгадку яе таямніц. У 1864 г. хвароба на пяць гадоў зваліла нястомнага геадэзіста. Аднак Юзэфу Ходзьку ўдалося пабачыць вынікі сваёй працы на Каўказе. Закаўказская трыангуляцыя ўвайшла ў агульны лік усіх геадэзічных вымярэнняў Еўрапейскай часткі Расіі.

У 1867 г. Юзэф Ходзька пайшоў у адстаўку і пасяліўся ў Тыфлісе. Ён працягваў працаваць у навукова-даследчых таварыствах Каўказа. У 1868 г. вучонаму была прысуджана вышэйшая ўзнагарода Рускага геаграфічнага таварыства — вялікі Канстанцінаўскі медаль. 23 мая 1872 г. грамадскасць Тыфліса ўрачыста адзначыла пяцідзесяцігоддзе працы Юзэфа Ходзькі. Каўказскі аддзел Рускага геаграфічнага таварыства заснаваў дзве прэміі імя Ю.Ходзькі за лепшую працу па апісанню Каўказа.

Здароўе даследчыка, падарванае цяжкай працай, пагаршалася. Ён ля-

чыўся ў Карлсбадзе, Есентуках, але, як толькі адчуваў сябе лепш, зноў падымаўся ў дарагія яго сэрцу горы. У 1874 г. ён даследаваў леднікі Казбека і пабываў на адным з іх — Дзеўдоракскім, самая нізкая кропка якога знаходзілася на вышыні 2296 метраў. Ён выязджаў у 1875 г. на Міжнародны геаграфічны кангрэс у Парыж.

Юзэф Ходзька адстойваў інтарэсы айчыннай навукі. У 1876 г. ён выступіў з адказам французскаму аўтару Анры Кардзье. Той сцвярджаў, што «даследаванне вялікага Каўказскага хрыбта было да цяперашняга часу няпоўнае: ні рускія афіцэры, ні падарожнікі-іншаземцы на самой справе не пранікалі сур'ёзна ў краіну вечных снягоў».

«На чым заснаваны гэты прысуд? — задаваў пытанне Юзэф Ходзька. — Няўжо пан Кардзье не ведае, што «Запіскі Ваенна-Тапаграфічнага дэпо Галоўнага штаба», выдадзеныя ў С.-Пецярбургу, змяшчаюць: 1) Частка XX, 1859 г., падрабязнае апісанне Закаўказскай трыангуляцыі, і 2) частка XXX, 1869 /г./, і частка XXXI, 1870 /г./, працяг гэтай трыангуляцыі на Паўночным Каўказе»? Далей даследчык пісаў: «Сур'ёзнае вывучэнне Каўказа пачынаецца з 1847 г., больш дваццаці гадоў таму, чым мімалётны праход праз Каўказ англійскіх турыстаў у 1869 і 1875 гадах»[15].

Нядаўна, у 70-я гады XX ст., зноў стала праектавацца работа па пабудове Транскаўказскай чыгункі. Але яшчэ каля ста гадоў таму Юзэф Ходзька прапаноўваў згодна са сваімі даследаваннямі правядзенне такога шляху праз Квінамцкі або Буслачырскі перавалы і настойваў на праверцы нівеліровак трыганаметрычных пунктаў Каўказскай трыангуляцыі, праведзенай ім у 50—60-я гады XIX ст. У архіве Геаграфічнага таварыства ў С.-Пецярбургу мною было выяўлена яго «Дадатковае меркаванне аб мяркуемай пабудове чыгункі ад Тыфліса да Уладзікаўказа» ад 3 мая 1878 г. Да гэтага Юзэф Ходзька складаў такую ж запіску ўлетку 1876 г.[16]

Памёр Юзэф Ходзька 21 лютага 1881 г. «ад удару галоўнога мозгу і паралічу». Урач Даманскі ў сваім афіцыйным заключэнні наконт смерці пісаў: «Прычынай такога можна лічыць уседлівыя разумовыя заняткі генерал-лейтэнанта Ходзькі, таму што да апошняй хвіліны жыцця ён пастаянна быў заняты прывядзеннем у сістэматычны парадак сваіх назіранняў»[17].

Працы нашага земляка былі ацэнены сучаснікамі па вартасці. Выдатны нямецкі прыродазнавец і географ Аляксандр Гумбальт пісаў 3 снежня 1850 г. галоўнакамандуючаму войскамі на Каўказе князю М.С.Варанцову: «Рэдка сустракаецца, каб праца, карысная для навукі і для наступных спроб прыкласці яе да практыкі, мела ў сваім распараджэнні такую сучасную і старанную трыангуляцыю, як тая, што выканана (наколькі мне вядома) палкоўнікам Ходзькам»[18].

Высока ацэньваў працу Ю.Ходзькі і вядомы расійскі астраном У.Я.Струве[19].

Лепшым помнікам Юзэфу Ходзьку засталіся трыганаметрычныя пун-

кты і вышкі, размешчаныя па ўсім Каўказе і Закаўказзі, хоць на іх і няма прозвішча нашага земляка.

Спасылкі:

[1] Пра яго гл: Chodźko D. Jan Chodźko // Teka Wileńska. 1858. ą 5, s. 271–292.

[2] Morawski S. Kilka lat młodości mojej w Wilnie (1818–1825). Wyd. 2. Warszawa, 1959, s. 316.

[3] Пра педагагічны ўплыў гэтай кнігі на вучняў у вясковых школах, у тым ліку на Паўлюка Бахрыма гл.: Beauvois D. Szkolnictwo polskie na ziemiach Litewsko-ruskich. 1803—1832. Rzym, Lublin, 1991. T. 2, s. 420—424.

[4] Morawski S. Kilka lat (...), s. 316.

[5] Падрабязна пра Т.Зана гл.: Грицкевич В. Ташкараган ищет золото // Грицкевич В.П. От Немана к берегам Тихого океана. Мн., Полымя, 1986, с. 92—131.

[6] Цыт па: Вержбовский Ф. К истории тайных обществ и кружков среди польско-литовской молодежи в 1819—1823 годах. Оттиск из «Известий Варшавского университета». 1897. Вып. VIII и IX, с. 3, 74.

[7] Szumski S. W walkach i więzieniach. Pamiętniki ■ lat 1812–1848. Wilno, 1931, s. 67–68; Rabinowiczówna S. Wilno w powstaniu roku 1830–1831. Wilno, 1932, s. 45, prym. 1.

[8] Муравьев-(Карсский) Н.Н. Русские на Босфоре в 1833 году. Из записок /.../. М., 1869, с. 337.

[9] Ходзько И.И. Воспоминания /.../ о восхождении на вершину Большого Арарата в 1850 г. Тифлис, /б.г./. 13 с.

[10] Там жа, с. 10.

[11] Там жа, с. 12.

[12] Ходзько И.И. Свод наблюдений, произведенных в разных местах Кавказского и Закавказского края 16/28 июля 1851 года // Записки Кавказского отдела Русского Географического общества. Тифлис, 1852. Кн. 1, с. 33—142.

[13] Lettres de M.Bartholomei, relatives aux antiquites Georgienne; envoi de M. Le Colonel Khodzko, ibscription d' Akhal-Kalak, par M.Perevalenko. (lu le 14 Octobre 1853). // Melanges asiatiques tires du Bulletin historico-philologique de l'Academie Imperiale des sciences de St. Petersbourg. 1852. T. 11. Ire livraisan, p. 344.

[14] Муравьев- (Карсский) Н.Н. Война за Кавказ в 1855 г. Спб., 1877. Т. 1. Ч. 2, с. 130—131.

[15] Архив Русского Географического общества в С.-Петербурге. Разряд 52. Опись 1. № 70, л. 12.

[16] Там жа, р. 52, оп. 1, № 38.

[17] Центральный Российский государственный военно-исторический архив в Москве. Фонд 400, 1881 г., д. 281, л. 8.

[18] Переписка Александра Гумбольдта с учеными и государственными деятелями России. М., 1962, с. 169.

[19] Цыт. па: О ходе работы по триангуляции Закавказского края // Записки Кавказского отдела Русского Географического общества. Тифлис, 1852. Т. 1, с. 8.

Літаратура:

1. Большаков Е.Н., Вайнберг Б.В., Никитин П.И. Иосиф Иванович Ходзько, ученый-геодезист. М., 1960. 146 с.
2. Вейнберг Л. Ходзько Иосиф Иванович // Русский биографический словарь. СПб., 1901. Т. «Фабер-Цявловский». С. 386—388.
3. Грыцкевіч В. З роду Ходзькаў // Полымя, 1990, № 5. С. 193—199.
4. Ён жа, Юзэф Ходзька // Настаўніцкая газета. 1993, 24 ліпеня, № 57—58.
5. Стебницкий И.И. Иосиф Иванович Ходзько // Кавказский календарь на 1882 год. Тифлис, 1881. Отдел II. С. 57—65.
6. Ён жа, Иосиф Иванович Ходзько // Известия Кавказского отдела Русского Географического общества, 1882—1883. Т. 7, № 1. С. 15—24 (Портрет).
7. Ходзько Иосиф Иванович // Энциклопедический словарь. Изд. Ф.А.Брокгауз, И.А.Ефрон. СПб., 1903. Полутом 73. С. 476.
8. Crickevičius V. Kalnuose jo širdis // Crickevičius V. Dešimt kelių iš Vilniaus. Vilnius: Mintis, 1972, psb. 39—52.
9. Zwolski B. Chodźko Józef // Polski słownik biograficzny. Kraków, 1937. T. 3, s. 385.

Валянцін Грыцкевіч

Ігнат ДАМЕЙКА

(1802—1889)

Зямля продкаў мае велізарную прыцягальную сілу. У гэтым я яшчэ раз пераканаўся ў апошні час, калі Беларусь наведалі нашчадкі Ігната Дамейкі. Унучаты пляменнік Мар'юш Германовіч, які жыве ў Францыі, прыехаў у Мінск, Карэлічы і Медзвядку, на радзіму выдатнага вучонага і падарожніка, у верасні 1998 г., каб прыняць удзел у навуковай канферэнцыі, прысвечанай сябру Ігната Дамейкі Адаму Міцкевічу, і пасадзіў дубок ля каменя, якім ушанаваны на радзіме яго продак. А праўнучка Альфонса Паз у маі 1999 г. дабралася ў Мінск з Аўстраліі праз Злучаныя Штаты і Францыю. Чатыры дні правяла яна ў паездках па Беларусі, каб як мага больш даведацца пра зямлю, адкуль паходзіў яе прадзядуля.

Хто ж такі Ігнат Дамейка і чаму мы павінны вярнуць з небыцця яго імя? Каб адказаць на гэтыя пытанні, найперш вазьміце атлас і прыгледзьцеся да карты паўднёва-амерыканскай краіны Чылі. Ля Ціхага акіяна, там, дзе да яго падступаюць магутныя вяршыні Андаў, знаходзіцца горад Дамейка. А крыху паўночней — горны хрыбет, які носіць тое ж імя. Геолагі могуць назваць мінерал дамейкін, батанікі — фіялку дамейкіяну, заолагі — малюска науцілус дамейкус. Аднак сёння мала хто ведае, што ўсё гэта названа так у гонар нашага земляка Ігната Дамейкі. Сын беларускай зямлі, ён увайшоў у сусветную навуку, пакінуў прыкметны след у самых розных галінах чалавечых ведаў: мінералогіі і фізіцы, хіміі і металургіі, геаграфіі і батаніцы, геалогіі і педагогіцы, этнаграфіі і заалогіі. За свой доўгі жыццёвы шлях ён адкрыў багата залежаў серабра і медзі, напісаў 130 навуковых прац, якія друкаваліся на французскай, нямецкай, польскай, рускай, англійскай, іспанскай і іншых

мовах. На жаль, сярод іх пакуль што няма мовы беларускай.

...Кіламетрах у 15 ад Міра (цяпер гэта Карэліцкі раён), над берагам рэчкі Уша, у пачатку мінулага стагоддзя стаяў драўляны палац з мудрагелістай вежай. Тут, у маёнтку Медзвядка, у сям'і старшыні навагрудскага земскага суда Іпаліта Дамейкі 31 ліпеня 1802 г. нарадзіўся сын, якому далі імя Ігнат. Дзяцінства будучага вучонага прайшло ў беларускай вёсцы. Хлопчык вельмі любіў слухаць народныя казкі, якія па вечарах расказвала старая прыгонная Тадора. Ад яе ён навучыўся беларускай мове.

У 1816 г., закончыўшы калегію ў Шчучыне, Дамейка накіраваўся ў Віленскі універсітэт. З затоеным дыханнем слухаў юнак лекцыі такіх выдатных вучоных, як Лялевель, Бароўскі, Франк, браты Снядэцкія. Адначасова з Дамейкам у Віленскім універсітэце вучыўся другі слаўны сын зямлі беларускай, чыё імя ўжо тады было вядома аматарам паэзіі. Гэта быў геніяльны польскі паэт, ураджэнец Навагрудчыны Адам Міцкевіч. Неўзабаве ён пазнаёміўся з Дамейкам і ўцягнуў яго ў тайнае студэнцкае таварыства філаматаў пад канспіратыўным псеўданімам Жэгота. У Віленскім універсітэце Дамейка пасябраваў з многімі філаматамі. Сярод іх былі паэт і фалькларыст Ян Чачот і выхаванец Мінскай гімназіі, адзін з першых польскіх паэтаў-рэвалюцыянераў Тамаш Зан, высланы потым царскімі ўладамі ў аддаленыя губерні. З Вільні маладыя патрыёты часта выязджалі ў вёску, у тую ж самую Медзвядку, якая потым была ўвекавечана Міцкевічам у яго эпапеі «Пан Тадэвуш» (сцэна дуэлі паміж Дамейкам і Давейкам). У адну з такіх паездак Дамейка пазнаёміў Міцкевіча са сваёй стрыечнай сястрой Марыяй Верашчака. Звычайнае сяброўства хутка перарасло ў страснае пачуццё.

У 1823 г. царскім уладам удалося натрапіць на след тайных арганізацый. У турмы было кінута больш за сто юнакоў. Камеры Міцкевіча і Дамейкі аказаліся побач — у сценах былога базыльянскага манастыра. Потым, апісваючы прабыванне ў гэтай турме ў трэцяй частцы паэмы «Дзяды», Міцкевіч паказаў свайго сябра Дамейку ў вобразе Жэготы. Той, хто чытаў паэму, памятае, што Жэгота расказвае зняволеным алегарычную байку пра д'ябла, які рашыў пасмяяцца над чалавекам і закапаў зерне капытом у зямлю, не ведаючы, што яно можа даць новыя ўсходы. І ў гэтых алегарычных словах быў глыбокі сэнс. Хаця царскія ўлады адправілі Міцкевіча і яго сяброў у ссылку, хаця пад строгім наглядам паліцыі апынуўся ў вёсцы Заполле на Лідчыне, а потым у Жыбуртоўшчыне ля Дзятлава Ігнат Дамейка, зерне, кінутае філаматамі, не прапала дарэмна. Іх прыклад натхніў на барацьбу наступныя пакаленні.

У лістападаўскую ноч 1830 г., нібы працягваючы справу філаматаў, нападам на Бельведэр пачала ўзброенае паўстанне варшаўская моладзь. Неўзабаве яно перакінулася ў Літву і Беларусь. Ігнат Дамейка адразу ж

прымкнуў да паўстанцаў. З важным даручэннем ён паехаў у наднёманскія лясы і па дарозе ледзь не загінуў ад рук тых жа паўстанцаў, якія па памылцы прынялі яго за шпіёна. Разам з іншымі мясцовымі патрыётамі недалёка ад Ліды Дамейка далучыўся да арміі генерала Хлапоўскага і ў яе шэрагах змагаўся супраць царскага самаўладства. Аднак, нягледзячы на гераічныя намаганні, паўстанне пацярпела паражэнне — яго не падтрымалі прыгонныя сяляне. Разам з арміяй Хлапоўскага Дамейка вымушаны быў перайсці прускую граніцу і скласці зброю.

Па дарозе ў Францыю, у Дрэздэне, наш зямляк зноў сустрэўся са сваім студэнцкім сябрам Адамам Міцкевічам, які тады працаваў над паэмай «Пан Тадэвуш». Пазней, калі абодва эмігранты нелегальна дабраліся да Парыжа, калі з-пад друкарскага станка выйшаў першы экземпляр паэмы, Міцкевіч падарыў яго Дамейку.

У Парыжы Ігнат Дамейка апынуўся ў самым цэнтры польска-беларуска-літоўскага эміграцкага руху. Ён часта выступаў на мітынгах з палымянымі прамовамі, заклікаючы працягваць барацьбу з царызмам, зблізіўся з такім выдатным дзеячам эміграцыі, як былы прафесар Віленскага універсітэта Іяахім Лялевель. Адным з бліжэйшых сяброў Дамейкі стаў ураджэнец Слонімшчыны Міхал Валовіч, які ў 1833 г. нелегальна вярнуўся ў Беларусь, спрабаваў тут узняць сялянскае паўстанне і быў за гэта павешаны ў Гродне. Але ў Парыжы Дамейка хадзіў не толькі на патрыятычныя сходы. Ён наведваў лекцыі ў славутым Калеж дэ Франс, Сарбонскім універсітэце і Горнай школе.

У 1838 г. Дамейка даведаўся, што ў Чылійскай рэспубліцы патрэбны выкладчыкі хіміі і мінералогіі. З дапамогай таго ж Міцкевіча быў аформлены кантракт на 6 гадоў. Адпраўляючыся ў марское падарожжа на англійскім караблі «Спей», малады вучоны не падазраваў, што яго прабыванне ў далёкай краіне зацягнецца на 46 год і што Чылі стане для яго другой радзімай.

У Рыо-дэ-Жанейра Дамейка сышоў з карабля і, наняўшы некалькі мулаў і коней для перавозкі закупленага ў Парыжы лабараторнага абсталявання, адправіўся праз увесь кантынент у Чылі. У пустынях і стэпах падарожніка мучылі смага і спёка, у дрымучых лясах трывожылі індзейскія плямёны антыподаў (так называлі тады дзікіх жыхароў супрацьлеглага паўшар'я), у гарах засыпаў снег, пагражалі абвалы. Але нястомны адкрывальнік ехаў наперад. І вось за перавалам у стромкіх Андах ён сустрэў першых чылійцаў — жыхароў маладой тады паўднёваамерыканскай рэспублікі, якая толькі ў 1818 г. вызвалілася ад прыгнёту еўрапейскіх каланізатараў. Гэта былі пераважна нашчадкі мясцовых індзейцаў. Свабодалюбівыя, яны стагоддзямі змагаліся супраць іспанскіх захопнікаў і выстаялі ў няроўнай барацьбе. З цікавасцю прыглядаўся Дамейка да стракатай вопраткі чылійцаў, пашытай з грубых шарсцяных

тканін, да каларытных нацыянальных танцаў і гульняў.

Авалодаўшы за тры месяцы іспанскай мовай, малады вучоны пачаў чытаць лекцыі па хіміі і мінералогіі ў Горнай школе горада Какімба. Разам са сваімі вучнямі ён падарожнічаў у горы — туды, дзе здабываліся серабро і медзь, золата і вугаль. З жахам глядзеў Дамейка на мясцовых шахцёраў, якім за мізэрную плату прыходзілася працаваць у невыносна цяжкіх умовах. Здабытую руду яны выносілі на спіне па маленькіх прыступках, высечаных у тоўстым бервяне, якое вертыкальна ставілася ў ствол шахты. У гэтых падарожжах Дамейка адкрыў і апісаў багата залежаў карысных выкапняў. Ён першы звярнуў увагу на мясцовую салетру, пасля чаго яна заваявала папулярнасць ва ўсім свеце як вельмі карыснае ўгнаенне. Вярнуўшыся з гор у Какімба, Дамейка паслаў ураду петыцыю, у якой запатрабаваў палепшыць умовы працы гарнякоў. І ўрад прыслухаўся да яго голасу.

У 1834 г. скончыўся тэрмін дамовы аб прабыванні Дамейкі ў Чылі. Але вучоны застаўся ў сталіцы краіны Сант'яга, дзе яму прапанавалі месца прафесара фізікі і хіміі ў нацыянальным універсітэце. Вядома, і ў Сант'яга Дамейка часта марыў аб звароце на радзіму, сніў беларускія палі і лясы. Яму было душна ў мурах, узведзеных іспанцамі. І ўсё ж вярнуцца ён не мог, бо ў царскай Расіі яго чакала ссылка.

У Сант'яга Дамейка пазнаёміўся з пятнаццацігадовай дзяўчынай Гусман дэ Сатамаёр, якая неўзабаве стала яго жонкай і памочніцай. На ўскраіне сталіцы вучоны пабудаваў сабе ўтульны домік, абсадзіў яго экзатычнымі дрэвамі. Тут, у строгім кабінеце, была напісана большасць яго навуковых прац. Тут, ля ўтульнага каміна, збіраліся лепшыя людзі Чылі — вучоныя, дзяржаўныя дзеячы — і раіліся, што зрабіць для прагрэсу краіны. Па заданню ўрада Дамейка распрацаваў і правёў школьную рэформу, пасля чаго навучанне ў Чылі стала больш дэмакратычным і агульнадаступным.

Неўзабаве Ігнат Дамейка адправіўся ў падарожжа — туды, дзе жыло амаль дзікае індзейскае племя араўканаў. Па стромкіх скалах і вісячых мастах ляжаў шлях падарожніка ў глыбіню краіны. Часам прыходзілася перасядаць на плыт, з якога вельмі зручна было паляваць на драпежных пум. Індзейцы сустрэлі «бледнатварага» госця вельмі зычліва. Яны гаварылі яму аб сваім жаданні жыць у міры з еўрапейцамі, наладжвалі ў яго гонар свае спартыўныя спаборніцтвы — так званую куэчу. У сваю чаргу Дамейка абдорваў араўканак бліскучымі пацеркамі, званочкамі і кваціістымі хусткамі. Вялікае ўражанне на вучонага зрабіла старажытнае індзейскае мастацтва, незвычайныя магільнікі.

Сваё чарговае падарожжа Дамейка апісаў у кнізе «Араўканія і яе жыхары», якая ў 1860 г. выйшла ў Вільні, у друкарні Юзафа Завадскага. Пераклаў яе з іспанскай на польскую мову Ян Замастоўскі, карэспан-

дэнт «Газэты Варшавскей» у Парыжы. Відаць, ён пабываў у Чылі і сустракаўся з аўтарам, бо ў прадмове параўноўвае паўднёваамерыканскія раўніны з «херсонскімі стэпамі» (такое мог напісаць толькі відавочца) і піша, што мае працу Ігната Дамейкі па мінералогіі, якую таксама намерваўся перакласці, але спалохала спецыфічная тэрміналогія.

Кніга пачынаецца з «Гістарычнага ўступу перакладчыка», дзе гаворыцца пра лёс індзейскага племені араўканаў, якія доўга і адчайна супраціўляліся іспанскім заваёўнікам. Гэтаму змаганню прысвечаны аднайменныя паэмы «Араўканія» іспанскіх паэтаў Эркілі і Асорыі, драма Лопэ дэ Вэга (змест іх падрабязна пераказваецца). Сімпатыі перакладчыка адназначна на баку араўканаў. Ён лічыць далёкую і свабодную паўднёваамерыканскую краіну ўзорам для сваёй заняволенай царызмам радзімы: «Чылійская рэспубліка належыць да самых спакойных і найлепей кіраваных ранейшых іспанскіх калоній, якія сёння заваявалі незалежнасць. Публіцысты тлумачаць такую незвычайную памыснасць памяркоўнасцю ўладаў, развіццём гандлю і заможнасцю...»*.

На такіх жа пазіцыях стаяў і сам Ігнат Дамейка. Найперш ён падкрэслівае імкненне араўканаў да свабоды, незалежнасці, што тады было вельмі актуальным і для суайчыннікаў, землякоў аўтара. Прыгадаем, што кніга выйшла ў пераломны час: на самым пярэдадні адмены прыгоннага права, рэвалюцыйнага ўздыму, які прывёў да вызваленчага паўстання 1863—1864 гг. Таму вельмі актуальна гучалі словы Ігната Дамейкі пра адвагу араўканаў, якія адчайна змагаліся з захопнікамі і не аднойчы перамагалі: «Хаця іспанцам удалося на некаторых малых умацаваннях узняць знакі свайго панавання, араўканскі народ не перастаў быць незалежным і з пакалення ў пакаленне пераказваў славу сваіх продкаў, здабытую ў тых баях» (62).

Кніга нашага суайчынніка складаецца з трох частак. У першай, пад назвай «Фізічнае становішча і прырода краю, у якім жывуць араўканы», апісваецца вонкавы выгляд краю, назву якому дала араўка́нія — стромкая і велічная сасна, падобная «на калону старажытнага храма». Шышкі яе замянілі мясцовым жыхарам хлеб. Ігнат Дамейка любуецца прыгажосцю экзатычных мясцін. Яго апісанні сведчаць аб несумненным пісьменніцкім таленце аўтара. Возьмем для прыкладу вось гэта: «Дарога бяжыць уздоўж узараных схілаў, парослых карыцай і ляшчынай. Дзве пасмы ўзгоркаў, засеяных пшаніцай, ажыўленых жытлом індзейцаў, што агароджана пасярод яблыневых садоў, зялёных палёў і выпасаў, паніжаюцца на захад, у бок мора, і на ўсім гэтым схіле рассеяны хаты з агародамі і нязлічанымі платамі. Шырокае лугавіннае ўзвышша падзя-

* Domejko I. Araukania i jej mieszkańcy: Wspomnienia z podróży po Południowych prowincyach rzeczypospolitej Chilijskiej. Wilno, 1860. S. 17. Далей старонкі гэтага выдання ўказваюцца ў тэксце ў дужках.

ляе гэтыя два ланцугі гор, пасярод якіх велічна плыве шырокая і цудоўная Царская рака, аколеная роўнымі нязвілістымі берагамі; удалечыні відаць мора і зрэдку самотныя скалы, а вышэй зруйнаваны ўжо два стагоддзі таму Царскі горад. На гарызонце, ад поўначы і ўсходу, пануюць шырокія вяршыні чорных гор» (101—102).

Падарожнік падрабязна апісвае таксама мясцовых жыхароў — іх жытло, агароды, палі. Доўгія і частыя гутаркі з араўканамі пераканалі нашага земляка, што, наперакор распаўсюджаным тады меркаванням, па сваіх разумовых здольнасцях, гаспадарлівасці яны не ўступаюць еўрапейцам: «Нічога варварскага, народ працавіты, палі шырокія і добра дагледжаныя, жывёла ўкормленая, а коні адпаведныя, усё гэта сведчыць пра памыснасць і працяглы мір» (102).

Думка аб праве паўднёваамерыканскіх індзейцаў на свабоднае і заможнае жыццё (актуальнай яна была і для тагачасных беларусаў!) асабліва часта падкрэсліваецца ў другой частцы кнігі пад назвай «Маральны стан, у якім сёння прабываюць араўканы, іх звычаі і побыт». Аўтару было цяжка пра іх пісаць, бо, па-першае, мала сярод іх жыў і, па-другое, чуў пра іх многа прадузятага, дрэннага. Нібы яны ні ў што не вераць, аддаюць перавагу злому. Аднак, пераканаўся аўтар, гэта не так. Вераць араўканы ў «Бога, стваральніка неба і зямлі і ў неўміручасць душы». «...хаця пагружаныя ў цемру і варварства. Адчуванне неўміручасці ў іх такое жывое, такімі выразнымі выяўляецца колерамі, у веры іх столькі моцы і ўпэўненасці, што ў гэтым дачыненні часта пераўзыходзяць людзей цывілізаваных, у якіх рэлігійнае перакананне застыгла» (120). І толькі ў стане вайны араўканы пераўвасабляюцца: становяцца жорсткімі, помслівымі.

Шматлікія сустрэчы прывялі Ігната Дамейку да пераканання ў паўнацэннасці індзейцаў, іх падрыхтаванасці да грамадскага жыцця ў незалежнай Чылійскай рэспубліцы (аўтар, відаць, свядома ўвесь час называе яе рэчпаспалітай, нібы згадваючы пра тую «Рэч Паспалітую абодвух народаў», што была падзелена паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй). Вось адзін з вывадаў: «Такім выглядае індзеец у сваім хатнім жыцці, на ўлонні міру і пры поўным суцішэнні сваіх азартаў. Падарожнік, бачачы яго ў такім стане і разважаючы пра сямейнае жыццё індзейцаў, яго заможнасць і выгоды, якімі ён карыстаецца, здаровы розум, разважлівасць, гасціннасць і ветлівае абыходжанне, ніяк не ўспрымае яго ані дзікуном, ані варварам — хутчэй прыйдзе ў галаву думка пра яго вышэйшасць у параўнанні з многімі народамі хрысціянскага свету» (139).

Адначасова вучоны бачыць у жыцці араўканаў і прыкметны рэгрэс. Гады прымусу, каланізацыі не маглі прайсці бясследна. Адышлі ў нябыт вогненныя тэлеграфы, «якія кансалідавалі народ, узнімаючы яго дзеля абароны хатніх ачагоў». І, галоўнае, аслабела гістарычная памяць,

часткова перапыніліся традыцыі. «Другім сімптомам упадку або, хутчэй, выгасання старадаўняй маральнай ідэі, якая натхняла гэты народ на мужнасць і надзвычайную стараннасць у абароне свабоды і незалежнасці краіны, з'яўляецца амаль поўнае паслабленне традыцыі і памяці пра колішнія вялікія дзеянні і гістарычны гераізм. Традыцыі, гэты святы скарб, сапраўднае нацыянальнае багацце, крыніца неўміручага жыцця нацыі, заўсёды ўзнікалі ў адзінай святыні веры гераічных народаў старажытнасці, і заўсёды іх зберагалі святары і паэты. Нацыянальны дух, іх высакародная годнасць знікалі толькі тады, калі знікала вера і занядбоўвалі абрады, пакідаючы адкрытую прастору сафістам, палітыкам і прамоўцам» (154).

Зноў жа: як гэта надзённа гучала і гучыць для беларусаў — і ў 1860 г. і цяпер.

У трэцяй частцы пад назвай «Прычыны, якія перашкаджаюць у цывілізаванні араўканскіх індзейцаў, і сродкі, што здаюцца найбольш адпаведнымі для дасягнення гэтай мэты» Ігнат Дамейка разважае, што трэба зрабіць у Чылі для прагрэсу краіны (парады лёгка дастасоўваліся і да зямель былога Вялікага княства Літоўскага, у сталіцы якога нібы спецыяльна і была выдадзена кніга). Найперш гэта развіццё прамысловасці і гандлю, пракладка дарог (нават слова «транзіт» з'яўляецца) і аднаўленне разбураных гарадоў. Затым — маральнае, духоўнае, рэлігійнае абнаўленне. Аргументуючы свае вывады, аўтар імкнецца надаць ім тэарэтычнае абгрунтаванне, вызначае рысы пастулальнага развіцця грамадства ўвогуле. І зноў многія палажэнні былі сугучныя з настроямі будучых паўстанцаў Кастуся Каліноўскага. Ігнат Дамейка, які крыху раней лічыў, што араўканаў трэба і можна цывілізаваць толькі мірным шляхам, раптам пачынае апраўдваць войны, узброеную барацьбу за вызваленне, высокую мэту: «Больш высакароднымі і ўзвышанымі з'яўляліся мэты, якімі кіраваліся нацыі, сапраўды заслужаныя для прагрэсу чалавецтва і маральнага развіцця іншых народаў — нават тады, калі раптоўная патрэба або дрэнна зразуметая ці імгненная экзальтацыя загадвалі ім выкарыстоўваць сілу. Уздым душы і думкі, моцнае *нацыянальнае перакананне* (тут і далей выдзелена мной. — *А.М.*), годнасць чалавека, яго маральнае шчасце ў гэтым і іншым жыцці, *любоў да свабоды* і неўміручых ісцін — вось такія былі *ўзвышаныя прычыны войнаў*; адным словам, вялікая цікавасць да сапраўднага прызначэння чалавека была адзінай стыхіяй *вялікіх дзеянняў* у народзе, у якога адзінай сілай і адзінай крыніцай натхненняў з'яўлялася рэлігійная вера і перакананне» (167).

Але тут жа, нібы спахапіўшыся, аўтар зноў пераконвае чытача, што араўканаў нельга «пераконваць» узброенай сілай. «Характар індзейцаў, калі мы возьмем яго ў нармальным стане, г. зн. у стане міру, бо чалавек

створаны для міру, а не для вайны, гэты характар, кажу, вызначаецца ветлівасцю, годнасцю, здольнасцю да найвышэйшай дабрачыннасці, гасціннасцю, схільнасцю да міру і парадку, любоўю да айчыны, дбайнасцю пра незалежнасць хатняга вогнішча, прадбачлівасцю, энергічнасцю, паважнасцю і наяўнасцю ўсяго таго, што павінна ўпрыгожваць сапраўднага грамадзяніна» (174).

Толькі адкрытая і шчырая ўрадавая палітыка, толькі гаспадарчы прагрэс, рэформа нораваў і пашырэнне адукацыі здольны, лічыць аўтар, пераўтвараць Араўканію і адначасова захаваць «моц і гарт старадаўняга араўканскага характару».

І яшчэ адна парада нашага суайчынніка чылійскім уладам, актуальная для беларусаў — і тады, і цяпер: чыноўнікам трэба ведаць араўканскую мову, «лепш яе вывучаць» (196).

Завяршаецца кніга артыкулам Міх. Б. (гэта, несумненна, віленскі гісторык Міхал Балінскі) «Звесткі пра жыццё і працы аўтара «Араўканіі». Пра Ігната Дамейку, удзельніка паўстання 1831 г., палітычнага эмігранта, гаворыцца тут, зразумела, вельмі асцярожна: маўляў, аддаліцца з краю мусіў ён «у выніку неспадзяваных абставін». Называюцца навуковыя працы нашага суайчынніка, з 1846 г. — прафесара універсітэта ў Сант'яга: «Elementos de Fisica experimental», «Elementos de mineralogia», «Introdution al estudio de las ciencas naturales». Гаворыцца пра шматлікія артыкулы ў парыжскіх часопісах.

«Араўканія» Ігната Дамейкі, несумненна, мела для беларускага, польскага, літоўскага чытача вялікую пазнавальную каштоўнасць: расказала яму пра невядомы народ, экзатычную краіну (апісанні падарожжаў тады былі ў асаблівай модзе). Але таксама несумненна, што ў кнізе быў вялікі выхаваўчы патэнцыял. Яна не магла не ўзбуджаць у тагачаснай моладзі грамадзянскую свядомасць, вызваленчыя настроі і тым самым рыхтавала глебу для паўстанцкага ўздыму 1863 г.

Пасля Араўканіі Дамейка адправіўся ў небяспечнае падарожжа да дзеючага вулкана Антука. Моцны вецер і паток лавы не дазволілі вучонаму дабрацца да самага кратэра. Але затое наш зямляк зрабіў першае апісанне гэтага вулкана.

Неўзабаве чылійская грамадскасць выбрала Дамейку рэктарам універсітэта ў Сант'яга, а потым тройчы перавыбірала яго на гэтай пасадзе. Ад рэктарства Дамейка адмовіўся толькі ў 1884 г. і зрабіў гэта па гуманнай прычыне — у знак пратэсту супраць захопніцкай вайны Чылі з суседняй рэспублікай Перу. Прыняўшы адстаўку, чылійскі ўрад рашыў выпусціць у гонар нашага земляка памятны медаль і ўстанавіць яму высокую пенсію ў краіне — 6000 піястраў у год.

У тым жа 1884 г., памеркаваўшы, што царскія ўлады ўжо не ў сіле нічога зрабіць яму, сусветна вядомаму вучонаму, Дамейка рашыў наве-

даць радзіму. З сабой ён вёз багатую калекцыю мінералаў у падарунак еўрапейскім універсітэтам. У Парыжы Дамейку ўрачыста віталі вучоныя Сарбоны. У Кракаве яму прысудзілі навуковую ступень ганаровага доктара. На варшаўскім пероне яго сардэчна цалаваў сябра студэнцкіх год польскі паэт Антон Адынец, адзіны, апрача Дамейкі, філамат, які яшчэ застаўся ў жывых. Царскім уладам, вядома, не прыйшлося даспадобы гэта падарожжа — яны на чатыры месяцы затрымалі ў Гродне пашпарт вучонага. Але мясцовая інтэлігенцыя з энтузіязмам сустракала свайго земляка, чалавека ■ легендарнай біяграфіяй. Беларускія сляне падносілі яму хлеб-соль, віталі народнымі песнямі. У Крошыне Дамейка і Адынец пасадзілі на памяць два дубкі, а вершаваны надпіс на камені ля дубкоў выбіў ім мясцовы каваль — відаць, жывы тады яшчэ Паўлюк Багрым. Нейкі час у Дамейкі была нават думка застацца на радзіме. Але хіба тут далі б яму спакойна жыць і працаваць?! Пабываўшы яшчэ ў Італіі і Палесціне, Дамейка разам з усёй сям'ёй зноў вярнуўся ў Чылі.

23 студзеня 1889 г. у Сант'яга перастала біцца сэрца патрыёта, падарожніка, вучонага. Дзень яго пахавання быў аб'яўлены днём нацыянальнай жалобы. Урад абвясціў Дамейку нацыянальным героем рэспублікі. На яго магіле быў пастаўлены мармуровы абеліск.

Памяць пра вялікага асветніка і гуманіста жыве ў Чылі і цяпер. Вядомы паэт Пабла Няруда ў 1953 г. назваў дзейнасць Дамейкі выдатнай, прагрэсіўнай дзейнасцю, якая прывяла ў Чылі да «рэарганізацыі прамысловасці, вышэйшага і сярэдняга навучання». Імя Дамейкі з удзячнасцю называлі чылійскія парламентарыі, якія наведвалі нашу краіну ў 1968 г. Дзейнасці вучонага прысвечаны дзесяткі манаграфій. Выдадзены яго дзённікі, перапіска. Яго імя мае бібліятэка ў Буэнас-Айрэсе, яно ўвекавечана памятнай дошкай на будынку Вільнюскага універсітэта, у экспазіцыях школьных музеяў Карэліцкага і Лідскага раёнаў. І гэта — заслужаная даніна павагі нашаму земляку, спадчына якога належыць адначасова тром розным народам — беларускаму, польскаму і чылійскаму.

Бібліяграфія:

1. Булай М. Лідскія шляхі Ігната Дамейкі // Наш радавод: З гісторыі Лідчыны. Ліда, 1994. Кн. 6. С. 78—82.

2. Грицкевич В.П. Народный герой Чили // Грицкевич В.П. Путешествия наших земляков. Мн., 1968. С. 97—119.

3. Каратынскі В. Ігнат Дамейка ў Варшаве / Пер. з пол. У.Мархеля // Каратынскі В. Творы. Выд. 2. Мн., 1994. С. 335—345.

4. Клейн Б.С. «Гранде эдукатор» // Клейн Б.С. Найдено в архиве. Мн., 1968. С. 61—72.

5. Мальдис А. Об Игнате Дамейке — в Америке // Тирози чахон (Худжанд, Таджыкістан), 1997, 28 февр.

6. Ситько З. Гражданин Чили, белорус // Нёман, 1989, № 1. С. 166—168.

7. Ян Чачот, Ігнат Дамейка: Сябры і паплечнікі Адама Міцкевіча. Мн., 1998 (Беларусіка-Albaruthenica, 10).

8. Amunategui Miguel Luis. Ignacio Domeyko. Santiago de Chile, 1952.

9. Domeyko Ignacy. Araukania i jej mieszkancy. Warszawa; Kraków, 1992.

10. Domeyko Ignacy. Moje podróże: Pamiętniki wygnańca. Wrocław, 1963.

11. Wójcik Zbigniew. Ignacy Domeyko: Litwa, Francja — Chile. Warszawa; Wrocław, 1995.

Адам Мальдзіс

Аляксандр ХОДЗЬКА

(1804—1891)



У вывучэнні літаратуры і фальклору народаў Каспійскага ўзбярэжжа ў XIX ст. выдатную ролю адыграла дзейнасць нашага суайчынніка ўсходазнаўца Аляксандра Ходзькі. На банкеце парыжскіх эмігрантаў з Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны ў гонар выхаду ў свет «Персідскай граматыкі» нашага земляка Аляксандра Ходзькі (1852 г.) адзін з выступаючых, сын Адама Міцкевіча — Уладзіслаў, адзначаў, што ва ўсходазнаўца «шчасліва спалучаюцца тры найбольш выдатныя народнасці Польшчы — польская, літоўская і руская» (80, с. 608)*. Біяграфія А.Ходзькі ў айчыннай літаратуры асветлена недастаткова, а ў шматлікіх працах з успамінамі дзейнасці арыенталіста сустракаюцца памылкі. Так, А.Ходзьку называлі «англійскім» даследчыкам (паколькі ў Лондане ў 1842 г. выйшла выданне сабраных ім песень народаў прыкаспійскага рэгіёну, а яго артыкулы пра Азербайджан, якія друкаваліся ў «Літаратурнай газеце», прыпісвалі перакладчыку У.Рамановічу (24, с. 122; 24, с. 105).

У нататцы пра А.Ходзьку ў двух дарэвалюцыйных рускіх і адным польскім энцыклапедычных і біяграфічных слоўніках сустракаюцца недакладныя даты і тлумачэнні (23, с. 384—385; 37, с. 475; 82, с. 381—382). У адной з гэтых нататак адзначана, што нібы А.Ходзька «служыў рускім консулам у Прусіі» (37, с. 475), тады як на самай справе ён служыў у Персіі. Памылкі дапушчаны і Я.Рэйхманам, які прысвяціў А.Ходзьку артыкул і раздзел у манаграфіі (84, с. 353—355; 85, с. 252—261).

---

* Рэдакцыя захоўвае сістэму спасылак аўтара.

У некаторых працах Аляксандра Ходзьку блытаюць з яго братам Юзэфам Ходзькам (Іосіфам) (28, с. 207; 29, с. 145; 21, с. 216).

Гэтыя абставіны выклікаюць неабходнасць асвятлення асноўных фактаў жыцця і дзейнасці А.Ходзькі.

Нарадзіўся Аляксандр Ходзька 30 жніўня 1804 г. у маёнтку Крывічы (цяпер Мядзельскі раён Мінскай вобласці) у сям'і вядомага ў Літве і Беларусі грамадскага дзеяча і пісьменніка Яна Ходзькі.

А.Ходзька атрымаў добрую хатнюю адукацыю (81, с. 12), вывучыў некалькі замежных моў, затым з 1816 г. ён вучыўся ў Вільні ў гімназіі пад наглядам Тамаша Зана (11, с. 92—131), будучага кіраўніка віленскіх паўлегальных маладзёжных таварыстваў («прамяністых», «філаматаў» і інш.), якія з'яўляліся своеасаблівай формай пераходу ад асветніцкай дзейнасці да арганізаванай палітычнай барацьбы супраць царызму.

Пасля сканчэння гімназіі ў 1820 г. А.Ходзька паступіў на філалагічнае аддзяленне Віленскага універсітэта. Вялікі ўплыў на яго аказалі лекцыі выдатных навукоўцаў таго часу І.Лялевеля, Г.Гродзека, Ю.Галухоўскага, І.Даніловіча. А.Ходзька ўвайшоў у склад блізкіх саўдзельнікаў Т.Зана па маладзёжных таварыствах і прыняў актыўны ўдзел у іх дзейнасці. Ён стаў сакратаром Блакітнага (філалагічнага) саюза філарэтаў.

Пасля разгрому царскімі ўладамі таварыстваў А.Ходзька (як і іншыя члены, у тым ліку і яго сябра Адам Міцкевіч) знаходзіўся пад следствам у зняволенні з восені 1823 г. да вясны 1824 г. Ён быў апраўданы і працягваў вучыцца. 16 красавіка 1825 г. скончыў Віленскі універсітэт.

Яшчэ ў Вільні ў А.Ходзькі праявіўся інтарэс да культуры народаў Усходу. Ён стаў тут вядомым як паэт, які прапагандаваў сярод літаратурнай моладзі ідэалы рамантызму. Сярод гэтых ідэалаў была цяга да ўсходніх матываў. Паэты рамантычнай школы цікавіліся і народнай творчасцю. Каб лепш вывучыць усходнія мовы, А.Ходзька вырашыў пераехаць у Пецярбург, дзе былі сканцэнтраваны лепшыя ўсходазнаўчыя сілы Расіі. 7 студзеня 1827 г. А.Ходзька паступіў на вучэбнае аддзяленне жывых моў пры Азіяцкім Дэпартаменце Міністэрства замежных спраў у Пецярбургу (2а). Гэта аддзяленне рыхтавала перакладчыкаў з усходніх моў для рускай місіі ў Іране і Турцыі (17, с. 529—533).

У 1829 г. Ходзька выдаў зборнік вершаў (43), у якім праявіўся на ўсю моц яго інтарэс да Усходу. Разам з перакладамі паэзіі А.С.Пушкіна і В.А.Жукоўскага і песнямі са зборніка «Гузла» П.Мерыме ў кнігу ўвайшлі навагрэчаскія, персідскія, башкірскія песні, азербайджанскія песні («Сердце мне жжешь, прекрасная девушка», «Ах, не называй меня господином») і паэма на арабскі матыў «Дэрар».

Адлюстраваўся ў зборніку і добра вядомы А.Ходзьку па яго этнічнаму асяроддзю ў родных месцах беларускі фальклор. У аснову

некалькіх песень, змешчаных у зборніку, пакладзены беларускія народныя матывы.

На публікацыю зборніка 1829 г. адгукнулася «Літаратурная газета», якую выдаваў Дэльвіг пры актыўным удзеле Пушкіна (9, с. 38—39; 25, с. 95). Змешчаная ў зборніку паэма «Дэрар» была перакладзена на рускую мову і апублікавана асобным выданнем у 1839 г. (34).

А.Ходзька быў прызнаны суайчыннікамі як паэт рамантычнага напрамку. Ён быў вельмі блізкі да будучых вялікіх паэтаў Ю.Славацкага і А.Міцкевіча. А.Міцкевіч называў яго «сокалам паэзіі, лічачы сябе яе «арлом».

1 студзеня 1830 г. А.Ходзька быў прызначаны перакладчыкам у расійскую місію ў Іране. Ён прыбыў на месца прызначэння праз Астрахань і Баку[1]. Шэсць артыкулаў з нагоды гэтага шляху былі змешчаны ў пецярбургскай газеце «Tygodnik Petersburski» ў 1830—1831 і 1833 гг. (44, с. 84—85; 45, с. 268—269; 46, с. 287—288; 47, с. 246; 48, с. 39; 49, с. 63—64), а чатыры з іх (у рускім перакладзе) — у «Літаратурнай газеце» (1830—1831) (30, с. 337; 24, с. 122—124).

А.Ходзька паслядоўна займаў пасады: перакладчыка пры рускім консульстве ў Тэбрызе (з 26 сакавіка 1832 г.), сакратара генеральнага консула там жа (з 13 лістапада 1833 г.), консула ў Рэшце — адміністрацыйным цэнтры правінцыі Гілян (з 14 жніўня 1834 г.) (3, оп. 464/1, д. 870, л. 2 об; оп. 464/3, д. 1846, л. 2 (Послужной список коллежского советника А.Ходзько, 1835 года).

Са знаходжаннем у Іране звязаны самы плённы перыяд біяграфіі А.Ходзькі. Прадаўжаючы фальклрарыстычныя і этнаграфічныя традыцыі, якімі адрозніваліся віленскія таварыствы, даследчык вывучаў краіну, яе гісторыю, побыт, мовы, культуру яе жыхароў.

29 красавіка 1841 г. А.Ходзька выехаў у адпачынак, каб падлячыцца «ў паўдзённую Еўропу» і правёў яго ў Грэцыі і Італіі (3, л. 2). Ён звольніўся з дыпламатычнай службы (3, л. 6) і пасяліўся ў Парыжы. Тут А.Ходзька аднавіў сяброўства з А.Міцкевічам і дапамагаў яму выдаваць газету «La Tribune des Peuples», вакол якой аб'ядналіся эмігранты з розных краін.

А.Ходзька не губляў сувязяў з Іранам. У 1857 г.[2] іранскі ўрад па рэкамендацыі палітычнага дзеяча Фаррух-хана Амін ад-Даула (пры якім А.Ходзька быў кансультантам у час наведвання Фаррух-ханам Францыі ў 1857—1858 гг. (75, с. 29), даручыў А.Ходзьку кантраляваць 42 іранскіх юнакоў, якія вучыліся ў Парыжы (88, с. 30). Усхо-

---

[1] Сцверджанне С.Корвіна (Паўлоўскага), што быццам Ходзька ехаў у Іран праз Сірыю, заснавана на недарэчнасці (78, с. 158).

[2] Датаванне гэтай падзеі, прыведзенае Я.Рэйхманам «1873 г.» (85, с. 259) па іншых крыніцах не пацвярджаецца.

дазнавец назіраў за імі да 1868 г. (83, с. 63)[3].

У 1857 г. А.Ходзька дарэмна імкнуўся заняць вакантнае месца выкладчыка персідскай мовы ў парыжскай Школе ўсходніх моў (81, с. 62)[4]. Ён атрымаў толькі месца прафесара па курсу славянскіх моў і літаратур у парыжскім універсітэце Калеж дэ Франс (42, с. 15). Памёр навукоўца 19 снежня 1891 г. у Нуазі-дэ-Сек, непадалёку ад Парыжа, і быў пахаваны на могілках ў горадзе Монмарансі.

Паспрабуем акрэсліць асноўны напрамкі прац А.Ходзькі. Яго навуковая спадчына вельмі вялікая, але спецыяльна не вывучалася. Бібліяграфічныя агляды гэтых прац (39, т. 7, с. 204—208; т. 9, с. 461; 40, с. 362—363; 76, с. 202—205) няпоўныя.

А.Ходзька цікавіўся праблемамі філалогіі, фальклярыстыкі, этнаграфіі, рэлігіі, тэатра народаў прыкаспійскіх абласцей. Суайчыннік А.Ходзькі, рускі падарожнік І.Ф.Бларамберг (яму А.Ходзька перадаў свае матэрыялы для яго «Статистического обозрения Персии») (7, с. 101—105, 115—122, 153—159, 205—231, 237, 248, 324—325) падкрэсліваў, што А.Ходзька «дасканальна ведаў літаратуру гэтай краіны, сабраў шмат рукапісаў» (8, с. 168). Ходзька шырока прымяняў метад палявых назіранняў і апісання жыцця народаў Каспійскага ўзбярэжжа, што адлюстравалася ў артыкуле «Персідская музыка» (50, с. 64) і ў прадмове да кнігі «Прыклады народнай паэзіі Персіі ў прыгодах і імправізацыях Кераглы (...)» (51, с. 13—16). Збору матэрыялаў садзейнічалі службовыя і навуковыя паездкі даследчыка па розных частках Ірана.

Асаблівы інтарэс маюць падарожныя дзённікі А.Ходзькі па Ірану ў 1834 г. (55), у лютым (36; 7), маі 1835 г. (36; 57, с. 280—308). Наведваў А.Ходзька аддаленыя ад сталіцы краіны правінцыі Мазандэран (1836 г.) (7, с. 153—159) і Хорасан (1833, 1834 гг.) (7, с. 205—231, 237, 248). Часта даследчык першым з еўрапейцаў дасягаў асобных раёнаў Ірана. Так, І.Бларамберг пісаў пра шлях з Нішапура да Шахруда ў Хорасане, што «ні адзін з еўрапейцаў, акрамя пана Ходзькі, не праходзіў вышэй акрэслены шлях» (7, с. 237, примеч.).

Сабраныя А.Ходзькам рукапісы і зробленыя ім на месцах запісы ляглі ў аснову большасці яго пазнейшых навуковых публікацый, сярод якіх выдзяляюцца працы па моваазнаўству, фальклору, этнаграфіі, тэатру, рэлігіі, а таксама комплексныя апісанні асобных тэрыторый. Ходзька першым звярнуў увагу даследчыкаў на мовы іранскай групы, якія да гэтага часу не вывучаліся: талышскую, гілянскую, мазандэранскую (51,

[3] Плюшэўскі (80, с. 381) лічыў, што Ходзька кіраваў гэтым толькі сем гадоў (82, с. 391).

[4] Л.Плюшэўскі (82, с. 381) недакладна піша, што Ходзька прэтэндаваў на пасаду выкладчыка персідскай мовы ў «Коллеж де Франс» пасля смерці там таго, хто выкладаў гэту мову. На самой справе гэту пасаду там займаў з 1847 па 1876 гг. Ж.Моль (79, с. 388, 390).

с. 453—592)[5], на сулейманійскі дыялект курдскай мовы (69, с. 297—356). Складзеная ўсходазнаўцам «Граматыка персідскай мовы» вытрымала два выданні — у 1852 і 1883 гг. (58; 71).

Найбольш вядомай стала кніга А.Ходзькі «Specimens of the popular poetry of Persia (...)» (1842 г.). Яна складаецца з наступных раздзелаў: 1. Прадмова. 2. Увядзенне да «Кераглу»[6]. 3. Прыгоды і імправізацыі Кераглу. 4. Народныя песні астраханскіх татараў. 5. Тры песні калмыкаў. 6. Туркменскія песні. 7. Песні персідскіх туркаў. 8. Персідскія песні. 9. Песні гілянцаў і інш. 10. Тое ж самае рудбарскіх горцаў. 11. Тое ж самае талышоў. 12. Тое ж самае мазандэранцаў. 13. Прыклады тэкстаў. 14. Дзевяць персідскіх песень, аранжыраваных для фартэпіяна (Антоніем Концкім)[7]. 15. Да песень, змешчаных у 14-м раздзеле («Кераглу», «Азербайджанскае паветра» і інш.) прыкладзены ноты.

У зборніку А.Ходзька адным з першых апублікаваў запісы народнай творчасці азербайджанцаў, туркменаў, нагайцаў, талышоў, іранцаў, гілянцаў, мазандэранцаў, калмыкаў. Раней усходазнаўцы вывучалі пераважна прыдворную пісьмовую літаратуру, а А.Ходзька адным з першых увёў фальклор названых вышэй народаў у шэраг навуковых даследаванняў.

Веданне А.Ходзькам цюркскіх і іранскіх моў, цесныя зносіны з жыхарамі Ірана садзейнічалі таму, што даследчык ажыццявіў адпаведныя пераклады туркменскай, азербайджанскай, персідскай і іншых узораў паэзіі на еўрапейскія мовы (гл. напрыклад, 59—65).

Большая частка фальклорных тэкстаў, змешчаных у лонданскім зборніку, была перавыдадзена і на іншых мовах. «Прыгоды і імправізацыі Кераглы» былі двойчы перакладзены на французскую мову (Жорж Санд (53) і Адольф Брэлье (68)), выйшлі асобным выданнем на нямецкай мове ў перакладзе О.Вольфа (52), не гаворачы ужо пра рускі пераклад С.Пена (21).

У перакладзе на французскую мову з'явіліся таксама раздзелы 4—9 і 11—12 лонданскага зборніка (51; 65). Усё гэта садзейнічала папулярызацыі твораў вуснай творчасці народаў Каспійскага ўзбярэжжа ў Еўропе.

Значную частку лонданскага зборніка А.Ходзькі склалі запісаныя ім у Іранскім Азербайджане «Прыгоды і імправізацыі Кераглу» (51; 62).

Рамантычныя інтарэсы А.Ходзькі праявіліся ў яго прыхільнасці да народных песень, якія ён пераклаў, і ў іх тэматыцы. У тым, што пра Ке-

---

[5] На заслугі Ходзька ў гэтай справе ўпершыню звярнуў увагу суайчыннік Ходзькі М.У.Ханыкаў (29, с. 37). Пра гэта таксама гл. у В.Гайгера і Э.Куна (74, с. 525—581).

[6] Кераглу — туркменскі пясняр з роду тэке, герой паданняў больш дзесяці цюркамоўных народаў Азіі.

[7] Антоній Концкі — польскі музыкант, які гастраліраваў па ўсёй Еўропе, пазней заснаваў у Пецярбурзе школу фартэпіяннай ігры.

раглу доўга захоўваліся народныя паданні, А.Ходзька знаходзіў лішні доказ імкненняў народаў Усходу да сацыяльнай справядлівасці.

Дзейнасць А.Ходзькі як папулярызатара азербайджанскага фальклору, які адным з першых пазнаёміў еўрапейскага чытача з эпасам «Кер-аглу», асветлена ў працах Б.Карыева (13), М.Садыхава (25) і інш. Менш вядомы ў літаратуры запісы тэкстаў туркменскіх песень і вершаў, зробленых у Нардзіне (Паўночны Харасан) у 1833 г.

Першыя два тэксты («Перамога туркменаў тэке» і «Песня Эмір-Гуна-хана пасля паражэння пад Маюном») прысвечаны разгрому туркменамі курдаў у 1782 г., наступныя тры тэксты належаць паэту Караджаоглану. Шосты тэкст прадстаўляе сабой песню пра паход іранскага шаха Ага-Махамед-хана ў 1796 г. супраць правадыра курдаў Меміш-хана. Наступныя тры тэксты А.Ходзька назваў «Тры песні Махтумкулі» («Махтумкулі — сваёй маці», «Разумныя думкі» і «Зімовыя ўспаміны»). За імі ідуць «Серджамская песня», «Парады Кеміне» і «Песня Адына Дарагазі» (51; 62).

Асаблівую ўвагу А.Ходзька надаваў творчасці класіка туркменскай паэзіі XVIII ст. Махтумкулі. Даследчык называў яго самым папулярным паэтам не толькі ў Туркменіі, але і ў Хорасане. А.Ходзька прыводзіць кароткую біяграфію Махтумкулі і падкрэслівае, што большую частку часу паэт прысвячаў філасофіі і паэзіі (51, с. 389—391; 62, с. 367—369). У прадмове да публікацыі вершаў Махтумкулі даследчык адзначаў: «Некалькі наступных яго вершаў, якія мы павінны прадставіць нашым чытачам, дадуць пацверджанне геніяльнасці гэтага выдатнага чалавека. Сярод адметных рысаў яго паэзіі — любоў да прыроды, якая рэдка на-зіраецца ў паэтаў Азіі, і шмат філасофскіх роздумаў аб тленнасці зямных спраў» (62, с. 369).

І.Бларамберг зрабіў празаічны пераклад атрыманага ім ад А.Ходзькі верша Махтумкулі «Разумныя думкі» на рускую мову і апублікаваў яго ў 1853 г. (7, с. 324—325):

«Имамы, дервиши, казы (судьи). Бедные и богатые! Слушайте, друзья мои! Пути счастья весьма извилисты. Молитва без веры не есть истинный путь! Льстить — безумство. Подумайте об этом, друзья мои! Что есть тело наше? — караван-сарай, клетка! Что есть душа наша? Сокол с завязанными глазами. Вдохновение — истинный герой, жертвующий жизнию своею богу. Истинный человек — подающий подаяния бедному. Накормить голодного стоит путешествия к Мекке. Наружность, которою молодость так гордится, стареет и желтеет, нос изгибается, губы высыхают. Я, Мехдум-Кули, я презираю жизнь (буквально — «я толкаю жизнь ногою»). Продолжительность мира только пять дней. Стоит ли для одного дня припасать на сто лет? Подумайте об этом, друзья мои»!

Публікацыя верша Махтумкулі, зробленая І.Бларамбергам, не пры-

цягнула ўвагі даследчыкаў туркменскай літаратуры, магчыма, таму, што яна была змешчана ў кнізе, прысвечанай не Туркменіі, а Ірану. Каштоўнасць гэтай публікацыі заключаецца ў тым, што яна з'явілася праз дванаццаць гадоў пасля першай публікацыі спадчыны паэта (зробленай А.Ходзькам) на еўрапейскай мове наогул і дваццаць гадоў таму першай вядомай да гэтага часу публікацыі вершаў Махтумкулі ў рускім перакладзе, які ажыццявіў Ф.Бакулін (5, с. 105—109).

Таму дзякуючы рабоце А.Ходзькі не толькі заходнееўрапей-скія чытачы, але і рускія чытачы змаглі пазнаёміцца з палітычнай спадчынай вялікага туркменскага паэта задоўга да таго, як прынята было лічыць

А.Крымскі ў свой час адзначыў значэнне публікацый А.Ходзькі ў справе вывучэння і папулярызацыі туркменскай літаратуры (15, с. 395). Б.А.Карыеў (12, с. 10), Р.Курбан (14, с. 3) і інш. падкрэслівалі піянерскую ролю даследчыка ў адносінах да папулярызацыі вершаў Махтумкулі сярод еўрапейскіх чытачоў, а Р.Аліеў (2, с. 11), А.Мерэдаў (18, с. 143; 19, с. 25) і інш. адзначалі яго значэнне ў справе папулярызацыі паэзіі туркменскіх паэтаў Кемінэ і Караджааглана. Аднак пра значэнне, якое мела перадача А.Ходзькам І.Бларамбергу тэксту вышэйпрыведзенага верша Махтумкулі, даследчыкі не пісалі.

Пераклады А.Ходзькі прыцягвалі ўвагу да туркменскай паэзіі яшчэ тады, калі Туркменію ад Расіі і іншых еўрапейскіх краін аддзялялі тэрыторыі, недастаткова ўцягнутыя ў шырокі культурны абмен паміж Еўропай і Азіяй, і калі сведчанні пра багаты духоўны патэнцыял туркменскага народа часта ішлі з варожых яму колаў і ўтрымлівалі недакладную інфармацыю пра яго.

Пяру А.Ходзькі належыць таксама выдадзенае на французскай мове і перакладзенае на рускую мову падрабязнае гісторыка-геаграфічнае апісанне правінцыі Гілян на паўднёвым узбярэжжы Каспійскага мора (36, 56). Гэта праца адметная комплексным падыходам да вывучэння Гіляна (10; 76). Апісанне Гіляна М.В.Ханыкаў назваў «выдатнай, добрасумленнай і ў вышэйшай ступені павучальнай» працай. У сваёй манаграфіі па этнаграфіі і антрапалогіі Ірана пры характарыстыцы гілянцаў ён цытуе іх «этнаграфічны партрэт», які быў зроблены А.Ходзькам (29, с. 111—112).

Сярод сабраных А.Ходзькам матэрыялаў былі рукапісы, якія паказвалі асобныя бакі рэлігійнага жыцця насельніцтва Ірана. У 1839 г. даследчык перадаў І.Бларамбергу рэдкі рукапіс, перакладзены ім з персідскай мовы на французскую, — «Кулсуннене, або Як персідскія жанчыны тлумачаць Каран» (8, с. 168—181; 41, с. 358—399). У 1848 г. выдаў персідскі тэкст (з французскім перакладам і каментарыямі) запіскі іранскага пасла ў Францыі Мірзы-Махаммед-Алі-хана «Адзінабожжа (секты) ваххабітаў, растлумачанае імі самімі» (54). Праз чатыры гады даследчык апублікаваў артыкул «Дэсацір, рэлігійны кодэкс (секты)

махабадзійцаў» (61), а затым артыкул «Хасан Себбах і яго прыхільнікі іранскія легітымісты» (67).

Адным з першых сярод даследчыкаў А.Ходзька звярнуў увагу на персідскія тэатральныя прадстаўленні «Тэазіе» (6, с. 11, 27, 67—68; 14, с. 51, 55—56; 27, с. 97—823; 38, с. 457; 86, с. XV, XX, XXVI; 87, с. 108—121) і апублікаваў пяць тэкстаў гэтых п'ес (66; 70).

Усходазнаўчыя працы А.Ходзькі атрымалі прызнанне і высокую ацэнку яго сучаснікаў (7, с. 205—231, 237, 260; 8, с. 52—55, 168; 28, с. 65, 92; 29, с. 36, 111), а таксама наступных даследчыкаў, якія апісвалі вывучэнне еўрапейцамі Ірана і яго культуры (72, с. 17, 266, 296, 327, 356, 367, 369; 73, с. 161, 162, 171, 174, 220, 223, 252). Яны адзначылі піянерскую ролю А.Ходзькі па збору фальклору прыкаспійскіх народаў.

Большасць прац А.Ходзькі вельмі багатая першапачатковым матэрыялам, які быў сабраны даследчыкам на месцах яго доўгачасовага знаходжання, у выніку яго пастаянных зносін з мясцовым насельніцтвам. У гэтым асноўная каштоўнасць прац А.Ходзькі.

Працы А.Ходзькі характарызуюцца цікавасцю да жыцця, звычаяў і побыту прыкаспійскіх народаў. У яго працах былі пакладзены асновы асабістага этнаграфічнага падыходу да вывучэння жыцця гэтых народаў. Даследчык склаў уражлівы малюнак побыту гілянцаў. Сярод яго назіранняў сустракаюцца цікавыя этнаграфічныя замалёўкі, якія дазваляюць убачыць жыццё народаў Каспійскага ўзбярэжжа ў першай палове XIX ст. Доўгачасовыя зносіны з жыхарамі вышэйадзначанага рэгіёна дазволілі А.Ходзьку акрэсліць лад іх жыцця больш поўна, чым гэта рабілі падарожнікі, якія знаёміліся з гэтым краем праездам.

У працах А.Ходзькі пра прыкаспійскі рэгіён ёсць многа сведчанняў, якія не страцілі і цяпер сваёй пазнавальнай значнасці. Даследчык звяртае ўвагу на змяненне духоўнага і матэрыяльнага жыцця гэтага рэгіёна пад уздзеяннем аб'ектыўных умоў жыцця. Ён прыводзіць прыклады пастаяннага ўзаемадзеяння культур у працэсе суіснавання розных народаў. Разумеючы, што чалавецтва адзінае, А.Ходзька ўважліва ставіўся да культуры асобных народаў, звяртаў увагу на сацыяльна-гістарычныя фактары, якія стрымлівалі яе развіццё. Дзейнасць А.Ходзькі садзейнічала фарміраванню ў сучаснікаў гуманных уяўленняў пра народы Блізкага Усходу і Сярэдняй Азіі. Яго працы дапамагалі станаўленню і развіццю фалькларыстыкі, мовазнаўства і этнаграфіі народаў прыкаспійскага рэгіёна.

Літаратура:

1. Акты Кавказской археографической комиссии. Т. 8. Тифлис. 1881.

2. Алиев Р. Жизнь и творчество Кемине. Автореферат диссертации на

соискание ученой степени кандидата филологических наук. Ашхабад. 1955.

3. Архив внешней политики России в Москве (АВПР), фонд ДЛС и Хд («Личные дела чиновников 1835—1844 гг.»). Опись 464/1, дело 870, лист 1 об., 2 л. и дальше.

4. Аширов Н. Махтумкули — выдающийся классик туркменской литературы. // Махтумкули. Юбилейный сборник, посвященный 225-летию со дня рождения великого туркменского поэта. Ашхабад, 1961.

5. Бакулин Ф. Песни у туркмен и поэт их Махдум-Кули. // Известия Кавказского отдела Русского географического общества. Тифлис, 1872. Т. 1. № 3.

6. Бартельс Е.С. Персидский театр. Л., 1924.

7. Бларамберг И.(Ф.) Статистическое обозрение Персии, составленное (...) в 1841 г. // Записки Русского географического общества. Кн. 7, 1853.

8. Бларамберг И.(Ф.) Воспоминания. М., 1978.

9. Гдт. (Рецензия кн.) Poezye Alexandra Chodźki. // Литературная газета. 1830, январь 21, № 5. С 38—39.

10. Грицкевич В.П. Переводчик дастана о Кер-оглы. // Литературный Азербайджан. 1972. № 2. С. 135—138. Ён жа. Первая русская публикация стихотворения Махтумкули. Ашхабад, 1979. № 5. С. 91—92. Гл. таксама: Грицкевич В.П. Популяризатор туркменской поэзии Александр Ходзько // Известия Академии наук Туркменской ССР. 1980, № 2. С. 60—69. Ён жа. Вклад воспитанника Вильнюсского университета Александра Ходзько в развитие востоковедения. // Научные труды высших учебных заведений Литовской ССР. История. Вильнюс, 1980. Вып. 1. Т. XX. С. 85—97. Ён жа. Один из первых исследователей азербайджанского эпоса. // Известия Академии наук Азербайджанской ССР. 1982. № 1. С. 19—25. Ён жа. Александр Ходзько (1804—1891) и его вклад в развитие иранистики и тюркологии. // Страны и народы Востока. М., 1987. Вып. XXV. География, этнография, история. С. 41—52. Ён жа. З роду Ходзькаў. // Полымя. 1980. № 5. С. 193—199.

11. Падрабязна пра Т.Зана гл.: Грицкевич В.П. От Нёмана к берегам Тихого океана. Мн., Полымя. 1986. С. 92—131.

12. Каррыев Б.А. Слово о Махтумкули. // Махтумкули. Избранное. Ашхабад, 1960.

13. Каррыев Б.А. Эпические сказания о Кер-оглы у тюркоязычных народов. М., 1968.

14. Кримський А. Перський театр, звідкі він узявсь і як розвивавсь. Київ, 1925.

15. Крымский А. Тюркские литературы. // Энциклопедический словарь Т-ва Гранат. Т. 41-к. СПб (б.г.).

16. Курбан Р. Великий поэт-патриот Махтумкули. Автореферат дис-

сертации на соискание ученой степени кандидата филологических наук. Ашхабад, 1965.

17.Материалы для истории факультета восточных языков. Т. 1, 1851—1864. СПб., 1905.

18.Мередов А. Социально-политические взгляды туркменского поэта-сатирика Кемине. // Труды Института истории, археологии и этнографии АН Туркменской ССР. Т. 3. Ашхабад, 1957.

19.Мередов А., Кичикулов Т. От составителей. // Махтумкули. Сборник статей о жизни и творчестве поэта. Ашхабад, 1960.

20.Мередов А., Халмухамедов Ш. Слово, которому вечно жить. // Огонек, 1971, № 50.

21.Николайшвили Н.Г. Грузинская газета «Дроэба» в национально-освободительной борьбе польского народа. // Центральная и юго-восточная Европа в новое время. Сборник статей. М., 1974.

22.Пенн С.С. Кер-оглы, восточный поэт-наездник, полное собрание его импровизаций, с присовокуплением его биографии. // Кавказ (Тифлис), 1856, №№ 21, 24, 26—27, 30, 34, 36—42.

23.Р.М. «Ходзько-Борейко А.Л.» // Русский биографический словарь. Т. «Фабер-Цявловский». СПб., 1901.

24.Садыхов М.З. Русские писатели об Азербайджане. Баку, 1970.

25.Садыхов М.З. Очерки русско-азербайджанско-польских литературных связей XIX века. Баку, 1975.

26. Соколова В.С., Грюнберг А.Л. История изучения бесписьменных иранских языков. // Очерки по изучению иранских языков. М., 1962.

27.Уманец С. Театр в Персии. // Исторический вестник. 1892, № 12.

28.Ханыков Н.(В.) Экспедиция в Хорасан. Под ред. Н.А. Халфина. М., 1975.

29.Ханыков Н.(В.) Записки по этнографии Персии. Под ред. В.В.Трубецкого. М., 1977.

30.(Ходзько А.) Несколько подробностей об индейцах астраханских. // Литературная газета. 1830, т. 1, № 27.

31.(Ходзько А.) Отрывки из письма путешествующего ориенталиста. // Там жа, 1830, т. 2, № 51.

32.(Ходзько А.). Путешествие. Самородные огни в Джоале. Индейский монастырь. Шестилетний импровизатор в Баке. Грязный волкан. // Там жа, 1830, т. 2, № 57.

33.(Ходзько А.). Татарская сказка или толгав. // Там жа, 1831, т. 3, № 30.

34. Ходзько Ал. Дерар, восточная повесть в стихах, СПб., 1839.

35.Ходзько А. Поездка из Тегерана к Каспийским воротам. // Географические известия, издаваемые Русским Географическим обществом, 1850, вып. 4.

36.Ходзько А. Гилан, или Прикаспийские болота. Историческое и географическое описание страны, лежащей на южном берегу Каспийского моря. Перевод М.Ломидзе. // Кавказ (Тифлис). 1851, №№ 7, 8, 10, 11, 16, 18—21, 48—50.

37.Ходзько-Борейко А.Л. // Энциклопедический словарь. Издатели Ф.А.Брокгауз, И.А.Ефрон, СПб., 1903.

38.Bausani A. Persia religiosa da Zaratustra a Baha'ullah. Milano, 1959.

39.Bibliografia literatury polskiej. Nowy Korbut. Romantyzm. «A—J». T. 7. (Warszawa). 1968, s. 204—208; T. 9 (Warszawa). 1972, s. 461—461.

40.Bibliografia polskich prac iranistycznych. Opracowała B.Majewska. // Historia literatury perskiej i tadżyckiej. Pod red. J.Rypki. Przekład z czeskiego. Warszawa. 1970, s. 362–363.

41.Blaramberg J., von. Erinnerungen. B. 2. Berlin, 1874.

42.Bouchon-Brandely G. Le College de France. P., 1873.

43.(Chodźko A.). Poezye Alexandra Chodźki. Petersburg, 1829.

44.Chodźko A. Kilka szczegołów o Indianach astrachańskich. // Tygodnik Petersburski. 1830, cz. 1, ą 11, s. 84–85.

45.Chodźko A. Baku. Cholera morbus. Wieża dziewicza w Baku. Powieść o Arystotelesie i Platonie. (Wyjątki z listu pisanego z Baku. 10 Lipca 1830). // Tygodnik Petersburski. 1830, cz. 2, ą 30, s. 268–269.

46.Chodźko A. Ognie samorodne w Dżoala. Klasztor Indyjski. Sześcioletni improwizator w Baku. Wulkan błotniczy. // Tygodnik Petersburski. 1830, cz. 2, ą 35, s. 287–288.

47. Chodźko A. Wyjątek z listu pisanego z Ardebilu. 29 Listopada 1830 r. Tołgawy. // Tygodnik Petersburski. 1831, ą 34, s. 244–246.

48.Chodźko A. Widok Gilanu. // Tygodnik Petersburski. 1833, cz. 7, ą 6, s. 39–39.

49.Chodźko A. Muzyka perska. Powieść Perska. // Tygodnik Petersburski. 1833, cz. 7, ą 10, s. 63–64.

50.(Chodźko A.). Poezye Alexandra Chodźki. Poznań, 1833.

51. Specimens of the popular poetry of Persia as found in the adventures and improvisations of Kurroglou, the bandit-minstrel of Northern Persia, and in the songs of the people inhabiting the shores of the Caspian Sea. Orally collected and translated, with philological and historical notes; by Alexander Chodzko, Esq. L. 1842, 592 p.

52.Chodźko. Die Abenteuer und Gesange Korroglous des Raubers und Dichters. Mit Einleitung bei O.L.B.Wolff. Jena, 1842.

53. Les aventures et les improvisations de Kouroglou, recueillies en perse par M.Alexandre Chodzko (par George Sand). // La Revue Independante. 1842. T. 6. 1 livr., pp. 71–84; 3 livr., pp. 405–438; T. 7, livr. 3, pp. 558–577.

54.La deisme des wahhabis expliqua par eux-memes. Memoire extrait

du manuscrit des voyages de Mirza-Mohamed-Ali-Khan, dernier ambassadeur de Perse en France, publie et traduit par M.Alexandre Chodzko. // Journal Asiatique. 1848. Fevrier, pp. 168—186.

55.Souvenirs diplomatiques. Comment l'Angleterre et la Russia font leurs affaires en Asie. // L'avenement au throne de Perse de Mohammed Chah le Kajar. // Journal tenu sur les lieux en 1834. // La Tribune des Peuples. (1849), №№ 89, 90, 93, 94, 96, 97, 98, 101, 102, (1, 2, 5, 6, 8, 9, 10, 13, 14, IX. 1849). (Edition phototypiqua. Wrocław-Warszawa-Kraków, 1963).

56.Chodzko A. Le Ghilan ou les marais Caspiens; description historiques et geographiques du pays qui borde au sud la Mer Caspienne. // Nouvelles annales des voyages et des sciences geographiques. Nouvelle serie. 1849. T. 4, pp. 257—271; 1850. T. 1, pp. 193—215; 285—306; T. 2, pp. 61—76; 200—209; T. 3, pp. 63—93.

57.Un excursion de Teheran aux Pyles Caspiens (1835). Extrait des Voyages unedits de M.Alexandre Chodzko ancien consul de Russie a Recht. // Nouvelles annales des voyages et des sciences geographiques. Nouvelle serie. 1850. T. 3, pp. 280—308.

58.Chodzko A. Grammaire Persane. P. 1852.

59.Chodzko A. Tolgaws ou chants populaires des Tatars d'Astrakhan. // Revue orientale et algerienne. 1852. T. 2, № 2. Juin.

60.Chodzko A. Trois chants Kalmouks. // Revue orientale et algerienne. 1852. T. 2. № 2. Juin.

61.Chodzko A. Le Decatir code religieux des Mahabadiens. // Revue orientale et algerienne. 1852. T. 2. № 3. Juillet.

62.Chodzko A. Chants populaires turkomans, traduit des dialectes turkoman et turk orientale. // Revue orientale et algerienne. 1852. T. 2. № 3. Juillet.

63.Chodzko A. Chants populaires perso-turcs. // Revue orientale et algerienne. 1852. T. 2. № 4. Aout.

64.Chodzko A. Chants populaires de la Perse. // Revue orientale et algerienne. 1852. T. 3. № 2. Octobre.

65.Chodzko A. Chants populaires des habitants des cotes meridionales de la Mer Caspienne. Dialectes Ghilek, Taliche et Mazenderani. // Revue orientale et algerienne. 1852. T. 3. № 4. Decemdre.

66. Chodzko A. Repertoire du theatre persan (texte persan). Premiere livraison. Djungui chehadet. Le cantique du mattyre, ou recueil des drames religieux que le persans du rite cheia font annulement representer dans le mois de Moharrem. Publice pour la premier fois. P. 1852.

67.Chodzko A. Hasan Sebbah i jego zwolennicy legitymisci perscy. // Przeglad Poznanski. 1853. T. 16. Poszyt 1—2.

68.Chodzko A. Aventures et improvisations de Kouroglu, heros populaire de la Perse septentrionale. Traduction d'Adolphe Breulieur. Revue

et annotee par l'auteur, A.Chodzko. // Revue orientale et algerienne. 1853. T. 1. № 1—2.

69. Chodzko A. Etudes philologiques sur la langue Kurde (dialecte de Solimanie). // Journal Asiatique. 1857. Avril-Mai. Serie V.

70. Chodzko A. Theatre persan choix de teazies. P. 1878.

71. Chodzko A. Grammaire de la langue Persan. Ed. 2. P. 1883.

72. Curzon G.N. Persia and Persian question. V. 1. L. 1892.

73. Gabriel A. Die Erforschung Persiens. Wien. 1852.

74. Geiger W., Kuhn E. Grundris der iranischen Philologie. B. 1. 2 Abt. Strasburg. 1898—1901; B. 2. Strasburg. 1896—1904.

75. Gillet. Damitte. A sa majeste Nasser-ed-Din roi des rois empereur du sublime etat de l'Iran, tres respectueuse epitre, a l'occasion de l'heureuse mission de S.Ferrukh-Khan, ambassadeur extraordinaire et plenipotentiaire de la Perse pres de S.M.Napoleon III en 1857—1858. Ed. 2. (P. 1859).

76. Grickevičius V. Dešimt kelių iš Vilniaus. Vilnius. 1972.

77. Kasinowski B. Aleksander Chodźko. // Tygodnik ilustrowany. 1904. ą 36.

78. Korwin (Pawłowski) S. Stosunki Polski ■ Ziemią Swiętą. Warszawa. 1958.

79. Lefranc A. Histoire du College de France. P. 1893.

80. Mickiewicz W. Uczta na cześć Aleksandra Chodźki. // Pamiętnik literacki. 1904. R. 3. Z. 3.

81. Pigoń S. Przyjaźń rozdarta. A.Chodźko i T.Zan w przededniu procesu filareckiego. // Pigoń S. Głosy z przed wieku. Szkice z dziejów procesu filareckiego. Wilno. 1924.

82. Płoszewski L. Chodźko Aleksander. // Polski słownik biograficzny. T. 3. Kraków. 1937.

83. R. Necrologie. Alexandre-Edmond-Borejko Chodźko. // Bulletin Polonaise Litteraire, Scientifique et Artistique. Paris. 1892. 1-er Avril - N 55.

84. Reychman J. Aleksander Chodźko, wielki orientalista polski. // Problemy. 1956. N 5.

85. Reychman J. Podróżnicy polscy na Bliskim Wschodzie w XIX wieku. (Warszawa). 1972.

86. Rossi E., Bombacci A. Elenco di drammi religiosi Persiani. Citta di Vaticano. 1961.

87. Święcicki A. Najnowsze prace oryentalistów polskich za granicą. // Ateneum. 1879. R. 4. Z. 1.

88. Trieury J. Documents pour servir a l'histoire des relations entre la France et la Perse suivis des traites de commerce conclus entre ces deux pays. La Perse et la Normandie. Evreux. 1866.

Валянцін Грыцкевіч

Напалеон ОРДА
(1807—1883)



кожнага з нас знаёмства з мінулым нашай Бацькаўшчыны адбываецца па-рознаму — праз паданні і пажаўцелыя з часам старонкі сівой даўніны летапісаў і архіўных сховішчаў, праз першыя археалагічныя знаходкі ў навуковай экспедыцыі і непаўторную прыгажосць, нечакана ўбачаную ў час вандровак. Але гэтае судакрананне было б няпоўным, каб не тая спадчына, што пакінута нам самабытным мастаком, таленавітым музыкантам і кампазітарам, чалавекам, бясконца ўлюбёным у сваю Беларусь, — Напалеонам Ордай.

Нарадзіўся Напалеон Орда 11 лютага 1807 года ў сям'і маршалка шляхты Кобрынскага павета Міхаіла Орды і Юзэфы з Бутрымовічаў непадалёку ад Пінска, у родавым маёнтку Варацэвічы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер в. Варацэвічы Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.). На гэтай зямлі продкі Орды са старадаўняга шляхецкага роду герба Астоя жылі з XVII стагоддзя і лічылі сваім родапачынальнікам харунжыя Пінскага павета Васіля Орду. У свой час бацька будучага славутага мастака і кампазітара, маючы адукацыю інжынера-фартыфікатара, будаваў грэблю праз непралазныя Пінскія балоты.

Пачатковыя веды Н.Орда атрымаў у бацькоўскім доме. Тут ён авалодаў таксама першымі навыкамі малявання і ігры на фартэпіяна. У дванаццаць гадоў хлопчык быў прыняты ў нядаўна адкрытую Свіслацкую гімназію, якую паспяхова скончыў праз чатыры гады. Наступнай ступенькай у адукацыі быў універсітэт. Асаблівых ваганняў у выбары далейшага месца навучання ў яго не было, як не было іх у Адама Міцкевіча, Тамаша Зана, Ігната Дамейкі. Цэнтрам прыцягнення маладых

дапытлівых розумаў Беларусі быў у тым часе славуты Віленскі універсітэт[1]. Сюды ў 1823 годзе паступае і Напалеон Орда. Ён выбраў фізіка-матэматычны факультэт, дарэчы, як і Адам Міцкевіч, толькі на восем гадоў раней.

Пачатак 20-х гадоў увайшоў у гісторыю Віленскага універсітэта трывожным часам — была ўчынена расправа над тайным студэнцкім таварыствам філаматаў, якое ад сціплых задач агульнакультурнага ўдасканалення і асветніцтва перайшло да распрацоўкі праграмы палітычнай барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне радзімы. Пасля разгрому таварыства большасць філаматаў царскі ўрад выслаў у глыбінныя губерні Расіі. Сярод іх былі Тамаш Зан, Ян Чачот і Адам Міцкевіч. Але рэвалюцыйны рух не быў задушаны канчаткова. Тут, у Вільні, працягвае дзейнічаць вучнёўскае тайнае таварыства «Заране», звязанае праз «Ваенных сяброў» з дзекабрыстамі.

Вучоба Н.Ордзе давалася лёгка, выкладчыкі высока ацэньвалі яго здольнасці, але ў 1827 годзе ён быў выключаны з універсітэта. Прычынаю таму, як потым высветлілася, была яго прыналежнасць да «заранаў». Пасля разгрому паўстання дзекабрыстаў ён быў арыштаваны і год і тры месяцы адбываў турэмнае зняволенне. Пасля заканчэння тэрміну пакарання яму было дазволена вярнуцца ў родныя Варацэвічы, але доўгі час ён знаходзіўся пад строгім наглядам паліцыі. Аднак гэта не запалохала, не спыніла рэвалюцыйна-вызваленчыя імкненні. І калі ўспыхнула паўстанне 1830—1831 гадоў, Н.Орда заняў сваё месца ў шэрагах паўстанцаў і быў сярод актыўных яго ўдзельнікаў. За ўдзел у адной з бітваў у 1831 г. ён нават атрымаў Залаты крыж Virtuti Militari. Праз паўгода Н.Орда меў ужо чын капітана арміі паўстанцаў.

Аднак нядоўгім быў удзел у паўстанні. Карны кулак расійскай імперскай машыны бязлітасна апусціўся на ўсіх, хто прагнуў волі і незалежнасці. Каго не павесілі, не расстралялі, хто не паспеў эміграваць на Захад, тых па адным і партыямі адпраўлялі ў самыя аддаленыя мясціны Расійскай імперыі. Для ўтаймавання вольнага духу царызм выкарыстоўваў застрашальны фактар Сібіры. Не раз і не другі сібірскі холад будзе ахінаць сыноў Беларусі. Па далёкіх этапах следам за паўстанцамі 30-х гадоў пройдуць ужо ў 60-я гады іх сыны і ўнукі.

Пасля задушэння паўстання Н.Орда зноў вяртаецца ў Варацэвічы, але ненадоўга — заставацца на радзіме было небяспечна. Тут яго, безумоўна, чакала турма ці ссылка. Разумеючы гэта, ён прымае рашэнне эміграваць. Наўрад ці малады ўчарашні паўстанец прадбачыў, што ягоны ад'езд расцягнецца на бясконца доўгія дваццаць пяць гадоў расставання з роднай Беларуссю.

Некаторы час Н.Орда жыў у Аўстрыі, Швейцарыі, Італіі, на поўдні Францыі. Рым і Вена, Фларэнцыя і ўзбярэжжа Міжземнага мора... Па-

дарожжы і новыя сустрэчы з цікавымі людзьмі, знаёмства з адметнай культурай, новымі традыцыямі з'явіліся выдатнай крыніцай для самаадукацыі і ўдасканалення ведаў. У 1833 г. апынуўся ў Парыжы, які пасля паўстання 1830—1831 гадоў стаў цэнтрам польскай рэвалюцыйнай эміграцыі. Тут знаходзяць прытулак сотні былых удзельнікаў паўстання — ад вядомых афіцэраў і знатных вяльмож да маладых, падобных Н.Ордзе, паўстанцаў. Але гэты горад заставаўся і цэнтрам культурнага і навуковага жыцця. Знакамітая Сарбона і Калеж дэ Франс, Інстытут Францыі і славуты Політэхнічны музей, Парыжская Акадэмія навук і першы ў свеце Заалагічны парк, Луўр і Гранд-Опера.

Малады эмігрант з небагатай сям'і меў вельмі сціплыя сродкі, аднак вышэй за ўсё ставіў сваю мэту — вучыцца. Прага да ведаў, бясконцая цікавасць, невычэрпны інтарэс да вяршынь чалавечай культуры былі, бадай, асноўнай рысай характару ягонай творчай натуры. Да гэтага часу вызначылася яго прафесійная цікавасць да двух відаў мастацтва — музыкі і жывапісу. Н.Орда пачынае рэгулярна наведваць майстэрню вядомага ў той час пейзажыста П'ера Жэрара, які ў многім вызначыў яго будучы лёс. Пад уплывам свайго настаўніка Н.Орда авалодаў майстэрствам мастака-рысавальшчыка. Яго захапіў жанр архітэктурных пейзажаў: дапытлівасць і шырыня інтарэсаў раскрыліся ў іх з поўнай сілаю. У яго творах адбівалася жаданне падзяліцца новымі знаходкамі, цікавымі ўражаннямі, якія ён прывозіў са сваіх бясконцых вандраванняў.

Н.Орда не карыстаўся алейнымі фарбамі, ён выдатна валодаў алоўкам, часта пісаў акварэллю. Маляваў у дарогах толькі з натуры. Свае першыя самастойныя спробы ў архітэктурным пейзажы, на якіх галоўным аб'ектам былі стары дом, руіны ці адзінокая арка або мост у гарах, а фонам — абавязкова неба, зямля, дрэвы, часам — фігуркі людзей, Н.Орда прывёз у Парыж у 1842 годзе са сваёй першай працяглай паездкі ў Іспанію і па поўдню Францыі. Малюнкі былі адобраны сябрамі і знаёмымі мастака, звярнулі на сябе ўвагу спецыялістаў і дазволілі сцвярджаць аб ужо сфармаваўшымся новым мастацкім таленце. На жаль, ад гэтага часу захавалася толькі некалькі малюнкаў і акварэляў, пераважна гэта пейзажы, на якіх прырода і архітэктурныя кампазіцыі не толькі добра спалучаліся, але і ўзбагачалі адзін аднаго.

Мастак вырашае практычна выкарыстаць свой талент рысавальшчыка-пейзажыста. Па дамоўленасці з выдаўцамі розных французскіх выданняў ён пабываў у Англіі, Шатландыі, Галандыі, Партугаліі, аб'ездзіў Іспанію, Алжыр, Скандынавію, замалёўваючы помнікі архітэктуры, месцы, звязаныя з вядомымі гістарычнымі падзеямі. Яго паездкі нярэдка працягваліся больш за год, з іх ён прывозіў дзесяткі, сотні малюнкаў-пейзажаў, якімі потым ілюстравалі даведнікі і часопісы.

І ўсё ж, безумоўна, цікавыя, таленавіта выкананыя краязнаўчыя

малюнкі Напалеона Орды можна цяпер лічыць толькі падрыхтоўкай да грандыёзнай па маштабах і высакароднай па мэтах рабоце ўжо на радзіме над зборам архітэктурна-гістарычных малюнкаў, якія вельмі хутка, яшчэ ў мінулым стагоддзі, былі прызнаны ўнікальнай мастацкай энцыклапедыяй помнікаў архітэктуры і гісторыі на тэрыторыях Беларусі, Літвы, Польшчы.

У Парыжы Н.Орда знаёміцца са славутым Фрэдэрыкам Шапэнам[2] і з вялікім захапленнем бярэ ўрокі музыкі і вучыцца кампазітарскаму майстэрству. Як сведчаць дакументы, «пад кіраўніцтвам Шапэна Орда дасягнуў такой высокай ступені фартэпіяннага майстэрства, што карыстаўся ў Парыжы папулярнасцю як выдатны педагог»[3]. Усё сваё жыццё ён заставаўся ўлюбёным у ігру на фартэпіяна музыкантам. Пісьменнік Адам Плуг, які добра ведаў Н.Орду ў яго сталым узросце, адзначаў, што і ў 70 гадоў Напалеон Орда выдатна, натхнёна музыцыраваў і заўсёды з гатоўнасцю прымаў удзел у дабрачынных канцэртах.

Паступова адносіны паміж Ф.Шапэнам і Н.Ордам перараслі звычайныя стасункі паміж настаўнікам і вучнем. Геніяльнага польскага піяніста пачынае звязваць шчырае сяброўства з маладым таленавітым мастаком і музыкантам з Беларусі. Сведчанне таму — ягоныя лісты да Н.Орды, у якіх ужо вядомы ў той час кампазітар з усёй шчырасцю і пяшчотай звяртаецца да свайго вучня не інакш як «мой мілы», «жыццё маё» і падпісвае іх словамі Орды «Твой стары сябра Шапэн»[4]. Даследчыкі творчасці Ф.Шапэна адзначаюць, што «Шапэн адчуваў моцную прыхільнасць да Орды, перапісваўся з ім, прысвячаў яму многія рукапісы сваіх твораў». Некаторыя са старонак яго аўтабіяграфіі з рознымі нататкамі Ф.Шапэна захоўваюцца ў музычным і бібліятэчным зборах Таварыства імя Ф.Шапэна ў Варшаве.

Напалеон Орда часта бываў у доме Шапэна, дзе збіралася музычная і літаратурная эліта Парыжа, польскія эмігранты. Разам яны наладжвалі імправізаваныя канцэрты. Паступова ў музычную частку гэтых вечароў Ф.Шапэн пачынае ўключаць, а часта і сам выконваць, фартэпіянныя творы свайго вучня як сведчанне высокай ацэнкі яго кампазітарскага таленту[5]. Ураджэнец Беларусі разам з Ф.Шапэнам пракладаў шляхі новаму, рамантычнаму напрамку ў музыцы, безупынна шукаў і знаходзіў новыя сродкі выразнасці, яскравыя фарбы, і тым самым садзейнічаў узмацненню эмацыянальнага ўздзеяння фартэпіяннага мастацтва. І хоць Н.Орда не змог узняцца да ўзроўню свайго геніяльнага настаўніка і сябра, ён быў адным з лепшых музыкантаў свайго часу і тонка валодаў законамі ўспрымання прыгожага.

На адным з такіх музыкальных вечароў адбылося знаёмства Напалеона Орды з Феранцам Лістам[6]. Праслухаўшы маладога музыканта, Ф.Ліст высока ацаніў яго дараванне ад Бога і параіў сур'ёзна заняцца

кампазіцыяй. Гэта не прымусіла доўга чакаць. Сёння ўраджэнец Беларусі Напалеон Орда вядомы як аўтар шматлікіх фартэпіянных твораў, у тым ліку больш за 20 канцэртных паланезаў, якія ў свой час выконваліся вядомымі піяністамі і аркестрантамі не толькі ў нашай краіне, але і ў Польшчы, Францыі, іншых краінах свету. Ім напісана мноства мазурак, вальсаў, полек, песень, рамансаў і іншых інструментальных і вакальных мініяцюр. На жаль, большасць твораў выдатнага майстра ў нашыя дні зрабілася здабыткам гісторыі.

Малады Н.Орда праяўляе пэўную цікавасць і да літаратурнай дзейнасці. Ён піша невялічкія артыкулы пра людзей і мясціны, дзе яму пашчасціла прайсці з алоўкам і планшэтам, цікавіцца лінгвістыкай. У 1856 годзе ён нават выдае ў Парыжы падручнік польскай мовы для французаў «Grammaire analytigue et practigue de la langue polonaise de l'usage des Français». Потым гэта кніга, якую першапачаткова ён прызначыў для сваёй жонкі і сына, якіх сам вучыў польскай мове, была перавыдадзена ў тым жа годзе ў Берліне, а дапоўненая рэдакцыя выйшла ў 1874 годзе ў Варшаве.

У 1839 годзе Н.Орда становіцца членам Польскага гістарычна-літаратурнага таварыства, а ў 1848 — Камітэта польскай эміграцыі. Гэта дало яму мажлівасць пазнаёміцца з многімі знакамітымі людзьмі, у тым ліку і са світ земляком — «літвінам» Адамам Міцкевічам[7]. Між імі ўзніклі сяброўскія адносіны. Вядома, што, жывучы ў Парыжы, А.Міцкевіч часта выступаў перад землякамі-эмігрантамі з паэтычнымі імправізацыямі і яго акампаніятарам не раз быў Напалеон Орда. Малады кампазітар часта іграў у чатыры рукі з жонкай паэта. З цікавасцю Н.Орда слухаў лекцыі А.Міцкевіча па славянскай літаратуры, якія той чытаў у Калеж дэ Франс. Жадаючы прыспешыць іх выданне ў Парыжы, ён нават аказаў матэрыяльную падтрымку вядомаму паэту, прапанаваўшы для гэтага грашовыя сродкі.

Тут, у Парыжы, Н.Орда сустракаецца і з Ігнатам Дамейкам — былым студэнтам Віленскага універсітэта, актыўным членам Віленскага таварыства філаматаў, аўтарам першай геалагічнай, гідралагічнай і гаспадарчай карты былой Рэчы Паспалітай, выдадзенай ў Парыжы ў 1837 г. З яго геаграфічным атласам Польшчы (Парыж, 1850) мастак Н.Орда прайшоў па дарогах Беларусі і Польшчы, пакінуўшы нам у спадчыну дзесяткі непаўторных акварэляў і замалёвак.

Дасягнуўшы высокага майстэрства ў ігры на фартэпіяна, Н.Орда пачынае карыстацца вядомасцю не толькі як кампазітар, але і як адзін з лепшых педагогаў. Выкладанне музыкі на ўсё жыццё застанецца адным з асноўных яго заробкаў і крыніцай параўнаўча бязбеднага існавання. Своеасаблівым абагульненнем вопыту ў выкладанні музыкі стала выпушчаная ім у 1873 годзе ў Варшаве кніга «Граматыка музыкі», якая прыз-

началася ў першую чаргу для піяністаў і прафесійных педагогаў музыкі. Станоўчыя водгукі на «Граматыку музыкі» з'явіліся. У пісьмах, якія прыходзілі з розных мясцін Беларусі, Украіны і Польшчы, адзначалася, што «праца Орды для вучняў надзвычай карысная, і з яе дапамогай, напэўна, ні адзін з іх у музыцы ў людзі выйдзе»[8]. Доўгія гады гэты аб'ёмісты, каля трохсот старонак, са шматлікімі нотнымі дадаткамі падручнік лічыўся адным з лепшых у Еўропе дапаможнікам для выкладчыкаў музыкі і вучняў. Характэрна, што гэтую фундаментальную працу аўтар прысвяціў свайму земляку, ураджэнцу Міншчыны Станіславу Манюшку[9]. «З задавальненнем чытаў работу аб гармоніі, пераказ якой мне здаецца найбольш поўным і даступным разуменню», — пісаў пра «Граматыку музыкі» С.Манюшка і заўважаў: «Збянтэжаны дабрынёй Орды, які прысвяціў мне такую дастойную кнігу»[10].

Пра высокі музычны аўтарытэт Н.Орды ў музычных і тэатральных колах Парыжа, шырокае прызнанне яго творчых і арганізатарскіх здольнасцяў сведчыць і той факт, што ў 1843 годзе Таварыства акцыянераў Італьянскай оперы ў Парыжы — аднаго з самых вядомых музычных тэатраў Еўропы — прапанавала Н.Ордзе пасаду дырэктара гэтага тэатра. Прапанова была прынята з вялікім задавальненнем, бо мець пастаянны заробак цяпер ужо сямейнаму чалавеку было вельмі пажадана[11]. Але, на жаль, на пасадзе дырэктара Н.Орда прабыў усяго адзін сезон: з-за непаразуменняў сярод членаў праўлення тэатр праз некалькі месяцаў быў закрыты. Н.Орда вымушаны быў зноў зарабляць на жыццё ўрокамі музыкі. Але сувязь з Італьянскай операй і павага да яе былога дырэктара захоўвалася яшчэ доўгія гады, аб чым сведчыць пісьмо Ф.Шапэна, атрыманае Н.Ордай у студзені 1849 года: «Жыццё маё! З таго часу, як мы не бачыліся, я быў вельмі хворы, сёння мне хацелася б пабываць у вас, але я яшчэ не ў стане. Заўтра пайду да італьянцаў, знайдзі мне, як бы гэта ні было цяжка, два месцы — зробіш добрую справу. Твой стары сябра Шапэн...».

У 1838 г. Н.Орда выдае ў Парыжы музыкальны альбом «Альбом твораў польскіх кампазітараў»; па парадзе Ф.Шапэна і Ф.Ліста ён рашаецца ўключыць у гэты альбом некалькі сваіх фартэпіянных мініяцюр, якія вызначаюцца меладычнасцю, драматызмам і віртуознасцю стылю. Грошы, атрыманыя ад выдання «Альбома» , ён накіроўвае на дапамогу збяднелым эмігрантам з Беларусі. Праз некаторы час зноў па парадзе Ф.Шапэна ён выдае ў Парыжы свае першыя фартэпіянныя творы — танцавальныя мініяцюры, якія адразу знайшлі свайго слухача і карысталіся ў Францыі вялікай папулярнасцю. Другое выданне збора гэтых мініяцюр адбылося ў Варшаве, у 1882 годзе. Практычна адначасова з выданнем фартэпіянных мініяцюр у Парыжы выходзяць рамансы і песні Н.Орды на словы Адама Плуга, Стэфана Вітвіцкага і некаторых іншых

паэтаў[12]. На жаль, натхнёны, віртуозны выканаўца-імправізатар Н.Орда не заўсёды запісваў свае творы, а тым больш — выдаваў.

Ціхімі вечарамі ён іграў, іграў для сябе, для душы. Нібыта шукаючы ў гуках музыкі спакою і нутраной гармоніі. Доўгія пальцы перабіралі клавішы фартэпіяна. Адзін гук, другі ... і нараджалася тая непаўторная музыка, якой ён заваяваў не толькі Парыж, а перад вачыма паўставалі вобразы роднай Беларусі з яе нияркімі, але запамінальнымі краявідамі. Жывучы ва ўтульным доме ў Парыжы, у дастатку, у кругу новых сяброў, ён марыў толькі аб адным і ведаў: прыйдзе той дзень, калі ён зможа раскінуць шырока рукі і абняць сваю Беларусь, уздыхнуць непаўторны пах роднага краю. І гэты дзень настаў.

У 1856 годзе, пасля амністыі ўдзельнікаў палітычных падзей 30-х гадоў, Напалеон Орда адразу вяртаецца на Беларусь[13]. Маёнтак у Варацэвічах і каля ста дзесяцінаў зямлі як уласнасць удзельніка паўстання даўно канфіскаваны і распрададзены. І ўсё ж — ён дома. Мастак прагна ўзіраецца ў знаёмыя з дзяцінства мясціны, твары людзей, палескія вёскі, у далечыні ад якіх быў вымушаны жыць доўгія дваццаць пяць гадоў. Вяртанне на радзіму станоўча паўплывала на яго творчае натхненне. Менавіта тут, на Беларусі, ім будуць створаны лепшыя з яго твораў у музыцы і жывапісу.

Хаця і пазбаўлены сродкаў да існавання, Н.Орда не падае духам — у сустрэчах з нягодамі ён ужо быў загартаваны. Ён прымае спробу выправіць матэрыяльнае становішча ў сям'і будаўніцтвам у Варацэвічах фабрыкі па вытворчасці сельскагаспадарчых прыладаў. Аднак і на гэты раз яму прыйшлося пераканацца, што такі накірунак дзейнасці не для яго. Ягонымі стыхіямі былі і застануцца да апошняга дня музыка і жывапіс.

Некаторы час Н.Орда жыве ў Пінску, а потым едзе на Украіну, на Валынь, дзе працуе хатнім настаўнікам у маёнтку генерала Адама Ржэвускага і выкладае музыку і маляванне яго старэйшаму сыну. Добры, сумленны настаўнік і рэпетытар, ён не атрымоўваў асалоды ад такіх заняткаў. Як мастак ён ужо быў захоплены ідэяй увекавечыць сваімі дакументальнымі малюнкамі як мага больш памятных мясцін, адзначаных архітэктурнымі збудаваннямі, падзеямі гісторыі. У гэты перыяд ім былі выкананы серыі мастацкіх работ, якія былі прысвечаны, галоўным чынам, краявідам Валыні. Яны складаюць частку знакамітага альбома мастака.

На пачатку 60-х гадоў мастак часта бывае на Гродзеншчыне і ў Гродне, у родных Варацэвічах, Свіслачы[14]. І піша, піша свае любімыя акварэлі. З планшэтам і алоўкам за больш як дваццаць гадоў ён аб'ездзіў і абыйшоў амаль усю Беларусь, Польшчу, Літву, пабываў у многіх гарадах і мястэчках, зрабіўшы накіды і акварэльныя малюнкі ледзь не ўсіх архітэктурных і гістарычных помнікаў і месцаў, звязаных з жыццём і дзей-

насцю многіх і многіх знакамітых людзей свайго часу. З дакументальнай дакладнасцю Н.Орда фіксуе на невялікіх па фармаце (даўжыня не больш як 30 см) малюнках і акварэлях замак ці сялянскі дом, дапаўняючы яго дэталямі пейзажу, што дазваляла перадаць рамантычна-ўзвышаны настрой у адлюстраванні беларускіх замкаў, а лірычны расказ пра невялікі беларускі фальварак давесці да сімвалу Радзімы. Ён выбіраў не тое, што ўяўляла мастацкую прыгажосць. Для яго галоўным было тое, што прыпамінала даўнія стагоддзі і гістарычна прыгадвала мінулую непаўторнасць.

І вынік гэтай велізарнай працы — збор арыгінальных малюнкаў мастака, на якіх амаль не паўтараюцца сюжэты, які складае больш за тысячу сто пяцьдзесят адзінак (з іх больш за 200 такіх малюнкаў прысвечаны Беларусі). Значная колькасць іх у наш час мае не толькі мастацкае, але і вялікае навукова-пазнавальнае значэнне. Дзякуючы ім мы маем магчымасць убачыць шмат помнікаў архітэктуры, якія не зберагліся або былі грунтоўна перабудаваны ў пазнейшыя часы. Малюнкі аднаўляюць выгляд беларускіх вёсак, мястэчак, гарадоў, сядзіб другой паловы мінулага стагоддзя.

Гарадскі пейзаж найбольш шырока прадстаўлены відамі Гродна, якому мастак прысвяціў больш за 30 малюнкаў. Цэнтральную частку горада вызначылі Стары і Новы замкі, цэрквы і касцёлы, якія кантраставалі з малапавярховай, пераважна драўлянай жылой забудовай. Характэрна, што Н.Орда амаль ніколі не абагульняў жылую забудову, як гэта рабілі многія сучасныя яму мастакі, імкнуўся перадаць строга вызначаныя індывідуальныя рысы кожнага будынка. На яго малюнках рэдка сустракаюцца выявы людзей, але прысутнасць чалавека выразна адчуваецца ў такіх бытавых дэталях, як падрыхтаваныя для рамонту хаты бярвенні. Скірда дроў, брычка перад прыадчыненымі дзвярыма дома, лодка на беразе ракі. Старонкай архітэктурнай гісторыі Гродна з'яўляецца малюнак гандлёвай плошчы і Замкавай вуліцы, дзе паказаны пабудаваныя ў 1807 г. у стылі класіцызму ратуша і гатычны фарны касцёл XVI ст. Сярод іншых помнікаў архітэктуры — Стары і Новы замкі, палацы Тызенгаўза, Валіцкіх, Чацвярцінскіх, Барысаглебская царква на Каложы, касцёлы і кляштары езуітаў, францысканцаў, бернардзінцаў і бернардзінак, брыгітак, базыльянскі і іншыя.

Цікавыя замалёўкі ў іншых гарадах і мястэчках Беларусі. На малюнку Саборнай плошчы (сучасная плошча Свабоды) ў Мінску, якому мастак прысвяціў каля 20 малюнкаў, паказаны першапачатковы выгляд двухвежавага касцёла, кляштар і калегіум езуітаў, гадзіннікавая вежа перад імі. Віцебск прадстаўлены малюнкам ратушнай плошчы і відамі горада праз Дзвіну з мураваным езуіцкім касцёлам, стараверскай царквой і драўлянай царквой з трыма шатровымі вярхамі. Гомель прадстаўлены малюнкам замка князя Паскевіча. У серыі малюнкаў беларускіх

гарадоў — Навагрудак, Пінск, Камянец, Сянно, Чашнікі, Свіслач, Друя, Асвея, Пружаны і інш. Гістарычную каштоўнасць маюць замалёўкі помнікаў, якія не захаваліся да нашага часу або часткова разбураны ці перабудаваны. Гэта замкі ў Крэве (Смаргонскі р-н), Гальшанах (Ашмянскі р-н), Міры (Карэліцкі р-н), Геранёнах (Іўеўскі р-н), Смалянах (Аршанскі р-н), Навагрудку, Пінску, Камянецкая вежа, будынак Горы-Горыцкага земляробчага інстытута, дом-крэпасць у Гайцюнішках (Воранаўскі р-н). Сярод замаляваных ім помнікаў культавага дойлідства — Сафійскі сабор і Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку. Барысаглебскія цэрквы ў Навагрудку і Гродне; манастыры Ляшчынскі (пад Пінскам) базыльянскі ў Жыровічах (Слонімскі р-н), Троіцкі ў Слуцку; кляштары ў Полацку, Нясвіжы, Смілавічах (Чэрвеньскі р-н); касцёлы і кальвінісцкія зборы ў Свіслачы, Кобрыне, Іванаве, Ішкалдзі (Баранавіцкі р-н), Гнезне (Ваўкавыскі р-н), Койданаве (цяпер г. Дзяржынск), Фашчаўцы (Шклоўскі р-н), Сар'і (Верхнядзвінскі р-н), Дзярэчыне (Зельвенскі р-н), Варанянах (Астравецкі р-н) , Ружанах (Пружанскі р-н), Жалудок (Шчучынскі р-н) і інш. Многія замаляваныя ім сядзібы маюць вялікае гісторыка-культурнае значэнне як памятныя мясціны, звязаныя з імёнамі славутых дзеячаў культуры: драўляны, з ганкам і высокім дахам пад таполямі дом у родных Варацэвічах, Убель — радзіма С.Манюшкі, Завоссе — радзіма А.Міцкевіча, Смольгаў — радзіма У.Сыракомлі, Скокі — радзіма Ю.Нямцэвіча, Гейстуны — радзіма А.Адынца. Многія малюнкі Н.Орды — выдатныя ілюстрацыі па этнаграфіі беларускай вёскі сярэдзіны мінулага стагоддзя, на якіх захаваны нацыянальны каларыт і з вялікай дакладнасцю перададзена народная архітэктура.

Калі б нават захаваліся архітэктурныя пейзажы Н.Орды толькі ў арыгіналах, у адзінкавых экземплярах, трапіўшы ў вялікія музеі, наўрад ці набыў бы мастак тую шырокую вядомасць, якой карыстаўся ў апошнія дзесяцігоддзі XIX стагоддзя. Нягледзячы на ўжо сталы ўзрост, мастак прымае рашэнне падрыхтаваць серыю альбомаў з відамі гістарычных мясцін. У адпаведнасці з гэтым праектам ён пачаў сістэматычныя падарожжы па краю: спачатку Гродзеншчына, Мінская, Віцебская і Віленская губерні, у 1870—1874 гг. — Кіеўская і Падольская губерні, у 1874—1876 гг. — Ковенская і Ліфляндская губерні, у 1876—1877 гг. — Віленшчына і Магілёўшчына і нарэшце — Познаньскія землі, Падлешша, Мазоўшна і Прусія. Вядома, што ідэйным натхняльнікам Н.Орды на стварэнне сістэматызаваных серый архітэктурна-гістарычных пейзажаў, якія стануць сведчаннем былой славы, велічы і культуры беларускага, польскага і ўкраінскага народаў, прыгажосці роднай зямлі, быў вядомы пісьменнік і гісторык Юзэф Крашэўскі, таксама выпускнік Свіслацкай гімназіі, студэнт Віленскага універсітэта, удзельнік паўстання 1830—1831 гадоў[15].

Акварэлі і малюнкі Н.Орды пераводзіліся ў літаграфіі маладым мастаком Алесем Місуровічам і выдаваліся асобнымі альбомамі па 20—30 каляровых літаграфій у кожным. За адзінаццаць гадоў, з 1873 па 1883 гг., было выдадзена 8 буйнафарматных каляровых альбомаў літаграфій з 260 літаграфіямі яго малюнкаў. У прадмове да «Альбома» мастак пісаў: «Альбом пейзажаў губерній Гродзенскай, Мінскай, Віленскай, Ковенскай, Валынскай, Падольскай, Кіеўскай, Віцебскай і Магілёўскай, змаляваных з натуры. У трох серыях прадстаўлены месцы гістарычныя з часоў войнаў турэцкіх, крыжацкіх і казацкіх. А таксама старыя руіны замкаў і выдатныя рэзідэнцыі, што сведчаць аб прыгажосці і цывілізацыі краю. Варшава. Літаграфія Максімільяна Фаянса». У першых чатырох серыях апублікавана 35 беларускіх архітэктурных пейзажаў, на якіх прадстаўлены помнікі Гродна, Ружанаў, Свіслачы, Бярозы, Моладава (Іванаўскі раён), Іванава, Полацка, Ліды, Геранёнаў (Іўеўскі раён), Нясвіжа, Міра, Навагрудка, Лагойска, Гомеля, Бялынічаў, Камянца і іншых мясцін. Тыраж іх быў досыць вялікі. Амаль кожная бібліятэка альбо ўладальнік прыватнай калекцыі лічылі за гонар мець такі альбом. Шмат малюнкаў было апублікавана ў польскіх часопісах «Tygodnik illustrowany», «Kłosy», «Biesiada Literacka» пад рубрыкай «З папкі Напалеона Орды», дзе друкаваліся новыя творы мастака.

На жаль, не ўсе малюнкі і акварэлі Орды ўбачылі свет пры жыцці мастака. Большая іх частка засталася невыдадзенай. Дзесяткі вядомых папак Напалеона Орды, з якіх паўстае маляўнічы вобраз нашай радзімы, якой яна была больш за сто гадоў таму, захоўваюцца ў Нацыянальным музеі ў Кракаве, куды яны былі перададзены яго сваячкай (больш за 950 адзінак). Многія творы мастака захоўваюцца ў архіўных, бібліятэчных сховішчах Літвы і Латвіі, у прыватных калекцыях. Час несправядліва распарадзіўся і са спадчынай Орды-кампазітара: значная частка яго твораў згублена, даўно не выконвалася. Аднак тыя нямногія музыканты і даследчыкі музыкі XIX стагоддзя, якія валодаюць нотнымі матэрыяламі Н.Орды, ацэньваюць яго творы вельмі высока і лічаць, што Орда-кампазітар забыты незаслужана і яго танцавальныя творы і песні маглі б папоўніць, упрыгожыць канцэртны рэпертуар сучасных выканаўцаў.

На пачатку 1883 г. здароўе Н.Орды пагоршылася і ён, па парадзе ўрачоў, выехаў на лячэнне ў Варшаву і апошнія месяцы правёў у евангеліцкім шпіталі. Смерць напаткала яго 26 красавіка, за падрыхтоўкай да выдання VIII тома «Альбома», марамі аб выданні IX і X тамоў. Да апошняга імгнення ён не выпускаў з рук алоўка. Труна з целам нябожчыка была перавезена ў Янава Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Іванава Брэсцкай вобл.), дзе ён 30 красавіка быў пахаваны, згодна з яго апошнім жаданнем, на зямлі продкаў, побач са сваёй маці і сястрой[16].

«Высокародная асоба, чалавек, жыццё якога было чыстым, як сляза, як шабля воіна, а найперш — горача любячым Айчыну сын», — так пісалі пра нашага земляка сучаснікі. На жаль, магіла мастака, як гэта часта бывала ў нашай гісторыі, ужо пасля вайны была зруйнавана і толькі, у 1997 г. у Іванава Напалеону Ордзе быў адкрыты помнік.

Значэнне мастака Н.Орды ў гісторыі беларускай цяжка пераацаніць. Яму ўдалося дзякуючы выдатнаму майстэрству, невычэрпнай працавітасці і настойлівасці ажыццявіць высакародную мэту — стварыць мастацка-гістарычны вобраз Беларусі. Яго пейзажы паўтаравекавой даўніны ўяўляюць сабой бясцэнны ілюстраваны дапаможнік па гісторыі архітэктуры, і ён выкарыстоўваецца пры сучасным аднаўленні і рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры, а таксама ў розных навукова-папулярных выданнях па гісторыі і культуры.

Мастацкая спадчына Напалеона Орды яшчэ амаль не вывучана. Толькі ў нядаўнія часы была завершана апрацоўка спадчыны выдатнага мастака і нарэшце выдадзены поўны каталог яго малюнкаў і акварэляў (гл. Katalog rysunków architektonicznych ze zbiorów Muzeum Narodowego w Krakowie. Warszawa, 1975). У 1991 г. ў Гданьску быў выдадзены альбом выбраных твораў Н.Орды «Album widoków historycznych Polski / Zrysowany z natury przez Napoleona Ordę», пераважная большасць з якіх прысвечана беларускім мясцінам.

Углядаючыся ў шляхецкія сядзібы і палацы, гарадскія плошчы і вузкія каменныя вулачкі, старыя цэрквы і манастыры з малюнкаў Н.Орды, разумееш, што гэтыя старонкі нашай гістарычнай радзімы з'яўляюцца своеасаблівымі дакументамі мінулага і сімвалічным падарункам нам — яго ўнукам і праўнукам. Мастак і кампазітар Н.Орда жыў і працаваў у XIX стагоддзі, але зробленае ім належыць будучаму. Магчыма, у тым недалёкім будучым і на Беларусі, у якую ён быў такі ўлюбёны, будуць урэшце выдадзены творы яе славутага сына. Гэта і будзе словамі нашай удзячнасці і лепшым помнікам непаўторнаму Напалеону Ордзе.

Спасылкі:

[1] Віленскі універсітэт на пачатку XIX ст. быў вучэбным і адміністрацыйным цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, у склад якой уваходзілі навучальныя ўстановы Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Валынскай, Падольскай і Кіеўскай губерняў. Ён адыграў выключную ролю ў культурным развіцці Беларусі, распаўсюджанні прыродазнаўчай адукацыі, падрыхтоўцы настаўнікаў для гімназій Віленскай навучальнай акругі і самога універсітэта. На працягу многіх гадоў фізіку тут выкладаў ураджэнец Гродзеншчыны Восіп Міцкевіч — першы прафесар універсітэта і арганізатар кафедры эксперыментальнай фізікі, астраномію

чытаў заснавальнік Віленскай астранамічнай школы, першы дырэктар Віленскай астранамічнай абсерваторыі Марцін Пачабут-Адляніцкі, які нарадзіўся ў в. Смалянцы Гродзенскага павета. Сярод яго выхаванцаў згадаем у першую чаргу ўраджэнцаў Беларусі І.Дамейку — геолага, потым прафесара універсітэта ў Сант'яга, С.Горскага, будучага дырэктара Батанічнага сада Віленскага універсітэта, чые навуковыя даследаванні значна ўзбагацілі веды пра флору Беларусі, лаўрэата Дзямідаўскай прэміі М.Ястржэмбскага — аўтара першага ў Расіі дапаможніка па будаўнічай механіцы «Курс практычнай механікі» (1837), І.Гайдэталя — інжынера, генерал-маёра, кіраўніка работамі па ўдасканаленню канала Агінскага.

Аднак пасля паўстання 1830—1831 гадоў, у якім актыўны ўдзел бралі віленскія студэнты, 1 траўня 1832 года выйшаў указ Мікалая І аб закрыцці універсітэта. Медычны і багаслоўскі факультэты перадаваліся ў Міністэрства ўнутраных спраў для пераўтварэння першага ў Медычна-хірургічную акадэмію, а другога — у Духоўную навучальню. Палітычна ненадзейных прафесароў іншых факультэтаў мусілі перавесці ў іншыя універсітэты. Той жа указ вызначаў адкрыць вышэйшую навучальню або ліцэй у Воршы. Аднак бюракратычная машына царскага самаўладдзя паварочвалася даволі марудна. Закрыць універсітэт было куды прасцей, чым стварыць пасля на Беларусі новую вышэйшую навучальную ўстанову. У 1833 годзе была ўтворана Кіеўская навучальная акруга, а ў наступным годзе адчыніў свае дзверы Кіеўскі універсітэт святога Уладзіміра. Туды і былі перададзены сродкі, прызначаныя для ліцэя ў Воршы. Акрамя таго, у Кіеў накіравалі частку бібліятэкі і прылады фізічнага кабінета і хімічнай лабараторыі з Вільні.

[2] Шапэн Фрэдэрык (1810—1849) — польскі піяніст, заснавальнік польскай музычнай класікі.

[3] Tygodnik Illustrowany. 1875. T. 16. № 405. S. 216.

[4] Шопен Ф. Письма. М., 1980. Т. 1—2.

[5] Кампазітар Напалеон Орда па жанрах музычнай творчасці паўтараў свайго настаўніка — Ф.Шапэна. У яго творах пераважалі танцавальныя мініяцюры, і перш за ўсё паланезы, мазуркі, а таксама вальсы, сэрэнады.

[6] Феранц Ліст (1811—1886) — венгерскі кампазітар, піяніст, дырыжор, педагог і музычны дзеяч. З 1823 г. жыў у Парыжы. Адзін з заснавальнікаў т. зв. Веймарскай музычнай школы.

[7] Міцкевіч Адам (1798—1855) — польскі паэт, адзін з палітычных кіраўнікоў левага крыла польскай эміграцыі, у 1840—1845 гг. — прафесар Калеж дэ Франс ў Парыжы, дзе выкладаў курс славянскай літаратуры.

[8] Bluzsz. 1878. № 25. S. 198.

[9] Станіслаў Манюшка (1819—1872) — кампазітар, дырыжор, педагог, стваральнік нацыянальнай класічнай оперы.

[10] Moniuszko S. Listy zebrane. Kraków, 1967. S. 568.

[11] У 1843 г. Н.Орда ажаніўся з француженкай Ірынай Багле. Натуральнае жаданне матэрыяльна забяспечыць сям'ю падштурхнула яго адкрыць у Парыжы сумесна са сваім сябрам Аляксандрам Макоўскім гандлёва-камісійны дом. Аднак тут спрацавала правіла, што кожны павінен займацца сваёй справай. Не маючы ніякага імкнення і таленту ў камерцыі, Н.Орда, безумоўна, не мог разлічваць на поспех. Дарэчы, памылкі такога плана не аднойчы паўтараліся ў гісторыі. Прыкладам таму можа быць лёс ураджэнца Беларусі Уладзіміра Кавалеўскага — выдатнага вучонага-прыродазнаўцы, стваральніка эвалюцыйнай палеанталогіі, які напачатку 60-х гадоў XIX стагоддзя актыўна заняўся выдавецкай і прадпрымальніцкай справаю, вынікам якой стала страта жыцця самагубствам.

[12] Адам Плуг (1823—1903) — пісьменнік, рэдактар часопіса «Kłosy», рэдагаваў выданне «Wielka Encyklopedia Powszechna Ilustrowana».

[13] Сын Вітальд — афіцэр французскай арміі, прыедзе на Беларусь толькі ў 1878 г. і паселіцца ў новым бацькоўскім маёнтку Noworzecze. Жонка мастака і кампазітара застанецца на сваёй радзіме і толькі час ад часу будзе наведваць Беларусь.

[14] Гродзеншчыне ён прысвяціў каля 140 акварэляў.

[15] Цікава, што з малодшым братам Ю.Крашэўскага Люцыянам пад час цывільскай высылкі за ўдзел у паўстанні 1863 г. пасябраваў другі выдатны вучоны — ураджэнец Беларусі З.Урублеўскі. Л.Крашэўскі быў адным з першых нашых фатографаў-мастакоў. У спадчыну ад яго засталіся мастацкія акварэлі, малюнкі алоўкам і пяром, большасць якіх захоўваецца ў Варшаве і Кіеве.

[16] Згодна з завяшчаннем Н.Орды для падтрымкі бедных, але здольных вучняў рымска-каталіцкага веравызнання рэальнай школы ў Пінску (у першую чаргу з роду Ордаў гербу Астоя) быў арганізаваны стыпендыяльны фонд у памеры 2 тыс. рублёў.

Вольга Гапоненка

Вінцэнт
ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ
(1808—1884)



есца В. Дуніна-Марцінкевіча ў гісторыі айчыннай літаратуры вызначана даўно і трывала: ён па праву лічыцца пачынальнікам новай беларускай літаратуры.

Жыццёвы шлях пісьменніка ахоплівае ледзь не ўсё XIX стагоддзе. Вінцэнт Іванавіч Дунін-Марцінкевіч нарадзіўся 23 студзеня (4 лютага па н. ст.) 1808 г. у фальварку Панюшкавічы Бабруйскага павета — закінутым і маляўнічым кутку Беларусі над ракой Бярэзінай.

Паводле радаводнай справы Дунінаў-Марцінкевічаў у Мінскім дваранскім дэпутацкім сходзе, род пісьменніка паходзіў са Смаленскага ваяводства і карыстаўся гербам Лебядзь. Першым вядомым продкам Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча быў Аляксандр Дунін-Марцінкевіч, які ў першай палове XVII ст. меў маёнтак Марцінкевічы ў Малахаўскім стане Смаленскага ваяводства. Унукі яго, Тамаш, Якуб і Марк, прадалі гэты маёнтак у 1650 г. і перасяліліся ў Беларусь. Адзін з іх, Тамаш, быў паручнікам лёгкай кавалерыі і змагаўся супраць туркаў у войску Яна Сабескага. Якуб быў продкам пісьменніка, а сын яго Тэадор і ўнук Мікалай служылі ротмістрамі ў войску Вялікага княства Літоўскага ў XVIII стагоддзі. Мікалай — гэта дзед Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Род належаў да сярэдняй беларускай шляхты.

Аднак паступова род драбнеў, і перад нараджэннем Вінцэнта яго бацькі самі арандавалі ў Бабруйскім павеце маёнтак Панюшкавічы, што належаў іх далёкаму, але ўплывоваму сваяку — магілёўскаму біскупу Станіславу Богушу-Сестранцэвічу (1731—1826). Апошні, знаходзячыся на пасадзе мітрапаліта ўсіх рымска-каталіцкіх касцёлаў у Расіі, узяў

пляменніка пад сваё крыло ў Пецярбург, дзе малы Вінцэнт гадаваўся ў сярэдзіне 1820-х гг. Пазней, ад 1828 года, юнак распачынае чыноўніцкую кар'еру: працуе памочнікам каморніка пры Мінскім межавым судзе, служачым палаты крымінальнага суда, а потым перакладчыкам у Мінскай каталіцкай духоўнай кансісторыі. У 1840 г. сумесна з жонкай Юзэфай Бараноўскай, з якой ажаніўся ў вельмі маладым веку, улезшы ў невыплатныя пазыкі, набыў ці не самы дробны ў Пяршайскай воласці Мінскага павета маёнтак Люцінка (Люцынка) і кінуў дзяржаўную службу. Будучаму пісьменніку марылася, што Люцінка стане ягонымі шчаслівымі пенатамі, калыскай творчых задум, адкуль можна будзе браць «рэкрутаў» для свайго аматарска-прафесійнага тэатра. Тут ён пачаў свой творчы шлях (1841) невядомым дзіваком-хлапаманам, непахісна і паслядоўна ствараючы мастацкія творы на «мужычай гаворцы», тут у сярэдзіне 70-х гадоў, дакладней, у 1876 г., ён паспрабаваў без дазволу ўлад адкрыць нелегальную школку для навакольных дзетак, дзе галоўнай настаўніцай была дачка пісьменніка Цэзарына і дзе навучаўся будучы беларускі празаік Ядвігін Ш. (псеўданім Антона Лявіцкага). І тут 17(29) снежня 1884 года абарвалася жыццёвая пуцявіна сапраўднага патрыярха новай беларускай літаратуры.

Кароткі экскурс у гісторыю роду Дуніных-Марцінкевічаў дазваляе акрэсліць грамадска-сацыяльныя ўмовы, у якіх складваўся светапогляд першага класіка новай беларускай літаратуры. Будучы сынам арандатара-хлебароба, Вінцэнт з маленства бачыў гаротнае жыццё паднявольнага селяніна, ды і сам на саслоўнай лесвіцы знаходзіўся найбліжэй да сялянства. Разам з тым у сям'і яшчэ жылі легенды і паданні пра былую славу роду, пра геройскія ўчынкі далёкіх продкаў. Спецыфічнасць сацыяльнага становішча сям'і Марцінкевічаў (маленства ў глухім закутку Мінскай губерні і адначасова знаёмства з пецярбургскімі салонамі) не магла не паўплываць на станаўленне светапогляду будучага пісьменніка, выхоўвала з сына беззямельнага шляхціца асобу неардынарную, з шырокім даляглядам і дэмакратычнымі перакананнямі. Усё пералічанае абумовіла фармаванне светапогляду Дуніна-Марцінкевіча як пісьменніка «мужыцкага».

З самых ранніх твораў Дуніна-Марцінкевіча захаваліся толькі назвы некалькіх лібрэт: *«Чарадзейная вада»*, *«Спаборніцтва музыкаў»*, *«Рэкруцкі жыдоўскі набор»*. Прэм'ера апошняй адбылася ў верасні 1841 г. у Мінскім тэатры. Дзякуючы змешчанай у *«Минских губернских ведомостях»* рэцэнзіі сёння змест гэтага твора вядомы: галоўны герой Ёган Бенатан, жыд (гэту ролю выконваў сам *«сочинитель»* Марцінкевіч), мае сына, якога баіцца аддаваць у рэкруты. Між тым яго дачка Сара захапілася расквартараваным у іх доме салдатам Вільгельмам. Пераапранутая ў адзенне брата, яна са згоды бацькі, які думае, што ратуе сына ад набору, шчаслівая, пакідае бацькоўскі кут і спяшаецца ўзяць шлюб з каханым. Пасля ўцёкаў з'яўляецца брат у адзенні сястры. Стары жыд у рос-

пачы: не стала любай дачкі, а сына ўсё роўна забяруць у рэкруты. «Між тым каханкі ўжо пабраліся, дачка ўжо не жыдоўка. Палкоўнік абяцае пакінуць сына, і ўсяму канец, усе задаволеныя»[1].

Імя Дуніна-Марцінкевіча паступова набывала заслужаную папулярнасць. Ён сам рупіўся пра гэта. Пасля шэрагу невялікіх аперэтак (на тэатральнай ніве В. Марцінкевіч выступаў не толькі як лібрэтыст: музыку да тэкстаў ствараў не адзін здольны малады кампазітар С. Манюшка, але і сябра драматурга, мінскі музыкант К. Кржыжаноўскі, а часткова і сам В. Дунін-Марцінкевіч) у 1842—1844 гг. пад пяром няўрымслівага неафіта беларускага прыгожага пісьменства паўстае буйнае драматычнае палатно — камедыя *«Ідылія»* (*«Sielanka»*). Лібрэта камедыі-оперы неўзабаве з'явіцца асобным выданнем (1846).

Экспазіцыя оперы — сцэнка ў карчме, дзе чытач (глядач) сустракаецца з галоўным героем — войтам Навумам Прыгаворкам. З першага ж маналога войта высвятляецца, што ніякі ён не жывадзёр, а гэтакі ж селянін, адно надзелены ад пана ўладай. І як дасціпны селянін жартуе, сыпле прымаўкамі — іх у творы каля сотні і больш чым 80 агучваюцца вуснамі Навума. Падобная «раскладка» дазволіла некаторым даследчыкам гаварыць пра «штучнасць мовы» дадзенага персанажа. Аднак варта згадаць адзін з яркіх, каларытных вобразаў «Палескай хронікі» І. Мележа — вобраз паляшучкі Сарокі або шматлікіх герояў з «Ніжніх Байдуноў» Я. Брыля, як пераконваемся: у галерэі нацыянальных характараў, створаных беларускай прафесійнай літаратурай XIX—XX стст., Навум Прыгаворка з оперы «Ідылія» займае адметнае месца.

Другая палова 1840-х гадоў — час выступлення на тэатральных падмостках дзяцей Дуніна-Марцінкевіча, музыкантаў-віртуозаў Камілы і Мірослава, будучых надзейных паплечнікаў бацькі ў культурна-асветніцкай дзейнасці. Іх шматлікія гастрольныя «турнэ» у Вільню, Варшаву, Кіеў спрыялі больш глыбокаму знаёмству пісьменніка з літаратурным і культурным жыццём Літвы, Польшчы, Украіны. Да пачатку 1850-х гадоў намаганнямі Дуніна-Марцінкевіча, каларытная постаць якога ярка вылучалася на мінскім Парнасе, склаўся тэатральны калектыў. У гісторыю беларускай культуры ён увайшоў пад назвай «Драматургічны гурток Дуніна-Марцінкевіча». Наогул у мінскай кватэры пісьменніка ў 50-я гады мінулага стагоддзя гуртавалася мясцовая дэмакратычная інтэлігенцыя. З ім падтрымлівалі цесныя сувязі бібліёграф і паэт І. Легатовіч, мастак А. Шэмеш, паэт А. Пянькевіч, выдавец А. Валіцкі, кампазітар С. Манюшка, гумарыст і калекцыянер Ю. Кабылінскі .

Рупнасцю драматычнага гуртка В. Дуніна-Марцінкевіча 9 лютага 1852 г. у Мінскім гарадскім тэатры адбылася прэм'ера «Ідыліі», і са сцэны адкрыта прагучала, асуджаючы касмапалітызм арыстакратычных колаў, беларускае слова. Пастаноўка оперы на сцэне прынесла тое, чаго не дало кніжнае выданне *«Ідыліі»*: яна атрымала шырокі грамадскі водгук у друку. З'явіліся рэцэнзіі Ю. Гарайна «Фізіялогія прыказак» і ка-

рэспандэнцыя з Мінска, падпісаная крыптанімамі *С. L.* У апошняй паведамлялася: «Гэтымі днямі аматарамі было дадзена некалькі прадстаўленняў на карысць бедных... Двойчы ставілася опера «Ідылія», напісаная Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам, музыку якой часткова напісаў Станіслаў Манюшка... *«Ідылія»* — гэта малюнкі беларускага і літоўскага народаў з іх песнямі і прымаўкамі. Вельмі добра выглядаў сам аўтар у ролі Навума Прыгаворкі і ў танцы «Мяцеліца», які ўсе ўдзельнікі і ўдзельніцы выконвалі вельмі ўдала. Ніхто не стане адмаўляць здольнасцей Дуніна-Марцінкевіча як у галіне драматургіі, так і паэтыкі, і калі б яго творы былі пастаўлены на вялікай сцэне, ад гэтага, бясспрэчна, была б карысць як для тэатра, так і для аўтара». Мяркуючы па заключных словах, аўтар карэспандэнцыі, дасылаючы яе ў варшаўскі часопіс, відаць, ужо пачуў пра забарону, накладзеную мінскімі ўладамі на пастаноўку *«Ідыліі»* прама ў дзень прэм'еры.

Нягледзячы на забарону, спектаклі *«Ідыліі»* адбыліся ў шэрагу іншых гарадоў Беларусі, у прыватнасці ў Глуску, Бабруйску, паўторна ў Мінску ў 1853 і 1855 гг. Сваёй працай акторскі гурток Дуніна-Марцінкевіча абуджаў нацыянальную свядомасць, катурхаў прыспаную грамадскую думку, стымуляваў далейшае развіццё літаратуры. Можна смела сцвярджаць, што ідэйным арганізатарам, мастацкім кіраўніком гуртка задумвалася шырокая сур'ёзная культурная праца па прыкладу шматлікіх польскіх прафесіных труп; стань яна больш працяглым у часе — значэнне дзейнасці гуртка вымяралася б не менш чым перыядычнае друкаванне кніг. З дапамогай паэта адбываліся першыя крокі станаўлення новага беларускага прафесіянальнага тэатральнага мастацтва. У знямелай ад страху і мяшчанскай абыякавасці краіне суполка аднадумцаў Дуніна-Марцінкевіча ўяўляла «фарпост» барацьбы за народную культуру, нацыянальны характар якой неадлучны ад яе дэмакратычных памкненняў.

Сярэдзіну 50-х гадоў XIX ст. — пераломных у гісторыі новай беларускай літаратуры — пісьменнік сустрэў вопытным літаратарам, пакутліва вынасіўшы ісціну: трэба сеяць на ўласным полі. Бо толькі той жне, хто сее. Плёнам напружаных мастацкіх і ідэйна-эстэтычных пошукаў В. Марцінкевіча паўсталі яго першыя паэтычныя зборнікі, дзе побач з польскамоўнымі вершамі і паэмамі суседзілі буйныя беларускія творы. На Беларусь прыйшоў час вялікай сяўбы. Лёс распарадзіўся так, што найбольш спрактыкаваным сейбітам, хто выйшаў тады з поўнай сяўнёю на здзірванелыя загоны нацыянальнага мастацкага слова, стаў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. У гэтым была бязмежная веліч, гонар і бязмежны цяжар.

Другая палова 1850-х гадоў — пярэдадзень адмены прыгонніцтва ў Расіі — вызначаецца небывалым уздымам грамадска-палітычнага руху, наяўнасцю ў імперыі рэвалюцыйнага становішча (1859—1861 гг.). У літаратуры ж уздым пачаўся трохі раней, дзесьці з 1855 г., калі пасля смерці

Мікалая I царскі ўрад зрабіў пэўныя ліберальныя палёгкі. Наогул сярэдзіна 50-х гадоў пазначана для Вінцэнта цяжкімі асабістымі стратамі і адначасова светлымі надзеямі на будучыню. У 1854 г. памерла ягоная першая жонка, Юзэфа Бараноўская (праз нейкі час амаль 50-гадовы пісьменнік ажаніўся зноў з Марыяй Грушэўскай), а наступны, 1855 год, пазначаны не толькі нечаканай смерцю цара Мікалая I, але і выхадам двух паэтычных зборнікаў В.Марцінкевіча: *«Гапон»* ды *«Вечарніцы і Апантаны»*. Потым, вельмі хутка, выходзяць кнігі *«Цікавішся? — Прачытай!»* (1856) і *«Беларускі Дудар, або Усяго патроху»* (1857). Зборнікі засведчылі поспех не проста асобнага творцы, а ўсёй беларускай дакастрычніцкай літаратуры: да пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, дакладней, да выхаду ў 1891 г. кракаўскага выдання «Дудкі беларускай» Францішка Багушэвіча, кнігі Дуніна-Марцінкевіча заставаліся ці не адзінымі паэтычнымі зборнікамі з беларускімі творамі, першымі вестунамі прыгожага пісьменства Беларусі на еўрапейскім літаратурным мацерыку, першымі значнымі прыкметамі нацыянальнага самасцвярджэння беларусаў, першым, так бы мовіць матэрыяльным увасабленнем.

Паэма *«Гапон»* (паўстала не пазней 1854 г.) — адзіны буйны вершаваны твор Дуніна-Марцінкевіча з больш-менш прымальнай дадзенай жанравай дэфініцыяй; астатнія вялікія паэтычныя творы пісьменніка літаратуразнаўцамі часцей называюцца «вершаванымі аповесцямі» (дарэчы, як і ў самога аўтара), «гістарычнымі аповесцямі», «паэмамі-баладамі», «гутаркамі», «былінамі». Паэма складаецца з чатырох раздзелаў-песень, у якіх паказаны «розныя моманты жыцця героя». Кожнаму раздзелу папярэднічае эпіграф, з іх тры ўзяты аўтарам з уласнай оперы *«Ідылія»*, чацвёрты — з беларускай вясельнай песні. У падобным самацытаванні Дуніна-Марцінкевіча праглядваецца пэўны трагізм станаўлення новай беларускай літаратуры. Тут выявілася не амбіцыя пісьменніка, а, хутчэй за ўсё, жаданне падкрэсліць пераемнасць і самастойнасць беларускіх кніжных традыцый.

Адзначаная асаблівасць «жанравай прыкметы» у маладой літаратуры істотная для разумення аўтарскага падзагалоўка да паэмы *«Гапон»*: *«Беларуская аповесць з праўдзівага здарэння, напісаная на мове беларускага люду»*. Двойчы выкарыстоўваючы азначэнне *«беларускі»*, аўтар нібы падкрэсліваў, завастраў сувязь твора з народным жыццём. Найбольш яркім паўстае першы раздзел паэмы — сцэна вечарынкі ў карчме:

Шум, крык, гоман у карчме,
Кіпіць сельская дружына,
Піва, мёд, гарэлку п'е,
Ажны курыцца чупрына. (В. Д.-М., 174)

Яркія, таленавітыя, а таму крыху нечаканыя для літаратурна-багемнага Парнаса творы Дуніна-Марцінкевіча спарадзілі рэцэнзіі У. Сыракомлі ў польскім друку. Першаму рэцэнзенту *«Гапона»* У. Сыракомлю пачатак твора нагадаў паэму А. Міцкевіча *«Пані Твардоўская»*, якая таксама пачынаецца іскрыстай сцэнкай у карчме. Непасрэдная радасць, дасціпнасць, душэўны парыў і музычны такт фальклорных танцаў у абодвух паэтаў перададзены з вялікім майстэрствам. Першая друкаваная паэма Дуніна-Марцінкевіча засведчыла далейшае творчае станаўленне аўтара. Яна вылучаецца майстэрствам у паказе сялянскага побыту, пластычным валоданнем беларускай мовай, дасканалым веданнем фальклору, арганічна ўплеценым у змест твора ў выглядзе песень, прыказак і прымавак.

Другі паэтычны зборнік Дуніна-Марцінкевіча *«Вечарніцы і Апантаны»* адкрываўся займальнымі «быліцамі» («вечарніцамі» *«Дурны Зміцер, хоць хітры»*, *«Стаўроўскія дзяды»*). Жанрава вершаваныя аповесці блізкія да польскіх гавэнд У. Сыракомлі. Крыніцай для беларускіх быліц і польскіх гавэнд служыў беларускі фальклор; адсюль чэрпаліся не толькі сюжэты, але і стыль, характар апавядання. Быліцы, тэматыкай, зместам скіраваныя на чытача з нізоў, з'яўляліся спробай пераадолець кніжную ўмоўнасць.

Найбольшую прыхільнасць да літаратурных здабыткаў дэбютанта на мясцовым Парнасе выказаў Уладзіслаў Сыракомля, блізкі сябра і паплечнік Дуніна-Марцінкевіча. Ён першы зрабіў грунтоўны аналіз мастацкай вартасці твораў Дуніна-Марцінкевіча. Вітаючы з'яўленне новай зоркі на паэтычным небасхіле, Сыракомля даў рашучы адпор тым польскім нацыяналістам, якія ставіліся няпэўна да гістарычнага права беларусаў на развіццё ўласнай нацыянальнай літаратуры, да існавання самой мовы, адносячы яе ў лік «непаўнацэнных». Крытычныя артыкулы Сыракомлі ўдыхнулі ў сэрца Беларускага Дудара ўпэўненасць у вернасці абранага шляху. («Наша выцвілая шляхецкая літаратура мае шмат прадстаўнікоў, у народнай — ён адзін»).

У прадмове да трэцяга паэтычнага зборніка *«Цікавішся? — Прачытай!»*, напісанай у форме панегірыка-прысвячэння, адрасаванага маршалку Бабруйскага павета Аляксандру Лапу, Дунін-Марцінкевіч, палемізуючы з уяўным апанентам, адкрыта заявіў: «Няхай што хочуць гавораць, але ж гэта я першы паэзію нашага сялянскага люду апрануў у шаты народнай эстэтыкі, увёў на сцэну жыцця і пакінуў у шэрагу твораў айчыннага пісьменства, чым і ганаруся». У вершаваных аповесцях Дуніна-Марцінкевіча *«Купала»*, *«Шчароўскія дажынкі»*, *«Травіца брат-сястрыца»*, *вечарніцы «Стаўроўскія дзяды»*, прысвечаных апісанню народных абрадаў, часцей, чым у іншых творах, у сюжэтную канву ўпляталіся фальклорныя песні, паданні. Моцныя бакі народнай філасофіі, крытэрыі дабрыні і зла леглі надзейнымі камянямі ў падмурку, на якім Марцінкевіч узрос як пісьменнік народны. Уласнымі творамі Дунін-Марцінкевіч у каторы ўжо раз засведчыў асабістую адданасць прыгнечаным і пагарджаным,

даў ясны і адназначны адказ, што найсправядлівай меркай маральных, духоўных каштоўнасцей у жыцці з'яўляецца крытэрый маральнасці працоўнага народа. У сцвярджэнні неабходнасці маральнага самаўдасканалення, у перабудове асноў чалавечага існавання, у адмаўленні існуючых антыгуманных праяў рэчаіснасці, у выкрыцці шматлікіх заган тагачаснага грамадскага жыцця — непераходная каштоўнасць творчай спадчыны В. Дуніна-Марцінкевіча. Без арыентацыі на маральны, духоўны прагрэс губляе сэнс само паняцце прагрэсу.

У зборніку «Цікавішся? — Прачытай!» Дунін-Марцінкевіч надрукаваў паэму «*Славяне ў XIX стагоддзі*», «гістарычнае апавяданне ў 2-х песнях» — адзін з самых яркіх рамантычных польскамоўных твораў беларускага паэта. Узвышанасць паводзін герояў, лёс якіх падпарадкоўваўся ідэі народна-вызваленчай барацьбы супраць іншаземнага прыгнёту, была блізкай і зразумелай аўтару, чый родны край таксама ўжо больш паўстагоддзя знаходзіўся ў няволі. Згаданы паэтычны зборнік засведчыў узрастанне рамантычных тэндэнцый у творчасці паэта, з'яўленне моцных, страсных, дэманічных натур, гатовых кінуць выклік лёсу, пацвярджэннем чаму бачыцца яркі публіцыстычны верш Дуніна-Марцінкевіча «*Хіба я стары?*» (1856), які смела можна назваць праграмным. У ім закранаецца важная праблема адносін паміж творцам і масамі, паміж паэтам і народам. Шмат хто з творцаў сутыкаўся з пытаннем: для каго пісаць, калі народ непісьменны, а ў арыстакратычных салонах Мінска, Кіева, Вільні, Варшавы, Прагі мова працоўнага люду бэсціцца, зневажаецца? Ці ёсць будучыня ў літаратуры без свайго чытача, знаўцы, абаронцы? Дуніна-Марцінкевіча ніколі (і ў гэтым яго гістарычная заслуга) не пакідала вера ў патэнцыяльныя магчымасці народных мас. Беларускі Дудар неператварыўся ў Геркулеса на раздарожжы, не пакутаваў над выбарам шляху, не раздумваў доўга над пытаннем: каму служыць? У праграмным вершы «Хіба я стары?» паэт адназначна заявіў:

Для вас, паны, шкода халопскай мне мовы,
Для вас, чые мудрые надта галовы,
Манеры салонаў засвоіўшы ўмела,
Смяюцца з таго, крытыкуючы смела,
Што тут адраджаецца на родных глебах,
Чужое ж, хай кепскае, ўзносяць да неба.
Ваш суд мне не страшны, хай злосна скавыча
У будцы сабака, увагі на пса не звярну я.
Як раіць пясняр Сыракомля, пішу я
Цяпер, як заўсёды, на мове мужычай.

(Пераклад А. Зарыцкага)

З'яўленне ў сярэдзіне XIX ст. шэрагу паэтычных зборнікаў Дуніна-Марцінкевіча мела неацэнную ролю для новай беларускай літаратуры. Творчасць пісьменніка на дзвюх мовах, польскай і беларускай, сведчыць пра актыўны ўплыў на фармаванне яго ідэйна-эстэтычных поглядаў як нацыянальнага фальклору, сацыяльна-гістарычнага вопыту народнага жыцця, так і культурных традыцый іншых літаратур. Варта падзівіцца тытанічнай працаздольнасці пісьменніка: толькі на працягу 1857 г. з вядомых сёння твораў ён напісаў аповесць у дзвюх карцінах «*Шчароўскія дажынкі*», баладу «*Травіца брат-сястрыца*», рамантычную паэму на польскай мове «*Люцынка, альбо Шведы на Літве*», дзве быліцы «*Злая жонка*» і «*Халімон на каранацыі*». І ўсё гэта, не лічачы цэнзарскіх купюр і пазнейшых страт рукапісаў, складае больш за 3600 радкоў.

Значныя па аб'ёму вершаваныя аповесці праўдзіва паказвалі побыт народа, характар гутарковай мовы селяніна, склад яго думак. Гэтыя творы сталі своеасаблівым нацыянальным эпасам. Разгорнутыя ў часе гістарычныя карціны вершаваных аповесцей патрабавалі не менш шырокай панарамы геаграфічнай. Мінск, Магілёў, Вільня, Валожын, Жодзіна, Івянец, Орша, Ракаў, Слуцк, Гародня, Пяршаі, Лошыца, Люцінка, Халопенічы — дзесяткі мястэчак і вёсак паўстаюць перад чытачом са сваімі традыцыямі, звычаямі, легендамі. За ўсім гэтым выразна ўзнаўляўся, праступаў абагульнены воблік адзінай зямлі — Літвы-Беларусі. Толькі што народ на гэтай зямлі заставаўся ў бяспраўным стане.

Быліца «*Халімон на каранацыі*» паўставала з-пад пяра Дуніна-Марцінкевіча ў час г.зв. «свабод», дараваных новым імператарам Аляксандрам II. Ліберальныя колы звязвалі з ім надзеі на будучае паслабленне законаў і рэжыму, усталяванага ў Расійскай імперыі Мікалаем Палкіным пасля задушэння паўстання дзекабрыстаў. Вось чаму новы твор беларускага паэта быў так прасякнуты ідэяй абнаўлення жыцця на больш гуманных дэмакратычных прынцыпах. Твор пачынаецца малюнкам усенароднага радаснага ўзрушэння з выпадку заканчэння руска-турэцкай вайны. Нягледзячы на бясслаўны вынік кампаніі ў «дзяржаўных планах», герой быліцы ў паражэнчым канцы вайны бачыць толькі станоўчае: магчымасць зноў мірна апрацоўваць зямлю, сеяць ды збіраць хлеб:

І апалчэнцы з крыжамі
Вялікімі грамадамі
Радзенькі брадуць к даму;
Адзін гасцінец з сабою,
Другі рад, што хоць з душою
Ў сваю верне старану...
Зямелька павесялела,
І песенька загудзела,
Аразвела кожна твар;
Мужык стаў за ніўку брацца,

Нечага ў лес хавацца,—
Рад малады, рад і стар. (В. Д.-М., 361)

У дарэформеннай літаратуры цяжка адшукаць яшчэ адзін узор твора, каб «вернападданніцкую» тэматыку так па-блюзнерску прыніжалі, каб у ёй назіралася падобная адкрытая неадпаведнасць паміж абранай «высокай» ідэяй і яе аўтарскім увасабленнем (*Чаго ж мы так дзерліась? згадаць я не ў стане. Чы што цар прыехаў на каранаванне?*). Не так лёгка ў тагачаснай афіцыйнай літаратуры, друкаванай з дазволу пільных цэнзараў, ахоўнікаў «маральнасці» грамадзян імперыі, знайсці падобны прэцэдэнт. Таму нездарма тагачасныя «цэрберы друку» пакінулі на прадстаўленым у Віленскі цэнзурны камітэт рукапісу быліцы недвухсэнсоўную рэзалюцыю: «*Эта вся статья не может быть пропущена, и потому ее должно исключить*». Тым самым адназначна вырашыўшы будучы лёс дасціпнага, арыгінальнага твора, на стагоддзе асуджанага праляжаць у рукапісу (балада «Травіца брат-сястрыца», нізка вершаваных аповесцей «*Быліцы, расказы Навума*» з галоўнай аповесцю «*Халімон на каранацыі*» змаглі пабачыць свет толькі амаль праз стагоддзе, у 1945—1946 гг.)

Гэтаксама застаўся ў рукапісе (і загінуў) поўны пераклад на беларускую мову паэмы А. Міцкевіча «*Пан Тадэвуш*», здзейснены Дуніным-Марцінкевічам у плённыя для яго 1850-я гады, дакладней, у другой іх палове. Выдадзены ў Вільні (першыя дзве быліцы) у 1859 г. увесь тыраж паэмы падпаў пад забарону і быў знішчаны. Фармальна — з-за лацінскага шрыфту; фактычна — царызм з жахам канстатаваў факт існавання самастойнай беларускай літаратуры. Пераклад Дуніна-Марцінкевіча з'явіўся яркім доказам паспяховага развіцця маладой беларускай літаратуры.

Літва! — родна зямелька! Ты, маўляў, здароўе, —
Той цябе ашанцуе, каму безгалоўе!
Хто жыў калісь на ніўцы тваёй, як у раі,
І вось крывавы роніць слёзкі у чужым краі!
Цяпер-то, як ты красна, я чую, я бачу
І апішу, бо горка ўсцяж па табе плачу! (В. Д.-М., 429)

З патаемных глыбінь душы, нібы ўласныя, выдыхнуты Дуніным-Марцінкевічам па-беларуску ўзнёслыя першыя радкі эпапеі. У гісторыі новай беларускай літаратуры марцінкевічаўскі пераклад паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш» — першая буйная спроба мастацкага перакладу, уваскрашэнне нацыянальных перакладчыцкіх традыцый ад часоў Францішка Скарыны, жорстка абарваных цяжкою хадою гісторыі на беларускай зямлі. Пераклад лексічна дакладны, хоць сама форма, паколькі літаратурная мова была нераспрацаваная, недакладная, можна сказаць, нават спрошчаная і ў нейкай меры наіўная. Нягледзячы на за-

мену перакладчыкам нейтральнага, абстрактнага, што сустракаецца ў паэме, спецыфічна народнымі паняццямі, пераклад даносіць агульную настраёвасць эпапеі Міцкевіча. Значэнне перакладу В.Марцінкевіча ў тым, што ён з'явіўся першым перакладам эпапеі на славянскія мовы, заставедчыў паспяховае станаўленнне беларускай літаратуры XIX ст., прадэманстраваў глыбіню разумення Дунінымі-Марцінкевічам неабходнасці пошуку новых шляхоў для яе паўнакроўнага развіцця. Дунін-Марцінкевіч адразу спрабаваў паставіць яе ў шырокі кантэкст еўрапейскіх літаратур.

Канфіскаваны пераклад паэмы А. Міцкевіча «*Пан Тадэвуш*» стаў апошняй друкаванай кнігай Дуніна-Марцінкевіча на беларускай мове. Адзіны апублікаваны ім на мяжы 1860-х гадоў твор — паэма на польскай мове «*Люцынка, альбо Шведы на Літве*», — узнік яшчэ ў 1857 г. Паэма напісана ў лепшых традыцыях польскага рамантызму XIX ст. і тыпалагічна блізкая да твораў А. Мальчэўскага «*Марыя*» (1825) і С. Гашчыньскага «*Канеўскі замак*» (1828). У «Пралогу» чытачоў не магло не ўсхваляваць глыбокае пачуццё сыноўняй любові да роднай зямлі, выказанае аўтарам:

Божа наш! Ты шыбнуў на зямлю чалавека,
І няшчасця бярэмя, і шчасця ад веку
Ты прызначыў яму, выганяючы з раю, —
Як жа ў смутак душы яго любасць да краю
Ты уліў? І чаму ён ля роднае нівы,
Адчувае і вольным сябе і шчаслівым?

(Пераклад С. Дзяргая)

Убачыць у мясцовай легендзе пра разбураны храм або замак нейкага вяльможы далёкае мінулае роднай стараны, кроўна звязанае з сучаснасцю, узяць з мінулага агонь, а не цяжар разбітых мар і страчаных надзей, зразумець і здолець перадаць нашчадкам сэнс урокаў гісторыі — вось тое, што, паводле паэтавага прызнання, вадзіла пяром кожны раз, калі ён звяртаў свой позірк у мінулае. Адчуванне гісторыі — асноватворнае для пераемнасці літаратурных традыцый. У «Эпілогу» паэмы «*Люцынка, альбо Шведы на Літве*» гучыць той самы адналькавы, што і ва ўступе да «Благаслвёнай сям'і», матыў: памятай, нашчадак, тут пад кожнай пяддзю роднай зямлі ляжыць святы прах далёкіх продкаў; жыццём плацілі яны за волю Радзімы, за яе будучыню.

Дужа неспрыяльныя, безнадзейныя для будучыні новай беларускай літаратуры грамадска-палітычныя ўмовы парэформеннага перыяду не дазволілі Дуніну-Марцінкевічу працягваць выдаваць уласныя зборнікі. Тым не менш да пачатку 1860-х гадоў яго імя ўсё часцей і часцей згадвалася пры характарыстыцы нацыянальна-вызваленчага і культурна-грамадскага руху беларусаў, атаясамлівалася з назвай «Беларусь», як постаць аўтара несмяротнага «Кабзара» з «нэнькай-Украінай». Асобную персаналію В. Марцінкевічу прысвяціў у сваёй вядомай энцыклапедыі С. Аргельбрант

(1864). Станоўча адгукнуўся пра яго ў кнізе «*Пра літаратуры братніх славянскіх народаў*» вучоны, публіцыст, літаратар Адам Кіркор (1874).

Ад імя цэлага народа Дунін-Марцінкевіч выступіў з адкрытым лістом у «*Gazecie Polskiej*» (1861). Паэт прыўзняў заслону над супярэчнымі адносінамі да беларускай мовы, літаратуры, а значыць, і да самога народа, распаўсюджанымі нават у дэмакратычным асяроддзі: «Ці ж трэба здзіўляцца, што ні адзін польскі орган, нягледзячы на амаль стогадовыя намаганні, не здолеў зрушыць гэтага люду? Мог жа які-небудзь орган дайсці да слыху і пераканаць селяніна, якому спосабы авалодання польскай мовай былі такімі цяжкімі, які, паліваючы крывавым потам нівы сваіх паноў, не меў часу для разумовых заняткаў? Калі іншы раз гук матчынай гаворкі даходзіў да прагнага вуха бедака, то гэта быў паток пагроз і лаянак на пагарджаную сірату» (В. Д.-М., 482). Падтрымліваючы салідарысцкія настроі, пісьменнік ніколькі не прыбядняў ролю народа ў будучых нацыянальна-вызваленчых бітвах: «Яшчэ ёсць час, каб нашы грамадзяне спахапіліся і, утвараючы школкі, прытулкі і прыносячы іншыя магчымыя ахвяры, імкнуліся гэтую малодшую брацію сваю, якая ўмее быць удзячнай, прытуліць да сэрца і для ўсеагульнага дабра з ёй моцна аб'яднацца». Улоўліваючы пагрозны подых у неспакойнай, узбунтаванай самымі палярнымі інтарэсамі грамадскай стыхіі, словы паэта выношваліся, шліфаваліся пад цяжкімі хвалямі народнай стыхіі.

Паўстанне 1863—1864 гг. спарадзіла вольную беларускую трыбуну — нелегальную газету «*Мужыцкая праўда*» на чале з легендарным рэдактарам Кастусём Каліноўскім. Разам з газетай у перадпаўстанне з'явіўся шэраг ананімных нелегальных брашур і рэвалюцыйных пракламацый: «*Гутарка старога дзеда*», «*Гутарка двух суседаў*», «*Перадсмяротны разгавор пустэльніка Пятра*», перакладзены на беларускую мову гімн «*Божа, што Польшчу...*» і інш. Паказальна, што ўсе з пералічаных пракламацый агенты тайнай паліцыі прыпісвалі Дуніну-Марцінкевічу[2]. У асобе Марцінкевіча беларуская літаратура паўставала літаратурай дэмакратычнай, антыўрадавай. Прынамсі, царскія сатрапы не маглі дараваць пісьменніку відавочную «крамольную» сувязь: у бунтарнай «Мужыцкай праўдзе» і ў яго творах героі размаўлялі на адной мове. Відаць, таму з'яўленне беларускіх пракламацый атаясамлівалася ў жандараў з імем Беларускага Дудара, і цалкам адмаўляць яго прыналежнасць да паўстання няварта.

Будучы па сваіх поглядах блізкім да шляхецкіх рэвалюцыянераў, пісьменнік, як і ўся яго сям'я (асабліва дачка Каміла, высланая ў Салікамск), меў дачыненне да вызваленчага руху пачатку 60-х гг., у 1861 г. удзельнічаў у вандроўцы У. Сыракомлі ў Варшаву з выразным прапагандысцкім характарам, вынікам якой магла стаць для абодвух беларуская паэма пра варшаўскі растрэл дэманстрантаў. У 1863 г. «паўстанцы знаходзілі ў Люцінцы падтрымку, сам пісьменнік на пачатку ўзброенага выступлення знік з дому» (Г.Кісялёў). У кастрычніку 1864 г. В. Дунін-

Марцінкевіч быў арыштаваны ў мястэчку Свір Свянцянскага павета і дастаўлены ў Мінск. Больш года адседзеў ён у турме, пакуль вялося следства. Галоўных абвінавачванняў улады давесці не здолелі, і ў снежні 1865 г. пісьменнік быў вызвалены з турмы з абавязацельствам жыць бязвыезна ў Люцінцы пад строгім наглядам паліцыі.

Агульная панарама трагічных падзей паўстання 1863—1864 гг. дапамагае ўзнавіць доўгі, поўны пакутлівых роздумаў шлях Дуніна-Марцінкевіча да стварэння свайго лепшага твора — камедыі *«Пінская шляхта»* (1866). Абурэнне, горыч, усведамленне гістарычнай асуджанасці, выраджэння шляхты як сацыяльнага саслоўя выліліся ў Дуніна-Марцінкевіча ў ачышчальны смех, ім запоўнена кожная старонка камедыі. Завязка дзеяння застаецца нібы за кадрам, і глядач прысутнічае, сочыць за высвятленнем канфлікту. Ён, гаворачы словамі з «судовага дэкрэту» Кручкова, наступным: *«Иван Тюхай-Липский назвал Тихона Протосовицкого мужиком; тот за такую обиду побил Липского, на что сей последний представил и свидетелей»* (В. Д.-М., 128). Сатырычнае завастрэнне з дапамогай гратэску дазваляе яскрава ўбачыць псіхалогію паводзін царскіх адміністратараў Кручкова і Пісулькіна. Ім, чыноўнікам, прыбыўшым на «суд правы» у глухі палескі кут, няма ні законаў, ні абмежаванняў. Цытаваныя ж Кручковым на памяць параграфы і ўказы («сообразно указу всемилостивейшаго государя Петра Великого, в 1988 году *марта 69 дня последовавшаго и применяясь Статуту Литовскому раздела 5-го, параграфа 18-го...»*) — гэта шырма, фігавы лісток і нічога больш, якія, аднак, у вачах фанабэрыстых дымных шляхцюкоў здаюцца незлічонымі «божымі прыказаннямі».

Галоўная сіла, што рухае развіццё сюжэта камедыі Дуніна-Марцінкевіча,— страх. Страх перад некаранаваным каралём, вярхоўным суддзёю глухога палескага павета станавым прыставам Кручковым, які з'явіўся высветліць «состав данного уголовного преступления». Асабліва глыбокі страх жыве ў свядомасці прадстаўнікоў старэйшай генерацыі пінскай ваколічнай шляхты, жывуць у паралічным палоне страху і іх дзеці — закаханыя Марыся і Грышка. На нейкі момант нават з'яўляецца думка, што Кручкоў, чынячы самасуд, і ваколічная шляхта не ведаюць, у які год XIX ст. яны жывуць і, тым болей, колькі дзён у месяцы. Аднак абодва бакі выдатна разумеюць вынікі непадпарадкавання царскім указам, былым і існуючым. Прыстаў Кручкоў для пыхаватай шляхты ні больш ні менш — «Найяснэйшая Корона». Паважным зваротам драматург нібы падкрэсліваў сувязь паміж судовым кручкатворам, гразою Пінскага краю і самадзержцам, што трымаў у страху і пакоры аграмадную імперыю.

Парэформенны перыяд творчасці Дуніна-Марцінкевіча супаў з пасляпаўстанцкім тэрорам на Беларусі, у выніку якога ўтварылася невыносная грамадска-палітычная атмасфера, няўдзячная для развіцця беларускай літаратуры. То быў час, калі пахіснуліся рады самых перакананых дэмакратаў. Характарызуючы апанаваўшую пасля крыва-

вага разгрому паўстання 1863—1864 гг. Паўночна-Заходні край грамадска-культурную атмасферу, рускі пісьменнік Ф. М. Рашэтнікаў, жывучы, дарэчы, у Брэсце, занатаваў у дзённіку 12 верасня 1866 г.: «Мураўёў памёр, аднак справы літаратурныя і пасля яго смерці не палепшыліся, а, здаецца, будуць ісці ўсё горш і горш. Прычын шукаць няма чаго: галоўныя літаратурныя дзеячы, як трэба разумець, западозраны ў кепскіх поглядах... урад іх душыць так, што яны прадбачаць: літаратуру заб'юць, а калі і застанецца літаратура, дык казённая... І мы перажываем цяпер цяжкі час, цяжкі таму, што казаць справу нельга, а хлусню, фантазію пісаць не хочацца» [3]. Таму невыпадкова, што хоць Дунін-Марцінкевіч у 1867 г. памкнуўся надрукаваць «*Быліцы, расказы Навума*» рускім шрыфтам у «Виленском вестнике», аднак ягоная спроба засталася толькі спробай. Гэтаксама як далёкімі подступамі-марамі засталіся планы сяброў і прыхільнікаў паэта (Я.Карловіча, А.Ельскага) адносна выдання твораў В. Дуніна-Марцінкевіча за мяжою (у Брусэлі і Лейпцыгу).

У складанай атмасферы, усталяванай на Беларусі ў пасляпаўстанцкія гады, Дунін-Марцінкевіч стварае светлую, элегічную паэму «*З-над Іслачы, або Лекі на сон*» (1868), вытрыманую ў лепшых традыцыях польскай рамантычнай паэзіі, у прыватнасці А. Міцкевіча. Паэма — найбольш гарманічны, камерны твор паэта. Талент ягоны раскрываецца тут эпічна і мудра, прымірэнча, бо каб жыць на зямлі — трэба быць у згодзе з прыродай, з людзьмі.

Разам з тым у элегічнае гучанне паэмы — лебядзінай песні па незваротна адыходзячым шляхецкім засценкам, дзе ў нязмушанай гамане вечаровай парою перад камінам або чалеснікамі печы яшчэ цепліліся братэрскія пачуцці і шанаваліся традыцыі бацькоў-прадзедаў, — прарываюцца трывожныя акорды, народжаныя сучаснай эпохай, зусім непадобнай на эпоху «апошняга наезду на Літве», апаэтызаваную ў «*Пане Тадэвушы*». Развіццё невядомых дагэтуль капіталістычных адносін спарадзіла злавесную постаць кулака-міраеда. У паэме Дуніна-Марцінкевіча «*З-над Іслачы, або Лекі на сон*» упершыню ў гісторыі новай беларускай літаратуры паўстаў тып капіталіста-прадпрымальніка, «чумазага» — правобраз будучых герояў М. Салтыкова-Шчадрына, ягоных «иудушек и деруновых», правобраз багушэвічаўскага Бартکі Саска з драпежніцкай псіхалогіяй рабаўніка-спажыўца:

Другі яснавяльможны пан з паноў Сабковіч,
Ахрышчаны ў суседстве імем Дарабковіч.
Гадоў таму са дваццаць — бедачок хлапчына
У выцертай сярмяжцы, збедненая міна,
Бывала, гоніць статак хмызнякамі з пугай,
Пасля ўжо гаспадарыць, тэпае за плугам,
Далей, асветы хцівы, што раз разумнее,

Ужо чытае кніжку, падпісацца ўмее.
Праз колькі год, глядзіш, уцёрся ў аканомы,
За тымі ўдачамі ў магнацкі дом вядомы
Якімісьці там спосабамі ўшрубаваўся
І так замыліў вочы, што замацаваўся
На неблагой арэндзе....

(Пераклад П. Бітэля)

Псіхалогія паводзін Сабковіча ў паэме «*З-над Ісланчы, або Лекі на сон*» і іншых яго «сабратаў па духу» аднолькавая, паколькі аднолькавы свет грамадскіх адносін выклікаў іх да жыцця: свет капіталізму. У апошнім вядомым нам сёння творы Дуніна-Марцінкевіча, камедыі «*Залёты*» (1870), тэма капіталістычнага спажывецтва і сацыяльнага расслаення па-рэформеннай вёскі атрымала далейшае мастакоўскае асэнсаванне. У ім драматург пайшоў углыб па шляху развіцця вобраза Сабковіча, раскрыў характар паводзін і логіку мыслення вясковага кулака-скнары, што кожны дзень жыве ў стыхіі ліхаманкавага ўзбагачэння. Антон Сабковіч прызнае і б'е паклоны толькі аднаму боству — залатому цяльцу, бо лічыць яго ўладу бязмежнай:

Маю грошы, маю я;
Мне ніхто тут не раўня;
Прад маёй машонкай поўнай
Гнецца роўны і няроўны.

(Пераклад Я. Купалы)

Камедыя Дуніна-Марцінкевіча «*Залёты*» сведчыць, як узмужнеў талент драматурга, як значна ўзрасло сацыяльна-палітычнае гучанне кожнай рэплікі з вуснаў персанажаў, майстэрства ў пабудове і развіцці камедыйнага сюжэту, наколькі рознакаляровай стала мастацкая палітра пісьменніка.

У Дуніна-Марцінкевіча былі таленавітыя папярэднікі і сучаснікі. Аднак ніхто з іх не стаў «на падрыхтаваны для яго гісторыяй п'едэстал. Чаму? А таму, што ў толькі што пачатай справе апрача лёгкага адчування патрэбна яшчэ вялікая праца. Трэба было заімпанаваць грамадству хаця б прыблізнай саліднасцю прадукцыі, трэба было даць шмат загалоўкаў, багата друкаваных старонак, і, нарэшце, трэба было да канца працягваць справу, непахісна стаяць на сваім месцы. Гэтага не магло зрабіць першае пакаленне, дык гэта зрабіў *Марцінкевіч*, якога і лічаць *сапраўдным* першым беларускім пісьменнікам, першым літаратурным імем на безлітаратурнай Беларусі. У гэтым яго вялікая заслуга і гэтым ён набыў сабе бяссмерце сярод свядомых беларусаў»[4].

Усёй жыццёвай пуцявінай, з гонарам пройдзенай па зямлі да апошняга імгнення, і няўрымслівай творчай дзейнасцю паэт увасабляў абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларускага народа і здолеў адлюстраваць меру яго мастацкіх вартасцей, заклаў генетычны код для далейшага паспяховага развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства.

Спасылкі:

[1] Мин. губ. ведомости. 1841. 10 окт.

[2] Кісялёў Г. Сейбіты вечнага: Артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў рэвалюцыйнага руху 1863 года. Мн., 1963. С. 133—136, 171.

[3] Решетников Ф. М. Полн. собр. соч.: В 6 т. Свердловск, 1948. Т. 6. С. 299—300.

[4] Палуян С. Лісты ў будучыню: Проза, Публіцыстыка. Крытыка. Мн., 1986. С. 103—104.

Творы:

Дунін-Марцінкевіч В. Творы // Мн., 1984.

Літаратура:

1. Купала Я. Памяці Вінцука Марцінкевіча // Збор твораў. Том 2. Мн., 1973.
2. Багдановіч М. Белорусское возрождение // Поўны збор твораў. Том 2. Мн., 1995.
3. Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Мн., 1963.
4. Кісялёў Г. Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча: Спробы навуковай сістэматызацыі дакументаў і матэрыялаў. Мн., 1988.
5. Грынчык М.М. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі. Мн., 1969.
6. Янушкевіч Я.Я. Беларускі Дудар: Праблема славянскіх традыцый і ўплываў у творчасці В.Дуніна-Марцінкевіча. Мн., 1991.
7. Навуменка І.Я. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Мн., 1992.

Язэп Янушкевіч

Уладзіслаў СЫРАКОМЛЯ (Людвік Францішак Уладзіслаў КАНДРАТОВІЧ) *(1823—1862)*



Уладзіслаў Сыракомля — шырока вядомы ў славянскім свеце паэт. Пражыў ён усяго 39 гадоў, але творчы плён яго таленту надзвычай багаты. Ён пісаў лірычныя вершы і паэмы, гавэнды-гутаркі і песні, краязнаўчыя нарысы і дарожныя нататкі, гістарычна-літаратурныя даследаванні і рэцэнзіі на паэтычныя кнігі, мясцовыя агляды для газет і публіцыстычныя артыкулы, апавяданні і фалькларыстычныя працы, перакладаў з лаціны, з французскай, нямецкай, англійскай, іспанскай, рускай, украінскай моў.

Сёння ўжо добра бачна, што гісторыя паставіла перад намі задачу аднясення гэтай спадчыны і да палякаў, і да беларусаў. Пішучы пераважна па-польску, паэт меў патрэбу далучыцца таксама да творчасці на беларускай мове (вершы «Добрыя весці» і «Ужо птушкі пяюць усюды»). Увядзенне беларускага слова ў мастацкую практыку, заахвочванне пісьменнікаў-землякоў да творчасці на беларускай мове і да адраджэння ўласнай літаратуры, арыентацыя на няўхільнае набліжэнне да ніжэйшых слаёў грамадства ў гістарычна абумоўленым і ўнутрана лагічным руху да беларускамоўнай творчасці — вось тыя асновы, якія вызначаюць Уладзіслава Сыракомлю як беларускага паэта-дэмакрата. Яго творчасць, звязаная з Беларуссю праз тэматыку і фальклор, праз выяўленне мясцовага генатыпу, нібы назапашвае энергію, каб адрадзіцца ў форме беларускай мовы і трапіць, паводле яго слоў, пад стрэхі «братоў у капоце і братоў у сярмязе».

Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Францішак Уладзіслаў Кандратовіч) нарадзіўся 29 верасня 1823 года ў фальварку Смольгаў, які знаходзіўся ў межах Бабруйскага павета Мінскай губерні (цяпер Любанскі раён).

Продкі паэта належалі да старадаўняй беларускай шляхты, паланізаванай у выніку палітычных падзей у Вялікім княстве Літоўскім. Сам жа паэт прыгадваў, што ён паходзіў «з небагатай, але старой і пачцівай шляхты».

Бацька яго, Аляксандр Каятан Кандратовіч, меў адукацыю каморніка, але на казённую службу не пайшоў і, каб утрымліваць сям'ю, арандаваў дробныя фальваркі ў князёў Радзівілаў. Людвіку не споўнілася і двух гадоў, калі быў узяты ў арэнду новы фальварак — Ськавічы (у межах сённяшняга Салігорскага раёна), а праз шэсць гадоў, вясною 1831 года, Кандратовічы пераехалі на новае месца — Кудзінавічы (на мяжы Капыльскага і Нясвіжскага раёнаў). Навучыўшыся чытаць у шасцігадовым узросце, Людвік самастойна знаёміўся з творамі І.Красіцкага і Ф.Князьніна. Падрыхтаваны хатнімі настаўнікамі, у канцы лета 1833 года паспяхова здаў уступныя экзамены ў павятовую школу пры дамініканскім кляштары ў Нясвіжы і пачаў навучанне адразу з другога класа. Пад канец навучальнага года ён быў па паспяховасці трэцім вучнем класа, аднак скончыць школу не ўдалося: у лістападзе 1835 года ўлады зачынілі яе. Давучвацца выпала ў Навагрудку, у той самай школе дамініканцаў, у якой раней вучыліся Адам Міцкевіч і Ян Чачот. Скончыўшы пяты клас, Людвік вярнуўся да бацькоў, якія арандавалі ў той час чарговы фальварак у Мархачоўшчыне (у межах сённяшняга Стаўбцоўскага раёна). Аднак яго прываблівала не гаспадарка, а літаратура, і бацька, разумеючы імкненне сына да асветы, дапамог яму, калі перабраліся на новую арэнду ў Залуча (у межах сённяшняга Стаўбцоўскага раёна), уладкавацца ў 1841 годзе на службу ў канцылярыю кіраўніцтва радзівілаўскімі маёнткамі.

У Нясвіжы перад Людвікам Кандратовічам адкрылася параўнальна шырокая магчымасць для самаадукацыі. Тут ён зблізіўся з колішнімі выпускнікамі Віленскага універсітэта, удзельнікамі краёвага грамадска-культурнага руху першай трэці XIX стагоддзя, тут у асяроддзі канцылярыстаў падаў свой голас, абменьваючыся з калегамі жартоўнымі вершамі, тут, вывучаючы паводле службовага абавязку паперы радзівілаўскага архіва, напісаў артыкул пра мінулае Нясвіжа для «Старажытнай Польшчы» Міхала Балінскага. Урэшце ў Нясвіжы будучы паэт узяў шлюб з шаснаццацігадовай пляменніцай кіраўніка канцылярыі А.Дабравольскага Паўлінай Мітрашэўскай.

У красавіку 1844 года Людвік і Паўліна сталі арандатарамі фальварка Залуча на Стаўбцоўшчыне. Аднак і на гэты раз гаспадарчыя клопаты былі ў Людвіка Кандратовіча не на першым месцы. У канцы года ён дэбютаваў у віленскім часопісе «Атэнэум» (1844, № 6) вершам «Паштальён», напісаным паводле пачутай у Міры гісторыі трагічнага кахання маладога фурмана. Першае выступленне паэта ў друку мела цікавы працяг: узноўлены праз чвэрць стагоддзя па-руску, твор у адаптаваным вygля-

дзе натуральна ўліўся ў рускі мелас і ўжо ў якасці песні «Когда я на почте служил ямщиком» набыў надзвычайную папулярнасць у Расіі.

У «Паштальёне», дакладней, у яго падзагалоўку «народная гутарка», вызначыўся вядучы жанр паэтычных твораў Уладзіслава Сыракомлі. Героем такой гутаркі быў звычайны чалавек, беларускі селянін ці дробны шляхціц, ад імя якога і вялося апавяданне. Гутарка ўяўлялася паэту надзейным сродкам лучнасці з шырокімі грамадскімі слаямі дзякуючы, найперш, увядзенню ў яе вобраз спаведніка, светаразуменне якога вынікала з народных уяўленняў пра дабро і зло і падпарадкоўвала сабе ўвесь вершаваны аповед.

Набліжаючы свае гутаркі да народнага светаўспрымання, паэт у іх аснову клаў мясцовае паданне ці легенду, а нярэдка і нядаўняе здарэнне. Так, палескае паданне пра асочніка, які падняў сякеру ў сваю абарону і забіў пана лоўчага, а пасля хаваўся ў лесе і доўга пакутаваў дзеля пакаяння, Сыракомля пачуў ад бацькі пісьменніка Адама Плуга і ўзнавіў у гутарцы «Хадыка». На паданні пра Мірскі замак заснавана гутарка «Пра зачараваны скарб».

У Залучы паэт працаваў шмат і плённа. З-пад яго пяра выйшла яшчэ адна гутарка — «Дабрародны Ян Дэмбарог» і мноства вершаў, сярод якіх «Вясковы лірнік», «Немаўляці», «Прысвячэнне ліцвінам народных гутарак», «Пра маю старую хатку», «Заўчасна», першы варыянт беларускамоўнага верша «Добрыя весці». Акрамя таго, ён перакладаў вершы паэтаў XVI—XVII ст., напісаныя на лацінскай мове, пісаў «Гісторыю літаратуры ў Польшчы» (у дзвюх кнігах).

Вершаваная апрацоўка паданняў, легендаў і быляў у гутарках, а таксама засваенне вуснапаэтычных вобразаў у вершах лірычнага складу давала Сыракомлю не толькі магчымасць выказаць свае сімпатыі, але і садзейнічала папулярызацыі паэзіі, яе ідэй сярод шырокіх мас, духоўна-культурнае жыццё якіх на працягу стагоддзяў знаходзіла выйсце галоўным чынам у фальклоры.

Мы прад вамі спяваем
Старасвецкім звычаем,
У новы год дорым песняй спадзевы;
Як надзеі дух чуем,
Вось тады калядуем,
Нашы слухайце спевы!

(Пераклад У. Мархеля)

У вершы «Лірнік вясковы», напісаным 18 студзеня 1852 года, паэт атаясамліваў сябе з рамантычным вандроўным лірнікам — гордым носьбітам народнай песні, які натхнёна служыць «роднай старонцы», «добрым

людзям» і да скону захоўвае адданасць свайму прызванню. Ён верыць, што прыйдуць калі-небудзь пакланіцца яго магіле людзі здалёку, а землякі будуць гадаць, як гэта сталася, што песні іх вёскі разышліся па свеце, і ўцямяць нарэшце, што ў гэтым заслуга лірніка, які спяваў і жыў з імі. Тады павядуць яны падарожнікаў на ціхія могілкі, паказаўшы на курганок ля сасны, з гонарам скажуць: «Тут наш лірнік вясковы, памёр ён, граючы на ліры».

Хто ўважліва сачыў за творчасцю паэта і захапляўся яго задушэўнымі гутаркамі з жыцця вясковага люду, хоць і аддаваў належнае мастацкай умоўнасці верша «Лірнік вясковы», але без асаблівай цяжкасці ўбачыў у яго галоўным героі шмат агульнага з аўтарам. І, вядома ж, многія ў Беларусі пачалі прызнаваць у паэце свайго «вясковага лірніка». Літаратурны псеўданім Людвіка Кандратовіча — Уладзіслаў Сыракомля і тытул паэта — «вясковы лірнік» сталі для тадышняй чытацкай публікі сінонімамі і назаўсёды засталіся імі ў гісторыі дзвюх літаратур — польскай і беларускай.

Выдавецкія інтарэсы вымагалі частых паездак у Вільню, таму на пачатку 50-х гадоў перад паэтам паўстала праблема пераезду ў гэты горад на сталае жыхарства, тым больш, што жыццё ў Залучы было азмрочана смерцю дачок-малалетак. Восенню 1852 года Сыракомля пакінуў залучанскую сядзібу і пераехаў з сям'ёю ў сталіцу колішняга Вялікага княства Літоўскага ў надзеі на тое, каб цалкам прысвяціць сябе літаратурнай працы. Аднак Вільня выклікала супярэчлівыя пачуцці, і паэт, разумеючы, што гарадское жыццё не па ім, як толькі надарыўся выпадак, узяў у арэнду падвіленскі фальварак Барэйкаўшчына. З таго часу так і разрываўся Сыракомля паміж горадам і вёскай, паміж Віленшчынай і Прынямоннем, выказваючы ў сваёй паэзіі і краязнаўчых нарысах сум па родных мясцінах.

Барэйкаўшчынска-віленскае дзесяцігоддзе паэта вызначаецца ўзмацненнем у яго творчасці грамадзянскіх матываў. Шукаючы адказ на сацыяльна вострыя пытанні часу, вясковы лірнік абураўся абыякавасцю пануючых класаў да лёсу прыгонных («Вызваленне сялян»), з сарказмам глядзеў на царскую ўладу («Сахар-мароз»), звяртаўся да гісторыю краю, каб апаэтызаваць гераічна-патрыятычныя ўчынкі продкаў дзеля ажыўлення сучаснага яму нацыянальна-вызваленчага руху («Гетманская начоўка», «Улас»). Зразумела, гэта не выклікала прыхільнасці самаўладства.

Супрацьстаянне вясковага лірніка і самадзяржаўнага чынавенства набліжаліся ў канцы пяцідзесятых гадоў да адкрытага сутыкнення. Канфлікт дасягнуў сваёй кульмінацыі ў 1858 годзе ў час паездкі Сыракомлі ў Вялікапольшчу. Пастаноўка яго п'есы «Хатка ў лесе» у Познаньскім тэатры, дзе шанаванне аўтара ператварылася ў бурлівае выяўленне патрыятычных пачуццяў гледачоў, скончылася тым, што за ім быў устаноўлены тайны паліцэйскі нагляд. І, калі ў красавіку 1861 года Сыракомля без дазволу віленскіх улад, праз Коўна, дзе здабыў патрэбны

пашпарт, выехаў у Варшаву і ўзяў удзел у антыцарскіх маніфестацыях, яго арыштавалі. Хворы на сухоты паэт амаль месяц знаходзіўся ў віленскай турме. Потым, яшчэ да заканчэння следства, яму было дазволена жыць пад наглядам паліцыі ў Барэйкаўшчыне, а пазней пераехаць на лячэнне ў Вільню. 15 верасня 1862 года трапяткое, няскоранае сэрца вясковага лірніка перастала біцца. Але нагляд за паэтам быў спынены не з яго смерцю, а з яго пахаваннем на віленскіх могілках Роса.

Пераважная большасць паэтычных твораў вясковага лірніка, яго асноўныя гістарычна-краязнаўчыя нарысы («Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», «Мінск», «Манаграфія ракі Нёман»), незакончаны дарожны дзённік з часу першай паездкі ў Варшаву (1856 г.), уступ да задуманай аповесці-ўспаміну «Вёска», накіды да працы пра Маладзечна ўсім сваім зместам былі звернуты да родных мясцін і па сутнасці з'яўляліся творчым увасабленнем яго любові да Беларусі. «Заўсёды мне здавалася, — пісаў Сыракомля ў нарысе «Нёман ад вытокаў да вусця», — што нельга палюбіць Маці-зямлю родную без уважлівага вывучэння ўсяго яе аблічча. Навучыцца бачыць іскру, што ўпала з яе павек, плакаць са слязьмі, якія з вачэй яе цяклі або цячы маглі, нават з любасцю лічыць маршчыны на яе твары — усё гэта абавязковыя ўмовы любові. Даследаваць нашу родную зямлю ў гістарычных, прыродных, этнаграфічных, археалагічных, геаграфічных адносінах — гэта, здаецца, вельмі просты вынік таго, што прынята называць любасцю да радзімы». Адсюль, думаецца, і пісьменніцкі універсалізм паэта.

У вершы «Пілігрым», напісаным неўзабаве пасля пераезду з прынёманскага Залуча ў Вільню, Сыракомля выказаў шчымлівую тугу па мясцінах маладосці праз натуральны ў яго творчасці вобраз роднага ветру:

О старонка любові! Мой родны закутак!
Калі віхр жыцця мяне носіць па свеце,
То няхай ён паветрам тваім запасецца
І напоўніць ім грудзі мае да глыбіняў,
Каб я змог уздыхаць пакрыху на чужыне.

(Пераклад У. Мархеля)

Набранае ў запас залучанскае паветра дапамагло паэту хутка закончыць кнігу «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», багатую на гістарычныя звесткі пра гарады і мястэчкі заходняй часткі Цэнтральнай Беларусі, на этнаграфічныя апісанні сялянскага побыту, насычанага пераважна будзёнымі клопатамі, якія значна спрашчаюць людскую памяць пра мінулы час. «У вёсках народ убогі, — зазначаў Сыракомля. — Працуе ён на нёманскіх плытах або на полі — сваім і панскім; у двары — пан арандатар або аканом, на пясчаных нівах — часцей на ўсё неўраджай. Часам больш ранні разліў Нёмана, эпідэмія, спякотнае лета, марозная зіма, карысныя або шкодныя для гаспадаркі дажджы — вось і ўсе факты мясцовага мінулага, захаваныя ў народнай памяці».

«Вандроўкі...» былі першым вяртаннем паэта ў свае «былыя ваколіцы». Памяць жа пашырала межы родных мясцін, скіроўвала яго ўвагу да Мінска. Калі «Вандроўкі...» яшчэ друкаваліся, Сыракомля пачаў збіраць матэрыялы для гістарычна-краязнаўчага нарыса пра сталіцу губерні, дзе праляцелі трыццаць гадоў яго жыцця. Вядома, што з гэтай мэтаю ён двойчы прыязджаў у Мінск. Зімою 1854 года ў вандроўках па горадзе вясковага лірніка суправаджаў чыноўнік мінскай дэпутацкай зборні, аматар-гербазнаўца Міхаіл Гаўсман, які паказаў, дзе працякала Няміга, і паведаміў некалькі звестак з мясцовай гісторыі. У чэрвені 1855 года яго кансультантам быў мастак і пісьменнік Адам Шэмеш, які прыслаў пасля асобную нататку пра тутэйшыя бажніцы.

Пра тое, што Сыракомля піша нырас «Мінск», было шырока вядома ў губернскім цэнтры, і жыхары яго лічылі сваім абавязкам дапамагчы паэту неабходнымі матэрыяламі. Праз пасрэдніцтва Шэмеша ў Вільню пасылалася для Сыракомлі «Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам», падрыхтаванае часовай камісіяй па збору старажытных дакументаў і выдадзенае тут у 1848 годзе. Публікацыя ж нарыса ў часопісе «Тэка Віленска» узмацніла цікавасць мінчукоў да гісторыі свайго горада, выклікала да жыцця нататкі пра Мінск мясцовага саветніка губернскага праўлення Зыгмунта Заштаўта, надрукаваныя ў «Минских губернских ведомостях». Заштаўт, у прыватнасці, сцвярджаў, што Сыракомля як тутэйшы ўраджэнец, вядома, надзвычай захапіўся сваёй радзімай, што ў нейкім сэнсе ён аддаў перавагу Мінску перад сталіцаю краю Вільняй. Свае нататкі аўтар даслаў у Барэйкаўшчыну. Неўзабаве прыйшоў адказ. «Ці магу я гневацца, — пісаў паэт Заштаўту, — што падазраяце мяне ў аддачы перавагі Мінску перад Вільняю? Мінск я люблю як сталіцу правінцыі, дзе нарадзіўся, Вільню — як сталіцу майго краю, не ўмею адрозніваць адной любові ад другой. Зрэшты, палеміка пра тое, хто болей любіць край, да дрэнных вынікаў прывесці не можа. Калі б мне загадалі абавязкова на вас гневацца і дазволілі накласці кару, то я пакараў бы вас жаданнем дасылаць мне ўсе свае артыкулы пра Мінск».

Вывучэнне «сталіцы правінцыі» Сыракомля працягваў і пасля публікацыі нарыса «Мінск». Ёсць звесткі, што паэт назапашваў новы матэрыял, пастаянна пашыраючы сваё апісанне гэтага губернскага горада, і што нарыс «у 80 працэнтах застаўся ў рукапісе». Пільная ўвага папулярнага краёвага паэта да мінскіх падзей стымулявала цікавасць да мінулых і сучасных дзён Мінска ў асяроддзі мясцовай інтэлігенцыі. Уладзіслаў Сыракомля гасцяваў у чэрвені 1855 года ў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і напісаў у сувязі з гэтым верш «Тост у доме В.Марцінкевіча». Прысвяціў ён таксама і экспромт Аляксандру Валіцкаму падчас іх першай сустрэчы:

Раней мы не страчаліся ніколі,
Але глыбей знаёмства ўжо й не трэба:

Мы толькі разламалі лусту хлеба,
А падалося — з'елі бочку солі.
(Пераклад У.Мархеля)

Якія канкрэтна гаворкі вяліся тады між паэтам і яго мінскімі прыяцелямі? Пра гэта няма дакументальных сведчанняў. Ёсць толькі глухія звесткі, што ў сярэдзіне 50-х гадоў Сыракомля наважваўся наладзіць выданне дэмакратычнага штогадовіка, прысвечанага пытанням мясцовага грамадска-культурнага жыцця. Таму не абышлося, відаць, без перагавораў наконт супрацоўніцтва ў гэтым выданні, без заахвочвання да напісання матэрыялаў пра мінскія праблемы. Агульнае ўяўленне пра супольны клопат вясковага лірніка і яго землякоў дае вершаваная імправізацыя «У коле знаёмых у Мінску», у якой выказваецца надзея на дабратворны грамадскі ўплыў дзейнасці мастака Адама Шэмеша, кнігара Жалезняка (Аляксандра Валіцкага) і кампазітара Станіслава Манюшкі. З Мінскам, з яго культурным асяроддзем Сыракомля сувязяў не перапыняў. Не маючы магчымасці часта наведвацца сюды, ён пісаў лісты да Паўла Малышэвіча, Аляксандра Валіцкага, Адама Шэмеша, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і радаваўся бязмежна добрым весцям з радзімы.

Рэалізуючы свае патрыятычныя пачуцці ў шматграннай працы, Сыракомля імкнуўся як мага паўней раскрыць вобраз роднага краю і паказаць яго свету. Вось чаму да яго апрацовак беларускіх народных песень, запазычанняў матываў і сюжэтаў з вуснай паэзіі, мастацкіх інтэпрэтацый і находжання народных выслоўяў у паэмах, гутарках і вершах дадалося яшчэ і «Кароткае даследаванне мовы і характару паэзіі русінаў Мінскай правінцыі». У гэтай працы вясковы лірнік раскрыўся як праніклівы фальклярыст і адданы прыхільнік вуснапаэтычнай творчасці беларусаў. Напісаная ў стрымана-эмацыянальнай манеры, гэтая праца абагульняла асабісты вопыт паэта ў спасціжэнні духоўнага жыцця беларускага народа. Сваю ўвагу ён засяродзіў тут на рэгіянальных асаблівасцях, якія выявіліся як у мове жыхароў ваколіц Барысава, Наваградка, Мінска, Слуцка, Пінска, так і ў вуснапаэтычнай творчасці. У поле зроку аўтара трапілі вясельныя, купальскія, рэкруцкія, сірочыя песні. Паводле назіранняў Сыракомлі, «самым багатым полем паэзіі вясковага русінскага люду з'яўляецца жніво». Пры гэтым ён адзначаў вядучы матыў беларускіх песень: «Ніводзін, можа, народ не ўмее так пераканаўча плакаць аб нядолі ўвогуле, як славянскі русін».

Захопленасць вывучэннем фальклору і гісторыі свайго краю была ў Сыракомлі амаль роўная паэтычнаму натхненню, а крыніцай яго творчай энергіі заўсёды была бязмежная любасць да тутэйшай зямлі. Паэт прызнаваўся, што, калі б ён ні браўся за аловак, у яго міжволі «атрымаецца пад рукою або ліцвінская хатка, або вясковы касцёлік, або ліцвінскі дворык», што «нічога іншага» ён не ўмее «маляваць на паперы, толькі тое, што палюбіў усёй душою». Звяртаючыся ў думках да роднай старонкі, дзе ў маладыя гады ён урабляў зямлю, Сыракомля ў гутарцы «Кавалак хле-

ба» зазначыў, што лугі ён пазнае па паху, а ваду з Нёмана — па смаку, што яму добра знаёмы пошум прынёманскіх лясоў і грудзьмі ён лёгка адчуе вецер з тых мясцін. Першае, чым хацеў падзяліцца паэт з чытачом, калі трапіў на тэрыторыю Польшчы, — гэта тое, што «тут, на польскім баку Нёмана, усё не такое, як у нас».

Чалавечая сутнасць Сыракомлевых герояў часта правяраецца іх стаўленнем да радзімы, да традыцый свайго народа. Гэты крытэрый вызначэння сапраўднай каштоўнасці чалавека, бадай, не саступаў у творчасці паэта другому, які выпрабоўваў маральнасць таго ці іншага героя яго сувяззю з інтарэсамі простых людзей («Жменя пшаніцы», «Начлег гетмана»). Адарванасць ад народа, ад родных каранёў, касмапалітызм расцэньваліся паэтам як самыя ганебныя якасці чалавечай асобы. Таму Сыракомля неаднаразова падкрэсліваў, што любоў да радзімы, няхай нічым не прыметнай на першы погляд, — гэта праява высокай духоўнасці.

Набліжаючы сваю творчасць да мастацкай свядомасці беларускага народа, Сыракомля хацеў, каб яго вершы і гутаркі траплялі пад вясковую страху. Аднак ён пісаў іх па-польску. А ў хатках, крытых дранкаю ці саломаю, жылі «браты ў капоце і браты ў сярмязе», якія размаўлялі і песню пялі па-беларуску. Гэта ўтварала пэўную супярэчнасць паміж мэтай і рэальнасцю, паміж матэрыялізаванай ідэяй і яе ўспрыманнем, паміж паэтам і чытачом. Патрэбен быў яшчэ адзін крок на шляху да беларускага чытача і слухача. І гэты крок быў зроблены...

У часе рэдагавання першага паэтычнага зборніка «Чым хата багата...» Вінцэся Каратынскага, які наважваўся скласці яго не толькі з польскамоўных твораў, але і з вершаў, напісаных па-беларуску, Сыракомля прапанаваў свайму падапечнаму выдаць сумесную кнігу беларускамоўных вершаў, каб беларускае мастацкае слова жыло асобна ад польскага. На жаль, гэтая сумесная кніга на пабачыла свет і з твораў, напісаных вясковым лірнікам па-беларуску, наша літаратура атрымала ў спадчыну ўсяго два вершы — «Добрыя весці» і «Ужо птушкі пяюць усюды», лёс астатніх, мусіць, трагічны. Сёння нават цяжка ўявіць, што з гэтым страціла беларуская паэзія на шляху да самастойнасці, якую прадчуваў і імкнуўся наблізіць сваёй творчасцю Уладзіслаў Сыракомля.

Літаратура:

1. Сыракомля У. Добрыя весці: паэзія, проза, крытыка. Мн., 1993.
2. Fornalczyk F. Hardy lirnik wioskowy. Poznań, 1972.
3. Цвірка К.А. Слова пра Сыракомлю. Мн., 1975.
4. Мархель У.І. Лірнік вясковы. Мн., 1983.
5. Мархель У.І. Вяшчун славы і волі. Мн., 1989.

Уладзімір Мархель

Міхаіл Ксаверы Зыгмунт ЕЛЬСКІ

(1831—1904)



ядомы беларускі і польскі скрыпач, кампазітар, музыкант, пісьменнік, збіральнік фальклору Міхаіл (Міхал) Ксаверы Зыгмунт Карлавіч Ельскі нарадзіўся 8 кастрычніка 1831 года ў маёнтку Дудзічы Ігуменскага павета (цяпер у Пухавіцкім р-не, Мінская вобласць), які з'яўляўся спадчынным маёнткам адной з галін вядомага ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай яшчэ з канца XVI стагоддзя шляхецкага роду Ельскіх. (У «Вялікай усеагульнай ілюстраванай энцыклапедыі»(Wielka Encyklopedya Powszechna Ilustrowana) адзначаецца, што М.Ельскі нарадзіўся ў маёнтку Ляды Ігуменскага павета, які таксама належаў сям'і Ельскіх.)[1]

Родапачынальнікам беларускіх Ельскіх іх нашчадкі і даследчыкі гісторыі роду Ельскіх лічаць Канстанціна Ельскага герба Пелеш (Pielesz — птушынае гняздо). Герб меў варыянты. Ім карысталіся не толькі Ельскія, але і нашчадкі роду Каціцькевічаў: Каяловічы, Нясецкія, Красніцкія, Баркоўскія, Касіньскія. «Вялікая ўсеагульная ілюстраваная энцыклапедыя» дае такое апісанне герба Ельскіх: «На шчыце, у чырвоным полі, пад шасціканцовай залатой зоркай (паводле Каяловіча пад кавалерскім крыжам) два мячы вастрыем угару, ускосна скрыжаваныя. Над шлемам у кароне шляхецкай, тры страусавых пяры»[2]. Ёсць і такое яго апісанне: «Два сярэбраныя мячы, складзеныя на крыж, звернутыя дзяржаннямі да долу, канцамі ў гару, на чырвоным полі. На рыцарскім шоламе тры стравусавыя пяры. Набыты ў Польшчы за адважныя справы продка таго дому ў мужных бітвах з непрыяцелем»[3].

Род Канстанціна Ельскага па мужчынскай лініі, як тады гаварылі —

«па мячы», прадоўжыў сын Гаўрыла, нашчадкі якога жылі ў асноўным на Гродзеншчыне і Міншчыне. Яны займалі значныя дзяржаўныя пасады, былі вядомымі вайскоўцамі, дзеячамі навукі і культуры, атрымоўвалі ад вялікіх князёў літоўскіх і польскіх каралёў пасады, чыны, маёнткі, шляхецкія прывілеі. Маёнткі, многія чыны і пасады перадаваліся па спадчыне, што было ў традыцыі тых часоў.

Да гэтай галіны належаў і Уладзіслаў Ельскі (дакладныя гады жыцця невядомы), староста пінскі, палкоўнік пяцігорскі. (Ён быў шэфам пяцігорскага палка лёгкай кавалерыі нацыянальнай войска Вялікага княства Літоўскага, які камплектаваўся з пінскай шляхты.) У шлюбе з Аленай Бжастоўскай меў сыноў Юзафа, Францішка, Станіслава, Канстанціна, якія таксама пакінулі прыкметны след у гісторыі Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай другой паловы XVIII—першай паловы XIX стагоддзяў.

Адзін з сыноў Уладзіслава — Станіслаў Ельскі (год нараджэння дакладна невядомы, памёр у 1829 г.), палкоўнік пяцігорскі, ігуменскі харунжы кавалерыі нацыянальнай войска Вялікага княства Літоўскага (1788), камісар скарбовы (1784—1792), камісар скарбовы Рэчы Паспалітай (1792—1793), а затым маршалак Ігуменскага павета (1795—1812), узяў за жонку Розу Прозар, дачку віцебскага ваяводы Юзафа Прозара, якая прынесла ў пасаг маёнтак Дудзічы.

Да гэтага часу тут ужо былі вялікія мастацкія, у тым ліку і музычныя, традыцыі. Сам ваявода Юзаф Прозар (1723—1788) захапляўся архітэктурай і музыкай. Дудзічская сядзіба была пабудавана ім у 1767—1769 гадах у стылі позняга барока. Сядзібны дом быў злучаны з флігелямі кароткімі пераходамі і ўтвараў курданер (парадны паўраскрыты двор перад будынкам, утвораны асноўным будынкам і яго двума бакавымі крыламі). У правым флігелі да 1864 года размяшчалася капліца, у левым — жылыя пакоі. Быў закладзены рэгулярны парк, створана арыгінальная водная сістэма. Сядзіба была палаца-паркавым ансамблем, які размяшчаўся на маляўнічым беразе ракі Пціч. У 1780 годзе Ю.Прозар, выконваючы волю сваёй памершай жонкі Аляксандры, пабудаваў на месцы драўлянага касцёла Заранкаў уніяцкую Пакроўскую царкву. Яна славілася цудатворнай іконай Божай Маці. У 1839 годзе уніяцкая царква была пераўтворана ў праваслаўную. У яе крыпце былі пахаваны ўладальнікі Дудзіч (Заранкі-Грабоўскія, Прозары, Ліпскія, Ельскія) і члены іх сем'яў.

Ю.Прозар, вялікі аматар і знаўца скрыпічнай музыкі, стварыў пры сваім двары капэлу пад кіраўніцтвам здольнага скрыпача Урублеўскага. Яна, як лічылі сучаснікі, выконвала творы на добрым прафесійным узроўні.

Неабходна адзначыць, што стварэнне музыкальных капэл пры два-

рах магнатаў і багатай шляхты ў сярэдзіне XVIII—першай чвэрці XIX стагоддзяў набыло шырокае распаўсюджанне. Часта імі кіравалі або ў складзе іх ігралі вядомыя еўрапейскія музыканты. Нямала яркіх талентаў было і з мясцовай шляхты і сялянства. На жаль, у многіх выпадках праяўлялася і знявага, абыякавасць да лёсу мясцовых талентаў, асабліва з прыгонных сялян. Аднак салонныя капэлы выконвалі ў асноўным творы заходнееўрапейскіх аўтараў. Народная музыка і песні гучалі ў карчмах, на вяселлях, падчас народных святаў і гульняў.

Станіслаў Ельскі атрымаў добрую адукацыю, стаў прадаўжальнікам музычных традыцый у Дудзічах. Ён уважліва адносіўся да Урублеўскага і членаў капэлы, сам іграў на скрыпцы. Станіслаў быў знаёмы з многімі вядомымі музыкантамі. Гетман Вялікага княства Літоўскага Міхал Казімір Агінскі прысвяціў «паважанаму брату Станіславу Ельскаму і яго жонцы Розе, ураджанай Прозар»[4] «G-dur паланез для скрыпкі і фартэпіяна». Станіслаў Ельскі захапляўся рэфарматарскімі ідэямі Антонія Тызенгаўза і Іяхіма Храптовіча, збіраў бібліятэку, стварыў мясцовую школу рамёстваў. Пры уніяцкай царкве была створана народная школа.

Ельскія радніліся з Агінскімі, Манюшкамі, Матушэвічамі, Булгарынымі, Ваньковічамі, Корсакамі, Чапскімі і іншымі выдатнымі шляхецкімі родамі, бралі ад іх любоў і здольнасці да музыкі, літаратуры, мастацтва, але змаглі захаваць і сваю самабытнасць.

Пасля смерці бацькі, Станіслава, у 1829 г. Дудзічы атрымаў яго другі сын Караль Ельскі (1789—1855). (У «Вялікай усеагульнай ілюстраванай энцыклапедыі» указваецца, што К.Ельскі нарадзіўся каля 1789 г. і памёр у 1856 г.)[5]. Гэта быў высокаадукаваны чалавек. Ён закончыў медыцынскі факультэт Віленскага універсітэта, набыў званне доктара медыцыны. Добра вёў гаспадарку. Утрымліваў за свой кошт бальніцу для сялян, дзе працаваў сам. Аднак галоўным яго захапленнем стала літаратура, мастацтва і асабліва музыка. Ён на прафесійным узроўні іграў на скрыпцы, якая, на думку даследчыкаў (А.Капілаў), з'явілася на Беларусі ў канцы XV—пачатку XVI стст. і стала не толькі прафесійным, але і народным музычным інструментам.

Караль Ельскі браў урокі ў знакамітых музыкантаў Кіфелінга і Юзафа Дзяшчынскага. Сам пісаў музыку, у асноўным паланезы, якія захоўваліся ў сямейным архіве ў Дудзічах. На жаль на сённяшні дзень даследчыкам вядомы толькі адзін скрыпічны музычны твор Караля Ельскага «Паланез 1837 года», які у наш час уключаны ў два нотныя зборнікі «Музыка сям'і Ельскіх» і запісаны на касету «Музыка сям'і Ельскіх».

Захаплялася музыкай і жонка Караля Ельскага Людвіка Штайнберг (1808—1881). У гэтым сямейным гняздзе аднаго з вядомых шляхецкіх родаў панавала сапраўдная багемная абстаноўка. Да іх цягнулася мясцовая шляхта, бывалі госці і з далёкіх краёў.

Тут, у Дудзічах, нарадзіліся дзеці Караля і Людвікі Ельскіх: сыны Міхаіл, Аляксандр, Жыгімонт і дачка Станіслава. Малодшы брат Міхаіла Аляксандр Карлавіч Ельскі (1834—1916) стаў вядомым беларускім гісторыкам, этнографам, краязнаўцам, пісьменнікам, публіцыстам, перакладчыкам. Ён стварыў знакамітую бібліятэку і музей старажытнасцей у Замосці.

Жыгімонт Карл Восіп Ельскі служыў у расійскім войску, меў званне падпалкоўніка, быў старшым ад'ютантам пры начальніку краю ва Усходняй Сібіры і там памёр. Іх сястра Станіслава таксама захаплялася музыкай. Яна стала жонкай вядомага кампазітара Міхала Грушвіцкага і прывіла любоў да музыкі сваім дзецям.

Атмасфера ў сям'і ў многім спрыяла таму, што ўсе дзеці Ельскіх выхоўваліся ў павазе да бацькоў, рэлігіі, захапляліся музыкай.

Міхаіл, як і бацька, больш за ўсё палюбіў скрыпку. Атрымаўшы добрае музычнае выхаванне ў сям'і, ён з 1845 па 1847 год вучыўся ў Лаздэнэне (цяпер Краснознаменск, Калініградская вобласць), бо тут, на думку некаторых даследчыкаў (У.Мархель), жылі блізкія родзічы яго маці Людвікі. Тут Міхаіл бярэ ўрокі ў скрыпача Эндома. У 1847 годзе ён вяртаецца да бацькоў і пачынае вучыцца ў вопытнага скрыпача, кампазітара і педагога, які разам з тым быў выдатным спеваком, Канстанціна Кшыжаноўскага (Krzyżanowskiego).

Творчая дзейнасць Кшыжаноўскага прайшла ў асноўным у Мінску, дзе ён выкладаў музыку ў пансіёне для дзяцей шляхты пры жаночым бенедыктынскім манастыры, у прыватным пансіёне Марыі Голуб і ў мужчынскай гімназіі. Разам са Станіславам Манюшкам К.Кшыжаноўскі стварыў музыку да спектакляў тэатра Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча — аперэты «Рэкруцкі набор» (1841) і оперы «Ідылія» («Сялянка», 1852).

У гэты час музыкальнае жыццё ў многіх беларускіх гарадах і шляхецкіх маёнтках дасягнула даволі высокага ўзроўню. У Мінску выступаюць з канцэртамі вядомыя артысты і тэатральныя трупы. Дзейнічае створаны В.Дуніным-Марцінкевічам музычна-драматычны гурток. Шырокі размах набываюць і выступленні мясцовых музыкантаў, сярод якіх вылучаецца як скрыпач і кампазітар Міхаіл Ельскі.

1840—1860-я гады — час імклівага росту прафесійнага майстэрства лепшых беларускіх скрыпачоў: Канстанціна Кшыжаноўскага, Івана Дабравольскага, Іераніма Памарнацкага, Івана Крушэўскага і многіх іншых. «Паганіні ў жаночым адзенні» — так назвалі сучаснікі 13-гадовую гродзенскую скрыпачку Тэафілію Юзэфовіч пасля яе бліскучых выступленняў у Пецярбургу ў 1841 г.

Вядомым скрыпачом-віртуозам у той час быў і Вікенцій Банькевіч. Да яго ў Вільню ў 1849 г. і едзе Міхаіл Ельскі. Тут ён адначасова вучыцца ў В.Банькевіча і ў Віленскім дваранскім інстытуце. Разам з іншымі

яго выхаванцамі Міхаіл выступае ў асноўным у дабрачынных канцэртах. Аб адным з іх, які адбыўся 24 лістапада 1849 г. і ў якім удзельнічаў і М.Ельскі, добразычліва пісаў музыкальны крытык газеты «Виленский вестник» у нумары за 2 снежня 1849 г.: «Былі выкананы на скрыпцы і фартэпіяна розныя музычныя п'есы п[ана]мі Манькоўскім, Андржэйковічам і Ельскім — выхаванцамі Віленскага дваранскага інстытута. П[ан] Андржэйковіч іграў на фартэпіяна фантазію Гайдна на тэму з оперы «Лукрэцыя Борджыя», п[ан] Манькоўскі, таксама на фартэп'яна, Вялікі канцэрт Шапэна з акампанементам аркестра, а п[ан] Ельскі таксама з аркестрам, Вялікую фантазію п[ана] Арто на скрыпцы. Усе трое задаволілі знаўцаў чысцінёй выканання і лёгкасцю ў пераадоленні цяжкасцей, якімі цяпер надзвычай багаты творы новых кампазітараў»[6]. У 1849 г. Міхаіл Ельскі заканчвае вучобу ў Віленскім дваранскім інстытуце і атрымлівае атэстат. Аднак ён не лічыць набытую адукацыю дастатковай і едзе ў Кіеў. Тут у якасці вольнага слухача наведвае лекцыі па правазнаўству ў Кіеўскім універсітэце і працуе юрыстам у гарадскім судзе. Відаць, гэта праца не захапляе яго, і ў хуткім часе Міхаіл Ельскі пакідае службу і вырашае заняцца прафесійнай кампазітарскай і выканаўчай дзейнасцю. Ён выступае з канцэртамі ў Кіеве і Мінску, імя яго становіцца ўсё больш вядомым.

Гэта быў перыяд рамантызму ў беларускай і польскай шляхецкай культуры. Таму не выпадкова сярод твораў М.Ельскага і іншых музыкантаў гэтага часу так многа музыкі народнага песеннага жанру, танцаў, гульняў — паланезы, мазуркі, танцы фантастычных вобразаў.

У 1852 г. у Кіеве ў выдавецтве Антона Кацiпiньскага надрукаваны першыя творы М.Ельскага «Скрыпічныя мініяцюры», высокамастацкая якасць якіх была адзначана як слухачамі, так і музычнымі крытыкамі. Менавіта 1852 г. Міхаіл Ельскі будзе лічыць пачаткам сваёй музыкальнай і кампазітарскай дзейнасці. Ён многа працуе над скрыпічнымі творамі Баха, Гайдна, Моцарта, Бетховена, Віёці, Берыо, Ліпіньскага, В'етана, Шпора і іншых ужо вядомых музыкантаў, уключае іх творы ў свой рэпертуар. Адначасова ў праграмах яго канцэртаў часта гучаць уласныя творы. Пасля смерці бацькі, Караля, у 1855 годзе Міхаіл як старэйшы па мужчынскай лініі, «па мячы», атрымлівае па раздзельнаму запісу спадчынны маёнтак Дудзічы, а брат Аляксандр — маёнтак Замосце.

Аднак у адрозненне ад брата Аляксандра, які сам вядзе сваю гаспадарку, Міхаіл не адчувае такой цягі і здае свой маёнтак Дудзічы (1656 дзесяцін зямлі), карчму і млын арандатарам, а сам у 1860 г. выязджае для далейшага ўдасканалення свайго выканаўчага майстэрства і музычнай адукацыі за мяжу. Па дарозе ў Парыж ён выступае з канцэртамі ў Кракаве, Вроцлаве, іншых гарадах, выконвае як творы знакамітых кампазітараў Віёці, Беліні, Ліпіньскага і інш., так і свае ўласныя.

Музычны крытык К.Залеўскі пісаў у газеце «Ruch Muzyczny» («Рух музычны») № 13 за 1861 г. з нагоды выступлення Міхаіла Ельскага ў Вроцлаве, што для невялікага кола аматараў музыкі выступленне дагэтуль тут невядомага артыста-скрыпача Міхаіла Ельскага, які знаходзіўся тут праездам у Парыж, было прыемным сюрпрызам. «П[ан] Ельскі сярод іншых іграў і свае творы, з якіх асабліва саната-фантазія адзначана незаўрадным талентам кампазітара»[7]. На гэтым і іншых канцэртах ён выканаў 24-ы канцэрт Віёці, Вялікую фантазію Ліпіньскага на тэмы оперы Беліні «Пурытане», а таксама такія свае творы, як Вялікая фантазія на палескія народныя тэмы, канцэртная мазурка «Успаміны аб Варшаве» і інш.

У Парыжы Міхаіл Ельскі знаёміцца, бярэ ўрокі, а затым і здружваецца са знакамітым бельгійскім віртуозам Анры В'етанам і членамі яго сям'і, якіх часта наведваў. Урокі, узятыя ў В'етана, дапамаглі яшчэ глыбей раскрыцца таленту Міхаіла Ельскага. Незадоўга да смерці вялікага польскага кампазітара Караля Ліпіньскага (снежань 1861 г.) Міхаіл Ельскі наведаў яго. І хоць гэта сустрэча з прычыны хваробы Ліпіньскага была непрацяглай, Міхаіл Ельскі неаднаразова адзначаў, што творы Ліпіньскага аказалі на яго вялікі ўплыў і ён лічыць сябе вучнем гэтага вялікага польскага кампазітара.

У канцы 1861—пачатку 1862 года Міхаіл Ельскі выступае з канцэртамі ў Франкфурце-на-Майне, Дармштаце, Мюнхене, Берліне, Вроцлаве. Канцэртнае турнэ па Германіі прайшло з вялікім поспехам. Як адзначае «Вялікая ўсеагульная ілюстраваная энцыклапедыя», берлінскія газеты пісалі, што для выканання М.Ельскага характэрны бліскучасць музычнай фразіроўкі, глыбокае музыкальнае пачуццё, упэўненасць, чысціня інтанацыі, высокая тэхніка апрацоўкі тэксту, выкарыстанне твораў як мінулага, так і сучаснага пакалення кампазітараў. Яго рэпертуар складаецца з найбольш знакамітых твораў скрыпічнай музыкі Баха, Віёці, Паганіні, В'етана, Эрнста, Ліпіньскага, Берыё, Шпора, з уласных музычных твораў[8].

М.Ельскі наведаў Мюнхен, дзе пад кіраўніцтвам вядомага нямецкага кампазітара і дырыжора Франца Лахнера паглыбіў свае веды ў музычнай кампазіцыі.

Пасля вяртання з падарожжа па Францыі, Германіі, Польшчы ў 1862 годзе ён пасяляецца ў Дудзічах і часта выязджае на канцэрты ў Мінск, Вільню. У маі 1862 г. ён выступіў у Кракаве і ўвесь прыбытак ад канцэрта аддаў на карысць навучэнцаў Тэхналагічнага інстытута. Дабрачынным быў і канцэрт, з якім ён выступаў у другой палове 1869 года ў Варшаве, у Resursie Obywatelskiej.

Міхаіл Ельскі многа працуе над сваімі арыгінальнымі творамі, у якіх выкарыстоўвае народную музыку і фальклор. Ён вельмі любіў свой парк,

«чэрпаў натхненне ў шуме вадзяного млына», непадалёку ад якога знаходзілася бяседка, пабудаваная ў 1768 годзе прыгоннымі віцебскага ваяводы Ю.Прозара за адну ноч да дня імянін яго любімай жонкі Аляксандры.

Выкананне і кампазітарская праца М.Ельскага высока ацэньваюцца крытыкай. «П[ан] Ельскі належыць да ліку скрыпачоў, якія строга трымаюцца класічных канонаў мастацтва, якімі ён не ахвяруе дзеля шумавых эфектаў, —адзначаецца ў «Виленском вестнике» ад 28 лістапада 1867 г. — Выкананыя ім уласныя п'есы сустрэлі спачувальны прыём з боку слухачоў, якія аддалі поўную справядлівасць ігры п[ан]а Ельскага, якія адрозніваюцца бездакорнай чысцінёй і прыемнасцю гуку. Асабліва спадабаліся «Ваенны канцэрт» Ліпіньскага і ўласны твор канцэртанта «Вясна»[9].

Неабходна адзначыць, што для другой паловы XIX стагоддзя характэрна развіццё канцэрта як музычнай формы. Гэта было важнай тэндэнцыяй у развіцці музычнай культуры. Музыка набыла вялікае значэнне як уласна эстэтычны феномен. Яна атрымала поўнае права не толькі суправаджаць розныя падзеі, юбілеі, святы, вяселлі, але і быць спецыяльна прызначанай для слухання.

У гэты час музычная культура трактуецца як шматгранная сістэма, якая складаецца з уласна музычных каштоўнасцяў, усіх відаў дзейнасці па іх стварэнню, вывучэнню і захаванню, уключае ў сябе ўсе суб'екты гэтай дзейнасці. Таму, калі ў XVIII стагоддзі музычная культура атаясамлялася з мецэнацкай дзейнасцю магнатаў, іх тэатрамі, аркестрамі і капэламі, царкоўнай і вайсковай музыкай, то ў XIX стагоддзі яна перамяшчаецца ў памешчыцкія маёнткі сярэдняга дабрабыту, у шляхецкі і сялянскі побыт, у дзейнасць дабрачынных арганізацый, навучальных устаноў. Музычная культура ўсё больш набывае свецкі характар.

Таму не выпадкова, што М.Ельскі, як і многія музыканты таго часу, займаецца зборам, апрацоўкай, вывучэннем музычнага фальклору, які цесна звязаны з устойлівай вясковай традыцыяй і з'яўляецца галоўным захавальнікам уласна нацыянальных элементаў у музычным мастацтве. Збор і апрацоўка народных песень і музычных твораў непасрэдна ўплывалі на практычную дзейнасць М.Ельскага як кампазітара і выканаўцы. Яго галоўнымі слухачамі былі не магнаты і арыстакраты, а мясцовая шляхта, мяшчане, сяляне, вучнёўская моладзь. Народная музыка хутчэй знаходзіла водгук у іх сэрцах.

Менавіта на грунце народнага фальклору развіваецца ў другой палове XIX стагоддзя нацыянальная музычная культура Беларусі, яркім носьбітам якой быў і М.Ельскі. Ён не толькі сам збірае фальклор, але і шырока выкарыстоўвае творы, сабраныя яго пляменніцай, дачкой брата Аляксандра Ельскага Аляксандрай, або, як яе любоўна называлі, Алесяй, Глогеравай (1861—1899), і яе мужам Зыгмун-

там (Жыгімонтам) Глогерам (1845—1910).

М.Ельскі не застаецца ўбаку і ад грамадскага жыцця. Як і яго брат Аляксандр, Міхаіл Ельскі вылучаецца сярод мясцовых памешчыкаў сваімі добрымі адносінамі да сялян. У 1864 годзе, калі ён быў арыштаваны па падазрэнню ва ўдзеле ў паўстанні, сяляне Дудзіцкай воласці звярнуліся да мінскага губернатара з прашэннем, у якім пісалі, што яны ведаюць пана Ельскага «як чалавека, які займаецца выключна арыстакратычнай справай — музыкай, акрамя таго адчуваючы да яго павагу за добрасумленнае да іх заўсёды абыходжанне, мы, сяляне, Дудзіцкай воласці на агульным сходзе пастанавілі звярнуцца да Вас з просьбай аб вызваленні Міхаіла Ельскага з-пад арышту»[10].

У 1880-х гадах Міхаіл Ельскі актыўна выступае з канцэртамі ў сябе на Радзіме і за мяжой. У 1879 годзе ён з вялікім поспехам дае канцэрты ў Варшаве, затым у 1884 годзе зноў выступае ў Варшаўскім музычным таварыстве, гастралюе па гарадах Германіі. Музычная крытыка адзначае высокае майстэрства Міхаіла Ельскага як выканаўцы і кампазітара.

Разам са сваёй выканаўчай і кампазітарскай дзейнасцю Міхаіл Ельскі шмат увагі надае музычнай крытыцы і прапагандзе музыкальных здабыткаў роднага краю, ацэнцы дзейнасці сучаснікаў.

Каб правільна ацаніць уклад М.Ельскага ў развіццё і прапаганду беларускай музычнай культуры, варта спыніцца на некаторых метадалагічных пытаннях.

Пры даследванні жыццёвага і творчага шляху Міхаіла Ельскага і многіх іншых дзеячаў навукі і культуры, якія нарадзіліся, жылі і тварылі на Беларусі, трэба ўлічваць і тыя абставіны, што некаторыя дзеячы беларускай культуры самі прылічвалі сябе да палякаў або рускіх. Гэта тлумачыцца тым, што падчас існавання Рэчы Паспалітай, а затым уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі ўсё беларускае лічылася мужыцкім, халопскім, а ўсё польскае, ці рускае — высакародным, шляхецкім, інтэлігентным. Адыгрывала сваю ролю і прыналежнасць да касцёла, да уніяцкай ці праваслаўнай царквы. Таму для многіх прадстаўнікоў беларускай культуры дваранскага (шляхецкага) паходжання было далёка не проста пераадолець гэты рубеж, адкрыта заявіць аб сваёй прыналежнасці да беларускага, «ліцьвінскага» народа.

Трэба ўлічваць і тое, што на тэрыторыі Беларусі лёсы беларускага, польскага, рускага, украінскага, татарскага і іншых народаў перакрыжоўваліся настолькі цесна і так часта, што часам цяжка сказаць, да якой нацыянальнай культуры належыць творчасць таго ці іншага дзеяча. Таму неабходна прызнаць, што дзейнасць шэрагу музыкантаў, у тым ліку Міхаіла Ельскага, неабходна разглядаць у гісторыі двух, трох, а то і чатырох нацыянальных культур. Аднак несумненна, што кожны з народаў, якія стагоддзямі жылі побач, унёс пэўны ўклад у развіццё беларус-

кай культуры, якая не толькі захавала нацыянальныя, але набыла і інтэрнацыянальныя рысы.

Высокая адукаванасць, прагрэсіўнасць поглядаў, уласны талент кампазітара і выканаўцы дапамаглі М.Ельскаму даць аб'ектыўныя ацэнкі сваім папярэднікам і сучаснікам, працэсам развіцця музычнай культуры на Беларусі і ў Еўропе, глыбока прааналізаваць прычыны як росквіту, так і тых складаных працэсаў у развіцці беларускай скрыпічнай музыкі і яе выканання, якія праяўляліся.

Менавіта з такіх пазіцый напісаны ўжо першыя яго работы: «З нагоды скрыпічнай методыкі», «Параўнанне Паганіні з Ліпіньскім і некалькі слоў аб скрыпічнай музыцы». Яны былі надрукаваны ў 1860 г. у газеце «Ruch Muzyczny». Хоць на творчасці самога М.Ельскага ў значнай меры адбіўся ўплыў рамантычнай музыкі Нікола Паганіні (1782—1840), ён цаніў яго патрыятычныя перакананні, аднак адзначаў, што асноватагаючым прынцыпам творчасці павінны быць сур'ёзныя, удумлівыя адносіны да мастацтва, а менавіта гэта ён лічыў характэрным для Караля Ліпіньскага. Музыка — гэта не рамяство для атрымання грошай, не забава для грамадства, а вялікая і напружаная праца — лічыў Міхаіл Ельскі і неаднаразова падкрэсліваў гэта. У 1861 г. выходзяць артыкулы аб віленскім настаўніку М.Ельскага Вікенцію Банькевічу і таленавітым беларускім скрыпачы з Навагрудчыны Каралі Стравінскім.

У канцы 70—пачатку 1880-х гадоў у газеце «Echo muzyczne» друкуюцца яго новыя музыказнаўчыя працы: «Аб таленце музычным, прыроджаным і набытым праз працу» (1879), «Музыка ў нас і за мяжой»(1879) і інш. Ён піша пра свайго настаўніка Канстанціна Кшыжаноўскага, першую на Беларусі прафесійную скрыпачку-віртуоза Тэафілію Юзэфовіч-Бароўскую, кампазітара, піяніста, педагога з Мінска Фларыяна Міладоўскага (1819—1889), творы якога выдаваліся ў Мінску, Парыжы, Вене, Варшаве, Вільні, пра беларускага піяніста, кампазітара, дырыжора, скрыпача Юзафа Дашчыньскага (1781—1844). Змястоўнымі з'яўляюцца яго нататкі пра піяніста Ф.Солтыка. У 1881 г. «Echo Muzycne» выдала яго надзвычай цікавыя нататкі «Некалькі ўспамінаў з мінулага музыкі на Літве». Яны не перакладзены на беларускую мову, хоць маюць цікавыя і малавядомыя звесткі аб развіцці беларускай музычнай культуры.

Міхаіл Ельскі прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Ён удзельнік многіх дабрачынных канцэртаў, з'яўляўся адным з ініцыятараў стварэння ў 1880 г. Мінскага музычнага таварыства, на карысць якога аддаваў усе прыбыткі з канцэртаў.

Адбываюцца змены і ў сямейным жыцці Міхаіла Ельскага. У 1875 годзе ён уступае ў шлюб з Людвікай Козел (Ludwika Koziełłówna). Аднак шлюб гэты не быў шчаслівым, і ў ён уступае ў другі шлюб, на гэты раз з

Марыяй з Барановічаў (Maria z Baranowiczów) (1851—1903), ад якога нараджаецца дачка Зофія (Сафія). Яна затым выйшла замуж за Януша Уняхоўскага і прадоўжыла род Уняхоўскіх-Ельскіх «па кудзелі», гэта значыць, па жаночай лініі. Адзін з нашчадкаў гэтай галіны роду, калекцыянер Антон Уняхоўскі, пакінуў цікавыя ўспаміны аб наведванні бібліятэкі і музея старажытнасцяў Аляксандра Ельскага ў Замосці. Яны падрыхтаваны да друку і выдадзены ў 1975 г. у Варшаве К.Уняхоўскай пад назвай «Uniechowski opowiada, czyli Tajemnice mafii antykwarskiej» («Уняхоўскі расказвае, або Таямніцы мафіі антыкварнай»).

У 1880-м—1890-х гадах у творчасці Міхаіла Ельскага паглыбляецца ўсё больш выразнае арганічнае спалучэнне рамантычнага стыля музыкі з класічным. Безумоўна, у гэтым знайшлі адбіткі асаблівасці свайго часу, патрабаванні канцэртнага жанру той эпохі. Але менавіта глыбіня думак і пачуццяў, скарыстанне багаццяў народнай культуры, выразнасць меладычнай лініі, разнастайнасць выкарыстання каларыстычных і віртуозных сродкаў скрыпічнай тэхнікі, што з'яўлялася бадай самай адметнай рысай Міхаіла Ельскага, робяць яго творы прывабнымі і для нашага часу.

У 1899 годзе ў Мінску выходзіць праца М.Ельскага «Вывучэнне музыкі» («Studya muzyczne»), у якой знайшлі адлюстраванне яго погляды на музыку як спецыфічны мастацкі жанр.

У 1902 годзе ў Дудзічах у кругу сям'і, родзічаў, блізкіх сяброў, паклоннікаў яго таленту Міхаіл Ельскі адзначыў 50-годдзе сваёй кампазітарскай і выканаўчай дзейнасці. Да гэтага часу ён быў ужо даволі вядомым выканаўцам, аўтарам каля 100 музычных твораў. Сярод іх былі 2 скрыпічныя канцэрты, бліскучая Фантазія на арыгінальныя тэмы з аркестрам або фартэпіяна, Фантазія на тэму польскіх народных мелодый, Саната-фантазія, фантазія «Вясна», канцэртныя мазуркі, «Успаміны аб Варшаве», «Успаміны аб Вільні», «Танец духаў», «Песні без слоў», а таксама іншыя мазуркі, паланезы, фантазіі і вялікая колькасць скрыпічных мініяцюр.

Ён сабраў і занатаваў дзесяткі народных мелодый, падтрымліваў цесныя сувязі з музычнымі выданнямі «Ruch Muzyczny», «Pamiętnik Myzyczny i Teatralny» («Памятнік музычны і тэатральны»), «Echo Muzyczne», у якіх друкаваў свае артыкулы і нататкі. У рукапісе захавалася яго праца «Народныя танцы Мінскай губерні».

Чалавек даволі заможны, Міхаіл Ельскі прымаў удзел больш чым у 100 дабрачынных канцэртах. Аднак час бярэ сваё, і ў сярэдзіне студзеня (магчыма, 15) 1904 года Міхаіл Карлавіч Ельскі памёр у маёнтку Русінавічы на Віленшчыне. Некаторыя даследчыкі (Эвеліна Пяжыньска-Ельска, Польшча) лічаць, што цела яго было перавезена і пахавана на могілках «Кабань» у Дудзічах. Аднак гэта пакуль што не даказана.

Даследчыкі (Федарук А.Т. і інш.) сцвярджалі, што родавы маёнтак Ельскіх Дудзічы перайшоў пасля смерці Міхаіла Ельскага «па мячы», гэта значыць, старэйшаму ў гэтым родзе мужчыне, Аляксандру Ельскаму, а затым яго сыну Яну. Аднак супрацоўнік НАНБ А.Кіштымаў, абапіраючыся на матэрыялы, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ, ф. 321, воп. 1, спр. 101), даказвае, што Дудзічы безраздзельна належалі Сафіі Юзэфе Міхайлаўне Уняхоўскай, народжанай Ельскай. Частку сваёй спадчыны яна прадала. На 1 сакавіка 1914 года ў маёнтку Дудзічы налічвалася 1149 дзесяцін 2150 квадратных сажэняў зямлі, у тым ліку 322 дзесяцін 2075 квадратных сажэняў прыдатнай і лесу 215 дзесяцін 1550 квадратных сажэняў[11]. Цалкам пагаджаюся з А.Кіштымавым, што неабходна грунтоўнае даследаванне эканамічнага стану і развіцця як маёнтка Дудзічы, так і іншых уладанняў, якія належалі роду Ельскіх, сярод якіх было нямала добрых гаспадароў і фінансістаў.

Сёння імя Міхаіла Ельскага вернута ў беларускую музычную культуру, яно ёсць у энцыклапедычных выданнях. Аднак, на жаль, ні ў нас, на Беларусі, ні ў Польшчы да гэтага часу няма ні адной грунтоўнай манаграфічнай працы, прысвечанай жыццёваму шляху і творчасці гэтага выдатнага скрыпача і кампазітара. У асобных жа артыкулах, у тым ліку энцыклапедычных, ёсць супярэчнасці і нават памылкі. Гэта яшчэ раз падкрэслівае неабходнасць і важнасць распрацоўкі праграмы «Славутыя імёны Бацькаўшчыны».

Спасылкі:

[1] Wielka Encyklopedya Powszechna Ilustrowana. T. XXXI. W-wa, 1902, s. 844.

[2] Ibid, s. 846.

[3] Гл: Дзеля блізкіх і прышласці. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага). Мінск, 7 кастрычніка 1999 г. Мн., 1999. С. 27.

[4] Цеханавецкі А. Міхал Казімір і яго «сядзіба музаў» у Слоніме. Мн., 1995.

[5] Wielka Encyklopedya Powszechna Ilustrowana. T. XXXI, s. 844.

[6] Капилов А.Л. Скрипка белорусская. Мн., 1982. С. 54.

[7] Там жа.

[8] Wielka Encyklopedya Powszechna Ilustrowana. T. XXXI, s. 845.

[9] Капилов А.Л. Скрипка Белорусская. С. 55.

[10] Капилов А.Л. Скрипач из Дудичей // Неман, 1978, № 5, с. 184.

[11] Дзеля блізкіх і прышласці. С. 116—117.

Літаратура:

1. Дамінікоўскі Ф. Кампазітар і скрыпач М.Ельскі // Беларусь, 1946, № 8.

2. Дзеля блізкіх і прышласці. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага). Мінск, 7 касрычніка 1999 г. Мн., 1999.

3. Dzierzbicka A. Jelski Michał // Polski słownik Biograficzny. T. XI. Wrocław–Warszawa–Kraków, 1964–1965, s. 158.


4. Jelski Michał // Wielka Encyklopedya Powszechna Ilustrowana. T. XXXI. Warszawa, 1902, ss. 844–845.

5. Капилов А.Л. Скрипка белорусская. Мн., 1982; Ён жа. Скрипач из Дудичей // Неман, 1978, № 5; Ён жа. Ельскі Міхаіл Карлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 3. Мн., 1996. С. 350—351; Ён жа, Ельскі Міхаіл Карлавіч // Беларуская энцыклапедыя. У 18 тамах. Т. 6. Мн., 1998. С. 388.

6. Цеханавецкі А. Міхал Казімір і яго «сядзіба музаў» у Слоніме. Мн., 1995.

Васіль Кушнер

Аляксандр Вікенцій ЕЛЬСКІ
(1834—1916)



ляхецкі род Ельскіх герба Пелеш (Pielesz — птушынае гняздо) вядомы ў Вялікім княстве Літоўскім з канца XVI ст. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай быў унесены ў VI частку радаслоўнай кнігі Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў як польскі шляхецкі род. Шляхецкае паходжанне Ельскіх было пацверджана справай, складзенай у 1853—1854 гадах, «Аб шляхецкім паходжанні рода Ельскіх», якая захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Яго прадстаўнікі былі дзяржаўнымі дзеячамі, вайскоўцамі, унеслі значны ўклад у развіццё навукі і культуры. Лёс раскідаў іх па розных краінах і кантынентах. Беларускія Ельскія, якія паходзяць па родавай лініі ад Гаўрылы Ельскага, жылі ў асноўным на Міншчыне і Гродзеншчыне.

Адзін з Ельскіх — Станіслаў Уладзіслававіч (год нараджэння дакладна невядомы, памёр у 1829 г.) — узяў шлюб з дачкой віцебскага ваяводы Розай Прозар і атрымаў за ёй у пасаг маёнтак Дудзічы Ігуменскага павета, які стаў родавым маёнткам іх нашчадкаў.

Затым па спадчыне Дудзічы перайшлі да сына Станіслава — Караля Ельскага (1789—1855). Ён закончыў медыцынскі факультэт Віленскага універсітэта, стаў доктарам медыцыны, добра гаспадарыў у сваім маёнтку, але галоўным яго захапленнем стала музыка. Асабліва любіў ён іграць на скрыпцы. Сам пісаў музыку. Напісаныя ім паланезы зберагаліся ў сямейным архіве ў Дудзічах.

У гэтым шляхецкім гняздзе панавала сапраўдная багемная атмасфера. Жонка Караля Ельскага — Людвіка Штайнберг (Стэмберг) — таксама захаплялася музыкай. Тут, у Дудзічах, нарадзіліся іх дзеці — сыны

Міхаіл, Жыгімонт, Аляксандр і дачка Станіслава[1].

Аляксандр Вікенцій Ельскі нарадзіўся 4(16) чэрвеня 1834 г. і быў ахрышчаны ў Смілавіцкім касцёле. Спасцігаць першыя азы граматы пачаў ад бацькоў, затым вучыўся ў нямецкай школе ў Лясдэнене ў Прусіі (цяпер Краснаменск Калінінградскай вобласці Расійскай Федэрацыі). Затым ён вяртаецца да бацькоў і працягвае вучобу ў класічнай гімназіі ў Мінску, якую скончыў у 1852 г. Магчыма, па родавай шляхецкай традыцыі яго прыцягвае вайсковая служба, і ён паступае карнетам у расійскі гусарскі прынца Фрыдрыха Гесен-Касельскага полк. Удзельнічаў у Крымскай вайне 1853—1856 гг.

У 1855 г. памірае яго бацька, і ў адпаведнасці са шляхецкімі звычаямі і воляй бацькі родавы маёнтак Дудзічы адыходзіць па спадчыне старэйшаму сыну Міхаілу, а Аляксандр становіцца ўладальнікам маёнтка Замосце. Пасля заканчэння Крымскай вайны ў 1856 г. у чыне паручніка выходзіць у адстаўку і пераязджае ў свой маёнтак.

У 1858 г. ён уступае ў шлюб з Аленай (Геленай) Каленчыньскай (Helena z Kalenczyńskich) (1838—1901) і актыўна займаецца гаспадаркай. Будуе вялікі драўляны дом, капліцу, гаспадарчыя пабудовы. Імкнецца палепшыць долю сялян, востра крытыкуе тых сваіх суседзяў, якія вядуць справы «па старыне», жорстка эксплуатуюць сялян і парабкаў. Гэта выклікае незадаволенасць у некаторых з навакольных памешчыкаў, і яму нават пагражаюць расправай.

А.Ельскі адмоўна ставіцца да прыгоннага права, выступае за яго адмену. У 1861 г. энергічнага ліберальнага памешчыка ■ Замосця абіраюць міравым суддзёй другой акругі Ігуменскага павета.

У гэтым жа годзе папаўняецца сям'я Ельскіх: нараджаецца любіміца бацькоў — дачка Аляксандра (1861—1899), або, як яе ласкава называюць, Алеся. Праз 5 гадоў, у 1866 г., народзіцца і сын Ян Банавентура Станіслаў Ельскі (1866—1930).

Аляксандр Ельскі не прымаў удзелу ў паўстанні 1863 г. на Беларусі і ў Літве. Аднак за ім быў устаноўлены паліцэйскі нагляд. На думку некаторых даследчыкаў (І.Марачкінай), гэта было звязана з тым, што яго блізкі сваяк, Уладзімір Ельскі, які быў жанаты з Соф'яй Каленчыньскай, роднай сястрой жонкі А.Ельскага, не падпісаў прысягі на вернасць Аляксандру II, быў арыштаваны і высланы ў Чэлябінск.

Аляксандр і Алена Ельскія ўсё сваё жыццё апекавалі траіх дзяцей Уладзіміра і Соф'і Ельскіх. Іх сын Уладзіслаў пакінуў цікавыя мемуары пра дзядзьку Аляксандра з Замосця, а яго ўнук, магістр этнаграфіі Анджэй Ельскі, які цяпер жыве ў Польшчы і займаецца вывучэннем гісторыі мастацтва татуіровак усіх народаў Афрыкі, склаў радаводную схему роду Ельскіх.

Ужо ў першыя гады жыцця ў Замосці абуджаецца «ціхі і старанны

шукальнік і збіральнік памятак краю», як сціпла называе сябе Аляксандр Ельскі. Ён не атрымаў сістэматычнай адукацыі, але адразу ж «з божай ласкі», як кажа ён сам, праяўляецца яго талент даследчыка.

А.Ельскі не толькі збірае помнікі гісторыі роднага краю, але імкнецца данесці да іншых значнасць гэтай працы. З 1860 г. А.Ельскі пачынае дасылаць допісы ў грамадска-палітычную і літаратурную газету «Kurier Wileński» («Віленскі веснік»), у якіх адзначае мэтазгоднасць вызвалення сялян ад прыгону, неабходнасць іх адукацыі. Яго псеўданімы — Бацян з-над Пцічы, Ліцвін-грамадзянін, Свядомы — яскрава сведчаць аб імкненні падкрэсліць сваю сувязь з народам роднага краю.

У гэты час сям'я церпіць матэрыяльныя нястачы, і, каб палепшыць становішча, А.Ельскі хоча прадаць калекцыю карцін, звяртаецца за падтрымкай і пасрэдніцтвам да пісьменніка Ю.Крашэўскага, але сітуацыя паступова змяняецца да лепшага.

З 1864 г. Аляксандр Ельскі распачынае галоўную справу свайго жыцця — стварэнне бібліятэкі, збор, сістэматызацыю і апісанне экспанатаў для Музея старажытнасцяў. Ужо праз некалькі гадоў вясковы дом памешчыка Аляксандра Ельскага ператвараецца ў значны навукова і культурна-асветніцкі цэнтр, а імя ўладальніка Замосця становіцца вядомым не толькі на Беларусі, але і ў Расіі, Літве, Польшчы і іншых краінах.

Яго наведваюць гісторыкі, этнографы, краязнаўцы, пісьменнікі, грамадскія дзеячы, родзічы. Яны выказваюць падзяку гаспадару Замосцінскага збору, свае ўражанні ад яго экспанатаў. Каб захаваць гэтыя сведчанні сваіх сучаснікаў, Аляксандр Ельскі стварае «Кнігу для запісу наведвальнікаў збораў у Замосці, пачатую ў 1882 годзе». Яна была выяўлена вядомым беларускім даследчыкам А.Мальдзісам у Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве на пачатку 1970-х гадоў. Безумоўна, у складанні гэтага унікальнага літаратурнага помніка праявілася імкненне А.Ельскага адзначыць сваю ролю ў стварэнні збору ў Замосці і разам з тым паказаць яго значэнне для вывучэння гісторыі і культуры Беларусі, для захавання гістарычнай спадчыны. У.Мархель, які вельмі грунтоўна даследаваў гэтую гісторыка-літаратурную крыніцу, лічыць, што ў «Кнізе для запісу...» зроблена не 225, як вызначалася раней, а 234 запісы наведвальнікаў родавай сядзібы А.Ельскага і літаратурна-краязнаўчага музея[2]. Пераважная большасць запісаў зроблена на польскай мове. Ёсць па два на рускай, нямецкай, французскай мовах. На жаль, толькі два з іх напісаны па-беларуску, адзін кірыліцай і адзін лацінкай. Адзіны кірыліцкі беларускамоўны запіс зрабіў вядомы беларускі гісторык і этнограф Мітрафан Доўнар-Запольскі, які наведаў музей А.Ельскага ў ліпені 1892 г., падчас экспедыцыі ў Мінскую губерню, якую наладзіла Маскоўскае этнаграфічнае таварыства.

Другі беларускамоўны запіс зроблены ў «Кнізе для запісу...» у вершаванай форме лацінкай Лявонам Пранцысем Ельскім, блізкім родзічам А.Ельскага, 12 верасня 1892 г., праз 10 гадоў пасля яго першага наведвання музея ў Замосці. Л.Ельскі быў палкоўнік рускай арміі і дырэктар дзяржаўных конезаводаў на Украіне.

Апошні запіс зроблены 15 жніўня 1915 г. За час, калі вялася «Кніга для запісу...», акрамя сваякоў і родзічаў, якія наведвалі А.Ельскага, свае запісы зрабілі В.Кантшынскі, дырэктар збораў імя Асалінскіх у Львове, Э.Чапскі, нумізмат, заснавальнік музея ў Кракаве, З.Каўроўскі, пазней прафесар Віленскага універсітэта, Ян Булгак, папулярны тады на Беларусі майстар мастацкай краязнаўчай фатаграфіі, лаўрэат шматлікіх міжнародных выставак, этнограф і фалькларыст, імя якога вядома ў Польшчы, але амаль невядома нават на яго радзіме, у Навагрудскім раёне, і многія іншыя.

У студзені 1883 г. А.Ельскага наведаў Якуб Наркевіч-Ёдка. У «Кнізе для запісу...» ён акцэнтаваў увагу на вялікую эрудыцыю, тытанічную працу і ахвярнасць А.Ельскага, адзначыў, што ў Замосці ён асабіста «папрацу і ахвярнасць»... «чэрпнуў новую энергію на працу дзеля блізкіх і прышласці»[3]. Два разы, 7 сакавіка 1886 г. і 30 жніўня 1902 г., наведаў А.Ельскага Мар'ян Здзяхоўскі, прафесар Кракаўскага універсітэта, ураджэнец і ўладальнік родавага маёнтка ў в. Ракаў Мінскага павета (цяпер у Валожынскім раёне). «З сардэчнасцю выказваю павагу і глыбокае прызнанне шаноўнаму Аляксандру Ельскаму, які нашаму грамадству ў Літве і Русі служыць узорам не толькі працы, але і глыбокага спасціжэння духу народа і яго маральных і разумовых патрэб»[4], — адзначыў ён у «Кнізе для запісу...» падчас другога свайго наведвання замосцінскага музея. Магчыма, што і гэтыя наведванні адклалі свой адбітак на светапогляд М.Здзяхоўскага як вучонага-славіста, філосафа, палітолага, публіцыста, які ў 1924 г. напісаў і выдаў у Вільні нечаканую для свайго часу брашуру «Уладзіслаў Сыракомля. Элемент літоўска-беларускі ў польскай творчасці».

Многа ўвагі надае Аляксандр Ельскі збору, апрацоўцы і прапагандзе этнаграфічных, мовазнаўчых і літаратуразнаўчых, фальклорных матэрыялаў. Ён працуе старанна, рупліва, па 12 і больш гадзін. Зберагае кожны рубель, каб набыць карціны і экспанаты.

Вялікую дапамогу аказваюць яму жонка Алена і асабліва дачка Алеся. Яна некалькі гадоў выхоўвалася ў кляштары ў Версалі, добра гаварыла і пісала па-французску. Мужам Алесі стаў вядомы гісторык, этнограф, краязнаўца Зыгмунт (Жыгімонт) Глогер (1845—1910), які наведаў Замосце ў лістападзе 1882 года. У Аляксандра Ельскага склаліся з зяцем вельмі цёплыя адносіны. Алеся наведвала навакольныя вёскі, занатоўвала народныя песні і мелодыі. Пазней многія з іх выкарыстоўваў Міхаіл

Ельскі, яе дзядзька, для напісання сваіх музычных твораў. Аляксандра Глогерава-Ельская валодала і літаратурнымі здольнасцямі, напісала цікавы нарыс пра родавы маёнтак Дудзічы і сувязі рода Ельскіх з іншымі шляхецкімі родамі. На жаль, у 1899 г. у 38 гадоў яна памерла ад запалення лёгкіх, пакінуўшы на руках мужа і бацькоў непаўналетніх дачку Яніну і сына Станіслава.

З'яўляюцца першыя грунтоўныя працы А.Ельскага «Піва і піваварэнне ў нашым мінулым» (1883), «Пра беларускую гаворку» (1885), «Слоўца пра матэрыялы для вывучэння беларускай гаворкі, этнаграфіі і літаратуры» (1886).

У 80—90-я гады А.Ельскі супрацоўнічае больш чым з 20 перыядычнымі выданнямі Беларусі, Польшчы, Расіі.

У гэты час у Пецярбургу выходзіў штотыднёвы грамадска-палітычны часопіс на польскай мове «Kraj» («Край») (1882—1909), які значнае месца адводзіў «краёвым матэрыялам» з гісторыі, навукі, культуры, літаратуры, мастацтва славянскіх народаў.

Аляксандр Ельскі актыўна супрацоўнічае з часопісам. У многіх нумарах друкуюцца яго «Лісты з правінцыі». Значную цікавасць выклікаюць яго артыкулы і нататкі «Пра беларускую гаворку» (1885), «Адам Міцкевіч на Беларусі» (1885), некралогі «Беларускі пясняр» (Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу, 1885), Янку Лучыну (1897), некралог «Францішак Багушэвіч» (1900) і інш.

Для Аляксандра Ельскага гэта былі не толькі слаўныя постаці роднай зямлі, але і людзі, з якімі яго звязвалі цесныя асабістыя сувязі. Ён сябраваў і быў першым біёграфам В.Дуніна-Марцінкевіча, ад якога прыняў частку архіва, прысвяціў яму верш «Вінцуку Дуніну-Марцінкевічу, беларускаму паэту», не раз адзначаў яго ўклад у беларускую літаратуру ў сваіх працах.

А.Ельскі перапісваўся з Ф.Багушэвічам, іншымі беларускімі пісьменнікамі і паэтамі, збіраў іх творы, многа ўвагі надаваў захаванню спадчыны прадстаўнікоў беларускай краёвай літаратуры. Ён адным з першых пераклаў на беларускую мову 1-ю частку паэмы А.Міцкевіча «Пан Тадэвуш» (1893), асобныя яго вершы, паэму А.Мальчэўскага «Марыя», кнігу польскага эканаміста Ю.Супінскага «Сем вечароў».

А.Ельскі актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці. З 1882 па 1887 год ён член апякунскага камітэта пры рэальным вучылішчы ў Мінску, шмат увагі надае пытанням паляпшэння народнай адукацыі, непакоіцца, каб вучні глыбей вывучалі гісторыю роднага краю. Боль за лёс роднай мовы, літаратуры, заклік да іх абароны гучыць у яго артыкуле «Згубны культ чужаземшчыны ў нас у святле айчыннай літаратуры» (1901).

У 80-я гады ён распачынае актыўнае супрацоўніцтва з такімі вядомымі выданнямі, як «Слоўнік геаграфічны Каралеўства Польскага і

іншых краёў славянскіх» («Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich») і «Вялікая ўсеагульная энцыклапедыя ілюстраваная» («Wielka Encyklopedia Powszechna Ilustrowana»). У некаторых даследчыкаў выклікае сумненне тая акалічнасць, што А.Ельскі падрыхтаваў для гэтых выданняў больш за 10 тысяч гісторыка-краязнаўчых артыкулаў пра Беларусь. Такую лічбу называе сам А.Ельскі ў пісьме да вядомага лінгвіста, этнографа, фалькларыста, рэдактара Яна Карловіча ад 5(17) лютага 1890 г.[5]. Аднак гэта не артыкулы ў нашым разуменні, а ў большасці невялічкія нататкі ў 3—7 радкоў. Некаторыя з дасланых А.Ельскім матэрыялаў наогул не былі надрукаваны. З найбольш значных яго матэрыялаў неабходна назваць артыкулы пра Мінск, Нясвіж, Пінск, Слуцк, Наваградак, Мазыр, Кобрын, Мір, Ігумен. Змешчаны невялічкія нататкі пра Клецк, Карэлічы, Зембін, Замосце, пра беларускія мястэчкі, архітэктурныя і культавыя помнікі.

Яшчэ пры жыцці А.Ельскага яго імя як гісторыка, этнографа, краязнаўцы, пісьменніка, перакладчыка і публіцыста стала вядомым за межамі Беларусі. У 1885 г. яму было нададзена званне члена-супрацоўніка Вольнага эканамічнага таварыства ў Пецярбургу, а ў 1892 г. А.Ельскі быў абраны правадзейным членам камісіі гісторыі і мастацтва філалагічнага аддзялення Акадэміі навук у Кракаве.

У 1900 г. ён прымаў удзел у III з'ездзе польскіх гісторыкаў у Кракаве, дзе кіраваў III секцыяй (археалогія, гісторыя, мастацтва). Удзельнічаў у археалагічных з'ездах у Вільні ў 1893 г. і ў Рызе ў 1896 г.

Глыбока хвалявалі А.Ельскага і сацыяльныя беды беларускага народа, такія як недахоп зямлі, жабрацтва, п'янства і інш. Аб гэтым яскрава сведчаць яго працы. Адной з першых можна назваць «Заўвагі аб сялянскім пытанні» (1884). З 1895 г. у Пецярбургу адна за другой выходзяць тоненькія кніжкі на беларускай мове, надрукаваныя кірыліцкімі літарамі. Многія з іх пазначаны крыптонімамі А.І. Сярод іх «Сынок. Расказ праўдзівага здарэння. Усім бацькам і дзецям для перасцярогі» (1895). У 1896 г. тры разы друкавалася праца А.Ельскага «Выбіраемся ў прочкі! Скарэй у Томск! Аб тое добра разведаў і растлумачыў народу А.І.». Яна выйшла асобным выданнем у Пецярбургу, затым у «Віцебскіх губернскіх ведамасцях» і асобным выданнем у Віцебску пад назвай «Нашы перасяленцы! Хутчэй у Томск!».

Ён збірае звесткі пра жабрацкія брацтвы, вядзе актыўную перапіску з Я.Карловічам аб магчымасці выдання манаграфіі пра жабрацтва на Літоўскай Русі, стварае унікальны «Слоўнік жабрацкай гаворкі на Белай Русі». На жаль, гэтыя працы не дайшлі да чытача.

На аснове запісаў «Аб жыцці і смерці п'яніцы», зробленых у Ваўкавыскім павеце ў якасці фальклорных, у 1900 г. у Пецярбургу была выдадзена напісаная А.Ельскім брашура «Слова аб праклятай гарэлцы і аб

жыцці і смерці п'яніцы. Добраму беларускаму народу на пакрапленне яго душы і розуму расказаў прыяцель яго папячыцель трэзвасці А.І.».

Погляды А.Ельскага на неабходнасць прыватных, частковых рэформ, рацыянальнага вядзення гаспадаркі адлюстраваны ў працы «Гутарка аб тым, якая мае быць «Зямля і Воля» сельскаму народу. Праўдзівы абразок, жыўцом зняты з цяперашняга жыцця вёскі на Белай Русі і даўняй крывічызны», напісанай у 1906 г. і выдадзенай у Вільні. У 1908 г. тут была выдадзена яго праца «100 прыказак, загадак, прыдумак і гавэндаў для пажытку беларускага народу. Сабраў А.І.» Гэтыя творы былі напісаны простай мовай у форме гутаркі і адрасаваны беларускаму селяніну.

А.Ельскі быў памешчыкам, і яго погляды на некаторыя сацыяльныя праблемы насілі кансерватыўны характар. Ён апраўдвае сацыяльную няроўнасць. Але яны мелі і свае асаблівасці. Гэта быў не рускі, вялікадзяржаўны, а беларускі, нацыянальны, патрыятычны кансерватызм. Менавіта гэта адзначыў у сваім запісе 14 кастрычніка 1901 г. Напалеон Чарноцкі, адзін з ініцыятараў выдання ў Слуцку каля 1885 г. першага беларускага варыянта рэвалюцыйнай брашуры «Дзядзька Антон». «Тут я знайшоў сапраўдны скарб сардэчнага, разумнага, крытычнага кансерватызму, які, не забываючы пра сучаснасць, старанна грабецца ў друзах мінуласці, налева адкідвае сабранае ім смецце.., а чыстыя крышталі нацыянальнага духу для яго цяперашніх і будучых адраджэнцаў назапашвае»[6], — пісаў Н.Чарноцкі.

Варта адзначыць, што А.Ельскі быў адным з першых даследчыкаў эканамічнай гісторыі Беларусі. Ён сам меў узорную гаспадарку, правёў меліярацыйныя работы, заклаў парк, сад, пабудаваў цагельню, займаўся развядзеннем рыбы. Гаспадарчы двор налічваў 13 пабудоў. «Не маю нават граша доўга за маёнткам», — з гонарам пісаў ён у аўтабіяграфіі. Канкрэтнай дапамогай дробнай збяднелай шляхце з'яўлялася і яго пасрэдніцкая дзейнасць пры ўладкаванні на працу паміж гаспадарамі маёнткаў і гаспадарскімі служачымі. Дзякуючы яму дзесяткі бедных шляхціцаў атрымалі пасады ўпраўляючых маёнткамі, аканомаў, ляснічых, вінакураў і іншыя, за што многія дзякавалі яму.

З 1901 г. ён ганаровы куратар павятовага Таварыства ўзаемастрахоўкі ад пажару, вядзе растлумачальную працу сярод сялян і шляхты аб неабходнасці зберажэння маёмасці ад агню.

Таму не толькі сабраны багаты фактычны матэрыял, але і ўласны вопыт з'яўляліся тым падмуркам, на якім былі створаны такія грунтоўныя яго працы, як «Нарыс гісторыі мясцовай гаспадаркі ў супастаўленні з народнымі звычаямі ад першабытных да апошніх часоў» (т. 1—2, 1893—1897), «Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку» (1893), «Нарыс звычаяў шляхты ў супастаўленні з эканамі-

кай і доляй народа ў Польшчы і Літве» (т. 1—2, 1897—1898), «Гістарычныя звесткі пра фабрыку шкла і аздобленых люстэрак у радзівілаўскім Урэччы на Літве» (1898).

Удзяляў ён увагу і вывучэнню гісторыі рэлігіі. Гэта знайшло адлюстраванне ў яго працы «Нарыс гісторыі Мінскага біскупства» (1907) і інш. Ён займаецца вывучэннем касмалогіі, дэманалогіі, народнай педагогікі і этыкі, народных звычаяў і традыцый.

З вялікай павагай ставіўся А.Ельскі да навукоўцаў, мясцовых краязнаўцаў, да ўсіх, хто вывучаў гісторыю, этнаграфію і фальклор беларускага народа, аказваў ім усялякую падтрымку. Так, у сваім пісьме ад 4(16) сакавіка 1889 г. да рэдактара польскага геаграфічна-этнаграфічнага часопіса «Вісла» («Wisła»), з якім у А.Ельскага былі добрыя адносіны, ён мякка, але настойліва папракае Я.Карловіча за нападкі на артыкул маладога ў той час вучонага-славіста М.Янчука (1859—1921) «А.К.Кіркор, вучоны, даследчык Беларусі і Літвы. Кароткі нарыс яго жыцця і дзейнасці», які быў надрукаваны ў 1888 г. у часопісе маскоўскага археалагічнага таварыства «Древности», а затым выдадзены асобнай брашурай. Я.Карловіч у рэцэнзіі, якая была надрукавана ў 1889 г. у «Вісле», лічыў, што больш аб'ектыўную працу пра А.Кіркора можа напісаць А.Ельскі, які асабіста ведаў яго і меў у сваіх калекцыях архіў А.Кіркора. А.Ельскі піша: «Так, Янчук у свой час прыслаў і мне гэту працу. Знайшоўшы ў ёй неадпаведныя і нават памылковыя мясціны, якія складаюць быццам бы разнагалоссе з яго прынцыпамі, я адпісаў яму крытычна, за што ён, аднак, не раззлаваўся і застаўся ўдзячным за мае заўвагі. Але вы, шаноўны зямляча, расправіліся з ім рашуча, і вельмі шкада, таму што малады яшчэ пан Янчук, пры паблажлівым абыходжанні пабрацімаў, мог бы, безумоўна, стаць цудоўным саюзнікам, бо ў яго грунтоўныя здольнасці, сумленнае сэрца і патрэбны быў толькі час»[7].

З вялікай увагай і беражлівасцю паставіўся А.Ельскі і да М.Доўнар-Запольскага. У нататцы, напісанай 29 ліпеня 1892 г. для часопіса «Край», А.Ельскі адзначаў з нагоды наведвання М.Доўнар-Запольскім музея ў Замосці: «П[ан] Запольскі вядомы ўжо некалькімі сур'ёзнымі этнаграфічна-гістарычнымі працамі, заглянуў цяпер і ў нашу старонку, здабыў цікавы этнаграфічны матэрыял з вуснаў вясковых казачнікаў, лірнікаў і спявачак. Такія рэчы сапраўды цяпер трэба хапаць талентам, бо старадаўняя традыцыя сёння знікае, і ніхто яе разумна не ахоўвае, ніхто не заахвочвае берагчы тое, што цэлыя вякі шанавалі...»[8].

Менавіта А.Ельскі яшчэ да іх асабістага знаёмства стаў першым рэцэнзентам навуковых прац М.Доўнар-Запольскага. У маі 1891 г. на старонках часопіса «Край» былі надрукаваны меркаванні ў той час ужо вядомага беларускага краязнаўцы пра выдадзеную ў гэтым годзе ў Кіеве працу М.Доўнар-Запольскага «Нарысы гісторыі крывіцкай і дрыгавіц-

кай зямлі да XII стагоддзя». Высока ацэньваючы працу маладога даследчыка, А.Ельскі выказвае заўвагу, што аўтар «недакладны ва ўжыванні выразаў «Русь», «рускае племя» і т.п., калі прыстасоўвае іх да славяншчыны, яшчэ не заваяванай варага-русамі, бо назва «Русь», уяўляючы дзяржаўна-палітычны, а не этнаграфічны тэрмін, азначала краіну, а не народ. Гэтыя назвы можна ўжываць у шырэйшым значэнні, пачынаючы амаль ці не ад эпохі ўстанаўлення князеўска-варажскіх удзелаў на месцы крыўскіх, драўлянскіх, дрыгавіцкіх, палянскіх і іншых дагістарычных уладанняў»[9]. Спраўдзяцца словы А.Ельскага, выказаныя ў 1891 г. аб М.Доўнар-Запольскім, што «малады працаўнік на ніве гістарыязнаўства займе выдатнае становішча, калі пачатак ужо вызначаецца так сур'ёзна і сімпатычна»[10].

У 1892 г. на старонках «Края» А.Ельскі адклікаецца на працу М.Доўнар-Запольскага «Жаночая доля ў песнях пінчукоў», звяртае ўвагу чытачоў, што песнямі малады вучоны «раскрывае досыць сумную долю палескай сялянкі, цнатлівасць якой часта бывае асуджана на крыўду і сіроцтва»[11].

І ў далейшым ён уважліва сочыць за навуковымі працамі М.Доўнар-Запольскага. У сваіх лістах да Я.Карловіча ад 18(30) студзеня і 1(13) лютага 1893 г. А.Ельскі не толькі рэкамендуе яму адну з прац М.Доўнар-Запольскага, але і просіць выплаціць некаторую суму маладому вучонаму як ганарар, які сам «здатнай і амбітнай рукі не працягне, а знаходзіцца ў страшэннай бядзе і слабы»[12].

Не застаўся незаўважаным і гісторыка-краязнаўчы артыкул М.Доўнар-Запольскага пра вершаваную аповесць В.Дуніна-Марцінкевіча «Гапон», які быў змешчаны ў «Календаре Северо-Западного края» за 1889 год. Пасля асабістага знаёмства А.Ельскі перадае навукоўцу са сваіх збораў экземпляр паэмы «Тарас на Парнасе», перапісанай рукой В.Дуніна-Марцінкевіча і завершанай адным з яго псеўданімаў — «Наум».

А.Ельскі рыхтуе і ў 1892 г. дасылае ў рэдакцыю «Вялікай усеагульнай энцыклапедыі ілюстраванай» тры, як ён сам адзначае ў пісьме да Я.Карловіча ад 12(24) студзеня 1892 г., бязмежна важныя і вялікія манаграфіі, якія называюцца «Беларусь», «Беларуская мова», «Беларуская літаратура і бібліяграфія». «Даручаючы гэтыя мае крапатлівыя працы вашай асаблівай апецы, маю надзею, што яны будуць цалкам надрукаваны на карысць нашага грамадства, мала азнаемленага з пытаннем, якое я вытлумачыў на падставе крыніц... мусіў шмат праседзець штаноў, каб напісаць нешта падобнае, а вы, які ведаеце вагу працы, зразумееце, колькі трэба было памазоліцца. Не дайце ж загінуць маёй працы па такому важнаму пытанню, за што браты беларусы, калі адукуюцца, благаслаўляць вас будуць, што вы ўсёй душой баранілі іх духоўную спадчыну»[13].

Гэтыя артыкулы былі надрукаваны ў энцыклапедыі з некаторымі зменамі, якія не вельмі задаволілі А.Ельскага, і праз год ён просіць Я.Карловіча дапамагчы яму вярнуць арыгіналы рукапісаў[14].

У артыкуле «Беларуская літаратура і бібліяграфія», надрукаваным у 1892 г. у 7-м томе «Вялікай усеагульнай энцыклапедыі ілюстраванай», А.Ельскі выказаў думку, што паэма «Тарас на Парнасе» належыць пяру В.Дуніна-Марцінкевіча.

Гэту версію падтрымаў і М.Доўнар-Запольскі. У 1895 і 1896 гадах ён друкуе ў «Витебских губернских ведомостях» артыкул «Дунін-Марцінкевіч і яго паэма «Тарас на Парнасе», а затым выдае яго ў 1896 г. у Віцебску асобнай брашурай, дзе выказвае падзяку гаспадару Замосцінскага збору за пазычаныя беларускамоўныя рукапісы, падтрымлівае сцвярджэнне А.Ельскага аб аўтарскай прыналежнасці паэмы. Ужо ў наш час беларускі літаратуразнавец Г.Кісялёў даказаў, што яны, на жаль, памыляліся.

Не абміналі Замосця і даследчыкі натуральнай гісторыі. Юліян Талька-Грынцэвіч, які збіраў антрапалагічныя матэрыялы на Палессі і працаваў з матэрыяламі Замосцінскага збору ў сакавіку 1891 г., выказаў у «Кнізе для запісу...» сваю падзяку гаспадару і адзначыў, што «дакуль у дварах будуць адчуваць і думаць так, як Аляксандр Ельскі, які збірае памяткі мінулага, кінутыя і марнаваныя звыроднымі сынамі сваёй зямлі, датуль Бог яшчэ будзе жыць на Літве»[15]. Свае падзякі гаспадару і ўражанні ад наведвання Замосця ён выказаў на старонках часопіса «Край» у нарысе «З экскурсіі на Беларусь», змешчаным у верасні 1891 г. пад псеўданімам Ян Іглоўскі.

Другі раз ужо вядомы вучоны Ю.Талька-Грынцэвіч пасля падарожжа ў Сібір і Манголію наведаў Замосце ў маі 1902 г. і з вялікай удзячнасцю за гасцінны прыём адзначыў у «Кнізе для запісу...», «што ёсць яшчэ ў нас высакародныя людзі тытанічнай працы і прысвячэння сябе грамадству, а пакуль яны ёсць, мы спадзяемся, што не ўсё яшчэ страчана!»[16].

Матэрыяламі збораў А.Ельскага карысталіся даследчыкі Я.Болаз-Антаневіч, Ю.Бэлза, Ю.Белінькі, З.Глогер, Т.Корзан, Ю.Растафінскі, М.Роле, У.Спасовіч, М.Сакалоўскі і многія іншыя.

Даволі цесныя сувязі падтрымлівалі Ельскія са сваімі родзічамі. Часта прыязджалі ў Замосце Міхал і Станіслава (сястра А.Ельскага) Грушвіцкія, якія жылі ў сваім маёнтку Выганічы, што каля Ракава, затым іх дзеці і ўнукі. Свайму швагру, кампазітару Міхалу Грушвіцкаму (1828—1904), А.Ельскі прысвяціў асобную брашуру, якую выявіў у бібліятэцы «Асалінэум» у Вроцлаве А.Мальдзіс і даваў звесткі пра яе ў сваёй працы «Таямніцы старажытных сховішчаў»[17]. Міхал Грушвіцкі ў «Кнізе для запісу...» выказаў шкадаванне, што ён не мастак і не можа зрабіць копій з гэтага каштоўнага збору, каб «увекавечыць іх для шы-

рокіх колаў»[18]. Сын Міхала і Станіславы Караль Ельскі першы раз упісаў сваё імя ў «Кнігу для запісу...» 16 ліпеня 1882 г. у дзень яе заснавання.

Падтрымліваліся сувязі і з родам Уняхоўскіх. Януш Уняхоўскі быў мужам Сафіі Юзэфы, адзінай дачкі брата Міхаіла і яго жонкі Марыі.

Адна з прадстаўніц гэтага роду, К.Уняхоўская, грунтуючыся на матэрыяле сямейнага архіва, і у прыватнасці на ўспамінах свайго бацькі, калекцыянера Антона Уняхоўскага, падрыхтавала цікавую кнігу «Уняхоўскі апавядае, або Таямніцы антыкварнай мафіі», якая выдадзена ў 1975 г. у Варшаве. У ёй ёсць і апісанне дома А.Ельскага ў Замосці. «Гэта быў аднапавярховы дом, у які заходзілі праз вялікую, зашкленную з усіх бакоў веранду. На верандзе стаялі вялічэзныя карэтныя куфры — чорныя, шасціканцовыя, акаваныя жалезам... Дзверы з правага боку цёмнай пярэдняй вялі ў кабінет старога. Гэта быў вялізарны пакой, які займаў амаль палову дома, застаўлены ўсюды лабірынтам паліц з кнігамі»[19].

Добрыя сяброўскія і сваяцкія сувязі звязвалі Аляксандра Ельскага і з родам Вайсенгофаў. Напамін аб сабе пакінулі ў «Кнізе для запісаў...» Генрык, Ян, Уладзіслаў, Эдвард, Янусь, Людвіка і Ядвіга Вайсенгофы. Не абмінуў увагай свайго родзіча і Юзаф Вайсенгоф. Аднак у адрозненне ад іншых ён не прыйшоў у захапленне ад збіральніцкай і беларусазнаўчай працы свайго дзядзькі, а, толькі аднойчы наведаўшы Замосце, едка высмеяў А.Ельскага на старонках часопіса «Свет» («Świat»)[20].

Адведвалі А.Ельскага ў Замосці і суседзі. Аднаму з іх, Яну Ваньковічу, вядомаму энтамолагу, сябру многіх навуковых таварystваў, А.Ельскі ў 1885 г. прысвяціў артыкул-некралог, адзначыў, што нябожчык «не толькі з замілаваннем займаўся земляробствам, але і старанна працаваў таксама для навукі сярод прыроды любых родных старон»[21].

Разам з апошнім мінскім ваяводам Адамам Хмарай, які таксама наведваў Замосце, А.Ельскі падрыхтаваў вялікі артыкул пра Мінск для «Слоўніка геаграфічнага Каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх».

Канец XIX—пачатак XX стагоддзяў быў нешчаслівы для Аляксандра Ельскага. У 1899 г. паміраe яго адзіная любімая дачка Аляксандра, у 1901 г. нестала любай жонкі, надзейнай памочніцы і паплечніцы Алены Ельскай з Каленчыньскіх, з якой пражыў 43 гады. Ён вельмі балюча перажываў гэтыя страты. «З ёй я страціў ужо сапраўды ўсё на свеце і кожную хвіліну хацеў бы памерці — так мне змізарнела і паблякла ўсё ў гэтай беднай зямной юдолі. Працаваць, вядома, буду, бо праца для мяне ў пэўнай ступені звычка, але ў якіх жа адметных умовах, з якой жа зменшанай сілай, у безнадзейных акалічнасцях, да якіх ніколі не прызвычаюся»[22], — піша ён у лісце да Я.Карловіча 2(15) ліпеня 1901 г.

У 1904 г. паміраe старэйшы брат Міхаіл, што дабавіла гаспадарчых клопатаў па дзедзічных Дудзічах, якія перайшлі да дачкі Міхаіла, Сафіі

Юзэфы Уняхоўскай, а не да А.Ельскага, як лічаць некаторыя даследчыкі.

З узростам, асабліва пасля рэвалюцыі 1905—1907 гг., погляды А.Ельскага становяцца ўсё больш кансерватыўнымі. Ён падтрымлівае існуючы парадак, ідэю паступовай рэфармацыі дзяржаўнага ладу. Ён супраць рэвалюцыйных выступленняў сялян.

А.Ельскі працягвае працаваць, як і раней, па 12 і больш гадзін у суткі. Пад канец жыцця А.Ельскага яго збор у Замосці налічваў звыш 60 карцін і 2 тысяч гравюр, шмат малюнкаў і эскізаў заходнееўрапейскіх і мясцовых мастакоў. Збераглаліся асобныя прадметы і лісты А.Міцкевіча і Т.Касцюшкі, калекцыі нумізматыкі, фарфору, шкла, слуцкіх паясоў, каля 20 тысяч аўтографаў і дакументаў, у тым ліку Пятра I, Напалеона, Лютэра, Вашынгтона, А.Міцкевіча і інш. Бібліятэка пісьменніка налічвала звыш 10 тысяч адзінак, сярод якіх былі старадрукі, амаль усе польскія і літоўска-беларускія хронікі, дыярыушы, розныя бібліяграфічныя даведнікі, энцыклапедыі, атласы, вопісы архіваў і г.д.[23].

Як адзначае ў сваіх успамінах У.Ельскі, у замосцінскай бібліятэцы былі рарытэты з надзвычай цікавым і нават трагічным лёсам. Адным з іх быў том «Плутарха» з бібліятэкі імператара Напалеона, згублены падчас уцёкаў з Масквы, імператарскі пераплёт меў на сабе сляды казацкай пікі, якой падымалі кнігу з зямлі і падавалі афіцэру[24].

У Замосцінскім зборы былі таксама ноты, рукапісы з аўтографамі знакамітых кампазітараў і выканаўцаў. Сярод калекцыі музычных інструментаў выдзялялася сваёй каштоўнасцю віяланчэль вядомага майстра Альбані. Сярод музыкантаў-аматараў А.Ельскі лічыўся добрым віяланчэлістам і нават спрабаваў свае сілы ў кампазіцыі. Сярод яго твораў музыканты-даследчыкі вызначаюць мастацкія вартасці «Мазуркі» і «Звон польскі» для фартэпіяна.

Аднак пад канец жыцця збіральніка скарбаў беларускага народа Аляксандра Ельскага ўсё больш засмучае тое, што сын Ян, які набыў прафесію юрыста і працаваў адвакатам, не цягнецца да бацькоўскай справы, а калі сказаць дакладна, абыякавы да яе.

Магчыма, Аляксандр Ельскі прадчуваў трагічны лёс сваіх збораў. Таму яшчэ пры жыцці ён падараваў эпісталярную спадчыну Адама Кіркора Віленскаму таварыству сяброў навукі. Многія археалагічныя экспанаты былі падараваны кафедры археалогіі, а самыя каштоўныя аўтографы — бібліятэцы Ягелонскага універсітэта, калекцыя малюнкаў — Нацыянальнаму музею ў Кракаве. Усяго, як лічаць даследчыкі, уратавалася каля 20 тысяч прадметаў з Замосцінскага збору.

27 жніўня (10 верасня) 1916 г. Аляксандра Карлавіча Ельскага не стала. Ён быў пахаваны на могілках у вёсцы Дудзічы. У савецкі час па ідэалагічных і палітычных матывах яго імя на доўгі час было фактычна выкраслена з культурнай спадчыны беларускага народа. Толькі дзяку-

ючы намаганням гісторыкаў і літаратараў А.Мальдзіса, Г.Кісялёва, А.Лойкі, У.Мархеля, У.Казбярука, Г.Каханоўскага яно зноў вернута ў гістарычную спадчыну нашага народа. Сёння плённыя даследаванні па гісторыі роду Ельскіх вядуць А.Мальдзіс, Г.Кісялёў, У.Мархель, А.Грыцкевіч, І.Марачкіна, Л.Сільнова, С.Пугачова, А.Кіштымаў, А.Федарук, В.Пракапцова, Я.Карлюкевіч, В.Скалабан, С.Сяльвестрава-Куль і некаторыя іншыя даследчыкі.

Значнай не толькі навуковай, але і грамадска-палітычнай з'явай стала правядзенне 7 кастрычніка 1999 г. міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Універсітэты Ельскіх», прысвечанай 165-годдзю з дня нараджэння Аляксандра Ельскага, у якой прынялі ўдзел нашчадкі роду Ельскіх: Анджэй і Эвеліна, Станіслаў Матушэвіч (Польшча), Георг Ельскі (Францыя), Віктар і Мікалай (Украіна), Генадзь Ельскія (Расія).

Асабліва варта зазначыць, што яе правядзенне — гэта плён калектыўных намаганняў Беларускага універсітэта культуры, музейна-вытворчага комплексу «Дудуткі», Пухавіцкага райвыканкама і Польскага інстытута ў Мінску.

Гэта фактычна першая на Беларусі навукова-практычная канферэнцыя, на якой вялася гаворка аб сістэматычных навуковых даследаваннях у галіне сядзібнай культуры Беларусі ў яе краязнаўчым, гаспадарчым, літаратуразнаўчым, мастацтвазнаўчым і іншых аспектах.

У выдадзеных пад назвай «Дзеля блізкіх і прышласці» матэрыялах канферэнцыі ўпершыню ў асобным выданні сабраны дакументы і працы, якія адлюстроўваюць жыццё і дзейнасць Аляксандра (1834—1916), Міхаіла (1831—1904), Канстанціна (1837—1896), Людвіка (1785—1843), Вільгельма (1867—1919) і некаторых іншых прадстаўнікоў роду Ельскіх, іх уклад у беларускую і еўрапейскую культуру.

Адной з частак «Універсітэтаў Ельскіх» стала праца па ўзнаўленні месца пахавання Ельскіх у Дудзічах, якую правялі студэнты Беларускага універсітэта культуры пад кіраўніцтвам выкладчыкаў А.Федарука і А.Трусава пры падтрымцы Пухавіцкага райвыканкама, калгаса «Світанак», музейна-вытворчага комплексу «Дудуткі» і консульскага аддзела пасольства Рэспублікі Польшча ў Беларусі. Аўтар гэтага артыкула ўдзячны членам калектыву, які вёў працу па ўзнаўленню месца пахавання Ельскіх у Дудзічах, за дазвол скарыстаць справаздачу аб іх рабоце.

На жаль, сёння нашчадкі роду Ельскіх мала звязаны з Рэспублікай Беларусь. Такая сітуацыя патрабуе ўзгодненых дзеянняў паміж уладнымі структурамі і тымі арганізацыямі, якія сапраўды хочуць дапамагчы ўзнавіць традыцыі і захаваць спадчыну беларускага народа.

Далейшым крокам у вывучэнні гісторыі роду Ельскіх можа стаць правядзенне ў 2001 г. міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 170-й гадавіне з дня нараджэння Міхаіла Карлавіча Ельскага.

Спасылкі:

[1] Больш падрабязна аб продках А.Ельскага глядзі ў артыкуле «Міхаіл Ельскі», які змешчаны ў гэтым зборніку, а таксама артыкул Кісялёва У. «За адважныя справы продка таго дома» // Беларуская мінуўшчына, 1995, № 3, с. 29—30.

[2] Дзеля блізкіх і прышласці. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага). Мінск, 7 кастрычніка 1999 г. Мн., 1999. С. 5—6.

[3] Там жа. С. 7—8.

[4] Там жа. С. 8.

[5] Пачынальнікі: З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. Мн., 1977. С. 353.

[6] Дзеля блізкіх і прышласці. С. 10.

[7] Пачынальнікі. С. 352.

[8] Дзеля блізкіх і прышласці. С. 11—12.

[9] Там жа. С. 13.

[10] Там жа.

[11] Там жа. С. 12.

[12] Пачынальнікі. С. 363.

[13] Там жа. С. 357—358.

[14] Там жа. С. 360.

[15] Дзеля блізкіх і прышласці. С. 24.

[16] Там жа. С. 25—26.

[17] Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974. С. 128—129.

[18] Дзеля блізкіх і прышласці. С. 20.

[19] Там жа. С. 19—20.

[20] Ельскі У. На зямлі продкаў // Шляхам гадоў. Мн., 1993. С. 147.

[21] Дзеля блізкіх і прышласці. С. 23.

[22] Пачынальнікі. С. 365.

[23] Беларускія пісьменнікі: Біблiяграфічны слоўнік. Т. 2. Мн., 1993. С. 420—421.

[24] У.Ельскі. На зямлі продкаў // Шляхам гадоў. С. 144.

Літаратура:

1. Дзеля блізкіх і прышласці. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Універсітэты Ельскіх» (да 165-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Ельскага). Мінск, 7 кастрычніка 1999 г. Мн., 1999.

2. Мархель У.І. Ельскі Аляксандр // Беларускія пісьменнікі: Біబліяграфічны слоўнік. Т. 2. Мн., 1993. С. 420—423; Яго ж. Была праца з божай ласкі // Беларуская мінуўшчына, 1995, № 3, с. 31—32.

3. Ельскі У. На зямлі продкаў. Успаміны пра дзядзьку Аляксандра Ельскага з Замосця. (Прадмова, пераклад І.Марачкінай) // Шляхам гадоў. Гісторыка-літаратурны зборнік. Мн., 1993. С. 140—149.

4. Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мн., 1974; Яго ж. Ельскі Аляксандр Карлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. Мн., 1996. С. 349—350.

5. Пачынальнікі. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / Укл. Г.В.Кісялёў. Мн., 1977.

7. Bieńkowski W. Jelski Aleksander // Polski Słownik Biograficzny. T. XI. Wrocław—W-wa—Kraków, 1964—1965, ss. 148—150.

8. Zy. Jelski Aleksander // Wielka Encyklopedia Powszechna Ilustrowana. T. XXXI. W-wa, 1902, s. 845.

Васіль Кушнер

Канстанцін ЕЛЬСКІ
(1837—1896)



Сярод ураджэнцаў беларускай зямлі, што праславілі яе сваімі навуковымі працамі і адкрыццямі, абавязкова трэба назваць імя Канстанціна Ельскага. Гэта быў усебакова адукаваны чалавек, рамантык па натуры, якога ўсё жыццё вабілі далёкія краіны.

Канстанцін Ельскі нарадзіўся 17 лютага 1837 г. у вёсцы Ляды Смілавіцкай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер Чэрвеньскі раён), у сям'і, з якой паходзіла некалькі выдатных людзей: Аляксандр Ельскі — беларускі і польскі пісьменнік, збіральнік, Міхаіл Ельскі — скрыпач і кампазітар. Спачатку хлопчык вучыўся ў Мінскай гімназіі, а затым, закончыўшы яе на «выдатна», паступіў на медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэта. Пасля вывучаў батаніку і заалогію на матэматычна-прыродазнаўчым факультэце Кіеўскага універсітэта. Атрымаўшы ступень кандыдата, юнак яшчэ два гады наведваў педагагічныя курсы. А калі ў Кіеўскім універсітэце адкрылася вакантнае месца выкладчыка, Ельскі падаў заяву. Яго конкурсная праца была ўзнагароджана залатым медалём, а яе аўтар пачаў чытаць лекцыі студэнтам.

Аднак выкладчыцкая дзейнасць не задавальняла маладога вучонага. Ён марыў пра экзатычныя краіны. Да таго ж пасля паражэння паўстання 1863 г. у царскай Расіі наступіла чорная ноч рэакцыі. Усё гэта прымусіла Ельскага падацца за мяжу. Без пашпарта ён прайшоў праз Бесарабію ў Румынію, а потым апынуўся ў Турцыі. Але тут яго высачылі турэцкія жандары. Без грошай у кішэні Ельскі апынуўся ў Канстанцінопалі і, каб зарабіць на хлеб, расфар-

боўваў для турэцкіх школ геаграфічныя карты, удзельнічаў у розных геалагічных экспедыцыях.

У 1865 г. сябры дапамаглі Ельскаму перабрацца ў Парыж. Але і тут не было адпаведнай работы. Даведаўшыся, што з Тулузы ў Гвіяну, паўднёваамерыканскую калонію Францыі, адпраўляецца ваенна-транспартны карабель, Ельскі напісаў заяву на імя міністра марскога флоту з просьбай выдаць яму бясплатны білет пасажыра самага ніжэйшага класа. Неўзабаве прыйшоў дазвол.

Зборы былі нядоўгімі. Усе свае калекцыі вучоны бясплатна раздаў калегам. Расчуленыя такой бескарыслівасцю, сябры сабралі яму на дарогу 150 франкаў. І вось вецер надзьмуў ветразі фрэгата «Амазонка», які рушыў на паўднёвы захад, да таямнічых берагоў Амерыкі. На караблі знаходзілася некалькі соцень палітычных вязняў. Іх накіроўвалі на катаргу ў калоніі. У Ельскага не было нават сваёй каюты. Ён спаў на падлозе, падаслаўшы сабе старыя канаты, або ў гамаку, падвешаным да мачты.

Праз многа гадоў, вярнуўшыся ў Еўропу, Канстанцін Ельскі падзяліўся дарожнымі ўражаннямі са слухачамі курсаў пры Прамысловым музеі ў Кракаве. Адначасова, абапіраючыся на свае ранейшыя пісьмы з Амерыкі, ён рыхтаваў да друку нататкі пра падарожжа. Але закончыць іх перашкодзіла хвароба. Частка гэтых успамінаў убачыла свет у Кракаве ў 1898 г., пасля смерці аўтара. Гэта — невялічкая кніжка на польскай мове пад назвай «Папулярна-прыродазнаўчае апавяданне аб прабыванні ў французскай Гвіяне і часткова ў Перу».

Ельскі пачынае расказ з таго, як у свой час іх карабель прычаліў да вострава Мадэйра. Пасажыраў у момант акружылі мясцовыя жыхары. Абарваныя і галодныя дзеці за кожнай кінутай манеткай давалі нырца ў глыбіні мора. Але чым мог дапамагчы ім малады падарожнік, калі ў яго не было нават грошай, каб купіць крыху бананаў, якіх ніколі раней не бачыў?

У жніўні 1865 г. карабель прыбыў у Кайену — гандлёвы і адміністрацыйны цэнтр французскай Гвіяны. Ельскага ўразілі кантрасты каланіяльнага горада: з аднаго боку, багатыя ўласнікі велізарных плантацый кавы, какавы, цукровага трыснягу, з другога — негры, мясцовыя індзейцы, мулаты, крэолы, усе тыя, у каго не белы колер скуры, хто за паўцаны, а то і проста дарма працаваў на еўрапейцаў. Асабліва жорстка праследаваліся індзейцы. «У час адкрыцця Гвіяны, — піша Ельскі, — яны жылі на ўсім абшары краіны, на ўзбярэжжы мора і ўздоўж рэк. Потым жа, заняволеныя, прыгнечаныя і пакрыўджаныя еўрапейцамі, індзейцы помсцілі, і за гэта на іх рабілі аблавы». Не лепшым быў лёс і ў завербаваных каланізатарамі азіяцкіх кулі: «Спачатку з імі заключылі кантракт усяго на некалькі гадоў,

абавязваліся адаслаць іх на радзіму. Але на самай справе да тых рабочых, якія не гавораць па-французску, адносяцца не лепш, чым да рабоў; сярод іх значная смяротнасць — і, кажуць, вяртаецца іх на радзіму менш паловы».

У Кайене за нязначную плату Ельскі ўладкаваўся памочнікам фармацэўта ў бальнічнай аптэцы. Кожную свабодную хвіліну ён выкарыстоўваў для падарожжаў у навакольныя лясы. Там вучоны збіраў і апісваў расліны, насякомых, птушак. Прэпарыраваныя чучалы адсылаліся ў музеі Еўропы. Адных павукоў Ельскі паслаў каля 300 экземпляраў. Вучоным адкрыты і ўпершыню апісаны не адзін новы від раслін і жывёл (адзін з відаў лаўра потым быў названы імем адкрывальніка). Сабраны Ельскім матэрыял даў іншым вучоным магчымасць зрабіць значныя абагульненні.

У трапічных джунглях падарожніка на кожным кроку падсцерагала небяспека. То ў ліянах прытойваўся ягуар, то побач з лодкай высоўвалася зяпа кракадзіла. Асабліва цяжка было даставаць змей. «Аднойчы, — успамінае Ельскі, — калі мы вечарам сядзелі ля стала, мне паведамілі, што каланісты даставілі велізарную вужаку. Гэта быў боа-канстрыктар даўжынёй звыш трох метраў і з выгляду зусім не пашкоджаны. Заплаціўшы 5 франкаў і дабавіўшы бутэльку віна, мы паклалі вужаку ў скрыню і зачынілі яе. Пры гэтым жывёліна кінулася на аднаго з нас, але не паспела ўкусіць, бо мы прыціснулі вечка. Назаўтра пасля работы ўсе служачыя бальніцы сабраліся, каб паглядзець на вужаку. Боа пачаў так моцна рыкаць, што можна было пачуць за кіламетр, і рыкаў бесперапынна амаль гадзіну. Такі зычны голас вужакі здзівіў усіх нас, бо, здаецца, ніхто з прысутных не чуў раней, каб боа рыкалі, ды яшчэ так гучна. Другі раз я паклаў у вялікую скрыню прынесенага мне боа-цэўрыса, які меў мо паўтара метра ў даўжыню. А калі ўрачы, як звычайна, сабраліся пасля дзяжурства ў маёй кватэры, аказалася, што хтосьці прынёс жывога пацука. Усе аднагалосна патрабавалі, каб я кінуў яго вужацы. Пацук першы зачапіў боа і ўцяў яго некалькі разоў, урэшце яны сашчапіліся. Вужака хапіла зяпай галаву пацука і імгненна, бы пружына, абвілася вакол яго і так праляжала да вечара. Потым боа аслабаніў ахвяру, але не праглынуў яе. Наступныя дзесяць дзён ён нічога не еў і ўрэшце здох. Як выявілася потым, у вужакі быў пераламаны хрыбетнік».

«У Сен-Ларэнц, — успамінае Ельскі ў кнізе, — здарыўся такі выпадак. Плывучы па рацэ разам з каланістамі, жандар убачыў у вадзе велізарную вужаку, боа-мурына, і застрэліў яе. Здымаючы скуру, заўважылі, што вужака мела ў страўніку праглынутага кракадзіла даўжынёй з метр, а той, у сваю чаргу, праглынуў меншага кракадзіла. Боа-мурына быў настолькі доўгі, што, змераўшы яго,

вусклалі адпаведны дакумент: 7 метраў! Здараліся выпадкі, калі вужакі нападалі на людзей. Аднойчы той жа жандар забіў качку і палез за ёй у ваду. Раптам яго схапіла за плячо вужака і пачала цягнуць у вір. Жандар здолеў вызваліцца, але са страху потым захварэў на малярыю і лячыўся ў кайенскім шпіталі. Сляды вужачых зубоў засталіся на ўсё жыццё».

Звычайна Ельскі падарожнічаў па лясах у суправаджэнні індзейцаў. Вучоны высока цаніў іх здольнасці, бачыў у карэнных жыхарах Амерыкі паўнацэнных людзей, якія маюць усе правы на свабоднае і шчаслівае жыццё. «Ходзяць яны ціха і хутка, — пісаў Ельскі пра індзейцаў, — прыкмячаючы на дрэвах нават маленькіх птушак, шэрых і нерухомых, выдатна вызначаюць, які звер пакінуў след на зямлі. Умеюць яны пераймаць голас кожнага звера; у лесе могуць дастаць літаральна ўсё, бо ведаюць карысныя ўласцівасці кожнай расліны, кожнага дрэва». Ельскі смуткаваў з прычыны таго, што індзейцаў становіцца ўсё менш і менш, што яны не вытрымліваюць сутыкнення з еўрапейскай «цывілізацыяй», са сквапнымі купцамі, якія за бутэльку гарэлкі набывалі ад іх розныя каштоўнасці. Са свайго боку, мясцовыя жыхары, якіх Ельскі бясплатна лячыў, вельмі паважалі нашага земляка, называлі яго «добрым белым», дапамагалі яму ў паляванні на акул і чарапах, папаўнялі яго калекцыі новымі экземплярамі раслін і жывёл.

Прабыўшы ў Гвіяне звыш чатырох гадоў, К.Ельскі пераехаў у Перу, дзе пражыў яшчэ амаль 10 гадоў. Увесь гэты час вучоны падтрымліваў сувязі з еўрапейскімі музеямі, навуковымі арганізацыямі і паасобнымі вучонымі, выконваў іх заказы. Ён бесперапынна працаваў над рознымі вынаходствамі: то адкрываў сакрэты кітайскай чорнай тушы, то ўдасканальваў спосаб захавання засушаных насякомых.

У сталым узросце вучоны вярнуўся ў Еўропу, ажаніўся і пасяліўся ў Кракаве. Няўрымслівы даследчык па-ранейшаму выношваў розныя планы. Ён пісаў даследаванне «Аб узаемнай залежнасці геалагічных з'яў», удзельнічаў у экспедыцыях у Брэтань і Далмацыю. Яшчэ за некалькі дзён да смерці Ельскі працаваў над падручнікам па заалогіі. Ён памёр 26 лістапада 1896 г.

Біяграфія Ельскага не вельмі багата на фантастычныя эпізоды, эфектныя прыгоды. Нягледзячы на тое, што яго шлях пралягаў па экзатычных краінах, ён ні разу не тапіўся, не трапляў у кіпцюры драпежнага звера, не абрываўся са скал. І ўсё ж жыццё нашага земляка — гэта бесперапынны подзвіг, яркі прыклад штодзённага працавітага служэння навуцы. Падарожнік і ўрач, батанік і заолаг, географ і геолаг, ён пакінуў прыкметны след у развіцці прыродазнаўства мінулага стагоддзя.

Літаратура:

1. Багадзяж М. Нястомны вандроўнік // Чырвоная змена. 1991. 11—17 сакавіка.

2. Грицкевич В.П. С берегов Березины в Гвиану и Перу // Грицкевич В.П. Путешествия наших земляков. Мн., 1968. С. 121—137.

3. Мальдзіс А. У джунглях Паўднёвай Амерыкі // Бярозка. 1963. № 11. С. 28.

4. Kieniewicz Stefan, Zahorski Andrzej Władysław. Trzy powstania narodowe. Warszawa, 1992. S. 31–35.

Адам Мальдзіс

Францішак Бенядзікт БАГУШЭВІЧ

(1840—1900)



ранцішак Багушэвіч — самы яркі нацыянальны паэт XIX стагоддзя. Талент ягоны, гэты «Божы дар», дадзены яму ад прыроды, выдатна спрычыніўся да станаўлення літаратуры, якую тады не прызнавалі, а калі прызнавалі, дык адгукаліся з вялікаю неахвотаю і пагардаю. Калі да Ф. Багушэвіча беларуская паэзія мела нешырокі рэзананс, дык пасля яго розгалас пра яе пайшоў па ўсім славянскім свеце. Менавіта творчасць Ф.Багушэвіча (Мацея Бурачка і Сымона Рэўкі з-пад Барысава ў адной асобе), ягоная хай сабе і невялікая (нават па мерках XIX стагоддзя), аднак яркая літаратурная спадчына адназначна зацвердзіла: беларуская літаратура была, яна ёсць, а значыць, у яе будзе і годны працяг.

Францішак Бенядзікт, сын Казіміра Багушэвіча, нарадзіўся 21 (9) сакавіка 1840 года «у двары Свіранах» (цяпер Вільнюскі раён Літвы). Да нядаўняга часу лічылася, што двор гэты арандаваўся бацькам паэта. Але Свіраны належылі Галаўням, а маці паэта, Канстанцыя, паходзіла менавіта з гэтага роду. Яна і паехала да сваіх бацькоў-дзядоў нараджаць ім чарговага ўнука (першым быў сын Уладзіслаў-Антон, старэйшы за Францішка на 4 гады). Неўзабаве сям'я перабралася ў спадчынны маёнтак Кушляны Ашмянскага павета. Кушляны належылі Багушэвічам з сярэдзіны XVIII ст.

Продкі паэта перабіваліся не толькі з зямельнага арандатарства, але служылі і ў войску (прадзед Казімір у 1783 г. атрымаў чын ротмістра Ашмянскага павета, Аляксандр стаў ротмістрам Літоўскай кавалерыі). Бацька ж паэта жыў выключна з зямлі і паводле «уводнага акту» ад 1-га

ліпеня 1837 года стаў валодаць маёнткам Кушляны з 34 сялянскімі душамі. Там прамільгнула маленства Францішка, ягоных братоў — Уладзіслава і малодшага Апалінара. Адтуль пацягнуліся сыны кушлянскага гаспадара ў недалёкую Вільню, па навуку. У спісе вучняў Віленскай гімназіі, «няздольных уносіць устаноўленую за навучанне плату», прозвішча Францішка сустракаецца з 1852 года побач з імем малодшага брата Валяр'яна.

У пастанове педагагічнай рады ад 17 чэрвеня 1861 года ягонае прозвішча было названа ў ліку чатырох лепшых выпускнікоў гімназіі. Залічаны 15 верасня на 1 курс Пецярбургскага універсітэта па матэматычнаму разраду Багушэвіч так і не распачаў вучобы: на знак пратэсту супраць новых універсітэцкіх правілаў, якія абмяжоўвалі правы навучэнцаў, студэнты, вярнуўшыся з летніх вакацый, адмовіліся прыняць свае матрыкулы (заліковыя кніжкі). Барацьба скончылася крывавай сутычкай на універсітэцкім ганку 24 кастрычніка, а неўзабаве, 14 лістапада, Багушэвіч піша новую, гэтым разам апошнюю заяву на імя рэктара з просьбай звольніць з універсітэта «з прычыны цяжкай хваробы» і «неспрыяльнага клімату», каб па парадзе доктара «адправіцца на месца маёй Радзімы».

Такі паварот падзей вярнуў юнака на Радзіму. У школцы, адкрытай на Лідчыне ўладальнікам маёнтка Доцішкі Аляксандрам Звяровічам, Францішак навучае сялянскіх падлеткаў ясна што не ў адпаведнасці з афіцыйнай тэорыяй, паводле якой «православие, самодержавие, народность — три незыблемые основы русского царства».

Тут на Лідчыне, у Доцішках, заспела Францішка паўстанне 1863 года. Пад час адной з сутычак касінераў з царскімі карнікамі ля маёнтка атрад, якім спачатку камандаваў легендарны партызан Людвік Нарбут і які пасля яго смерці ўзначаліў Аляксандр Парадоўскі-Астрога, быў ушчэнт разгромлены казакамі і перайшоў за Нёман у Аўгустоўскую губерню. Блізкія да паэта людзі сцвярджалі, што тым шляхам прайшоў і малады настаўнік з Доцішак, пакуль не быў паранены ў нагу ў Аўгустоўскіх лясах. Прамыя рэмінісцэнцыі тых «крывавых дзён» і не менш памятных наступстваў, што расцягнуліся на гады і дзесяцігоддзі над зрабаваным, зруйнаваным краем, гучаць у багушэвічавых строфах:

Я стары, таму й не знаю;
Я знаёмы з іншым краем:
З тым, дзе Лена і Пячора,
З тым, дзе багна і вазёры,
З тым, дзе горы, з тым дзе, стэпы,
З тым, дзе прах дзядоў у склепах,
Што палеглі на чужыне,

Волю прагнучы Айчыне.
Сёння ж кат стаіць над ёю...
А ці знаеш ты пра тое?... (С. 104).
(«Я стары, таму й не знаю...». Пер. С. Сокалава-Воюша).

7 мая 1865 г. Францішак Багушэвіч падаў заяву дырэктару Нежынскага юрыдычнага ліцэя з просьбай залічыць яго ў лік студэнтаў. Пакутная вучоба скончылася 26 ліпеня 1868 г., а 17 жніўня, калі Багушэвічу выпісвалі атэстат, ён ужо «состоял на службе» у г. Чарнігаве, адкуль у 1869 годзе пераве́уся ў Кралявецкі павет судовым следчым. Праз два гады (за гэты час ён папрацаваў у Старадубскім павеце) мы зноў бачым Багушэвіча ў Чарнігаве. Але і тут 30-гадовы следчы не затрымаўся надоўга, яшчэ раз змяніўшы месца працы: 21 ліпеня 1871 г. загадам Міністэрства юстыцыі прызначаны судовым следчым у Гразявецкі павет Валагодскай губерні. Праз год ён вернецца на Украіну, каб 7 месяцаў папрацаваць старшым следчым Барзнянскага павета і перайсці на службу ў Канатоп.

2 лютага 1884 г. Багушэвіч падаў прашэнне ў Нежынскі акруговы суд з просьбаю звольніць са службы – фактычна, пайсці ў адстаўку, а 25 сакавіка, на Звеставанне, ступіў на віленскі брук, камяні якога памяталі ягоны юначы крок з гімназічных часоў, убачыў горад сваёй маладосці. Быў ужо цяпер ён не адзін, а з жонкаю Габрыэляй з дому Шклёнікаў, мінчанкаю, з якой узяў шлюб у 1874 годзе і ад якой меў дачку Канстанцыю (Туньку) і сына Тамаша Вільгельма.

Вучоба на Украіне і адвакацкая адысея па абшарах Расійскай імперыі былі вымушанымі ўцёкамі з роднага краю бадзягі-эмігранта. Падчас здоўжанай адысеі паэт захварэў «невылечнай хваробай» — «хвароба гэта ў дактароў завецца настальгія» (Г.Гейнэ). Найбольш гаючымі лекамі для паэтавай душы, відаць, з'яўляліся ўласныя вершы-скаргі, аднак ніводнага паэтычнага твора, датаванага 1860—1870 г, не захавалася. Пакуль што першымі, паводле храналогіі, вядомымі паэтычнымі спробамі Францішка Багушэвіча трэба лічыць знойдзеныя ў Львове вершы на польскай мове: «Новы 1886 год», «Прывід надзеі», «Хто гэта?» («Nowy rok 1886», «Widmo nadziei», «Kto to?»), напісаныя ў 1885—1886 гг. Аднак адшуканыя ў Львове польскамоўныя творы Багушэвіча не даюць іх аўтару права называцца паэтам — прадстаўніком братняга народа з-над Віслы і Одры, якім стаў наш Міцкевіч, пясняр Літвы. Так, верш «Nowy rok 1886» — узор альбомнай лірыкі сярэдняга гатунку; вершык «Kto to?» уяўляе сабой палітычную сатыру на аднаго з тагачасных дзяржаўных мужоў — ці не Бісмарка.

Вершы дасылаліся ў лістах да Яна Карловіча, з якім, пасля вяртання на Радзіму, у былога канатопскага следчага наладзіліся больш тры-

валыя сувязі і якому Беларусь павінна быць удзячнай не толькі за выданне «кантрабандных» зборнікаў паэта, але і за нараджэнне Багушэвіча-публіцыста. У шматлікіх пісьмах-справаздачах пра гаспадарку ў Вішневе (віленскі адвакат пэўны час сумяшчаў абавязкі апекуна над родавым маёнткам Ірэны Карловіч) між радкоў вучоны-славіст убачыў тое, чаму сам адрасат не надаваў асаблівай увагі: афарыстычнасць слова, трапнасць ацэнак, назіральнасць мастака, пісьменніцкую здольнасць адным сказам намаляваць абагульнены вобраз нейкіх значных падзей, у звычайным «бытавым» здарэнні, грамадскім канфлікце ўбачыць супярэчлівасць самой эпохі, сутнасць царскага рэжыму, яго хвалёных «свабод», «эканамічнага росквіту», прыстасаванне пануючай рэлігіі і іншых дзяржаўных інстытутаў пад існуючы лад.

Першае вядомае публічнае выступленне Багушэвіча-літаратара адбылося 4 красавіка 1885 г. на старонках польскага часопіса «Kraj», што выдаваўся ў Пецярбургу. Віленскі карэспандэнт пісаў пра «зніжэнне цэн на збожжа» і «адпаведнае зніжэнне кошту на ўсе сельскагаспадарчыя прадукты і мясцовыя вырабы», іншымі словамі — пра эканамічны крызіс; пра гадавы сход акцыянераў мясцовага зямельнага банка; пра судзейскую практыку ў паўночна-заходніх губернях. Супрацоўніцтва з польскім перыядычным выданнем «Край» з'явілася выдатнай школай для Багушэвіча-публіцыста.

Увосень 1891 г. у Кракаве выходзіць паэтычны зборнік «Дудка беларуская» Мацея Бурачка. «Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маёй! Вам афяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, ды і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя «мужыцкай» завуць, а завецца яна «беларускай». Як было тутэйшаму «цёмнаму» селяніну, што ўвесь век звекаваў у сваёй вёсцы, не верыць больш дасведчанаму, бываламу і разумнаму супляменніку, што гаворыць на адной з ім гаворцы: «...я шмат гдзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і пераканаўся, што мова нашая ёсць такая людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая...» Як было ім не верыць чалавеку, хай сабе чужому-незнаёмаму, калі ў кожным яго сказе, у кожным слове гучала засцярога: «Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як чалавек той прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі». Як было не пачуць заклiку: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»

У запеўнай, праграмнай «Прадмове» паэтам дакладна праведзена вызначэнне асноўных прыкмет існавання самастойнай беларускай нацыі: даўняя, праз вякі эканамічная і культурная супольнасць люду, што жыве на адной тэрыторыі разам з іншымі народамі, якія ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага. Такім чынам, прадмовы Ф. Багушэвіча сталі своеасаблівым маніфестам беларускага нацыянальнага адраджэн-

ня. Багушэвіч па-свойму, у мастацкай форме падхапіў публіцыстычныя выступленні «гоманаўцаў».

Феномен першага паэтычнага зборніка Ф. Багушэвіча ў гісторыі нацыянальнага кнігадрукавання выявіўся яшчэ і ў тым, што ад часу выхаду кракаўскай «Дудкі беларускай» Мацея Бурачка беларуская кніга больш анікол і не спынялася на дарозе да беларускага чытача і пачала з'яўляцца штогод. «Дудка беларуская» стала нязводнай крыніцай для ўсёй друкаванай беларускай кнігі. Бо калі паэты маўчаць — маўчыць народ, нямее зямля. Сам Багушэвіч па-ранейшаму не выпускаў з рук сваёй дудкі-самаграйкі, пісаў і пісаў новыя вершы.

Ох, дайце ж мне смык,
Каб усюды граў!
Хоць бы сам я знік,
Абы голас даў;
Каб той голас чуць
Па усёй зямлі,
Гдзе людзі жывуць,
Гдзе даўней жылі! (С. 66).

Такой страснай споведдзю пачынаўся другі зборнічак «Смык беларускі», што выйшаў у 1894 годзе у Познані (?) пад новым псеўданімам: «Сымон Рэўка з-пад Барысава». З вышыні стогадовага шляху, пройдзенага новай беларускай літаратурай ад часу выхаду ў свет паэтычных кніг Францішка Багушэвіча, яскрава бачыцца, што можна і аднаму быць у полі Змагаром, калі ты Народны Паэт; і адзін Абаронца, калі ты жыццё і талент кладзеш за пакрыўджаных і бяздольных; калі, як Хрыстос, робіш усё, каб наталіць зняверaных духоўным хлебам. Дзеля адраджэння беларускай літаратуры і нацыянальнай свядомасці Францішак Багушэвіч на схіле XIX ст. зрабіў тое, што для чэшскай — геніяльны містыфікатар Вацлаў Ганка сваім «Краледворскім рукапісам».

Дух паэта не схіляўся пад штодзённым жыццёвым цяжарам, бо ў лістах да Яна Карловіча творца не раз скардзіўся: «Матэрыяльная нястача наведвае перыядычна, і цяпер я знаходжуся пад яе моцным уплывам: перамена можа наступіць праз колькі месяцаў». Мінала паўгода, і паэт апраўдваўся: «Частку майго доўгу — 100 р. — адсылаю, сто разоў дзякую пану за дапамогу; застаюся вінаваты яшчэ 350 р., якія пастараюся даслаць у дамоўлены тэрмін. Я даўно б разлічыўся, калі б мяне не расчаравалі паважаныя грамадзяне-кліенты! У нашай прафесіі штораз цяжэй здабываць хлеб, і не ведаю, што будзе пад старасць, якая ўжо ля дзвярэй».

Таму шчаслівым дарункам лёсу была для Багушэвіча спадчына, ат-

рыманая ім пасля смерці варшаўскага сваяка Тадэвуша ў 1896 годзе. Паэт здолеў разлічыцца з пазыкамі, адбудаваць нанова занядбаную бацькоўскую сядзібу ў Кушлянах і там, кінуўшы агорклую службу ў царскім судзе, аддацца творчай працы. Зрэшты, на дзень 20 мая 1898 г., калі Багушэвіч пісаў заяву на фактычнае вызваленне ад абавязкаў прысяжнага паверанага пры Віленскім акруговым судзе, у яго ўжо наспеў востры канфлікт з некаторымі калегамі і начальствам. Мо ад непрымання ягоных «дзівацтваў», ад таго, што ён «не такі адвакат, як астатнія», сям'я не прымала Багушэвіча як паэта беларускага. Трагедыя, што не раз азмрочыць старасць Мацея Бурачка: ад дарослых дзяцей асабліва балюча чуць папрокі ў «хлопаманстве». Сямейная драма Багушэвіча адбівае, як у люстэрку, глыбіню нацыянальнай трагедыі: што значыла быць у XIX стагоддзі паэтам Белай Русі.

Хоць трагічны пафас большасці твораў Ф.Багушэвіча абумоўлены абмалёўкай штодзённага побыту беларускага сялянства. Тым велічней успрымаецца кожная спроба Багушэвічавых герояў узняцца на змаганне («Хрэсьбіны Мацюка», «Кепска будзе», «У астрозе»). Прабуджэнне пачуцця ўласнай годнасці – адзін з хвалюючых момантаў людской псіхалогіі. Аўтар спрабуе падаць уласную мадэль гуманістычнага ідэалу чалавека, калі ў герояў побач з боскай пакорай суседзіць бунт супраць несправядлівасці на зямлі. Так, селянін з верша «У астрозе» за тое, што струшчыў возам няўзнак «калок на капцы» («быў гнілы, як бурак»), прыцягваецца да судовай адказнасці, але ідзе на гэта не з паставай пакорнай жывёлы, а праяўляе свой бунтарны дух. Той, што застаўся ад продкаў, калі яны жылі і кіраваліся ўласнымі статутнымі законамі.

Паэт нярэдка выносіць у загаловак вечныя каштоўнасці («Мая Дудка», «Праўда», «Як праўды шукаюць»), пашыраючы свае жанрава-стылявыя пошукі. Матывы паэзіі Ф.Багушэвіча самыя разнастайныя: сацыяльны аналіз рэчаіснасці («Гора», «Бог не роўна дзеле»), матывы праўдашукальніцтва, маральная праблематыка («Ахвяра», «Не цурайся»), грэх і свабодалюбства (паэма «Кепска будзе!», «У астрозе», «Быў у чысцы»), міжнацыянальныя і міжканфесійныя зносіны («Жыдок», «Падарожныя жыды»), тэматычнае пашырэнне традыцыйнай «вясковай паэзіі» і нараджэнне так званай гарадской тэматыкі («Немец»). Трэба адзначыць, што падступы да апошняй — да меставай, гарадской, тэматыкі — вельмі ўдалыя. Бліскуча паказана, што псіхалогія паводзін героя на вёсцы і на меставым бруку — розныя. Сацыяльна неабаронены «мужык» у месце лёгка-задарма можа быць скрыўджаны і абдураны («Абодва абдураць, абдзяруць як ліпку, // Адбяруць і сошку за бітую скрыпку»). Адсюль — празрыстая выснова, што ляжыць на паверхні: горад — гэта не для селяніна. Чым яшчэ прыцягвае да сябе верш «Не-

мец», гэта што ў ім адлюстравалася Беларусь пасляпаўстанцкая, парэформенная. Рэчаіснасць была жахлівай: краіну рабавалі хто хацеў, колькі хацеў і як хацеў. Завяршаецца верш моцным акордам, у якім мо ўпершыню так поўна прагучала трагічная тэма «тутэйшасці» («Тутэйшы загіне — дык вораг прыбудзе»).

Асаблівасцю творчай эвалюцыі Багушэвіча трэба лічыць паглыбленне лірызму ў зборніку «Смык беларускі». Тэндэнцыя да лірызацыі найбольш ярка выявілася ў нізцы «Песні» («Удава», «Гора», «Сватаны», «Калыханка» — усяго 10 твораў). Гэты цыкл — яркі ўзор майстэрскага выкарыстання народных песень, насычаных аўтарскім успрыманнем сучаснага сацыяльнага зместу і філасофскім роздумам. Да народна-фальклорных матываў пра ўдавіцу, жонку-няўдаліцу, персаніфікаваных вобразаў гора-нядолі, матчыных калыханак над калыскай немаўляці паэт па-майстэрску і нязмушана ўплятае матывы чалавечага быцця і беспрытульнасці, зноўку задумваецца над філасафічнай цыклічнасцю, паўторнасцю падзей пад вечным небам, заглыбляецца ў развагі-пошукі свайго «я» і назову роднай зямлі .

Хмаркі цёмныя, мае братанькі!
Вецер гоне вас без дарожанькі,
І нігдзе ж для вас няма хатанькі...
Адпачынеце аж у Божанькі!
Гдзе радзіліся, гдзе ж вы, хмарачкі,
Гдзе «тутэйшымі» называліся..... (С. 76)

Аднак не толькі на малыя формы настрайвалася муза паэта. Эпічны свет паэзіі Багушэвіча патрабаваў адпаведных шырокіх мастацкіх палотнаў. Наогул да кампазіцыйна-стылёвых асаблівасцяў яго твораў трэба аднесці эпічную разгорнутасць жыццёвага малюнка, засяроджанасць на побытавай сітуацыі, якая вырастае да сацыяльнага абагульнення. Фальклорна-міфалагічныя і апакрыфічныя матывы ў баладах «Хцівец і скарб на святога Яна», «Балада», апрацоўка народных баек («Гдзе чорт не можа, там бабу пашле») падаюць узоры паэтычных здольнасцяў Ф.Багушэвіча, што яму было пад сілу апрацаваць вялікія вершаваныя памеры, а не толькі кароткі верш. Зарыфмаваць некалькі соцен радкоў гладка, без рытмічных збояў, з гучнай выразнай рыфмай – такое ў першай палове XIX ст. мог адолець толькі літаратар, роўны талентам В.Дуніну-Марцінкевічу або аўтару «Тараса на Парнасе». Аднак, у адрозненне ад сентыментальных перажыванняў у «Ідыліі», «Гапоне» патрыярха новай беларускай літаратуры, у іншых тагачасных ананімных быліцах, паэмы Ф.Багушэвіча вылучаюцца сюжэтным драматызмам. Бо як інačай можна ўвасобіць складаную мастакоўскую задачу — выяўленне ідэі

фатальнасці лёсу простага чалавека ва ўмовах сацыяльнай несправядлівасці. У такіх творах, як паэма «Кепска будзе!», наймацней выразіўся рэалізм творчасці пісьменніка.

Эпічнасць вершаваных палотнаў разам з прысутнасцю мноства празаічных элементаў у вершах (нарысавасць і публіцыстычнасць асобных твораў, бытавізм у замалёўках, у аўтарскай мове) сведчылі пра моцныя парасткі таленту Багушэвіча-празаіка; празаічны талент выявіўся ў схільнасці аўтара да доўгіх апавяданняў вершам. Таму невыпадкова пад пяром паэта паўсталі і першыя парасткі мастацкай нацыянальнай прозы. Наогул сталасць кожнай нацыянальнай літаратуры вызначаецца наяўнасцю ўсіх літаратурных жанраў. На ўсім шляху станаўлення новай беларускай літаратуры XIX ст. не хапала важкай кроны: уласнай нацыянальнай прозы — як сведчання поўнага засваення літаратурнага мацерыка.

Патрымаўшы ў руках карэктуру свайго зборніка — «Дудка беларуская» (Кракаў, 1891), — «вельмі няўдалую, з процьмай памылак», як скардзіўся паэт Яну Карловічу, Багушэвіч у наступным лісце да нязменнага апекуна паведамляў: «Дудка» пераходзіць да песень і празаічнай аповесці». Найверагодней, гаворка ішла пра апавяданне «Тралялёначка», якое пабачыла свет у 1892 годзе ў той самай кракаўскай друкарні Уладзіслава Анчыца, што і «Дудка беларуская». Праўда, калі на зборніку замест сапраўднага імя паэта стаяла сціплае «Мацей Бурачок», гэтым разам вокладку не ўпрыгожваў ніякі псеўданім, і, каб даказаць прыналежнасць твора пяру Багушэвіча, спатрэбілася не адно дзесяцігоддзе намаганняў беларускіх даследчыкаў. Багушэвіч не мог не прыйсці ў прозу, бо ягоныя лірычныя героі надта ж глыбока разважалі сам-насам. Такіх лірычных, унутраных маналогаў да Багушэвіча не адшукаць у ніводнага беларускага аўтара. Самапаглыбленне, аналіз учынкаў, душэўныя пакуты ў пошуках адказу на вечныя пытанні вельмі характэрныя для герояў Багушэвіча.

У сваім першым апублікаваным празаічным творы Францішак Багушэвіч стварыў адметны вобраз Барткі Саска — духоўнага брата беларускага габсека Антона Сабковіча, выведзенага Дунінным-Марцінкевічам у «Залётах», паказаў, як у працэсе рассяляньвання беларускай парэформеннай вёскі нараджалася постаць капіталіста-эксплуататара з невядомай дагэтуль тутэйшаму люду псіхалогіяй чалавеканенавісніка. Аднак кола праблем у апавяданні «Тралялёначка» больш шырокае, чым звыкла лічылі крытыкі. У творы неаднаразова згадваецца «ганарал», папярэдні ўладальнік маёнтка Замораўкі, набытага Барткам Саском: «Ад нас да Замораўкі недалёка, але туды ніхто не ўчашчае: там пан надта дзікі якісь быў, Прыбалдоў зваўся; сам казаў, што ён ганарал, але мундзеру таго, каб які там быў у яго ганаральскі, блiскучы — таго ніхто не відзеў, хоць

крычаў па-ганаральску і біўся». Колькі ж такіх «ганаралаў», пачынаючы ад душыцеля нацыянальна-вызваленчага паўстання Тадэвуша Касцюшкі генералісімуса Суворава, маёнтак якога на Кобрыншчыне распатрынкаў у карты ды на гарэлку ягоны сын Аркадзій, балявала і расқашавала на Беларусі з часоў падзелаў Рэчы Паспалітай?! Асабліва гэтая хваля заліла Беларусь пасля паўстання 1863 года. «О водворении русского элемента ■ Северо-Западном крае» — так адмыслова гучаў спецыяльны рэскрыпт, падпісаны імператарам Аляксандрам II з мэтаю фарсіравання русіфікацыі далучаных абшараў. Акрамя ідавочнага палітыка-нацыянальнага ўціску, такія «ганаралы», як Прыбалдоў, развальвалі эканоміку Беларусі, марнавалі зямлю: «Гаспадарка ў яго там ішла кепска: мы сеем ужо на зіму, а ён сабе касіць зачынае; мы на зіму аром, а ў яго зажынкі, і ўсё гэтак, а ўсё-тыкі ганаралам зваўся!..» Аднак як Прыбалдоў няварты наймення гаспадара тутэйшай зямлі, так і Бартак Сасок нядоўга цешыўся набытым маёнткам і скончыў сваё жыццё ў турме. «Гэтае апавяданне сваёй сюжэтнай асноваю ў значнай ступені нагадвае верш Ф.Багушэвіча «Немец», — слушна адзначыў Сцяпан Александровіч.

От цяпер згадай ты — хто кім калі стане?
Аб пану ні весці, ні слыху, ні звання,
Жыд панам зрабіўся, немец яшчэ большы,
А мужык быў голы, цяпер яшчэ гольшы!
Так і на гародзе: лябяда, крапіва, —
Толькі вырві рэпу, — дык зарастуць жыва,
Так як чорт насее! Ото ж так і людзе:
Тутэйшы загіне, дык вораг прыбудзе!

— з горкай скрухаю пісаў паэт у прыведзеным вершы пра нескончоныя змены ўладароў нашых мястэчак і вёсак. Па сваіх мастацкіх вартасцях і насычанасці ідэямі невялікае апавяданне «Тралялёначка» сапраўды можна назваць аповесцю. Напісаўшы яго, Францішак Багушэвіч сцвердзіў уласны тэзіс пра сталасць і развіццё роднай мовы, на якой можна мець «і друкованыя ксёнжачкі, і гісторыйкі, і баячкі».

У свой час В.Дуніну-Марцінкевічу прыпісвалі нямала ананімных твораў на «мужычай гаворцы». Не мінула гэта (хоць і ў меншай ступені) такога яркага наступніка Беларускага Дудара, якім быў Багушэвіч. Услед за «Тралялёначкай» у Кракаве выйшла яшчэ адна кніжачка-аповесць на беларускай мове без імя-псеўданіма і нават без назвы, увогуле без тытульнай старонкі. Замест яе адразу ішоў тэкст як у лістках неўміручай «Мужыцкай праўды»: «Гаспадары, для Вас пішым гэта апавяданне... Вы ж і павінны ведаць, сколькі церпяць вашые бра-

ты пад царскім ярмом. Апавядання гэтыя смутныя і страшныя, а нядоля наша вялікая!..» З'яўленне пракламацыі было выклікана трагічнымі падзеямі ў мястэчку Крожах на Літве (1894 г.), дзе царскія ўлады наважыліся зачыніць каталіцкі касцёл. Відаць, па традыцыі ад ранніх даследаванняў па гісторыі новай беларускай літаратуры XIX ст. прыпісваць аўтарства найбольш дасканалых мастацкіх твораў самым яркім творчым постацям на літаратурным небасхіле (Дуніну-Марцінкевічу ў свой час прыпісвалі большасць ананімных вершаў — ад антыўрадавых гімнаў да паэмы «Тарас на Парнасе») гэтую пракламацыю залічылі ў «актыў» Багушэвіча. Думаецца, такі дасведчаны вучоны, як аўтар капітальнага даследавання «Беларусы» Я.Карскі, тут не памыляўся: чытаеш пракламацыю «Гаспадары, для Вас пішам гэта апавяданне...» і згадваеш не менш балючую і пранізлівую «Прадмову» Мацея Бурачка, яго «Хрэсьбіны Мацюка». Брашура тая магла распаўсюджвацца ў Беларусі толькі нелегальным чынам. Кантрабандным шляхам павандравала на Беларусь і другое выданне «Дудкі беларускай», перавыдадзенай у Кракаве ў 1896 годзе.

Куды менш пашчасціла творам Ф. Багушэвіча апошніх гадоў; вершаваныя меліся скласці трэці паэтычны зборнік «Скрыпачка беларуская», а проза — кнігу «Беларускія апавяданняў Мацея Бурачка». Забароненыя царскай цэнзурай рукапісы гэтыя загінулі, і лёс іх невядомы. Вельмі шкада! «Калі б гэты зборнік (гутарка пра «Беларускія апавяданні Бурачка») складаўся ўсяго з дзесятка такіх апавяданняў, як «Тралялёначка», гэта быў бы такі пачатак беларускай нацыянальнай прозы, якому б не адна літаратура магла пазайздросціць» (А.Лойка). Апроч таго, у Кушлянах Багушэвіч працягваў карпатлівую працу па складанню слоўніка беларускай мовы, марыў пра выданне граматыкі, сам як творца востра адчуваючы ненарматыўнасць, нераспрацаванасць беларускай літаратурнай мовы.

15 (28) красавіка 1900 г. у адзіных на Беларусі XIX ст. ацалелых літаратурных пенатах (беспрэцэдэнтны для гісторыі айчыннай літаратуры факт захавання пісьменніцкай сядзібы) у сваім маёнтку Кушляны адышоў Францішак Багушэвіч, alias Мацей Бурачок, vel Сымон Рэўка з-пад Барысава. За месяц перад тым збалелы гаспадар Кушлян падпісваў фінансавыя рахункі-справаздачу пра адкрыццё барэльефа Адама Міцкевіча ў Вільні. Подпісы пад справаздачай сяброў міцкевічаўскага камітэта — апошнія паэтавы аўтографы — з канспірацыйных меркаванняў былі знішчаны. Гэтыя сумныя факты ілюструюць не проста мужнасць і высакародства генія, які заставаўся грамадзянінам у паэзіі і ў жыцці, але і атмасферу, у якой даводзілася паэту жыць і пайсці з жыцця.

Францішак Багушэвіч не проста паэт, гэта геніяльны песняр. І народ, які змог нарадзіць такога валадара слова, ужо не маленькі народ.

Францішак Багушэвіч — эпоха ў беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Такога кніжнага зарападу, які пабачыла Беларусь на схіле мінулага стагоддзя дзякуючы Багушэвічу, не было над ёй ад часу выхаду першых беларуска-польскіх зборнікаў паэзіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (чатыры кнігі на працягу 1855—1857 гадоў). У творчасці Беларускага Дудара тады адчуваўся прыкметны ўплыў фальклорнага этнаграфізму. Паэзія ж ягонага паслядоўніка — яркі ўзор крытычнага рэалізму, чысты без фальшу голас, пранікнёны да адчаю. Бо толькі ад вялікага пачуцця можна з эпохаю гаварыць на роўных і самому стаць вымярэннем гэтай эпохі. Калі Дуніна-Марцінкевіча пасля выхаду ўсіх ягоных друкаваных кніг чакалі наперадзе несмяротная «Пінская шляхта», «Залёты», дык зорны перыяд у творчасці Багушэвіча прыпаў на апошняе дзесяцігоддзе ягонага веку: прыжыццёвыя зборнікі паэта склалі вершы, напісаныя ім на працягу 15 гадоў. Толькі ўсвядоміўшы гэта, зразумееш веліч творчага і грамадзянскага подзвігу, здзейсненага Мацеем Бурачком за паўтара дзесяцігоддзі. Да яго паэт ішоў усё свядомае жыццё. І узняўшыся на абарону адвечнай праўды мільённага люду, на стагоддзе наперад даў «мільёнам пракурораў», што вынеслі над ягоным народам нечалавечы вердыкт «на отмирание и слияние» годны адказ: сваё адталенавітае, выпакутаванае ў дранцвеючым маўчанні і таму навекі адроджанае жывое слова.

Творчасць Ф. Багушэвіча — вяршыня нацыянальна-ўсвядомленай ідэі беларускага адраджэння ў XIX ст., звяно, якое аб'ядноўвае ўсю беларускую літаратуру XIX ст. з яе адраджэнскім уздымам на пачатку XX ст. Яна ўвасабляе прадвызначэнне адметнага шляху для нацыянальнага прыгожага пісьменства, прадчуванне магутнага ўздыму духоўнасці на роднай зямлі. Засваенне і развіццё папярэдніх дэмакратычных традыцый адразу было падхоплена маладой генерацыяй. Паэзія Багушэвіча паўплывала не проста на паасобных літаратурных творцаў, яна здзейсніла аграмадны ўплыў на абуджэнне ўсяго нацыянальнага руху. «Рашучы штуршок беларускаму руху надала кніжка Мацея Бурачка «Дудка беларуская», якая выйшла ў Кракаве ў 1891 годзе на беларускай мове» — канстатаваў Я.Карскі. Гэтую думку яшчэ больш катэгарычна паўтарыў італьянскі даследчык Дж. Месіна ў капітальнай манаграфіі «Беларуская літаратура» (Рым, 1952). Ён вобразна-дакладна выказаўся пра неацэнную ролю першых Багушэвічавых кніжак: «Калі ў новай беларускай літаратуры і можа быць метрычны выпіс яе нараджэння, — дык гэта час апублікавання ў Кракаве твораў Мацея Бурачка (Ф.Багушэвіча)». Сама гісторыя выдання зборнікаў паэта з 1891 па 1914 гг. – праўдзівае люстэрка складанай і жыццядайнай пуцявіны беларускага мастацкага слова напрыканцы XIX—пачатку XX стст.

Літаратура:

1. Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Мн., 1992.
2. Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць. Мн., 1968.
3. Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Мн., 1963.
4. Кісялёў Г. Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 1993.
5. Дорошевич Э., Конон В. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. Мн., 1972.
6. Майхрович А. Белорусские революционные демократы. Мн., 1977.
7. Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч. 1. 2-е выд. Мн., 1989.
8. Янушкевіч Я. «Чалавек, які нарадзіўся не ў сваю эпоху...»: Новае з перапіскі Францішка Багушэвіча з Янам Карловічам // Шляхам гадоў. Мн., 1990.
9. Содаль У. Кушлянскі кут. Мн., 1990.
10. Содаль У. Сцежкамі Мацея Бурачка. Мн., 1990.

Язэп Янушкевіч

Зыгмунт МІНЕЙКА (Сігізмунд Мінейка-Газдава)

(1840—1925)



Кракаве, у рукапісным аддзеле бібліятэкі Ягелонскага універсітэта пад нумарам 7092 (т. VIII) захоўваюцца восем рукапісных томікаў фармата малой васьмёркі — усяго 1356 старонак. Запоўнены яны выразным «круглым» почыркам. Часам у тэкст уключаны афіцыйныя дакументы, пісьмы розных асоб. Гэта — «Успаміны» нашага земляка, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863 г. у Беларусі Зыгмунта Мінейкі.

Вось што расказаў мне рукапіс пад нумарам 7092 у час адной з камандзіровак у Польскую Народную Рэспубліку.

Зыгмунт Мінейка-Газдава, «літвін з глыбокіх бароў», нарадзіўся ў 1840 г. на Ашмяншчыне, у Балванішках (з 1969 г. Зялёны Бор), што каля Гальшан. Яго бацькі, Станіслаў і Цэцылія, належылі да прагрэсіўна настроенай мясцовай шляхты і выхавалі сваіх дзяцей у духу нянавісці да царскага самаўладства, на традыцыях філарэтаў і філаматаў. У Балванішках праводзіліся вобыскі. Царскія жандары шукалі нелегальную літаратуру, дапытвалі дзяцей. Але хлопчыкі аказаліся стойкімі, свядома ўказвалі на ўяўны след, напрыклад на скрынку з кантрабанднымі сігарамі, якія тут жа канфіскоўваліся заспакоенымі служкамі. Зыгмунт з дзяцінства быў цесна звязаны з чэляддзю, прыгоннымі сялянамі. З жахам і спачуваннем глядзеў ён на прымусовыя рэкруцкія наборы, пагромы ў засценках «шарачковай» шляхты.

Першапачатковую адукацыю Мінейка атрымаў дома. Затым бацькі аддалі яго ў Віленскую гімназію, дзе ён быў таварышам па класу Францішка Багушэвіча (прозвішча беларускага паэта двойчы сустракаецца ў мемуарах з эпітэтам «высакародны»). Вучыўся хлопчык пільна — і каб здабыць

веды, так патрэбныя айчыне, і каб пазбегнуць здзеклівага пакарання розгамі, якога «ўдастойваліся» па суботах усе тыя, хто за тыдзень атрымаў на занятках «нулі». Пасля заканчэння гімназіі Мінейка стаў слухачом інжынернай ваеннай школы ў Пецярбургу. Мундзір афіцэра царскай арміі быў яму ненавісны яшчэ з дзяцінства. Але моладзь тады імкнулася атрымаць ваенную адукацыю, каб у адпаведную хвіліну прыняць дзейсны ўдзел у паўстанні. У Пецярбургу юнак не адчуваў сябе адзінокім: тут, як пісаў ён потым, жыў роднасны «славянскі народ», аднолькава прыгнечаны «крывавым» царызмам. Увайшоўшы ў блізкі кантакт з Балтазарам Каліноўскім, Мінейка дапамагаў яму ў стварэнні нелегальнай студэнцкай бібліятэкі, дзе было многа кніг, забароненых цэнзурай. У іх рана пасталелая моладзь шукала адказу на пытанні, як далей жыць і змагацца.

Вясной 1861 г. да Пецярбурга дайшлі весткі аб першых патрыятычных маніфестацыях у Польшчы, Літве і Беларусі. Спаслаўшыся на хваробу сваякоў, Мінейка перапыніў вучобу і спешна выехаў на радзіму, дзе адразу ж уключыўся ў рэвалюцыйную работу сярод сялянства. Разам з мясцовымі леснікамі ён хадзіў па вёсках, тлумачыў прыгонным, хто іх сапраўдны вораг. Сярод жа шляхты Мінейка стаў вядомы як «апостал» адмены прыгоннага права. Патрыятычны рух ахапіў некалькі парафій — Гальшанскую, Барунскую, Крэўскую і Ашмянскую. Бліжэйшымі паплечнікамі маладога патрыёта былі члены тайнага ашмянскага таварыства «Пянтковічаў» Канстацін Янушэвіч, браты Генрык, Пётр, Якуб і Браніслаў Завадскія, а таксама Валерыян Юсевіч, Ваньковічы, Свянціцкія.

Дзейнасць апранутага ў кадэцкую форму юнака адразу прыкавала ўвагу царскіх шпіёнаў. Як сведчаць матэрыялы, знойдзеныя маскоўскай даследчыцай З.Тальвірскай, агент III аддзялення І.Бярніцкі паведамляў пра яго наступнае: «Ёсць яшчэ адзін небяспечны чалавек, які ходзіць, апрануўшыся селянінам. Разносіць «Гутаркі» і бунтуе народ супраць цара».

Тучы згушчаліся. Ратуючыся ад арыштаў, Мінейка вымушаны быў эміграваць за мяжу. Шлях ляжаў праз Вільню, Ліду, Слонім, Пінск у Галіцыю, а адтуль — у Румынію, Турцыю і Італію. Дабраўшыся да Генуі, ён паступіў у ваенную школу, якая рыхтавала камандзіраў. Потым чакаў адпаведнай хвіліны ў Турцыі, дзе дапамагаў праектаваць першую чыгунку. Урэшце прыйшла доўгачаканая вестка аб пачатку паўстання. У пачатку 1863 г. Мінейка спяшаецца ў Кракаў, адтуль прабіраецца праз рускую граніцу, уліваецца ў паўстанцкую армію Лянгевіча, камандуе атрадам касінераў у бітве пад Грахавіскам. Але Лянгевіч аказаўся не на вышыні. Нібы спалохаўшыся першых перамог, ён расфарміраваў армію, загадаў атрадам ісці ў бок аўстрыйскай граніцы. Злоўлены аўстрыйцамі, Мінейка аказаўся ў кракаўскай турме. Адтуль выйшаў, пераапрануты ў ліўрэю лакея, які прыносіць вязням ахвяраванні арыстакратаў. Зноў удалося ўстанавіць сувязь з прадстаўнікамі Нацыянальнага паўстанцкага

ўрада. Яны далі Мінейку скіраванне ў Літву. Апрануты франтам, ён шчасліва даехаў праз Прусію да Вільні, знайшоў там указаную яўку. Літоўскі аддзел паўстанцкага ўрада прызначыў падрыхтаванага афіцэра ваенным начальнікам Ашмянскага павета.

І вось веснавой ноччу Мінейка зноў прабіраецца ў родныя мясціны. Ён адчувае сябе «магутным і здольным да работы на карысць айчыны». Ён перакананы, што народ ахвотна паўстане да бою, каб «вызваліцца з варварскай няволі», якую асабліва адчувалі сяляне, «прыгнечаныя больш за ўсе іншыя саслоўі». Аднак Мураўёў-вешальнік паспеў ужо дэмаралізаваць край. У лесе каля Гальшан, паміж Міхалоўшчынай і Краснагоркай, Мінейка спадзяваўся застаць некалькі соцень паўстанцаў, знайшоў жа толькі 28 чалавек — астатнія разышліся, сказаўшы, што ім трэба адсеяцца. Не паказаўшы свайго расчаравання, ваенны начальнік пачаў наводзіць дысцыпліну. Найбольш здольных паўстанцаў вучыў на камандзіраў атрадаў. Для сялян заказаў у кузнях некалькі тысяч кос. Паляўнічыя стрэльбы рашыў падоўжыць самаробнымі штыкамі. Планы ў Мінейкі былі вялікія: сабраўшы 10 атрадаў па 40 чалавек, кінуць іх у розныя куткі Ашмяншчыны, абвясціць у павеце паўстанцкую ўладу і ўсеагульную мабілізацыю, потым арганізаваць у Гальшанах агляд павялічаных сіл і разам з іншымі паветамі пайсці штурмам на Вільню, узяць у палон Мураўёва і тым самым выратаваць паўстанне і айчыну. Разлікі рабіліся па ўсіх правілах ваеннага майстэрства.

Аднак намеры радыкальна настроенага камандзіра не прыйшліся даспадобы навакольнай шляхце. Час ішоў, а атрад павялічыўся ўсяго на дзесяць чалавек, і то сумніцельных. Скончыліся скупыя запасы правіянту. На след паўстанцаў напалі царскія войскі. Прыйшлося адступіць у бок Бакштанскіх лясоў, Налібоцкай пушчы. У час паходаў Мацей Баравы (пад такім псеўданімам дзейнічаў Зыгмунт Мінейка) арыентаваўся пры дапамозе нябачанай тут яшчэ «магнітнай іголкі».

15 чэрвеня 1863 г. атрад царскіх войскаў у колькасці ста чалавек нагнаў паўстанцаў у балотах каля вёскі Расолішкі. Нягледзячы на няроўныя сілы Мінейка рашыў прыняць бой. Уздоўж сцежкі, што вяла праз балота, ён расставіў у засадзе найбольш трапных стралкоў. Раздаўся посвіст першых куль. Адна з іх смяротна параніла паўстанца. Гэта выклікала паніку сярод навічкоў. З крыкамі «Уцякайце, уцякайце!» яны кінуліся ўглыб лесу. За імі разбегліся астатнія. На полі бою з зараджанай зброяй у руках застаўся адзін Мінейка. Ратуючы гонар, ён рашыў змагацца да канца. Але змагацца не было з кім. Спалохаўшыся вэрхалу, царскія салдаты таксама адступілі. Мінейка доўга чакаў, пакуль збярэцца яго атрад. Ды нікога не дачакаўся і смяротна змучаны, страшэнна галодны пайшоў шукаць хлеба і часовага прытулку.

Урэшце паказалася хацінка лесніка. Мінейка смела зайшоў у яе,

папрасіў пад'есці. На стале з'явіўся хлеб, кіслае малако. Там часам у дзвярах паказаліся яшчэ два леснікі. Яны вынялі нейкую паперку і папрасілі невядомага госця, каб ён ім прачытаў, што там напісана. Мінейка даверліва згадзіўся. Леснікі ж нечакана схапілі яго за рукі, звязалі вяроўкамі і выдалі царскім уладам, не разумеючы, што паўстанцы змагаліся за іх жа інтарэсы. Зрэшты, гэта быў, падкрэслівае аўтар мемуараў, адзіны на Ашмяншчыне выпадак, калі сяляне выступілі супраць паўстанцаў.

Збітага і хворага Мінейку адвезлі на сялянскай фурманцы ў Ашмяны і тут апазналі як «інсургенцкага начальніка». Пасля чарговай страты прытомнасці змясцілі яго ў шпіталь. Сябры задумалі выкрасці Мінейку з-пад стражы. Але змова раптоўна раскрылася. Вязня паспешліва вывезлі ў кібітцы ў Вільню. Там яго ўжо чакаў загад Мураўёва: пасля выздараўлення — павесіць! І ўсё ж уплывовым сваякам удалося праз хабар змякчыць прыгавор. Павешанне было заменена дванаццацю гадамі катаржных работ у Нерчынскіх шахтах. З віленскай турмы Мінейку разам з іншымі вязнямі ўсіх саслоўяў — у тым ліку жанчынамі — адправілі чыгункай праз Пецярбург у Маскву, а адтуль па этапах у Сібір. Сасланыя на вольнае пасяленне ехалі на фурманках, катаржнікі ж ішлі строем, скаваныя цяжкімі ланцугамі. Па дарозе выгнанцы не гублялі марна часу: устанавілі ўзаемадапамогу, непісьменных вучылі чытаць і пісаць і нават пачалі выпускаць штотыднёвы рукапісны часопіс. Насельніцтва Сібіры спагадліва адносілася да вязняў, бясплатна частавала іх па сваіх хатах, калі Мінейку, выбранаму старастам «партыі», удавалася пад сваю адказнасць звольніць паплечнікаў ад начоўкі ў смуродлівых турэмных станцыях. Па дарозе наш зямляк знаёміўся з бытам сібіракоў, падрабязна апісаным у мемуарах. Пры зручным выпадку ён намераваўся тут узняць узброенае паўстанне, уцячы да мора, а там, захапіўшы карабель, дабрацца да Заходняй Еўропы.

І тут на этапе памёр ад тыфусу шляхціц Струміла, прыгавораны да вольнага пасялення ў Томску. Ён быў вельмі падобны да Мінейкі, таму сябры ўгаварылі апошняга выдаць сябе за нябожчыка. Уяўны Мінейка быў пахаваны каля дарогі, уяўны ж Струміла пасяліўся ў Томску і адкрыў шапачную майстэрню. Але ссыльныя, што прыбывалі з новымі групамі, не ведалі аб гэтай містыфікацыі. Сустрэўшы Мінейку на вуліцы, яны аклікалі яго па ўласнаму імю. Усё гэта было вельмі небяспечна, бо бегламу катаржніку пагражала кнутаванне: некалькі соцень удараў па спіне кнутом — трыма скуранымі раменьчыкамі, у якія былі зашыты алавяныя кулі, што рвалі цела да касцей. Таму разам з двума сябрамі Мінейка рашыў уцякаць у Еўропу. За грошы купіў сабе фальшывы пашпарт. Пераапрануўся селянінам. Каб скрыць нізка абстрыжаныя валасы, сябры глыбей насунулі на вушы шапкі і... адкрыта паехалі на тарантасе па таму ж самаму тракту, па якому яны знясілена крочылі некалькі

месяцаў назад. У Маскве студэнты універсітэта крыху памаглі ім грашыма, далі явачныя адрасы ў Пецярбургу. У сталіцы Мінейку чакала неспадзяванка. Аказваецца, яго маці прыснілася, што яе сын бяздомна блукае на Пецярбургу, і яна, нягледзячы на доказы сваякоў, што так быць не можа, рашыла паслаць праз знаёмую, якая туды якраз ехала, значную суму грошай. Неўзабаве яны аказаліся ў руках здзіўленага юнака.

Маючы грошы, Мінейка адчуваў сябе адважней. Рускія сябры дапамаглі яму атрымаць пашпарт на імя эстонскага барона фон Меберта. Затым удалося дастаць білет на карабель, што ішоў з Кранштадта ў Англію. Такім шляхам Мінейка трапіў у Францыю. Спачатку ніхто з эмігрантаў не паверыў, што яму ўдалося ўцячы з Сібіры. Але потым новыя ўцекачы пацвердзілі яго словы. Мінейка расказаў уладам пра многіх французаў, якія за ўдзел у паўстанні знаходзіліся ў сібірскай катарзе і ссылцы, і тым самым памог іх вызваліць адтуль.

Эміграцыя ў Парыжы жыла думкамі аб новым паўстанні. Рыхтуючыся да яго, Мінейка паступіў у французскую ваенную школу генеральнага штаба. Вучыўся, ледзь не галадаючы. Пасля заканчэння ў 1868 г. спадзяваўся атрымаць адпаведны чын у французскай арміі. Але замест гэтага яму прапанавалі ехаць у Алжыр, каб трымаць у паслушэнстве арабскія землі. Хіба мог згадзіцца на гэта чалавек, які змагаўся за вызваленне сваёй айчыны? Ён так і сказаў камандаванню: «Не стану накладваць путы няволі іншым!» І хаця яму гаварылі гучныя словы аб «цывілізацыйнай місіі» французаў у Алжыры, ён быў непахісны, бо добра ведаў, што на справе гэтая місія зводзілася да звычайнай каланізацыі. Замест Алжыра выехаў у Балгарыю, якая тады стагнала пад турэцкім прыгнётам. Як інжынер Мінейка будаваў там чыгункі, масты, пракладваў каналы, што садзейнічала прагрэсу краіны, набліжала дзень яе вызвалення.

На гэтым мемуары нашага земляка абрываюцца. Але з прац польскіх гісторыкаў, перш за ўсё Элігіюша Казлоўскага, мы можам даведацца шмат чаго пра яго далейшы жыццёвы шлях. У 1870 г. Мінейка зноў узяў зброю ў рукі — на гэты раз, каб абараняць Францыю ад прускага нашэсця, а затым — Турцыя, Грэцыя, пасада галоўнага інжынера правінцый Эпір і Фэсалія. У 1876 г. Мінейка распачаў археалагічныя пошукі славутага старажытнагрэчаскага храма ў Дадоне і неўзабаве знайшоў яго. У 1880 г. апублікаваў сваю этналагічную карту Эпіра. За ўсё гэта, а таксама за шматлікія тапаграфічныя работы парламент прысвоіў яму ў 1910 г. тытул ганаровага грамадзяніна Грэцыі.

Нягледзячы на 72-гадовы ўзрост, Мінейка актыўна ўдзельнічаў у балканскай вайне 1912—1913 гг., скіраванай супраць Турцыі. Па яго планах грэчаская армія, удвая меншая за турэцкую, паспяхова штурмавала горад Салонікі і непрыступную крэпасць Яніна. Аднак лаўры часова дасталіся іншым. І толькі потым праўда выйшла наверх, а

Мінейку ўзнагародзілі Залатым крыжам заслугі.

У 1911, 1922 і 1923 гг. былому катаржніку нарэшце ўдалося тройчы пабываць на радзіме. Віленскаму універсітэту ён падарыў свае калекцыі старажытных манет. У Львоўскім універсітэце быў выбраны ганаровым доктарам. Для таго, каб зберагчы для нашчадкаў «праўду гісторыі», на 85 годзе жыцця Мінейка пачаў пісаць свае «Успаміны», якія якраз і захоўваюцца ў Ягелонскім універсітэце (зусім нядаўна ў скарочаным выглядзе яны былі выдадзены ў Польшчы асобнай кніжкай). Як гісторык паўстання 1863 г. аўтар неаднаразова падкрэслівае, што гэты патрыятычны рух, скіраваны супраць царскага самаўладства, загубіла кансерватыўна настроеная шляхта. Смерць абарвала работу над мемуарамі. Ён памёр 27 снежня 1925 г.

Акрамя «Успамінаў» у бібліятэцы Ягелонскага універсітэта захоўваецца яшчэ 49 сшыткаў, спісаных рукой Мінейкі. Гэта — хроніка першай сусветнай вайны, даследаванні аб прыгнёце, якія цярпелі грэкі з боку туркаў. Усе гэтыя паперы падарылі бібліятэцы жонка Мінейкі Празерпіна і дачка Андрамаха. Дзеці выгнанца так і не вярнуліся на яго радзіму, акліматызаваліся ў Грэцыі. Сын Станіслаў, які памёр у 1924 г., заразіўшыся пры доглядзе хворых, пакінуў пасля сябе некалькі томікаў грэчаскіх вершаў. Дачка Соф'я стала жонкай віднага грэчаскага дзяржаўнага дзеяча Г.Папандрэу.

Не маючы ва ўмовах царскага самаўладства магчымасці працаваць на карысць свайго народа, З.Мінейка працягваў руку дапамогі іншым прыгнечаным народам і таму варты нашай удзячнай памяці.

Літаратура:

1. Клейн Б. От Ошмян до Акрополя // Гродненская правда. 1984. 15 ноября.

2. Клейн Б. Фамильный портрет // Нёман. 1986. № 4. С. 126—143.

3. Мальдзіс А. Аб чым расказваюць мемуары // Бярозка. 1976. № 2. С. 29.

4. Тальвирская З. Создание ошмянской революционной организации и общества «Пентковичей» в 1861—1862 гг. // Ученые записки Института славяноведения. М., 1965. Т. 29. С. 58—61.

5. Juszewicz W. Wspomnienia z lat 1861–1867 // Litwa i Ruś. 1912. T. 10. S. 47–48.

6. Mineyko Zygmunt. Z tajgi pod Akropol: Wspomnienia z lat 1848–1866. Warszawa, 1971.

7. Parandowski I. Wspomnienia i sylwety. Wrocław, 1969.

Адам Мальдзіс

Іван ЯРКОЎСКІ

(1844—1902)

Так атрымалася, што гісторыю навукі мы вывучаем пераважна па імёнах вучоных, вядомых сваімі адкрыццямі, законамі, формуламі. Пры гэтым застаюцца ў цені тыя з прыродазнаўцаў, якія сваёй штодзённай карпатлівай працай спрыялі прыходу новых ведаў. Імёны некаторых з іх вяртаюцца ў аналы гісторыі часам праз стагоддзі. Да іх з поўным правам можна далучыць нашага земляка Івана Яркоўскага — члена Рускага фізіка-хімічнага таварыства, Рускага тэхнічнага таварыства, Таварыства тэхнолагаў у Пецярбурзе.

Яго жыццё — звычайная біяграма кваліфікаванага інжынера: ад майстра чыгуначных майстэрняў да ўпраўляючага буйным заводам, калі б не адна дэталь. Іван Яркоўскі з'яўляецца аўтарам кніг і артыкулаў па атамнай і малекулярнай фізіцы, тэорыі гравітацыі, метэаралогіі і тэорыі паветраплавання. Напрыканцы XIX стагоддзя ён асмеліўся стаць у адзін шэраг з вядомымі вучонымі-фізікамі для рашэння важных навуковых задач.

Нарадзіўся Іван Яркоўскі 12 траўня 1844 года на поўначы Беларусі, у мястэчку Асвея Дрысенскага павета Віцебскай губерні (цяпер г.п. Асвея Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобласці), у збяднелай шляхецкай сям'і Восіпа Яркоўскага і Казіміры са Станкевічаў[1]. Пры хрышчэнні яму было нададзена патройнае імя Іван Тадэвуш Юльян. Яго бацька быў хатнім доктарам у графа Язэпа Шадурскага. Яркоўскія належылі да старажытнага шляхецкага роду герба Корсак. Сваім продкам нашчадкі гэтага шляхецкага дрэва лічылі Мікалая Яркоўскага, якому яшчэ кароль Жыгімонт III дараваў у Наваградскім ваяводстве восем валокаў зямлі.

Маленства І.Яркоўскага прайшло на беразе Асвейскага возера. Хлопчыку было ўсяго тры гады, калі ён страціў бацьку. Застаўшыся практычна без сродкаў на існаванне, яны з маці праз некаторы час перасяляюцца ў Маскву, дзе яна атрымала месца гувернанткі з правам трымаць пры сабе сына.

Пачатковую адукацыю Іван Яркоўскі атрымаў у школе пры Петрапаўлаўскай царкве ў Маскве, а потым на скарбовы кошт быў прыняты ў маскоўскі Александрынскі сіроцкі кадэцкі корпус[2]. Поўны курс навучання тут падзяляўся на тры аддзелы: падрыхтоўчы (тэрмінам 2 гады), агульны (4 гады) і спецыяльны (3 гады). Курсанты атрымлівалі агульнаадукацыйную падрыхтоўку па такіх дысцыплінах, як руская мова і пісьменства, французская і нямецкая мовы, арыфметыка, алгебра, геаметрыя, механіка, астраномія, гісторыя, фізіка, хімія, геаграфія, артылерыя, тактыка, ваенная тапаграфія. Акрамя таго, выкладаліся закон Божы, гімнастыка, фехтаванне, танцы і вершніцтва. З асаблівай цікавасцю Іван Яркоўскі наведваў заняткі па матэматыцы і механіцы. На адным з урокаў ён прапанаваў канструкцыю дальнамера, за што атрымаў пахвалу настаўніка, а вялікі князь Міхаіл Мікалаевіч падараваў яму залаты гадзіннік.

У 1862 годзе Іван Яркоўскі ў чыне прапаршчыка артылерыі быў накіраваны на Каўказ. Спачатку ў Пятроўску, а потым у Цямір-Хан-Шуры ён праслужыў шэсць гадоў. Аднак вайсковая служба не магла задаволіць яго дапытлівага розуму. Ён марыў прадоўжыць сваю адукацыю і наважыўся паступіць у Ваенна-інжынерную акадэмію. Аднак з прычынаў, якія ад яго не залежылі, гэтыя намеры не ажыццявіліся. У 1868 г. І.Яркоўскі пакідае вайсковую службу і паступае на механічнае аддзяленне ў С.-Пецярбургскі практычны тэхналагічны інстытут. Пэўную ролю ў выбары вышэйшай навучальнай установы адыграла не толькі любоў да тэхнікі. Істотным стаў і грашовы бок справы: плата за навучанне ў Тэхналагічным інстытуце была меншая, чым у прэстыжных Маскоўскім і Пецярбургскім універсітэтах.

У канцы 60-х гадоў тут выкладалі маладыя вучоныя: Дз.Мендзялееў, Р.Ленц, П.Петрушэўскі. Інстытут даваў вучням добрую магчымасць для самастойных даследаванняў. Машынны дом, механічная, сталярная, ліцейная майстэрні былі адчыненыя для студэнтаў увесь вольны ад тэарэтычных заняткаў час. Правесці самастойнае даследаванне электрычных і аптычных з'яў, хімічных пераўтварэнняў дазвалялі фізічныя і хімічныя лабараторыі, забяспечаныя сучаснымі прыладамі і абсталяваннем. У час вучобы ў інстытуце І.Яркоўскі выдае сваю першую работу — табліцу множання да 1000, якая пры адсутнасці вылічальных лінеек і арытмометраў уяўляла сабой вялікую значнасць[3].

Улетку 1870 года Іван Яркоўскі, здаўшы многія курсы экстэрнам,

скончыў інстытут з дыпломам тэхнолага 1-га разраду і атрымаў прапанову Навучальнага камітэта інстытута застацца на год для падрыхтоўкі дыпломнага праекта і атрымання кваліфікацыі інжынера-тэхнолага[4]. Аднак складанае матэрыяльнае становішча не дазволіла яму прыняць гэтую прапанову. Намаганнямі Імператарскага Тэхнічнага таварыства І.Яркоўскі ўладкоўваецца на адзін з пецярбургскіх заводаў для практычнага вывучэння справы. Потым па даручэнню прыватнай фірмы едзе ў Берлін і на працягу некалькіх месяцаў знаёміцца з машынабудаўнічымі заводамі Шварцкопфа і Борзінга. Увосень 1870 года ён паступае на Кіеўска-Брэсцкую чыгунку, дзе працуе спачатку памочнікам машыніста, а потым начальнікам дэпо ў Казаціне.

На пачатку 1872 года І.Яркоўскі вяртаецца ў Пецярбург і ўжо ў траўні паспяхова абараняе дысертацыйную працу «Праект машыны для водазабеспячэння і тэарэтычнае даследаванне механізма»[5] і атрымоўвае кваліфікацыю інжынера-тэхнолага. Для павышэння прафесійных ведаў па рэкамендацыі Навучальнага камітэта Тэхналагічным інстытутам І.Яркоўскі камандзіруецца на стажыроўку за мяжу тэрмінам на два гады.

Жыццё паступова наладжвалася. У ліпені 1872 года І.Яркоўскі бярэ шлюб з Аленай Шэндзікоўскай — дачкой шляхціца Менскай губерні Аляксандра Шэндзікоўскага[6] — і з ёю ад'язджае за мяжу.

Пазнаёміўшыся з работай механічных заводаў Нямеччыны, Бельгіі і Францыі, І.Яркоўскі вяртаецца ў Пецярбург і дае падрабязную справаздачу аб сваёй паездцы ў Навучальны камітэт Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. У скарочаным выглядзе гэтая справаздача пад назвам «Некаторыя спосабы, што дастасоўваюцца замежнымі фабрыкамі ў праектаванні і пабудове паравозаў» была надрукавана ў «Часопісе Міністэрства шляхоў зносін»[7].

Пад канец 1873 года І.Яркоўскі паступае на Маскоўска-Брэсцкую чыгунку ў Мінск на пасаду зборнага майстра чыгуначных майстэрняў[8]. Праз год ён атрымаў павышэнне па службе і быў пераведзены ў Смаленск на пасаду начальніка дэпо. У 1876 годзе І.Яркоўскі быў прызначаны начальнікам вагонных майстэрняў, а потым начальнікам усіх маскоўскіх майстэрняў той жа Маскоўска-Брэсцкай чыгункі. Тут ён праслужыў амаль дваццаць гадоў.

Першыя гады самастойнай працы шмат далі для прафесійнага росту. Да гэтага часу належаць першыя са шматлікіх прапанаваных ім тэхнічных удасканаленняў і рацыяналізатарскіх прапаноў. У асяроддзі тэхнічнай інтэлігенцыі І.Яркоўскі атрымаў вядомасць як аўтар праекта машыны для водазабеспячэння заводаў і горада, канструкцый печаў для спальванняў нечыстотаў, ён прапанаваў нафтавае паліва для зварачнай печы.

Нешматлікія вольныя гадзіны ён прысвячае навуковым пытанням.

Перыяд жыцця ў Маскве, з 1874 да 1894 года, быў часам станаўлення І.Яркоўскага як вучонага. Яго навуковыя погляды фарміраваліся пад уплывам навуковых канцэпцый і тэорый XIX стагоддзя. Дыскусіі пасля апублікавання «Паходжання відаў» Ч.Дарвіна (1859), адкрыццё перыядычнага закону (1869) і распрацоўка тэорыі хімічнай будовы рэчыва, стварэнне тэорыі электрамагнітнага поля (1865—1873) паклалі пачатак новаму перыяду ў гісторыі прыродазнаўства, спрыялі ўмацаванню дыялектычнага разумення з'яваў прыроды. Было відавочна, што механічная карціна свету, прапанаваная механікай Ньютана, паступова разбуралася. На змену ёй павінна была прыйсці новая, здольная даць несупярэчлівае тлумачэнне аптычным і электрамагнітным з'явам.

Цікавыя і таямнічыя фізічныя з'явы не пакінулі абыякавым І.Яркоўскага. Знаёмства з навуковымі працамі сусветна вядомых фізікаў дазволіла яму сфармаваць сваё стаўленне да тых складаных фізікахімічных працэсаў і з'яваў, якія былі вядомыя ў другой палове XIX стагоддзя. Пры канцы 70-х гадоў у выніку шматгадовай тэарэтычнай працы і разважанняў ён прапанаваў «кінетычную» гіпотэзу і, абапіраючыся на ідэю пра існаванне матэрыяльнага эфіру [9], паспрабаваў стварыць мадэль Свету з яго складанымі фізічна-хімічнымі з'явамі, даў з'явам прыроды кінетычнае тлумачэнне на аснове руху і ўзаемадзеяння атамаў гэтага эфіру. Яна была не фантазіяй, а плёнам упэўненасці аўтара ў адзінстве свету, які акружае нас, і як вынік — у неабходнасці існавання адзінай тэорыі для апісання складаных з'яваў і працэсаў. Высновы, атрыманыя аўтарам, былі пададзены ў выглядзе філасофскага спалучэння разрозненых навуковых ідэй, выказаных раней у дачыненні да розных з'яваў прыроды. Два светы — сусвету і мікрачасцінак — абумоўлены сваім існаваннем, на думку вучонага, непарыўным рухам атамаў эфіру. Утварэнне ўстойлівых структур як на элементарным узроўні, так і на ўзроўні Галактыкі тлумачылася абменным узаемадзеяннем атамаў эфіру з фізічнымі атамамі цела. Па сутнасці, «кінетычная» гіпотэза Яркоўскага была праграмай аб'яднання гравітацыйных і электрамагнітных палёў на падставе ўяўлення аб эфіры.

Ужо ўлетку 1888 года праца І.Яркоўскага «Сусветнае прыцягненне як вынік утварэння важкай матэрыі ўнутры нябесных целаў. Кінетычная гіпотэза» з'явілася ў друку — спачатку на французскай мове. «Калі я буду настолькі шчаслівы, што маю кнігу прачытаюць, што яна выкліча спрэчкі, нават калі мае ідэі і адвергнуць, то й тады мае намаганні не будуць дарэмныя, мой час не будзе страчаны, бо для доказу, што я не маю рацыі, неабходна будзе працаваць у тым кірунку, які да гэтага часу быў занядбаны, і, такім чынам, навуковым даследаванням будзе дадзены новы штуршок». Гэтымі словамі І.Яркоўскі закончыў прадмову да сваёй першай кнігі «Hypothese cinetique de la gravitation universelle, en connexion

avec formation des elements chimiques» (СПб., 1888). У 1889 годзе ў пашыраным і дапрацаваным выглядзе яна выйшла на рускай мове.

Трыста паасобнікаў першага выдання сваёй кнігі ён даслаў вядучым вучоным свету і атрымаў водгукі ад добрай паловы адрасатаў, у тым ліку Дз.Мендзялеева, К.Крукса, Г.Тамана. Гэта само па сабе было неблагой рэкамендацыяй: вучоныя рэдка прымалі ўсур'ёз тры глыбінныя праблемы стварэння Сусвету, напісаныя неспецыялістамі. Але толькі ў нашым часе стала відавочна, колькі пытанняў, актуальных і цяпер, узняў у сваіх навуковых працах І.Яркоўскі. Нясмелы чалавек, відавочна, ніколі б не адважыўся выказаць адразу столькі рызыкоўных гіпотэз і меркаванняў, што значна апярэджвалі свой час, колькі іх ёсць у працах І.Яркоўскага[10]. І.Яркоўскі прадказвае ўзаемнае пераўтварэнне хімічных элементаў і неэлементарнасць атамаў, высоўвае меркаванне, што перыядычнасць ва ўласцівасцях хімічных элементаў вызначаецца падабенствам іх атамных абалонак, якія ўтрымліваюць ці чатыры, ці дзесяць часцінак. У ягоных разважаннях можна ўгледзець апісанне радыёактыўнага распаду, існаванне нейтрына. Было б перабольшаннем сцвярджаць, што даследчык усё гэта прадбачыў. Але ніхто не стане адмаўляць, што падобныя здагадкі ў гісторыі навукі неаднойчы стымулявалі адкрыцці фундаментальнага значэння.

У якасці зыходнага прынцыпу І.Яркоўскі, далучыўшыся да прыхільнікаў атамістычнай будовы матэрыі, разглядаў эфір не суцэльным. Атам эфіру разглядаўся як «найпрасцейшая, надзвычай малая, цалкам цвёрдая часцінка матэрыі, якая не валодае ніякімі ўласцівасцямі і сіламі, акрамя прыцягнення, непранікальнасці і інерцыі», атамы былі падзелены паміж сабой выключна пустэчай. Ён прыпісваў часцінкам эфіру здольнасць зрастацца пры поўным ціску ў атамы звычайных элементаў. Паводле гіпотэзы І.Яркоўскага, цвёрдыя атамы, з якіх складаюцца ўсе целы, мала адрозніваюцца паміж сабой вагой, форма іх сферычная. Яны не застылыя, а ўвесь час рухаюцца. Прычым для апісання гэтага руху падыходзяць законы адзінай вядомай тады класічнай механікі. «Няма прычын меркаваць, што атамы толькі дзеля сваёй малечыні будуць падпарадкоўвацца іншым законам, чым тыя, пра якія нам кажа механіка», — пісаў ён у 1888 годзе, калі яшчэ не былі адкрытыя ні электрон, ні кванты электрамагнітнага поля. Аднак меркаванне пра тое, што атамы не абавязаны быць непадзельнымі, лунала ў асмасферы дыскусій. І.Яркоўскі акуратна спасылаецца на сваіх папярэднікаў, але тэзіс пра падзельнасць атамаў распрацоўвае з такой паслядоўнасцю, якой мала хто з іх дасягаў.

Абапіраючыся на «кінетычную гіпотэзу», І.Яркоўскі прапанаваў тлумачэнне сусветнага прыцягнення. Сілу цяжару ён разглядаў як вынік існавання накіраванага руху частак эфіру і яго «усмоктвання» (паглынання)

праз паверхню любых целаў. Ступень ушчыльнення эфіру залежыць ад нутраной будовы цела і яго памераў і максімальная ў цэнтры цела, бо паглынанне ідзе з усіх бакоў. Ён вывеў формулу закона сусветнага прыцягнення, якая адрознівалася ад ньютанаўскай толькі пераменным значэннем каэфіцыента спамернасці. «Тое, што мы называем прыцягненнем Зямлі, — пісаў вучоны, — спамернае масе цела m, адваротна спамернае квадратам адлегласцяў R і залежыць ад некаторай велічыні C, якая выражае той ціск, тое імкненне да цэнтра, якому падвергнута адзінка масы, што знаходзіцца на адзінцы адлегласці ад цэнтра Зямлі. Прыняўшы ўсё гэта да ўвагі, сіла F адлюстроўваецца наступнай формулай:

$$F = \frac{mC}{R^2},$$

дзе C знаходзіцца ў залежнасці ад нутраной будовы рэчыва, з якога складаецца Зямля, ад энергіі эфіру і ад памераў Зямлі, але ў якіх стасунках, мы пакуль не ведаем».

У формуле Ньютана прыцягненне спамернае мае Зямля, якая ўваходзіць у формулу ў яўным выглядзе. У І.Яркоўскага падобнай залежнасці не было, бо прыцягненне залежыла ад колькасці эфіру, якую Зямля здольная паглынуць за адзінку часу. Істотная розніца паміж двума поглядамі на прыроду прыцягнення была ў тым, што ў першым разе яно — уласцівасць матэрыі, у другім — вынік імкнення целаў да Зямлі пад уздзеяннем плыні эфіру, які ёю паглынаецца[11]. Высновы І.Яркоўскага не супярэчылі найважнейшай асаблівасці поля прыцягнення, вядомай з Ньютанавай тэорыі і пакладзенай А.Эйнштэйнам у аснову тэорыі рэлятыўнасці, пра тое, што прыцягненне абсалютна аднолькавае для розных целаў і дае ім аднолькавае паскарэнне — паскарэнне свабоднага падзення — незалежна ад іх масы, хімічнага складу.

У 1903 годзе Л.Цэннек — аўтар вядомага агляду па праблеме прыцягнення, надрукаванага ў «Encyklopedie der Mathematischen Wissenschaften», прапанаваў класіфікацыю эфірна-механічных гіпотэзаў аб прыродзе прыцягнення. Імя І.Яркоўскага ў ім згадвалася побач з імёнамі вядомых фізікаў Г.Гельмгольца, У.Томсана, а кінетычным гіпотэзам аддавалася перавага ў параўнанні з гідрастатычнымі і эфірна-хвалевымі.

На пачатку 90-х гадоў на падставе кінетычнай гіпотэзы вучоны прапанаваў тэарэтычную канцэпцыю будовы матэрыі, перыядычнасці хімічных элементаў і іх фізіка-хімічных уласцівасцей, скарыстаў асноўныя яе палажэнні для аналізу прычынаў існавання матэрыі ў розных агрэгатных станах (цвёрдым, вадкім, газападобным). Гэтыя вынікі былі абагульнены ім у кнізе «Будова матэрыі і малекулярныя сілы», якая

выйшла ў С.-Пецярбурзе ў 1894 годзе.

Паводле гіпотэзы вучонага, атам кожнага рэчыва складаецца з атамаў эфіру. Атамы злучаюцца ў малекулы, якія маюць характэрныя формы і памеры. Разважаючы над праблемай міжмалекулярных узаемадзеянняў, ён выкарыстоўвае такія паняцці, як «фізічны атам» і «агрэгат дадзенага стану», міжмалекулярныя ўзаемадзеянні тлумачыць рухам атамаў эфіру ў міжмалекулярных прамежках. Кожнаму стану, лічыў І.Яркоўскі, адпавядаюць агрэгаты, якія адыгрываюць ролю атамаў стану дадзенага цела. «Падобна атаму ці, лепш, малекуле, якая з'яўляецца найменшай часцінкай матэрыі і якая можа існаваць у прыродзе і характарызаваць хімічныя ўласцівасці дадзенага цела, гэтыя агрэгаты з'яўляюцца найменшымі часцінкамі, якія характарызуюць цвёрды і вадкі стан вядомага хімічнага элемента. Яны, калі можна так сказаць, уяўляюць фізічныя атамы гэтага стану». За фізічны атам газападобнага стану прымалася малекула. Пры пераходзе ў вадкі стан малекулы злучаюцца ў групы. Групы малекул даследчык разглядае як нешта цэласнае, непадзельнае, што ўдзельнічае ў цеплавым руху. Прычым зыходныя малекулы ў фізічным атаме вадкасці знаходзяцца ў стацыянарным стане і не бяруць удзелу ў цеплавым руху.

Калі цела пераходзіць з вадкага стану ў цвёрды, то зноў некалькі такіх групаў спалучаюцца ў новы агрэгат — фізічны атам цвёрдага цела. «...Часцінкі матэрыі ў цвёрдым целе ўяўляюць не іначай як у выглядзе агрэгатаў крышталічнай формы, значыцца, абмежаваных роўніцамі. Роўніцы гэтыя, ці грані, не суцэльныя; як і ўсе часцінкі, яны ўтвораныя з укладзеных адна пры адной драбнейшых часцінак, паміж якімі ўтвараюцца прамежкі, што працінаюць усю часцінку ў выглядзе каналаў няправільнай формы і даступныя ва ўсялякім разе для пранікнення атамаў эфіру, якія сваёй велічынёю значна драбнейшыя...». Пры пераходзе ад цвёрдага стану да газападобнага павялічваецца нутраны аб'ём целаў, запоўнены атамамі эфіру[12]. Такі погляд на будову цвёрдых целаў дазваляе вельмі проста растлумачыць такія з'явы, як механічныя і тэрмічныя дэфармацыі.

Прайшоў час і ўяўленні І.Яркоўскага пра тое, што міжмалекулярныя сілы абумоўлены абменным узаемадзеяннем атамаў эфіру з фізічнымі агрэгатамі цела, набылі сёння новае гучанне на падставе квантавамеханічных уяўленняў. Сучасныя даследаванні паказалі, што міжмалекулярныя ўзаемадзеянні ў значнай ступені абумоўлены пераносам электронаў ад адной малекулы да другой.

Пасля адкрыцця Дз.Мендзялеевым перыядычнага закону пытанне пра адзінства матэрыі заставалася дыскусійным. Адны вучоныя былі прыхільнікамі адзінства матэрыі. Некаторыя, у тым ліку і Дз.Мендзялееў, называлі ідэю адзінства матэрыі ўтопіяй. І.Яркоўскі лічыў,

што перыядычны закон не толькі не супярэчыць адзінству матэрыі, але, наадварот, «складае адзін з самых важных аргументаў пацвярджэння яго(адзінства) існавання».

Калі дапусціць, што кожны з элементаў існуе сам па сабе, незалежна ад другога, то дзе шукаць прычыны той сувязі, якая выразна праявілася ў перыядычнай сістэме Мендзялеева і якая гэтак бліскуча пацвердзілася адкрыццём галію, германію, скандзію і іншых элементаў, ім прадказаных? Як растлумачыць магчымасці існавання невядомых элементаў, калі паміж імі няма сувязі, няма стасункаў? Але калі гэтыя стасункі існуюць, то на чым яны палягаюць? Вось тыя пытанні, на якія паспрабаваў даць адказ І.Яркоўскі.

Перыядычнасць элементаў і іх фізіка-хімічных уласцівасцяў І.Яркоўскі ілюструе з дапамогай мадэлі крышталікаў. Паводле гэтай мадэлі адрозненне паміж крышталікамі залежыць ад трох зменных:

1) колькасці складовых часцінак — атамаў першапачатковай матэрыі; 2) формы, у якую яны згрупаваліся; 3) колькасць «схаванай» энергіі атамаў. Пры іх падзеле ўтвараюцца крышталі іншай формы, іншай вагі, а значыць, і іншых хімічных уласцівасцяў[13]. У якасці найменшага з магчымых крышталікаў ён выдзяляў той, для расшчаплення якога «трэба надзвычай вялікае намаганне». І падкрэсліваў удакладненне, што «цалкам непадзельных крышталікаў у прыродзе не існуе». Ці гэта не зародак ідэі радыёактыўнага пераўтварэння атамных ядраў? Магчымасць выпраменьвання целам энергіі дзякуючы яго нутраной будове, якую прадбачыў І.Яркоўскі, пацвердзіцца праз гады адкрыццём радыёактыўнасці.

На думку І.Яркоўскага, «асноўных целаў, з якіх складаюцца ўсе элементы, не адно, а некалькі; яны адно ў другое ўжо пераходзіць не могуць, гэта значыць, з крышталікам аднаго з іх ніякім чынам вы не здолееце атрымаць крышталік іншага цела. Канструкцыя гэтых найменшых крышталікаў настолькі простая, што яны раскладваюцца на «атамы першапачатковай матэрыі»[14].

Для пацвярджэння такой цікавай высновы ён звяртаецца да геаметрычнай ілюстрацыі, прыпісваючы крышталікам найбольш простыя і ўстойлівыя геаметрычныя формы: куб, тэтраэдр і актаэдр. «Калі вы захочаце пабудаваць з атама першапачатковай матэрыі больш складаныя малекулы, — пісаў І.Яркоўскі, — то будзеце мець у сваім распара-джэнні вядомую колькасць формаў для пэўнай колькасці атамаў. З 4 атамаў, напрыклад, вы можаце стварыць шмат формаў, з якіх толькі адна — тэтраэдр — больш устойлівая, чым іншыя. Падобныя формы з 5, 6, 7, 8, 9 атамаў зрабіць нельга. Яна можа з'явіцца толькі пры 10 атамах. Форма малекулаў будзе той жа, але лінейныя памеры будуць іншыя. Паколькі ад формы малекулы залежыць фізічна-хімічная ўласцівасць целаў, то, верагодна, целы, якія складаюцца з 10 атамаў у малекуле, будуць мець

падобныя ўласцівасці з целам, якое складаецца з 4 атамаў у малекуле. Хіба ў гэтым не бачна прычына перыядычнасці? Гэтае дапушчэнне таксама зразумела тлумачыць, чаму пры пераходзе ад аднаго элемента да другога іх фізічна-хімічныя ўласцівасці не ўяўляюць паступовага пераходу, а змяняюцца скачком». Складаныя фізічныя элементы ўтвараюцца пры злучэнні некалькіх крышталікаў. Прычым, калі атамная вага першага асноўнага элемента пазначана праз a, а другога — праз b, то атамная вага новага элемента будзе кратнай $na+mb$. Такое мадэльнае ўяўленне, на думку І.Яркоўскага, магло служыць ключом для разгадкі залежнасці паміж атамнымі вагамі элементаў.

Меркаванні пра тое, што перыядычнасць фізічна-хімічных уласцівасцей элементаў вызначаецца падабенствам атамных структур, знайшлі пацвярджэнне ў законе перыядычнай будовы атамных абалонак. Перыядычнасць абумоўлена паслядоўным запаўненнем электронных абалонак, што фактычна пацвярджае здагадкі І.Яркоўскага.

У кастрычніку 1889 года І.Яркоўскі звяртаецца ў Дэпартамент гандлю і мануфактураў, каб яны выдалі прывілей на вынаходствы спецыяльнай сістэмы пераўтваральніка (рухавік, які пераўтвараў цеплавую энергію вадзяной пары ў механічную работу), якую ён атрымаў праз два гады, 7 лістапада 1891 года. Ідэя І.Яркоўскага была ўдасканаленая расійскім інжынерам В.Шухавым у 1893 годзе і ўжо на пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя вадатрубныя паравыя катлы былі даведзеныя да высокай ступені дасканаласці.

Акрамя таго, вучоны праводзіў цікавыя даследаванні па выбару аптымальных параметраў змазачных маслаў і даследаваў уплыў розных гатункаў масла на зніжэнне затрат пры трэнні. Вядома, што ён сканструяваў прыстасаванне для вымярэння паскарэння свабоднага падзення, якому даў назву «графітаскоп». Гэтае прыстасаванне з поспехам была ім выкарыстана 7 жніўня 1887 года — пад час поўнага сонечнага зацьмення — для ўстанаўлення ўплыву руху планет на велічыню сілы цяжару.

У 1893 годзе, пад час падарожжа ў Злучаныя Штаты Амерыкі — на Сусветную выставу ў Чыкага, І.Яркоўскаму давялося сутыкнуцца з акіянскай стыхіяй. Стоячы на палубе парахода і назіраючы вялізныя хвалі, ён задаецца думкай утылізаваць іх «жыццёвую сілу» для руху парахода, каб зрабіць больш танным яго рух. Вярнуўшыся з падарожжа, пачынае ствараць мадэль такога «хваляхода». Наіўная па сённяшніх мерках ідэя набывае рэальнае гучанне ў задуме скарыстаць такі «хваляход» для пераўтварэння энергіі хваляў у электрычную энергію.

Адным з цікавых навуковых накірункаў, які здаўна прыцягваў да сябе ўвагу вучоных, была метэаралогія. У другой палове XIX стагоддзя яна знаходзілася на парозе тэарэтычнага абагульнення. Асноўная ўвага даследчыкаў была засяроджана, галоўным чынам, на зборы звестак пра

атмасферныя з'явы. На ўсёй тэрыторыі тагачаснай Расіі Галоўная фізічная абсерваторыя арганізавала шырокую сетку метэаралагічных станцый. На тэрыторыі Беларусі такіх станцый было больш за трыццаць. Яны сістэматычна праводзілі разнастайныя назіранні стану атмасферы: ціску, вільготнасці і тэмпературы паветра, кірунку і сілы ветру, колькасці ападкаў, рабіліся замеры вільготнасці глебы, вызначаліся таўшчыня і асаблівасці снежнага покрыва.

Метэаралогія зацікавіла даследчыка яшчэ ў студэнцкія гады. Ён пачаў са сціплых назіранняў зменаў атмасфернага ціску, і для рэгістрацыі малых яго адхіленняў І.Яркоўскі сканструяваў прыладу, скарыстаўшы ідэю дыферэнцыйнага барометра Дз.Мендзялеева[15]. З часам цікавасць да вонкавых праяўленняў метэаралагічных з'яў перарасла ў жаданне знайсці іх прычыны, убачыць узаемасувязь.

Вялікая колькасць фактычнага матэрыялу аб метэаралагічных з'явах, апублікаваная ў шматлікіх артыкулах у «Запісках» і «Весцях» Расійскага геаграфічнага таварыства, «Метэаралагічным весніку», вымагала аналізу і абагульнення, вызначэння прычын і заканамернасцяў у іх зменах. Свой погляд на прыроду некаторых з іх выказаў І.Яркоўскі, скарыстаўшы для тлумачэння метэаралагічных з'яў асноўныя палажэнні «кінетычнай гіпотэзы». У прыватнасці, ён упершыню паказаў змены, што суправаджаюць выпадзенне ападкаў, сувязь паміж атмасферным ціскам і сутычным ходам магнітнага нахілу, якія патрабавалі далейшага даследавання. «Мая гіпотэза, — любіў паўтараць І.Яркоўскі, — прыходзіць на дапамогу толькі ў тых выпадках, дзе з'явы прыроды не могуць быць растлумачаныя ніякім чынам без парушэння асноўных законаў фізікі. Мая гіпотэза дае магчымасць вытлумачыць змяненне бараметрычнага ціску, мінуючы ўплыў вільготнасці і тэмпературы».

Заняткі метэаралогіяй, спроба даць тэарэтычнае асэнсаванне фізічным працэсам, якія адбываюцца ў паветраных слаях, стымулявалі цікавасць І.Яркоўскага да яшчэ аднаго навуковага кірунку — да аэрадынамікі.

Ягоная цікавасць да гэтай праблемы шмат у чым была абумоўленая знаёмствам з Мікалаем Жукоўскім — чалавекам, які стаяў каля вытокаў расійскага самалётабудавання, распрацаваў метады аэрадынамічнага і трываласнага разліку самалётных канструкцый. Эксперыментальным шляхам І.Яркоўскі знайшоў залежнасць супраціўлення паветра ад плошчы крылаў, вугла нахілу і хуткасці руху і вывеў формулу для разліку аэрадынамічнага супраціўлення і пад'ёмнай сілы, падобную да формул М.Жукоўскага.

Ці можа чалавек лятаць, як птушка, рухаючы які-небудзь механізм сілаю сваіх мускулаў? Адказ І.Яркоўскага быў адназначны: такі рух неверагодны. Вучоны прыходзіць да высновы, што паветраплаванне з да-

памогай машыны, бясспрэчна, магчымае, але ў сучасны момант пакуль не хапае магутнага і лёгкага рухавіка. Менавіта ў гэты бок, на яго думку, вучоныя павінны скіраваць свае намаганні, каб развязаць пытанні паветраплавання. Выступаючы 9 ліпеня 1889 года на пасяджэнні фізічнага аддзела Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Маскоўскім універсітэце ён адзначаў: «Я ўпэўнены, што паветраплаванне можа быць дасягнутае не шляхам натхнення ці дасціпнай здагадкі, а шляхам упартай працы і даследавання ў розных галінах нашых ведаў. Вырашэнне гэтых пытанняў не будзе належаць аднаму чалавеку, яно будзе залежаць ад сукупнасці працаў многіх людзей розных спецыяльнасцяў».

Акрамя вышэй згаданых праблем даследчык абмяркоўваў арыгінальныя гіпотэзы эвалюцыі зорак, зямнога магнетызму, вулканічнай дзейнасці і пытанне, ці можна лічыць сусветную прастору пустэчай. Няўмольная логіка інжынера І.Яркоўскага ставіла пытанні, адказы на многія з іх навука шукае яшчэ і сёння.

У 1894 годзе І.Яркоўскі пакідае службу на Маскоўска-Брэсцкай чыгунцы і пераязджае з сям'ёй у Пецярбург, дзе займае пасаду кіраўніка Неўскім механічным і суднабудаўнічым заводам. Пад час трохгадовай службы ён стараецца ўпарадкаваць вытворчасць і ўзняць прыбытак гэтага буйнога, але аслабелага тады прадпрыемства, што яму ўдаецца.

Праз тры гады, у 1897 годзе, І.Яркоўскі прымае запрашэнне Акцыянернага таварыства Мальцава і ў чэрвені з'язджае з Пецярбурга ў Арлоўскую губерню, у вёску Дзядзькава, на пасаду памочніка галоўнага кіраўніка заводамі «з заробкам 8 тысяч рублёў на год пры гатовай кватэры ... для рэарганізацыі дзейных заводаў і ўдасканалення арганізацыі вытворчасці». Тут, у правінцыі, ён і пражыў апошнія пяць гадоў.

Нягледзячы на аддаленасць вялікіх навуковых цэнтраў, І.Яркоўскі працягвае працаваць над дапаўненнем і абагульненнем сваіх навуковых прац. Ён мае намер выдаць іх на расійскай, польскай і нямецкай мовах.

У 1901 годзе дактары параілі яму паехаць за мяжу лячыцца (у І.Яркоўскага была саркома). Некалькі месяцаў І.Яркоўскі правёў у Баварыі, у Верысгофэне, затым у кастрычніку яго перавезлі ў Гайдэльберг. Нягледзячы на хваробу, ён да апошніх дзён падтрымліваў творчую актыўнасць. Адчуваючы блізкасць смерці, ён выказаў шкадаванне, што не ўдалося давесці да канца свае намаганні па стварэнню агульнай карціны Сусвету.

Памёр І.Яркоўскі 21(9) студзеня 1902 года ў Акадэмічным шпіталі нямецкага горада Гайдэльберга. Смерць напаткала вучонага

пры падрыхтоўцы другога выдання кнігі «Сусветнае прыцягненне». Яна ўбачыла свет у 1912 годзе пры ўдзеле Таварыства тэхнолагаў пад рэдакцыяй яго сыноў Вітаўта і Уладзіслава. Грошы, атрыманыя ад яе продаж, пайшлі на стварэнне фонду спрыяння вынаходніцкай дзейнасці імя І.Яркоўскага.

Доўгім і зусім не простым склаўся шлях да ўразумення праблемаў такога маштабу, якія былі высунуты логікай інжынера Яркоўскага, і далёка не ў літаральным сэнсе збываюцца прагнозы тых, хто разважаў над імі ў мінулым. Але ўсё ж у гісторыі навукі ёсць месца не толькі для таго, хто знаходзіць канчатковыя развязкі, але і для таго, хто ставіць пытанні і імкнецца адказаць на іх. Спасціжэнне гармоніі сусвету, у якую так верыў стагоддзе таму ўраджэнец Беларусі Іван Яркоўскі, працягваецца.

Спасылкі:

[1] Матэрыялы падрыхтаваны пры выкарыстанні дакументаў, якія захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве (Ф. 319, воп. 1, спр. 351, а. 425—426; спр. 332, а. 70; спр. 1045, а. 22; спр. 1169, аа. 58—59; воп. 2, спр. 3775, аа. 1— 54, 68—74, 112—115, 154—156), Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве С.-Пецярбурга (ф. 492, воп. 2, спр. 2083, а. 65; спр. 4341, аа. 2—15; ф. 478, воп. 14, спр. 356, а. 278; ф. 492, воп. 2, спр. 4342, аа. 1, 2, 6, 16; спр. 6897, аа. 26, 30, 31—37); Дзяржаўным архіве Бранскай вобласці (ф. 105, воп. 1, спр. 230, аа. 18, 21, 49; воп. 2, спр. 1, а. 3; воп. 3, спр. 31, аа. 70, 95); Ваенна-гістарычным архіве ў Маскве, гарадскім архіве Гайдэльберга (Германія).

[2] Кадэцкі корпус — сярэдняя прывілеяваная вайсковая навучальная ўстанова для падрыхтоўкі дваранскіх дзяцей да вайсковай службы. Заснавана ў 1732 г.

[3] Ярковский И. Таблица умножения. СПб., 1868.

[4] Чатырохгадовы план навучання ў С.-Пецярбургскім тэхналагічным інстытуце не прадугледжваў часу на падрыхтоўку дыпломнага праекта. Таму выпускнікам інстытута, якія скончылі яго, атрымаўшы дыплом «тэхнолага 1-га разраду», давалася права заставацца ў інстытуце яшчэ на адзін год для падрыхтоўкі дысертацыі «па якім-небудзь тэхнічным пытанні, якое мае важнае значэнне ў прамысловасці».

[5] Адзін з двухсот літаграфаваных паасобнікаў гэтае працы захаваўся да сённяшняга часу ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Пецярбургу.

[6] Шандзікоўскія таксама належылі да старога шляхецкага роду і

мелі маёнтак Астраўкі ў Ігуменскім павеце Менскай губерні. Маршалкам мясцовай шляхты тут быў Антон Наркевіча-Ёдка — бацька таленавітага беларускага прыродазнаўца Якуба Наркевіча-Ёдкі (пра яго гл.: Грыбкоўскі В.П., Гапоненка В.А., Кісялёў У.М. Прафесар электраграфіі і магнетызму. Мн., 1988 (серыя «Нашы славутыя землякі»)). Улічваючы адзінства інтарэсаў І.Яркоўскага і Я.Наркевіча-Ёдкі, з вялікаю ступенню верагоднасці можна выказаць меркаванне, што яны ведалі адзін аднаго.

[7] Журнал Министерства путей сообщения. 1879. Т. 2, кн. 1. С. 68—99; Т. 2, кн. 2. С. 401—419.

[8] На базе майстэрняў створаны Менскі вагонарамонтны завод.

[9] Ідэя пра існаванне эфіру, які запаўняе прастору ў канечных ці бясконцых маштабах, была неадлучнай часткай прыродазнаўства XIX стагоддзя. Яе падзялялі ўсе выдатныя вучоныя мінулага: Г.Гюйгенс, І.Ньютан, М.Ламаносаў, М.Фарадэй, Дж.Максуэл, Л.Лёрэнц і многія іншыя. З уяўлення аб эфіры як пераносчыку электрамагнітных хваляў зыходзілі М.Фарадэй і Дж.Максуэл, ствараючы электрамагнітную тэорыю святла. На тэорыі эфіру была пабудавана ўся класічная электрадынаміка. Дз.Мендзялееў у першапачатковым накідзе перыядычнай сістэмы хімічных элементаў пакінуў нават спецыяльнае нулявое месца перад вадародам для часцінкі эфіру. Да тэорыі эфіру былі прыстасаваныя і цудоўныя пераўтварэнні Лёрэнцы, і рэлятывісцкая формула складання хуткасцяў. Гіпатэтычны эфір як сукупнасць «першапачатковых часцінак» — цвёрдых, непранікальных, якія знаходзяцца ў няспынным руху, ляжаў у аснове ўяўленняў аб структуры рэчыва і сілах узаемадзеяння паміж малекуламі. У наш час старая канцэпцыя эфіру знайшла своеасаблівае адлюстраванне ў сучасным паняцці фізічнага вакууму, які зусім не адпавядае ўяўленням аб «абсалютнай пустэчы» (супраць іх якраз і выступаў у сваіх працах І.Яркоўскі).

[10] Сярод асноўных навуковых прац І.Яркоўскага — кнігі «Сусветнае прыцягненне як вынік утварэння важнай матэрыі ўнутры нябесных целаў. Кінетычная гіпэтэза» (М., 1889; СПб., 1912), «Новы погляд на прычыны метэаралагічных з'яў» (М., 1891), «Будова матэрыі і малекулярнай сілы» (М., 1894), «Захапленне матэматычнымі тэорыямі ў сучаснай навуцы» (М., 1893), «Шчыльнасць светлавога эфіру і ягоны супор руху» (Бранск, 1901).

[11] Апошнім часам у навуковай літаратуры з'яўляюцца тэорыі сусветнага прыцягнення, якія будуюцца на гіпотэзе аб зменнасці гравітацыйнай канстанты не толькі з цягам часу, але і ад пункта да пункта, што нагадвае выснову І.Яркоўскага. Хуткасць змянення гэтай велічыні непасрэдна звязваецца з пашырэннем сусвету.

[12] Калі ўлічыць, што неабходным патрабаваннем для ўтварэння вад-

касці з'яўляецца бліжні парадак, а асноўнай уласцівасцю крышталяў — дальні парадак у размяшчэнні атамаў, то ў разважаннях І.Яркоўскага можна знайсці шмат рацыі. Паводле сучасных уяўленняў, існаванне рэчыва ў канкрэтным агрэгатным стане вызначаецца ступенню спарадкаванасці атамаў і малекул і характарам іх руху.


[13] «Крышталікі» І.Яркоўскага ў сучасных уяўленнях — найменшая часцінка хімічнага элемента, носьбіт яго ўласцівасцяў.

[14] Уяўленні І.Яркоўскага аб «атамах першапачатковай матэрыі» адпавядаюць сучасным уяўленням аб часцінках, якія атрымалі найменне «элементарныя».

[15] Прынцып яе дзеяння апісаны намнога пазней у яго кнізе «Новы погляд на прычыны метэаралагічных з'яваў» і затым памочнікам дырэктара Галоўнай фізічнай абсерваторы М.Рыкачовым у часопісе «Метэаралагічны веснік» (№ 2 за 1897 год).

Вольга Гапоненка

Жыгімонт (Зыгмунт) Флярэнт УРУБЛЕЎСКІ
(1845—1888)



родзенская зямля дала свету шмат таленавітых вучоных, палітыкаў, дзеячаў культуры. Сярод іх — Жыгімонт (Зыгмунт) Флярэнт Урублеўскі (Wróblewski), выдатны фізік і педагог, прафесар Ягелонскага універсітэта, член-карэспандэнт Польскай Акадэміі ведаў, Акадэміі навук у Вене, адзін з заснавальнікаў фізікі і тэхнікі нізкіх тэмператур.

Ён быў адным з прадстаўнікоў фізікі паміж класічнай і сучаснай. Работы, выкананыя ім, былі звязаныя і абапіраліся на навуковыя канцэпцыі XIX стагоддзя. Побач з наватарствам, глыбокім аналізам падмуркаў навукі і назіральнасцю Ж.Урублеўскаму была ўласціва выключна строгая патрабавальнасць да ўласных даследванняў, да методыкі эксперымента. І менавіта ў спалучэнні класічнага стылю мыслення, неад'емнай складовай часткай якога былі яснасць у разуменні пытання і матэматычная дакладнасць, з духам пошукаў варта бачыць карані ягоных навуковых дасягненняў. Любоў да навукі, незвычайны педагагічны дар, які з дзівоснай здольнасцю прыцягваў да сябе маладыя таленты, класічны стыль выкладання матэрыялу, велізарная асабістая прывабліваць, якая спалучалася з прастатой і зычлівым стаўленнем да калегаў, — усё гэта зрабіла яго прыкметнай постаццю ў фізіцы XIX стагоддзя.

Нарадзіўся Жыгімонт Урублеўскі ў Гродне 6(28) кастрычніка 1845 года ў небагатай шляхецкай сям'і Антона і Караліны з Манькоўскіх[1]. Пры хрышчэнні ў Фарным касцёле, прыхаджанамі якога былі Урублеўскія, яму было нададзена падвойнае імя Жыгімонт Флярэнт. Запіс аб гэтым захаваўся ў метрычнай касцёльнай кнізе ад 8 лістапада 1845 года. Ён быў другім хлопчыкам у сям'і[2], дзе клапатлівая маці выхоўвала дзя-

цей ў любові да музыкі і мастацтва, у павазе да рэлігіі, у шанаванні чалавечай годнасці. Жылі Урублеўскія ва ўласным доме, які ў архіўных матэрыялах значыцца як «дом Урублеўскіх», на вуліцы Дамініканскай, якая пралягла ўздоўж Дамініканскага кляштара.

На беларускіх і польскіх землях вядома некалькі шляхецкіх родаў Урублеўскіх. Ж.Урублеўскі належыў да Урублеўскіх герба Слепаўрон. Менавіта так была занесена сям'я Урублеўскіх у Радаводную кнігу дваранаў Гарадзенскай губерні 1875 года. Сваім родапачынальнікам нашчадкі гэтага герба лічылі Станіслава Урублеўскага, якому кароль і вялікі князь Ян III дараваў маёнтак Падліпкі на Берасцейшчыне, у ваколіцах Драгічына. 10 ліпеня 1858 года указам урадавага Сената Дэпартамента Герольдыі за № 4725 Жыгімонт Урублеўскі быў прылічаны да дваранскага роду[3].

Пачатковую адукацыю ён атрымаў дома. Калі Жыгімонту споўнілася адзінаццаць гадоў, ён паступіў у Гарадзенскую гімназію для хлопчыкаў (адкрытая 6 красавіка 1834 года замест ліквідаванай у 1833 годзе дамініканскай навучальні). Гімназійны курс складаў сем гадоў: 4 ніжэйшыя класы і 3 вышэйшыя. Акрамя мовы, закона Божага, гісторыі, геаграфіі, матэматыкі і правазнаўства, з 1853 года ў гімназіі пачалося выкладанне прыродазнаўчых навук. Цікава адзначыць, што ў гімназіі вяліся сістэматычныя метэаралагічныя назіранні, дадзеныя якіх паведамляліся ў Пецярбургскую акадэмію навук. Фізіка выкладалася «у фізічным кабінеце з практычным тлумачэннем на машынах»[4].

Скончыўшы ў 1862 годзе гімназію з сярэбраным медалём, Жыгімонт Урублеўскі паступіў на фізічна-матэматычны факультэт Універсітэта Святога Уладзіміра ў Кіеве, які пасля закрыцця Віленскага універсітэта лічыўся базавай вышэйшай навучальной установай для Мінскай, Віленскай і Гродзенскай губерняў.

На чатырох факультэтах Універсітэта Св.Уладзіміра — гістарычна-філасофскім, фізічна-матэматычным, юрыдычным і медычным — у 1862 годзе вучыліся 835 чалавек. Пераважна гэта былі дваране. Паводле веравызнання студэнты дзяліліся практычна пароўну: 393 праваслаўных і 407 каталікоў. У спісах 267 студэнтаў найбольшага па колькасці навучэнцаў фізічна-матэматычнага факультэта ў 1862 годзе з'явілася імя Жыгімонта Урублеўскага.

У распараджэнні студэнтаў фізічна-матэматычнага факультэта была універсітэцкая бібліятэка, фізічны і метэаралагічны кабінеты, хімічны кабінет і лабараторыя, тэхналагічны кабінет і лабараторыя, астранамічная абсерваторыя[5]. Перад Жыгімонтам Урублеўскім упершыню адчыніліся шырокія гарызонты навуковага пазнання.

Універсітэцкая адміністрацыя і мясцовыя органы ўлады строга назіралі за паводзінамі студэнтаў, фармаваннем іх светапогляду і нават

выглядам. Студэнты былі абавязаныя насіць форму (мундзіры), ім забаранялася збірацца вялікімі групамі ў грамадскіх месцах. Урад Мікалая I спадзяваўся, што Кіеўскі універсітэт зробіцца «разумовай цытадэляй, блізкай да вайсковай, для знішчэння духу польскай нацыянальнасці». Гэтыя надзеі не спраўдзіліся. У сценах універсітэта гучалі не толькі лекцыі прафесараў, але і рэвалюцыйныя заклікі студэнтаў.

Учарашні гімназіст Ж.Урублеўскі літаральна адразу трапіў у напружаную атмасферу, у сітуацыю, якая патрабавала выбару — вучоба ці рэвалюцыя? Моладзь Расійскай імперыі, пакаленне за пакаленнем, на працягу амаль стагоддзя рабіла для сябе гэты выбар. І Жыгімонт Урублеўскі абраў барацьбу. Многія з плыні непасрэдных удзельнікаў падзеяў 1863—1864 гадоў, людзі розных станаў, нацыянальнасцяў дый узростаў, свядома ішлі на няроўнае змаганне з самаўладдзем. Ішлі і гінулі. Некаторыя станавіліся легендаю, як Кастусь Каліноўскі, Валерый Урублеўскі, Юльян Бакшанскі. Юнацкі максімалізм, жаданне адчуць смак барацьбы, вера ў справядлівасць прыводзілі моладзь у шэрагі паўстанцаў. Сярод іх быў і васемнаццацігадовы студэнт Кіеўскага універсітэта Жыгімонт Урублеўскі.

10 жніўня 1863 года за ўдзел у паўстанні Жыгімонт Урублеўскі быў арыштаваны. Каля шаснаццаці месяцаў ён прасядзеў за кратамі ў астрогах Горадні і Вільні, а потым быў высланы этапным парадкам у губернскі горад Томск. Тут Жыгімонт Урублеўскі правёў амаль два гады. Пасля бацькоўскіх намаганняў і клопатаў на пачатку ліпеня 1865 года яго перавялі ў Цывільск, на той час павятовы горад Казанскай губерні — адзін з найбольш арганізаваных цэнтраў высылкі для паўстанцаў.

У высылцы Жыгімонт Урублеўскі зразумеў, што ягонае прызначэнне не палітычная барацьба, а пошук разгадак таямніц прыроды. Увесь вольны час прысвячаў філасофскай распрацоўцы такой праблемы, як развіццё сусвету[6]. Вядома, што ён даваў прыватныя ўрокі, прачытаў шмат папулярных лекцый па прыродазнаўстве.

Напачатку 1869 года імя Ж.Урублеўскага трапіла ў спіс амніставаных і увесну таго ж года ён вяртаецца ў Горадню, у бацькоўскі дом. Гады, праведзеныя ў выгнанні, сталі для яго школай жыцця. Ён многае паспеў пераасэнсаваць, многае зразумець. Тое, што трывала стаць на ногі ў гэтым складаным жыцці ён зможа, толькі атрымаўшы вышэйшую адукацыю, не выклікала ў юнака сумневу. Дваранскае паходжанне здымала саслоўныя абмежаванні і адкрывала беспераішкодны шлях да навукі і кар'еры.

Жыгімонт Урублеўскі спачатку едзе ў Варшаву, дзе жылі яго родныя браты Вітаўт і Станіслаў, каб паступіць у Варшаўскі універсітэт. Аднак папулярнасць Імператарскага Варшаўскага універсітэта пасля прыняцця ў 1869 г. агульнага Статута расійскіх універсітэтаў (1863 г.)

імкліва зніжалася, а колькасць студэнтаў за наступныя пяць гадоў скарацілася ўдвая. Выкладанне і справаводства вялося цяпер толькі на расійскай мове.

Таму Жыгімонт Урублеўскі едзе вучыцца за мяжу, у Берлінскі універсітэт. Штуршком для такога кроку сталася і неабходнасць лячэння хваробы вачэй. З дзяцінства ён меў моцную блізарукасць. У цяжкіх умовах высылкі яна пачала прагрэсаваць і над юнаком навісла пагроза цалкам страціць зрок. У Берліне Ж.Урублеўскаму былі зроблены дзве складаныя аперацыі і дзякуючы ім зрок удалося захаваць.

Час, праведзены ў Берліне, зрабіў вялікі адбітак на далейшым лёсе Ж.Урублеўскага. І гэта не выпадкова. Берлін быў асяродкам сусветнай навуковай думкі. Там было цэлае сузор'е матэматыкаў: Л.Ойлер, Ж.Лягранж, К.Якобі, Л.Дырыхле, Л.Кронэкер, К.Гаўс, чые даследванні ўнеслі фундаментальны ўклад у развіццё гэтае навукі. Выключнае становішча займала хімія дзякуючы даследаванням Дж.Пота, А.Марграфа і М.Кляпрота. Імёны П.Эрмана, Г.Магнуса, Г.Гельмгольца, Ё.Погендарфа, Г.Кірхгафа спрыялі з'яўленню ў гісторыі прыродазнаўства такога паняцця, як «берлінская фізіка».

Менавіта тут Ж.Урублеўскі намерыўся прадоўжыць сваю адукацыю. Ён падаў дакументы на фізічна-матэматычны факультэт філасофскага аддзялення Берлінскага універсітэта. Цудоўныя лекцыі такіх карыфеяў фізікі, як Г. Магнус, Г.Квінке, Ё.Погендарф,[7] моцна паўплывалі на фармаванне навуковага светапогляду, на вызначэнне прыярытэтаў у даследванні фізічных з'яваў.

Характэрная рыса таго часу — адкрыццё фізічных лабараторый і нават інстытутаў, стварэнне навуковых таварыстваў і спецыялізаваных фізічных часопісаў. Так, першае фізічнае таварыства было ўтворана ў Берліне ў 1856 годзе. У 1868 годзе пры Пецярбургскім універсітэце было арганізавана Расійскае фізічна-хімічнае таварыства. Цікава, што адным з яго заснавальнікаў быў родны брат Жыгімонта, Эдвард Урублеўскі, выпускнік, а потым прафесар Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Сярод першых спецыялізаваных навуковых часопісаў трэба прыгадаць «Annalen der Physik und Chemie», «Annalen der Physik». У 1840 годзе на фізічна-матэматычным факультэце Берлінскага універсітэта з'яўляецца новае структурнае ўтварэнне — фізічная лабараторыя. Ініцыятарам яе арганізацыі і кіраўніком быў Г.Магнус. У сценах гэтай лабараторыі, якая паступова папаўнялася першакласнымі прыладамі для навуковых даследаванняў, студэнты універсітэта рабілі свае першыя самастойныя крокі ў навуцы.

На працягу двух навучальных семестраў Жыгімонт Урублеўскі працаваў у лабараторыі прафесара Гельмгольца[8], а потым перасяліўся ў Мюнхен[9]. У гэтым часе фізіку ў Мюнхенскім універсітэце выкладаў пра-

фессар Ф.Жалі — выдатны эксперыментатар, вядомы сваімі даследаваннямі законаў малекульнай фізікі і фотаметрыі. Ф.Жаллі з вялікай цікавасцю паставіўся да маладога навукоўца і ўзяў самы непасрэдны ўдзел у фармаванні яго навуковай будучыні. Два гады Ж.Урублеўскі працаваў у прафесара і ў лютым 1874 года паспяхова вытрымаў экзамен і абараніў дысертацыю пад назовам «Эксперыментальнае даследванне магчымасці ўзбуджэння электрычнасці механічнымі сродкамі» на ступень доктара філісофіі з найвышэйшаю адзнакаю «summa cum laude».

У 1874 годзе Ж.Урублеўскі займае пасаду асістэнта на кафедры фізікі Страсбургскага універсітэта, якую ўзначальваў прафесар А.Кундт[10]. Менавіта ў сценах фізічнай лабараторыі Страсбургскага універсітэта, у глыбока навуковай атмасферы, сфармаваўся як фізік-даследчык, а ягонае імя сталі з павагаю вымаўляць у навуковых колах свету.

А.Кундт, якому імпанаваў творчы імпэт маладога навукоўца, прапанаваў Ж.Урублеўскаму такую цікавую праблему, як вывучэнне ўласцівасцяў газаў. Гэты кірунак здаўна вабіў вучоных. Рэчыву, часцінкі якога не звязаны ці вельмі слаба звязаны сіламі ўзаемадзеяння, прысвячалі свае даследванні Р.Бойль і Э.Марыёт, Ж.Гей-Люсак і Б.Кляпэйрон, Дж.Джоўль і В.Томсан. Ужо ў першых працах Ж.Урублеўскага па дыфузіі газаў праявіліся яго вынаходлівы розум, выдатныя здольнасці эксперыментаваць, строгая логіка высноваў.

Пад кіраўніцтвам А.Кундта Ж.Урублеўскі выканаў габілітацыйнае даследванне пад назовам «Аб дыфузіі газаў праз абсарбавальныя субстанцыі», надрукаванае спачатку асобным выданнем, а потым у «Annalen der Physik». На дысертацыю звярнулі ўвагу многія фізікі, а на старонках аўтарытэтнага ангельскага выдання «Nature» з'явіўся станоўчы водгук Дж.Максўэла[11]. У лютым 1876 года ён абараніў дысертацыю і стаў дацэнтам фізікі Страсбургскага універсітэта. У наступных гадах Ж.Урублеўскі праводзіць цікавыя эксперыменты па дыфузіі рашчынаў солі, якія значна пашырылі фізічныя веды ў гэтым кірунку. Пры вывучэнні распаўсюджвання газаў у вадкасцях ён звярнуў увагу на залежнасць ад глейкасці. Вынікі гэтых даследванняў былі надрукаваны на старонках аўтарытэтных навуковых выданняў і знайшлі пэўны рэзананс у навуковым свеце.

Актыўная і паспяховая навуковая дзейнасць Ж.Урублеўскага па вывучэнню ўласцівасцяў рэчываў у газавым стане прываблівала да сябе не толькі кіраўніцтва многіх вышэйшых навучальных устаноў. У 1880 годзе ён атрымаў запрашэнне з Ягелонскага універсітэта ў Кракаве заняць пасаду загадчыка кафедры фізікі. У тым жа годзе Польская Акадэмія ведаў прысудзіла ўраджэнцу Гародні стыпендыю імя братоў Снядэцкіх фундацыі Севярына Галянзоўскага[12]. Для дацэнтаў стыпендыя складала пяць тысяч франкаў на год і прадугледжвала наведванне вядучых навуковых цэнтраў па-за межамі Галіцыі, куды ўваходзіў і Кракаў.

Амаль два гады Ж.Урублеўскі працаваў у славутых навуковых цэнтрах Еўропы — у навуковай лабараторыі Ecole Normalle Superieure у Парыжы, лабараторыях Оксфарда і Кембрыджа. Асноўную ўвагу ён засяродзіў на пытаннях, звязаных з уласцівасцямі газаў пры высокім ціску, пазнаёміўся з прынцыпамі дзеяння прыладаў для іх звадкавання. Пры даследванні распаўсюджвання вугальнай кіслаты ў вадзе пры высокім ціску ён атрымаў іх спалучэнне — гідрат вугальнай кіслаты.

У 1882 г. быў абраны загадчыкам кафедры фізікі Ягелонскага універсітэта. З 1888 г. Ж.Урублеўскі — дэкан фізічнага факультэта універсітэта. З першых дзён сваёй працы ў Ягелонскім універсітэце ён заняўся арганізацыяй першай ва універсітэце фізічнай лабараторыі — «Фізічнага інстытута» — для правядзення навуковых даследаванняў і практычных заняткаў са студэнтамі, якая была адкрыта ўжо праз год, у 1883 г.

Аўстрыйскі ўрад[13] даў вялікія сродкі на ўладкаванне фізічнай лабараторыі. На працягу пяці гадоў Ж.Урублеўскаму выдавалі па 14000 гульдэнаў. Аднак даследаванні па звадкаванні газаў патрабавалі значна большых выдаткаў. І таму вучоны змушаны быў траціць свае ўласныя сродкі на набыццё розных прыладаў, маючы прафесарскі заробак да 5000 гульдэнаў штогод.

Першая, абавязковая, частка дзейнасці фізічнай лабараторыі была звязана з навучальным працэсам. Тут студэнты ў адпаведнасці з навучальнымі планамі праводзілі практычныя заняткі. Другім кірункам дзейнасці лабараторыі сталі грунтоўныя навуковыя даследаванні пад кіраўніцтвам Ж.Урублеўскага ў галіне малекулярнай фізікі і нізкіх тэмператур (раўнавага стану, уласцівасці хімічных сумесяў, крытычныя з'явы, ізатэрмы газаў) і вывучэнне тэрмаэлектрычных і электрафізічных уласцівасцяў цвёрдых целаў пры гэтых тэмпературах.

Талент дакладна і зразумела выказваць ідэю, удала выбіраць прадмет лекцыі прынёс Жыгімонту Урублеўскаму поспех як настаўніку. Фізіка ў яго выкладанні была жывой навукай. Звычайна ён пачынаў свае лекцыі з простых практыкаванняў, паступова падводзячы слухача да складанай фізічнай праблемы. Характэрнай рысаю стылю Урублеўскага, калі можна так сказаць, было шырокае выкарыстанне філасофіі. Для яго метаду выкладання было ўласціва тое, што многія з праблем, на якіх ён засяроджваў увагу на лекцыях, былі якраз тымі, якія ён сам збіраўся развязваць. Вядзенне канспектаў лекцый было пажаданым, бо на той час не было адпаведнага дапаможніка. Ангельскі падручнік Бальфура — Стаўрта быў надта сціслы, шматтомны нямецкі Вюльнэра — занадта пашыраны для пачаткоўца. А тым часам фізіка была галоўным экзаменацыйным прадметам на першай сесіі нават на медычным факультэце. Ж.Урублеўскі экзаменаваў не «проста з кніжкі»: ён патрабаваў ад студэнтаў разумення, а не механічнага засвойвання.

Цікавасць грамадства да навуковых пытанняў і патрэбаў знаходзіцца ў спамернай залежнасці з стаўленнем да пэўнай асобы — гэта разумеў Ж.Урублеўскі. Выдатны арганізатар, ён распачынае ў Кракаве актыўную папулярызацыйную дзейнасць. У Кракаўскім універсітэце Ж.Урублеўскі арганізаваў цыкл дакладаў, пад час якіх апавядаў пра стан сусветнай фізікі, пра арганізацыю навуковых даследаванняў у найбуйнейшых універсітэтах, пра кірункі ўласных навуковых вышукаў і першыя перамогі. Лекцыі суправаджаліся цікавымі і сенсацыйнымі эксперыментамі з галіны оптыкі, а таксама электрычнымі з'явамі. Чаканы эфект узмацняўся пры выкарыстанні праекцыйнага апарата, калі на экране паўставалі часам незразумелыя для прысутных у зале нескладаныя графікі, формулы і малюнкі фізічных прыладаў.

У архіве Ягелонскага універсітэта захаваліся запрашэнні, якія спецыяльна друкаваліся на тыя публічныя даклады. У спісе асоб, асабіста запрошаных Ж.Урублеўскім, фігуруюць прозвішчы інтэлектуальнай эліты Кракава. Спецыяльныя лекцыі былі арганізаваны Ж.Урублеўскім для жонак прафесараў і іншых знакамітасцяў горада.

Асноўныя навуковыя даследаванні З. Урублеўскага, якія былі выкананы ў Кракаве, былі прысвечаны фізіцы і тэхніцы нізкіх тэмператур. Сумесна з К. Альшэўскім, прафесарам хіміі Ягелонскага універсітэта, у красавіку 1884 г. упершыню ў свеце ён атрымаў вадкі кісларод і азот у вымернай колькасці, звадкаваў вокіс вугляроду. Для гэтага была пабудавана эксперыментальная ўстаноўка. Падрабязнае апісанне прылады было дадзена Жыгімонтам Урублеўскім і Каралем Альшэўскім у артыкуле «Аб звадкаванні кіслароду, азоту і вокісу карбону», які быў надрукаваны ў часопісе «Летапіс фізікі і хіміі»[14].

Паведамленне пра вынікі сваёй навуковай дзейнасці па звадкаванню кіслароду і азоту было зроблена вучоным (у пісьмовай форме)[15] 25 красавіка 1884 года на пасяджэнні матэматычна-прыродазнаўчага аддзялення Польскай Акадэміі ведаў. У іх, у прыватнасці, зазначалася: «Кіслард быў звадкаваны і бачны як вадкасць першы раз адным з нас (Урублеўскім) 29 сакавіка. Пасля таго як у прыладу была ўнесеная невялікая змена, каб спрасціць назіранне, з'яву ўдалося бачыць другім разам 4 красавіка ва ўсім яе хараcтве і дзівоснасці абодвум нам, а таксама асістэнтам Новаку і Касмінскаму, якія прысутнічалі пры эксперыменце. Кракаў, лабараторыя прафесара Урублеўскага. 5 красавіка 1883 года».

У другім лісце паведамлялася: «Ніжэйпадпісаныя паведамляюць, што сёння ім удалося бачыць азот як вадкасць зусім без колеру, калі пры ахаладжанні таго газу да тэмпературы, блізкай да -130°С, быў павялічаны ціск. Меніск быў бачны надта выразна. У Кракаве дня 13 красавіка 1883 г. Жыгімонт Урублеўскі. Караль Альшэўскі»[16].

Гэтым эксперыментам папярэднічалі грунтоўныя разважанні аб ус-

танаўленні нутраной узаемасувязі трох агрэгатных станаў рэчыва: цвёрдага, вадкага і газападобнага. «Газападобны і вадкі станы — гэта толькі далёка адлеглыя стадыі аднаго і таго ж стану матэрыі, — тлумачыў даследнік. — Яны здольныя пераходзіць адзін у другі шляхам бесперапыннага змянення».

У далейшых сваіх даследаваннях Ж.Урублеўскі ўпершыню ў свеце вызначыў крытычныя тэмпературы вокісу вугляроду (1883), кіслароду і азоту (1885–1888). Такім чынам, працы ураджэнца Беларусі Ж. Урублеўскага канчаткова абверглі метафізічныя погляды пра так званыя «сталыя» газы (несціскальныя, якія немагчыма пераўтварыць у вадкасць) і паклалі пачатак шырокім доследам у галіне фізікі нізкіх тэмператур.

Ідэя звадкавання газаў амаль стагоддзе лунала ў атмасферы навуковых лабараторый свету. І таму вестка аб паспяховых выніках даследаванняў Ж.Урублеўскага была з вялікай цікавасцю сустрэта навуковай грамадскасцю. Лісты з адрасам «Кракаў. Інстытут фізічны. Праф. Урублеўскаму» ішлі з Парыжа, Ляйдэна, Лондана, Вены, Варшавы, іншых гарадоў ад вядомых вучоных, у тым ліку Гельмгольца, Жалі, першапачынальнікаў даследаванняў па звадкаванні газаў Л.Кайетэ і Р.Піктэ.

За фундаментальныя даследаванні ў галіне фізікі нізкіх тэмператур Ж.Урублеўскагі быў абраны ў 1883 годзе членам-карэспандэнтам Польскай Акадэміі ведаў (сёння – Польская Акадэмія навук). Венская Акадэмія навук у 1886 годзе прысудзіла яму прэмію Баўмгартнэра, якая прысуджалася Акадэміяй адзін раз на тры гады за найбольш актуальныя даследаванні ў галіне фізікі, на 1000 гульдэнаў, а праз год, у 1887 годзе, таксама абрала яго членам-карэспандэнтам. Ён быў абраны сябрам многіх навуковых таварыстваў. Таварыства фізікі і гісторыі ў Жэневе абрала яго ганаровым сябрам. Акрамя таго, Ж.Урублеўскі быў ганаровым сябрам Таварыства садзейнічання навуцы ў Львове.

Пасля паспяховага звадкавання кіслароду і азоту ніхто ўжо з навукоўцаў не сумняваўся ў магчымасці звадкавання вадароду. Неабходна было толькі вызначыць тэмпературу, пры якой адбудзецца такое пераўтварэнне. У 1884 годзе Ж.Урублеўскі правёў серыю эксперыментаў па звадкаванню вадароду паводле метаду Кайетэ праз пашырэнне. Даследчык назіраў лёгкі туман, аднак не быў перакананы, што гэта кроплі вадкага вадароду. Эксперыменты, паўтораныя зноў і зноў, не давалі чаканых вынікаў. Вучоным былі праведзены тэарэтычныя разлікі, і ён паказаў, што крытычная тэмпература для вадароду — велічыня, меншая за 30° К. Самая нізкая тэмпература, якую можна было атрымаць у той час, складала каля 55° К. Шлях да абсалютнага нуля на нейкі час прывёў у «мёртвую кропку».

Далейшыя даследаванні Ж.Урублеўскага былі сканцэнтраваны на вывучэнні сутнасці працэсаў, што адбываюцца пры нізкіх тэмперату-

рах. Распрацоўваючы канцэпцыю пра адпаведныя станы, даследнік прыходзіць да высновы, што «калі два газы знаходзяцца ў адпаведных станах, то іх $P_{кр}$ *х* $T_{кр}$ = const». *Упершыню гэты закон быў сфармуляваны Ж.Урублеўскім у артыкуле «Ueber die Zusammendruckbarkeit des Wasserstoffs», які быў прысвечаны праблеме звадкавання вадароду і надрукаваны ўжо пасля смерці навукоўца ў часопісе Венскай Акадэміі навук. У гісторыю фізікі гэтае раўнанне ўвайшло як «тэарэма Урублеўскага».*

Ж.Урублеўскі выразна бачыў тыя перспектывы, што адкрывалі перад фізікамі нізкія тэмпературы. Яшчэ на пачатку сваёй навуковай дзейнасці ў галіне фізікі нізкіх тэмператур ён прадказаў, што дакладнае вымярэнне фізічных уласцівасцяў рэчываў пры вельмі нізкіх тэмпературах у значнай ступені пашырыць нашыя веды аб прыродзе і будове рэчыва. Новым кірункам, які паступова ўмацоўваўся ў гэтай галіне, было даследаванне электрамагнітных і цеплавых уласцівасцяў цвёрдых целаў ва ўмовах гранічнага холаду.

Асаблівую актуальнасць пад канец XIX стагоддзя набывала пытанне пра велічыню ўдзельнага супору. Маючы ў сваім распараджэнні новы абсяг тэмператураў ад 90 да 55^0 *K, Ж.Урублеўскі скіраваў свае намаганні на вывучэнне электраправоднасці металаў. Эксперыменты, праведзенныя раней іншымі вучонымі, паказвалі, што з паніжэннем тэмпературы ўдзельны супор чыстага металу паступова змяншаецца да нуля. Вынікі, атрыманыя Ж.Урублеўскім, не пацвярджалі гэтых дадзеных. Змяненне велічыні ўдзельнага электрычнага супору з памяншэннем тэмпературы мела нелінейную залежнасць і ў пункце* T = -200°C *для медзі вызначалася велічынёй* $p = 0.414$ *Ом · см*[17]. *Тлумачэнне гэтай карціны было атрымана толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў, калі адкрыццё электрона, дыфракцыі рэнтгенаўскіх прамянёў у крышталях і, нарэшце, адкрыццё будовы атама паклалі пачатак новым кірункам даследаванняў у галіне фізікі цвёрдага цела і спосабам пабудовы тэорыі электрамагнітных з'яваў. У 1911 годзе Г.Камэрлінг-Онес эксперыментальна паказаў, што пры некаторых тэмпературах электрычны супор многіх металаў падае да нуля. З'ява гэтая атрымала назоў «звышправоднасць». Медзь, якую даследаваў Ж.Урублеўскі, заставалася выключэннем з правіла.*

Вынікі навуковых даследаванняў Ж.Урублеўскі апублікаваў у такіх прэстыжных навуковых выданнях, як французскі часопіс «Compte Rendu», нямецкія «Annalen der Physik», «Annalen der Physik und Chemie», «Verzeichnis der von der Kaiserlichen Akademie der Wissenschaften in Wien» і іншых.

Як дэкан фізіка-матэматычнага факультэта і кіраўнік Фізічнага інстытута Ягелонскага універсітэта Ж.Урублеўскі аддаваў шмат сіл і намаганняў стварэнню больш спрыяльных умоў для навуковай працы і

прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў. Ён марыў аб новым будынку для інстытута і выказваўся за неабходнасць падрыхтоўкі новага падручніка па фізіцы. Яшчэ ў 1883 годзе Ж.Урублеўскі пісаў: «Па заняцці кафедры фізікі ў Кракаве адразу пачаў ствараць лабараторыю, галоўнай мэтай якой было даць магчымасць кожнаму студэнту, незалежна ад яго асноўнай спецыяльнасці навучання, пазнаёміцца з эксперыментальнымі метадамі, што ўжываюцца ў фізіцы. Будзе яно мець мэтаю навучанне ў моладзі нашай таго, што немцы называюць «naturwissenshaftlicher Sinn». Метэаралогія, магнетызм зямны і атмасферная электрычнасць стануць адным з галоўных заняткаў у той лабараторыі. Нішто так не развівае будучага навукоўца і не прывучае да дакладнага мыслення і дакладных ведаў, як сістэматычная практычная дзейнасць у тым кірунку. Для ажыццяўлення ўсяго гэтага неабходна стварыць падручнік практычнай фізікі»[18].

* * *

Позна ўвечары 25 сакавіка 1888 года ў фізічнай лабараторыі Ягелонскага універсітэта адбыўся пажар. Засяроджаны на даследаванні Ж.Урублеўскі не ўбачыў, як кроплі газы ад нафтавай лямпы трапілі яму на адзенне і паперы. Ратуючы малюнкі, ён не адразу заўважыў, як на ім загарэўся пінжак. З моцнымі апёкамі вучоны быў перавезены ў прыватны шпіталь, аднак, нягледзячы на ўсе намаганні лекараў, 16 красавіка а 7 гадзіне раніцы — дзень у дзень праз пяць гадоў пасля паспяховага эксперымента з вадкім азотам — Ж.Урублеўскі памёр.

Пахавалі Жыгімонта Урублеўскага на Ракавіцкім цвінтары Кракава, побач з паўстанцамі 1830—1831 і 1863 гадоў. На надмагільнай пліце выбітыя словы: «Жыгімонт Урублеўскі, прафесар Ягелонскага універсітэта. Нарадзіўся ў Гародні 28.X.1845, памёр у Кракаве 16.IX.1888. — Служыў Айчыне — Загінуў дзеля навукі».

Мемарыяльная табліца з чорнага мармуру з гарэльефным партрэтам вучонага ў медальёне з бронзы ўмуравана ў левай сцяне акадэмічнага касцёла Святой Ганны ў Кракаве. Апаленыя полымем 25 сакавіка 1888 года рабочыя дзённікі прафесара эксперыментальнай фізікі Жыгімонта Флярэнта Урублеўскага ляглі у старажытнай зале Ягелонскага універсітэта побач з хадайніцтвам, падпісаным больш за чатырыста гадоў таму кракаўскім студэнтам Мікалаем Капернікам.

Памяць аб ураджэнцы Беларусі захоўваецца і на яго радзіме. Пра яго нагадвае ў Гародні памятная табліца ў Фарным касцёле. А побач — імёны яго родных братоў: Вітаўта (1838—1927), прафесара Вышэйшай Петэхнічнай школы ў Варшаве, Эдварда (1848—1892), прафесара хіміі Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута, і Станіслава (1854—1928), інжы-

нера-тэхнолага, дырэктара Цэнтральнага ўпраўлення вайсковай прамысловасці Польшчы.

«Кожны выдатны даследнік назаўсёды ўносіць сваё імя ў гісторыю не толькі ўласнымі адкрыццямі, але і адкрыццямі, да якіх ён падштурхоўваў іншых». Гэтыя словы належаць выдатнаму нямецкаму фізіку, заснавальніку квантавай тэорыі Максу Планку. Менавіта з такога гледзішча трэба ацэньваць постаць Жыгімонта Урублеўскага, каб зразумець усё велізарнае значэнне зробленага ім адкрыцця. Ураджэнец Беларусі быў адным з тых, хто паклаў пачатак новай рэвалюцыі ў прыродазнаўстве. Найлепшы доказ таго — шэсць Нобелеўскіх прэмій за даследаванні ў галіне нізкіх тэмператураў, якія былі ўручаныя ўжо ў наступным, ХХ стагоддзі. К.Камэрлінг-Онес ва ўрачыстай прамове пры ўручэнні яму Нобелеўскай прэміі ў галіне фізікі 1913 года назваў працу Ж.Урублеўскага па звадкаванню кіслароду класічнай і падставай для ягоных поспехаў.

Імя Жыгімонта Урублеўскага ўвайшло ў шматлікія энцыклапедыі і біяграфічныя слоўнікі. Кароткія біяграфічныя звесткі і спіс найбольш значных навуковых прац змясціў на сваіх старонках «Biografisch-literarisches Handworterbuch für Mathematik, Astronomie, Physik» (London-Berlin, 1904), амерыканскі навуковы біяграфічны слоўнік «Dictionary of Scientific Biography» (N.-Y., 1974), польскае выданне «Album biograficzne zasłużonych Polaków i Polek wieku XIX» (Warszawa, 1903), часопісы «Przegląd Współczesny», «Kłosy», «Kosmos», усе выданні «Большой Советской Энциклопедии», многія іншыя агульныя і спецыяльныя даведнікі, што выдаваліся ў розных краінах.

І толькі, на вялікі жаль, дагэтуль Жыгімонту Урублеўскаму не знайшлося месца ў «Беларускай энцыклапедыі» ... і адважны вучоны — ураджэнец Гародні — вядомы сёння свету як выдатны польскі навуковец, заснавальнік польскай фізічнай школы.

Жыгімонт Урублеўскі — гэта яшчэ адно імя, яшчэ адна старонка з гісторыі нашай Беларусі.

Спасылкі:

[1] Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў (Гародня), фонд 259, вопіс 2, справа 40, аркушы 3, 7 адгорт.

[2] Акрамя старэйшага брата Вітаўта Адольфа, у Жыгімонта былі браты Эдвард Вінцэнт і Станіслаў Тодар, сёстры Аліна Марыяна і Марыя Антаніна.

[3] Тамсама, фонд 332, вопіс 2, справа 1, аркушы 141-143.

[4] С.Р. Из воспоминаний гимназиста шестидесятых годов. Тифлис, 1904.

[5] У Кіеўскі універсітэт была перададзена значная частка бібліятэкі (5405 назоваў у 7563 тамах), калекцыя манет і медалёў (2783 адзінкі),

прылады фізічнага кабінета (149 адзінак), прыстасоўванні хімічнай лабараторыі і калекцыя мінералаў з Віленскага універсітэта.

[6] Са сваёй канцэпцыяй мадэлі сусвету Ж.Урублеўскі азнаёміў у 70-я гады вядучых вучоных Нямеччыны і Францыі, аднак станоўчых водгукаў не атрымаў.

[7] Магнус Генрых Густаў (1802—1870) — нямецкі фізік і хімік, сябар Берлінскай Акадэміі навук. Унёс адметны ўклад у механіку, гідрадынаміку, тэрмадынаміку. Заснавальнік навуковага часопіса «Летапіс фізікі», першы нумар якога пабачыў свет у 1847 годзе, і Нямецкага хімічнага таварыства (1868).

Квінке Георг Герман (1834—1924) — нямецкі фізік, сябар Берлінскай Акадэміі навук. Навуковыя даследаванні прысвечаны малекульнай фізіцы, акустыцы і оптыцы. Вынайшаў прыладу для вымярэння даўжыні гукавых хваляў, якая вядомая сёння як трубка Квінке.

Погендарф Ёган Хрыстыян (1796—1877) — нямецкі фізік, сябар Берлінскай Акадэміі навук. Навуковыя даследванні прысвечаны электрамагнетызму. Заснавальнік і рэдактар часопіса «Летапіс фізікі і хіміі» і даведніка «Biographisch-literarisches Handworterbuch der exakten Naturwissenschaften», да якога зноў і зноў звяртаецца не адно пакаленне тых, хто цікавіцца фізікай і яе гісторыяй.

[8] Гельмгольц Генрых Людвіг Фердынанд (1821—1894) — выдатны нямецкі прыродазнавец, сябар Берлінскай Акадэміі навук, прэзідэнт Фізічна-тэхнічнага інстытута (Берлін—Шарлётэнбург). Унёс значны ўклад у развіццё электрадынамікі, оптыкі, тэрмадынамікі, акустыкі і гідрадынамікі.

[9] Пераезд у Мюнхен быў абумоўлены ў значнай ступені фінансавымі абмежаваннямі Ж.Урублеўскага: тут плата за работу ў эксперыментальнай лабараторыі была значна ніжэй, чыў у лабараторыі Гельмгольца.

[10] Кундт Аўгуст Адольф (1839—1894) — нямецкі фізік, заснавальнік першай у свеце навуковай школы фізікаў-эксперыментатараў. Сябар Берлінскай Акадэміі навук, дырэктар адной з першых навукова-даследчых устаноў па фізіцы — Фізічнага інстытута ў Страсбургу.

[11] Максуэл Джэймс Клерк (1831—1879) — выдатны ангельскі фізік, які зрабіў фундаментальны ўклад у развіццё электрадынамікі, малекулярнай фізікі, оптыкі, механікі, тэорыі пругкасці. Стваральнік тэорыі электрамагнітнага поля.

[12] Снядэцкі Ян (1756—1830) — польскі астраном, матэматык і філасаф, арганізатар і дырэктар з 1792 года Кракаўскай астранамічнай абсерваторыі. У 1807—1815 гадах— рэктар Віленскага універсітэта.

Снядэцкі Анджэй (1768—1838) — польскі хімік і лекар. Заснавальнік навуковай школы хімікаў у Віленскім універсітэце і стваральнік польскай хімічнай тэрміналогіі.

Галянзоўскі Севярын (1802—1878) — польскі вучоны-медык, лекар. Актыўны ўдзельнік паўстання 1831 года. Пасля яго задушэння быў у эміграцыі.

[13] Згодна з умовамі падзелу Рэчы Паспалітай Кракаў у 1795 годзе адышоў да Аўстрыі. У 1815—1846 гадах ён быў вольнай Кракаўскай рэспублікай. Пасля задушэння Кракаўскага паўстання ў 1846 годзе горад апынуўся зноў у складзе Аўстрыйскай імперыі.

[14] Wróblewski Z., Olszewski K. Ueber die Verflussigung des Sauerstoffs, Stickstoffs und Kohlenoxyds // Annalen der Physik und Chemie. 1883. T.20. P. 243-257.

[15] Гэтыя лісты былі накіраваны даследнікамі на імя сакратара Акадэміі ведаў у Кракаве не выпадкова. Згодна з традыцыяй такі крок гарантаваў права першынства ў звадкаванні састаўляючых паветра і дазваляў надалей пазбегнуць непрыемных сітуацый, якія нярэдка сустракаюцца ў гісторыі навукі, калі гаворка заходзіць аб прыярытэтах.

[16] Rozprawy i sprawozdania z posiedzeń Wydziału Matematyczno-Przyrodniczego Akademii Umiejętnolści. 1883. T. X1. S.XXII-XXV.

[17] Wróblewski Z. Sur la resistance electrique du cuivre ŕ la temperature de 200°C au-dessous de zero et sur le pouvoir isolant d'oxygene et de l'azote liquide // Compte Rendu. 1885. T.101. P.160—161.

[18] Такі падручнік будзе падрыхтаваны адным з вучняў Ж.Урублеўскага А.Віткоўскім, які прадоўжыць даследаванні свайго настаўніка па звадкаванню газаў і вывучэнню ўласцівасцяў рэчыва пры нізкіх тэмпературах.

Вольга Гапоненка

Эдвард Адам ВАЙНІЛОВІЧ
(1847—1928)



двард Адам Вайніловіч(13.10.1847г., маёнтак Сляпянка, каля Мінска, цяпер у межах Мінска — 16.06.1928 г., Быдгашч, Польшча) —гаспадарчы і палітычны дзеяч Беларусі другой паловы XIX—пачатку XX ст.

Эдвард Вайніловіч паходзіў са старажытнага беларускага шляхецкага роду, пра што сам згадваў у сваіх успамінах. Род Вайніловічаў меў свой уласны герб (Сыракомля зменены): у чырвоным полі сярэбраны «Габданк» (знак у выглядзе лацінскай літары W, толькі з шырокімі палямі) са стралой уніз. Род Вайніловічаў сягае другой паловы XV ст., ад першага згаданага продка Вайнілы, унук якога Сямён Стэцкавіч Вайніловіч (памёр у 1563 г.) упамянуты ў дакуменце ад 1 мая 1559 г. Прадстаўнікі роду ў XVI—XVIII стст. жылі ў Мінскім і Навагрудскім ваяводствах і займалі розныя пасады ў павятовых адміністрацыях. Яны мелі зямельныя ўладанні ў Слуцкім княстве, Наваградскім (нянькаўская лінія ў XIX ст.), Пінскім (макранская лінія ў XIX ст.), Мазырскім паветах (ад гэтай галіны паходзіць савіцка-пузаўская лінія ў Слуцкім княстве ад пачатку XVII ст.). Эдвард Вайніловіч паходзіў з савіцка-пузаўскай лініі роду. У XIX стагоддзі прадстаўнікі роду Вайніловічаў жылі ў Мінскай і Магілёўскай губернях.

Прадзед Эдварда, Адам (1739—1803), быў наваградскім падкаморыям. Дзед Эдварда Вайніловіча, Антоній (1771—12.10.1855), быў слуцкім павятовым маршалкам дваранства (шляхты), а ў ліпені 1812 г., пасля абвяшчэння Вялікага княства Літоўскага, займаў пасаду слуцкага падпрэфекта (кіраўніка павета). Пасля ўзнаўлення расійскай улады ў канцы 1812 г. ён, як і раней, займаў пасаду маршалка слуцкай шляхты.

Антоній Вайніловіч набыў у Грыцкевічаў маёнтак Душава, ля Капыля. Дзядзька Э.Вайніловіча, Тадэвуш Вайніловіч, быў таксама слуцкім павятовым маршалкам шляхты, апошнім абраным, бо наступныя маршалкі прызначаліся ўжо расійскім урадам.

Бацька Эдварда Вайніловіча, Адам (1806—22.12.1874), быў межавым (гранічным) суддзёю Слуцкага павета. Адам Вайніловіч скончыў Слуцкую кальвінісцкую гімназію, а потым Віленскі універсітэт. Маці, Ганна з Ваньковічаў, была з-пад Мінска, дзе быў родавы маёнтак Ваньковічаў у Сляпянцы. Менавіта там і нарадзіўся Эдвард Вайніловіч. Бацька яго быў дваюрадным братам Станіслава Манюшкі, а родная цётка бацькі, Фларэнтына, была замужам за Міхалам Кастравіцкім (гербу Байбуза) з маёнтку Навасёлкі, ля Койданава, сваяком аднаго з беларускіх класікаў канца XIX—пачатку XX ст., Каруся Каганца (Казіміра Кастравіцкага). Дарэчы, і сястра Эдварда Вайніловіча, Ядвіга, была замужам з Вацлавам Кастравіцкім (гербу Байбуза). Вайніловічы таксама былі сваякамі Хмараў, з іх рэзідэнцыяй у Сёмкавым Гарадку.

Такім чынам, як гэта было ў шляхецкім асяроддзі, род Вайніловічаў меў сваяцкія сувязі з вядомымі ў Мінскай губерні шляхецкімі родамі.

У параўнанні з іншымі шляхецкімі сем'ямі сям'я Адама Вайніловіча была багатай. Маёнткі Савічы і Пузаў (Цімкавіцкая воласць Слуцкага павета) разам з некалькімі фальваркамі і вёскамі налічвалі ў пачатку XIX ст. каля 5 тысяч дзесяцін зямлі (на паўднёвы захад ад Капыля). Гэты багаты маёнтак перайшоў да сям'і Вайніловічаў у канцы XVI—пачатку XVII ст. у спадчыну ад Тальшэўскіх. Шляхецкі род Вайніловічаў быў спачатку праваслаўным, а ў XVII ст. Вайніловічы прынялі каталіцтва. Хаця царква ў Савічах была да 1839 года уніяцкай (толькі ўжо потым праваслаўнай). У маёнтку Савічы захоўваліся старажытныя дакументы роду і партрэты яго прадстаўнікоў, была сабрана багатая бібліятэка. У пэўнай ступені гэта быў невялічкі культурны асяродак для мясцовай шляхты, куды яна часам збіралася.

Атрымаўшы добрую хатнюю адукацыю, Эдвард Вайніловіч у 1861 г. паступіў у 4-ы клас Слуцкай гімназіі і ў 1865 г. скончыў яе. Юнак быў сведкам паўстання 1863 года і сам адчуў наступствы пасля яго падаўлення. Ён адзначаў ва ўспамінах, што ў 4-м і 5-м класах урокі рэлігіі вяліся па-польску і вывучалася польская мова як прадмет. А ўжо ў 6-м і 7-м класах нават катэхізіс выкладаўся па-руску і на рускай мове вучні здавалі экзамен па катэхізісу. У 1862—1863 гг. вучні Слуцкай гімназіі насілі значкі з арлом на гальштуку і з маленькімі партрэтамі Касцюшкі і іншых дзеячаў вызваленчага руху. Патаемна чыталі падпольную прэсу. Пасля падаўлення паўстання Слуцкая гімназія была пераведзена з ведамства кальвінісцкага (рэфармацкага) сіноду ў ведамства Міністэрства асветы. Пасля заканачэння Слуцкай гімназіі ў 1865 г. з залатым медалём мала-

ды Эдвард Вайніловіч быў без конкурсу прыняты ў Санкт-Пецярбургскі тэхналагічны інстытут, які скончыў з адзнакай у 1869 г. па спецыяльнасці «інжынер-механік». Адразу пасля заканачэння інстытута атрымаў месца інжынера-механіка на Пуцілаўскім заводзе ў Пецярбургу з месячнай платай 50 рублёў серабром і з службоваю кватэрай.

Пасля Эдвард Вайніловіч стажыраваўся на заводах Германіі і Бельгіі. Пасля смерці бацькі (у снежні 1874 г.) Эдвард Вайніловіч атрымаў у спадчыну багатыя маёнткі і заняўся сельскай гаспадаркай, якую пачаў весці рацыянальна, з выкарыстаннем сельскагаспадарчых машын і еўрапейскага вопыту вядзення гаспадаркі. Заняўся ён і грамадскай дзейнасцю.

У гэты час царскі ўрад намагаўся перасяліць у Беларусь расійскіх памешчыкаў і чыноўнікаў, прадаючы ім па таннай цане або перадаючы канфіскаваныя ў паўстанцаў 1863 г. і іх прыхільнікаў маёнткі, ■ не прадаючы іх мясцовым беларускім сялянам. Мэтай царскага ўраду было стварыць у Беларусі расійскую групоўку памешчыкаў, укараніць рускае землеўладанне. Пазней міністр унутраных спраў Расіі Л.С.Макаў атрымаў канфіскаваны маёнтак Блонь (Мар'іна Горка) у Ігуменскім павеце. Ён і стаўся заснавальнікам Мінскага губернскага таварыства сельскай гаспадаркі (20.08.1876 г.). У статуце таварыства было запісана, што яго членамі могуць быць толькі асобы рускага паходжання. У таварыства ўвайшло шмат дзяржаўных чыноўнікаў, і яго ўзначаліў губернскі кіраўнік дваранства (па прызначэнню) В.І.Паўлаў, памешчык Тамбоўскай губерні, паплечнік Мураўёва-вешальніка. Таварыства існавала фармальна і пытаннямі сельскай гаспадаркі не займалася. Праз два гады В.І.Паўлаў вымушаны быў запрасіць у таварыства некалькі мясцовых памешчыкаў-рэфарматараў: Леона Ваньковіча, Віктара Сьвіду, Аляксандра Скірмунта, Зыгмунта Свянціцкага і Эдварда Вайніловіча. Пункт статуту з выключным сяброўствам у таварыстве толькі рускіх па паходжанні быў выкрэслены. Паступова ў Мінскае губернскае таварыства сельскай гаспадаркі ўвайшлі і іншыя мясцовыя ўраджэнцы, а губернскія чыноўнікі пакінулі таварыства. З 1878 г. Эдвард Вайніловіч быў абраны віцэ-старшынёй таварыства. У 1878 г. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі налічвала 64 сябра, а ў 1901 г. — 675.

Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі дзейнічала да 1917 года. Яно мела чатыры секцыі: агранамічную, лясную, па конегадоўлі і па жывёлагадоўлі, а таксама доследнае поле. Сельскагаспадарчыя эксперыменты былі наладжаны і ў асабістых гаспадарках сяброў таварыства. У 1897 г. пры таварыстве было арганізавана і камерцыйнае аддзяленне — сіндыкат па збыце прадукцыі і дастаўцы сябрам таварыства сельскагаспадарчых машын. Гэтая кааперацыйная дзейнасць дазваляла сябрам таварыства цэнтралізавана збываць збожжа ваеннаму ведамству і прадаваць прадукцыю на піўныя заводы Пецярбурга і Масквы, прадаваць лес у Данецк і

на экспарт, а прадукты жывёлагадоўлі — у Варшаву. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі арганізавала ў Мінску дзве сельскагаспадарчыя выставы, у 1901 і 1912 гг.

Э.Вайніловіч быў таксама абраны старшынёй Таварыства дабрачыннасці Слуцкага павета, якое існавала яшчэ з пачатку XIX ст. Ён прычыніўся да адкрыцця ў Слуцку сярэдняй гандлёвай школы. На сродкі сяброў Таварыства дабрачыннасці ў Слуцку быў створаны інтэрнат на некалькі дзесяткаў месцаў, у якім жыла моладзь, што вучылася ў Слуцку, з вясковай дробнай шляхты і дзяцей служачых у памешчыцкіх маёнтках. Яны або бясплатна, або за невялікі кошт атрымоўвалі месца ў інтэрнаце і харчаванне.

Падчас рэвалюцыі 1905—1907 гг., паводле асноўных законаў Расійскай імперыі 1906 г., у гэтай дзяржаве быў уведзены парламенцкі лад. Разам з Дзяржаўнай думай была створана і вышэйшая палата расійскага парламента — Дзяржаўны савет, пераўтвораны з вышэйшага законадарадчага органа імперыі ў заканадаўчы. Дзяржаўны савет разглядаў прынятыя Дзяржаўнай думай законы, а пасля прыняцця іх Дзяржаўным саветам законы ўжо накіроўваліся на зацвярджэнне імператару і тады ўжо канчаткова прымаліся. У склад Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі ўваходзілі члены па прызначэнню імператара Мікалая II і члены па выбарах (пароўну). Тыя, хто ўваходзіў у склад Дзяржаўнага савета па выбарах, выбіраліся ад дваранскіх сходаў, губернскіх земскіх сходаў, духавенства (выбіраў сінод), Расійскай акадэміі навук і універсітэтаў, а таксама былі там прадстаўнікі прамысловых і гандлёвых колаў. Увогуле гэта быў больш кансерватыўны орган, чым Дзяржаўная дума, бо шырокія слаі насельніцтва ў ім прадстаўлены не былі, ды і тая частка членаў савета, якая выбіралася, прадстаўляла карпаратыўныя і саслоўныя органы і арганізацыі. На Мінскую губерню прыпадала адно месца ў Дзяржаўным савеце.

У 1906 годзе на сходзе буйных і сярэдніх памешчыкаў (паводле зямельнага цэнзу звыш 150 дзесяцін зямлі) у зале Мінскага дваранскага сходу Эдвард Вайніловіч быў абраны патаемным галасаваннем членам Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі і цяпер значную частку свайго часу прысвячаў дзяржаўным справам у Санкт-Пецярбургу і ў Мінску. У Дзяржаўным савеце Э.Вайніловіч быў абраны старшынёй «Кола Каралеўства Польскага, Літвы і Русі», якое складалася з памешчыкаў-католікаў Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны. У гэты час Эдвард Вайніловіч меў дзяржаўны чын статскага саветніка і быў дэпутатам Мінскага губернскага дваранскага сходу ад Слуцкага павета.

Пасля ўвядзення земскага мясцовага самакіравання ў Мінскай губерні ў 1911 годзе Эдвард Вайніловіч быў абраны адным з дэпутатаў мінскай губернскай земскай управы ад «польскай» (каталіцкай) курыі Слуцкага павета. Ён бярэ чынны ўдзел у працы губернскага самакіра-

вання. На працягу трыццаці пяці гадоў Э.Вайніловіч быў таксама ганаровым суддзёй Слуцкага павета.

Эдвард Вайніловіч ажаніўся на пачатку 80-х гадоў з Алімпіяй Узлоўскай, ад якой меў двух дзяцей — Алену (1884—1903) і Сымона (1885—1897). Смерць дзяцей моцна паўплывала на Эдварда Вайніловіча, і ён у іх памяць у значнай ступені на свае сродкі пабудаваў у Мінску касцёл святых Сымона і Алены («Чырвоны касцёл»). Для пабудовы касцёла, фундатарам якога быў Эдвард Вайніловіч, 19 сакавіка 1905 г. быў створаны грамадскі камітэт па будаўніцтву касцёла, з 14 членаў і 6 кандыдатаў, старшынёй якога быў абраны Э.Вайніловіч. Аднак 11 красавіка 1905 г. ён адмовіўся ад пасады старшыні камітэта, і на яго месца быў абраны гарадскі галава М.Валовіч. Гэты храм будаваўся ў 1905—1910 гг. паводле праекта архітэктара Тамаша Пайздэрскага. У праектаванні і будаўніцтве храма бралі ўдзел архітэктары У.Марконі і Г.Гай. Інтэр'еры храма былі аздоблены мастаком Ф.Бруздовічам і скульптарам З.Оттам. Сучаснікі былі ўражаны высокай якасцю будаўнічых работ. Так, спецыяльную чырвоную цэглу разнастайнай канфігурацыі прывозілі ў Мінск у асобных скрынях з Чэнстаховы, а дахаўку — з Влацлаўку. Для калон і алтароў быў падрыхтаваны ружовы пясчанік і келецкі мармур. У 1909 г. на касцёльную вежу былі падняты тры званы: самы вялікі «Міхал», сярэдні «Эдвард» і меншы «Сымон». 21 лістапада 1910 г. новы мінскі храм быў асвечаны. У 1916 г. была пабудавана новая мураваная плябанія.

Сам Эдвард Вайніловіч у сваіх успамінах заўважаў, што ён «добра валодаў беларускай мовай, таксама як і польскай, і ўжываў яе пастаянна ў дачыненнях з сельскагаспадарчымі работнікамі». Ён некалькі дзесяткаў гадоў быў у пастаянных кантактах з беларускімі грамадскімі і палітычнымі дзеячамі і з усімі праявамі беларускага нацыянальнага руху. Яшчэ ў адносна невялікім на пачатку XX ст. Мінску ён сустракаўся з Антонам Луцкевічам і Казімірам Кастравіцкім (Карусём Каганцом), а ў Вільні і Санкт-Пецярбургу — з В.Іваноўскім, Б.Эпімахам-Шыпілам і іншымі дзеячамі. Ён матэрыяльна дапамагаў беларускім суполкам, якія працавалі ў рэчышчы нацыянальнага самавызначэння і нацыянальнага адраджэння. Ён дапамог у выданні літаратурнага і навукова-папулярнага часопіса для моладзі «Лучынка» у Мінску ў 1914 г., сельскагаспадарчага часопіса «Саха» у Вільні і Мінску (1912—1915 гг.), фінансава падтрымаў першае беларускай выдавецтва ў Пецярбургу «Загляне сонца і ў наша аконца» (1906—1914 гг.).

Аднак да палітычнага беларускага руху Э.Вайніловіч не далучаўся з-за таго, што амаль усе беларускія нацыянальныя арганізацыі мелі сацыялістычны накірунак, а гэта не адпавядала поглядам Эдварда Вайніловіча на грамадскі і эканамічны лад краіны. Тым не менш у 1917—1918 гг. ён працягваў супрацоўнічаць з беларускімі палітычнымі дзеячамі. Часам ён

удзельнічаў у агульных сходах беларускіх арганізацый у Мінску, бо з 1917 г. больш часу знаходзіўся ў сваім маёнтку Савічы ў Слуцкім павеце.

Эдвард Вайніловіч належыў да апалячанай беларускай шляхты, якая ў XVII ст. перайшла ў каталіцтва, але адчувала сваю сувязь з гэтай зямлёй і з яе народамі і спрыяла развіццю беларускага нацыянальнага і культурнага руху. Ён разам з былым дэпутатам Дзяржаўнай думы ад Мінскай губерні Р.Скірмунтам не ўвайшоў у склад Польскай рады Мінскай зямлі, што ўтварылася ў сакавіку 1917 г. У 1917 годзе ён працаваў у земскіх арганізацыях разам з дзеячам беларускага руху Аркадзем Смолічам і Раманам Скірмунтам.

У кастрычніку 1917 г. у бліжэйшых да яго маёнтку вёсках і ў самім маёнтку быў створаны сялянскі камітэт, які ўзяў на сябе кіраванне маёнткам і распрадаваў на сваю карысць сельскагаспадарчую прадукцыю. Пры бязладным адступленні з Заходняга фронту рэшткаў расійскай арміі 19—21 лютага 1918 г. салдаты і мясцовыя жыхары разрабавалі дом Э.Вайніловіча і гаспадарчыя будынкі ў Савічах. Былі знішчаны бібліятэка, архіў і галерэя партрэтаў, былі забраны коні і каштоўныя прадметы. Э.Вайніловіч знаходзіўся ў суседзяў, таму і выратаваўся.

У канцы лютага 1918 г., калі Слуцкі павет быў заняты нямецкімі войскамі, новая ўлада вярнула маёнтак яго ўладальніку, і Э.Вайніловіч працягваў гаспадарнічаць у сваім маёнтку. У гэты час Э.Вайніловіч быў прыхільнікам узнаўлення Вялікага княства Літоўска-Беларускага, як ён яго сам вызначаў. З планам адраджэння гэтай дзяржавы Э.Вайніловіч і выступіў ад імя мясцовых памешчыкаў. Нямецкія акупацыйныя ўлады сустрэлі гэты план непрыхільна. Э.Вайніловіч стварыў «Саюз абшарнікаў мінскай губерні». Падчас нямецкай акупацыі Беларусі ў 1918 г. Э.Вайніловіч заставаўся дэпутатам ад Слуцкага павета ў Мінскім губернскім дваранскім сходзе. 29 верасня 1918 г. ён нават балатаваўся на выбарах на пасаду мінскага губернскага маршалка дваранства, аднак галасы падзяліліся пароўну (54 за і 54 супраць). Паколькі Э.Вайніловіч не набраў большасці галасоў, абраным на пасаду маршалка ён не быў. Балатаванне праводзілася шарамі — белымі і чорнымі (за і супраць). Маршалкам быў абраны граф Георгій Эмерыкавіч Чапскі.

Эдвард Вайніловіч падтрымаў утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, але з асцярогай паставіўся да абвяшчэння яе поўнай незалежнасці з-за сваіх кансерватыўных поглядаў.

У гэты час Эдвард Вайніловіч прымаў удзел у некаторых пасяджэннях Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, у «Юбілейным доме», дзе праходзілі яе пасяджэнні. Рада БНР запрашала прадстаўнікоў розных грамадскіх арганізацый.

У снежні 1918 г. перад прыходам у Беларусь Чырвонай арміі Э.Вай-

ніловіч выехаў у Варшаву, дзе быў адным са стваральнікаў «Саюза палякаў з беларускіх ускраін». У студзені 1919 г. гэты саюз прапанаваў польскаму ўраду ўстанавіць усходнюю мяжу Рэчы Паспалітай (уключна з Вялікім княствам Літоўска-Беларускім) да Дняпра і Заходняй Дзвіны. У красавіку 1919 г. Эдвард Вайніловіч удзельнічаў у пераўтварэнні «Саюза абшарнікаў Мінскай губерні» у «Саюз абшарнікаў Літвы і Беларусі ў Варшаве», куды ўваходзілі буйныя землеўладальнікі з Беларусі, што знаходзілі прытулак у Варшаве. Старшынёй гэтага саюза быў выбраны Дамінік Даўгяла.

Адначасова Э.Вайніловіч не парываў сувязей з беларускімі дзеячамі. У маі 1919 г. разам з В. і Л. Дубейкаўскімі стварыў у Варшаве «Польска-беларускае таварыства для палітычнага і культурнага супрацоўніцтва на Беларусі», сярод сяброў якога былі Мельхіор Ваньковіч, княгіня Магдалена Радзівіл, Раман Скірмунт.

Пасля ўдалага наступу польскіх войск у Беларусі ў жніўні 1919 г. Э.Вайніловіч выехаў у Мінск і ў пачатку верасня быў ужо ў сваім маёнтку Савічы. Ён па-ранейшаму працягваў грамадскую дзейнасць, выязджаў у Мінск і Варшаву. Мінск яго ўразіў тым, што ўсе шыльды ў горадзе былі на польскай мове, школы — польскія, а жыхары размаўлялі ці намагаліся гаварыць па-польску. Ён адзначаў, што нават яўрэі загаварылі па-польску. Яго зацікавіла тое, што на «чорным» валютным рынку курс расійскага дарэвалюцыйнага рубля ішоў угару, а курс польскай маркі падаў.

Падчас польскай акупацыі Беларусі Эдвард Вайніловіч быў прыхільнікам незалежнай Беларусі ў саюзе з Польшчай, выступіў супраць магчымага падзелу тэрыторыі Беларусі паміж Польшчай і Савецкай Расіяй. 4 ліпеня 1920 г. пачаўся наступ войск Заходняга фронту ў Беларусі. Паводле загаду слуцкага павятовага старосты ўсе абшарнікі ды іншыя, хто не захацеў застацца пры савецкай уладзе, павінны былі эвакуіравацца да Слонімскага павета. Вечарам 7 ліпеня 1920 г. Э.Вайніловіч з жонкай выехаў сваёй фурманкай на захад. Паколькі Чырвоная армія наступала імкліва, ён паехаў па дарозе на Кобрын, далей на Брэст, Люблін і далей ў гарадок Хжануў у Кракаўскім ваяводстве.

Эдвард Вайніловіч быў глыбока абураны падпісаннем перамір'я і папярэдняга мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Польшчай 12 кастрычніка 1920 г., паводле якога тэрыторыя Беларусі была падзелена. Ён не мог зразумець, чаму «Мінск, сталіцу Беларусі» пакінулі ў руках бальшавікоў. Толькі праз тыдзень ён даведаўся, што лінія дзяржаўнай мяжы пакінула на савецкім баку яго маёнтак. Э.Вайніловіч паехаў у Варшаву на сход «Саюза абшарнікаў Літвы і Беларусі ў Варшаве», дзе даведаўся, што польскі сойм аднагалосна зацвердзіў «ганебныя», як назваў, умовы Рыжскага мірнага дагавора, назваўшы яго чацвёртым падзелам краю. На гэтым сходзе выступіў прадстаўнік Саюза М.Абезерскі

як эксперт на рыжскіх перамовах, які паведаміў, што галава савецкай дэлегацыі А.Іофэ прапанаваў перадаць тэрыторыю Беларусі Польшчы, аднак галава польскай дэлегацыі Ст.Грабскі не згадзіўся; каб «Польшча пазбавілася гэтай беларускай язвы», ён задаволіўся лініяй мяжы на захад ад Лепеля, Мінска і Слуцка. Сход «Саюза абшарнікаў» пратэставаў супраць Рыжскай дамовы 1920 г.

Карыстаючыся тым, што дзяржаўная мяжа яшчэ не была ўстаноўлена на мясцовасці, а ў лістападзе Слуцкі павет, які ўваходзіў у склад нядаўна (31 ліпеня) адноўленай БССР, быў яшчэ заняты польскімі войскамі, якія ўжо пачалі адводзіцца за лінію мяжы, Эдвард Вайніловіч, едучы з Нясвіжа, наведаў 27 лістапада 1920 г. свой маёнтак Савічы, дзе прабыў толькі тры гадзіны і развітаўся назаўсёды са сваім радавым гняздом. У гэты час польскія войскі адступілі за лінію мяжы і нават з 15-кіламетровай нейтральнай зоны на сваім боку. Аналагічная 15-кіламетровая зона была і на савецкім баку. Таму маланкавы праезд дадому Э.Вайніловіча адбыўся ў вайсковай пустэчы: жаўнераў тут пакуль не было.

Але ўжо пачыналася Слуцкае паўстанне 1920 г. У доме Э.Вайніловіча ў Слуцку 14—15 лістапада 1920 г. адбыўся беларускі з'езд Случчыны, які выбраў раду Случчыны як часовы орган улады Беларускай Народнай Рэспублікі на тэрыторыі Слуцкага павета. Былі сфарміраваны два палкі — Слуцкі і Грозаўскі, якія стварылі Слуцкую брыгаду стральцоў Беларускай Народнай Рэспублікі. Менавіта ў той дзень, калі Э.Вайніловіч наведаў Савічы, 27 лістапада 1920 г., Слуцкая брыгада распачала ваенныя дзеянні. Неўзабаве яны адбываліся і на тэрыторыі Цімкавіцкай воласці, там, дзе быў маёнтак Э.Вайніловіча. Слуцкае паўстанне скончылася 28 снежня 1920 г., калі жаўнеры брыгады, не маючы боепрыпасаў, вымушаны былі адступіць на тэрыторыю, што кантралявалася Польшчай.

Э.Вайніловіч сачыў за гэтымі падзеямі, занатоўваючы іх у сваім дзённіку. Ён спачуваў «беларускім атрадам». Ён яшчэ спадзяваўся, што лінія дзяржаўнай мяжы будзе зменена падчас падпісання канчатковага міру. У сакавіку 1921 г. ён даведаўся, што ў яго мясцовасці дзяржаўная мяжа паводле мірнага дагавору паміж Расіяй і Польшчай ад 18 сакавіка 1921 г. не змянілася і маёнткі Савічы і Пузаў засталіся на савецкім, як ён пісаў «расійскім», баку мяжы. Хутка ён спыніў пісаць свой дзённік.

Апошнія гады жыцця Эдвард Вайніловіч цяжка хварэў і адышоў ад грамадскага жыцця. Памёр ён у Быдгашчы, у Польшчы, 16 чэрвеня 1928 года.

Эдвард Вайніловіч з'яўляецца аўтарам успамінаў, якія былі выдадзены ў Вільні ў 1931 г. Прадмову да іх напісаў вядомы польскі гісторык, прафесар Віленскага універсітэта Януш Івашкевіч, які і выдаў гэтыя мемуары.

Твор:

Woyniłłowicz E.Wspomnienia, 1847—1928. Cz. 1, Wilno, 1931.

Літаратура:

Грыцкевіч А.П. Вайніловіч Эдвард Адам // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Том 2. Мінск, 1994. С. 201—202.

Анатоль Грыцкевіч

Пры сваім узнікненні навуковая ісціна праходзіць тры стадыі разумення. Спачатку кажуць, што гэта абсурд, затым — у гэтым нешта ёсць. Нарэшце — усё гэта даўно вядома.

Э.Рэзерфорд

Якуб НАРКЕВІЧ-ЁДКА
(1847—1905)



еспагадны лёс навукоўца.

Імя выдатнага беларускага вучонага, вынаходца, урача, прафесара Якуба Атонавіча Наркевіча-Ёдкі (1847—1905) цяпер больш-менш вядома па шэрагу кампетэнтных навукова-папулярных публікацый. Яно ўваходзіць ужо ў даведнікі, вучэбныя дапаможнікі, энцыклапедыі, літаратурныя апрацоўкі, усё шырэй замацоўваецца ў паўсядзённым жыцці.

А яшчэ зусім нядаўна справа абстаяла інакш. Над імем і справамі вучонага буяла трава забыцця. Аўтару гэтых радкоў пашчасціла, пачынаючы з канца 60-х, прымаць непасрэдны ўдзел у адраджэнні постаці нашага слыннага земляка.

Плён больш як дзесяцігадовай працы быў зведзены і апублікаваны ў 1980 годзе ў бюлетэні «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», аднак артыкул «Вучоны шырокага дыяпазону», на жаль, быў не заўважаны тады нашымі творчымі коламі.

Толькі пазней пры садзеянні акадэміка Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі Алеся Махнача ды непасрэдным удзеле члена-карэспандэнта Акадэміі Віктара Грыбкоўскага, пасля шэрагу навуковых публікацый імя вучонага пачало паступова ўваходзіць ва ўжытак.

Навуковыя погляды і вынаходствы нашага земляка зараз прааналізаваны з пазіцый сучасных навуковых дасягненняў. Пацверджана іх высокая вартасць, увасабляючая тагачасны прарыў вучонага ў невядомы да гэтага свет на сутыку фізічнай, электрычнай, біялагічнай і нават псіхалагічнай навук.

Даказана, што наш вучоны не толькі выявіў шляхі да новых адкрыц-

цяў у галіне прыродазнаўства, але і даў з'явам дастаткова грунтоўнае фізічнае тлумачэнне з адначасовамі прапановамі іх прыкладнога выкарыстання.

Паколькі вынаходствы Якуба Атонавіча рэфераваліся і ацэньваліся не толькі ў тагачаснай Расіі, але і за мяжой, яго навуковыя справы можна лічыць дзейсным укладам у беларуска-руска-заходнееўрапейскае супрацоўніцтва.

Сёння мы, звяртаючыся да асобы Я.Наркевіча-Ёдкі праз 150 гадоў з дня нараджэння, сведчым факт адраджэння, вяртання яго імя.

Бяспамяцтва ў адносінах да спадчыны вучонага пачалося яшчэ да рэвалюцыі і зараз мае адпаведнае тлумачэнне.

Вучоны працаваў пераважна ў сваім спадчынным маёнтку «Над-Нёман» на Уздзеншчыне, на самым вытоку Нёмана. Працаваў большай часткай у адзіноце, на свой кошт і рызыку. Ён не здолеў ці не захацеў мець паплечнікаў, не стварыў сваёй школы, мала публікаваўся.

Асноўныя работы Я.Наркевіча-Ёдкі — навуковыя справаздачы перад вучонымі ўстановамі Заходняй Еўропы. Менавіта там і да сёння знаходзяцца галоўныя, услаўляючыя яго, водгукі, рэфераты, пратаколы, адрасы навуковых аўтарытэтаў таго часу.

А ў нас? Тут правіла баль пыхлівае, маладасведчанае шляхецтва. Яно з пагардай ставілася да незразумелых яму спраў вучонага. Пра тое сведчаць матэрыялы ў газеце «Виленский вестник» за 1894 год:

«Надзвычай таварыскі і экспансіўны па сваёй натуры малады вучоны любіць падзяліцца сваімі думкамі і ведамі з суседзямі-памешчыкамі ды наязджаючымі да яго гасцямі.

Але... Я.А. большай часткай сустракаў з боку акружаючых напоўварожыя, напоўнасмешлівыя адносіны да сябе і да сваіх навуковых заняткаў і даследаванняў, з якіх многія ён намагаўся дапасаваць да практыкі ў галіне сельскай гаспадаркі. Такая доля, такія неспагадлівыя адносіны — звычайны лёс кожнага, хто, не пакідаючы практычнага жыцця, працягвае ажыўлена цікавіцца пытаннямі быцця і духа, і прысвячае свой вольны час навуковым заняткам...

«Як! .. NN хоча быць разумнейшы ад нас!..», «... Нічога добрага не выйдзе з такога дылетантцтва...», «Бавіцца хімерамі..», «... Панскае штукарства!..» — такія звычайныя водгукі блізкіх і знаёмых таго чалавека, які захаваўшы ў сваёй душы іскру Божую, не хавае свайго, ад Бога дадзенага яму, таленту ў зямлю і, не гледзячы на багацце і раскошу, працуе ў поце сваёй асобы над выпрацоўкай пытанняў вышэйшага парадку...

Такія адносіны з боку акружэння дадавалі нямала гора чуллівай душы Я.А., але ніколі не паўплывалі на яго напал і любоў да навукі. Натура энергічная і дзейсная з шырокім розумам, — Я.А. ведаў, што такія

адносіны заўсёды выпадаюць на долю ўсякага чалавека, які ўзвышаецца па сваіх прыродных дараваннях і энергіі над узроўнем пасрэднасці...».

Відныя першапраходцы ва ўсе часы былі, як правіла, акружаны мноствам пасрэдных, мала падыходзячых для сур'ёзнай навукі апанентаў. Яны дапамагаюць выцесніць сапраўдных вучоных з адпаведнага іх дастатусу навуковага месца. Пры жыцці навуковай зоркі зрабіць гэта davolі цяжка. Іншая справа — пасля яе адыходу ў свет лепшы. Здаралася, што вучоныя, іх выключныя справы адсоўваліся на дзесяцігоддзі, заступаючы месца другасортнасці.

Непавагу ж пэўных колаў тагачаснай інтэлігенцыі да плёну спраў вучонага можна патлумачыць і так: фігура яго — чалавека памяркоўнага, традыцыяналісцкі мудрага — кепска дапасоўвалася да палітычных перацягванняў, а яго яскрава матэрыялістычная пазіцыя — да містычных ачмурэнняў.

Але час ішоў, і адхінутыя ідэі адраджаліся, іншы раз і праз зусім новых, далёкіх ад узроўню першаадкрывальнікаў людзей. Так, дарэчы, сталася і на гэты раз.

Нямала бяды натварылі і твораць нашаму вучонаму-земляку маладасведчаныя журналісты і некампетэнтныя прапагандысты яго ведаў і заслуг.

Можа, і ў гэтым крыецца сакрэт празмерна хуткага забыцця вучонага пасля смерці. Сам ён, чалавек надзвычай сціплы, не заносіў сваю асобу ў навуковыя і энцыклапедычныя выданні. Апаненты, само сабой, тое зрабіць не парупіліся. Для спраў вучонага повязь часоў перарвалася болей чым на 70 гадоў. Але што тыя дзесяткі гадоў для адыйшоўшага ў вечнасць вучонага! Яго філасофскі розум выдатна ўсведамляў гэту суадносіну...

У паслярэвалюцыйны перыяд Я.Наркевіча-Ёдку калі і ўспаміналі, то толькі як жорсткага прыгнятальніка сялян. Нагодай таму паслужыў факт выступлення супраць яго ў кастрычніку 1903 года мяшчан і сялян з суседняга мястэчка Пясочнае, былой яго вотчыны. Набыўшы яго і землі на левым беразе Нёмана, Наркевічы-Ёдкі заадно з імі прыдбалі адвечныя клопаты ад песачанаў, якія спрадвек дамагаліся вольнасці не толькі асабістай, але і маёмаснай. Незадаволеныя памерамі арэнднай платы мяшчане лічылі, што арандаваная ў Я.Наркевіча-Ёдкі зямля таго не варта, неаднаразова спынялі выплату арэнды. Канфлікт цягнуўся амаль ці не з 1828 года.

Так што выступленне сялян у 1903 годзе, у сувязі з якім нават выклікалася з Мінску войска, было следствам санкцый за парушэнне песачанамі ўзятых імі ж умоў згодна з заключаным дагаворам на арэнду зямель і нічога іншага ў сабе не ўтрымлівала.

Тым не менш факт безахвярнага падаўлення выступлення песача-

наў асабліва падкрэсліваўся паслярэвалюцыйным афіцыёзам і зацьміў сабой усё тое значнае і вялікае, што рабілася ў той час на наднёманскай зямлі...

Адначасова ў памяці людзей захоўваўся зусім адрозны ад афіцыйнага вобраз суседскага пана, па ўспамінах — доктара, прафесара, па натуры дзівака. Менавіта простыя людзі сёння больш за другіх шануюць вучонага. Яны хавальнікі памяці пра яго справы.

Вось на такой глебе і пачыналася адраджэнне імя вучонага ў спалучэнні нярэдка процілеглых па зместу звестак з архіваў, бібліятэк, успамінаў мясцовых жыхароў.

Але як бы там ні было, у 1988 годзе пра Я.Наркевіча-Ёдку грамадскасць Беларусі ведала даволі многа. Неахопленымі засталіся і застаюцца пакуль навуковыя сховішчы Заходняй Еўропы. Аднак і на тыя зараз складзены даволі дакладны рэестр.

Вывучэнне спадчыны вучонага прадаўжаецца і ідзе зараз углыб. Яго постаць прыцягвае ўвагу і як выдатная культурная з'ява тагачаснай Міншчыны.

Дастойны прадаўжальнік старажытнага роду.

Радавод Наркевічаў-Ёдкаў засведчаны пачынаючы з XVI стагоддзя, калі іх продку Марціну Ёдку ў часы Рэчы Паспалітай за ваенныя справы былі дараваны маёнткі каля Ліды. За Жыгімонта Аўгуста гэты род за ўдзел у ваенных экспедыцыях, як роўна і ў іншых адносінах, меў значныя заслугі.

У гербе Наркевічаў-Ёдкаў адлюстраваны Ліс, страла ж яму была нададзена пазней. Ад Ліса, што сядзіць на шляхецкім рыцарскім шоламе, апускаецца харугва-шчыт малінавага колеру з двума крыжамі.

Па часу існавання род Наркевічаў-Ёдкаў даходзіць да ўладанняў Ягелонаў. Мае родапачынальнікам аднаго з Ёдкаў, ад якога пайшлі сыны Нарка (Марка) і Петка. Адпаведна адзін з прыдомкаў прозвішча атрымаў дадатак Наркевічаў-, а другі — Петкавічаў-Ёдкаў.

Затым нашчадкі роду рассяліліся ў Наваградскім ваяводстве, у Слуцкім і Мінскім паветах, на землях Вільні і Інфлянтаў (прыбярэжнай часткі сённяшняй Латвіі).

Якуб Атонавіч Наркевіч-Ёдка нарадзіўся на Міншчыне, у маёнтку маці «Турыне» на Пухаўшчыне 27 снежня 1847 года, атрымаўшы адразу яшчэ два дадатковыя імёны Сармата і Жыгімонта. Можа таму вучонага іншы раз залічваюць у свае шэрагі татары, не адракаюцца ад яго палякі і літоўцы.

Маці Якуба Анэля (Ганна) Якубава Эстка належыла да роду Касцюшкаў. Яна даводзілася ўнучкай старэйшай сястры Тадэвуша Касцюшкі — Ганны, якая выйшла ў 1762 годзе за смаленскага стольніка Пятра Эст-

ку. Яна слыла ў адрозненні ад малашляхетнага мужа вытанчанай, адукаванай жанчынай, стварыўшай і падтрымліваўшай у сям'і атмасферу ўзвышанасці і творчасці.

Старэйшая сястра Якуба Анэля — таленавітая паэтэса — і малодшы брат Гуга памерлі рана, зусім маладымі. Пецярых дзяцей брата Якуб Атонавіч выхоўваў і ўтрымліваў да апошніх дзён свайго жыцця.

Дзед вучонага Ануфрый займаў пасаду ігуменскага маршалка, прыцягваўся да адказнасці за дачыненне да паўстання 1831 г. і быў вымушаны пажыццёва не пакідаць свой маёнтак «Над-Нёман».

Дваюрадны брат Якуба Вітольд Аляксандравіч Наркевіч-Ёдка праслыў выдатным хірургам-афтальмолагам. Апошнія гады з-за хваробы ён жыў у канцы мінулага стагоддзя ў сваім маёнтку «Бабоўня» (цяпер Капыльскага раёна).

Яго сын, таксама Вітольд, відны польскі палітычны дзеяч, — стварыў разам з Ю.Пілсудскім Польскую сацыялістычную партыю. Трымаў сувязь з Ф.Энгельсам, Г.Пляханавым, сустракаўся з У.Леніным. З апошнім разышоўся адразу і назаўсёды. А на пачатку свайго жыццёвага шляху здаваў экстэрнам экзамены на атэстат сталасці ў Слуцкай гімназіі.

Яшчэ адзін дваюрадны брат Якуба, інжынер-металург і рэвалюцыянер Іван (Ян) Аляксандравіч Наркевіч-Ёдка, меў маёнтак у Кацельніках на Капыльшчыне. Яго жонка Алена даводзілася пляменніцай генералу Я.Дамброўскаму. Іван аказаў вялікі ўплыў на фарміраванне палітычнага светапогляду свайго пляменніка, вышэй узгаданага Вітольда. Зяцем жа Івана быў выдатны беларускі і польскі адвакат, дэлегат І з'езда РСДРП Казімір Петрусевіч.

Аўтарам гэтых радкоў адноўлены радавод Наркевічаў-Ёдкаў. Ён увабраў у агульнай складанасці да 200 імёнаў. Па разгалінаваннях родавага дрэва Наркевічаў-Ёдкаў можна прасачыць, як імёны яго далёкіх прадстаўнікоў паступова пераходзяць з канца XVII—першай паловы XVIII стагоддзяў з беларускіх у польскія. Як усё больш рэлігійныя перакананні адзначаюцца рымска-каталіцкім веравызнаннем. Хаця ў ім працягваюцца і паслядоўнікі праваслаўя, сустракаюцца нават пратэстанты. Адным словам, яны, як і вядомыя тады роды Тышкевічаў, Алелькавічаў, Масальскіх, Астрожскіх, Вішнявецкіх, Заслаўскіх і іншых, прайшлі свой вымушаны шлях у тагачаснай Рэчы Паспалітай ад праваслаўя і беларускасці да каталіцтва і польскасці.

... Вярнуўшыся ў 1871 годзе з замежжа на радзіму, Якуб ажаніўся з Аленай Пасляк, дачкой суседзяў з маёнтка Мохарты. З 1888 года Якуб Атонавіч Наркевіч-Ёдка — адзінаўласны ўладальнік родавага маёнтка і адпаведна адзін з буйнейшых землеўладальнікаў Міншчыны. Меў чын стацкага саветніка за благачынныя справы і вучоныя працы. Ад цар-

скай адміністрацыі атрымаў шэраг узнагарод.

Пасля смерці Я.Наркевіча-Ёдкі яго сын Адам атрымаў па раздзельнаму акту былы матчын маёнтак у Турыне, які потым, у час першай сусветнай вайны, прадаў. Сын Тамаш памёр маладым, студэнтам Харкаўскага універсітэта. Сын Конрад пасля рэвалюцыі жыў у Польшчы і памёр у Кракаве ўжо пасля другой сусветнай вайны. Дачка Гелена была ў замужжы за баронам Гартынгам, другая, Марыя, — за італьянцам Паганіні Нобіле.

Гонар адыйшоўшых прадстаўнікоў роду дастойна прадаўжаюць нашчадкі вучонага: Алена Маркава — доктар тэхнічных навук з Масквы; Хрысціян Наркевіч-Лейн — архітэктар, выкладчык коледжа ў Чыкага; будаўнік з Мінска Сяргей Ёдка і інш.

Далёка за межамі Міншчыны быў вядомы і маёнтак «Над-Нёман». Яго сядзібны дом узведзены ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, потым двойчы дабудоўваўся. З часам адметнасцю сядзібы, а пазней і сімвалам беларускай навукі ды і самой Уздзеншчыны, стала сядзібная вежа пры доме вышынёй 27 метраў. Менавіта на ёй праводзіліся ўсе «атмасферычныя» вопыты нашага вучонага.

Для навукоўцаў «Над-Нёман» з часам стаў своесаблівай навуковай Мекай. Яго наведвалі выдатныя рускія вучоныя А.І.Ваейкаў, А.В.Саветаў; з Францыі быццам бы сюды завітваў сам Каміль Фламарыён. Бывалі тут, па паданнях, У.Сыракомля і Я.Колас...

На шчасце, дзякуючы нястомнай працы Напалеона Орды выгляд гэтых мясцін захаваўся ў яго малюнках. У часопісе «Kłosy» за 1882 год змешчана выдатная гравюра Шыманскага з малюнка Н.Орды «Над-Нёман» Мінскай губерні, як мяркуецца работы 1864 года. А ў 1992 годзе Кракаўскі народны музей даслаў нам фотакопію з невядомага ў нас дагэтуль малюнка мастака «Пясэчна. Палац у Ёдкаве» (фальварак Атонава, цяпер Сінячова Капыльскага раёна). Абодва палацы знішчаны ў час другой сусветнай вайны.

Асоба Якуба Наркевіча-Ёдкі не ўкладваецца ў рамкі нашых паўсядзённых уяўленняў. Вырваўшыся за межы тагачаснага Паўночна-Заходняга краю ён надзейна ўвайшоў у высокі храм навукі і пакарыў незвычайнасцю сваіх работ вучоны свет Расіі і Заходняй Еўропы...

Шляхам творчага ўзвышэння.

Праз усё жыццё Я.Наркевіч-Ёдка ўзбагачаўся ведамі, асабліва пра такую любую і блізкую яму электрычнасць. Не выпадкова за мяжой яго называлі «электрычным чалавекам».

Усебаковая адукацыя дазволіла Я.Наркевічу-Ёдку ў наступным зрабіць асэнсавана і свой жыццёвы выбар. Пачыналася адукацыя з дамашняга агульнаадукацыйнага, музычнага і артыстычнага выхавання.

Дададзім: усё гэта выхаванне праходзіла на фоне лагоднай і вельмі паэтычнай наднёманскай прыроды. Менавіта яна выклікала ў душы юнака разуменне высокага, творчага, мастацкага.

Потым пайшло чатырохгадовае навучанне ў Мінскай класічнай гімназіі. Усё цікавіла маладога Якуба: мовы і музыка, археалогія і медыцына, гуманітарныя і дакладныя навукі. Да гэтага часу ён валодаў не толькі «мёртвымі» класічнымі мовамі мінулага, але і асноўнымі заходнееўрапейскімі, у прыватнасці французскай і італьянскай. І што важна — працягваў заняткі музыкай. Скончыўшы гімназію, ён пасля 1865 года адправіўся ў замежную вандроўку, у час якой даваў фартэп'янныя канцэрты.

Малады Якуб добра разбіраўся ў здабытках айчыннай і еўрапейскай культуры. Ён стаў адным з найбольш інтэлектуальна ўзвышаных людзей Міншчыны.

Дакладна вядома, што на радзіме Якуб Атонавіч стварыў і доўгі час падтрымліваў калектыў народнай творчасці. Канцэрты пачыналіся выкананнем гімна, затым выступалі аркестр і хары. Усё прадаўжалася музыкай на раялі, скрыпцы, гармонікордзе. Харавыя спевы ў народным гусце выклікалі спрыяльнае ўражанне на сялянскую публіку. Як выцякала са справаздачы Я.Наркевіча-Ёдкі мінскаму губернатару ў чэрвені 1898 года, усё праходзіла прыстойна. Пасля канцэртаў да 11-ці вечара народнае гулянне працягвалася і затым усе маладыя і старыя разыходзіліся, задаволеныя праведзеным вечарам...

У 1888 годзе Я.Наркевіч-Ёдка выступаў на ўрачыстасцях у зале Дваранскага сходу ў Мінску ў якасці дырыжора гарадскога аркестра пад час выканання напісанага ім жа марша. Ноты гэтага твора Якуб Атонавіч, як і многіх іншых яго музычных рэчаў, пакуль што не знойдзены.

Цесныя сувязі з аркестрамі Мінска захаваліся і надалей. У пачатку лета Якуб Атонавіч час ад часу запрашаў да сябе ваенных аркестрантаў і па вечарах у наднёманскіх прасторах хвалямі смутку і прыгажосці лунала чароўная музыка.

На сядзібнай вежы яе гаспадар прыладзіў «музычную машыну» — напамін колішніх «эолавых арфаў». Гучанне мянялася ў залежнасці ад сілы наднёманскіх вятроў ад вельмі ціхага, таемна-пяшчотнага да вельмі гучнага.

Музычнае жыццё на сядзібе «Над-Нёман» не спынілася і пасля смерці Якуба Атонавіча. Вось як апісвае адзін такі вечар вядомы паэт, скрыпач, ураджэнец суседняга Пясочнага Адам Русак у сваёй «Аўтабіяграфіі»:

«Аднойчы летам я даведаўся, што ў пана ў маёнтку будуць госці і прыезджыя музыканты. Усе хлопцы пайшлі на рэчку з вудамі, а я схаваўся ў дворскім садзе і пачаў чакаць вучонай музыкі. Сцямнела. Вокны

палаца былі адчынены. Цішыня... І раптам паліліся чароўныя гукі. Гэта іграў піяніст. Я залез на дрэва і сядзеў як зачараваны, забыўшыся на ўсё на свеце. Ачомаўся, калі здранцвелі ногі.

З таго часу часта бегаў вечарамі ў маёнтак, каб яшчэ хоць раз паслухаць чароўную музыку, але цуд не паўтараўся...».

Тое адбылося недзе перад 1914 годам, калі Адаму было не больш за дзесяць гадоў.

...Палац, яго вежа і лёхі ў свядомасці навакольных жыхароў засталіся ўвасабленнем неспасцігнутай таемнасці ад перуноўскага над імі апякунства. Нешта з тых часоў таемна-трывожнае пра той самы сядзібны дом Якуба Наркевіча-Ёдкі гучыць у паэме П.Труса «Развітанні».

Пазней, яшчэ маладым чалавека, Якуб абраў справай жыцця медыцыну з ухілам на выкарыстанне прыродных фактараў для лячэння хворых, у першую чаргу з дапамогай прыроднай электрычнасці.

Нагадаем тут, што ў другой палове XIX стагоддзя прыродазнаўчыя навукі атрымалі незвычайнае развіццё. Іх карысць для ўсяго чалавецтва была відавочнай і неаспрэчнай. Дасягненні медыцыны, хіміі, фізікі, біялогіі адкрылі новыя магчымасці ў барацьбе з хваробамі, у прыватнасці з воспай, чумой, халерай, сухотамі. Процістаянне з прыродай таксама складвалася ў карысць чалавека. Вялікія перспектывы адкрываў новы від энергіі — электрычнасць. Прэстыжнасць і высокая эфектыўнасць натуральных навук была настолькі доказнай і пераканаўчай, што многія маладыя людзі зыходзячы з адзінства творчага пачатку ў мастацтве і навуцы адыходзілі ад мастацкіх заняткаў і пераходзілі ў сферу навукі, лічачы патрэбным не спазніцца зрабіць свой асабісты ўклад у прыродазнаўчую скарбонку чалавецтва.

Вось такое ж рашэнне ў канцы 60-х гадоў прыняў на сябе і Якуб Наркевіч-Ёдка. Для пачатку прадоўжыў медыцынскую адукацыю ў парыжскай Сарбоне. Удасканальваў свае веды далей у Вене, потым у Фларэнцыі. І надалей з 1869 года ён ужо выступае пераважна як навуковец. Асноўнай падрыхтоўкай яго, як і большасці прыродазнаўцаў таго часу, была ўрачэбная. Доктарам ён быў неблагім, вылечваў нават безнадзейна хворых.

На карысць чалавецтва.

Якуб Атонавіч не пайшоў па шляху звычайнай тады навуковай спецыялізацыі. Ён вярнуўся нават назад, да традыцый вялікіх натуралістаў XVIII стагоддзя, калі было прынята даследаваць прыроду ў комплексе, пранікаючы думкай у яе сутнасць. Такія вучоныя, як правіла, уздымаліся ў сваіх высновах да спасціжэння агульначалавечых праблем, праяўлялі талент на вялікіх абагульненнях, на іх філасофскім асэнсаванні,

вострa адчувалі таемнасць творчага працэсу. Ёсць некаторыя падставы сцвярджаць, што і сёння той стыль працягваецца. Навука ўсё больш пачынае браць ад культуры.

Галоўным напрамкам вучоных прац Я.Наркевіча-Ёдкі стала вывучэнне атмасфернай электрычнасці і яе ўплыву на раслінны і жывёльны свет. Навуковыя даследаванні вяліся па многіх накірунках.

Метэаралогія. *У наднёманскай сядзібе вучоны пабудаваў метэаралагічную станцыю І-га разрада, якая ўвайшла ў сетку станцый Галоўнай фізічнай абсерваторыі С.-Пецярбургскай Акадэміі навук, і правадзіў работы па праграме Метэаралагічнай камісіі Рускага Геаграфічнага таварыства. Яна забяспечвала вучонага крыніцай інфармацыі аб стане атмасферы.*

Вынікі метэаралагічных назіранняў разглядваліся на пасяджэннях камісіі. Яе ўвазе вучоным прапаноўваўся спосаб вымярэння скорасці руху воблакаў. Для вымярэння вільготнасці глебы вучоны распрацаваў так званы лізіметр.

Градаадводы. *Яны шырока выкарыстоўваліся на землях маёнтка ў мэтах прадухілення навальніц і градабіццяў. Праз іх, між іншым, забяспечвалася цыркуляцыя электратокаў у глебе, а ў паветры — узнікненне азону ў выніку «ціхага» разраду паблізу вастрыя градаадвода.*

Пад электракультывацыяй, ці інакш апрацоўкай глебы электрычным токам, было занята каля 200 гектараў сельгасугоддзяў. Ураджайнасць большасці культур павышалася на 6—10 працэнтаў. Вегетацыйны перыяд адпаведна скарачаўся на тры—чатыры тыдні. Аб гэтым вучоны паведамляў на пасяджэннях «Сходу сельскіх гаспадароў» у С.-Пецярбургу ў 1892 і 1893 гадах.

Электраграфія. *Пачаўшы з вопытаў над раслінамі, вучоны перакінуў кладку да спроб выкарыстання электрычнай энергіі для лячэння чалавека. Ён прыйшоў да пераканання, што «усё, што знаходзіцца над ці пад зямлёй, акужана з усіх бакоў электычнымі з'явамі... Усе мы плаваем у прасторы, у якой пастаянна адбываюцца электрычныя з'явы». Кожны чалавек уяўляе, на яго думку, электрычную машыну, якая, з аднаго боку, вырабляе электрычнасць і аддае яе ў акружаючае асяроддзе, а з другога — паглынае электрычнасць звонку.*

Узнікла патрэба распрацаваць метад выяўлення наяўнасці электрычнасці ў расліне ці арганізме. Даследчыку ўдалося зарэгістраваць гэтыя працэсы. Яго знакамітая электраграфія (так назваў адкрыццё сам вынаходца) не што іншае як арыгінальны спосаб атрымання з дапамогай электрычнасці фотаадбіткаў з органаў жывых арганізмаў, ці «фатаграфія без аб'ектыву». Распрацоўкі ў гэтым накірунку прынеслі Я.Наркевічу-Ёдку міжнародную вядомасць.

Сёння метад неабгрунтавана вядомы ва ўсім свеце як «эффект

Кірліян», хоць Кірліяны паўтарылі са спазненнем на пяцьдзесят гадоў толькі тэхнічны бок вынаходства Я.Наркевіча-Ёдкі.

Вучоным быў адразу прапанаваны тэхнічна бяспечны спосаб атрымання электраграфій з любой часткі жывога аб'екта пры любым яго стане (чалавек мог нават спаць). Ён здымаў на адну фотапласцінку адбіткі рук адразу некалькіх чалавек. Тых, хто, напрыклад, знаходзіцца ў прыязных між сабой адносінах або, скажам, у недружалюбных. Вучоны заўважыў, што ў гэтых выпадках здымкі атрымліваліся розныя, хоць у агульным іх выглядзе выяўлялася нейкая сістэма. Вельмі асцярожны ў сваіх высновах, ён у прыватных размовах трактаваў з'яву як праяўленне «сімпатыі» і «антыпатыі». Тым не менш у наступныя часы ўхапіліся за гэтую асаблівасць маладасведчаныя містыкі і экстрасенсы і ў многім скампраметавалі з'яву электраграфіі ў цэлым.

Сёння ж электраграфічны метад выкарыстоўваецца не толькі для дакладнай дыягностыкі захворванняў, але і для вызначэння сумяшчальнасці членаў доўгачасовых экспедыцый і, як нам здаецца, ляжыць у аснове вядомага «дэтэктара хлусні» ды яшчэ шмат якіх тэхнічных дасягненняў сучаснай навукі і тэхнікі.

Таму мы маем маральнае права і патрэбу аргументаваць і ў той жа час настойліва абараняць прыярытэт Я.Наркевіча-Ёдкі. Трэба абараніць і навуковую сімволіку вучонага, у першую чаргу вобраз электраграфічных адбіткаў, выгляд наднёманскай вежы.

Па характару змены «кароны» — свайго рода дактыласкапічнага адбітка электрычнай карціны доследуемых участкаў органаў жывых арганізмаў — на здымках аднаго і таго ж пацыента вучоны і ўрач прадказваў развіццё ці згасанне хваробы. Так з'явілася дыягнаставанне *хваробы.*

«Тое, што складае ў нас па частцы распазнання гэтых хвароб асабістае ўспрыняцце, тое Наркевіч-Ёдка аб'ектывізаваў з дапамогай сваіх метадаў і пры тым надзвычай і да відавочнасці наглядна», — вось толькі адно з выказванняў той пары. Усяго было атрымана больш за 1,5 тыс. дыягнастычных здымкаў. Па форме «кароны» вучоны згрупаваў характэрныя для той ці іншай хваробы здымкі і вызначыў дакладна паталагічны і нават псіхалагічны стан.

Развіваючы сваё адкрыццё Якуб Атонавіч пазней вынайшаў метад атрымання свячэння — люмінесцэнцыі ўсяго цела чалавека, г.зн. адлюстраваў т. зв. аўру чалавека.

Ад электраграфіі Я.Наркевіч-Ёдка перайшоў да электратэрапіі. *Ён заўважыў, што недахоп ці лішка электрычнасці ў жывым арганізме — ненармальнасць, якая прыводзіць да разладаў здароўя. Ён спрабуе лячыць паталагічныя змены ў арганізме з выкарыстаннем штучнай і атмасфернай электрычнасці. Прапанаваны ім новы метад электратэ-*

рапіі адрозніваўся ад іншых бескантактным уздзеяннем на абмежаваныя ўчасткі цела і першапачаткова быў апрабаваны ў Інстытуце фізіялогіі ў Рыме пад назвай «сістэмы Ёдкі». Акрамя таго, ён стымуляваў імпульснымі электраразрадамі біялагічна актыўныя акупунктурныя кропкі.

У сваім прыватным «санаторыуме» у «Над-Нёмане», створаным для лячэння нервовахворых і «слабагрудных», — своеасаблівым «палігоне» выпрабавання і ўкаранення медыцынскіх дасягненняў — Я.Наркевіч-Ёдка выкарыстоўваў самыя перадавыя лячэбныя прыёмы.

Лячэнне вялося комплексна: яно дапаўнялася светла- і паветратэрапіяй, гімнастыкай, кумыса- і кефіралячэннем, выкарыстаннем мясцовых мінеральных вод. Якуб Атонавіч валодаў прыёмамі гіпнатызацыі і выкарыстоўваў яе разам з музыкатэрапіяй. За сезон у яго санаторыі падлечвалася да 50 хворых. У канцы мінулага стагоддзя паслугамі санаторыя, у прыватнасці, карыстаўся і будучы паэт, пісьменнік і дзяржаўны дзеяч Язэп Дыла.

Радыёпрыём і радыёперадачы. *Нельга абмінуць увагай і той факт, што з вежы сядзібнага дома ў «Над-Нёмане» яшчэ ў 1890 годзе рэгістраваліся навальнічныя разрады электрычнасці на адлегласці 100 км ад фронту навальніцы з дапамогай распрацаванага вучоным прыбора. Яго можна па праву лічыць першым навальніцаадзначальнікам, па сутнасці — першым радыёпрыёмнікам.*

Услед за гэтым у 1891 годзе на пасяджэнні фізічнага аддзялення Рускага фізіка-хімічнага таварыства Я.Наркевіч-Ёдка прадэманстраваў магчымасць рэгістрацыі з дапамогай «ізаляваных тэлефонаў» электрычных сігналаў на адлегласці, г. зн. работу свайго рода «бяздротавага тэлеграфа». Такія ж вопыты ён затым паўтарыў у Вене, Празе, Вільні, Мінску. Гэта важная падзея была засведчана і дакументамі Французскага фізічнага таварыства.

Вучоны прытрымліваўся думкі, што найлепшым прынцыпам даследаванняў з'яўляецца паследаванне прыродзе. Доследы па прастаце пераўзыходзілі вядомыя раней. У эсперыментах даследчык праяўляў незвычайную інтуіцыю, выбіраючы кожны раз той найкарацейшы шлях, што нязменна прыводзіў яго да мэты.

Даследаванні Я.Наркевіча-Ёдкі вызначаліся сістэмнасцю, паслядоўнасцю. Ад утылітарнага выкарыстання вынікаў сваёй работы да філасофскіх абагульненняў — такое развіццё навуковай пазіцыі вучонага. Выходзячы з матэрыялістычнага светапогляду Якуб Атонавіч адмовіўся ад пытання «пустой» прасторы без матэрыі, энергіі, арганізаванасці. З часам вучоны прыйшоў да пераканання, што электрычнасць падпарадкоўваецца агульным законам фізікі, а іменна — што яна, падобна гуку і святлу, распаўсюджваецца хвалепадобнымі ваганнямі. Гэта было аба-

гульненне высокага навуковага ўзроўню.

Навуковым пошукам вучонага спадарожнічала здзіўляючая прыгажосць думкі, што пастаянна выяўлялася праз яе лагічнасць, даступнасць, прастату, паслядоўнасць выкладання.

Біёграф Я.Наркевіча-Ёдкі пацвярджае: «Ёдка, несумненна, адзін з вядучых прадстаўнікоў.... магутнай школы эксперыментатараў, якія не задавальняюцца ні выключна практычнымі даследаваннямі, ні абстрактнымі развагамі. Для яго практыка мела права на існаванне толькі на аснове тэорыі. Ён у аднолькавай ступені далёкі ад эмпірычнага пазітывізму, як і ад містычных утопій».

...Летам Я.Наркевіч-Ёдка працаваў, як правіла, у маёнтку, ладзіў гаспадарку, праводзіў новыя доследы, лячыў хворых. Зімой жа адпраўляўся ў Пецярбург ці Заходнюю Еўропу, дзе правяраў свае ідэі, вывучаў новае, завязваў навуковыя знаёмствы, набываў прыборы і абсталяванне. Замежныя кантакты былі вельмі высокага ўзроўню.

Навуковая дзейнасць Я.Наркевіча-Ёдкі была яшчэ пры жыцці ацэнена вучоным светам належным чынам. Ён меў ступень доктара Венскага медычнага таварыства, абіраўся членам фізічна-матэматычнага таварыства Галілея ў Фларэнцыі. Меў званне ганаровага члена Французскага электратэрапеўтычнага таварыства пры Парыжскай Акадэміі навук, выбіраўся ў Францыі членам-карэспандэнтам медыцынскага і астранамічнага інстытутаў, членам-супрацоўнікам расійскіх навуковых устаноў, у прыватнасці інстытута эксперыментальнай медыцыны ў С.-Пецярбурзе (ён і цяпер дзейнічае). У Францыі ў 1900 годзе яму было нададзена званне прафесара электраграфіі і магнетызму.

Сам Я.Наркевіч-Ёдка карыстаўся заслужаным аўтарытэтам сярод буйнейшых вучоных. Яго работы станоўча ацэньвалі І.І.Борман, А.І.Ваейкаў, Дз.І.Мендзялееў, Ф.Ф.Петрушэўскі, А.В.Саветаў, Э.Красоўскі і інш. У 1896 годзе ў Парыжы выдадзена біяграфія Я.Наркевіча-Ёдкі з апісаннем найбольш цікавых яго работ.

Зычлівае стаўленне навуковай грамадскасці да нашага земляка, бясспрэчна, тлумачыцца толькі тым, што яго даследаванні і вынаходствы мелі высокую навуковую вартасць. Болей таго, працы Я.Наркевіча-Ёдкі, прайшоўшы выпрабаванне часам, не губляюць сваёй актуальнасці і цяпер. Яны не пазбавіліся і ў нашых умовах свайго значнага навуковага рэзерву. Наадварот, новыя навуковыя здабыткі толькі яшчэ больш выразна адбіваюць і адцяняюць значнасць мінулага патэнцыялу...

Пасланні з мінулага.

Жыхары ваколіц «Над-Нёман» памятаюць Я.Наркевіча-Ёдку па пераказах старэйшых не толькі як паважанага «пана прафесара», але і як

12—1421

добрага, уважлівага чалавека, які нямала рабіў для паляпшэння ўмоў жыцця простых людзей.

Ён знаходзіў час і для выканання грамадскіх абавязкаў: з'яўляўся папячыцелем Іванаўскага дзявочага вучылішча ў С.-Пецярбургу, узначальваў слуцкае «Чалавекалюбівае таварыства», Уздзенскае вольна-пажарнае таварыства. У якасці ўчастковага папячыцеля вёў мясцовае таварыства народнай цвярозасці (на чале павятовага стаяў у той час вядомы краязнаўца А.К.Ельскі).

Вучоны-ўрач Я.Наркевіч-Ёдка выступаў супраць знахарства і шарлатанства. Пра сваю медыцынскую і санітарную дабрачыннасць ён пісаў у адной са справаздач: «У маёй мясцовасці імкнуся распаўсюдзіць пашанцы карысці антыдыфтэрытнай сывараткі і гігіенічных умоў для захавання здароўя... Я прыкладам і парадай імкнуся і імкнуўся распаўсюдзіць неабходнасць праверкі стану здароўя жывёлы, прышчэпак гэтых сродкаў (туберкуліна і маляіна) і спадзяюся, што будуць паслядоўнікі і яны прынясуць найвялікшую карысць гігіене і сельскай гаспадарцы. Летні сезон прысвечаны абсталяванню часовых прыёмных амбулаторый у маім мястэчку Пясочна Ігуменскага павета з урачамі і аптэкай для хворых сіфілісам і для бясплатнай дапамогі як медыцынскай, так і лекавай церпячым нястачу...».

На масленіцу ўладальнік «Над-Нёмана» ладзіў у Пясочным народныя гулянні. Ён чапляў на верхавіну гладкага слупа кішэнны гадзіннік. Здаралася, што найбольш зграбнаму і ўдаламу ўдавалася ўзабрацца на слуп і завалодаць каштоўным прызам.

Памешчык раскопваў старажытныя курганныя пахаванні ля Магільнага. Яго цікавіла багатае мінулае наднёманскага краю.

На сваім адносна нядоўгім вяку вучонаму давялося быць сведкам адмены прыгоннага права, падзей паўстання 1863 года, звестак пра ўдзел яго дзеда Ануфрыя ў падзеях 1831 года, быць у цэнтры франка-прускай вайны, блакады Парыжа, Парыжскай Камуны, вострага канфлікту з мясцовымі жыхарамі ў 1903 годзе. Бліжэйшая перспектыва не пакідала яму надзей. Усё дадаткова абцяжарвалася заўчаснай смерцю блізкіх яму людзей.

Якуб Атонавіч мала клапаціўся пра сябе і, нягледзячы на перасцярогу ўрачоў, поўны новых задум, адправіўся за мяжу ў чарговую паездку. Там, у Вене, ён і памёр 19 лютага 1905 года. Так супала, што адыйшоў ён ад нас у год, які абвясціў пачатак змены гістарычных эпох у Расіі. Нядаўна ў мясцовым архіве быў знойдзены яго апошні замежны пашпарт.

Сёння тэрыторыя сядзібы «Над-Нёман» належыць Музею прыроды і экалогіі Рэспублікі Беларусь. Цяпер тут пустынна і ціха. Сядзібны дом быў спалены летам 1943 года. У лютым 1995 года рухнула апошняя свед-

ка былога — сядзібная вежа. Апроч мастацкіх палоцен ды фотаматэрыялаў ужо больш нічога не нагадвае пра колішнюю навуковую адметнасць.

Пра Я.Наркевіча-Ёдку з рознай ступенню дакладнасці пісалі пры жыцці француз М.Дэкрэп, пецярбуржцы М.Пагарэльскі і В.Бітнер, віленец С.Штэрн. Мы свядома не спыняемся на безлічы бягучых карэспандэнцый у перыядычным друку. Таксама на невыкарыстаных замежных бібліятэчных і архіўных матэрыялах. Гэта ўжо задача наступнага этапа; магчыма, наступнага пакалення. Несумненна, яны прынясуць шмат чаго новага і нечаканага.

Слова ў заключэнне.

Трэба прызнаць, што звесткі пра Я.Наркевіча-Ёдку не ляжаць на паверхні, навідавоку. Авалоданне імі патрабуе значных высілкаў, а да таго ж і кампетэнцыі.

Плён навуковай творчасці, светапогляду, духоўнага, культурнага і інтэлектуальнага жыцця Якуба Наркевіча-Ёдкі дасягнуў не толькі нашых дзён, але і прасцёрся ў будучыню. Што важна — гэта сфера не застаецца нязменнай, кожны асэнсоўвае яе па-свойму. З часам адны ідэі адыходзяць на другі план, як гэта часова сталася з электраграфіяй. Другія ўзнаўляюцца з новай сілай. Тут мы сустракаемся з жывым, усё больш дасканалым вучоным — па сутнасці нашым сучаснікам.

Фізічнае, біялагічнае, псіхалагічнае вывучалася Я.Наркевічам-Ёдкам у адзінстве і непарыўнасці. Багатая эрудыцыя дала яму магчымасць абагульніць вынікі даследаванняў і даць ім пераходзячае ўжо за далягляд мыслення яго сучаснікаў філасофскае асэнсаванне.

Я.Наркевіч-Ёдка пражыў складанае, поўнае кантрастаў жыццё. Спазнаў радасць вялікага поспеху і горыч непаразумення. Быў вельмі вядомы і ўшаноўваемы пры жыцці, меў мноства тытулаў і ўзнагарод, прадстаўлены ў дзесятках і сотнях артыкулаў у навуковых выданнях і перыядычным друку. Тым не менш постаць вучонага, нягледзячы на яе высокі навуковы статус, бачыцца і глыбока трагічнай.

Пошукі сведчанняў высокага навуковага подзвігу Якуба Наркевіча-Ёдкі працягваюцца. Аўтар гэтага артыкула абагульніў свае знаходкі, апісанні цікавых сустрэч, усё новае пра нашага славутага земляка ў брашуры-эсэ «Парадоксы «электрычнага» чалавека», падрыхтаванай да міжнароднай навуковай канферэнцыі, што прайшла ў снежні 1997 года ў горадзе Узда па нагодзе 150-й гадавіны з дня нараджэння Я.Наркевіча-Ёдкі. Спадзяемся, што яна нарэшце пабачыць свет...

Незвычайная з'ява феномену жыцця і дзейнасці Якуба Наркевіча-Ёдкі патрабуе надалей стараннага і глыбокага асэнсавання. У рэшце рэшт і як значная культурная з'ява апошняй чвэрці XIX—пачатку XX стагоддзяў у тагачасным Паўночна-Заходнім краі Расіі.

Літаратура:

1. Decrespe M. Lavie et de m. de Narkiewicz-Jodko. Paris, 1896.
2. Государственный исторический архив Ленинградской области, ф. 2282, оп. 2, ед. хр. 146.
3. Погорельский М.В. Электрофотосфены и энергография как доказательство существования физически полярной энергии. СПб., 1899.
4. Битнер В.В. В область таинственного: Научная экскурсия в тайны человеческой природы. СПб., 1907.
5. Кісялёў У. Вучоны шырокага дыяпазону // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1980, № 2.
6. Грыбкоўскі В.П., Гапоненка В.А., Кісялёў У.М. Прафесар электраграфіі і магнетызму: Якуб Наркевіч-Ёдка. Мн., 1988.
7. Яков Оттонович Наркевич-Иодко (1847—1905): Библиографический указатель. Мн., 1988.
8. Кісялёў У. Ад самадалейшых часоў прозвішча... // Беларуская мінуўшчына, 1997, № 5.

Уладзімір Кісялёў

Мікалай СУДЗІЛОЎСКІ
(1850—1930)



У пачатку стагоддзя ў газетах Далёкага Усходу і Сібіры з'явіліся артыкулы пра жыццё рускіх эмігрантаў на розных ціхаакіянскіх астравах: на Гаваях, Філіпінах, у Японіі. Гэтыя артыкулы пад назвамі «Лісты з Сандвічавых астравоў», «Руская калонія на Гаваях», «Лісты з-пад тропікаў», «Свята кветак у Японіі» выходзілі за подпісам «Д-р І.Б.» або проста «І.Б.» і «М.Русель» і прыцягвалі ўвагу чытачоў сваім простым паказам звычайнага жыцця ў экзатычных краінах.

Аўтарам артыкулаў быў урач-рэвалюцыянер Мікалай Канстанцінавіч Судзілоўскі. Ён быў больш вядомы пад псеўданімам «Русель», што па-румынску азначае «рускі». Чаму ў рускага эмігранта на ціхаакіянскіх астравах быў румынскі псеўданім, доўга расказваць[1]. Але гэта вельмі цікавае апавяданне, і яго мэтазгодна данесці да чытача, таму што біяграфія ўрача Руселя-Судзілоўскага незвычайная нават для рэвалюцыянера, настолькі яна падобная на авантурны раман, а прыгод, якія выпалі на яго долю, хапіла б на некалькі чалавек. Арганізатар і ўдзельнік падпольных гурткоў у Расіі, ён «хадзіў у народ», у эміграцыі стаяў ля вытокаў румынскага сацыялістычнага руху, працаваў у некалькіх заходнееўрапейскіх краінах і ЗША. Адзін з таварышаў М.Руселя па эміграцыі, член групы «Вызваленне працы» Л.Дэйч, пісаў: «Паўсюдна, куды б не закінуў лёс Руселя, ён прыстасоўваўся да месца і ўмоў, хутка вывучаў мову гэтай краіны і прасякаўся яе інтарэсамі і патрэбамі»[2].

Сярод бліскучай плеяды рэвалюцыянераў 70-х гадоў XIX ст. М.К.Судзілоўскі быў не першай асобай, але заўсёды знаходзіўся ў

гушчы ўсіх праблем, якія непакоілі ўдзельнікаў руху народнікаў. Палову сваёй творчай дзейнасці ён правёў у краінах Далёкага Усходу і Ціхаакіянскага басейна.

Шлях М.К.Судзілоўскага на Далёкі Усход быў доўгім. Нарадзіўся будучы рэвалюцыянер 3 снежня 1850 г. у Магілёве ў сям'і столаначальніка мясцовай палаты грамадзянскага суда[3]. Пасля заканчэння гімназіі ў родным горадзе ён паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Праз год М.Судзілоўскі перавёўся ў іншы універсітэт[4]. Ён абраў для навучання Кіеў і паступіў на медыцынскі факультэт Кіеўскага універсітэта. У Кіеве М.Судзілоўскі стварыў студэнцкі народніцкі гурток, выязджаў у Швейцарыю, дзе пазнаёміўся з рэвалюцыйнымі эмігрантамі: П.Лаўровым, М.Бакуніным, некаторымі дзеячамі I Інтэрнацыяналу. Калі вярнуўся, узначаліў «Кіеўскую камуну» студэнтаў[5].

У лютым 1874 г. малады рэвалюцыянер паехаў ў Ананьеўскі павет Херсонскай губерні, каб весці прапаганду сярод сялян, а адтуль — у Мікалаеўск (цяпер Пугачоў) Самарскай губерні. Яго накіравалі фельчарам у вёску Пястраўку. Паліцыя высачыла М.Судзілоўскага і нечакана абшукала яго кватэру. На шчасце, рэвалюцыянера дома не было. Ён уцёк з Паволжжа як нямецкі каланіст, які блага размаўляў па-руску. Хоць прыкметы ўцекача былі разасланы па ўсіх жандармскіх управах, яму ўдалося прабрацца ў Лондан.

У Лондане М.Судзілоўскі ўключыўся ў працу эмігранцкіх арганізацый. 23 студзеня 1875 г. адбыўся сход, прысвечаны гадавіне паўстання 1863 г. На ім выступалі К.Маркс і Ф.Энгельс. Выступіў з прамовай і М.Судзілоўскі. Некаторая катэгарычнасць яго выступлення выклікала палеміку, якая завяршылася выказваннем Ф.Энгельса пра тое, што «аднаўленне Польшчы сапраўды ў інтарэсах рэвалюцыйнай Расіі»[6]. М.Судзілоўскі сустракаўся і асабіста размаўляў з К.Марксам.

У Лондане, а затым у Швейцарыі (куды М.Судзілоўскі пераехаў улетку 1875 г.) ён прадаўжаў супрацоўнічаць з рэвалюцыйнымі эмігрантамі, а восенню таго ж года ён накіраваўся ў Румынію. Краіна сустрэла М.Судзілоўскага негасцінна, і праз некалькі гадоў ён з горыччу пісаў пра гэта народніку М.В.Чайкоўскаму: «Гэтыя два гады жылося вельмі цяжка: нястача і нястача. Жонка пастаянна хварэла, дзіця таксама — з-за нашай беднасці не маглі запрасіць карміцельку. Скончылася тым, што дзіця памерла ад штучнага кармлення. Нарэшце, я атрымаў дыплом (урача — *В.Г.*) і месца і цяпер, адправіўшы жонку дахаты на радзіму папраўляцца, выплочваю патрохі даўгі, зробленыя за два гады».

Тым не менш М.К.Судзілоўскі быў задаволены рэвалюцыйнай работай у Румыніі: «Паверце, тут намнога свабадней, чым у Швейцарыі. Вось я два гады тут і ні ў мяне, ні ў каго-небудзь з маіх знаёмых ніхто

не спытаў пашпарта. Я заўсёды думаў і думаю, што для нашага брата месца не ў Жэневе, не ў Лондане, а тут, ля парога, у асяроддзі, блізкім да сваіх. І ў інтэлігентнай працы тут больш няма неабходнасці, чым у Еўропе, і таму нам будзе лягчэй прыстасавацца так ці інакш»[7]. У Румыніі М.Судзілоўскі наладзіў пераправу эмігранцкіх газет і іншай літаратуры ў Расію.

Урач не мог заставацца абыякавым і да лёсу працоўных мас Румыніі, дзе ён скончыў медыцынскую адукацыю. Медыцынскія погляды М.Судзілоўскага фарміраваліся пад уплывам перадавых традыцый айчыннай медыцыны.

Урачэбная дзейнасць М.К.Судзілоўскага ў 1870-я гг. сутыкала яго з масавымі захворваннямі, высокай дзіцячай смяротнасцю, бытавой антысанітарыяй і замацоўвала яго ўсведамленне неабходнасці барацьбы супраць эксплуататарскага ладу, які быў прычынай гэтых з'яў. Урач актыўна ўспрымаў новыя медыцынскія ідэі: тэзісы яго доктарскай дысертацыі «Аб антысептычным метадзе лячэння ў хірургіі» (1877) былі прысвечаны новаму напрамку ў лячэбнай практыцы, прынцыпы якога ён вывучаў у клініках кіеўскага прафесара С.П.Каломніна і прафесара Холмса ў Лондане.

З восені 1875 г. у Бухарэсце працаваў рэвалюцыйны гурток малдаўскага народніка М.П.Зубку-Кадрану. З ім супрацоўнічалі М.Судзілоўскі і балгарскі рэвалюцыянер Х.Боцеў, якія даўно сябравалі[8]. У перыяд падрыхтоўкі Красавіцкага паўстання супраць туркаў у Балгарыі М.Судзілоўскі дапамагаў сваім балгарскім таварышам звязвацца з рэвалюцыянерамі іншых краін; удзельнікі атрада Х.Боцева звалі яго з сабой у паход за Дунай[9]. М.Судзілоўскі, М.Зубку-Кадрану, Х.Боцеў і іншыя члены гуртка вывучалі і абмяркоўвалі працы рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў, сацыялістаў-утапістаў, К.Маркса, Ф.Ласаля, П.Прудона.

У час руска-турэцкай вайны 1877—1878 гг. М.Судзілоўскі працаваў урачом у ваенным шпіталі і вёў актыўную прапаганду сярод рускіх салдат і афіцэраў, якія знаходзіліся ў Румыніі. У 1879 г. ён пераехаў у Ясы і ўзначаліў новы сацыялістычны гурток у гэтым горадзе. Гурток імкнуўся распаўсюдзіць свой уплыў на мясцовых рабочых і рамеснікаў, выдаваў з верасня па снежань 1879 г. газету «Basarabia», ініцыятарам выдання і галоўным супрацоўнікам якой быў М.Судзілоўскі. Па патрабаванню царскіх чыноўнікаў выданне газеты было спынена.

Члены гуртка прадаўжалі прапагандысцкую дзейнасць. М.Судзілоўскі выдаў у Ясах у 1880 г. брашуру «Псіхіятрычнае даследаванне з некаторымі каментарыямі наконт здаровых ідэй» у адказ на крытыку камуністычных поглядаў з боку буржуазных румынскіх газет. Урач-рэвалюцыянер, спасылаючыся на творы К.Маркса, М.Чарнышэўскага, Ф.Ласаля, даказваў, што сацыялістычны лад прадугледжвае вяртанне

зямлі, фабрык, жалезных дарог, капіталаў ад прыватных уласнікаў у калектыўную ўласнасць рабочых. Гэта прывядзе да ліквідацыі канкурэнцыі, эканамічных крызісаў, заваявальных войнаў. М.Судзілоўскі пісаў пра ўстанаўленне сацыялістычнага ладу ў выніку сацыяльнай рэвалюцыі, прымаў удзел у падрыхтоўцы стварэння ў Румыніі сацыялістычнай партыі.

Румынскія ўлады выгналі М.Судзілоўскага і іншых рускіх сацыялістаў з краіны, карыстаючыся тым, што тыя падрыхтоўвалі 18 сакавіка 1881 г. банкет у гонар гадавіны Парыжскай камуны. Дастаўленыя ў Стамбул палітычныя эмігранты ледзь пазбеглі небяспекі трапіць у рукі царскіх шпікоў і толькі ў маі змаглі дасягнуць Заходняй Еўропы[10].

У Жэневе і Парыжы М.Русель аднавіў свае сяброўскія сувязі з групай эмігрантаў, блізкіх па поглядах. Адзін з іх, Л.Дэйч, пісаў пра гэта: «... Мы, г. зн. *я*, Марфа (Вера Засуліч — *В.Г.*), Жорж (Г.В.Пляханаў — *В.Г.*), Павел (Аксельрод — *В.Г.*), Вас(іль) Мік(алаевіч) (Ігнатаў — *В.Г.*) і часткова Мішка (Дэбагорый-Макрыевіч — *В.Г.*), Росель (г. зн.Русель-Судзілоўскі — *В.Г.*), Ал-р Хацінскі, Сяргей (Сцяпняк-Краўчынскі — *В.Г.*) і Лаўроў, хоць і не складалі якога-небудзь арганізаванага згуртаванага гуртка, але з-за старых сяброўскіх адносін і больш-менш тэарэтычнай згоды з'яўляліся чымсьці цэльным, адзіным»[11].

У 1882 г. М.Судзілоўскі пераехаў у балгарскі горад Плоўдзіў — цэнтр аўтаномнай тады вобласці Турцыі Усходняй Румеліі. Тут ён заняўся ўрачэбнай практыкай і пасылаў грошы сваім таварышам па жэнеўскай групе, якая да таго часу прыняла назву «Вызваленне працы».

У 1885 г. М.Судзілоўскі быў сведкам і ўдзельнікам аб'яднання паўночнай і паўднёвай Балгарыі. Але аўстрафільска-русафобскія колы балгарскіх нацыяналістаў пачалі траўлю рускага сацыял-інтэрнацыяналіста[12]. Г.Пляханаў выступіў у друку ў абарону М.Судзілоўскага, але той ўсё ж быў вымушаны пакінуць Балгарыю.

Накіраваўся М.Судзілоўскі ў ЗША, дзе жыў яго брат Эміль. 21 жніўня 1887 г. ён прыбыў у Нью-Йорк, а адтуль 14 кастрычніка 1887 г. пераехаў у Сан-Францыска. Тут ён займаўся ўрачэбнай практыкай і заваяваў папулярнасць сярод беднаты. М.Судзілоўскі выкрыў амаральнасць мясцовага праваслаўнага епіскапа Уладзіміра. У адказ на гэта епіскап падверг урача публічнаму пракляццю ў царкве і заклікаў адмовіцца ад лячэння ў яго. М.Судзілоўскі падаў у суд іск аб матэрыяльнай шкодзе, нанесенай яму гэтым праклёнам. Узняўся скандал, і обер-пракурор Сінода К.П.Пабеданосцаў вымушаны быў пісьмова прасіць урача-эмігранта адмовіцца ад іску, абяцаючы адклікаць епіскапа. Рускі патрыёт М.Судзілоўскі пайшоў насустрач ідэолагу расійскай рэакцыі толькі таму, што публічны працэс супраць амаральнага епіскапа мог нанесці маральны ўрон рускім, якія жылі ў ЗША. Ён дабіўся ад'езду духоўнага пасты-

ра, які праштрафіўся. Праўда, у Расіі таго не пакаралі, а прызначылі вікарным епіскапам у Варонежы і ўзнагародзілі ордэнам «За стараннасць»[13].

Пасля пяцігадовага знаходжання ў Сан-Францыска М.К.Судзілоўскі пераехаў на Гавайскія астравы. Прыбыў ён туды 17 мая 1892 г. і спачатку працаваў урачом урадавай службы ў вясковай акрузе Вайанае (заходняе ўзбярэжжа цэнтральнага вострава архіпелага Оаху)[14]. Вядомы рускі батанік А.М.Красноў (заснавальнік Батанічнага саду ў Батумі), які наведваў архіпелаг, назваў М.К.Судзілоўскага «самым любімым і папулярным з мясцовых урачоў»[15]. Пазней М.К.Судзілоўскі пераехаў у сталіцу Гавайскіх астравоў Ганалулу[16]. Тут у 1896 г. ён выдаў дзве брашуры: «Our health policy» (Наша палітыка аховы здароўя)[17] і «How to live on the Havaiian islands. A summary of individual hygiene» (Як жыць на Гавайскіх астравах. Нарыс асабістай гігіены)[18]. У іх М.К.Судзілоўскі патрабаваў паляпшэння санітарна-гігіенічных умоў жыцця працоўных, на здароўе якіх не звярталі ўвагі плантатары. Урач прыводзіў прыклад таго, як плантатары забяспечвалі працоўных забруджанай вадой, якая выклікала страўнікава-кішачныя захворванні. Ён дамагаўся, каб урадавыя ўрачы пераўтварыліся з чыноўнікаў, якімі яны з'яўляліся на самой справе, у санітарных урачоў[19].

У 1897 г. урад Гавайскіх астравоў запрасіў М.Судзілоўскага працаваць урачом на землях, што здаваліся ў арэнду рускім перасяленцам[20]. Рэвалюцыянер-інтэрнацыяналіст М.Судзілоўскі не змог застацца ўбаку ад барацьбы мясцовага насельніцтва супраць амерыканскіх каланізатараў. Ён выкрываў расавую дыскрымінацыю, якая насаджалася каланізатарамі: «Амерыканскія місіянеры не задумваюцца ўстанаўліваць цэнз на белую скуру нават у справе рэлігіі. Тут на адной і той жа вуліцы вы ўбачыце дзве пратэстанцкія царквы пад адной назвай, размешчаныя па-суседству адна ад адной, але адна прызначана для беласкурай арыстакратыі, другая — для бедных тубыльцаў. Той жа прынцып праводзіцца і ў школе. Белыя пазбягаюць пасылаць сваіх дзяцей у агульныя ўрадавыя вучылішчы. Для іх спецыяльна наладжана ўрадам так званая прывілеяваная школа, якая ўтрымліваецца на агульныя (бюджэтныя) сродкі. Але і гэтым яны незадаволены і аддаюць перавагу платным прыватным вучылішчам. Туземная канакская мова зусім выключана з выкладання»[21].

М.Судзілоўскі ўключыўся ў барацьбу мясцовага насельніцтва, канакаў, у складзе партыі незалежных або туземцаў і супрацьпаставіў яе амерыканізаваным партыям рэспубліканцаў і дэмакратаў. А ў час выбараў у парламент гэта партыя перамагла, і М.Судзілоўскі быў абраны сенатарам, а пазней прэзідэнтам сената[22].

Гавайскія астравы атрымалі правы, сярэднія паміж правамі амеры-

канскага штата і тэрыторыі. 2 красавіка 1901 г. М.Судзілоўскі адмовіўся ад займаемай пасады, каб мець права праводзіць свае законапраекты, накіраваныя на паляпшэнне быту карэннага насельніцтва.

М.Судзілоўскі як радавы сенатар дабіваўся правядзення сваіх законапраектаў, у прыватнасці павелічэння падатку з багатых, рэформы санітарнага кіравання, пашырэння крэдытаў на асвету, упарадкаванне продажу алкагольных напіткаў, кантролю над прамысловымі кампаніямі і прадпрыемствамі. Ён імкнуўся праводзіць у жыццё прынцыпы, якія абвяшчаў яшчэ ў Румыніі.

М.Судзілоўскі быў прыхільнікам незалежнай ад Вашынгтона палітыкі Гаваяў. Па яго патрабаванню сенат адхіліў рэзалюцыю аб прадастаўленні астравам праў штата, што ўзмацніла б пазіцыі гаспадароў цукровых плантацый. Аднойчы ён дабіўся выдалення з ніжняй палаты парламента прызначанага з Вашынгтона сакратара, які з'явіўся там без запрашэння.

Нягледзячы на тое, што М.Судзілоўскі аддаўся ўвесь палітычнай барацьбе на далёкіх ад радзімы астравах, ён памятаў пра барацьбу супраць царызму, якой прысвяціў свае юнацтва. У 1903 г. ён пакінуў сваю ферму, на якой жыў, і накіраваўся ў Шанхай. Тут ён правёў дзевяць месяцаў, жадаючы дамовіцца з кітайскімі бандытамі, хунхузамі, каб тыя напалі на месца катаргі ў Забайкаллі Акатуй і вызвалілі адтуль палітычных зняволеных.

З пачаткам руска-японскай вайны 1904—1905 гг. М.Судзілоўскі вярнуўся на Гавайскія астравы. Аднак хутка ён пасяліўся ў Японіі, дзе яму было дазволена арганізаваць камітэт дапамогі рускім палонным. Камітэт гэты забяспечваў іх бялізнай, прадуктамі, пісьмовымі прыладамі, газетамі і кнігамі.

У.Д.Бонч-Бруевіч расказваў пра гэту працу Г.У.Пляханаву, і той паведаміў, «што Руселя ён ведае асабіста і цалкам рэкамендуе як вельмі энергічнага і вельмі адданага справе рэвалюцыі таварыша і што нашу дзейнасць ён поўнасцю адабрае...»[24].

Урач М.Русель з дапамогай японцаў адкрыў у Асаке, Хамадэрэ і іншых гарадах школы для непісьменных салдат, часта выступаў на мітынгах. Праваслаўная семінарыя ў Кобэ выдавала на рускай мове штотыднёвік «Японія і Расія», М.Судзілоўскі змог пераўтварыць гэта «выданне з пахам ладану» ў рэвалюцыйнае. Ён распаўсюджваў сярод палонных рэвалюцыйныя брашуры, стварыў некалькі рэвалюцыйных гурткоў, з 1 красавіка 1906 г. выдаваў у Нагасакі газету «Воля» для палонных салдат.

Можна спадзявацца, што не выпадкова ўрач М.Судзілоўскі ў Японіі пераконваў ваеннапалонных выступіць супраць самадзяржаўя, як толькі тыя высадзяцца ў Расіі. Ён паспрабаваў дабіцца ў японскіх улад дазволу

вярнуць палонным зброю і перапраўіць іх на азіяцкі мацярык, разлічваючы такім чынам забяспечыць поспех рускай рэвалюцыі. Праект не ажыццявіўся не па віне М.Судзілоўскага.

Рэвалюцыйнае імкненне распрапагандаваных М.Судзілоўскім палонных дасягнула мацерыка. Адзін з іх, матрос з браняносца «Арол» Аляксей Новікаў (пазней савецкі пісьменнік А.Новікаў-Прыбой), добра гаварыў пра дзейнасць Руселя ў Японіі. Адна з рускіх газет пісала ў 1906 г.: «У цяперашні час Расія абавязана Мікалаю Канстанцінавічу тым, што па вёсках і сёлах размешчана некалькі дзесяткаў тысяч свядомых галоў»[24а].

Пры вяртанні з Японіі салдаты неслі ў родныя месцы дух пратэсту супраць самадзяржаўя. Ва Уладзівастоку адбываліся сутычкі паміж салдатамі і вернымі царызму жандарамі і казакамі. У студзені 1906 г. у горадзе ўзнікла рэвалюцыйная дэманстрацыя. У час расстрэлу казакамі дэманстрантаў загінула паплечніца М.Судзілоўскага па працы ў Японіі сярод ваеннапалонных Людміла Волкенштэйн.

І пасля вяртання рускіх салдат з Японіі ў Расію М.Судзілоўскі прадаўжаў выдаваць газету «Воля» у Нагасакі, а затым газету «Усходні агляд» у Токіо.

У 1906—1907 гг. М.Судзілоўскі выдаў у Японіі ў выглядзе некалькіх брашур свае артыкулы з «Японіі і Расіі» і «Волі», а праз 10 гадоў — яшчэ адзін зборнік сваіх артыкулаў. У іх ён заклікаў да звяржэння самадзяржаўя і ўсталявання ў Расіі дэмакратычнага ладу[25]. Рэвалюцыянер перапісваўся з М.Горкім і У.Г.Караленкам.

Кітайскі рэвалюцыйны правадыр Сунь Ятсен пісаў М.Судзілоўскаму: «Я з вялікім задавальненнем прачытаў ваш цікавы артыкул «Кітайская загадка...». Я рэдка сустракаў прадстаўніка Захаду, які б калі-небудзь так адстойваў ідэі адраджэння Кітая і практычнага забеспячэння ўмоў чалавечага існавання мільёнам яго пакутуючага насельніцтва»[26]. М.Судзілоўскі ў хуткім часе пасля сустрэчы з Сунь Ятсенам атрымаў узрыўчатку для вырабу бомб. Японская паліцыя ўстанавіла, што ўзрыўчатыя рэчы для бомб, з дапамогай якіх кітайскія рэвалюцыянеры ажыццявілі ў Японіі замах на маньчжурскага прынца-рэгента, які наведаў гэту краіну, былі выраблены ў Нагасакі рускімі рэвалюцыянерамі.

Калі ў Кітаі адбылася рэвалюцыя (1911 г.) і Сунь Ятсен стаў прэзідэнтам рэспублікі, М.Судзілоўскі пісаў свайму кітайскаму сябру: «Мы ўсе так глыбока і шчыра зацікаўлены ў поспеху новай рэспублікі, што я не магу не паслаць Вам некалькі слоў перасцярогі. Будучае ўсіх нацый Азіі залежыць ад вашага поспеху, і ўсіх непакоіць думка, як пазбегнуць рэакцыі...». Рускі рэвалюцыянер выказваўся за неабходнасць сацыяльна-культурных змен у Кітаі, папярэджваў, што «армія — вострая з абодвух бакоў зброя. Яна можа быць таксама лёгка павернута супраць само-

га народа! Гэта небяспека больш сур'ёзная, чым замежнае ўмяшанне»[27].

М.Судзілоўскі падтрымліваў сувязь і праз супрацоўнікаў газеты «Нагасакі сімпо» з японскім сацыялістычным цэнтрам у Токіо і з нагасакскім аддзелам рэвалюцыйнага таварыства «Хэймінся». У 1906 г. японскія дэмакраты дамовіліся з М.Судзілоўскім пра сумеснае выданне часопіса «Рэвалюцыйны веснік». Пасля выхаду ў свет некалькіх нумароў японскі ўрад забараніў выданне часопіса[28].

Па патрабаванню незадаволеных прапагандысцкай дзейнасцю М.Судзілоўскага царскіх улад адміністрацыя ЗША пазбавіла ўрача амерыканскага пашпарта. Рэвалюцыянер пераехаў на Філіпінскія астравы, якія ў той час знаходзіліся пад кіраўніцтвам ЗША. У пачатку 1912 г. ён прыбыў на самы паўднёвы буйны востраў архіпелага — Мінданаа. Галоўнаму гораду вострава — Замбаанга, быў прысвечаны артыкул у мясцовай газеце. Пашыраны варыянт артыкула на рускай мове М.Судзілоўскі па традыцыі паслаў у далёкаўсходні друк, і ў 1914 г. у газеце «Усурыйскі голас» з'явіліся два яго «Лісты з-пад тропікаў»: «Замбаанга» і «Хола», прысвечаныя жывапісным Філіпінскім астравам Мінданаа і Хола.

М.Судзілоўскі апісваў засілле клерыкальнай рэакцыі на Філіпінах: «Калі б спатрэбілася эмблема для нацыянальнага сцяга Філіпін, то самым прыдатным было б адлюстраванне напаўголага, напаўгалоднага філіпінца з пеўнем у руках і каталіцкім патэрам на шыі»[29]. Ён пісаў пра самавольства амерыканскіх войск, якія захапілі ў канцы XIX ст. Філіпіны: «...Масавае забіванне тысяч з кулямётаў адбылося ў кратэры Баг-Сак амерыканскім губернатарам генер(алам) Пэршынг(ам) год таму. (...) Сумна бачыць, што амерыканцы не знайшлі лепшых сродкаў для вырашэння пытання, чым японцы на Фармозе (Тайвані, захопленым японцамі ў 1895 г., — *В.Г.*). *(...) Амерыканцы або японцы, ці французы (у Марока) — гэтыя* гаспадары не разумеюць, што ў аснове сацыяльнага і палітычнага ладу, які яны разбураюць, ляжыць пытанне пра хлеб. (...) Замест таго, каб дапамагчы ў эканамічнай арганізацыі спачатку, даць зброю і веды для барацьбы з прыродай, яны забіваюць. Гэта, зразумела, вельмі проста і практычна, але ніяк не падыходзіць да выразу аб прызванні і ролі белага чалавека сярод членаў чалавечай сям'і, якія адсталі»[30].

Пасля знаходжання на Філіпінах М.Судзілоўскі вярнуўся ў Японію, а адтуль пераехаў у кітайскі горад Цяньцзінь, дзе ахвотна лячыў мясцовую беднату, сярод якой быў вельмі папулярным. Ён піша адозву аб неабходнасці падтрымкі савецкага ўрада «левымі ўсяго свету», арганізоўвае Камітэт дапамогі галадаючым Паволжжа. Таварыства паліткатаржан у Савецкай Расіі выклапатала ў Наркамаце сацыяльнага забеспячэння для старога рэвалюцыянера пенсію. Рэакцыйная цяньцзінская буржуа-

зія не дае спакою старому ўрачу, яго дачцы прыходзіцца пакінуць мясцовую школу. У канцы свайго жыцця М.Судзілоўскі надрукаваў свае артыкулы ў маскоўскім часопісе «Катарга і ссылка» і нават хадайнічаў перад Таварыствам паліткатаржан аб вяртанні на Радзіму. 30 красавіка 1930 г. М.Судзілоўскі памёр. Па ўсходняму звычаю ён быў крэміраваны. Так скончыўся доўгі жыццёвы шлях урача-рэвалюцыянера родам з Беларусі.

Спасылкі:

[1] Пра змену ў 1877 г. у Румыніі М.К.Судзілоўскім свайго прозвішча на «Русель» (па-румынску — «рускі») гл.: Центральный государственный архив Октябрьской революции и социалистического строительства СССР (скарочана ЦГАОР СССР), Русский заграничный исторический архив. Фонд 5825, Н.К.Руссель-Судзиловский), опись 1, дело 1. Пра матывы змены прозвішча гл.: J.Ghelerter. Din viata şi activitatea doctorului Nicolae Russel (1850–1930). – in: Din ist oria medicina romineşti si universale. Sub ingr. V.L.Bologa. Bucureşti, 1962, pp. 351–377.

Судзілоўскі змяніў прозвішча, баючыся, што яго выдадуць румынскія улады царскаму ўраду: у 1877 г. праз Румынію рускія войскі ішлі на вайну з Турцыяй.

М.К.Судзілоўскаму прысвечаны наступныя даследаванні ў беларускай гістарыяграфіі: Грицкевич В.П. Добрый русский доктор на Гавайях // Грицкевич В.П. Путешествия наших земляков. Мн.: Наука и техника, 1968. С. 139—171 (библ.); Клейн Б. Доктор Руссель // Нёман, 1969, № 1. С. 69—106; № 2. С. 80—107; Грицкевич В.П. Врач-революционер Н.К.Судзиловский // Советское здравоохранение, 1976, № 4. С. 74—78; Иосько М.И. Николай Судзиловский-Руссель. Жизнь, революционная деятельность и мировоззрение. Мн.: БГУ, 1976, 336 с. (библ.); Грицкевич В.П. Добрый доктор на Гавайях // Грицкевич В.П. От Нёмана к берегам Тихого океана. Мн.: Полымя, 1986. С. 244—256 (библ.); Грицкевич В.П. Президент Гавайского сената // Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа. Мн.: Наука и техника, 1987. С. 217—223 (библ.).

[2] Дейч Л. Из Карийских тетрадей // Каторга и ссылка, 1926, № 4. С. 128—129.

[3] Центральный государственный исторический архив СССР в г. Ленинграде (скарочана ЦГИА СССР), фонд 1343, опись 29, дело 7699 (О дворянстве Судзиловского), лист 5.

[4] Ленинградский государственный областной исторический архив, фонд 14, опись 5, дело 3608, листы 1—17.

[5] Дебогорий-Мокриевич В.К. Воспоминания. СПб., 1906. С. 113—124.

[6] Энгельс Ф. За Польшу // Маркс К., Энгельс Ф. Собр. соч. Изд. 2-е. Т. 18. С. 555. У нашым артыкуле «Добрый русский доктор на Гавайях»

(у кн.: «Путешествия наших земляков», Минск, 1968, с. 143) мы памылкова сцвярджалі, што Энгельс падтрымліваў Судзілоўскага.

[7] Цыт па: G.Haupt. Din istoricul legaturilor revolutionare Romino-Ruse, 1849–1881. Bucureşti, 1955, p. 153.

[8] Освобождение Болгарии от турецкого ига. Сборник документов. Т. 2. М., 1964, № 253. С. 291.

[9] Освобождение Болгарии. Т. 2, № 253, с. 291.Яшчэ 12 красавіка 1875 г. за паўгода да ўтварэння гуртка, Х.Боцеў пісаў свайму аднадумцу І.Драсаву: «Рускія сацыялісты ў Лондане і Цюрыху запрашаюць мяне прыехаць або стаць іх пасрэднікам. Яны хочуць устанавіць сувязь з нашымі рэвалюцыянерамі. Прапаноўваюць абменьвацца прапагандыстамі, пашпартамі і г. д. «Мы гатовы дапамагчы вам і маральна, і фізічна, г. зн. і словам і мускуламі», — піша мне адзін былы аднакашнік Судзілоўскі». (Х.Ботев. Сочинения, редакция и коментар. от А.Бурмов. Т. 1. София, 1948. С. 232—233); Бакалов Г. О связи Н.К.Русселя-Судзиловского с болгарами. // Каторга и ссылка, 1930, кн. 10. С. 192.

[10] Пра рэвалюцыйную дзейнасць М.Судзілоўскага ў Румыніі гл. яго перапіску з Джоржэ Міль Дэметрэску ад 31 жніўня—3 снежня 1901 г. ЦГАОР СССР, Русский заграничный исторический архив, фонд 5825 (Н.К.Руссель-Судзиловский), опись 1, дело 188, а таксама: J.Ghelerter. Din viata şi activitatea doctorului Nicolae Russel (1850–1930). // Din istoria medicina romineşti şi universale Bucureşti, 1962, pp. 351–377; Поглубко К.А. О революционной деятельности народника Н.К.Русселя-Судзиловского ■ Румынии (вторая половина 70-х годов XIX ст.) // Русско-румынские и советско-румынские отношения. Сборник статей и сообщений. Кишинев, 1969. С. 181—206.

[11] Дейч Л.Г. Шестнадцать лет в Сибири, с. 316.

[12] Дейч Л.Г. Финанасы группы «Освобождение труда» // Каторга и ссылка. 1928, № 6. С. 310; Веков А.Х. Българо-руски революционни връзки. 1885—1917 гг. София, 1965. С. 17; Анев П. Доктор Николай Константинович Судзиловский (Русел) в Пловдив 1881—1887 год. // Съвременна медицина. 1967, № 5. С. 414—415; Д(обровольский) (И.И.) Письмо из Филиппополя. // Северный вестник, 1885, № 4. С. 238 (аўтарства артыкула ўстаноўлена па кн.: Масанов И.Ф. Словарь псевдонимов русских писателей, ученых и общественных деятелей. Т. 1. М., 1956. С. 311). У сваёй кнізе «Путешествия наших земляков» (Минск, 1968. С. 150) мы памылкова прыпісвалі адзначаны артыкул М.Судзілоўскаму. Аб знаходжанні М.Судзілоўскага ў Балгарыі гл. яго артыкулы і запісы: ЦГАОР, ф. 5825, оп. 1, дд. 11, 12, 13, 91.

[13] Д-р Руссель. Житие преосвященного Владимира, бывшего епископа Алеутского и Аляскинского, ныне викарного епископа Воронежского. М. (месца выдання указана выдуманае), 1895. Аб знаходжанні М.Су-

дзілоўскага ў ЗША гл.: ЦГАОР, ф. 5825, оп. 1, дд. 16, 66, 107, 108, 197.

[14] Вайанае прысвечаны маляўнічы нарыс М.Судзілоўскага (пад псеўданімам «І.Б.») «О океанской деревне» («Книжки недели», 1893, ноябрь, с. 42—101; декабрь, с. 112—153). Пра дзейнасць М.К.Судзілоўскага на Гаваях гл.: ЦГАОР, ф. 5825, оп. 1, дд. 17, 18, 19, 21, 93, 192, 196, 198, 205—217, 261.

[15] Краснов А.Н. Очерки природы и жизни на Гавайской республике. // Исторический вестник, 1896, т. 66, ноябрь. С. 569.

[16] Ліст архівіста штата Гаваі міс Агнес С.Конрад аўтару артыкула ад 17 лістапада 1969 г. Карыстаючыся выпадкам, дзякую бібліятэкару Дэпартамента адукацыі штата Гаваі місіс Нэнсі Сатэрфілд і архівісту штата міс Агнес С.Конрад за дасланыя імі звесткі аб знаходжанні М.К.Судзілоўскага на Гаваях і ксеракопіі яго прац.

[17] ЦГАОР, ф. 5825, дело 98. Our health policy. By Dr.N.Russel. Read before the Annual Meeting of the Medical Association of Hawaii. May, 27, 1896. Honolulu. Hawaiian Gazette Company, 1896, 16 pp.

[18] ЦГАОР, ф. 5825, дело 99. How to live on the Hawaiian islands. A summary of individual hygiene by N.Russel, M.D., Honolulu. Hawaiian Gazette Company, 1896, 37 pp.

[19] ЦГАОР, ф. 5825, д. 98, лл. 8—9.

[20] ЦГАОР, ф. 5825, д. 99, л. 4.

[21] И.Б. По Гавайским островам // Австралия и полярные страны. Иллюстрированный географический сборник, составленный А.Крубером, С.Григорьевым, А.Барковым и С.Чефрановым. Изд. 2-е. М., 1907. С. 224—225.

[22] Не адпавядае сапраўднасці версія, згодна з якой М.Судзілоўскі быў прэзідэнтам Гавайскіх астравоў (Юр'еў П. Беларус — прэзідэнтам Гавайскіх астравоў // Ніва (Беласток), 1966, 27 сакавіка, № 13 (526). С. 4—5; Клейн Б. Доктор Руссель // Неман, 1969, № 2. С. 89). Пра крытыку М.Судзілоўскім палітыкі амерыканскіх кіруючых колаў на Ціхім акіяне гл.: ЦГАОР, ф. 5825, оп. 1, дд. 36, 41, 42, 58, 76.

[23] Законапраект аб санітарнай службе, вынесены ў сенат Гавайскіх астравоў сенатарам Руселем 2 красавіка 1901 г.: ЦГАОР, ф. 5825, оп. 1, д. 205, 20 с.

[24] Бонч-Бруевич В.Д. Избранные сочинения. Т. 2. М., 1961. С. 331.

[24а] Новиков-Прибой А.С. Цусима. Кн. 2. М., 1959. С. 466.

[25] Гл.: Руссель Н.К. В плену. Кобе, 1906, 106 с.; ён жа. На политические темы. Нагасаки, 1907, 122 с.; ён жа. Последовательная демократия. Нагасаки, 1907, 58 с.; ён жа. Мысли вслух, 2-е исправленное и дополненное издание. Нагасаки, 1916, 158 с.; ЦГАОР, ф. 5825, оп. 1, д. 126, лл. 1—1 об. (лето 1906 г.).

[26] ЦГАОР, ф. 5825, оп 1, д. 106, лл. 9—9 об.

[27] ЦГАОР, ф. 5825, оп. 1, д. 199, л. 44 (8 ноября 1906—1 марта 1912 г.). Упершыню апублікавана: Хейфец А.Н. Революционные связи народов России и Китая в начале XX века // Вопросы истории, 1956, № 12. С. 97.

[28] Иванова Г.Д. Котоку — революционер и литератор. М., 1959. С. 62; яна ж. Дело об оскорблении трона. М., 1972. С. 79.


[29] ЦГАОР, ф. 5825, оп. 1, д. 44, л. 1. Руссель Н. Письма из-под тропиков. Замбоанга // Уссурийский голос. 6 апреля 1914 г., № 52.

[30] ЦГАОР, ф. 5825, оп. 1, д. 45, л. 1. Руссель Н. Холо // Уссурийский голос, 1914 г., № 116.

Валянцін Грыцкевіч

Марыя БАГУШЭВІЧ

(1865—1887)



асам гісторыя рукапісу бывае не менш захапляючая і займальная, чым гісторыя чалавечага лёсу. І не менш трагічная. Пра гэта думалася мне ў Варшаўскай Публічнай бібліятэцы, дзе яшчэ на пачатку 70-х гг. я перачытваў рукапісныя ўспаміны нашай зямлячкі, ураджэнкі былога Слуцкага павета Марыі Багушэвіч.

Уласна кажучы, дваццаць асобных картачак, спісаных у канцы 1887 г. дробным роўным почыркам, дзе чарнілам, а дзе алоўкам, назваць «Успамінамі», як указана ў бібліятэчных вопісах, крыху цяжкавата. Гэта, хутчэй, лісты, адрасаваныя нейкаму вельмі блізкаму чалавеку. Іх аўтар увесь час вяртаецца ў думках у Беларусь, краіну свайго дзяцінства. Пісаліся ж яны ў турэмных камерах, на пастоях па шляху з Томска ў Краснаярск. Потым чыясьці сяброўская рука, мабыць, рука фіктыўнага («белага») нарачонага Марыі Багушэвіч Міхала Манцэвіча, які поплеч ішоў з ёю ў сібірскую ссылку, клапатліва збірала картачкі, хавала пад падкладку ў адзенні.

Па дарозе аўтар «Успамінаў», 22-гадовая дзяўчына, зусім занядужыла ад сухотаў. «Марыя Багушэвіч, — пісаў потым адзін з яе таварышаў па ссылцы, — дайшла да Краснаярска. Жыццё ў ёй замірала на нашых вачах. Яе вельмі любілі, таму ніхто не хацеў з ёю расставацца. Нам удалося на нейкі час затрымаць усю партыю ў Краснаярску. Але калі надышла другая партыя, мы павінны былі пайсці далей, пакідаючы Марыю... назаўсёды... Застаўся пры ёй у ролі нарачонага толькі Манцэвіч».

Стан хворай раптоўна пагоршыўся. Тады яе змясцілі ў турэмны шпіталь. Але паветра было нават горшае, чым у камерах. Манцэвіч з вя-

лікай цяжкасцю дабіўся дазволу наведваць яе і выносіць на двор, нібы дзіцё, на руках. Ды нішто ўжо не было ў сіле адвесці непазбежную смерць. Даведаўшыся аб ёй, хтосьці з жыхароў Краснаярска патаемна прыслаў у турму дарагую труну. Магілу рускія аднадумцы закідалі кветкамі. А лісткі з успамінамі нябожчыцы Манцэвіч панёс па этапах на ўсход. Іх перапісвалі сябры. Копіі лісткоў насілі на шыі, нібы талісман. Арыгіналы ж, пераплеценыя ў вокладку, нейкім невядомым чынам трапілі ў Варшаву, у рукапісны аддзел бібліятэкі. Дзесяткі рук данеслі да нас цікавы дакумент гераічнай і трагічнай эпохі. Зберaглі радкі, у якіх выявіліся вялікая маральная чысціня і самаахвярнасць іх аўтаркі.

Хто ж такая Марыя Багушэвіч і што яна хацела расказаць свайму паплечніку па партыі (потым высветлілася, што быў ім «пралетарыятчык» Леанард Фінкель)?

Адважная рэвалюцыянерка нарадзілася 4 студзеня 1865 года непадалёку ад Клецка — у Цапэрцы над рэчкай Цапрой, прытокам Лані (цяпер гэта Клецкі р-н). Багушэвічы спачатку арандавалі там фальварак у Радзівілаў, а потым адкупілі яго як уласнасць. Бацька Марыі, Уладзімір Багушэвіч, быў чалавекам перадавых поглядаў, вучыўся ў Мінску і Маскве. У 1863 г. ён пайшоў разам са слугой-беларусам у паўстанцкі атрад і толькі цудам пазбегнуў рэпрэсій. Сям'я Багушэвічаў ўвогуле славілася рэвалюцыйнымі традыцыямі. Адзін з продкаў, пасол сойма ад Мінскага ваяводства Станіслаў Багушэвіч, вызначыўся ў XVIII ст. рашучасцю ў барацьбе з кансерватарамі. Прабабкай Марыі была родная сястра Тадэвуша Касцюшкі, недалёкім сваяком — беларускі паэт-дэмакрат Францішак Багушэвіч. У драўляным доміку над Цапрой па вечарах часта расказвалі пра легендарнага Кастуся Каліноўскага, спявалі беларускія народныя песні. З трапятаннем у сэрцы дзяўчынка разам з бацькам наведвала ў 1874 г. сядзібу ў Сяхновічах на Брэстчыне, дзе яшчэ расла ляшчынавая алея, пасаджаная рукой самога Тадэвуша Касцюшкі. Там, піша ва «Успамінах» М.Багушэвіч, яна са слязьмі на вачах спыталася ў бацькі:

— На свеце столькі гора і зла. Дык што ж рабіць, каб было лепш, каб лягчэй жылося народу? Каб людзі не дзяліліся на багатых і бедных? І якім чынам найлепш служыць свайму народу? Як аддаць яму сваё жыццё і сілы?

— Падрасцеш, будзеш вучыцца — зразумееш сама, — ціха адказаў бацька.

І Марыя вучылася. Пасля пераезду бацькоў у Варшаву хадзіла ў школу, пансіён, слухала лекцыі славутага гісторыка, мінчаніна родам, Тадэвуша Корзана. Дом Багушэвічаў у Варшаве стаў своеасаблівым клубам перадавой моладзі. Тут бывалі рускія народавольцы, першы польскі крытык-марксіст, ураджэнец Случчыны, Браніслаў Белаблоцкі, Міхаіл Войніч (потым муж славутай аўтаркі «Авадня»), палымяны рэвалюцы-

янер Людвік Варынскі, які ў 1882 г. заснаваў першую польскую рабочую партыю «Пралетарыят». Лёс Марыі быў звязаны з лёсам гэтай партыі з першых дзён яе існавання.

Дзяўчыне жылося нялёгка. Пасля смерці бацькоў мусіла кінуць вучобу, узваліць на свае кволыя плечы клопаты пра брата і сястру, зарабляць на хлеб прыватнымі ўрокамі. І адначасова весці партыйную работу. Збірала грошы для хворых вязняў. Арганізоўвала маёўкі і развучвала на іх з моладдзю «Марсельезу» і «Варшавянку». Абсталявала ў сябе на кватэры падпольную друкарню. Узяўшы ў рукі кош з бялізнай або завуалюю, разносіла надрукаваныя там лістоўкі па рабочых кватэрах. Проста здзіўляешся, адкуль у маладой дзяўчыны, якая вырасла ў даволі заможнай сям'і, знайшліся сіла волі, веды, вопыт, каб рабіць усё гэта. Рабіць умела, апантана, бясстрашна.

Калі чытаеш «Успаміны» Марыі Багушэвіч, часта ўзнікае ўражанне, нібы пісаў іх аскет, чалавек з жалезнымі нервамі, пазбаўлены жаночых «слабасцяў». Ды не. Сучаснікі ведалі яе як вясёлую, дасціпную дзяўчыну, якая любіла чытаць вершы, танцаваць, марыла аб сапраўдным — адзіным на ўсё жыццё — каханні. Вось што ўспамінала потым часты госць у доме Багушэвічаў Ядвіга Альшэўская-Цішкевіч: «Марыя была хударлявая і досыць высокая дзяўчына. Шатэнка, з бледным колерам твару і прыгожымі цёмна-блакітнымі вачыма, якія набывалі дзіўны бляск, калі яна хвалявалася. Марыя не вызначалася класічнай прыгажосцю, але ў яе была цудоўная ўсмешка. Заўсёды была вельмі валявая, імклівая ў прыняцці рашэнняў і нейкая такая сур'ёзная, што, калі нешта адмовіла, ніхто не асмельваўся паўторна яе аб тым жа прасіць. Але перш за ўсё валодала яна нечым такім, што я магу ацаніць толькі сёння, з перспектывы шасцідзесятых гадоў, г. зн. мела тую нейкую сціплую дзявочую прывабнасць, якой прыцягвала да сябе людзей».

А вось радкі з успамінаў Уладзіслава Умінскага, папулярнага дзіцячага пісьменніка. Зімой 1885 г. ён танцаваў з Марыяй мазурку на балі, дзе прысутнічалі палякі і рускія, беларусы і яўрэі, і потым так апісваў свае ўражанні: «Марыя была зграбная, спрытная і цудоўная дзяўчына. Калі яна ўсміхалася, на шчоках яе з'яўляліся ямачкі. У паўсядзённым жыцці была мудрая, валявая і рашучая, але ў час балю выяўляліся іншыя рысы яе характару; нейкая мяккасць і летуценнасць, жаданне здабыць зычлівасць і прызнанне, а можа і спадабацца. Я нават падазраваў яе ў дзявочай какетлівасці, але хутка пераканаўся ў іншым. Марыя перанесла ў сваім маладым жыцці цяжкія хвіліны, таму прагнула цяпла і сімпатыі. А паколькі на яе звалілася сур'ёзная і заўчасная адказнасць за сваю асірацелую сям'ю, яна толькі ў танцы забывала аб гэтых абавязках і тады станавілася прывабнай». Дарэчы, Умінскі, танцуючы з Марыяй на балі, не ведаў, што ўвесь даход ад яго пойдзе на першае

польскае выданне «Капітала» Карла Маркса.

Летам 1884 г. у партыі «Пралетарыят» пачаліся масавыя правалы. У турмах апынулася кіраўніцтва партыі. І тады на чале раз'яднаных рэвалюцыйных сіл становіцца Марыя Багушэвіч. Пра гэты, найбольш важны перыяд свайго жыцця яна, на жаль, гаворыць ва «Успамінах» вельмі скупа. Ды яно і зразумела: паперы маглі трапіць у рукі ўлад, пашкодзіць тым, хто застаўся на волі. Ва «Успамінах» рэвалюцыянерка будзе гаварыць толькі аб тым, што ўжо вядома жандарам. Ды яшчэ аб сваіх пераконаннях: «Агульныя прынцыпы сацыялістаў былі мне добра вядомыя, а іх імкненні я горача падзяляла яшчэ з дзяцінства».

Больш звестак аб дзейнасці нашай зямлячкі захавалася ў следчых матэрыялах, мемуарах сучаснікаў. Яны сведчаць, што Марыя Багушэвіч, узяўшы псеўданім Рэгіна (г.зн. каралева), стала сапраўдным кіраўніком «Пралетарыяту», узначаліла яго Цэнтральны камітэт. Каб аднавіць парушаныя сувязі, патаемна выязджала ў Лодзь, Згеж і іншыя гарады. Рукой юнай рэвалюцыянеркі былі напісаны «Арганізацыйны статут партыі «Пралетарыят», адозва «у імя веры і свабоды», артыкулы для газеты «Пралетарыят», якая ўзнавілася пад яе непасрэдным кіраўніцтвам. Урэшце 2 сакавіка 1885 г. Багушэвіч арганізавала ў Варшаве, на Замкавай плошчы, першую ў Польшчы рабочую дэманстрацыю. Вядомы рэвалюцыянер Людвік Кшывіцкі па праву назваў нашу зямлячку душой варшаўскага «Пралетарыяту». Як гаварылі сучаснікі, яна ўзняла баявы сцяг партыі, што выпаў з рук арыштаваных таварышаў.

Аднак у верасні 1885 г. над «Пралетарыятам» сталі згушчацца хмары. Здраднік і правакатар, нехта Пінскі, высачыў рэвалюцыянераў. Пры вобыску ў Багушэвіч знайшлі рукапіс артыкула «Адносна дагавору», прызначанага для газеты «Пралетарыят». У ім гаварылася аб супольных дзеяннях польскіх і рускіх рэвалюцыянераў, аб пашырэнні ўплыву партыі на Беларусь і Літву. Мэтай жа супольных дзеянняў павінна было стаць «вызваленне працоўных мас з-пад прыгнёту капіталу, а таксама стварэнне новага, сацыялістычнага ладу на руінах старога, г.зн. сацыяльная рэвалюцыя». Ясней не скажаш!

І вось у ліку 55 падазроных асоб Марыя Багушэвіч трапіла ў суровы X павільён Варшаўскай цытадэлі. Царскія ўлады адразу зразумелі, хто быў галоўнай асобай у так званым другім «Пралетарыяце» (першы быў разгромлены з арыштам Варынскага). Пачаліся здзекі, катаванні. Але ні карцэр, ні вільготнае падзямелле не зламалі волю дзяўчыны. Яна зацята маўчала. 12 мая 1887 г. быў абвешчаны прысуд: ссылка ва Усходнюю Сібір. Толькі ў Брэсце зняволеным дазволілі развітацца з блізкімі. Шлях ляжаў на ўсход: спачатку — цягніком, потым — пешшу. Па дарозе абвастрыліся сухоты, набытыя Марыяй у Мінску, дзе яна крыху раней самаахвярна лячыла сваю хворую цётку. На этапах дзяўчына яшчэ

марыла аб свабодзе, планавала, як уцячы. Ды суровае сібірскае надвор'е, недаяданне, душэўныя пакуты зрабілі сваё.

Дзесьці ў канцы 1887 г. абарвалася жыццё адной з першых польскіх марксістак. Абарвалася толькі фізічна. Бо памяць аб ёй засталася ў сэрцах тых, хто ішоў поплеч з ёю ў Сібір, хто застаўся, каб працягваць барацьбу ў Варшаве. Сябар Марыі, мінчанін родам, пісьменнік І.Патоцкі ўзяў сваім псеўданімам яе імя: Мар'ян Богуш. Вядомы паэт Вацлаў Серашэўскі напісаў верш «Памяці Марыі Багушэвіч». Прозвішча рэвалюцыянеркі назаўсёды запісана ў гісторыі польскага і міжнароднага рабочага руху. Яно неаднаразова ўпаміналася побач з прозвішчам Розы Люксембург у верасні 1972 г., калі друк Польшчы ўрачыста адзначыў 90-годдзе ўтварэння партыі «Пралетарыят». Сёння мы з гонарам называем імя Марыі Багушэвіч, якая прайшла высакародны, хоць і кароткі шлях з глухой беларускай вёскі да Варшавы і адтуль — у сібірскую ссылку. Яна ўмела накіроўвала намнога старэйшых за сябе падпольшчыкаў, стала на чале першай марксісцкай польскай партыі. Марыя Багушэвіч — адна з тых, хто стаіць ля вытокаў даўняй беларуска-польскай дружбы.

Літаратура:

1. Мальдзіс Адам. Душа варшаўскага «Пралетарыяту» // Работніца і сялянка. 1974. № 7. С. 18—19.

2. Сазановіч У. Касцюшкаўская праўнучка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1985. № 3. С. 23—24.

3. Связи революционеров России и Польши в XIX—начале XX в. М., 1968.

4. Швед В. Кніга аб Марыі Багушэвіч // Ніва. 1975. 20 ліп.

5. Monasterska Teresa. Historyczna rola partii «Proletariat» // Nowe Drogi. 1972. Nr 9.

6. Wawrzykowska-Wierciochowa Dioniza. Kosciuszkowska prawnuka. Warszawa, 1974.

7. Wawrzykowska-Wierciochowa Dioniza. Maria Bohuszewicz. Warszawa, 1967.

Адам Мальдзіс

Адам ГУРЫНОВІЧ
(1869—1894)



гісторыі беларускай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя на беларускім Парнасе творцу Адама Гурыновіча вылучае адна рыса. Рыса трагічная. Ён — самы малады паэт, які мусіў пайсці з жыцця, толькі-толькі адсвяткаваўшы сваё 25-годдзе. У гэтым нетрадыцыйным вымярэнні маладая вясковая постаць Гурыновіча бачыцца трэцяй, пасля Францішка Савіча (1815—каля 1845) і Кастуся Каліноўскага (1838—1864). Вядома, калі можна назваць святочным юбілеем дзень твайго нараджэння ў бацькоўскай хаце, бо цябе адпускаюць (вымушаны збыць паміраць!) у закінуты (нават па сённяшніх аўтамабільна-чыгуначных ўяўленнях) фальварак Крыстынопаль дзесь на Свянцяншчыне. Спехам выпіхнулі з паўночнай Пальміры, слыннай не толькі лонданскімі туманамі ды белымі начамі над Нявою, але і цытадэлямі Петрапаўлаўкі. У адной з іх, па некаторых звестках, і захварэў малады студэнт сталічнага тэхналагічнага інстытута невылечнай у тыя часы чорнай воспай.

Памерці на Радзіме — гэта, бадай, адзінае шчасце і змілаванне, падараванае Адаму лёсам у кароткім, але яркім жыцці. Ужо потым, пасля смерці, якая забрала Гурыновіча напачатку 1894 года, яшчэ раз адрэзак часу, роўны кароткай жыццёвай дарозе, шчасліва ўваскрэсілі творы паэта. Яны ацалелі дзякуючы рупнасці сваякоў. Невялічкі асабісты архіў Адама Гурыновіча, які цудам дайшоў да нас, — яшчэ адно выключэнне на беларускім паэтычным Парнасе мінулага стагоддзя, звязанае з ягоным імем. Гэтым разам шчаслівае выключэнне.

Паходзіў Адам Гурыновіч са старадаўняга небагатага шляхецкага роду татарскага паходжання. Прасачыць вытокі яго можна з XV—XVI стагоддзяў. Бацькі, Калікст Іасафатавіч і Элеанора з Сіняўскіх (хтось з

продкаў яе трымаў у руках гетманскую булаву), мелі некалькі дробных фальваркаў. Спачатку сям'я жыла ў Кавалях (Кавальках), пасажным фальварку маці, дзе 13/25 студзеня 1869 года і нарадзіўся маленькі Адам. Неўзабаве сям'я перабралася ў Крыстынопаль, які быў супольнай уласнасцю Калікста Іасафатавіча і яго брата Абдона (некаторых даследчыкаў, што знаходзілі ў архівах рукапісы Гурыновічаў, уводзілі ў зман подпісы пад дакументамі другой паловы XIX ст. — А.Гурыновіч; яны паспешна неабачна залічвалі адшуканыя аўтографы ў актыў паэта, не зважаючы, што пісьмы тыя, адказныя фінансавыя справы, паўставалі, калі паэту было 7—10 гадкоў).

Братоў і сястрычак у Адама нарадзілася шмат, і калі бацька раптам памёр, маладой удаве ой як цяжка прыйшлося з шасцю дзецьмі на руках. Калі дзеці падраслі, ім трэба было даваць нейкую адукацыю, удава ахвяравала маёнткамі і набыла невялічкі дамок у Вільні, у Пірамонцкім завулку, № 22 (цяпер вуліца Мельнікайце, дом захаваўся пад старым нумарам).

З гэтай хацінай звязана пара духоўнага станаўлення сына азёрнай Мядзельшчыны. Пасля заканчэння Віленскага рэальнага вучылішча (1879—1887), дзе ўжо тады А.Гурыновіч пачаў цікавіцца беларускім фальклорам, пытаннямі грамадска-палітычнымі, рабіць літаратурныя спробы, ён у 1887 годзе паступае ў Тэхналагічны інстытут, што месціўся ў тагачаснай сталіцы Расійскай імперыі. Нястачы і цяжар жыцця ў месце над Нявою (маці не магла істотна падтрымаць паўгалоднае існаванне ў нетаннай сталіцы) аслабілі здароўе маладзёна. Напачатку 1888 года (вылячыўшыся ў шпітальных палатах ад тыфа) вымушаны быў часова звольніцца з інстытута і вярнуцца на радзіму.

Прага ведаў і водар роднай Мядзельшчыны дапамаглі яму сабрацца з сіламі і ўвосень 1888 г. зноў паступіць на 1-ы курс «роднага» Тэхналагічнага інстытута. Пара студэнцтва, узлёт маладых гадоў дазвалялі не адчуваць стомы і займацца ў шмат якіх накірунках. Апроч авалодання тэхнічнымі навукамі (паводле ўспамінаў блізкіх, Адам адмыслова паглыбіўся ва ўдасканаленні тагачасных праектаў цягнікоў і на гэтым шляху быў блізкі да важных і цікавых высноў), ён адначасова, што называецца, проста глытаў працы беларускіх фалькларыстаў. Зачараваны красою родных песень, радзімага фальклору, ён скарыстоўваў пару вакацый, каб папоўніць уласныя фальклорна-этнаграфічныя зборы.

Што да літаратурнай спадчыны Адама Гурыновіча — яна таксама немалая (улічваючы, што пасля арышту, паліцэйскіх ператрусаў-вобыскаў і допытаў знікла, магчыма, беззваротна, значная частка ягоных рукапісаў). Пераважна гэта вершы. На беларускай, польскай і рускай мовах. Паколькі пад аўтографамі паэт не ставіць даты, цяпер цяжка рэканструяваць дакладна, калі і на якой мове распачаў ён сваю паэтычную творчасць. Нам, нашчадкам, важна тое, што яна захавалася. І такой бяды, што ў гэтым нарысе значная частка цытаваных твораў маладога

творцы прыводзіцца ўпершыню, хоць пасля нараджэння Адама мінула стагоддзе з чвэрткай. Значыць, спазнанне-спасціжэнне Гурыновіча-паэта яшчэ не скончана.

Вельмі магчыма, што першыя сталыя вершы маладога Гурыновіча напісаліся па-польску.

Wznoş się, wznoś się piosnko moja,
Dalej w górę
Po nad chnurę
Po nad rzeki
W kraj daleki
Po nad lasy
Przez wsze czasy,
Nim ustanie
Nerwów drganie
Nim na zawsze dusza moja
Każdy odgłos, wszelkie dzwięki
W sercu mojem
Tłumnym rojem
Krążą w koło
To wesoło
To ■ boleścią
Ze złą wieścią
W piersi drgają
W duszy dają
Głos złowieszczy, dzikie męki.

Ты ляці, ляці ж ты, песня,
Звонкай марай
Па-над хмарай,
Па-над борам
У прастору.
Па-над рэчкай
Хваляй вечнай,
Покуль гранне
Не прыстане,
І душа ў ім не ўваскрэсне.
Кожны водгалас магутны
Сэрца джаліць
Рэхам-жалем,
Кружыць колам,
То вясёла,
То са скрухай,
Гэй, паслухай:
Б'юцца ў грудзі,
Душу студзіць
Гук трывожны, спеў пакутны.
(Пераклад Ірыны Багдановіч)

У працытаваным вершы, як і ў шмат якіх іншых, знайшлі свой адбітак пытанні філасофска-грамадскага і сацыяльнага гучання, што ва ўсю шырыню паўставалі перад ягоным краем, іншымі паярэмленымі царскай імперыі народамі напрыканцы XIX стагоддзя. Папулярныя ў тагачасным асяродку студэнтаў-разначынцаў марксісцкія, сацыялістычныя ідэі запаланілі юнака цалкам. Адам прымае актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху, уваходзіць у студэнцкі «гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай». Утвораны ў 1889 г. як асяродак зямляцкай арганізацыі культурна-асветніцкага кшталту, гурток хутка схіліўся ў бок падпольнай антыўрадавай дзейнасці. А такія арганізацыі былі на ўліку ў паліцэйскіх агентаў. І калі ў 1892 годзе шпікі перахапілі ягоны ліст, адрасаваны да сяброўкі Станіславы Пяткевіч ў Цюрыху, у якім пецярбургскі адрасат прасіў арганізаваць дастаўку для гуртка вялікай партыі рэвалюцыйнай літаратуры на беларускай, польскай, рускай і ўкраінскай мовах, прац Маркса, Энгельса, Пляханава, Ласаля, Лібкнехта, лёс Адама і ягоных сяброў быў прадвызначаны. У 1893 г. А.Гуры-

новіч быў арыштаваны ў сваім доме ў Вільні, дзе пры вобыску знайшлі нямала забароненай літаратуры. Яго даставілі спачатку ў «будынак № 14» Віленскай цытадэлі, адтуль потым неадкладна адправілі пад вартай у Пецярбург. Сярод «арыштаваных» папер былі і ўласныя рукапісы, у тым ліку і беларускія.

Пісаць па-беларуску Гурыновіч пачаў, магчыма, на самым пачатку 1890-х гадоў, калі ў ягоныя рукі трапіла «Дудка беларуская» Мацея Бурачка, выдадзеная ў 1891 г. у Кракаве і патаемна, кантрабанднымі-перамытніцкімі сцяжынкамі, перапраўленая на Беларусь. Знаёмства з высокамастацкімі творамі на беларускай мове паказала маладому паэту збавенны шлях для ягонага ўласнага паэтычнага таленту.

Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею,
За тое, што ў сэрцы збудзіў ты надзею,
Што між братоў нашых знаходзяцца людзі
З кахаючым сэрцам і баляшчай груддзяй.
Дзякуй табе, браце, і за тыя словы,
Што ўспомнілі звукі нашай роднай мовы,
Бяры, браце, дудку, наладзь і жалейку,
Няхай песнь смутная ідзе ў калейку
І будзіць у сэрцах мысль аб лепшай долі,
Якой мы не зналі дагэтуль ніколі.

Гэтае вершаванае прызнанне гучыць як падзяка ад імя ўсяго пакалення маладзейшых беларускіх літаратараў канца XIX стагоддзя. Хіба дзякуючы абранаму шляху беларускія зярняты ў творчым даробку паэта склалі важкі колас.

Паэтычная творчасць на беларускай і польскай мовах адначасова з'яўлялася характэрнаю з'яваю для ўсёй папярэдняй беларускай літаратуры першай паловы і сярэдзіны XIX стагоддзя. Аднак русіфікацыя «забраных» земляў, асабліва жорсткая пасля задушэння паўстання 1863—1864 гадоў, прынесла свой плён. Беларускія літаратары пачынаюць пісаць і на трэцяй мове — па-расійску. Адам Гурыновіч тут не стаў піянерам-першапраходцам. Прынамсі, трохі раней за паэта ў гэтым практыкаваўся ягоны сучаснік Вайніслаў Казімір Суліма-Савіч-Заблоцкі. Апошні наогул пакінуў у сваім архіве ўзоры літаратурнай творчасці больш чым на паўдзесятка мовах.

Гартаючы чарнавыя аўтографы А.Гурыновіча, бачым, што рускай мовай ён валодаў найгорш. Прынамсі, менавіта на гэтых аркушах сустракаюцца метрычныя разметкі радкоў. Баючыся збіцца на слых, Адам выявараў сваё натхненне, выкладзенае на чужой яму мове захопнікаў, строгім чаргаваннем націскных і ненаціскных складоў уверсе над словамі, што ірваліся з ягоных грудзей. Што ж, патрабавальнасць да сваёй творчасці, на якой бы мове не пісаліся лірычныя радкі ,— выдатная ха-

рактарыстыка Гурыновіча-паэта.

Пловец плыл по морю, на утлом челне,
И челн всё бросало по бурной волне.
Вот бросило вверх, вот качнуло опять,
Вот кинулся вглубь он — совсем не видать.
А вон показался на гребне волны,
Движенья гребца все от страха полны.
Напрасно он правит дрожащей рукой,
Как щепку бросает челн утлый волной.

Рускамоўны верш Адама адносіцца да пецярбургскага перыяду ягонай жыццёвай адысеі. Падчас вучобы адбылося знаёмства з нелегальнымі выданнямі групы «Гоман», гектаграфічныя адбіткі якой з'явіліся ў Пецярбургу напачатку 1880-х гадоў. Пад іх уплывам Адам пачынае вывучаць перадавую філасофскую, у тым ліку марксісцкую, літаратуру, прымаць актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху. Сярод іх пераважалі тады групы першых расійскіх марксістаў.

Блаженны вы, студенческие годы
И ваши чистые возвышенные грёзы,
Когда лишь жаждалось любви свободы,
Когда не знали Вы про горечи и слёзы.

Па часе Гурыновіч уваходзіць у кіраўнічыя структуры гэтай рэвалюцыйнай студэнцкай арганізацыі. Ягонае сэрца, узгадаванае на апавяданнях сваякоў і бацькоў пра нядаўнія крывавыя падзеі з часоў вызвольнага паўстання 1863—1864 гадоў, прагнула вызвалення для ўсіх народаў, паняволеных расійскім царызмам.

Как мало тех, кто искренней душою
Готов понять страдания людей.
Готов к борьбе (с) превратною суд(ь)бою,
С коварством злым отсталости детей.
Как мало тех, как мало тех,
Как мало тех, кто б светлыя (!) идеи
В толпе людзей (!) хотел распространять,
Чтоб все могли коварные затеи
Служащих злу от правды отличать...

Таму нездарма ў ягоным творчым даробку захавалася гэтак шмат перакладаў з розных моў: з польскай — «Вялля» (Адама Міцкевіча), «Вясна», «Гібнуць зарання столькі цвяткоў...» (Яна Каспровіча); з рускай — «Рэха» (Аляксандра Пушкіна), «Мароз» (Мікалая Някрасава),

«Казельчык» (Івана Крылова), «Восень» (Аляксея Талстога); з украінскай — «Вечны рэвалюцыянер...» (Івана Франко). Паказальна, што малады паэт думаў аб празаічным жанры на роднай мове. Адначасова з Францішкам Багушэвічам — толькі-толькі ў Кракаве выходзіць (а можа яшчэ не дайшла да Беларусі, («Траляляёначка») 1892), Гурыновіч перакладае апавяданне Э.Ажэшкі «З часоў голаду».

Апроч усяго вышэй пералічанага Адам Гурыновіч думаў пра беларускую дзіцячую паэзію. Яно, мо, звысока і навукова сказана. Проста звярнуцца ў сваёй паэзіі да дзяцей-падлеткаў было натуральнай патрэбай, арганічнай рысаю маладога Гурыновіча. Нагадаю, самага маладога нашага паэта, які пайшоў з жыцця ў 25 гадоў.

Стаіць рыбак над вадою,
Ловіць рыбіну вудою:
Стаяў, стаяў ён дзень цэлы —
Ані рыбкі не прыспела.
Скора сонца за лес сядзіць,
Аж за вудку нехта цягніць
Учапіўся карась нейкі,
Такі дрэньненькі, маленькі.
Рыбаку ён стаў казаці:
«Мяне варта адвязаці
І выпусціць, зняўшы з вуды,
Бо ці ж варта вастрыць
На маленькую такую,
Як я, рыбіну худую?
Пусці ў раку — раздабрэю,
Год ці два — якраз прыспею;
Як вырасту — смачны буду,
Учаплюся сам на вуду».
«Добра, добра, — рыбак скажа.
Ды той дурны, хто так кажа
І на заўтра адкладае,
Што мае, то кідае.
Па мне, розуму не мае,
Хто, злавіўшы — з рук пускае».
(«Рыбак»)

Здаецца, Адам яшчэ сам пачуваўся маладзёнам, якому не хапіла бацькоўскай ласкі ды матчынай пяшчоты. Бацька ж памёр рана, і сірочае жыццё не песціла Адама. Падчас вучобы ў Пецярбургу ён ніколі не патрабаваў ад маці лішняга, памятаючы пра малодшых брацікаў ды сястрычак. «Мне вельмі прыкра, — апраўдваецца паэт у адным з лістоў, — што я прычыніўся да вымовы збоку цёткі; праўдзіва, я пісаў дзядзьку і згадаў, што

атрымліваю з дому мала, але няхай мама будзе пэўная, што тым самым не хацеў зрабіць маме аніякай абразы. Я добра ведаю, што я не адзін у мамы, і што апроч мяне аднолькавае права маюць Ясь, Стась і Косьця і наогул мы ўсе. Я добра ведаю, што мама не мела грошай і павінна была выдаткаваць іх на Яся. І патрабаваць ад мамы ў такім становішчы было б занадта...»

Нягледзячы на цяжкае матэрыяльнае становішча, калі часта ўвосень даводзілася бегаць на лекцыі па пецярбургскіх прашпектах у прамоклых наскрозь камашах (неаднойчы дбайна падшытых суровымі ніткамі маладым інжынерам), Адам заставаўся жыццялюбам.

Я немножко литератор.
Я при случаих (!) фатор.
А в счастливое мгновенье
Коль случится вдохновенье,
Я могу быть и поэтом,
Хоть непризнан я злым светом.
Что увижу опишу
И... таким любить прошу.
Представляться не умею
Лицемерить, лгать не смею,
Уж простите, коль смешу,
Но таким любить прошу.

Калі з паэтычнай спадчыны Адама Гурыновіча пры ягоным жыцці не было апублікавана ні радка, гэтага нельга сказаць пра ягоныя этнаграфічныя і фальклорныя запісы. Бываючы на летніх вакацыях у Беларусі, Гурыновіч штудзіраваў працы беларускіх фалькларыстаў (І.Насовіча, П.Штэйна) і сам папаўняў у ваколіцах Крыстынопаля свае фальклорна-этнаграфічныя зборы. У 1890 г. ён пераслаў узоры сваіх запісаў у Варшаву Яну Карловічу, які быў блізкім земляком, амаль суседам па Вішневу, просячы парад у фальклорна-этнаграфічнай працы. Карловіч у сваю чаргу даслаў матэрыялы А.Гурыновіча ў Кракаўскую Акадэмію навук, дзе яны былі надрукаваны ў 1893 г. у часопісе «Zbior wiadomości do antropologii krajowej» («Збор звестак па айчыннай антрапалогіі») і асобнай адбіткай.

Калі ж 27 студзеня 1894 года сакратар аддзела Антрапалагічнай камісіі згаданай Акадэміі пісаў Адаму Гурыновічу ліст з просьбаю паведаміць адрас, куды б Акадэмія магла пераслаць 50 адбіткаў ягонай публікацыі і належны яму за матэрыял ганарар у памеры 33 рублёў срэбрам — беларускага паэта ўжо не было ў жывых. Ён памёр 26 ці 29 студзеня 1894 г. (паводле іншых звестак 4 лютага) паводле новага стылю, г. зн. 14 ці 17 або 23 студзеня паводле старога стылю.

Язэп Янушкевіч

КАРОТКІЯ ЗВЕСТКІ ПРА АЎТАРАЎ

Барышаў Гурый — доктар мастацтвазнаўства, прафесар Беларускага універсітэта культуры.

Галенчанка Георгі — доктар гістарычных навук, загадчык аддзела Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Гапоненка Вольга — кандыдат фізіка-матэматычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік музея гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

Гілеп Уладзімір — старшыня Беларускага фонду культуры.

Грыцкевіч Анатоль — доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі і музеязнаўства Беларускага універсітэта культуры.

Грыцкевіч Валянцін — кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Санкт-Пецярбургскага інстытута культуры (Санкт-Пецярбург, Расія).

Жлутка Аляксандр — кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Кісялёў Генадзь — доктар філалагічных навук, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я.Купалы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Кісялёў Уладзімір — кандыдат эканамічных навук, загадчык Музея жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Кушнер Васіль — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, галоўны рэдактар «Беларускага гістарычнага часопіса».

Мальдзіс Адам — доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык аддзела Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны.

Мархель Уладзімір — кандыдат філалагічных навук, загадчык аддзела Інстытута літаратуры імя Я. Купалы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Свяжынскі Уладзімір — кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Янушкевіч Язэп — кандыдат філалагічных навук, загадчык аддзела археаграфіі Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы.

ЗМЕСТ

Уладзімір Гілеп. *Славутыя імёны Бацькаўшчыны.* 3

Ефрасіння Полацкая. *Анатоль Грыцкевіч.* 9

Мікалай Радзівіл. *Анатоль Грыцкевіч.* 17

Астафій Валовіч. *Георгі Галенчанка.* 28

Сымон Будны. *Георгі Галенчанка.* 39

Раман Сангушка. *Анатоль Грыцкевіч.* 52

Васіль Цяпінскі. *Георгі Галенчанка.* 64

Фёдар Еўлашоўскі. *Уладзімір Свяжынскі.* 78

Мікалай Крыштоф Радзівіл. *Анатоль Грыцкевіч.* 87

Леў Сапега. *Анатоль Грыцкевіч.* 100

Ян Караль Хадкевіч. *Анатоль Грыцкевіч.* 115

Казімір Семяновіч. *Георгі Галенчанка.* 129

Казімір Леў Сапега. *Анатоль Грыцкевіч.* 136

Урсула Францішка Радзівіл. *Гурый Барышаў.* 147

Міхал Карыцкі. *Аляксандр Жлутка.* 160

Вікенцій Равінскі. *Генадзь Кісялёў.* 178

Юзэф Ходзька. *Валянцін Грыцкевіч.* 186

Ігнат Дамейка. *Адам Мальдзіс.* 197

Аляксандр Ходзька. *Валянцін Грыцкевіч.* 207

Напалеон Орда. *Вольга Гапоненка.* 220

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. *Язэп Янушкевіч.* 233

Уладзіслаў Сыракомля. *Уладзімір Мархель.* 248

Міхаіл Ксаверы Зыгмунт Ельскі. *Васіль Кушнер.* 256

Аляксандр Вікенцій Ельскі. *Васіль Кушнер.* 268

Канстанцін Ельскі. *Адам Мальдзіс.* 283

Францішак Бенядзікт Багушэвіч. *Язэп Янушкевіч.* 288

Зыгмунт Мінейка. *Адам Мальдзіс.* 300

Іван Яркоўскі. *Вольга Гапоненка.* 306

Жыгімонт Флярэнт Урублеўскі. *Вольга Гапоненка.* 320

Эдвард Адам Вайніловіч. *Анатоль Грыцкевіч.* 333

Якуб Наркевіч-Ёдка. *Уладзімір Кісялёў.* 342

Мікалай Судзілоўскі. *Валянцін Грыцкевіч.* 357

Марыя Багушэвіч. *Адам Мальдзіс.* 369

Адам Гурыновіч. *Язэп Янушкевіч.* 374

Кароткія звесткі пра аўтараў. 381



Навукова-папулярнае выданне

Славутыя імёны Бацькаўшчыны

Зборнік

Выпуск першы

Рэдактар В. А. Басава
Мастацкі рэдактар П. М. Драчоў
Тэхнічны рэдактар М. М. Кіслякова
Карэктар Р. А. Маслоўская
Вёрстка І. В. Баранава, А. А. Первянкоў
Камп'ютэрны набор А. В. Кушнер, Н. К. Сакалова
Камп'ютэрная апрацоўка А. А. Первянкоў

Здадзена ў набор 14.04.2000. Падпісана да друку 7.08.2000. Фармат 60Х90/16. Папера афс. Гарнітура SchoolBookC. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 24. Ул.-выд. арк. 20. Тыраж 2000 экз. Заказ 1421.

Падатковая ільгота — Общегосударственный классификатор Республики Беларусь ОКРБ 0007-98, ч. 1, 22.11.20.400

Выдавецтва «Беларускі фонд культуры». Ліцэнзія ЛВ № 241 ад 11.04.98 г.
Рэспубліка Беларусь, 220039, г. Мінск, Камунальная наб., 6-Б.

Пры садзейнічанні ЗАТ «ТІМ На Ростанях». Ліцэнзія ЛВ № 452 ад 05.06.2000 г.
Рэспубліка Беларусь, 220005, г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 47.

Надрукавана з дыяпазітываў заказчыка на Рэспубліканскам унітарнам прадпрыемстве «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа»
Рэспубліка Беларусь, 220005, г. Мінск, вул. Чырвоная, 23.